## ЗМЕСТ

Уводзіны ў дысцыпліну “Гісторыя Беларусі”.
**Модуль 1.** Цывілізацыйная спадчына Старажытнага свету, сярэдніх вякоў і Беларусь.
Тэма 1: Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі.
Тэма 2: Раннефеадальныя княствы на тэрыторыі Беларусі 9 – 13 стст.
Тэма 3: Утварэнне і грамадска-палітычнае развіццё Вялікага княства Літоўскага ў другой палове 13 – першай палове 16 стст.
Тэма 4: Сацыяльна-эканамічнае развіцце ВКЛ 14 - 16 стст.
Тэма 5: Рэлігія і культура ВКЛ у 14 – 16 стст.
**Модуль 2.** Цывілізацыйная спадчына Новага часу і Беларусь.
Тэма 6: Грамадска-палітычнае развіццё ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (апошняя трэць 16 – першая палова 17 стст.).
Тэма 7: Грамадска-палітычнае развіццё ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (апошняя трэць 16 – першая палова 17 стст.). Падзелы Рэчы Паспалітай.
Тэма 8:Сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ у 17 – 18 стст.
Тэма 9: Рэлігія і культура ВКЛ 17 – 18 стст.
**Модуль 3.** Беларусь у складзе Расійскай імперыі.
Тэма 10: Грамадска-палітычнае жыццё і эвалюцыя палітыкі царызму на землях Беларусі ў канцы 18 - першай палове 19 стст.
Тэма 11: Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове 19 ст.
Тэма 12: Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове 19 ст.
Тэма 13: Сацыяльна-палітычнае жыццё Беларусі ў другой палове 19 ст.
Тэма 14: Фарміраванне беларускай нацыі. Культура Беларусі ў 19 ст.
Тэма 15: Беларусь на пачатку 20 ст. (рэвалюцыя 1905-1907 гг. і перыяд 1907-1914 гг.).
**Модуль 4.** Беларусь у перыяд сусветных войнаў і рэвалюцый 1914 – 1945 гг. Фарміраванне беларускай савецкай дзяржаўнасці.
Тэма 16: Першая сусветная вайна і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі.
Тэма 17: Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1918-1921 гг.
Тэма 18: Новая эканамічная палітыка і палітыка беларусізацыі ў БССР.
Тэма 19: БССР у 1930-я гг.
Тэма 20: Заходняя Беларусь у складзе Польшчы.
Тэма 21: Беларусь ва ўмовах Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.
**Модуль 5.** Беларусь у пасляваенны перыяд (другая палова 20 – пачатак 21 стст.). Станаўленне незалежнай беларускай дзяржавы.
Тэма 22: БССР у другой палове 1940 – першай палове 1950-х гг.
Тэма 23: БССР у другой палове 1950-х – 1980-я гг.
Тэма 24: Рэспубліка Беларусь на сучасным этапе развіцця.
Найбольш значныя даты гісторыі Беларусі.
Тэрміналагічны слоўнік.
Спіс літаратуры.

# УВОДЗІНЫ

“Гісторыя Беларусі” з’яўляецца абавязковым для вывучэння прадметам ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь. *Мэта вывучэння дысцыпліны* – фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнтаў, што павінна забяспечыць іх самавызначэнне ў сістэме каштоўнасцей, выпрацаваных у працэсе гістарычнага развіцця беларускага народа.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт **павінен ведаць**:

1) асноўныя гістарычныя перыяды грамадскага развіцця на тэрыторыі Беларусі;

2) асаблівасці эвалюцыі сацыяльна-эканамічных адносін у розныя гістарычныя перыяды на тэрыторыі Беларусі;

3) этапы станаўлення і развіцця форм дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, вытокі дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

4) дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа;

5) месца і ролю беларускіх земляў у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды, месца суверэннай Рэспублікі Беларусь у сучасным свеце.

Студэнт **павінен умець:**

1) рабіць характарыстыку асаблівасцяў развіцця грамадства на тэрыторыі Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды;

2) вызначаць спецыфічныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у розныя гістарычныя перыяды, тлумачыць прычыны сацыяльна-эканамічных трансфармацый у гісторыі Беларусі;

3) аналізаваць працэс фарміравання і развіцця розных форм дзяржаўнасці і сацыяльна-палітычных адносін на тэрыторыі Беларусі, вызначыць вытокі станаўлення суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

4) тлумачыць уплыў розных культурна-цывілізацыйных фактараў на развіццё беларускага грамадства і вызначаць асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры;

5) характарызаваць геапалітычнае становішча беларускіх зямель у розныя гістарычныя перыяды, аналізаваць месца і ролю суверэннай Рэспублікі Беларусь ва ўмовах глабалізацыі.

*Структура вучэбна-метадычнага комплекса* ўключае ў сябе два блокі:

1) лекцыйны, які ўтрымлівае ў сабе інфармацыйна-аналітычны матэрыял у межах дысцыпліны;

2) практыкум, які змяшчае кантрольныя пытанні і заданні па асобных тэмах курса, а таксама прыкладную тэматыку дакладаў і рэфератаў у якасці спосабаў засваення дадатковай інфармацыі ў межах курса.

У канцы ВМК змешчаны спіс асноўнай і дадатковай літаратуры, неабходнай для засваення матэрыялу курса, а таксама тэрміналагічны слоўнік і спіс важнейшых дат з гісторыі Беларусі.

## Уводзіны ў дысцыпліну "Гісторыя Беларусі"

1. **Гісторыя як навука. Прадмет і аб'ект гісторыі.**
2. **Метадалогія гістарычнай навукі.**
3. **Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі.**
4. **Перыядызацыя гісторыі Беларусі.**

### У.1. Гісторыя як навука. Прадмет і аб'ект гісторыі.

***Гісторыя** – навука аб заканамернасцях функцыянавання грамадства на розных этапах яго развіцця.* Яна ўяўляе з сябе інтэгральную дысцыпліну, якая абагульняе веды аб асноўных накірунках функцыянавання грамадскага жыцця ў часе.

Гісторыя як навука мае сваю спецыфіку ў параўнанні з іншымі як прыродазнаўчымі, так і сацыяльна-гуманітарнымі навукамі.

*Адрозненне гісторыі ад прыродазнаўчых навук*:

- у межах прыродазнаўчых навук галоўным з'яўляецца ўстанаўленне факту, які потым тлумачыцца з дапамогай пэўных заканамернасцяў; у межах гісторыі факт з'яўляецца вынікам дзейнасці людзей і выступае як унікальная з'ява, што не заўсёды можа быць патлумачана з дапамогай пэўных заканамернасцяў;
- у межах прыродазнаўчых навук пэўны факт устанаўліваецца, галоўным чынам, шляхам эмпірычных метадаў (назіранне, эксперымент і інш.); у межах гістарычнай навукі выкарыстанне дадзеных метадаў амаль немагчымае – вывучэнне гістарычных фактаў адбываецца на аснове розных гістарычных крыніц, якія не заўсёды дакладна адлюстроўваюць падзеі мінулага;
- у прыродазнаўчых навуках даследчык выступае як незалежны назіральнік, што канстатуе факты і ўстанаўлівае заканамернасці; у межах гістарычнай навукі вялікую ролю маюць суб'ектыўныя асаблівасці навукоўца-даследчыка, паколькі гістарычныя факты могуць мець розныя інтэрпрэтацыі.

*Адрозненне гісторыі ад іншых сацыяльна-гуманітарных навук*:

- гістарычная навука выступае як комплексная навука, якая сістэмна разглядае ўсе падсістэмы грамадства ў розныя часавыя эпохі; гэта патрабуе сінтэзу ведаў з галіны філасофіі, эканамічнай тэорыі, сацыялогіі, паліталогіі, культуралогіі, рэлігіязнаўства і іншых сацыяльна-гуманітарных дысцыплін;
- калі прадстаўнікі іншых сацыяльна-гуманітарных навук вывучаюць асобныя сферы грамадства (эканамічная тэорыя вывучае эканамічную сферу, паліталогія – палітычную і г.д.), то гісторыя вывучае ўсе сферы жыцця грамадства ў іх развіцці ў часе і прасторы.

*Асноўныя функцыі гісторыі як навукі*:

*1) Пазнавальная функцыя:* у межах гісторыі адбываецца даследаванне і тэарэтычная апрацоўка шматбаковай інфармацыі аб мінулым грамадства.

*2) Практычная функцыя:* гісторыя садзейнічае захаванню і практычнай перадачы сацыяльнага вопыту. Крытычнае ўспрыманне мінулага дапамагае

зразумець і асэнсаваць, якія з'явы мінулага перайшлі ў сучаснае, дазваляе даследаваць розныя шляхі развіцця грамадства ў перспектыве.

3) *Выхаваўчая функцыя:* гісторыя садзейнчае фарміраванню светапогляду асобы, складванню самастойных адносін да з'яў сацыяльнай рэчаіснасці.

**У.2. Метадалогія гістарычнай навукі.**

Кожная навука мае сваю метадалогію.

*Метадалогія навукі* – гэта сістэма асноўных прынцыпаў і метадаў пэўнай навуковай дысцыпліны.

*Прынцыпы* – зыходныя паняцці навукі, што вызначаюць асноўныя спосабы вырашэння навуковай праблемы.

*Метады* – гэта сукупнасць прыёмаў і аперацый, што рэгулююць дзейнасць даследчыка і забяспечваюць вырашэнне даследчыцкай задачы.

***Прынцыпы гістарычнай навукі***:

*Гістарызм* – прынцып, у адпаведнасці з якім грамадства вывучаецца ў працэсе развіцця, падчас якога адбываюцца якасныя змены ў розных сферах сацыяльнага жыцця.

*Аб'ектыўнасць* – прынцып, які патрабуе разглядаць гістарычныя з'явы аб'ектыўна, г.зн. такімі, якімі яны ёсць незалежна ад волі і жаданняў асобных індывідаў.

*Сістэмнасць* – прынцып, які патрабуе вывучэння гістарычных з'яў у межах пэўнай грамадскай сістэмы, з улікам усёй сукупнасці ўзаемасувязяў і механізмаў іх фунцыянавання.

***Метады гістарычнага даследавання***:

*Агульнанавуковыя*:

*аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, абагульненне, абстрагаванне, аналогія, лагічны аналіз.*

*Спецыяльна-навуковыя:*

*гісторыка-генетычны* метад дазваляе вывучаць з'явы ў працэсе іх развіцця, ад зараджэння да гібелі ці сучаснага стану;

*гісторыка-параўнальны* метад дазваляе параўноўваць гістарычныя аб'екты ў прасторы і часе, выяўляць падабенствы і адрозненні паміж імі;

*гісторыка-тыпалагічны* дазваляе выяўляць агульныя рысы ў прасторавых групах гістарычных падзей і з'яў і вылучаць аднародныя стадыі ў іх развіцці;

*гісторыка-сістэмны* метад дазваляе праводзіць паглыблены аналіз сацыяльна-гістарычных сістэм і раскрываць унутраныя механізмы іх функцыянавання.

*Крыніцамі* інфармацыі для гісторыкаў выступаюць матэрыялы і знаходкі экспедыцый, раскопак, музейных калекцый, архіваў.

*Тыпы гістарычных крыніц:*

- пісьмовыя (летапісы, хронікі, карэспандэнцыя і г.д.);
- рэчавыя (музейныя і археалагічныя калекцыі);
- этнаграфічныя (прадметы побыту этнічных культур);

- фальклорныя (легенды, казкі, песні і г.д.);
- вусныя (успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей);
- кінафотадакументы;
- фонадакументы (запісы гука).

**У3. Асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі.**

У сучасных сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах вылучаюць два асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі:

- *лінейныя (стадыльна-паступовыя)*; сутнасць іх палягае ў поглядзе на гісторыю як адзіны працэс паступовага, узыходзячага развіцця чалавецтва, у адпаведнасці з якім вылучаюцца стадыі ў гісторыі;
- *нелінейныя*; сутнасць яго ў поглядзе на гісторыю як працэс фарміравання і развіцця некалькіх самастойных грамадскіх супольнасцяў, кожная з якіх мела сваю самастойную гісторыю.

У межах ***лінейных*** вылучаюцца наступныя падыходы:

1) *Гістарычныя канцэпцыі Асветніцтва* (І. Гердэр, М.Ж. Кандарсэ, Л. Морган і інш.). У іх гісторыя чалавецтва падзяляецца на тры стадыі:

- дзікасць (перыяд панавання прывойваючай гаспадаркі і родавай абшчыны);
- варварства (перыяд пераходу ад родавага да класавага грамадства, узнікнення вытворчай гаспадаркі ў выглядзе земляробства і жывёлагадоўлі, рамяства, пачаткаў гандлю, сацыяльнай няроўнасці);
- цывілізацыя (перыяд, для якога характэрна фарміраванне сацыяльна-класавай структуры грамадства, дзяржаўнасці, гарадской гаспадаркі і культуры, пісьмовасці).

Штуршком да пераходу грамадства ад адной стадыі да другой абвяшчаюцца распаўсюджанне ведаў аб прыродзе і грамадстве.

2) *Фармацыйны падыход* распрацаваны ў межах *марксізму* (К. Маркс, Ф. Энгельс і інш.). У аснове яго знаходзіцца матэрыялістычнае тлумачэнне гісторыі, у адпаведнасці з якім галоўнай сферай грамадскага жыцця абвяшчаецца матэрыяльная вытворчасць. *Фармацыя* – гэта ўстойлівы тып грамадства, у аснове якога знаходзіцца пэўны спосаб вытворчасці. *Спосаб вытворчасці*, які ўключае ў сябе *прадукцыйныя сілы* (прадметы, сродкі працы і працоўная сіла) і адпавядаючыя ім *вытворчыя адносіны* (адносіны паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці, абмену, размеркавання і спажывання прадуктаў) абвяшчаюцца *базісам* грамадства, які вызначае яго спецыфіку. *Надбудова* (сферы палітыкі, культуры, рэлігіі і г.д.) абвяшчаецца залежнай ад базісу. Усё чалавецтва праходзіць праз некалькі сацыяльна–эканамічных фармацый, якія вылучаюцца на аснове пануючых у пэўным грамадтве вытворчых адносін і правоў уласнасці на сродкі вытворчасці (першабытнаабшчынная, рабаўладальніцкая, феадальная, капіталістычная, а затым пасля пралетарскай рэвалюцыі павінна была прыйсці сацыялістычная-камуністычная). Крыніцай пераходу ад адной фармацыі да другой з’яўляюцца ўнутраныя супярэчнасці ў паміж прадукцыйнымі сіламі, якія пастаянна развіваюцца, і вытворчымі адносінамі, што з’яўляюцца стабільным

элементам ў кожнай фармацыі. У перыяды найбольшага абвастрэння эканамічных супярэчнасцяў у грамадстве актывізуецца барацьба паміж сацыяльнымі класамі, якая прыводзіць да *сацыяльных рэвалюцый*, што становяцца непасрэдным штуршком змены фармацый.

Да моцных бакоў фармацыйнага падыходу трэба аднесці тое, што ён упершыню ў гісторыі сацыяльна-філасофскіх канцэпцый пераадолеў ідэалістычную метадалогію, сцвердзіў агульнасць чалавечай гісторыі, непазбежнасць агульнасусветнага прагрэсу. Але гэты падыход:

а) перабольшваў ролю эканомікі і неадаацэньваў значэнне іншых сфер грамадскага жыцця;

б) абсалютызаваў фактар адзінства чалавечай гісторыі (тыпы фармацый вылучаліся пераважна на аснове аналізу еўрапейскай гісторыі, у той час як на іншых кантынентах вылучэнне падобных тыпаў уяўляецца складаным;

в) абсалютызаваў класавую барацьбу як фактар сацыяльнай дынамікі;

г) галоўную ролю ў аналізе фармацый надаваў аб'ектыўным фактарам і недаацэньваў значэнне суб'ектыўных фактараў.

3) *Канцэпцыі тэхналагічнага дэтэрмінізму* (Д. Бел, Э. Тофлер і г.д.). У межах дадзенага падыходу вылучаюцца стадыі гістарычнага развіцця ў залежнасці ад панавання на пэўным этапе тых ці іншых тыпаў тэхналогій. У адпаведнасці з гэтым вылучаюць, як правіла, тры тыпы грамадства: аграрнае (даіндустрыяльнае), індустрыяльнае, постіндустрыяльнае.

*Аграрнае (даіндустрыяльнае) грамадства* характарызуюць:

- вядучая роля сельскай гаспадаркі ў эканоміцы;
- перавага натуральнай гаспадаркі;
- непасрэдны прымус як галоўны сродак ажыццяўлення сацыяльнай улады;
- наяўнасць саслоўнай іерархіі;
- панаванне аўтарытэтаў і традыцый у якасці галоўнага рэгулятара міжасабістых і грамадскіх адносін;
- павольнае развіццё тэхнічнага прагрэсу і яго другасная роля ў працэсах сацыяльнай дынамікі.

*Індустрыяльнае грамадства* мае наступныя характарыстыкі:

- вядучая роля прамысловасці ў структуры эканомікі;
- прыярытэт таварна-грашовых адносін;
- пераўтварэнне капітала ў асноўны інструмент ажыццяўлення сацыяльнай улады;
- фарміраванне нацый і нацыянальных дзяржаў;
- узнікненне дэмакратычных палітычных інстытутаў;
- пераўтварэнне права ў асноўны рэгулятар грамадскіх адносін;
- урбанізацыя;
- пераўтварэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу ў асноўны фактар развіцця грамадства.

*Постіндустрыяльнае грамадства* характарызуецца наступнымі рысамі:

- пераўтварэнне навуковых ведаў і інфармацыі ў галоўную крыніцу развіцця эканомікі і важнейшы вытворчы рэсурс;

- пераўтварэнне сферы паслуг у вядучую галіну эканомікі;

- стварэнне інтэлектуалізаванай тэхнікі (аўтаматыка, кампутарныя тэхналогіі);

- развіццё сацыяльнай мабільнасці, павелічэнне значэння ў сацыяльнай структуры тэхнічных спецыялістаў;

- глабалізацыя ў розных сферах грамадскага жыцця.

***Нелінейныя падыходы*** ўвасабляе, галоўным чынам, цывілізацыйны падыход.

*Цывілізацыйны падыход* фарміруецца ў еўрапейскай сацыяльна-гуманітарнай думцы ў 19-20 стст. (М. Данілеўскі, А. Тойнбі, О. Шпенглер). У ім у якасці асноўнай адзінкі сацыяльнага быцця вылучаецца цывілізацыя. *Цывілізацыя* – гэта ўстойлівая культурна-гістарычная супольнасць людзей, якая адрозніваецца агульнасцю эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага, духоўнага жыцця, наяўнасцю агульных геаграфічных межаў. Розныя даследчыкі налічваюць ад 8 да 21 цывілізацыі. Да гэтага часу адсутнічаюць адзіныя крытэрыі вылучэння цывілізацый. У аснову аналізу звычайна ставяцца рысы культуры, а эканамічныя і палітычныя асаблівасці прасочваюцца не толькі колькасна, але і змястоўна. Даследчыкі на прыкладзе жыцця культур адрозніваюць агульныя стадыі, якія праходзяць цывілізацыі: нараджэнне, росквіт, заняпад ці вясна, лета, восень, зіма.

Прадстаўнікі дадзенага падыходу вылучаюць, як правіла, два асноўныя тыпы цывілізацый:

*Усходні*, для якога характэрныя:

- традыцыяналізм;

- вялікі ўплыў рэлігіі на грамадскае жыццё;

- вызначальная роля дзяржаўных інстытутаў у розных сферах жыцця грамадства;

- калектывізм;

- перавага практычных ведаў над тэарэтычнымі.

*Заходні*, для якога характэрныя:

- рацыянальнасць, арыентаваная на змяненне свету і чалавека ў адпавведнасці з чалавечымі патрэбамі і інтарэсамі;

- спалучэнне інтарэсаў дзяржавы і асобы ў развіцці грамадства;

- панаванне прыватнай уласнасці;

- індывідуалізм;

- арыентацыя на прагрэс грамадства;

- спалучэнне тэарэтычных і практычных ведаў ў форме навукі.

**У.4. Перыядызацыя гісторыі Беларусі.**

Падзел усяго гістарычнага працэсу на пэўныя кавалкі часу згодна з вызначанымі крытэрыямі называецца *перыядызацыяй*. Вылучаюцца некалькі асноўных падходаў да перыядызацыі: палітычная, фармацыйная, універсальная.

*Палітычная перыядызацыя* вылучае перыяды згодна з існаваўшымі на тэрыторыі Беларусі дзяржавамі (В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, І. Лойка):

Полацкае княства (9-13 стст.);
Вялікае княства Літоўскае (сярэдзіна 13 ст. – 1569 г.);
Рэч Паспалітая (1569 – 1795 гг.);
Расійская імперыя (1795 – 1917 гг.);
Савецкая дзяржаўнасць (1917 – 1991 гг.);
незалежная Рэспубліка Беларусь (з 1991 г.).

*Фармацыйная перыядызацыя* была пануючай у савецкай гістарычнай навуцы; згодна з ёй вылучаюцца перыяды гісторыі Беларусі ў адпаведнасці з панаваннем той ці іншай фармацыі:
першабытнае грамадства (да 9 ст.);
феадальнае грамадства (9 ст. – 1861 г.);
капіталістычнае грамадства (1861 – 1917 гг.);
сацыялістычнае грамадства (з 1917 г.).

*Універсальная перыядызацыя* падзяляе гістарычны працэс ва ўсім свеце на наступныя кавалкі:
першабытнае грамадства (3.5 млн. гадоў назад – 5ст. н.э.);
Сярэднія вякі (5 – 15 стст.);
Новы час (16 ст. – 1918 г.);
Найноўшы час (1918 г. (канец Першай сусветнай вайны) – да сённяшняга дня).

*Першабытнае грамадства;* характарыстыка:
- панаванне абшчыннага тыпу грамадскага ўладкавання;
- выкарыстанне прымітыўных тэхналогій ў гаспадарцы;
- панаванне традыцый ў сацыяльным жыцці.

*Сярэднія вякі*; характарыстыка:
- фарміраванне класавага грамадства і ўзнікненне дзяржаўнасці;
- развіццё феадальнай сістэмы, карпаратыўнасць сацыяльнага жыцця;
- перавага сельскай гаспадаркі ў эканоміцы;
- панаванне рэлігіі і традыцый у духоўнай сферы жыцця грамадства.

*Новы час*; характарыстыка:
- цэнтралізацыя і фарміраванне нацыянальных дзяржаў;
- індустрыялізацыя, хуткае развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу;
- генезіс і зацвярджэнне капіталістычных адносін;
- урбанізацыя;
- фарміраванне свецкіх культурных каштоўнасцяў.

*Навейшы час*; характарыстыка:
- глабалізацыя;
- навукова-тэхнічная рэвалюцыя;
- фарміраванне постіндустрыяльнага, інфармацыйнага грамадства.

**Асноўныя паняцці:**

гісторыя, аб’ект, прадмет, функцыі, метадалогія, прынцыпы, метады, гістарызм, аб’ектыўнасць, сістэмнасць, гісторыка-генетычны метад, гісторыка-параўнальны метад, гісторыка-тыпалагічны метад, гісторыка-сістэмны метад, крыніцы гістарычнай навукі, лінейныя і нелінейныя

падыходы, фармацыя, цывілізацыя, аграрнае грамадства, індустрыяльнае грамадства, постіндустрыяльнае грамадства, перыядызацыя, першабытнае грамадства, Сярэднія вякі, Новы час, Навейшы час.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Назавіце прадмет і аб’ект гістарычнай навукі.
2. У чым заключаюцца асноўныя адрозненні гісторыі ад прыродазнаўчых і іншых сацыяльна-гуманітарных навук?
3. Якія функцыі выконвае гісторыя як навука?
4. Што такое метадалогія навукі?
5. Што з сябе ўяўляюць прынцыпы і метады навукі?
6. Назавіце асноўныя прынцыпы гістарычнай навукі і вызначце іх сутнасць.
7. Вызначце асноўныя метады гістарычнай навукі і дайце іх характарыстыку.
8. Якія Вам вядомыя асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі? Укажыце адрозненні паміж імі.
9. Чым характарызуецца фармацыйны падыход да вывучэння гісторыі? Вызначце моцныя і слабыя бакі дадзенага падыходу.
10. Вызначце спецыфіку тэхналагічнага дэтэрмінізму пры вывучэнні гісторыі. Дайце параўнальную характарыстыку аграрнага, індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадства.
11. У чым спецыфіка цывілізацыйнага падыходу? У чым палягае яго карэннае адрозненне ад лінейных падыходаў?
12. Што такое цывілізацыя і якія іх тыпы Вы ведаеце?
13. Якія Вам вядомыя перыядызацыі гісторыі Беларусі?
14. Вызначце асноўныя рысы гістарычных стадый паводле ўніверсальнай перыядызацыі.
15. Паразважайце, якая з вызначаных перыядызацый гісторыі Беларусі падаецца Вам набольш абгрунтаванай.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Гісторыя ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук.
2. Фарміраванне і развіццё прынцыпу гістарызму ў гістарычнай навуцы.
3. Канцэпцыя “трох хваляў” у развіцці гісторыі Э. Тофлера.
4. Цывілізацыйная канцэпцыя А. Тойнбі.
5. Фарміраванне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі.

## Модуль 1. Цывілізацыйная спадчына Старажытнага свету, сярэдніх вякоў і Беларусь.

### Тэма 1: Першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі.

1. **Каменны век на тэрыторыі Беларусі.**
2. **Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі.**

3. **Жалезны век на тэрыторыі Беларусі.**
4. **Першабытны лад і рэлігія на тэрыторыі Беларусі.**

У ходзе *антрапагенэзу* (фарміравання чалавека сучаснага тыпу) на аснове археалагічных знаходак навукоўцы вылучаюць наступныя этапы:

*Аўстралапітэк* (4-3 млн. гадоў назад);

*Архантрап* (2-0,5 млн. гадоў назад);

*Неандэрталец* (500-50 тыс. гадоў назад);

*Краманьёнец* (чалавек сучаснага тыпу) (ад 40 тыс. гадоў назад).

У гісторыі першабытнага грамадства ў залежнасці ад выкарыстання таго ці іншага матэрыялу для вырабу прылад працы вылучаюць тры асноўныя перыяды:

1) каменны век;

2) бронзавы век;

3) жалезны век.

У розных рэгіёнах свету храналагічныя межы гэтых перыядаў адрозніваліся.

На тэрыторыі Беларусі з'яўленне першых людзей датуецца перыядам 100 – 40 тыс. гг. да н.э.

**1.1. Каменны век на тэрыторыі Беларусі.**

Паводле выкарыстання асноўнага матэрыялу, з якога людзі рабілі прылады працы, археолагі першым перыядам у гісторыі чалавецтва называюць ***каменны век*** (храналагічныя межы на тэрыторыі Беларусі: 100-40 – 2 тыс. да н.э.). У сваю чаргу каменны век падзяляюць на тры перыяды:

палеаліт (ранні каменны век; 100-40 – 10 тыс. да н.э.);

мезаліт (сярэдні каменны век; 10 – 5 тыс. да н.э.);

неаліт (позні каменны век; 5 – 3 тыс. да н.э.).

***Палеаліт*** (100-40 – 10 тыс. да н.э.).

У гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі перыядычна наступае і адыходзіць ледавік, пануе арктычны клімат. Прыблізна ***100-40 тыс. гг. да н.э.*** на тэрыторыю Беларусі прыходзяць першыя людзі. Гэта былі *неандэртальцы*. Паводле сваіх фізіялагічных параметраў яны ўяўлялі з сябе людзей з сучасным памерам і будовай мозгу, але былі больш нізкарослыя, мускулістыя, з вялікімі надброўнымі дугамі і слабавыражанай сківіцай. Аб пранікненні неандэртальцаў на тэрыторыю Беларусі сведчаць археалагічныя знаходкі каля вёсак Свяцілавічы, Абідавічы, Бердыж. Яны карысталіся грубаабабітымі прыладамі працы – вастраканечнікамі, рубіламі, нажамі і іншымі, навучыліся паляваць на маманта, здабываць агонь, будаваць прымітыўнае жытло са скур жывёл. Наступленне новага ледавіку спыніла пражыванне неандэртальцаў на тэрыторыі Беларусі.

Прыблізна 40 – 30 тыс. гг. да н.э. адбываецца адліга і на поўдзень тэрыторыі Беларусі прыходзяць *краманьёнцы*, якія ствараюць стаянкі каля в. *Юравічы* (26 тыс. гг. да н.э.) і *Бердыжа* (23 тыс. гг. да н.э.). У гэты перыяд людзі жылі на невялікіх стаянках па 20-30 чалавек у шалашах і паўзямлянках,

якія пакрывалі скурамі і насцiламі з дрэва. Іх асноўнымі прыладмі працы былі скрэблы, праколкі, рубілы, наканечнікі дзідаў і г.д. Асноўныя матэрыялы, з якіх яны вырабляліся – косткі жывёл, дрэва, камяні і крэмень. Выкарыстоўваўся агонь.

Галоўнымі відамі заняткаў насельніцтва з’яўляліся *загоннае паляванне* на буйных жывёл і *збіральніцтва*. Паляванне ажыццяўлялася калектыўна на мамантаў, паўночных аленяў, шарсцістых насарогаў, тураў, якіх заганялі ў ямы-пасткі і забівалі камянямі і грубаапрацаванымі сякерамі, коп’ямі.

У перыяд палеаліту складваецца першы тып сацыяльнай арганізацыі людзей – *родавая абшчына*. Род (аб’яднанне людзей аднаго паходжання, што пражываюць на вызначанай тэрыторыі) меў агульныя прыкметы:

- адзінства паходжання;
- агульная (калектыўная) ўласнасць на сродкі і вынікі працы.

Радство ў межах абшчыны вылічвалася, як правіла, па жаночай лініі (*матрыярхат*). Гэта пацвярджаецца наскальным роспісам і “неалітычнымі Венерамі” (лічацца скульптуркамі жаночых багінь-абярэгаў).

Прыкладна 18 – 10 тыс. гг. да н.э. на тэрыторыі Беларусі адбылося новае абледзяненне, якое прывяло да адыходу людзей.

***Мезаліт (10 – 5 тыс. да н.э.)***

На пачатку гэтага перыяду ледавік канчаткова адыйшоў і на тэрыторыі Беларусі сфарміравалася рачная і азёрная сетка, выраслі лясы, склаўся сучасны раслінны і жывёльны свет. Тэрыторыя была цалкам заселена, увайшла ў *айкумену* – паверхню Зямлі, дзе жыве чалавек.

Вядома каля 120 стаянак гэтага перыяду, на якіх пражывала каля 4,5-6 тыс. чалавек. Амаль усе яны знаходзіліся на берагах рэк, каля радовішчаў крэменю. Мезалітычныя стаянкі былі невялікія па памерах, складаліся з шалашоў і зямлянак. Асноўнымі заняткамі насельніцтва з’яўляліся паляванне, збіральніцтва, *рыбалоўства*. Да ліку асноўных вынаходніцтваў дадзенага перыяду належаць:

- *лук і стрэлы* (дзякуючы ім паляванне набывае індывідуальны характар);
- касцяныя кручкі і гарпуны, драўляныя чоўны (дзякуючы ім узнікае рыбалоўства);
- выраб састаўных прылад працы;
- прыручэнне сабакі.

Асноўнымі відамі матэрыялу для вырабу прылад працы заставаліся крэмень, косткі і дрэва.

У сацыяльнай арганізацыі грамадства ўмацоўваецца родавая абшчына.

***Неаліт (5 – 3 тыс. да н.э.).***

Да гэтага перыяду вядомыя каля 500 стаянак на тэрыторыі Беларусі, насельніцтва якіх налічвала каля 27-36 тыс. чалавек. Асноўнымі заняткамі насельніцтва застаюцца паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва. У той жа час удасканальваюцца прылады працы за кошт новых тэхналогій апрацоўкі крэменю: *шліфаванне, свідраванне, паліраванне*. Гэта дазволіла ствараць больш якасныя прылады працы; асабліва палепшыліся магчымасці выкарыстання сякер, якія з гэтага часу не прывязваліся да дрэўка, а

насаджваліся на яго. Павялічваюцца памеры здабычы крэменю, ствараюцца шматлікія *шахты* для здабычы крэменю. Пад в. Краснаселле Ваўкавыскага раёну археолагі знайшлі больш 1000 шахтаў па здабычы крэменю, якія заглыбляліся ў крэйду на 5-8 метраў.

Узнікаюць новыя віды дзейнасці – *ткацтва* і *ганчарства*. У выніку ўзнікаюць адзенне з тканіны, гліняны ляпны посуд з вострым дном і г.д. У рыбалоўстве на змену выкарыстання гарпуна прыйшлі вуда, кручок і рыбалоўныя сеткі. Асноўныя тыпы жытла ў перыяд неаліту – паўзямлянкі і наземныя жытлы слупавой канструкцыі. З'яўляюцца першыя формы міжрэгіянальнага абмену.

Перыяд неаліту ў сусветным маштабе характарызуецца такой з'явай як *неалітычная рэвалюцыя* – працэс пераходу ад прысвойваючай гаспадаркі (паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва) да вытворчай. Першымі формамі вытворчай гаспадаркі з'явіліся земляробства і жывёлагадоўля. На паўднёва-заходняй тэрыторыі сучаснай Беларусі з 4 тыс. да н.э. пачынаецца станаўленне *матычнага земляробства* (сеялі ячмень, лён) і *жывёлагадоўлі* (прыручаны буйная рагатая жывёла, свінні). На астатняй тэрыторыі да канца неаліту пераважае прысвойваючая гаспадарка.

У сацыяльнай арганізацыі грамадства назіраецца росквіт родавай абшчыны. Павелічэнне прадуктаў харчавання ў выніку ўдасканалення прылад працы прыводзіць да пераходу ад ураўняльнага размеркавання ў межах роду да *размеркавання згодна звычаю*. Гэта азначала, што лепшы паляўнічы ці рыбалоў мог пакінуць сабе большую і лепшую частку здабычы. Разрастанне родаў прыводзіць да іх падзелу і ўзнікнення *плямёнаў* – аб'яднанняў некалькіх родаў, якія маюць агульнае паходжанне. Плямёны адрозніваюцца пэўнай агульнасцю матэрыяльнай і духоўнай культуры. Плямёны або аб'яднанні плямён эпохі неаліту атаясамліваюцца з пэўнымі *археалагічнымі культурамі*. Адрозненні археалагічных культур атаясамліваюцца перш за ўсё з формай і арнаментам глінянай керамікі, якія мелі сваю спецыфіку ў розных плямёнаў. Большасць даследчыкаў лічыць, што з 3 тыс. да н.э. на поўначы і на ўсходзе тэрыторыі Беларусі пераважаюць *фіна-угорскія плямёны*.

*Такім чынам, на працягу каменнага веку на тэрыторыі Беларусі адбываецца фарміраванне чалавечага грамадства, замацоўваюцца асноўныя формы яго прысвойваючай гаспадаркі (паляванне, збіральніцтва, рыбалоўства) і сацыяльнай арганізацыі (родавая абшчына).*

### 1.2. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі.

На Блізкім Усходзе і ў Індыі бронзавы век пачынаецца прыкладна ў 5 тыс. да н.э. На тэрыторыі Беларусі яго храналагічныя межы: *2 – пачатак 1 тыс. да н.э.*

Пачатак перыяду звязваецца з прыходам на тэрыторыю Беларусі вандроўных жывёлаводаў – *індаеўрапейцаў*. Радзіма індаеўрапейцаў – Малая Азія (сучасная Турцыя). З канца 2 тыс. да н.э. яны пачынаюць масавае перасяленне. Індаеўрапейцы былі ваяўнічымі плямёнамі, выкарыстоўвалі коней і валоў у якасці цяглай сілы ў земляробстве і міграцыях. Карысталіся

коламі, вазамі, калясніцамі, баявымі сякерамі і мячамі. Так гэтыя плямёны рассяліліся на вялікай тэрыторыі – ад Індыі да Атлантычнага акіяна.

Індаеўрапейскае засяленне прывяло да таго, што асноўнымі заняткамі насельніцтва становяцца *жывёлагадоўля* і *лядна-агнявое і матычнае земляробства*. Сутнасць апошняга была ў тым, што лясную дзялянку спачатку высякалі, пні карчавалі, потым іх спальвалі, баранавалі зямлю і на ўзбагачанай попелам глебе засявалі земляробчыя культуры на працягу 4-5 год; потым зноў праводзілі такую ж аперацыю на новым участку. Глебу апрацоўвалі матыкай, а таксама *ралам* (правобразам плуга), у які ўпрагалі валоў ці каня. Асноўнымі земляробчымі культурамі былі пшаніца, ячмень, авёс, проса, гарох, бабы. Паляванне, збіральніцтва і рыбалоўства пераўтвараюцца ў дапаможныя віды заняткаў.

Асноўныя прылады працы па-ранейшаму выраблялісяз крэменю. *Бронзавых рэчаў* было мала, у асноўным гэта зброя і ўпрыгожванні. Паколькі асноўныя радовішчы медзі і волава знаходзіліся далёка ад тэрыторыі Беларусі (Каўказ, Карпаты), гэта вымушае насельніцтва Беларусі ўключыцца ў міжнародны абмен і гандаль. На тэрыторыі Беларусі для гаспадарчых патрэбаў выкарастоўвалі каменныя прылады, а для ўпрыгожанняў і рэлігійных патрэб – бронзавыя, таму некаторыя навукоўцы лічаць, што тут быў змешаны каменна-бронзавы век (*энеаліт*).

Складванне вытворчай гаспадаркі стымулявала пераход да аседлага ладу жыцця. Замест аднакамерных жылых пабудоў (паўзямлянак ці наземных жытлаў) зараз будуюць двухкамерныя жытлы. З’явіліся лавы і сталы, керамічны посуд з плоскім дном, што ставіўся на сталы і плоскі ачаг.

Істотныя змены адбываюцца ў *сацыяльнай арганізацыі грамадства*. Земляробства, жывёлагадоўля, а таксама войны, якія выклікалі амаль пастаянныя сутычкі індаеўрапейцаў з мясцовым насельніцтвам спрыялі таму, што на першае месца ў сацыяльнай іерархіі выходзіць мужчына. Узнікае *патрыярхат* – галоўным у родзе становіцца мужчына; род лічыцца па бацькоўскай лініі.

Роды пачынаюць падзяляцца на *вялікія патрыярхальныя сем’і* са сваякоў 2-4 пакаленняў; пры захаванні родавай уласнасці на зямлю карыстанне ёю ажыццяўляецца асобнымі вялікімі патрыярхальнымі сем’ямі; жывёла, жытло, прылады працы і быту, зброя становяцца ўласнасцю асобных сем’яў. Узнікае *сацыяльная няроўнасць*: з’яўляюцца больш багатыя і бедныя роды і сем’і; асабліва ўзрастае статус і багацце ваенных правадыроў і старэйшын плямёнаў. У той жа час асноўныя пытанні жыцця роду ці племені вырашаліся на агульных сходах узброеных мужчын; такі лад сацыяльна-палітычнай арганізацыі атрымаў назву “*ваенная дэмакратыя*”.

Індаеўрапейцы паступова асімілявалі мясцовае насельніцтва. У археалагічным плане раннія індаеўрапейцы атаясамліваюцца з *культурамі баявых сякер або шнуравой керамікі*. Пазней культуры шнуравой керамікі падзяляюцца на шэраг рэгіянальных культур. У другой палове 2 тыс. да н.э. яны аб’ядналіся ў *тшцінецкую культуру*.

На поўначы Беларусі пераважае *паўночнабеларуская культура.* Яна прадстаўляла даіндаеўрапейскае, відавочна, фіна-угорскае, насельніцтва, якое займалася пераважна паляваннем і збіральніцтвам.

*Такім чынам, на працягу бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі адбываецца пераход да вытворчай гаспадаркі ў формах земляробства і жывёлагадоўлі, фарміруецца патрыярхальная родавая абшчына, замацоўваецца перавага індаеўрапейскіх культур.*

### 1.3. Жалезны век на тэрыторыі Беларусі.

***Жалезны век*** на тэрыторыі Беларусі ахоплівае перыяд 8-7 стст. да н.э. – 8 ст. н.э. У гэты перыяд асноўным матэрыялам для вырабу прылад працы становіцца *жалеза*, якое выплаўлялася з мясцовай балотнай руды ў невялікіх гліняных печах. З дапамогай жалезных вырабаў удасканальваюцца прылады працы земляробства (наканечнікі для ралаў), ткацтва, ганчарства, пляцення, зброя. Узнікае *кавальства* як асобны від рамяства.

Вынікам становіцца рост прадукцыйнасці працы. Земляробства і жывёлагадоўля канчаткова замацоўваюцца ў якасці асноўных форм гаспадарання. У некаторых раёнах на змену лядна-агнявому прыходзіць *ворыўнае земляробства.* Распаўсюджваецца рэгіянальны абмен паміж рознымі плямёнамі. Гаспадарка і матэрыяльная культура на поўдні Беларусі ў жалезным веку адчувалі значны ўплыў з боку больш развітых суседніх рэгіёнаў старажытнаеўрапейскай цывілізацыі. Тут знойдзены скіфскія і кельцкія жалезныя вырабы, антычныя манеты і амфары. У цэнтры і на поўначы Беларусі матэрыяльная культура развівалася больш запаволена.

Да пачатку жалезнага веку ў грамадскім жыцці канчаткова ўсталяваўся *патрыярхат.* У сацыяльнай арганізацыі грамадства паступова адбываецца *разлажэнне родавай абшчыны*, пра што сведчаць наступныя з’явы:

- разам з вялікімі патрыярхальнымі сем’ямі ўзнікаюць *малыя патрыярхальныя сем’і* (бацька, маці і дзеці), якія маюць асабістую гаспадарку пры агульнай уласнасці абшчыны на зямлю;
- у склад абшчыны пачынаюць уваходзяць прадстаўнікі розных родаў; сувязі паміж абшчыннікамі становяца не кроўна-роднаснымі, а суседскімі;
- узмацняецца *сацыяльная няроўнасць*; значна павялічваецца роля ў кіраванні плямёнамі ваенных правадыроў і рода-племянных старэйшын.
- узнікае *патрыярхальнае рабства.*

Павелічэнне агульнай колькасці насельніцтва, рост выпрацаванай грамадствам прадукцыі і маёмаснае расслаенне абумовілі абвастрэнне ўзброеных сутычак паміж рознымі плямёнамі за зямлю і матэрыяльныя каштоўнасці. У гэтых умовах узнікае новы тып паселішчаў – *гарадзішчы*, у якіх знаходзілася сядзіба ваенных правадыроў і дзе насельніцтва хавалася падчас ваенных сутычак. Крыху пазней з’явіліся *селішчы* – неўмацаваныя пасёлкі земляробаў, але яны, як правіла, знаходзіліся побач з гарадзішчамі. Жылыя пабудовы сталі больш разнастайныя, побач з імі размяшчаліся гаспадарчыя збудаванні.

У жалезным веку завяршаецца працэс асіміляцыі мясцовага насельніцтва індаеўрапейцамі. Адбываецца дыферэнцыяцыя індаеўрапейскіх этнічных груп: балты, славяне, германцы, кельты і г.д. На тэрыторыі Беларусі складваецца некалькі асноўных археалагічных культур:

*мілаградская культура* (7-3 стст. да н.э.); *зарубінецкая культура* (3 ст. да н.э. – 2 ст. да н.э.); *кіеўская культура* (2-6 стст.) – поўдзень Беларусі;

*паморская культура* – паўднёвы захад Беларусі;

*культура штрыхаванай керамікі* (7 ст. да н.э. – 5 ст. н.э.) – захад і цэнтр Беларусі;

*днепра-дзвінская культура* (7 ст. да н.э. – 5 ст. н.э.) – поўнач Беларусі.

Культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінскую большасць навукоўцаў залічваюць да *балтаў*. Паморская культура разглядаецца пераважна як *славянская*. Адносна культур на поўдні Беларусі сярод даследчыкаў няма адзінства: адны лічаць іх славянамі, другія балтамі, трэція прамежкавымі этнічнымі групамі паміж балтамі і славянамі.

У 4–8 стст. у Еўропе адбываецца працэс, які атрымаў назву "*Вялікае перасяленне народаў*", які суправаджаўся перамяшчэннем вялікіх мас насельніцтва. У 2–4 стст. праз тэрыторыю паўднёва-заходняй часткі Беларусі праходзілі германскія плямёны *готаў і гепідаў*. У 5–6 стст. пачынаецца працэс пранікнення *славянскіх плямёнаў*. Прарадзімай славян лічыцца Вісла-Одэрскае міжрэчча (тэрыторыя сучаснай Польшчы), а таксама прылеглая частка лясной зоны (паўднёвы захад сучаснай Беларусі і паўночны захад сучаснай Украіны). З 5-6 стст. частка славянскіх плямёнаў перасяляецца на поўдзень (Балканы), частка – на ўсход і поўнач.

У 5-8 стст. на тэрыторыі Беларусі складваюцца новыя археалагічныя культуры:

*пражская* – на поўдні;

*банцараўская* – на захадзе і ў цэнтры;

*калочынская* – на ўсходзе.

Пражская культура лічыцца навукоўцамі славянскай. Банцараўская і калочынская культуры лічацца балцкімі, але ў іх прысутнічаюць моцныя славянскія элементы (тып жылля – паўзямлянка з вогнішчам у дальнім вугле; простая карычневая кераміка без арнаменту; пахаванні ў паўсферычных курганах).

У 8-9 стст. пачынаецца масавае засяленне тэрыторыі Беларусі *славянамі* і заваяванне імі мясцовага балцкага насельніцтва. Гэты працэс расцягнуўся на многія стагоддзі; яго вынікам стала тое, што славяне падначалілі балтаў палітычна, а таксама паступова асімілявалі ў культурным плане. У гэтым працэсе славянам спрыялі іх большая скансалідаванасць, вышэйшы ўзровень развіцця гаспадаркі, больш развітыя сацыяльна-эканамічныя структуры. У славян у большай ступені, чым у балтаў праяўлялася разлажэнне родавай абшчыны, узвышэнне правадыроў і знаці, што стварала перадумовы расслаення грамадства. Неабходнасць утрымання пад уладай падначаленага насельніцтва садзейнічала ўзмацненню ўлады знаці і ўтварэння дзяржаў.

*Такім чынам, у жалезным веку на тэрыторыі Беларусі канчаткова замацоўваецца вытворчая гаспадарка, адбываецца разлажэнне сацыяльных інстытутаў рода-племяннога грамадства і ствараюцца перадумовы пераходу да сацыяльна разнароднага грамадства і дзяржаўнасці.*

**1.4. Першабытны лад і рэлігія на тэрыторыі Беларусі.**

Зыходзячы з дадзеных археалогіі і антрапалогіі, якая вывучае даіндустрыяльныя грамадствы сучаснасці, у першабытных людзей ужо з часоў палеаліту існавалі *рэлігійныя вераванні*. Даказана існаванне рэлігіі і пахавальнага культу ў неандэртальцаў (яны клалі ў магілы ежу, кветкі, зброю і г.д.). З прыходам славян у познім жалезным веку пашырылася традыцыя крэмацыі; толькі з замацаваннем хрысціянства вярнуліся да трупапакладання.

*Формамі першабытнай рэлігіі* былі:

- *татэмізм* – вера ў звышнатуральную сувязь паміж чалавекам і прадстаўнікамі жывёльнага і расліннага свету, паходжанне роду ад гэтых прадстаўнікоў (напр., імёны і плямёны індзейцаў);
- *фетышызм* – вера ў звышнатуральныя якасці прыродных аб’ектаў (напр., пакланенне камяням, дрэвам), а таксама ў сувязь чалавека і прадмета (напр., шчаслівая дзіда);
- *анімізм* – вера ў існаванне душы, духаў у прыродзе і чалавеку;
- *магія* – вера ў магчымасць уздзеяння на прыродныя аб’екты і людзей з дапамогай асаблівых дзеянняў (напр. замовы, праклёны і г.д.).

У канцы бронзавага і жалезным веку рэлігійныя вераванні індаеўрапейскага насельніцтва набываюць больш сістэматызаваны выгляд. У жалезным веку ў балтаў і славян фарміруецца *політэізм* – рэлігія, заснаваная на веры ў шматлікіх багоў. Ствараецца *пантэон паганскіх (язычніцкіх) багоў*, галоўнымі з якіх з’яўляліся *Пярун* (бог грому, маланкі і вайны)*, Велес* (бог – абаронца хатняй жывёлы і дабрабыту)*, Ярыла* (бог сонца)*, Сварог* (бог неба), *Цёця, Лада, Купала* і інш. Кожнаму богу прыносіліся ахвяры, былі прысвечаны асобныя мясціны (крыніцы, валуны), святы і абрады, некаторыя з якіх дагэтуль шануюцца беларусамі (Купала, Каляды, Масленіца і г.д.). Фарміруецца спецыяльная праслойка служыцеляў рэлігійнага культу – *вешчуноў*.

*Такім чынам, у першабытным грамадстве адбываецца фарміраванне рэлігійных вераванняў і культу, паступова складваецца політэістычная язычніцкая рэлігія.*

**Асноўныя паняцці:**

Антрапагенэз, неандэрталец, краманьёнец, ледавік, палеаліт, паляванне, збіральніцтва, родавая абшчына, матрыярхат, мезаліт, рыбалоўства, неаліт, ткацтва, ганчарства, неалітычная рэвалюцыя, археалагічныя культуры, фіна-угры, бронзавы век, індаеўрапейцы, жывёлагадоўля, лядна-агнявое земляробства, энеаліт, патрыярхат, вялікія патрыярхальныя сем’і, “ваенная дэмакратыя”, жалезны век, ворыўнае земляробства, малыя патрыярхальныя сем’і, тэрытарыяльная (суседская) абшчына, гарадзішчы, селішчы, балты,

славяне, “Вялікае перасяленне народаў”, татэмізм, фетышызм, анімізм, магія, політэізм, пантэон.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Калі і дзе ўпершыню з’явіліся людзі на тэрыторыі Беларусі?
2. Ахарактарызуйце асноўныя рысы жыцця і заняткі людзей на палеалітычных стаянках.
3. Што такое родавая абшчына? Які характар мела родавая абшчына ў каменным веку?
4. Якія змены адбываюцца ў занятках людзей і сацыяльнай арганізацыі ў перыяд мезаліту?
5. Якія Вам вядомыя асноўныя тэхнічныя вынаходніцтвы перыяду мезаліту?
6. Якія новыя віды дзейнасці з’яўляюцца ў насельніцтва Беларусі ў перыяд неаліту?
7. Што такое “неалітычная рэвалюцыя”? Калі яна пачынаецца на тэрыторыі Беларусі?
8. Якія змены адбываюцца ў сацыяльнай арганізацыі грамадства на тэрыторыі Беларусі ў перыяд неаліту?
9. Калі на тэрыторыі Беларусі пачынаецца бронзавы век? У чым яго спецыфіка на дадзенай тэрыторыі? Што такое энеаліт?
10. Хто такія індаеўрапейцы? Якім чынам адбываецца працэс засялення тэрыторыі Беларусі індаеўрапейцамі?
11. Якія Вам вядомыя тэхнічныя вынаходніцтвы індаеўрапейцаў?
12. Якія формы гаспадарання замацоўваюцца на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым веку?
13. Якія змены адбываюцца ў сацыяльнай арганізацыі грамадства ў бронзавым веку?
14. Да якіх сацыяльна-эканамічных вынікаў прыводзіць распаўсюджанне жалеза ў якасці асноўнага матэрыялу для вырабу прылад працы?
15. Якія з’явы сведчаць пра працэсы разлажэння родавай абшчыны ў жалезным веку?
16. Якія Вы ведаеце асноўныя археалагічныя культуры ў жалезным веку?
17. Што такое “Вялікае перасяленне народаў”? Якім чынам яно закранула землі Беларусі?
18. Вызначце фактары, якія спрыялі заваяванню і асіміляцыі славянамі балцкага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў другой палове 1 тыс.?
19. Назавіце асноўныя формы першабытнай рэлігіі.
20. Што такое політэізм? Калі адбываецца яго фарміраванне на тэрыторыі Беларусі?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Жыццё людзей на палеалітычных стаянках.
2. Краснасельскія шахты, іх станаўленне і развіццё.
3. Індаеўрапейцы: прарадзіма, гісторыя перасялення.

4. Ганчарства і ляпны посуд у бронзавым і жалезным веку.
5. Балты і славяне ў жалезным веку.
6. Гарадзішчы на тэрыторыі Беларусі.
7. Фарміраванне пантэона багоў ў насельніцтва Беларусі ў жалезным веку.

## Тэма 2. Раннефеадальныя княствы на тэрыторыі Беларусі 9 – 13 стст.

**1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх земляў у 9 – 13 ст.**

**2. Утварэнне першых княстваў на тэрыторыі Беларусі. Іх палітычнае развіццё і дзяржаўны лад.**

**3. Барацьба супраць крыжацкай і мангола-татарскай агрэсіі.**

**4. Рэлігія і культура беларускіх зямель у 9 – 13 стст.**

У 9-13 стст. на тэрыторыі Беларусі адбываюцца працэсы, характэрныя для ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропы перыяду Сярэднявечча:

- складванне раннефеадальных адносін у эканоміцы і палітыцы;
- аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі і ўзнікненне гарадоў;
- пераход ад родавай да тэрытарыяльнай (суседскай) абшчыны;
- фарміраванне феадальнай дзяржаўнасці;
- прыняцце хрысціянства ў якасці пануючай рэлігіі і пераўтварэнне яе ў вызначальную сілу развіцця духоўнай культуры грамадства.

### 2.1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх земляў у 9 – 13 ст.

Асноўным заняткам большасці насельніцтва ў Сярэднявеччы з'яўляюцца *земляробства* і *жывёлагадоўля*. Асноўнымі відамі земляробства былі *падсечна-агнявое* і *ворыўнае*. Пры першым варыянце выпальваліся і распрацоўваліся надзелы ў лесе (ляды), пры другім – ралля была ў штогадовым засеве, а пазней – у *двухпольным севазвароце*, калі адно поле апрацоўвалася, а другое адпачывала "пад парам". Узнікаюць новыя прылады працы: двухрогая саха з жалезным наканечнікам, серп са стальным навараным лязом, каменныя жорны, драўляныя ступы. Галоўнай сельскагаспадарчай культурай становіцца *жыта*. Дадатковымі былі ячмень, пшаніца, авёс, проса, каноплі, лён і г.д. Галоўныя віды хатняй жывёлы: коні і буйная рагатая жывёла. Дапаможнымі заняткамі насельніцтва былі садаводства, агародніцтва, бортніцтва, лясныя промыслы, ткацтва, прадзенне, апрацоўка скур.

Канчаткова адбываецца пераход ад родавай да *тэрытарыяльнай (суседскай) абшчыны* (*верв*, *грамада*). У склад абшчыны пачынаюць уваходзіць прадстаўнікі розных родаў; сувязі паміж абшчыннікамі становяцца не кроўна-роднаснымі, а суседскімі.

Зямля ў часы першых дзяржаўных утварэнняў належала племені, родавым і суседскім абшчынам. Паступова ў 9 – 13 стст. у межах абшчын адбывалася маёмаснае расслаенне, захоп зямель прыватнымі асобамі. Назіраецца працэс станаўлення феадальных адносін. Пад *феадалізмам* разумеецца сістэма грамадскіх адносін, у аснове якой знаходзіцца прынцып

перадачы зямельных уладанняў вышэйшым уласнікам зямлі ў дзяржаве (князем, каралём) сваім васалам на пэўны час або назаўсёды за пэўныя заслугі. Асноўнымі сацыяльнымі класамі феадальнага грамадства з'яўляюцца *феадалы* (буйныя уладальнікі зямлі) і залежныя ад іх *сяляне*.

Ва ўмовах фарміравання феадалізму князі становяцца ўладарамі не толькі ўсёй зямлі ў дзяржаве, як яе кіраўнікі і "божыя памазанікі", але і ўласных надзелаў. Княскія дружыннікі і заможныя абшчыннікі ў выніку атрымання значных зямельных плошчаў фарміравалі сацыяльны клас феадалаў, які атрымаў ва Ўсходняй Еўропе назву *баярства*.

*Асноўныя шляхі фарміравання феадальнага землеўладання на тэрыторыі Беларусі*:

- падараванні князёў сваім дружыннікам за ваенную або грамадзянскую службу;
- падараванні з боку князёў і баяраў царкве.

*Асноўныя віды феадальнага землеўладання*:

- *княскае*;
- *баярскае*;
- *царкоўнае*.

*Асноўныя тыпы феадальных уладанняў*:

- *вотчына* – уладанне з правам поўнага распараджэння і перадачы па спадчыне;
- *памесце* – уладанне з правам абмежаванага распараджэння без права перадачы па спадчыне на працягу жыцця (дажывотна) або на пэўны час.

Абсалютная большасць сялян–абшчыннікаў (*смердаў*) у дадзены перыяд пражывала на дзяржаўных землях. Устанаўліваецца залежнасць сельскіх абшчын ад князёў, якая адлюстроўвалася ў зборы *даніны* (натуральнай рэнты) з асобных сялянскіх абшчын. Даніна збіралася шляхам перыядычных паходаў князёў са сваімі дружынамі ў *палюддзе*, або асобнымі дружыннікамі, якія атрымлівалі пэўныя тэрыторыі ў "*кармленне*". За абарону з боку князя і дружыны раз у год у вызначаных памерах у *пагосты* (цэнтры пэўных тэрыторый–воласцей) звозіліся прадукты харчавання, мёд, футра і г.д. Аб'ём даніны з асобных сялянскіх двароў размяркоўвала абшчына.

У выніку дамоўленасцяў з уласнікамі і трымальнікамі зямлі, або немагчымасці разлічыцца па павіннасцях і даўгах сяляне траплялі ў часовую, або поўную залежнасць ад феадалаў.

Фарміруюцца *асноўныя катэгорыі залежных сялян*:

- *закупы* – сяляне, якія выконвалі павіннасці на карысць землеўладальніка на пэўны час за пазыку ("купу") прадуктамі або грашыма да моманту разліку;
- *радовічы* – сяляне, якія заключалі дамову з землеўладальнікамі ("рад") на пэўны час з фіксацыяй павіннасцей;
- *ізгоі* – людзі, якія страцілі сувязь са сваімі абшчынамі ў выніку невыканання павіннасцей, нявыплаты пазык ці здзейсненых злачынстваў і жылі за кошт часовых заробкаў;

- *чэлядзь, халопы* – хатнія рабы або кабальныя даўжнікі. Рабамі станавіліся пераважна ваеннапалонныя, дзеці якіх маглі атрымаць свабоду.

Асноўныя павіннасці феадальна залежнага сялянства:

– *дзякло* (натуральны падатак);

– *паншчына* (адпрацоўкі на зямлі феадала).

У разглядаемы перыяд адбываецца *аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі*. Гэты працэс абумовілі наступныя фактары:

– *павелічэнне сельскагаспадарчага прадукту* (у гэтых умовах рамеснікі могуць забяспечыць сябе ўжо выключна вынікамі сваёй прафесійнай дзейнасці, а не сельскай гаспадаркай);

– *удасканаленне промыслаў* (удасканальванне сырадутнага метаду выплаўкі жалеза, з'яўленне ганчарнага кола, печаў для абпальвання керамікі і г.д.), што патрабавала спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў, якія маглі ажыццяўляць толькі адпаведна падрыхтаваныя для пэўнай дзейнасці людзі.

На тэрыторыі Беларусі ў 9 – 13 стст. вядомыя каля 40 відаў рамёстваў. Асноўнымі сярод іх з'яўляліся *апрацоўка жалеза* (вядома 16 спецыяльнасцяў)*, ганчарства, апрацоўка скур, ювелірнае майстэрства, ткацтва, дрэваапрацоўка, будаўнічае рамяство* і г.д.

Развіццё рамяства прыводзіць да фарміравання ў 9 – 12 стст. *гарадоў*. Гарады станавіліся адміністрацыйнымі, рамеснымі, гандлёвымі, абарончымі і рэлігійна-культурнымі цэнтрамі.

*Буйнейшыя гарады гэтага перыяду* (з датамі іх узнікнення):

*Полацк* (862)
*Тураў* (980)
*Ізяслаўль* (988)
*Берасце* (1019)
*Віцебск* (1021)
*Менск* (1067)
*Друцк* (1078)
*Барысаў* (1102)
*Слуцк* (1116)
*Гародня* (1116)
*Навагародак* (1117).

*Асноўныя шляхі фарміравання гарадоў*:

– стварэнне рамесна-гандлёвых пасяленняў вакол замкаў – рэзідэнцый князёў або баяр.

– стварэнне і разрастанне рамесна-гандлёвых пасяленняў вакол абшчынна-племянных цэнтраў – пагостаў.

Сярэднявечны горад паводле сваёй структуры складаўся з дзядзінца, пасада і тарга. На *дзядзінцы* (замку, градзе) пад аховай умацаванняў, знаходзіліся рэзідэнцыі князя, баяр, буйнога купецтва і вышэйшага духавенства. *Пасад* з'яўляўся гандлёва-рамеснай часткай горада; тут жылі людзі "простага стану", асноўнымі заняткамі якіх з'яўляліся рамяство і гандаль, дапаможнымі – агародніцтва, хатняя жывёлагадоўля і г.д. На *таргу* адбываліся гандлёвыя здзелкі і сходы веча.

Адасабленне рамяства ад сельскай гаспадаркі выклікала развіццё пастаяннага *ўнутранага гандлю* – з’явіліся спецыяльныя месцы ў гарадах для вядзення гандлю (таргі). Фарміруецца сацыяльная група *гандляроў – купцоў*. Сярод іх былі дробныя гандляры, якія займаліся гандлем на пэўнай тэрыторыі, і буйныя купцы, якія ажыццяўлялі міжнародны гандаль. На таргі прывозілі тавары таксама замежныя купцы.

Гандаль ажыццяўляўся пераважна па рэках. Праз землі Беларусі праходзіла адна з галін міжнароднага гандлёвага шляху “*з варaг у грэкі*”, што звязваў Заходнюю і Паўночную Еўропу з Візантыяй і арабскім Усходам па рэках Зах. Дзвіна і Днепр, якія злучаліся *валокамі* – прамежкамі паміж рэкамі, на якіх грузы ад адной ракі да другой перацягваліся па сушы. Каля валок былі склады, факторыі купцоў. На гандлёвых шляхах, што ўзніклі па Сожы, Прыпяці і Бугу, злучаліся прыкаспійскія і заходнееўрапейскія землі.

Па гэтых магістральных шляхах ў Візантыю дастаўляліся рабы, лясныя тавары, футра, мёд, лён, жалезныя вырабы і зброя, а на Поўнач ішлі віно, срэбныя і залатыя вырабы, манеты, тканіны, грыўны, соль. Прадметамі *экспарту* з тэрыторыі Беларусі былі пераважна футра, воск, мёд, лён; *імпарту* – прадметы раскошы: тканіны, вострыя прыправы, грэцкія арэхі, шкляны посуд, якія завозіліся пераважна з Блізкага Усходу і Візантыі.

Развіццё гандлю прывяло да з’яўлення *грошай.* У 9 – 10 ст. на тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны арабскія манеты – дырхемы, у канцы 10 – 11 стст. заходнееўрапейскія дынарыі. У 11 – 13 стст. у гандлёвых аперацыях выкарыстоўвалі плацёжныя зліткі з серабра (*грыўны*) ці іх вагавыя часткі.

**2.2. Утварэнне першых княстваў на тэрыторыі Беларусі. Іх палітычнае развіццё і дзяржаўны лад.**

У выніку “Вялікага перасялення народаў” на тэрыторыі Беларусі аселі некалькі славянскіх племянных саюзаў: крывічы, радзімічы, дрыгавічы, валыняне, якія паступова падпарадкавалі і асімілявалі балцкае насельніцтва.

*Крывічы* рассяліліся ў вярхоўях Дняпра, Зах. Дзвіны, Волгі. Сфарміравалася тры галіны гэтага племяннога саюзу: *палачане*, *смаляне*, *пскавічы*. Саюз крывічоў – палачан уключаў у сябе тэрыторыю з гарадамі Полацк, Віцебск, Лукомль, Менск, Ізяслаўль, Лагойск, Орша, Барысаў.

*Дрыгавічы* жылі ў паўднёвай і сярэдняй частцы Беларусі, у цячэннях рэк Прыпяць і Бярэзіна (Тураў, Слуцк, Пінск).

*Радзімічы* рассяліліся ў міжрэччы Сожа і Дняпра (Рэчыца, Чачэрск, Гомель).

У паўднёва-заходняй частцы Беларусі (вакол Бярэсця) адбывалася змяшэнне плямёнаў валынян і дрыгавічоў.

У заходняй частцы Беларусі пражывалі пераважна *балцкія плямёны* (літва, яцвягі, нальшчаны, дзяволтва і інш.). У 11 – 13 стст. адбываецца актыўная славянская каланізацыя ў басейн Верхняга Панямоння, дзе былі заснаваны гарады Навагародак, Гародня, Ваўкавыск.

У 9 – 10 стст. на базе саюзаў плямёнаў (“*племянных княжанняў*”) на тэрыторыі Беларусі ўзнікаюць першыя дзяржавы – *княствы.*

У 9 ст. на аснове племяннога княжання крывічоў–палачан узнікла ***Полацкае княства***. Яно ахоплівала паўночную і часткова цэнтральную частку сучаснай Беларусі. Цэнтрам княства становіцца *Полацк* – самы першы горад на тэрыторыі Беларусі, які ўзгадваецца ў летапісах пад ***862 г.***, хаця паселішча тут узнікла яшчэ ў 5 ст. Полацкае княства размяшчалася на гандлёвых шляхах “з вараг у грэкі” і кантралявала частку гэтых шляхоў ўздоўж Заходняй Дзвіны і міжрэчча Дзвіны і Дняпра.

Полацкае княства перыядычна падтрымлівала саюзныя адносіны з іншымі славянскімі княствамі ва Ўсходняй Еўропе, буйнейшыя з якіх мелі цэнтры ў Кіеве і Ноўгарадзе. На чале гэтых славянскіх княстваў часта знаходзіліся варажскія (скандынаўскія) князі са сваімі дружынамі. Часам Полацк трапляў у непасрэднае падпарадкаванне гэтых княстваў. Палачане ў якасці саюзнікаў нярэдка прымалі ўдзел ў набегах славян і варагаў на сталіцу Візантыі – Канстанцінопаль. Пасля аднаго з іх, у 907 г. сярод шэрагу князёў, якія атрымалі долю здабычы, узгадваецца полацкая князёўна – *Прадслава*.

У другой палове 10 ст. буйнейшай дзяржавай ва Ўсходняй Еўропе стала *Кіеўскае княства*. Паступова яе князі шляхам ваенных захопаў або дагавораў з мясцовымі князямі падначалілі сваёй уладзе большасць іншых славянскіх дзяржаў у рэгіёне. На чале Кіеўскай дзяржавы знаходзілася дынастыя варажскіх князёў – *Русь*, першым прадстаўніком якой з’яўляўся Рурык. Паступова паняцце “Русь” пачынае ахопліваць усе тэрыторыі, на якія распаўсюджвалася ўлада князёў дынастыі Рурыкавічаў. Гісторыкі традыцыйна называюць кангламерат усходнеславянскіх княстваў на чале з вялікім князем з дынастыі Рюрыкавічаў *Кіеўскай Руссю*.

Першым вядомым з летапісных крыніц полацкім князем з’яўляецца *Рагвалод*. Па найбольш верагоднай версіі ён быў варагам, аб чым сведчаць шведскія сагі, па іншых альбо быў крывічом, альбо палабскім ці паморскім славянінам. Падчас міжусобнай барацьбы паміж кіеўскім князем Яраполкам і наўгародскім князем Уладзімірам, каля 980 г., ён і яго дачка Рагнеда становяцца на бок першага. За гэта і асабістую абразу, якую яму нанеслі, адвяргаючы сватаўство да Рагнеды, Уладзімір захапіў Полацк; паводле яго загаду былі забітыя Рагвалод і яго сыны, а Рагнеда гвалтоўна стала яго жонкай.

У канцы 10 – пачатку 11 стст. пад уладай Уладзіміра і яго дынастыі апынулася большасць усходнеславянскіх княстваў, у тым ліку і Полацкае. (канец 10 ст.) Па ініцыятыве Уладзіміра ў канцы 10 ст. у Кіеве, а потым ва ўсіх падначаленых яму землях пануючай рэлігіяй стала *хрысціянства* ва ўсходняй візантыйскай версіі. З таго часу ўсходняе хрысціянства (праваслаўе) ва Ўсходняй Еўропе называлася “*рускай верай*”.

У канцы 10 ст. (каля 988 г.) было адноўлена Полацкае княства ў якасці *ўдзельнага княства* ў складзе Кіеўскай дзяржавы. На чале яго быў пастаўлены старэйшы сын Уладзіміра ад Рагнеды *Ізяслаў Уладзіміравіч* (988 – 1001). Паколькі Ізяслаў з’яўляўся непасрэдным нашчадкам Рагвалода, з устанаўленнем яго ўлады звязваецца аднаўленне полацкай княскай дынастыі. Пасля прыняцця Уладзімірам хрысціянства і няўдалага замаху на жыццё

князя Рагнеда была астрыжана ў манашкі пад імём Анастасія (лічыцца першай манашкай ва Ўсходняй Еўропе) і саслана на Полаччыну, дзе яна памерла ў Ізяслаўскім манастыры ў 1000 г.

Пасля смерці Ізяслава полацкімі князямі з'яўляліся яго сыны *Усяслаў* (1001 – 1003) і *Брачыслаў* (1003 – 1044).

***Палітычнае развіццё Полацкага княства ў 11 ст.***

Пасля смерці князя Уладзіміра Святаславіча ў Кіеўскай дзяржаве пачынаецца барацьба за ўладу паміж яго нашчадкамі, адным з якіх быў полацкі князь Брачыслаў. Пад яго кіраваннем палачане ў 1021 г. захапілі і разрабавалі Ноўгарад. Войска сына Ўладзіміра наўгародскага і кіеўскага князя Яраслава Мудрага дагнала іх на р. Судамір. Пасля ўзброенай сутычкі быў заключаны мір, паводле якога да Полацкага княства былі далучаны Віцебск, Усвяты і валокі паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной. У 1021-1026 гг. Брачыслаў становіца кіеўскім князем сумесна з Яраславам Мудрым, пры гэтым, працягваючы заставацца полацкім князем. З 1026 г. у Кіеве ўстанаўліваецца аднаасобная ўлада Яраслава Мудрага. Узамен за гэта князь Брачыслаў атрымлівае фактычна поўную ўладу ў Полацкай зямлі. Па сутнасці *Полацкае княства аднаўляе сваю дзяржаўную самастойнасць*.

Падчас княжання Брачыслава Полацкае княства захоўвала саюзніцкія адносіны з Кіеўскай дзяржавай. Дружыны полацкіх і кіеўскіх князёў сумесна ўдзельнічалі ў паходах на суседнія балцкія землі, у заснаванні Браслава і, верагодна, Новагародка.

Найвялікшага росквіту Полацкае княства дасягнула падчас княжання *Усяслава Брачыслававіча "Чарадзея"* (1044 – 1101). У гэты час абвастраюцца адносіны Полацкага княства з Кіеўскай дзяржавай і падуладнымі ёй княствамі. Асноўнымі прычынамі гэтага з'яўляліся:

- імкненне кіеўскіх князёў падначаліць сваёй уладзе Полацк і барацьба Полацкага княства за захаванне самастойнасці;
- прэтэнзіі Усяслава на валоданне Кіевам (полацкія князі лічылі сябе як нашчадкі кіеўскага князя Ўладзіміра Святаславіча законнымі пераемнікамі кіеўскага пасаду);
- барацьба з Наўгародскім княствам, якое было саюзнікам Кіева, за кантроль над валокамі на шляху "з вараг у грэкі" ля рэк Зах. Дзвіна і Днепр (раён Віцебск – Усвяты).

У 1065 – 1066 гг. палачане на чале з Усяславам здзейснілі рабаўнічыя паходы на Пскоў і Ноўгарад. У адказ князі Кіеўскай Русі накіравалі супраць Полацкага княства вялікія сілы, якія спалілі Менск. 3 сакавіка 1067 г. паміж імі і палачанамі адбываецца бітва на р. Нямізе, якая скончылася велізарнымі стратамі для абодвух бакоў. Запрошаны на перамовы Ўсяслаў з сынамі быў захоплены ў палон і пасаджаны ў Кіеве ў поруб (турму). У выніку народнага паўстання кіян ў 1068 г. Усяслаў Чарадзей на 7 месяцаў стаў князем у Кіеве. Але ў 1069 г. быў пазбаўлены пасады і вымушаны змагацца за полацкі трон. У 1071 г. ён канчаткова вярнуў сабе ўладу ў Полацку. У 1077 і 1084 гг. адзін з кіеўскіх князёў Уладзімір Манамах здзейсніў паходы на Полацк і Менск. У

1078 г. палачане спалілі Смаленск. Полацкае княства ў часы Ўсяслава Чарадзея заставалася палітычна цалкам незалежным.

Яшчэ адным з накірункаў знешняй палітыкі Усяслава з'яўлялася *экспанія на землі балцкіх плямёнаў*. Полацкае княства ўстанавіла сваю ўладу, якая выяўлялася ў выплаце даніны, над плямёнамі яцвягаў, літвы (на тэрыторыі сучасных усходняй Літвы і заходняй Беларусі), латгалаў і ліваў (на тэрыторыі сучаснай Латвіі). На землях латгалаў ствараюцца славянскія гарады – Кукенойс і Герцыке.

***Феадальная раздробленасць Полацкага княства***

Пасля смерці Усяслава ў 1101 г. тэрыторыя Полцкага княства была падзелена на шэраг *удзельных княстваў*: Віцебскае, Менскае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Друцкае, Лукомскае. Пачаўся перыяд *феадальнай раздробленасці*. Кожнае з удзельных княстваў мела ўласныя органы кіравання, войска, падатковую сістэму. У той жа час яны падпарадкоўваліся полацкаму князю (выплата даніны, адзіная знешняя палітыка, сумесныя ваенныя паходы). На чале удзельных княстваў станавіліся князі полацкай дынастыі. Вялікі князь полацкі з'яўляўся свайго роду старшынёй федэратыўнага саюзу князёў Полацкай зямлі.

*Прычыны феадальнай раздробленасці*:

– эканамічнае развіццё асобных рэгіёнаў, што выклікала ўзвышэнне іх палітычнага значэння;

– неабходнасць захавання палітычнай стабільнасці ў адносінах паміж прадстаўнікамі княскай дынастыі.

У першай трэці 12 ст. працягваецца барацьба Полацкага княства з Кіеўскай дзяржавай. Найбольш актыўную палітыку, скіраваную супраць Кіева, праводзіў менскі ўдзельны князь *Глеб Усяславіч*, які ў 1116 г. здзейсніў паход на Слуцк, а ў 1117 г. – на Оршу і Копысь. У выніку паходу кааліцыі князёў на чале з Уладзімірам Манамахам Глеб быў захоплены ў палон, дзе быў атручаны ў 1119 г.

У 1127 г. быў арганізаваны вялікі паход на чале з кіеўскім князем Мсціславам супраць Полацкай зямлі. Падчас яго былі захоплены Лагойск, Ізяслаўль; Полацкае княства фактычна было падпарадкавана Кіеву. У 1129 г. шмат удзельных полацкіх князёў разам з сем'ямі былі высланы ў Візантыю, адкуль вярнуліся толькі ў 1139 г.

З 1230-х гг. адбываецца распад Кіеўскай дзяржавы і яна паступова губляе пануючы ўплыў у рэгіёне. У 1132 г. полацкае веча выгнала кіеўскага стаўленіка Ізяслава і выбрала на княжанне прадстаўніка полацкай дынастыі *Васільку Святаславіча*.

У 12 – 13 стст. у Полацкай зямлі фарміруецца новая сістэма дзяржаўна-палітычнага ладу, якая можа быць ахарактарызавана як *вечавая дэмакратыя*. Асноўнымі органамі дзяржаўнай улады ў Полацкім і ўдзельных княствах з'яўляліся:

- *Князь* – афіцыйны кіраўнік дзяржавы, узначальваў ваенныя сілы і адміністрацыйны апарат, ажыццяўляў суд (выбіраўся вечам з ліку прадстаўнікоў полацкай княскай дынастыі).

- *Дружына* – пастаянныя прафесійныя ўзброеныя сілы пры князю; яе прадстаўнікі з’яўляліся дарадцамі князя ў ажыццяўленні адміністрацыйнага кіравання, суда, зборы даніны; удзельнічалі ў ваенных паходах у якасці вайсковай эліты. У межах дружыны вылучаліся дзве асноўныя групы: *баяры* (старшыя дружыннікі) і *дваране* (малодшыя дружыннікі).

- *Веча* – агульны сход усіх свабодных дарослых жыхароў княства мужчынскага полу. Яго функцыі: запрашэнне на трон і выгнанне князёў, заключэнне міжнародных дагавораў, абвяшчэнне вайны і заключэнне міру, ажыццяўленне вышэйшага суду. Вялікі ўплыў на веча мелі буйныя землеўладальнікі і купцы, вышэйшае духавенства на чале з епіскапам.

Феадальная раздробленасць прыводзіла да частых канфліктаў паміж асобнымі ўдзельнымі князямі. Паміж імі ішла барацьба за валоданне цэнтральным полацкім пасадам, а таксама за тэрыторыі паміж асобнымі княствамі. Гэта нярэдка прыводзіла да *міжусобных войнаў*, у якія часта ўмешваліся іншыя дзяржавы. У 1151 – 1161 гг. адбылася міжусобная вайна, падчас якой быў упершыню выгнаны полацкім вечам князь Рагвалод Васількавіч і запрошаны менскі князь Расціслаў Глебавіч. У выніку вайны ўладу атрымаў полацка-віцебскі князь Усяслаў Васількавіч, але вайна паслабіла патэнцыял усіх князёў полацкай дынастыі. У дадзеных умовах аслабляецца ўлада князёў і ўзмацняецца *значэнне веча*. Мясцовыя князі канчаткова становяцца “служылымі”, то бок наймаюцца і выганяюцца згодна з рашэннем веча, за якім стаяць мясцовыя “моцныя людзі”. Таксама павялічваецца ўплыў полацкіх праваслаўных *епіскапаў*. Як прадстаўнік “міру” – хрысціян (сукупнасці “грамадзян”), дзяржаўныя дамовы першым замацоўваў епіскап. Вяршыня дадзенага працэсу наступіла ў 1180 – 1190 г., калі на чале Полацка фармальна стаяла рада з 30 старэйшын.

У другой палове 12 – першай палове 13 стст. Полацкае княства ўцягваецца ў палітычную барацьбу паміж Суздалем, Чарнігавам, Смаленскам, Ноўгарадам і Псковам. Паміж імі ішла барацьба за панаванне ў рэгіёне і кантроль над гандлёвымі шляхамі “з вараг у грэкі”. Князь Уладзімір Полацкі (1186 – 1216), які спачатку ваяваў супраць Смаленскага княства, затым заключыў з ім саюз супраць крыжакоў. У першай трэці 13 ст. смаленскія князі пачынаюць актыўна ўмешвацца ва ўнутрыпалітычную барацьбу ў Полацкім княстве; пад іх кантроль пераходзіць Віцебск. У 1222 г. смаленскія войскі занялі Полацк і на некаторы час у Полацкай зямлі ўсталявалася ўлада смаленскіх князёў.

Верагодна, з-за небяспекі мангольскіх прэтэнзій пасля разгрому тымі Рурыкавічаў, з 1248 г. у Полацку княжыў выгнаны з Літвы Міндоўгам князь Таўцівіл. Пасля гэтага ў другой палове 13 ст. ажыццяўляліся саюзы Полацка з ВКЛ і запрашаліся на княжанне смаленскія князі Рурыкавічы.

*Такім чынам, Полацкае княства ў 9 – 13 стст. з’яўлялася буйнейшым дзяржаўным утварэннем на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Пасля непрацяглага перыяду палітычнай залежнасці ад Кіеўскай дзяржавы яно на працягу 11 – 13 стст. ажыццяўляла самастойную ўнутраную і знешнюю палітыку. Пад уплывам феадальнай раздробленасці ў Полацкім княстве*

*склалася спецыфічная форма дзяржаўна-палітычнага ўладкавання – вечавая дэмакратыя.*

***Тураўскае княства.***

Тураўскае княства сфарміравалася на аснове племяннога княжання дрыгавічоў. Яно ахоплівала тэрыторыю сучаснай паўднёвай Беларусі – Палесся. Тураўскае княства ўзнікае на водным Прыпяцка-Бугскім гандлёвым шляху з Кіева ў Польшчу. Яго цэнтрам з'яўляўся *Тураў.* Назва ад імя міфічнага князя Тура. Упершыню Тураў узгадваецца ў летапісах пад 980 г.

З летапісаў вядома, што падчас праўлення кіеўскага князя Уладзіміра Тураўскае княства было падпарадкавана Кіеўскай дзяржаве ў якасці ўдзельнага княства. Першым удзельным князем у Тураве стаў сын Уладзіміра *Святаполк Уладзіміравіч* (988 – 1015). Тураўскімі князямі станавіліся, як правіла, старэйшыя сыны вялікіх кіеўскіх князёў, якія потым атрымлівалі кіеўскі пасад. У Тураве Рурыкавічы праходзілі навучанне перад будучай палітычнай дзейнасцю на чале Кіеўскай дзяржавы.

У першай палове 12 ст. ва ўмовах крызісу і распаду Кіеўскай дзяржавы пасада тураўскіх князёў часта пераходзіла з рук у рукі, панавала палітычная нестабільнасць. У 1158-1160 гг. Тураўскае княства адасабляецца ад Кіеўскай дзяржавы. Першым незалежным князем з'яўляецца *Юрый Яраславіч*, які паклаў пачатак мясцовай самастойнай дынастыі.

У другой палове 12 ст. у Тураўскім княстве пачынаецца працэс феадальнай раздробленасці. Фарміруюцца *ўдзельныя княствы*: Пінскае, Клецкае, Слуцкае, Дубровіцкае. У канцы 12 – першай палове 13 стст. Тураўскае княства трапляе пад палітычны ўплыў суседняй моцнай дзяржавы – *Галіцка-Валынскага княства* (на тэрыторыі сучаснай Заходняй Украіны).

У *дзяржаўна-палітычным ладзе Тураўскага княства* склалася вечавая дэмакратыя на ўзор той, што існавала ў Полацкім княстве. Але разам з тым меліся некаторыя адрозненні:

- веча акрамя сваіх асноўных функцый таксама мела права выбару мясцовага епіскапа;
- існавала пасада *пасадніка* – галоўнага кіраўніка дзяржаўнай адміністрацыі, намесніка князя.
- існавала пасада *тысяцкага* – кіраўніка ваеннага апалчэння.

Акрамя Полацкага і Тураўскага княстваў землі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў склад і іншых славянскіх княстваў. На землях крывічоў–смалян і часткі радзімічаў ў 9 ст. складваецца *Смаленскае княства*, якое становіцца цалкам самастойным у першай палове 12 ст. У выніку феадальнай раздробленасці з другой паловы 12 ст. у яго межах утвараецца некалькі ўдзельных княстваў; на тэрыторыі Беларусі ўзнікае *Мсціслаўскае княства*. Частка Палесся з горадам Мазыр уваходзіла ў склад Кіеўскага княства; тэрыторыя Пасожжа з горадам Гомель – *Чарнігаўскага княства*.

На захадзе сучаснай Беларусі, дзе адносна позна ажыццяўлялася падпарадкаванне славянамі балцкіх плямёнаў, узнікаюць *Берасцейскае* (1017), *Новагародскае* (1117), *Гарадзенскае* (1116) княствы. Спачатку яны знаходзіліся пад уладай Кіеўскай дзяржавы. З канца 12 ст. трапляюць пад

палітычны кантроль Галіцка-Валынскага княства. У гэтых княствах жыло змешанае насельніцтва з валынян, дрыгавічоў, крывічоў і балтаў.

На сумежжы сучасных Беларусі і Літвы на мяжы 12-13 стст. пачынаецца працэс фарміравання раннефеадальных княстваў сярод *балцкіх плямёнаў* (літва, яцвягі і інш.). Узброеныя атрады балцкіх князёў выступаюць у якасці наёмнікаў у канфліктах паміж славянскімі княствамі, а таксама здзяйсняюць самастойныя набегі на суседнія славянскія землі.

*Такім чынам, у 9 – 13 стст. на тэрыторыі Беларусі адбываецца працэс фарміравання раннефеадальнай дзяржаўнасці. Буйнейшымі дзяржаўнымі ўтварэннямі з'яўляліся Полацкае і Тураўскае княствы.*

### 2.3. Барацьба супраць крыжацкай і мангола-татарскай агрэсіі.

Тэрыторыя ўсходняй Прыбалтыкі ў канцы 12 ст. заставалася апошнім паганскім рэгіёнам Еўропы, праз яго праходзілі важнейшыя гандлёвыя шляхі. Пры гэтым ён быў палітычна раздроблены на племянныя княжанні, частка з якіх знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Полацкага княства. Гэтыя акалічнасці выклікалі імкненне з боку нямецкіх, дацкіх і шведскіх рыцараў, мяшчан і каталіцкага духавенства падначаліць сваёй уладзе эстаў, ліваў, куршаў, латгалаў і іншыя балцкія плямёны.

З канца 12 ст. пачынаецца актыўная хрысціянская прапаганда каталіцкай царквы ў рэгіёне. Каталіцкі манах Мейнард у 1184 г. атрымаў дазвол ад князя Уладзіміра Полацкага, які спачатку не бачыў у гэтым вялікай пагрозы, на місіянерскую дзейнасць у вусці Зах. Дзвіны, на землях ліваў. Папа рымскі Цэлестын III даў дазвол на правядзенне каланізацыі і "першы паўночны крыжовы паход" супраць паганцаў ва ўсходняй Прыбалтыцы (1198 г.). Пасля гэтага біскуп Бертольд разам з крыжакамі высадзіўся ў вусці Дзвіны. *Крыжакамі* называюцца прадстаўнікі асобых ваенна-манаскіх каталіцкіх ордэнаў, якія ўзнікаюць у Заходняй Еўропе падчас правядзення масавых рыцарскіх крыжовых паходаў у 12-13 стст. у Палесціну, а потым і ў іншыя землі, населеныя нехрысціянамі або хрысціянамі некаталіцкіх вызнанняў. Афіцыйная мэта іх дзейнасці – распаўсюджанне хрысціянства паводле каталіцкага ўзору шляхам вайны. Крыжакі мелі арганізацыю якая сумяшчала царкоўную і ваенную іерархію (*ордэн*).

У 1201 г. па ініцыятыве каталіцкага біскупа Альберта ў вусці Зах.Дзвіны, на землях племені ліваў, узнікае крэпасць *Рыга.* Для абароны каталіцкага духавенства біскуп Альберт у 1202 г. заснаваў крыжацкі *Ордэн мечаносцаў.* Пасля заснавання Ордэна мечаносцаў яго рыцары пры падтрымцы каталіцкай царквы праводзілі прымусовую хрысціянізацыю жыхароў Прыбалтыкі, захоплівалі землі ліваў, куршаў, селаў, латгалаў і абкладалі данінай насельніцтва.

Такая палітыка Ордэна выклікала супраціўленне з боку полацкіх князёў, якія дагэтуль кантралявалі землі ліваў і латгалаў. Паміж Ордэнам і полацкімі князямі пачаліся ўзброеныя сутычкі. Палачане на чале з Уладзімірам Полацкім зрабілі паходы на каменныя крыжацкія замкі каля Рыгі – Ікскуль і

Гольм у 1203 і 1206 гг. Крыжакамі былі захоплены васальныя княствы Полацка Кукейнос у 1208 г. і Герцыке ў 1209 г.

Сілаў палачан і асобных балцкіх плямён аказалася недастаткова для барацьбы з крыжакамі. Таму ў 1216 г. адбывалася падрыхтоўка сумеснага полацка-смаленска-літоўскага пахода на Ордэн мечаносцаў. Аднак, ён не адбыўся, паколькі князь Уладзімір нечакана памёр, верагодна быў атручаны ордэнскімі агентамі. Дамовы Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Ордэнам у 1210 і 1223 гг. замацавалі свабоду гандлю купцоў па Дзвіне ад Полацка да Рыгі, але права адгрузкі тавара на замежныя караблі атрымалі толькі рыжане. На працягу першай чвэрці 13 ст. уся тэрыторыя сучасных Латвіі і Эстоніі была падпарадкавана Ордэну мечаносцаў і Рыжскаму арцыбіскупству, якія ўтварылі там федэратыўную дзяржаву. Полацкае княства страціла ўсе свае ўладанні ў Ніжнім Падзвінні.

У далейшым адбываліся частыя войны паміж Ордэнам і Полацкім княствам; крыжакі здзяйснялі перыядычныя набегі на Полацкую зямлю, а таксама землі суседніх славянскіх дзяржаў (Ноўгарад, Пскоў), праводзілі разбурэнні і захоплівалі палонных. Полацкае і Віцебскае княствы працягваюць змагацца з крыжакамі, уступаючы ў саюзніцкія адносіны са Смаленскім, Ноўгародскім і панямонскімі княствамі. Пры абароне Юр’ева (Тарту), наўгародскай калоніі на землях эстаў, у 1224 г. загінуў апошні кукейноскі князь *Вячка*. У 1260 г. полацкія дружыны ўдзельнічалі ў бітве літоўцаў з крыжакамі на возеры Дурбэ. Барацьба з крыжакамі садзейнічала аслабленню і заняпаду Полацкага княства ў сярэдзіне 13 ст.

У 1230 г. на тэрыторыі Прусіі пачынае дзейнічаць крыжацкі *Тэўтонскі Ордэн*. Яго намаганнямі было заваяваны і прымусова ахрышчаны мясцовыя балцкія плямёны прусаў і створана асобная крыжацкая дзяржава. У 1237 г. Ордэн мечаносцаў далучыўся да Тэўтонскага Ордэна ў якасці аўтаномнай адзінкі пад назвай *Лівонскі ордэн*. Тэўтонскі ордэн скіроўваў сваю экспансію супраць балцкіх плямёнаў жамойтаў на тэрыторыі сучаснай Літвы. Пры гэтым нярэдка адбываліся сутыкненні крыжакоў з суседнімі славянскімі княствамі на тэрыторыі Панямоння, якія падпарадкоўваліся Галіцка-Валынскаму княству. Барацьба славянскіх і балцкіх княстваў супраць крыжакоў паскорыла працэс іх аб’яднання ў адзіную дзяржаву.

У сярэдзіне 13 ст. у раннефеадальных княстваў на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца новы знешнепалітычны праціўнік – *мангола-татары* – качавыя плямёны з усходняй Азіі. У першай палове 13 ст. мангола-татары ўтварылі адзіную дзяржаву, якая праводзіла актыўную заваёўніцкую палітыку. У склад гэтай дзяржавы шляхам войнаў увайшлі тэрыторыі Кітая, часткова Сібіры і Далёкага Усходу, Цэнтральнай Азіі, Ірана, Урала, Каўказа, Паволжа. У стэповай зоне Еўразійскага кантынента пачаліся вялікія міграцыі, якія справакавала агрэсія мангола-татарскіх саюзаў плямён.

У 1223 г. адбываецца першая сутыкненне кааліцыі славянскіх князёў *з мангола-татарамі*. У бітве на р. Калка войска кааліцыі было знішчана, сярод іншых загінуў князь Юры Нясвіжскі. У 1238 г. мангола-татары на чале з ханам Бату падпарадкавалі Уладзіміра-Суздальскія і Смаленскія землі. У 1239

– 1241 гг. падчас паходаў на Кіеў, Валынь і Польшчу імі былі спалены Гомель, Тураў, Мазыр, Пінск, Берасце. Аднак спроба мангола-татараў прарвацца ў цэнтральныя землі Беларусі ў 1242 і 1249 гг. скончыліся няўдачай (бітва пад Крутагор'ем 1249 г.).

У пачатку 40-х гг. 13 ст. у Паволжы была ўтворана мангола-татарская дзяржава – *Залатая Арда*. Землі сучаснай Расіі і Украіны сталі залежнымі ад яе і вымушаны былі выплочваць даніну. Нягледзячы на частыя спусташальныя набегі, на працягу ўсяго 13 ст., мангола-татарам не ўдалося ўстанавіць сваю ўладу на беларускіх землях. Барацьба славянскіх княстваў на тэрыторыі Беларусі супраць мангола-татараў паскорыла працэс іх аб'яднання ў адзіную дзяржаву.

*Такім чынам, у першай палове 13 ст. раннефеадальныя княствы на тэрыторыі Беларусі апынуліся пад пагрозай агрэсіі з боку двух значных знешнепалітычных праціўнікаў – крыжакоў і мангола-татараў. Неабходнасць супрацьстаяння гэтым сілам сталі адной з важнейшых прычын утварэння адзінай дзяржавы.*

### 2.4. Рэлігія і культура беларускіх зямель у 9 – 13 ст.

У рэлігійным жыцці беларускіх зямель разглядаемага перыяду вызначальным працэсам стала прыняцце *хрысціянства* ў якасці пануючай рэлігіі. Першыя звесткі пра з'яўленне хрысціянства на землях сучаснай Беларусі ўзыходзяць да 9 ст. Скандынаўскія сагі сведчаць аб тым, што ў гэты час у Полацку існавала драўляная царква, а асноўнымі носьбітамі хрысціянства былі хрышчоныя ў Візантыі варажскія дружыннікі.

Каля 988 г. кіеўскі князь Уладзімір разам са сваёй дружынай прымае хрысціянства. Пасля гэтага афіцыйна пачынаецца масавы перавод у хрысціянскую веру насельніцтва на ўсіх землях, падпарадкаваных Кіеўскай дзяржаве, да якіх у той час належалі Полацкае і Тураўскае княствы. Прыняцце хрысціянства дазваляла палітычнай эліце вырашаць праблемы ўлады і прэстыжу, як у межах сваіх княстваў (умацаванне ўлады шляхам устанаўлення адзінай рэлігіі), так і на міжнародным узроўні, дазваляла дамаўляцца на роўных з хрысціянскай Еўропай.

Перавод у хрысціянства адбываўся рознымі сродкамі: прымусовымі і мірнымі. Вядома пра факты прымусовага хрышчэння ў Тураве (зафіксавана паданне аб прыплыўшых з Кіева крывавых крыжах). Язычніцкія культы забараняліся, а іх служыцелі падвяргаліся пераследаванням. Разам з тым перавод насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў хрысціянства зацягнуўся на доўгія стагоддзі, асабліва ў рэгіёнах, аддаленых ад цэнтральных гарадоў. Большасць насельніцтва, якое прыняло хрысціянства, не разумела яго сутнасці, і будучы фармальна хрысціянамі, працягвала неафіцыйна захоўваць язычніцкія вераванні (*дваяверства*). Гэта зафіксаваў беларускі фальклор (песні, казкі, паданні), традыцыі (Дзяды, Каляды, Купалле, шанаванне валуноў, крыніц і г.д.). Пад уплывам язычніцтва некаторыя погляды і культы былі ўведзены ў практыку хрысціянскай царквы.

З прыняццем хрысціянства на землях Беларусі з'яўляецца рэлігійная арганізацыя – *царква*, якая кіравалася *духавенствам*. Спачатку духоўныя асобы былі пераважна выхадцамі з Візантыі або Балгарыі, паступова з'яўляліся мясцовыя кадры. Царкоўная арганізацыя ва Ўсходняй Еўропе (на тэрыторыі, якая ўваходзіла ў Кіеўскую дзяржаву на мяжы 10-11 стст.) падпарадкоўвалася Ўсходняй візантыйскай царкве на чале з Канстанцінопальскім патрыярхам. Яна мела назву *Кіеўская мітраполія*. Мітраполія падзялялася на шэраг *епархій*. На землях Беларусі існавалі *Полацкая* (заснавана ў 992 г., першы епіскап – Міна), *Тураўская* (1005), *Смаленская* (1136) *епархіі*.

У 1054 г. хрысціянская царква распадаецца на *каталіцкую* (на захадзе Еўропы) і *праваслаўную* (на Усходзе з цэнтрам у Візантыі). Кіеўская мітраполія ўваходзіла ў склад праваслаўнай царквы. Праваслаўная царква, вяла барацьбу з язычніцкімі вераваннямі, праводзіла будаўніцтва храмаў і манастыроў. Пры гэтым яна атрымлівала вялікую эканамічную і палітычную падтрымку з боку княскай улады. Вельмі садзейнічалі хрысціянізацыі князь Ізяслаў і яго маці Анастасія (Рагнеда), князь Усяслаў Чарадзей, а таксама першая кананізаваная "святая" на землях Беларусі *Еўфрасіння Полацкая* (? – 1173), якая паходзіла з полацкай княскай дынастыі. Царква ў сваю чаргу выступала ў якасці важнага ідэалагічнага інструменту княскай улады.

*Хрыціянізацыя* садзейнічала таму, што культура беларускіх земляў 9 – 13 стст. стала вызначацца стварэннем форм і структур, характэрных для еўрапейскай цывілізацыі. Вынікамі хрысціянізацыі сталі:

1) Узнікненне *пісьмовасці* і *літаратуры*. Пісьмовасць развіваецца ў сувязі з патрэбамі пашырэння свяшчэнных хрысціянскіх тэкстаў. На нашых землях існавалі дахрысціянскія графічныя сістэмы (т.зв. "чэрты і рысы" і варажскія руны), аднак з прыняццем хрысціянства яны былі выціснутыя *старaславянскай мовай з кірылічным алфавітам*. Кнігі перапісваліся ўручную ў майстэрнях пры цэрквах – *скрыпторыях* і насілі рэлігійны характар, таксама тут ствараліся *летапісныя зводы*. Найлепшымі ўзорамі кніжнага майстэрства, якія дайшлі да нашых дзен сталі *Тураўскае Евангелле* 11 ст., *Друцкае Евангелле* 12 ст., *Радзівілаўскі летапіс*. Акрамя царкоўнай сферы пісьмовасць паступова пашыраецца сярод гарадскога насельніцтва, пра што сведчаць *берасцяныя граматы*, у якіх фіксаваліся эканамічныя здзелкі, графіці, надрапаныя на падмурках храмаў, а таксама "Барысавыя камяні" 12 ст. – высечаныя на 9 паганскіх "святых валунах" хрысціянскія малітвы полацкага князя Барыса.

2) Развіццё а*рхітэктуры і мураванага дойлідства.* Гэта стала вынікам патрэб у стварэнні хрысціянскіх храмаў паводле ўзораў візантыйскага дойлідства. На працягу ўсяго Сярэднявечча асноўным матэрыялам для будаўніцтва з'яўлялася дрэва, аднак для вырашэння праблем прэстыжу і сакральнасці пачалося капіраванне форм больш высокай візантыйскай культуры, а значыць стварэнне мураваных цэркваў. Асноўным стылем *храмавага дойлідства* быў *раманскі*, для якога былі характэрныя

канструкцыя ў выглядзе прамавугольніка ці квадрата, тоўстыя сцены і калоны, на якія абапіраўся дах, упрыгожанне фрэскамі і шлемападобныя купалы. У Полацку сфарміравалася сваеасаблівая школа дойлідства, для якой былі характэрныя лаканічнасць формаў, квадратны план і выцягнутыя ўверх пабудовы. Найбольш вядомымі з помнікаў з'яўляюцца *Полацкі сабор св. Сафіі* (пабудаваны паводле фундацыі Усяслава Чарадзея ў 50-я г. 11 ст.), *Спаская* царква ў Полацку (дойлід Іаан на грошы Еўфрасінні Полацкай у сяр. 12 ст.), *Пятніцкая* і *Барысаглебская* цэрквы ў Бельчыцах і *Дабравешчанская царква* ў Віцебску. Паводле звестак летапісаў, у Полацку ў канцы 12 ст існавала 8 мураваных храмаў і манастыроў. Акрамя таго, да нашага часу дайшлі *Барысаглебская (Каложа) царква ў Гародні* (12 ст.), і т.зв. *"Белая" вежа*–данжон валынскага тыпу ў Камянцы (13 ст.).

3) Развіццё *выяўленчага мастацтва.* Твораў гэтага перыяду амаль не захавалася да нашых дзён. Вядомыя кавалкі фрэсак і мазаік Сафійскага сабора і Барысаглебскага манастыра, і толькі ў Спаскай царкве ў Полацку і сёння роспіс 12 ст. упрыгожвае амаль ўсе сцены. Найлепшым ўзорам старажытнабеларускага *ювелірнага майстэрства* з'яўляецца зроблены па замове Еўфрасінні Полацкай ў 1161 г. майстрам Лазарам Богшам крыж.

Да ліку *буйнейшых прадстаўнікоў хрысціянскай культуры* адзначанага перыяду належаць:

*Еўфрасіння Полацкая* (? - 1173) – заснавальніца Спаскай царквы і манастыра ў Полацку; паводле "Жыція св. Еўфрасінні Полацкай" яна займалася перапісваннем кніг і садзейнічала развіццю рэлігійнай асветы.

*Кірыла, епіскап Тураўскі* (1130? – 1182) – адзін з пачынальнікаў рэлігійнай літаратуры ва Ўсходняй Еўропе, аўтар каля 70 словаў, прытчаў, пропаведзяў і г.д.

*Клімент Смаляціч* (12 ст.) – кіеўскі мітрапаліт, паходжаннем са Смаленска. Аўтар першага вядомага ў Беларусі пісьмовага твору "Пасланне Фаме прасвітару".

У творах, складзеных на тэрыторыі Беларусі, выкарыстоўваліся не толькі царкоўнаславянская, а і старажытнабеларуская народная лексіка ("пожні", "вельмі", "злодзей", "сябры" і гд.).

*Такім чынам, у 11 – 13 стст. на тэрыторыі Беларусі адбываецца развіццё хрысціянскай культуры, якая абумовіла фарміраванне пісьмовасці, станаўленне рэлігійнай літаратуры, архітэктуры і выяўленчага мастацтва. У той жа час сярод шырокіх мас насельніцтва працягвала існаваць традыцыйная народная культура, якая мела карані ў язычніцтве.*

**Асноўныя паняцці:**

Верв, феадалізм, князь, дружына, баяры, вотчына, памесце, кармленне, даніна, феадальная рэнта, смерды, закупы, радовічы, ізгоі, халопы (чэлядзь), палюддзе, пагосты, рамяство, гарады, дзядзінец, пасад, торг, купцы, шлях "з вараг у грэкі", валокі, крывічы, дрыгавічы, радзімічы, яцвягі, літва, варагі, дзяржава, Полацкае княства, Тураўскае княства, Русь, Кіеўская дзяржава,

феадальная раздробленасць, удзельныя княствы, веча, міжусобныя войны, тысяцкі, пасаднік, крыжакі, Ордэн мечаносцаў, Тэўтонскі ордэн, Лівонскі ордэн, мангола-татары, Залатая Арда, хрысціянізацыя, дваяверства, царква, епархія, стараславянская мова, кірыліца, дойлідства, манастыр, скрыпторый, раманскі стыль, летапіс.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Назавіце асноўныя рысы сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель у 9 – 13 стст.?
2. Якія Вам вядомыя тэхнічныя ўдасканаленні ў сельскай гаспадарцы ў 9 – 13 стст.?
3. У чым палягае адрозненне паміж родавай і тэрытарыяльнай (суседскай) абшчынай?
4. Што такое феадалізм? Якія шляхі ўзнікнення феадальнай уласнасці на зямлю вы ведаеце?
5. Што такое даніна? Якім чынам адбываўся збор даніны ў сялянскіх абшчынах?
6. Якія катэгорыі залежнага сялянства Вы ведаеце?
7. Чым выклікана аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі?
8. Назавіце даты першых узгадак пра гарады Беларусі. Якія функцыі выконваў сярэднявечны горад?
9. З якіх частак складаўся ўсходнееўрапейскі сярэднявечны горад?
10. Па якіх рэках ляжаў шлях “з вараг у грэкі” і што па ім перавозілі?
11. Якія племянныя саюзы і гарадскія цэнтры сталі асновай для фарміравання першых княстваў на тэрыторыі Беларусі?
12. У сувязі з якімі падзеямі ўзгадваецца першы вядомы полацкі князь Рагвалод?
13. Які характар мелі ўзаемаадносіны Полацкага княства з Кіеўскай дзяржавай у 10 – 11 стст.? Дайце агульную характарыстыку.
14. Калі Полацкае княства дасягнула найвышэйшага палітычнага росквіту? З дзейнасцю якога князя ён звязаны?
15. Што такое феадальная раздробленасць? Якія яе прычыны і вынікі на тэрыторыі Полацкага княства?
16. Што такое веча? Пасля якіх падзей Полацкая зямля фактычна становіцца вечавой рэспублікай?
17. Якія іншыя княствы, акрамя Полацкага, існавалі на тэрыторыі Беларусі і ў чым іх асаблівасці?
18. Назавіце асноўныя адрозненні дзяржаўна-палітычнага ладу Полацкага і Тураўскага княстваў.
19. Якія Вы ведаеце крыжацкія ордэны? Калі яны з’яўляюцца ў Прыбалтыцы і якімі былі асноўныя мэты іх дзейнасці?
20. Назавіце асноўныя падзеі, звязаныя з барацьбой Полацкага княства з крыжакамі?
21. Калі Полацкая зямля страціла на карысць крыжакоў Кукейнойс і Герцыке?

22. Якія беларускія гарады былі спалены мангола-татарамі ў сярэдзіне 13 ст.?
23. Ці зведалі беларускія землі мангола-татарскае ярмо?
24. Чаму і як на беларускіх землях была прынята хрысціянства?
25. Які характар мела хрысціянізацыя на беларускіх землях? Што такое дваяверства?
26. Якую ролю мела прыняцце хрысціянства для развіцця пісьмовасці на землях Беларусі?
27. Якія асаблівасці характэрныя для полацкай архітэктурнай школы?
28. Якія помнікі беларускай архітэктуры 9 – 13 ст. дайшлі да нашых дзён?
29. Якія помнікі кніжнага і выяўленчага майстэрства 9 – 13 стст. Вам вядомыя?
30. Якіх Вы ведаеце дзеячоў культуры Беларусі 9-13 ст.?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Шлях "з вараг у грэкі" і яго роля ў эканамічным развіцці беларускіх зямель.
2. Першыя гарады на тэрыторыі Беларусі: іх становішча і функцыі.
3. Грашовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў 9 – 13 стст.
4. Варагі і іх роля ў фарміраванні дзяржаўнасці ва Ўсходняй Еўропе.
5. Веча і яго роля ў грамадска-палітычным развіцці раннефеадальных княстваў на тэрыторыі Беларусі.
6. Смаленскае княства ў 9 – 13 стст.
7. Барацьба полацкіх князёў з крыжакамі ў першай палове 13 ст.
8. Кірыла Тураўскі: жыццё і творчасць.

## Тэма 3: Утварэнне і грамадска-палітычнае развіццё Вялікага княства Літоўскага ў другой палове 13 – першай палове 16 стст.

1. **Утварэнне ВКЛ.**
2. **Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у другой палове 13 – 14 стст.**
3. **Крэўская унія і яе сацыяльна-палітычныя вынікі.**
4. **Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у 15 – першай палове 16 стст.**
5. **Дзяржаўны лад, органы кіравання ВКЛ**

### 3.1. Утварэнне ВКЛ.

*Канцэпцыі фарміравання ВКЛ.* У асяроддзі гісторыкаў існуе некалькі канцэпцый таго, якім чынам і на аснове якой этнічнай групы ўзнікла Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых зямель.

1) Паводле найбольш распаўсюджанай у літоўскай і савецкай гістарыяграфіі канцэпцыі ў 13 ст. адбываецца "*літоўскае заваяванне*" (В. Пашута, Е. Ахманьскі, Е. Гудавічус). Балтамоўныя літоўцы заваявалі паслабленыя феадальнай раздробленасцю ўсходнеславянскія княствы і падначалілі іх сваёй уладзе. Гэтая канцэпцыя мае вытокі ў ідэалогіі маскоўскіх цароў 16 – 17 стст. для абгрунтавання сваіх тэрытарыяльных

прэтэнзій на землі Беларусі і Ўкраіны, а таксама ў літоўскім нацыянальным руху 19 ст.

2) Канцэпцыя *“Русі Літоўскай”* узнікла ў расійскай імперскай гістарычнай навуцы 19 ст. (С. Салаўеў). Яна падкрэслівала тое, што ўсходнеславянская ў асноўнай сваёй масе “Русь Літоўская” няўдала супернічала з “Руссю Маскоўскай”. Прычым само існаванне беларусаў, украінцаў і іх інтарэсы ў мінулым адмаўляліся.

3) Канцэпцыя *“Літоўска-рускай дзяржавы”,* распрацаваная расійскім гісторыкам М. Любаўскім на пачатку 20 ст. Усе ўсходнеславянскія народы паводле гэтай канцэпцыі называлася “рускімі”, без размежавання на беларусаў, рускіх, украінцаў. За імі прызнавалася другарадная, але важная роля ў стварэнні ВКЛ.

4) Канцэпцыя *“Беларуска-літоўскай дзяржавы”,* распрацаваная ў 1920-я гг. беларускім гісторыкам У. Ігнатоўскім. Яна сцвярджала, што беларусы адыгралі вядучую ролю ў эканамічным і культурным жыцці (большая частка тэрыторыі і гарадоў ВКЛ, дзяржаўная мова ВКЛ), а літоўцы склалі аснову войска, княжацкіх і магнацкіх фамілій ВКЛ.

5) Канцэпцыя *“Беларускай дзяржавы”*, распрацаваная гісторыкамі беларускага адраджэння у 1920-я і 1980-1990-я гг. (В. Ластоўскі, М. Доўнар-Запольскі, М. Ермаловіч). Яна сцвярджала, што беларускі этнас быў вядучым стваральнікам ВКЛ; гістарычная Літва – гэта землі сучаснай заходняй Беларусі ад Маладзечна да Новагародка, а сучасныя чыста балцкія землі (Жамойція) былі заваяваныя ёй у 15 ст.

6) Канцэпцыя *“Поліэтнічнай ці кантактнай паласы”* (А. Краўцэвіч) створана ў беларускай навуцы ў наш час. Яна прадугледжвае прыблізна роўны ўдзел у дзяржаватворчых працэсах у Верхнім Панямонні балцкіх і славянскіх элементаў. Лічыцца, што з 19 ст. гарады рэгіёну былі славянскімі (Новагародак, Вільня, Гародня), а сельская ваколіца заставалася балцкай. Гіпотэза пацвярджаецца археалагічнымі знаходкамі, тапанімікай і тым, што ў Сярэднявеччы ядро дзяржавы называлася “Літвой”, пад “Руссю” разумелася Падзвінне і Падняпроўе, а балцкая Жмудзь была далучана да ВКЛ канчаткова толькі ў 15 ст.

Большасць даследчыкаў згодныя з тым што асноўнымі *прычынамі і перадумовамі стварэння ВКЛ* сталі:

1) неабходнасць сумеснай абароны ад крыжацкай і мангола-татарскай агрэсіі;

2) наяўнасць моцнай дзяржаўнай і вайсковай традыцыі ва ўсходніх славян, пры тагачаснай слабасці іх раздробленых на удзелы княстваў;

3) высокі ўзровень эканамічнага і сацыяльнага развіцця рэгіёну, назапшванне багаццяў, сацыяльная дыферынцыяцыя, якія эліце неабходна было падтрымліваць і абараняць пры дапамозе моцнай дзяржавы;

4) наяўнасць у Верхнім Панямонні і Падзвінні традыцыі мірнага супрацоўніцтва паміж балцкім і славянскім насельніцтвам і распрацаванасць механізмаў міжэтнічных кантактаў.

Цэнтрам аб'яднання княстваў на тэрыторыі Беларусі становіцца *Новагародак*, а таксама прылеглыя да яго землі балцкіх плямёнаў Літвы. Да сярэдзіны 13 ст. Новагародскае княства знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Галіцка-Валынскага княства. У межах Новагародскага княства вылучаюцца ўдзельныя княствы: Ваўкавыскае, Слонімскае, Здзітаўскае і інш.

*Прычыны* ўзвышэння палітычнага значэння Новагародскай зямлі:

– найбольш развітая сельская гаспадарка на тэрыторыі сучаснай Беларусі;

– высокі ўзровень развіцця рамяства (асабліва апрацоўкі жалеза, каляровых і каштоўных металаў);

– наяўнасць развітых гандлёвых сувязяў у рэгіёне;

– тэрыторыя знаходзілася ў аддаленасці ад тэатраў баявых дзеянняў і не пацярпела ад набегаў крыжакоў і мангола-татараў.

Другім цэнтрам утварэння адзінай дзяржавы становяцца землі балцкіх плямёнаў, размешчаных на сумежжы з Новагародскім княствам. Галоўную ролю сярод іх меў саюз плямёнаў *Літвы*. Сярод гісторыкаў няма адзінства адносна таго, дзе знаходзілася тэрыторыя Літвы ў 13 ст. Асноўныя версіі:

– паўднёва-усходняя частка сучаснай Літвы;

– землі на захадзе сучаснай Беларусі (паміж Навагрудкам, Слонімам і Мінскам);

– тэрыторыя на сумежжы сучасных Беларусі і Літвы.

У першай палове 13 ст. сярод літоўскіх плямёнаў адбываецца працэс утварэння дзяржаўнасці; пад палітычны ўплыў Літвы трапляюць суседнія балцкія плямёны *аўкштайтаў, дзяволтвы, нальшчанаў* і інш., якія знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай усходняй Літвы і паўночна-заходняй Беларусі. Устанаўліваюцца саюзныя адносіны Літвы з балцкімі плямёнамі *жамойтаў* (паўночна-заходняя частка сучаснай Літвы) і *яцвягаў*. У 1230 – 1240-я гг. адбываецца працэс фарміравання адзінай Літоўскай дзяржавы. Вярхоўным князем у ёй становіцца Міндоўг, які праводзіць палітыку падначалення сабе асобных балцкіх плямёнаў і княстваў. Для ўмацавання сваёй улады ў Літве Міндоўг працяглы час знаходзіўся ў саюзніцкіх адносінах з Галіцка-Валынскім княствам.

*Каля 1246 г. Міндоўг быў абраны князем у Новагародку*: такім чынам новагародскае баярства разлічвала з дапамогай Літвы пазбавіцца залежнасці ад Галіцка-Валынскага княства, а Міндоўг з дапамогай Новагародскага княства разлічваў умацаваць сваю ўладу ў Літве. У 1248-1249 гг. ён з дапамогай новагародскага войска праводзіць актыўную барацьбу, накіраваную на ўмацаванне сваёй улады ў балцкіх землях. Перспектыва стварэння новай моцнай дзяржавы ў рэгіёне выклікала занепакоенасць суседніх дзяржаў. Супраць дзяржавы Міндоўга ў 1248 – 1249 гг. выступіла кааліцыя, у склад якой увaходзілі Галіцка-Валынскае княства, Лівонскі Ордэн і некаторыя балцкія княствы, а таксама канкурэнты Міндоўга ў Літве на чале з Таўцівілам. Сіламі кааліцыі ў 1248 – 1254 гг. было ажыццёўлена некалькі паходаў на Новагародак і землі Літвы.

З мэтай разбурэння кааліцыі Міндоўг праводзіць перамовы з пасланнікамі рымскага папы, абяцаючы ўвядзенне хрысціянства ў Літве. *У 1253 г. Міндоўг карануецца ў Новагародку* ў якасці каталіцкага караля Літвы. У выніку быў заключаны мір з Ордэнам, паводле якога Міндоўг прызнаваў уладу крыжакоў у Жамойці. Тады адбылося перамір'е з Галіцка-Валынскім княствам. Паводле яго, князем у Новагародку становіцца галіцкі княжыч Раман Данілавіч.

У 1258 г. уладу ў Новагародкім княстве захапіў сын Міндоўга Войшалк. У 1260 г. пачынаецца паўстанне жамойтаў супраць крыжакоў. Выкарыстаўшы гэтую акалічнасць, Міндоўг разрывае саюз з Ордэнам, адмаўляецца ад каталіцызму і разам з атрадамі палачан пачынае вайну супраць крыжакоў. У бітве на возеры Дурбэ 1260 г. войскі Міндоўга і жамойтаў разбіваюць крыжакоў. У выніку на пачатку 1260-х гг. пад уладай Міндоўга знаходзілася дзяржава, у склад якой уваходзілі Літва і прылеглыя да яе балцкія землі, Новагародская зямля, Жамойць. Пазней гэтая дзяржава атрымала назву *Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае*.

*Такім чынам, у сярэдзіне 13 ст. пад уплывам шэрагу сацыяльна-эканамічных і палітычных фактараў на тэрыторыі Панямоння пачынаецца фарміраванне новай дзяржавы, якая склала аснову Вялікага княства Літоўскага. Цэнтрамі фарміравання новай дзяржавы сталі Новагародская зямля і балцкае племяннное княжанне Літва.*

### 3.2. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у другой палове 13 – 14 стст.

Першы кіраўнік дзяржавы, якая стала асновай Вялікага княства літоўскага Міндоўг быў забіты ў выніку змовы балцкай знаці ў 1263 г. На кароткі час уладу атрымлівае жамойцкі князь *Транята* (1263 – 1264). Аднак у 1264 г. ён таксама быў забіты. Вялікім князем становіцца старэйшы сын Міндоўга *Войшалак* (1264-1267).

Падчас свайго княжання Войшалк прытрымліваецца саюзу з Галіцка-Валынскім княствам і нават прызнае намінальную залежнасць ад яго ў якасці новагародскага князя. У межах Літвы ён праводзіць жорсткую барацьбу супраць рода-племянной знаці, далучае да новай дзяржавы землі дайновы, нальшанаў і гальшанаў (вакол Крэва і Гальшан). У 1265 г. васальную залежнасць ад ВКЛ прызнае Полацкае княства. У рэлігійных адносінах Войшалк з'яўляўся праваслаўным і актыўна садзейнічаў распаўсюджанню праваслаўя сярод балцкага насельніцтва (заснаванне Лаўрышаўскага манастыра). У выніку змовы валынскіх князёў у 1267 г. Войшалк быў забіты. У 1267 – 1270 гг. на чале ВКЛ знаходзіцца валынскі князь *Шварн Данілавіч*.

Наступным вялікім князем становіцца *Тройдзень* (каля 1270–1282). Ён лічыцца прадстаўніком балцкай язычніцкай знаці і, як мяркуюць, пераносіць сталіцу дзяржавы з Новагародка ў Кернаў. Асноўныя накірункі знешняй і ўнутранай палітыкі Тройдзеня:

- канчатковае пазбаўленне васальнай залежнасці Новагародскай зямлі ад Галіцка-Валынскага княства;

- барацьба з крыжакамі за геапалітычнае панаванне ў Прыбалтыцы (на некаторы час ВКЛ удалося падпарадкаваць землі балцкіх плямёнаў земгалаў і селаў у сярэднім Падзвінні пасля паспяховай *Ашэрадэнскай бітвы 1279 г.*);

- барацьба з агрэсіяй мангола-татараў пры падтрымцы Галіцка-Валынскага княства, якое ў гэты час трапляе ў залежнасць ад Залатой Арды і з яе дапамогай спрабуе аднавіць уладу ў Новагародскай зямлі (у 1274, 1275 і 1277 гг. аб'яднаныя валынска-татарскія войскі ажыццявілі тры буйныя паходы на Новагародак і Літву, аднак былі адбітыя);

- барацьба з Мазовіяй (славянскае княства на паўночным усходзе Польшчы) за памежныя тэрыторыі; далучэнне да ВКЛ Слонімскага і Гарадзенскага княстваў, а таксама часткі тэрыторый яцвягаў;

- перасяленне ў ВКЛ у 1277 – 1280 гг. часткі прусаў і яцвягаў, якія ўцякаюць пасля няўдалага паўстання супраць Тэўтонскага ордэна ў Прусіі 1276 г. у Верхняе Панямонне і Пабужжа.

Наступным вялікім князем становіцца *Віцень* (каля 1293 – 1316). Асноўныя накірункі знешняй і ўнутранай палітыкі ВКЛ падчас княжання Віценя:

- жорсткая барацьба з Тэўтонскім і Лівонскім Ордэнамі (паходы Ордэна на Гародню 1296, 1305, 1306 (двойчы), 1307 (тройчы), 1314 гг.); у барацьбе з крыжакамі вылучаецца ваенны талент гарадзенскага ваяводы *Давыда Гарадзенскага*); усталяванне ваеннай мяжы паміж ВКЛ і Тэўтонскім Ордэнам па р. Нёман;

- ваенныя сутыкненні з Польскім каралеўствам за кантроль над памежнымі тэрыторыямі (паходы на польскія землі 1294, 1295, 1300, 1306, 1307 гг.);

- барацьба супраць жамойцкай знаці, якая імкнулася адасобіцца ад ВКЛ (падаўленне жамойцкага паўстання 1294 г.);

- канчатковае далучэнне да ВКЛ Полацкага княства (1307). Полацк заключыў з ВКЛ дамову (рад), паводле якой князь працягваў прызначацца толькі са згоды мясцовага веча; гандлёвыя дамовы горад заключаў самастойна; за злачынствы на тэрыторыі ВКЛ палачан маглі судзіць толькі ў Полацку прадстаўнікі гараджан – фактычна захавалася шырокая аўтаномія.

Пры Віцені ў якасці агульнадзяржаўнага герба была ўведзена "Пагоня".

Пераемнікам Віценя становіцца *Гедымін* (1316 – 1341). У 1323 г. ён пераносіць сталіцу ВКЛ у Вільню. Асноўныя накірункі палітыкі ВКЛ падчас праўлення Гедыміна:

-уключэнне ў склад ВКЛ Віцебскага, Менскага, Турава-Пінскага, Берасцейскага княстваў, Падляшша;

- спробы распаўсюджання палітычнага ўплыву на Наўгародскую і Пскоўскую рэспублікі; далучэнне да ВКЛ Таропецкага і Ржэўскага княстваў;

- барацьба з крыжацкімі Ордэнамі (пастаянныя ўзаемныя набегі), падтрымка Рыжскага арцыбіскупства ва ўнутранай вайне з Лівонскім Ордэнам;

- заключэнне ў 1325 – 1330 гг. ваенна-палітычнага саюзу з Польскім каралеўствам, скіраванага супраць Тэўтонскага Ордэна (вынікам сталі некалькі паспяховых паходаў супраць крыжакоў);

- удзел у барацьбе за падзел спадчыны Галіцка-Валынскага княства, якое спыніла сваё існаванне ў 1330-я гг., што прыводзіць да разрыву саюзу з Польшчай (сын Гедзіміна Любарт становіцца князем на Валыні);

- захаванне свабоды веравызнання ў ВКЛ для праваслаўных, католікаў і паганцаў; спробы стварэння асобнай Літоўскай праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Новагародку (1317 – 1330); спробы распаўсюджання каталіцызму ў ВКЛ (зварот да рымскага папы 1323 г. з выказваннем намеру рыняцця каталіцызму, запрашэнне ў ВКЛ каталіцкіх манаскіх ордэнаў і мяшчан з каталіцкіх краін).

Пасля гібелі Гедзіміна ў 1341 г. вялікім князем стаў яго сын *Яўнут* (1341-1345). Аднак у выніку змовы іншых князёў на чале з Альгердам і Кейстутам ён быў скінуты.

Падчас праўлення вялікага князя *Альгерда* (1345 – 1377) ВКЛ дасягае сваёй найвышэйшай магутнасці. У гэты перыяд існавала пэўнае двоеўладдзе: Альгерд княжыў у Вільні і Віцебску, валодаў пераважным палітычным уплывам ва ўсходняй частцы ВКЛ, яго брат *Кейстут* княжыў у Троках, Гародні і Берасці і меў пераважны палітычны ўплыў у заходняй частцы ВКЛ. *Асноўныя накірункі* знешняй палітыкі ВКЛ падчас праўлення Альгерда:

- далучэнне да ВКЛ тэрыторый сярэдняга Падняпроўя, Мсціслаўскага і Бранскага княстваў (1358 – 1359);

- паяпяховая барацьба супраць Залатой Арды ў 1350 – 1360-я гг.; пасля *бітвы пад Сінімі водамі 1362 г.* да ВКЛ былі далучаны Кіеўская, Чарнігаўская землі, Падолле;

- барацьба з крыжакамі: крыжакі за 30 год здзейснілі больш 100 рэйдаў на ВКЛ, у адказ адбыліся 42 пагоні (*пагоня* – звычай, калі на абарону краіны збіралася ўсё мужчынскае насельніцтва);

- барацьба за падзел спадчыны Галіцка-Валынскага княства з Польшчай і Венгрыяй (войны 1349-1351 і 1366 гг.); у выніку за ВКЛ была замацавана Валынь;

- барацьба за палітычнае лідэрства ва Ўсходняй Еўропе з *Маскоўскім княствам*, якое з сярэдзіны 14 ст., абапіраючыся на падтрымку Залатой Арды імкнецца да аб'яднання пад сваёй уладай суседніх усходнеславянскіх княстваў: паходы войска Альгерда на Маскву 1368, 1370, 1372 гг.; барацьба за палітычны ўплыў у Ноўгарадзе, Пскове, Цвярскім, Смаленскім княствах; у выніку да ВКЛ далучаны *Вярхоўскія княствы* (невялікія княствы ў чарназемнай паласе сучаснай Расіі).

У рэлігійных адносінах Альгерд з'яўляўся праваслаўным, але імкнуўся да захавання рэлігійнага міру паміж праваслаўнымі і язычнікамі ў дзяржаве; дамагаўся стварэння самастойнай праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ.

*Такім чынам, к канцу княжання Альгерда ВКЛ з'яўлялася адной з буйнейшых дзяржаў у тагачаснай Еўропе, якая ахоплівала тэрыторыі сучасных Беларусі, Літвы, большай часткі Украіны, некаторых абласцей*

*Расіі і Польшчы*. Можна вылучыць *асноўныя шляхі ўключэння асобных княстваў і тэрыторый у склад ВКЛ*:

- заключэнне дагавораў з асобнымі княствамі на добраахвотнай аснове (напрыклад, Полацкае княства);
- устанаўленне васальных адносін праз дынастычныя шлюбы (напрыклад, Віцебскае княства);
- ваеннае заваяванне (напрыклад, Кіеўская, Чарнігаўская землі, Падолле).

К канцу 14 ст. Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ўяўляла з сябе *федэратыўны саюз асобных удзельных княстваў* на чале з вялікім князем літоўскім. Першапачаткова ва ўдзельных княствах захоўваліся мясцовыя княскія дынастыі, пазней іх замянілі розныя галіны пануючай літоўскай дынастыі.

Асобныя княствы і землі мелі вялікую самастойнасць. Кожнае з іх мела ўласныя органы кіравання, войска, падатковую сістэму, права і традыцыйныя звычаі, нават рэлігію. Асноўным прынцыпам далучэння да ВКЛ быў "даўніны не рушыць навіны не ўводзіць", што дазваляла старой эліце захаваць уладу ў княствах. Падпарадкаванне ўдзельных княстваў вялікаму князю літоўскаму выяўлялася ў наступных з'явах:

- выплата даніны;
- адзіная знешняя палітыка;
- сумесныя ваенныя паходы.

### 3.3. Крэўская унія і яе сацыяльна-палітычныя вынікі.

Пасля смерці Альгерда вялікім князем літоўскім становіцца старэйшы сын Альгерда ад другога шлюбу *Ягайла (1377 - 1392)*. Супраць гэтага выступіў старэйшы сын ад першага шлюбу Андрэй Полацкі, які знайшоў падтрымку ў Пскове, Маскве і Лівоніі, аднак пасля аблогі войскам Ягайлы Полацка вымушаны быў эміграваць (1378). Але палачане таксама прагналі стаўленіка Ягайлы, яго брата Скіргайлу (1379), і туды неўзабаве вярнуўся Андрэй. У 1381 г. супраць Ягайлы ўзняў паўстанне *Кейстут* (1381 – 1382), які на некаторы час здолеў захапіць уладу. Аднак у 1382 г. Ягайла з дапамогай Тэўтонскага Ордэна, палачан, віцеблян і віленцаў вярнуў уладу. Кейстут быз вераломна забіты ў замку ў Крэве, а ягоны сын Вітаўт уцёк да крыжакоў. За аказаную падтрымку Ягайла перадаў Тэўтонскаму Ордэну палову Жамойці.

Ягайлу ўдалося вярнуць сабе ўладу, аднак становішча яго было хісткім. Супраць яго працягвалі барацьбу моцныя канкурэнты – Вітаўт і Андрэй Полацкі, якія мелі моцную падтрымку сярод баярства ў адпаведна заходняй і ўсходняй частках краіны і абапіраліся на знешнепалітычныя сілы (крыжацкія Ордэны, Маскоўскае княства). Баяры ВКЛ патрабавалі гарантый свайго пануючага сацыяльнага становішча. У дадзеных умовах Ягайла знайшоў знешнепалітычнага саюзніка ў абліччы Польскага каралеўства, вынікам чаго стаў заключаны палітычны саюз. Сярод *асноўных прычын* дадзенага саюзу можна вылучыць наступныя:

– агульная для Польшчы і ВКЛ небяспека з боку крыжакоў;

– імкненне Ягайлы заручыцца падтрымкай Польшчы ва ўнутрыпалітычнай барацьбе ў ВКЛ;

– імкненне каталіцкай царквы шляхам уніі ВКЛ з каталіцкай дзяржавай распаўсюдзіць каталіцызм на новых тэрыторыях.

Формай саюзу стаў дынастычны шлюб. У 1382 г. пасля смерці польскага караля Людвіка Баварскага каралевай была абвешчана яго малалетняя дачка Ядвіга. Шляхам шлюбу Ядвігі з Ягайлам польская палітычная эліта імкнуліся атрымаць пасады і землі ў ВКЛ, знайсці моцнага партнёра у барацьбе супраць нямецкай экспансіі.

*15 жніўня 1385 г.* у замку Крэва быў падпісаны дзяржаўна-палітычны саюз паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам – ***Крэўская унія***. *Асноўныя палажэнні Крэўскай уніі*:

- Ягайла ў выніку шлюбу з польскай каралевай Ядвігай станавіўся польскім каралём;
- Польскае каралеўства і ВКЛ аб'ядноўваліся ў адну дзяржаву на чале з адзіным манархам, праводзілі сумесную знешнюю палітыку. Пры гэтым кожная з дзяржаў захоўвала сваю сістэму кіравання, праводзіла самастойную ўнутраную палітыку;
- Ягайла абавязваўся ахрысціць у каталіцкую веру язычніцкае насельніцтва ВКЛ.

Акт Крэўскай уніі быў падпісаны шэрагам буйнейшых прадстаўнікоў палітычнай эліты ВКЛ. У сакавіку 1386 г. Ягайла стаў польскім каралём пад імем *Уладыслаў II*. Ягайла, а таксама значная частка знаці ВКЛ прынялі каталіцызм.

У 1387 г. па ініцыятыве Ягайлы ў ВКЛ было створана каталіцкае Віленскае біскупства; пачалося масавае хрышчэнне язычніцкага балцкага насельніцтва ў каталіцкую веру. У 1387 г. Ягайла выдаў *прывілей*, паводле якога князі і баяры, якія пераходзілі ў каталіцызм, атрымлівалі правы недатыкальнасці асобы і маёмасці, поўнай уласнасці на іх родавыя маёнткі з правам свабодна распараджацца імі, залежныя ад баяр сяляне вызваляліся ад шэрагу дзяржаўных павіннасцяў. Правы баяр-католікаў, такім чынам, прыраўноўваліся да правоў шляхты Польскага каралеўства, што падкрэслівала інтэграцыйную палітыку Ягайлы.

Разам з тым аб'яднанне з Польшчай і ўвядзенне каталіцызму выклікала незадаволенасць палітыкай Ягайлы з боку значнай часткі арыстакратыі ВКЛ, асабліва праваслаўнага веравызнання. Гэта выкарысталі палітычныя канкурэнты Ягайлы ў барацьбе за ўладу ў ВКЛ. У 1386 – 1387 гг. супраць Ягайлы распачынае вайну Андрэй, што скончылася яго паражэннем. У 1388-1392 гг. адбываецца грамадзянская вайна паміж прыхільнікамі Ягайлы і Вітаўта, якога падтрымлівалі крыжакі. У выніку Ягайла быў вымушаны пайсці на саступкі. У 1392 г. было падпісана *Востраўскае пагадненне.* Паводле яго, Вітаўт атрымліваў уладу ў ВКЛ у якасці намесніка Ягайлы, які па-ранейшаму лічыўся вялікім князем літоўскім. Фактычна ў выніку пагаднення рэальная ўлада ў ВКЛ перайшла да Вітаўта, які пачаў праводзіць самастойную палітыку ў адносінах да Польшчы.

*Такім чынам, Крэўская унія стала падзеяй, якая вызначыла ўцягванне Вялікага княства Літоўскага ў арбіту цеснай інтэграцыі з Польскім каралеўствам і ў палітычную сістэму заходнееўрапескага каталіцкага свету. У той жа час унія не прывяла да трывалага дзяржаўнага аб’яднання ВКЛ і Польшчы; яе рэальным вынікам сталі дынастычны (адзінства кіруючай дынастыі) і знешнепалітычны саюз дзвюх дзяржаў.*

### 3.4. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у 15 – першай палове 16 стст.

У выніку Востраўскага пагаднення пачынаецца праўленне ў ВКЛ *Вітаўта* (1392–1430). Афіцыйна тытул вялікага князя ён атрымаў у 1401 г. пры захаванні ўмоўнай васальнай залежнасці ад польскага караля.

Ва ўнутранай палітыцы Вітаўтам праводзілася *цэнтралізацыя дзяржавы*: была ліквідавана большасць удзельных княстваў (у тым ліку Полацкае), а на іх месцы ўтвараліся ваяводствы і намесніцтвы на чале з прызначанымі вялікім князем ваяводамі і намеснікамі. Пасля канчатковага далучэння да ВКЛ Жамойці ў 1411 г. на чале яе адміністрацыйнага апарату быў пастаўлены прызначаны вялікім князем стараста і стаў ажыццяўляцца масавы прымусовы перавод мясцовага язычніцкага насельніцтва ў каталіцызм. Гэта выклікала *паўстанне жамойтаў у 1418 г.*, якое было жорстка падаўлена войскамі Вітаўта.

Палітыка цэнтралізацыі, праводзімая Вітаўтам, выклікалі незадаволенасць княскай арыстакратыі, нашчадкаў Рурыкавічаў і Гедымінавічаў. Гэта выкарыстоўвалі канкурэнты Вітаўта ў прэтэнзіях на пасаду вялікага князя, найбольш значным сярод якіх быў малодшы сын Альгерда Свідрыгайла. У барацьбе з імі Вітаўт абапіраўся перадусім на сярэдняе баярства, асабліва каталіцкага веравызнання. Паводле *Гарадзельскага прывілею 1413 г.* пацвярджаліся ўсе іх грамадзянскія прывілеі, а таксама ўказвалася выключнае права каталіцкіх князёў і баяр займаць вышэйшыя пасады ў сістэме дзяржаўнага кіравання.

У адносінах з Польшчай Вітаўт імкнуўся да максімальнай самастойнасці ВКЛ. Аднак па ўнутры- і знешнепалітычных прычынах працягваў прызнаваць афіцыйную васальную залежнасць ад Польшчы, пацвярджэннем чаго былі *Віленска-Радамская і Гарадзельская уніі* ў 1401 і 1413 гг. Гарадзельская унія замацоўвала перадачу 47 польскіх гербоў 47 шляхецкім родам ВКЛ. Паводле яе, абвяшчалася неадходнасць агульнай згоды прадстаўнікоў Польшчы і ВКЛ на абранне чарговага манарха. Спрабуючы цалкам аднавіць незалежнасць краіны ў 1430 г. Вітаўт паспрабаваў каранавацца як кароль ВКЛ, аднак карону перахапілі ў Польшчы, а сам Вітаўт нечакана памёр.

*Знешняя палітыка ВКЛ падчас праўлення Вітаўта* ўключала наступныя накірункі:

1) *Барацьба з крыжакамі*: Напрыканцы 14 ст. націск крыжакоў Тэўтонскага ордэна на ВКЛ узмацняўся. Паводле пагадненняў 1398 і 1404 гг. ВКЛ прызнавала ўладу Ордэна ў Жамойці. У 1409-1411гг. адбываецца

“Вялікая вайна” паміж ВКЛ і Польшчай, з аднаго боку, і Ордэнам, з другога. Яе кульмінацыяй стала *Грунвальдская бітва 15 ліпеня 1410 г.* (буйнейшая па колькасці ўдзельнікаў бітва Сярэднявечча), падчас якой ордэнскае войска было ўшчэнт разгромлена (загінула каля 18 тыс. крыжакоў і ўсё кіраўніцтва Ордэна). Пасля гэтага на працягу двух месяцаў праводзілася аблога сталіцы ордэна – Мальбарка, але Вітаўт, які апасаўся празмернага ўзмацнення Польшчы, адвеў войскі. Паводле Торуньскага міру 1411 г. тэрыторыя Жамойці і Занёманскай Літвы адыходзіла да ВКЛ, што канчаткова замацаваў Мельнскі мір 1422 г. У выніку вайны Тэўтонскі ордэн спыніў агрэсію на ўсход і пераўтварыўся ў другарадную дзяржаву ў рэгіёне.

2) *Барацьба супраць Залатой Арды*: ВКЛ актыўна падтрымлівае прэтэндэнтаў на ханскі трон ва ўнутрыпалітычнай барацьбе ў Залатой Ардзе. У 1399 г. аб’яднаныя сілы ВКЛ і былога хана Тахтамыша пацярпелі паражэнне ад войскаў Залатой Арды і саюзнага ім цэнтральнаазіяцкага правіцеля Цімура (Тамерлана) на *р. Ворскла*. У гэтай бітве загінула больш 50 князёў, у т.л. Андрэй Полацкі. Вітаўт запрасіў татараў Тахтамыша ў ВКЛ на правах паселенага войска і дараваў ім правы, аналагічныя шляхецкім, акрамя права валодаць хрысціянамі. Выкарыстоўваючы міжусобіцы ў Залатой Ардзе ў 1420-я гг., ВКЛ атрымала Таўрыду і выхад да Чорнага мора.

3) *Усходняя палітыка*: У 1404 г. было канчаткова далучана да ВКЛ Смаленскае княства. Палітычная актыўнасць Вітаўта ў 1424 – 1427 гг. прывяла да таго, што васальную залежнасць ад ВКЛ фактычна прызналі Маскоўскае, Разанскае, Пераяслаўскае і шэраг іншых княстваў, а ў 1428 г. пасля кароткачасоай вайны быў узяты выкуп з Наўгародскай рэспублікі.

4) *Еўрапейская палітыка*: У кантэксце супрацьстаяння Свяшчэннай Рымскай імперыі, якой падпарадкоўваўся Тэўтонскі Ордэн і якому яна аказвала істотную матэрыяльную падтрымку, Вітаўт выступіў у падтрымку *паўстання чэшскіх гусітаў (прадстаўнікоў антыкаталіцкага рэлігійнага руху) 1419 – 1434 гг.*, накіраванага супраць Свяшчэннай Рымскай імперыі і каталіцкай царквы. Вітаўт быў абвешчаны паўстанцамі каралём Чэхіі і даслаў на дапамогу ім у 1422 г. 5-тысячнае войска на чале са сваім намеснікам Жыгімонтам Карыбутавічам. Аднак, дасягнуўшы кампрамісу з імперыяй, у 1423 г. Вітаўт адмовіўся ад чэшскай кароны на карысць Жыгімонта Карыбутавіча, а ў 1424 г. вывеў войскі ВКЛ з Чэхіі.

Пасля смерці Вітаўта, у 1430 г. вялікім князем літоўскім становіцца *Свідрыгайла*. Была скасавана унія з Польшчай і пачаўся ўзброены канфлікт з Польшчай з-за спрэчных тэрыторый на Валыні і Падоллі, для чаго былі заключаны саюзніцкія пагадненні з Ноўгарадам і Лівонскім Ордэнам.

У кастрычніку 1432 г. пры падтрымцы Ягайлы групоўка арыстакратыі, якая абапіралася на саюз з Польшчай, ажыццявіла дзяржаўны пераварот, абвясціла вялікім князем *Жыгімонта Кейстутавіча* (малодшага брата Вітаўта) (1432 – 1440), а таксама аднаўленне уніі з Польшчай. У выніку адбыўся раскол дзяржавы: заходняя частка краіны прызнавала ўладу Жыгімонта Кейстутавіча; усходняя (Полацк, Віцебск, Кіеў) – Свідрыгайлы. Паміж абодвума бакамі пачалася *грамадзянская вайна 1432-1439 гг.* Па

сутнасці вайна стала адлюстраваннем канфлікту паміж дзвюма групоўкамі арыстакратыі.

У лістападзе – снежні 1432 г. войска Свідрыгайлы ажыццявіла паход на Вільню, але ў бітве пад Ашмянамі (студзень 1433 г.) пацярпела паражэнне. Кульмінацыйнай падзеяй у вайне стала бітва пад Вількамірам 1435 г., у якой перамогу атрымалі войскі Жыгімонта. Перамога Жыгімонта ў значнай ступені была абумоўлена пераходам на яго бок часткі праваслаўнай знаці ў выніку прыняцця *прывілеяў 1432 і 1434 гг.*, якія гарантавалі праваслаўнай шляхце роўныя грамадзянскія правы з каталіцкай (акрамя права займаць вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў вялікакняскай радзе). Адыгралі сваю ролю таксама суб'ектыўныя якасці Свідрыгайлы, які быў вельмі нястрыманым чалавекам, у 1435 г. па падазрэнні ў здрадзе спаліў у Віцебску праваслаўнага мітрапаліта Герасіма. У 1436 г. Полацк і Віцебск, а ў 1439 г. Валынь і Падолле прызналі ўладу Жыгімонта Кейстутавіча. Грамадзянская вайна прывяла да гібелі і заняпаду многіх арыстакратычных родаў, перадзелу ўласнасці. У той жа час яна садзейнічала ўзвышэнню сацыяльна-палітычнага значэння сярэдняга баярства.

Падчас свайго праўлення Жыгімонт Кейстутавіч уваходзіць у канфлікт з арыстакратычнымі коламі, праводзячы рэпрэсіўную ўнутраную палітыку. У выніку змовы знаці, Жыгімонт Кейстутавіч быў забіты, а вялікім князем быў абвешчаны малодшы сын Ягайлы *Казімір Ягайлавіч* (1440–1492).

У 1447 г. *Казімір Ягайлавіч* стаў адначасова польскім каралём, што азначала пацвярджэнне персанальнай уніі ВКЛ і Польскага каралеўства. Перад сваім ад'ездам на каранацыю ў Кракаў Казімір стварыў рэгенцкую раду з магнатаў, якая пачала кіраваць ВКЛ у адсутнасць вялікага князя. Падчас праўлення Казіміра Ягайлавіча адбываецца ўзвышэнне новай арыстакратыі (фарміруецца часткова за кошт былых удзельных князёў, часткова за кошт баярства), цэнтрам якой становіцца дарадчы орган улады – Паны Рада. Паводле *прывілею 1447 г.* пацвярджаліся гарантыі асабістай свабоды і недатыкальнасці шляхты, права на свабодны выезд за мяжу, продаж, абмен і перадачу па спадчыне маёнткаў, суд над падданымі сялянамі, абвяшчалася вызваленне шляхецкіх уладанняў ад дзяржаўных павіннасцей і г.д. Частка княскай арыстакратыі была незадаволена спробамі працягу цэнтралізацыі (пераўтварэнне Кіеўскага княства ў намесніцтва ў 1471 г.), падтрымкай пераважна каталіцкай знаці. У яе колах быў падрыхтаваны няўдалы замах на жыццё Казіміра ў 1481 г. (М.Алелькавіч, І. Гальшанскі, Ф.Бельскі).

У знешняй палітыцы Казімір арыентаваўся на мірныя ўзаемаадносіны з суседнімі дзяржавамі, буйнейшымі сярод якіх сталі ў гэты час Маскоўскае княства і *Крымскае ханства* (утворанае у выніку распаду Залатой Арды).

У 1470-1480-я гг. Маскоўскае княства падпарадкавала сабе Наўгародскую рэспубліку, Цвярское княства і шэраг больш дробных княстваў ва Ўсходняй Еўропе фактычна без супрацьдзеяння ВКЛ. Ад ВКЛ да Масковіі перайшлі Вярхоўскія княствы. У выніку геапалітычная ініцыятыва ва Ўсходняй Еўропе пераходзіць да Маскоўскага княства. З 1470-х гг. крымскія

татары, аб’яднаныя пад уладай дынастыі Гірэяў, пачалі рэгулярна ажыццяўляць рабаўнічыя набегі на землі ВКЛ, нават спалілі Кіеў.

Галоўную ўвагу Казімір надаваў польскаму накірунку знешняй палітыкі. У выніку яго дыпламатычных намаганняў прадстаўнікі Ягелонаў сталі венгерскімі (1440-1457, 1490-1526) і чэшскімі (1453–1457, 1471–1526) каралямі. Пасля вайны ў 1453 – 1466 г. у васальную залежнасць ад Польшчы патрапіў Тэўтонскі Ордэн.

Пасля смерці Казіміра вялікім князем становіцца яго сын *Аляксандр Казіміравіч* (1492–1506), з 1501 г. з’яўляўся таксама польскім каралём. Ва ўнутрыпалітычнай сферы падчас яго праўлення адбываецца працэс паслаблення ўлады манарха і ўзмацнення дзяржаўна-палітычнага значэння арыстакратыі – Паноў Рады. Пры абвяшчэнні Аляксандра вялікім князем у 1492 г. адбыўся ***першы агульны з’езд шляхты ВКЛ (вальны сойм)***. У спецыяльным прывілеі 1492 г. вялікі князь абяцаў не прымаць рашэнняў па важных унутрыпалітычных пытаннях без згоды Паноў Рады.

У знешняй палітыцы адбываецца абвастрэнне адносін з Маскоўскім княствам і Крымскім ханствам. У выніку войнаў 1492–1494 гг. і 1500–1503 гг. з Маскоўскай дзяржавай ад ВКЛ адышлі Чарнігаўская, Ноўгарад-Северская, Бранская і Гомельская землі на карысць Масковіі. На мяжы 15 – 16 стст. катастрафічныя вынікі набываюць набегі крымскіх татараў, якія даходзілі да цэнтральных тэрыторый ВКЛ (Менск, Слуцк, Навагародак). Часовае прыпыненне татарскіх набегаў наступіла пасля перамогі войскаў ВКЛ на чале з М. Глінскім у *бітве пад Клецкам ў 1506 г.*

Наступным вялікім князем становіцца брат Аляксандра *Жыгімонт Стары* (1506–1548). Жыгімонт Стары ўвесь час свайго праўлення з’яўляўся адначасова польскім каралём. Тым самым умацоўвалася персанальная унія ВКЛ і Польшчы. На пачатку праўлення Жыгімонта Старога частка арыстакратыі на чале з *Міхалам Глінскім* у 1508 г. узняла мяцеж. Але ён не атрымаў шырокай падтрымкі і быў падаўлены.

У наступныя гады кіравання Жыгімонта Старога ўмацоўвалася роля арыстакратыі (Паноў Рады) ў кіраванні дзяржавай. Праводзілася палітыка рэлігійнай цярпімасці ў яе дачыненні. Праваслаўны магнат Канстанцін Астрожскі насуперак Гарадзельскаму прывілею заняў пасаду віленскага кашталяна (1511) і троцкага ваяводы (1522). Адбывалася кансалідацыя княска-магнацкай эліты як пануючай сацыяльнай групы. У 1540-я гг. пачынаецца фарміраванне руху сярэдняй і дробнай шляхты, які ставіў сваёй мэтай абмежаванне ўсеўладдзя арыстакратыі і саўдзел шляхты ў кіраванні дзяржавай шляхам рэформы заканадаўства (“паправа статутаў”).

У знешняй палітыцы ВКЛ падчас праўлення Жыгімонта Старога найбольш востры характар мелі адносіны з Маскоўскай дзяржавай. З гэтай краінай адбываліся войны 1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. Іх вынікам стаў адыход да Масковіі Смаленска, Себежа, Ноўгарад-Северскай зямлі. У той жа час да ВКЛ быў вернуты Гомель. Буйнейшай падзеяй падчас войнаў з Масковіяй была *бітва пад Оршай 8 верасня 1514 г.*, калі маскоўскія войскі пасля захопу Смаленска спрабавалі ажыццявіць рэйд углыб тэрыторыі ВКЛ,

аднак былі ўшчэнт разбіты 20-тысячным войскам пад кіраўніцтвам гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага (у маскоўскім войску налічвалася 80 тыс. чалавек).

Да канца 1520-х гг. адбываюцца частыя набегі крымскіх татараў, якія заходзілі ўглыб тэрыторыі ВКЛ. Для барацьбы з імі выкарыстоўвалася фартыфікацыі ўкраінскіх магнатаў Вішнявецкіх, Астрожскіх, Чартарыйскіх, а таксама стварэнне пастаяннага памежнага войска з ліку *казакаў* – узброеных атрадаў, што дзейнічалі ў стэпавай паласе паміж ВКЛ і Крымскім ханствам. У адказ на набегі татараў казакі ажыццяўляюць набегі на Крым. У 1527 г. войска ВКЛ і казакаў атрымала буйную перамогу на *р. Альшаніцы*, што прывяло да спынення масавых татарскіх набегаў.

У якасці польскага караля самым значным знешнепалітычным поспехам Жыгімонта Старога стала пераўтварэнне Прусіі (былога Тэўтонскага Ордэна) ў 1525 г. у свецкага васала Польскага каралеўства.

Падчас праўлення *Жыгімонта Аўгуста* (1548–1572), сына Жыгімонта Старога, які з'яўляўся адначасова польскім каралём, адбываецца актывізацыя руху шляхты за ўраўнаванне ў палітычных правах з арыстакратыяй і саўдзел у дзяржаўным кіраванні на ўзор шляхецкай дэмакратыі ў Польшчы. Вялікі князь і Паны Рада ажыццявілі шэраг саступак шляхецкаму руху, вынікам чаго сталі дзяржаўныя рэформы 1560-х гг.:

– *Віленскі прывілей 1563 г.*, паводле якога праводзілася ўраўнаванне ў палітычных правах шляхты ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў;

– *Бельскі прывілей 1564 г.*, які санкцыяніраваў стварэнне выбарных шляхецкіх земскіх судоў, абвяшчэнне роўнасці ўсёй шляхты перад законам;

– *Віленскі прывілей 1565 г.,* паводле якога ствараліся органы шляхецкага мясцовага самакіравання – соймікі;

– рэформа сойма паводле Статута 1566 г.

У знешняй палітыцы галоўным вынікам праўлення Жыгімонта Аўгуста стала далучэнне да ВКЛ Інфлянтаў (Лівоніі) у 1559 – 1561 гг. Да сярэдзіны 16 ст. Лівонская канфедэрацыя канчаткова пераўтварылася ў слабую дзяржаву і стала прадметам супрацьборства суседніх дзяржаў. У 1558 – 1559 гг. большая частка яе тэрыторыі была захоплена маскоўскімі войскамі; частку занялі Швецыя і Данія. У 1559 г. Лівонская канфедэрацыя пераходзіць пад пратэктарат ВКЛ. У 1561 г. большая яе частка далучана непасрэдна да ВКЛ; на тэрыторыі заходняй Латвіі ўтворана залежнае ад ВКЛ *Курляндскае герцагства*. Гэтыя падзеі паклалі пачатак вайны ВКЛ з Масковіяй і Швецыяй у 1561 г., якія таксама прэтэндавалі на землі Лівоніі.

У 1562 г. маскоўскія войскі пераносяць ваенныя дзеянні на тэрыторыю ВКЛ. 15 лютага 1563 г. яны захапілі Полацк. Войскам ВКЛ удалося разбіць праціўніка пад Улай (студзень 1564) і Оршай (люты 1564). Да 1570 г. працягвалася пазіцыйная вайна на тэрыторыі Падзвіння.

*Такім чынам, у 15 – першай палове 16 стст. Вялікае княства Літоўскае знаходзіцца ў межах дзяржаўна-палітычнага саюзу з Польскім каралеўствам, але пры гэтым захоўвае па сутнасці дзяржаўную самастойнасць. Ва ўнутрыпалітычным жыцці адбываецца паступовае*

*ўзмацненне ролі княска-магнацкай арыстакратыі. У знешняй палітыцы на пачатку 15 ст. былі аслаблены ранейшыя галоўныя праціўнікі ВКЛ – крыжакі і Залатая Арда, з канца 15 ст. галоўную ролю набывае супрацьстаянне з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам. Знешнепалітычная напружанасць у сярэдзіне 16 ст. выклікала неабходнасць умацавання дзяржаўнага саюзу ВКЛ з Польшчай.*

### 3.5. Дзяржаўны лад, органы кіравання ВКЛ.

Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае на працягу 14-16 стст. эвалюцыянуе ад *феадальнай патрыярхальна-вотчыннай* да *саслоўна-прадстаўнічай манархіі*.

*Феадальная патрыярхальна-вотчынная манархія* характарызуецца ўладай манарха згодна з замацаванымі звычаямі на тэрыторыі, якая з'яўляецца яго спадчыннай вотчынай; падданыя манарха не маюць акрэсленых палітычных правоў.

*Саслоўна-прадстаўнічая манархія* абапіраецца на прынцып сумеснага кіравання дзяржавай манарха і саслоўных прадстаўнікоў, найперш прадстаўнікоў шляхты, якая атрымлівае правы пануючага саслоўя.

Пры ўваходжанні асобных зямель у склад ВКЛ удзельныя княствы і асобныя гарады заключалі з вялікім князем дагаворы аб яго вярхоўнай уладзе і захаванні мясцовага самакіравання земляў.

*Вялікі князь* з'яўляўся галавой дзяржавы. У яго функцыі ўваходзілі:

- абарона дзяржавы, кіраўніцтва войскам;
- кіраванне правядзеннем унутранай палітыкі;
- ажыццяўленне вышэйшага суда;
- кіраўніцтва адміністрацыйным апаратам дзяржавы;
- кіраванне ажыццяўленнем міжнародных адносін;
- распрацоўка і выданне заканадаўчых актаў.

Улада вялікіх князёў мела спадчынны характар. З 14 ст. кіруючай была дынастыя Гедымінавічаў (Ягелонаў). З канца 15 ст. фарміруецца прынцып выбарнасці вялікіх князёў Панамі Радай і соймам з ліку прадстаўнікоў дынастыі Ягелонаў. Аднак фармальна права спадчыннасці трону захоўвалася да 1564 г. З другой паловы 15 ст. усе свае асноўныя функцыі вялікі князь ажыццяўляў сумесна з Панамі Радай.

Паступова ў дзяржаўна-палітычным жыцці ўзрастае роля такога органа ўлады як *Паны Рада*. Дадзены орган сфарміраваўся на аснове нарад вялікіх князёў у 13-14 стст. з васальнымі князямі і найбольш уплывовымі баярамі. З канца 15 ст. Паны Рада пераўтвараюцца ў пастаянна дзеючы вышэйшы орган цэнтральнай улады ў ВКЛ, што было замацавана прывілеямі 1492 і 1506 гг. Склад Паноў Рады не быў строга вызначаны, у яе ўваходзіла 30-40 асоб. Сярод іх – усе каталіцкія біскупы, вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі і асобныя запрошаныя арыстакраты.

*Функцыі* Паноў Рады:

- удзел у выбарах вялікага князя;
- кантроль за дзейнасцю вялікага князя;

- ажыццяўленне міжнародных адносін;
- кіраўніцтва вышэйшымі цэнтральнымі і мясцовымі органамі кіравання;
- прызначэнне на вышэйшыя дзяржаўныя пасады;
- абмеркаванне і прыняцце законаў;
- ажыццяўленне вышэйшага суда. Большасць з гэтых функцый Паны Рада ажыццяўляла з пачатку 16 ст. разам з вялікім князем, а таксама па ўсіх пытаннях яна магла склікаць сойм.

*Сойм* фарміруецца ў 15 ст. як з’езд прывілеяванага саслоўя – *шляхты ВКЛ*. Да сярэдзіны 16 ст. сойм мог склікацца па рапараджэнню вялікага князя ці Паноў Рады па меры патрэбы. На соймавых пасяджэннях мог прымаць удзел кожны шляхціц. Пытанні, што датычыліся кампетэнцыі сойма, строга вызначыны не былі. Гэта залежыла ад таго, якую праграму рыхтавалі вялікі князь ці Паны Рада. Часцей за ўсё соймы вырашалі наступныя *пытанні*:
- пытанні аб вайне ці міры, міжнародных адносінах;
- збор і памер падаткаў на ваенныя патрэбы;
- прыняцце законаў.

У 1566 г. у выніку правядзення т.зв. “паправы статута” была праведзена рэформа сойма. З гэтага часу ўстанаўлівалася вызначаная сістэма выбараў *дэпутатаў (паслоў)* на соймы. З кожнага павета або ваяводства, якое не падзялялася на паветы, выбіраліся на сходах мясцовай шляхты (сойміках) па два паслы. У той жа час прадстаўнікі буйных арыстакратычных родаў мелі права самастойна прымаць удзел у пасяджэннях сойму. Па сутнасці галоўную ролю на пасяджэннях соймаў мелі Паны Рада, якія вырашалі, якую пастанову ўхваліць сойм.

*Вышэйшыя пасады дзяржаўнага кіравання*:

*Маршалак земскі* – старшыня на паседжаннях Паноў Рады і сойма, кіраўнік вялікакняскай адміністрацыі.

*Маршалак дворны* – загадчык гаспадарчымі справамі вялікакняскага двара.

*Гетман найвышэйшы* – кіраўнік узброенымі сіламі дзяржавы. Меў намеснікаў – *гетмана дворнага* і *гетмана польнага*, што ўзначальвалі частку войска.

*Канцлер* – кіраўнік канцылярыі ВКЛ – ведамства, якое ажыццяўляла дзяржаўнае справаводства, захавальнік дзяржаўнай пячаткі ВКЛ. Намеснік канцлера – *падканцлер*.

*Падскарбі земскі* – захавальнік дзяржаўнай казны (скарба). Яго намеснік – *падскарбі дворны*.

Ніжэйшыя служачыя – *скарбнікі, ключнікі, мытнікі, дзяржаўцы, цівуны* праводзілі рэвізіі, выконвалі пастановы дзяржаўных органаў і судоў.

На важнейшыя дзяржаўныя пасады прызначаліся прадстаўнікі арыстакратыі пажыццёва вялікім князем са згоды Паноў Рады. Сярод іх – Астрожскія, Гаштольды, Хадкевічы, Радзівілы, Валовічы, Кезгайлы, Гальшанскія, Глябовічы, Збаражскія, Кішкі, Забярэзінскія. Афіцыйнай мовай дзяржаўнага справодства ў ВКЛ была *старабеларуская мова*.

Доўгі час ВКЛ не мела аднастайнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. У склад ВКЛ уваходзілі ўдзельныя княствы, што кіраваліся сваімі княскімі дынастыямі, а таксама намесніцтвы на чале з прызначанымі вялікім князем чыноўнікамі. Паступова ўдзельныя княствы ліквідаваліся, расла колькасць намесніцтваў. У 15 – першай палове 16 стст. буйныя намесніцтвы пераўтвараліся ў ваяводствы. Буйныя ваяводствы ў сваю чаргу падзяляліся на паветы. У першай палове 16 ст. існавалі Віленскае, Троцкае, Полацкае, Віцебскае, Наваградскае ваяводствы. Усяго ў гэты час існавала каля 20 адміністрацыйных акруг, межы іх дакладна вызначаны не былі. Розныя часткі дзяржавы мелі розную ступень падпарадкаванасці цэнтру. Так, Полацкае і Віцебскае ваяводствы мелі спецыяльные граматы, дзе пацвярджаліся значныя правы на самакіраванне. У 1565-1566 гг. праведзена *адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа*, згодна з якой тэрыторыя ВКЛ была падзелена на 13 ваяводстваў, а тыя ў сваю чаргу на паветы.

*Органы мясцовага кіравання*

*Ваявода* – кіраўнік адміністрацыйных, гаспадарчых, ваенных і часткі судовых органаў на тэрыторыі ваяводства. Абавязкі ваяводы: падтрыманне парадку; кіраванне дзяржаўнай і вялікікняскай маёмасцю ў ваяводстве; арганізацыя ўзброеных сіл ваяводства; ажыццяўленне суда ў гродскім (замкавым) судзе.

*Кашталян* – камандуючы ўзброенымі сіламі замка ваяводы і апалчэння ваеннаабавязаных ваяводства.

*Падваявода* – намеснік ваяводы, кіраўнік сцовай канцылярыі.

*Староста* – кіраўнік адміністрацыі павета. Яго намеснік – *падстараста*.

*Харужы* – кіраўнік павятовага шляхецкага апалчэння.

*Дзяржаўцы* (цівуны) – кіраўнікі асобных дзяржаўных маёнткаў.

Прызначэнні на дадзеныя пасады ажыццяўлялі вялікі князь і Паны Рада пажыццёва (у Полацкім і Віцебскім ваяводствах – са згоды мясцовага баярства). Найбольш прэстыжнымі былі пасады віленскага і троцкага ваяводы і кашталяна, якія разам з віленскім каталіцкім біскупам займалі важнейшыя месцы ў складзе Паноў Рады.

*Судовая сістэма ВКЛ*

*Агульнадзяржаўныя суды*:

*Вялікакняскі суд*, які паступова аб'яднаўся з судом Паноў Рады – вышэйшая апеляцыйная інстанцыя, якая ажыццяўляла разгляд дзяржаўных злачынстваў, скаргі на вышэйшых асоб дзяржавы, пытанні прыналежнасці да шляхты і г.д.

*Камісарскі суд* – разглядаў спрэчкі аб межах феадальных і дзяржаўных зямельных уладанняў. Справы разглядаліся на месцы камісарамі, якіх прызначаў вялікі князь з Панамі Радай.

*Мясцовыя суды:*

*Гродскі (замкавы) суд* (у ваяводствах, паветах, староствах) – разглядаў самае шырокае кола пытанняў, што датычыліся ўсіх саслоўяў. Узначальваў суд кіраўнік мясцовай адміністрацыі.

*Земскі павятовы суд*, створаны паводле Бельскага прывілею 1564 г. – разглядаў справы ў межах шляхецкага саслоўя. У склад суда ўваходзілі выбарныя суддзі, абраныя шляхтай з ліку мясцовых адукаваных шляхціцаў.

*Падкаморскі суд* разглядаў справы аб межах феадальных землеўладанняў у павеце на чале з прызначанымі вялікім князем суддзямі.

Існавалі таксама асобныя суды для сялян, мяшчан, яўрэяў і г.д.

*Прававая сістэма*

У другой палове 13 – пачатку 16 стст. у розных частках дзяржавы дзейнічалі асобныя нормы звычаёвага права. Перыядычна выдаваліся агульнадзяржаўныя і мясцовыя прывілеі вялікіх князёў.

У 1468 г. вялікім князем Казімірам выдадзены *Судзебнік*. Ён уяўляў з сябе зборнік норм крымінальнага права. Сярод гісторыкаў няма адзінства паводле пытання, ці распаўсюджваўся ён на ўсю тэрыторыю ВКЛ. У дадзеным прававым зборы ўпершыню былі ўведзены прынцып індывідуалізацыі пакарання (абмяжоўвалася адказнасць дзяцей і жонкі за злачынствы мужа), а таксама прынцып неадваротнасці пакарання (раней злачынца мог адкупіцца).

Новы этап эвалюцыі заканадаўства звязаны з выданнем *Статутаў ВКЛ*, у якіх права было сістэматызавана і кадыфікавана.

У *1529 г.* выдадзены *першы Статут ВКЛ* – зборнік норм права, якое распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю ВКЛ. У ім было праведзена размежаванне права па асобных галінах (13 раздзелаў, 282 артыкулы). Дзякуючы Статуту ВКЛ увайшла ў кола дзяржаў, у якіх права стала важным элементам рэгулявання грамадскага і дзяржаўнага жыцця.

Далейшае развіццё нормы агульнадзяржаўнага права атрымалі ў *другім Статуце ВКЛ*, які пачаў дзейнічаць у *1566* г. У яго межах былі адлюстраваныя праведзеныя ў 1563 – 1565 гг. дзяржаўныя рэформы (новы парадак дзейнасці сойма, увядзенне соймікаў і земскіх судоў).

*Такім чынам, на працягу 15 – першай паловы 16 стст. у ВКЛ паступова сфарміравалася саслоўна-прадстаўнічая манархія, у межах якой галоўная роля належала феадальнай арыстакратыі. У гэты час у дзяржаве сфарміравалася адзіная сістэма дзяржаўнага кіравання і заканадаўства, што сведчыла аб станаўленні ВКЛ як цэнтралізаванай дзяржавы.*

**Асноўныя паняцці**:

Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, канцэпцыі ўтварэння ВКЛ, Навагародскае княства, Літва, жамойты, яцвягі, бітва пад Сінімі водамі 1362 г., Крэўская унія, дынастычная унія, вялікакняскія прывілеі, цэнтралізацыя, намесніцтва, Гарадзельская унія, Грунвальдская бітва 1410 г., грамадзянская вайна 1432 – 1439 гг., Маскоўскае княства, Крымскае ханства, Клецкая бітва 1506 г., Аршанская бітва 1514 г., феадальная патрыярхальна-вотчынная манархія, саслоўна-прадстаўнічая манархія, вялікі князь, Паны Рада, сойм, шляхта, маршалак земскі, маршалак дворны, гетман, канцлер, падскарбі, ваяводства, павет, ваявода, кашталян, стараста, вялікакняскі суд,

камісарскі суд, гродскі (замкавы) суд, земскі павятовы суд, падкаморскі суд, Судзебнік 1468 г., Статут ВКЛ 1529 г., Статут ВКЛ 1566 г.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Назавіце асноўныя канцэпцыі стварэння ВКЛ? Як Вы лічыце, якая з канцэпцый найбольш абгрунтаваная?
2. Якія асноўныя прычыны ўтварэння ВКЛ?
3. Якія рэгіёны з'яўляліся цэнтральным ядром фарміравання ВКЛ? Чым гэта можна патлумачыць?
4. Назавіце асноўныя падзеі, звязаныя з узнікненнем ВКЛ?
5. Якія дзяржавы супрацьдзейнічалі стварэнню ВКЛ? Ахарактарызуйце ў цэлым палітыку Міндоўга.
6. Вызначце асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ у апошняй трэці 13 – пачатку 14 стст.
7. З якімі дзяржавамі ВКЛ ваявала ў другой палове 13 – 14 стст.?
8. Пры якіх князях адбываецца набольшы тэрытарыяльны рост ВКЛ?
9. Ахарактарызуйце асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ падчас княжання Гедыміна і Альгерда.
10. Назавіце асноўныя шляхі ўваходжання розных зямель у склад ВКЛ у 14 ст. Якім чынам складваліся адносіны вялікакняскай улады і далучаных рэгіёнаў у ВКЛ?
11. Якія былі асноўныя прычыны Крэўскай уніі? Дайце кароткую характарыстыку грамадска-палітычнай сітуацыі ў ВКЛ напярэдадні уніі.
12. Якія асноўныя палажэнні прадугледжвала Крэўская унія. Падумайце, якая дзяржава мела больш выгады з дадзенага саюзу – Польшча ці ВКЛ?
13. Якія можна вылучыць наступствы Крэўскай уніі для ВКЛ. Якія яна выклікала перамены ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы?
14. Паспрабуйце вызначыць, ці адбылося аб'яднанне ВКЛ і Польшчы пасля Крэўскай уніі ў адну дзяржаву. Абгрунтуйце сваю думку.
15. Дайце агульную характарытыку ўнутранай палітыкі Вітаўта. На якія сацыяльныя слаі абапіраўся ў першую чаргу Вітаўт?
16. Якім чынам складваліся адносіны ВКЛ і Польшчы падчас княжання Вітаўта?
17. Вызначце асноўныя накірункі знешняй палітыкі ВКЛ падчас княжання Вітаўта.
18. Якія можна вылучыць прычыны і наступствы грамадзянскай вайны ў ВКЛ 1432 – 1439 гг. Чым абумоўлена перамога ў вайне прыхільнікаў Жыгімонта Кейстутавіча?
19. Якія істотныя змены ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ адбываюцца ў другой палове 15 – першай палове 16 стст.?
20. Якія новыя знешнепалітычныя праціўнікі з'яўляюцца ў ВКЛ у канцы 15 – першай палове 16 стст.?
21. Назавіце, якія Вам вядомыя войны ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай у канцы 15 – першай палове 16 стст. Да якіх яны прывялі вынікаў?

22. Калі ў ВКЛ фарміруецца шляхецкі палітычны рух? Якія ён выстаўляе патрабаванні? Назавіце асноўныя дзяржаўна-палітычныя рэформы 1560-х гг.
23. Якія факты сведчаць пра тое, што ў ВКЛ ў 14 – першай палове 16 стст. адбываецца эвалюцыя ў бок саслоўна-прадстаўнічай манархіі?
24. Што такое Паны Рада? Якім чынам адбываецца фарміраванне гэтага органа дзяржаўнай улады?
25. Вызначце паўнамоцтвы вялікага князя і Паноў Рады ў дзяржаўна-палітычнай сістэме ВКЛ.
26. Што такое сойм? Прасачыце яго эвалюцыю ў дзяржаўна-палітычнай сістэме ВКЛ.
27. Якім чынам адбываліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэме ВКЛ у 14 – 16 стст.?
28. Якія Вы ведаеце асноўныя пасады ў сістэме цэнтральнага і мясцовага дзяржаўнага кіравання ВКЛ.
29. Назавіце асноўныя органы цэнтральнай і мясцовай судовай улады ў ВКЛ.
30. Якім чынам адбывалася развіццё прававой сістэмы ў ВКЛ у 15 – першай палове 16 ст. Назавіце асноўныя зборнікі права гэтага перыяду.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Гістарычныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ: агульная характарыстыка.
2. Уваходжанне Полацкага княства ў склад ВКЛ: перадумовы, вынікі.
3. Дзяржаўна-прававыя ўзаемаадносіны ВКЛ і Польскага каралеўства ў канцы 14 – першай палове 16 стст.
4. Палітыка ВКЛ падчас княжання Вітаўта ў адносінах Залатой Арды.
5. Паўстанне М. Глінскага 1508 г.: прычыны, ход, вынікі.
6. Шляхецкі палітычны рух у ВКЛ у сярэдзіне 16 ст.: перадумовы, вынікі.
7. Эвалюцыя сістэмы мясцовага дзяржаўнага кіравання ў ВКЛ у 14 – першай палове 16 стст.
8. Статуты ВКЛ 1529 і 1566 г.: гісторыя стварэння, асноўны змест.

## Тэма 4: Сацыяльна-эканамічнае развіцце ВКЛ 14 - 16 стст.

**1. Развіццё сельскай гаспадаркі і феадальных адносін.**
**2. Аграрная рэформа 1557 г. Станаўленне фальваркавай сістэмы.**
**3. Развіццё гарадоў, рамяства і гандлю. Магдэбургскае права.**
**4. Саслоўная структура грамадства.**

### 4.1. Развіццё сельскай гаспадаркі і феадальных адносін.

Асноўнымі заняткамі насельніцтва ў 14 – 16 стст. застаюцца земляробства, жывёлагадоўля і хатняе рамяство. Асноўная сельскагаспадарчая культура – жыта. Таксама вырошчваліся ячмень, пшаніца, авёс, лён, проса, каноплі, гародніна. Асноўныя прылады земляробчай працы – драўляная двурогая саха, плуг, барана. Асноўная цяглая жывёла – коні (на ўсходзе), валы (на захадзе). Пераважныя віды агратэхнікі – трохполле і

двухполле. У паўднёвых і лясістых раёнах працягвала месцамі існаваць падсечна-агнявое земляробства.

Вярхоўным уласнікам усіх зямель ВКЛ намінальна лічыўся вялікі князь. Паводле спосабу ўладання землі падзяляліся на *дзяржаўныя* і *прыватныя*.

*Дзяржаўныя землі* падзяляліся на дзве катэгорыі:

– *валасці* (ворныя землі былі ў асабістым карыстанні сялян, астатнія выкарыстоўваліся калектыўна);

– *гаспадарскія двары* (належалі непасрэдна князю, кіраваліся яго адміністрацыяй і забяспечвалі княжацкі двор і казну ўсім неабходным).

*Шляхі пашырэння прыватнага землекарыстання*:

- падараванні з боку вялікага князя або буйных феадалаў сваім васалам ці царкве;
- купля-продаж;
- залога (застава) з наступным адчужэннем.

Удзельная вага прыватнага землекарыстання павялічваецца з 30% у 14 ст. да 65% у 16 ст.

*Формы прыватнага феадальнага землеўладання*:

1) на пэўны час;
2) пажыццёва або на працягу некалькіх пакаленняў;
3) на вечнасць.

Прыватнае землеўладанне пераважае на захадзе ВКЛ; дзяржаўнае – на ўсходзе.

На працягу 14-16 стст. умацоўвалася прывілеяванае становішча феадальнага землекарыстання. Агульнадзяржаўныя прывілеі 1387, 1413, 1434, 1447 гг., Статуты ВКЛ гарантавалі недатыкальнасць прыватных маёнткаў, вызваленне ад натуральных і грашовых падаткаў, мытных збораў. Утвараюцца вялікія *латыфундыі* буйных феадалаў (Радзівілы, Гаштольды, Кішкі, Глябовічы, Валовічы, Друцкія, Астрожскія і г.д.).

Асноўнай адзінкай сялянскай гаспадаркі і адначасова адзінкай падаткаабкладання з’яўляўся сялянскі двор – *дым*. З некалькіх дымоў утваралася *сельская грамада (абшчына)*. Яна арганізоўвала размеркаванне ворыва і сенакосаў паміж дымамі, выплату падаткаў і выкананне павіннасцяў. Грамадзе належалі выганы, сенажаці, рыбныя ловы, лясныя ўваходы. На агульных сходах грамады выбіраліся старцы, дзесяцкія, соцкія, якія арганізоўвалі ўнутранае размеркаванне зямлі, расклад павіннасцяў пры захаванні кругавой парукі, копны (абшчынны) суд. Сялянская гаспадарка мела амаль выключна натуральны характар.

Паступова к 16 ст. феадалы прысвойвалі сабе права распараджэння абшчыннымі землямі, а потым і ўсімі землямі сялян, выконвалі іншыя функцыі грамады (суд, раскладка павіннасцей, выбар старцаў і г.д.). За карыстанне зямельнымі надзеламі сялян абавязвалі выконваць шматлікія павіннасці, якія змяняліся па меры развіцця феадальных адносін.

Да *асноўных відаў сялянскіх павіннасцей* належылі:

- *Даніна* (натуральны аброк) – асноўны да 16 ст. від павіннасцяў на карысць дзяржавы або феадала. Мела дзве формы:

– “*дзякло*” – даніна жытам, пшаніцай, аўсом, сенам;

– “*мезлева*” – даніна мясам, яйкамі, прадуктамі бортніцтва і паляванння.

- *Паншчына* – адпрацоўкі ў гаспадарскіх і панскіх дварах з дапамогай уласных прылад працы і працоўнай жывёлы (распаўсюдзілася з 15-16 стст.).

- *Чынш* – грашовы аброк (распаўсюдзіўся з 15-16 стст.).

- *Дадатковыя павіннасці*: будаўніцтва і рамонт замкаў, дарог, мастоў, удзел у зборах грошай на ваенныя патрэбы і г.д.

Паводле *юрыдычных прынцыпаў сялянскае насельніцтва падзялялася на наступныя катэгорыі*:

- *людзі пахожыя* – сяляне, якія з’яўляліся асабіста свабоднымі і выконвалі павіннасці на карысць уладальніка зямлі; мелі права змены месца жыхарства;

- *людзі непахожыя* – сяляне, якія выконвалі павіннасці на карысць землеўладальніка і былі асабіста залежнымі ад яго; без дазволу яны не мелі права змяняць месца жыхарства;

- *закупы, радовічы* – сяляне, якія знаходзіліся ў часовай поўнай залежнасці ад уладальніка за атрыманую пазыку або паводле заключанага дагавору;

- *халопы, чэлядзь нявольная* – рабы, якія лічыліся асабістай уласнасцю ўладальніка.

Паводле *спецыфікі выконваемых павіннасцяў сяляне падзяляліся на наступныя групы*:

- *даннікі* – сяляне, што выплочвалі ўладальніку даніну прадукцыяй асабістай гаспадаркі – збожжам, медам, футрам і інш.;

- *асадныя сяляне або чыншавікі* – сяляне, якія выплочвалі грашовы падатак на карысць уладальніка;

- *людзі цяглыя* – сяляне, якія выконвалі на карысць землеўладальніка паншчыну;

- *сяляне-слугі* – прывілеяваная частка сялянства: конюхі, сельскія рамеснікі і прамыславікі, ваенна-служылыя сяляне (баяры панцырныя, путныя, слугі-баяры), сельскі адміністрацыйны апарат (соцкія, старцы і г.д.);

- *агароднікі* – збяднелыя сяляне ці былыя хатнія рабы, якім уладальнік даваў невялікі кавалак зямлі за адпрацоўкі;

- *людзі лёзныя, кутнікі, халупнікі* – беззямельныя сяляне, якія жылі за кошт часовых заробкаў.

У цэлым да 16 ст. у агульнай масе сялянства пераважалі асабіста свабодныя “людзі пахожыя”. Землі, якія знаходзіліся ў непасрэдным карыстанні дзяржавы або феадалаў пры двары, былі невялікімі; для іх апрацоўкі выкарыстоўвалася пераважна праца халопаў, закупаў, радовічаў. Пераважная частка зямлі знаходзілася ў карыстанні сялянскіх абшчын, якія выплочвалі ўладальніку даніну.

*Такім чынам, да сярэдзіны 16 ст. сельская гаспадарка ВКЛ мела пераважна натуральны характар. У яе межах адбывалася паступовае развіццё феадальных адносін.*

## 4.2. Аграрная рэформа 1557 г. Станаўленне фальваркавай сістэмы.

У 15 – 16 стст. у краінах Заходняй Еўропы адбываюцца істотныя грамадскія пераўтварэнні: "Вялікія геаграфічныя адкрыцці", стварэнне каланіяльных імперый, станаўленне мануфактурнай вытворчасці, значны рост гарадоў і пашырэнне гандлю, якія сведчылі пра фарміраванне і развіццё капіталістычных адносін. У Заходняй Еўропе ў сувязі з развіццём прамысловасці і ростам гарадоў рэзка павялічваецца попыт на прадукты харчавання і сельскагаспадарчую сыравіну. З другога боку, назіраецца значны рост цэн у выніку падзення кошту высакародных металаў. Так, пасля адкрыцця Амерыкі ў 1492 г. адтуль за 60 год было вывезена 180 тон золата і 17000 тон срэбра. У выніку кошт высакародных металаў у Еўропе за 1500 – 1600 г. зменшыўся больш чым у 8 разоў. Адбылася так званая "*рэвалюцыя коштаў*", характэрнымі рысамі якой сталі рост цэн на харчаванне і сельскагаспадарчую сыравіну, танныя срэбра і золата. Гэта была вельмі выгадна для вытворцаў і гандляроў збожжам.

Еўрапейскі кантынент ў эканамічным жыцці выразна падзяліўся па "*лініі ракі Эльбы*". На захад ад яе развіваюцца капіталізм, банкі, мануфактурная вытворчасць, урбанізацыя; а на ўсход – адбываюцца развіццё таварнай сельскай гаспадаркі і "другое выданне прыгоннага права" (пазбаўленне сялян асабістай свабоды і прымацаванне да зямлі).

У сувязі з імкненнем дзяржавы і феадалаў да павелічэння даходаў шляхам продажу збожжа ранейшая феадальная сістэма, заснаваная на даніне і натуральнай гаспадарцы, у 16 ст. замяняецца фальваркавай. *Фальварак* – арыентаваная на продаж прадукцыі шматгаліновая таварная гаспадарка, у якой вядучае месца належала вытворчасці збожжа. З фарміраваннем фальваркаў значна пашырыліся ворыўныя землі, якія знаходзіліся ў карыстанні феадалаў, у асноўным за кошт сялянскіх надзелаў. Павялічылася доля паншчыны ў сялянскіх павіннасцях.

Ва ўмовах пашырэння сувязяў са знешнім рынкам для росту дзяржаўных даходаў вялікі князь Жыгімонт ІІ Аўгуст у 1557 г. пачынае правядзенне рэформы ў дзяржаўных маёнтках, якая атрымала назву "*валочная памера*". Падчас рэформы ўся зямля ў маёнтку дзялілася на ўніфікаваныя надзелы – *валокі* памерам каля 23 га. Кавалкі зямлі былі падзелены паводле якасці глебы на "вельмі кепскую", "кепскую", "сярэднюю" і "добрую". Лепшыя валокі адводзіліся пад вялікакняжацкія *фальваркі*. Астатнія валокі раздаваліся ў якасці надзелаў сялянам у *падворнае землекарыстанне*. Для сялянскіх дымоў валока з'ўлялася адзінкай падаткаабкладання і нясення павіннасцей. Суадносіны велічыні фальваркавых і сялянскіх ворыўных земляў у дзяржаўным маёнтку вызначаліся 1:7. Акрамя падворнага надзела, сялянам адводзіліся землі агульнага карыстання: сенажаці, выганы, дубровы і г.д. За абшчынамі было захавана права "ўваходу" і "ўступу" ў пушчы, балоты і азёры маёнтка. Тут сяляне маглі нарыхтоўваць дровы, будаўнічы матэрыял, пасвіць жывёлу, лавіць рыбу.

Сялянскія двары ў залежнасці ад колькасці ворыва ў той ці іншай мясцовасці, магчымасцяў апрацоўкі (колькасці рабочых рук, цяглавай жывёлы, прылад працы) атрымлівалі валоку ці яе частку (палову, чвэрць), з якой выконвалі дакладна ўстаноўленыя павіннасці.

Валочныя надзелы падзяляліся на *цяглыя* (паншчынныя), *асадныя* (чыншавыя), *вольныя* (для сялян-слуг, што вызваляліся ад спецыфічных павіннасцей сялян іншых катэгорый). Цяглыя валокі пераважалі на захадзе дзяржавы; чыншавыя – на ўсходзе. Цяглыя сяляне абавязваліся адпрацоўваць паншчыну два дні на тыдзень з валокі, асадныя сяляне павінны былі плаціць чынш, сума якога залежала ад якасці зямлі. Акрамя таго усе сяляне выконвалі розныя дадатковыя павіннасці і выплочвалі нерэгулярныя падаткі на вайсковыя патрэбы. Сялянскія надзелы падзяляліся на тры часткі. Гэта забяспечвала прымусовы трохпольны севазварот, што спрыяла росту ўраджайнасці.

Да канца 16 ст. рэформа ў дзяржаўных уладаннях была ў асноўным завершана. Яна прывяла да істотнага павелічэння прыбыткаў маёнткаў. *Сацыяльнымі наступствамі рэформы* сталі:

- на захадзе і ў цэнтры ВКЛ была разбурана сялянская абшчына;

- сялянскія гаспадаркі страцілі правы на зямельныя ўчасткі, якія традыцыйна лічыліся іх спадчынным валоданнем;

- асноўнымі формамі сялянскіх павіннасцяў сталі на захадзе паншчына, на ўсходзе –чынш;

- адбываецца паступовае абмежаванне грамадзянскіх свабод большасці сялянства.

Прынцыпы рэфармавання былі пераняты прыватнымі землеўладальнікамі, якія пры стварэнні фальваркаў таксама ажыццяўлялі валочную памеру. Гэтаму спрыяла тое, што з 1609 г. у Рэчы Паспалітай былі адменены ўсе падаткі з продажу тавараў, якія належалі шляхце.

Адначасова са станаўленнем фальваркавай гаспадаркі адбываецца працэс юрыдычнага *запрыгоньвання сялянства*. У яго межах можна вылучыць некалькі этапаў:

1) Прывілей 1447 г. Казіміра Ягайлавіча, згодна з якім замацоўвалася права вотчыннага суду над сялянамі і было забаронена шляхце прымаць беглых і пераманьваць да сябе чужых сялян.

2) Статут ВКЛ 1529 г., які абмежаваў права распараджэння сялян зямлёй без дазволу ўладальніка, а таксама ўстанаўліваў правіла, паводле якога “пахожы” селянін, які пражыў на зямл аднаго ўладальніка звыш 10 гадоў, пераходзіў у катэгорыю “непахожых”.

3) Устава на валокі 1557 г. (пазбаўленне спадчыннага валодання сялянамі зямлі, фактычнае прымацаванне сялян да зямлі).

4) Статут ВКЛ 1566 г., паводле якога быў уведзены 10-гадовы тэрмін пошуку сялян–уцекачоў і абмежавана “пахожасць” адным пакаленнем (ужо сыны перайшоўшага ў другі маёнтак вольнага селяніна станавіліся прыгоннымі).

5) Статут ВКЛ 1588 г., згодна з якім уводзіўся 20-гадовы тэрмін пошуку сялян–уцекачоў і абвешчана аб адмене “пахожасці”.

*Такім чынам, да канца 16 ст. большая частка сялянства страціла асабістую свабоду і трапіла ў залежнасць ад землеўладальнікаў, без дазволу якіх яны не маглі перасяліцца на іншае месца, выбраць іншы від заняткаў; фактычна пазбаўляліся грамадзянскіх правоў. Паступова розныя юрыдычныя катэгорыі сялянства (акрамя сялян-слуг) зліваюцца ў адзіную групу прыгоннага сялянства.*

**4.3. Развіццё гарадоў, рамяства і гандлю. Магдэбургскае права.**

У 14 – першай палове 16 стст. ва ўмовах развіцця феадальных адносін ішоў інтэнсіўны працэс аддзялення рамяства і гандлю ад сельскай гаспадаркі. Гэта суправаджалася ростам *гарадоў* і *мястэчак* (невялікіх гандлёва-рамесных паселішчаў). Калі ў 14 ст. у ВКЛ налічвалася 83 гарады, то да канца 16 ст. каля 530. Насельніцтва гарадоў і мястэчак у асноўным займалася рамяством і гандлем. Жыхары мястэчак і невялікіх гарадоў побач з гэтым былі яшчэ цесна звязаны з апрацоўкай зямлі і сельскагаспадарчымі промысламі.

*Асноўныя крыніцы папаўнення* гарадскога насельніцтва:

- перасяленне сялян (асабліва да сярэдзіны 16 ст.);
- іміграцыя іншаэтнічнага насельніцтва (яўрэяў, татар, караімаў, немцаў, цыган і г.д.).

У той жа час працэс росту гарадскога насельніцтва стрымлівалі войны і запрыгонванне сялян.

Буйнейшымі гарадамі ВКЛ былі ў 16 ст. Полацк (12 тыс. жыхароў), Вільня, Берасце, Гародня, Віцебск, Менск, Навагародак, Слуцк.

Паводле прававога становішча гарады і мястэчкі падзяляліся на вялікакняжацкія і прыватныя. Прыватнымі былі пераважна дробныя гарады і мястэчкі. З пачатку 16 ст. у многіх вялікакняжацкіх гарадах Беларусі пачалі вылучацца асобныя адміністрацыйныя кварталы, якія знаходзіліся пад уладай прыватных асоб – *юрыдыкі*. Мяшчане (гарадское насельніцтва) неслі павіннасці на карысць уладальніка – дзяржавы або феадала: плацілі грашовыя подаці, выконвалі будаўнічыя і гаспадарчыя работы, пастаўлялі падводы (фурманкі) і г.д. Жыхары юрыдык не выплочвалі гарадскія падаткі і не падлягалі гарадскому суду.

У разглядаемую эпоху адной з галоўных палітычных мэт мяшчан была барацьба за права на самакіраванне гарадоў. Гэтым яны забяспечвалі сваю незалежнасць ад судовых і эканамічных злоўжыванняў дзяржаўных чыноўнікаў і феадалаў. У выніку ў канцы 14 – 16 стст. большасць вялікакняжацкіх гарадоў атрымалі права на самакіраванне – *магдэбургскае права*. У немалой ступені гэта было абумоўлена імкненнем вялікіх князёў заручыцца палітычнай падтрымкай гарадоў.

Прывілеі на самакіраванне, якія ўтрымлівалі ранейшыя правы горада і афармлялі іх згодна з еўрапейскімі юрыдычнымі нормамі падпісваў вялікі князь. Правы, што прадастаўляліся гарадам, былі розныя. Агульным было

тое, што мяшчане вызваляліся з-пад адміністрацыйнай і судовай улады ваявод і стараст; замест феадальных павіннасцяў уводзіўся адзіны дзяржаўны грашовы падатак для горада; у горадзе ствараліся *органы самакіравання*.

Першым горадам ВКЛ які атрымаў магдэбурскае права была Вільня (1387). Затым яго атрымалі Берасце (1390), Гародня (1391), Слуцк (1441), Полацк (1498), Менск (1499), Віцебск (1597). Да канца 16 ст. самакіраванне атрымалі ўсе больш-менш значныя гарады ВКЛ.

У гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права, склаліся наступныя *органы гарадскога кіравання*:

- *Войт* – кіраўнік гарадской адміністрацыі і суда. Яго прызначаў вялікі князь з Панамі Радай з ліку шляхты ці знатных гараджан; часам права выбараў войта выкуплялі самі гараджане. Функцыі войта: падтрыманне парадку ў горадзе; вызначэнне правілаў гандлю; збор падаткаў; ажыццяўленне суду. Дапамагаў войту яго намеснік – *ленвойт*.

- *Магістрат* – орган гарадскога самакіравання, які складаўся з рады і лавы. *Рада* вызначала агульны напрамак развіцця гарадской гаспадаркі, займалася добраўпарадкаваннем, абарончымі збудаваннямі, зборам падаткаў, кантралявала гарадскія расходы, ажыццяўляла суд па маёмасных і грамадзянскіх справах. У склад рады ўваходзілі выбраныя мяшчанамі горада *радцы* на чале з адным або некалькімі *бурмістрамі.* Бурмістры выбіралася мяшчанамі ці прызначалася войтам. *Лава* (складалася з войта, ленвойта, лаўнікаў – асоб, выбраных з мяшчан або прызначаных войтам ці радай) займалася разглядам крымінальных і некаторых грамадзянскіх спраў мяшчан.

На першым этапе распаўсюджання самакіравання значную ролю меў *агульны сход мяшчан* (сойм, веча, капа). На ім слухалі справаздачы бурмістраў, складалі скаргі, вызначалі памеры збору сродкаў на гарадскія патрэбы, маглі змясціць некаторых службовых асоб.

Асноўным відам заняткаў мяшчан з'яўлялася *рамяство*. Найбольшае распаўсюджанне мелі наступныя рамёствы:

*апрацоўка металаў* (кавальства, вытворчасць зброі, слясарства, ювелірная справа і інш.);

*апрацоўка дрэва* (выраблялісія асноўныя часткі плугоў, сох, лапаты, вёслы, граблі, а таксама посуд і іншы інвентар, будаваліся жыллё, гаспадарчыя памяшканні, павозкі, караблі);

*ганчарства* (вытворчасць посуду, цэглы, чарапіцы, кафлі);

*апрацоўка скур* (гарбарная, рымарная, кушнерская вытворчасць);

*ткацтва* (шавецтва, кравецтва).

Асноўнай стала работа не на заказ, а на продаж. З'яўляецца асоба скупшчыка, што арганізуе рэгулярны гандаль.

Асноўнай формай грамадскай арганізацыі ў сярэднявечным грамадстве была карпаратыўныя саюзы. З 16 ст. рамеснікі аб'ядноўваюцца ў *цэхі* (брацтвы). Цэхі аб'ядноўвалі рамеснікаў адной ці некалькіх сумежных спецыяльнасцяў аднаго веравызнання і абаранялі іх ад канкурэнцыі з боку сельскіх і іншагародніх рамеснікаў. У 16 ст у гарадах Беларусі налічвалася

каля 100 цэхавых спецыяльнасцяў (срэбнікі, кавалі і г.д.), у 18 ст. – ужо 200. У склад цэха ўваходзіла каля 60-100 чалавек. Сярод членаў цэхаў вылучаліся:

- *Майстры* – самастойныя гаспадары, якія мелі ва ўласнасці прылады працы і майстэрні, дасканала валодалі прафесіяй. З іх ліку на год выбіраўся кіраўнік цэха – *староста* (*цэхмістр)*.

- *Чаляднікі* – падручныя майстроў, якіы прайшлі курс навучання, але не мелі сваіх прылад працы і не атрымалі статусу майстра; пры пэўных умовах (выкананне ўзорнай работы, тэрмін працы і г.д.) чаляднік мог перайсці ў катэгорыю майстра.

- *Хлопцы* – вучні майстроў.

Дзейнасць цэха рэгламентавалася пісьмовым *статутам*. У ім распісваўся парадак навучання, найму вучняў і чаляднікаў, пераход з разраду вучняў у чаляднікі і далей у майстры, адносіны ўнутры цэха, адносіны цэха да рамеснікаў, якія не ўступілі ў цэх, сувязі цэха з гарадскім самакіраваннем. Толькі ўдзельнікі цэхаў маглі прадаваць сваю прадукцыю ў гарадах; рамеснікі, якія не ўваходзілі ў цэх, называліся *партачамі*, у выпадку іх выкрыцця ўладамі і братчыкамі, яны страчвалі тавар і плацілі вялікія штрафы.

Пад уплывам агульнага росту эканомікі адбываецца развіццё *гандлю*. Наладжваецца пастаянны гандаль у гарадах і мястэчках у лавах і крамах. Кожны тыдзень у мястэчках і гарадах праходзілі *таргі* (пераважалі аптовыя і дробнааптовыя аперацыі); у буйных гарадах кожны год праводзіліся *кірмашы*. Узмацняюцца гандлёвыя сувязі розных рэгіёнаў краіны. Гэта стымулявала будаўніцтва дарог-*гасцінцаў*. Самая вялікая звязвала Берасце, Менск з Оршай і Смаленскам.

Ідзе працэс аб'яднання купцоў у *брацтвы* ці *гільдыі*. Яны атрымлівалі дзяржаўныя прывілеі на вядзенне гандлю. Афармілася спецыялізацыя ў сферы гандлю. Міжнародны гандаль ажыццяўлялі "*госці*"; аперацыямі па перапродажу сярэдніх партый тавараў, якія збіраліся па сельскай мясцовасці займаліся "*перасолы*", а дробным разносным гандлем – "*шкоты*" (назва паходзіць ад шатланцаў-наёмнікаў, якія аселі ў ВКЛ).

У сістэме *знешняга гандлю* на экспарт праз Познань, Крулявец і Рыгу вывозіліся тавары лясных промыслаў, збожжа, мёд, лён, радзей – рамесніцкія вырабы; імпарт складалі металы, металічныя паўфабрыкаты і вырабы, сукно, каштоўнае ўзбраенне, прадметы раскошы, віно, селядцы, соль.

*Такім чынам, у сярэднявечных гарадах ВКЛ у 14 -16 стст. адбываліся працэсы, характэрныя для большасці краін рэгіёну: хуткае развіццё рамяства і гандлю, стварэнне сістэмы гарадскога самакіравання, фарміраванне грамадскіх карпарацый.*

**4.4. Саслоўная структура грамадства.**

Усё насельніцтва ВКЛ можна падзяліць на некалькі саслоўяў (станаў):

- *шляхта;*
- *духавенства;*
- *мяшчанства;*

- *сялянства;*

- *іншаканфесійныя станы* (яўрэі, татары).

На працягу 14-16 стст. межы паміж саслоўямі становяца ўсё больш жорсткімі.

Найбольш прывілеяваным саслоўем з'яўлялася *шляхта*. Яе прывілеі:

- выключнае права валодання зямлёй;

- вызваленне ад абавязковых падаткаў;

- выключнае права займаць дзяржаўныя пасады і ўдзельнічаць у палітычным жыцці.

Да сярэдзіны 16 ст. гэтае саслоўе ў прававых адносінах не было аднародным. Найбольшым уплывам карысталіся *магнаты* (князі і паны), якія паходзілі з былых удзельных князёў і некаторых уплывовых баяр. Яны займалі галоўныя дзяржаўныя пасады ў дзяржаве, валодалі вялікімі зямельнымі маёнткамі. З сярэдзіны 16 ст. адбываецца працэс павышэння палітычнага значэння сярэдняй і дробнай шляхты (нашчадкі былых баяр і дваран), сведчаннем чаго з'яўляюцца рэформы 1560-х гг.

*Духавенства* не ўяўляла з сябе адзінай саслоўнай групы. На тэрыторыі ВКЛ дзейнічала каталіцкае, праваслаўнае, з сярэдзіны 16 ст. пратэстанцкае духавенства. Прававы статус іх быў розны. Прывілеяванае становішча займала каталіцкае духавенства; каталіцкія біскупы займалі вышэйшыя месцы ў складзе Паноў Рады. Праваслаўнае духавенства мела вызначаны прававы статус, пацверджаны вялікакняскімі прывілеямі. Асобныя групы духавенства атрымлівалі спецыяльныя прывілеі, а таксама зямельныя падараванні ад вялікіх князёў або магнатаў.

*Мяшчанства* (гарадское насельніцтва) таксама не валодала агульнымі правамі ў межах ВКЛ. Прававое становішча мяшчан залежала ад таго, у якім горадзе яны пражывалі. Значнымі правамі карысталіся жыхары Вільні, Полацка, Берасця, Менска і іншых буйных дзяржаўных гарадоў з правам на самакіраванне і даравальнымі ільготнымі граматамі. Меншымі правамі валодалі жыхары мястэчак і гарадоў, што не мелі права на самакіраванне. Жыхары прыватнаўласніцкіх гарадоў з'яўляліся феадальна залежным насельніцтвам. Мяшчанства падзялялася на некалькі сацыяльных груп:

- *патрыцыят* (заможныя купцы і цэхмайстры);

- *рамеснікі і дробныя гандляры*;

- *гарадскі плебс* (чаляднікі, вучні, “чорныя людзі” – вольнаёмныя рабочыя і жабракі).

*Сялянства* як саслоўе не было аднародным. Сярод сялян вылучаюцца:

- *асабіста свабодныя сяляне*, што выконвалі ваенную службу (баяры путныя, баяры панцырныя, баяры слугі) або займаліся пэўнымі рамёствамі і промысламі (асочнікі, баброўнікі, бортнікі, рыбаловы, стральцы, бондары, ганчары, кавалі, цесляры); паводле статусу былі найбольш набліжаны да дробнай шляхты або мяшчанства;

- шматлікія катэгорыі *феадальна залежнага сялянства* (гл. 4.1); прававое становішча гэтых катэгорый характарызавалі поўная палітычная

бяспраўнасць, абмежаваная грамадзянская правааздольнасць, павышаная крымінальная адказнасць.

У асобныя саслоўі ўключаліся групы нехрысціянскага насельніцтва – *яўрэі, караімы, татары.* Яны валодалі спецыяльнымі правамі, вызначанымі асобымі прывілеямі вялікіх князёў, мелі ўласную аўтаномію: свае органы самакіравання, суды. У адносінах да дзяржавы плацілі павышаныя падаткі (яўрэі) або неслі ваенную службу (татары). У асноўным былі ізаляваны ад хрысціянскага насельніцтва. Яўрэі, якія пражывалі ў розных гарадах, валодалі рознымі правамі.

*Такім чынам, на працягу 14 – 16 стст. у ВКЛ сфарміравалася саслоўная сістэма, характэрная для феадальнага сярэднявечнага грамадства. Прывілеяванае становішча ў межах дадзенай сістэмы займала шляхта.*

**Асноўныя паняцці:**

Воласць, гаспадарскі двор, паншчына, чынш, людзі пахожыя, людзі непахожыя, даннікі, асадныя сяляне, людзі цяглыя, агароднікі, людзі лёзныя, “рэвалюцыя коштаў”, “лінія Эльбы”, валочная памера, фальварак, падворнае землекарыстанне, прыгоннае сялянства, мястэчка, магдэбурскае права, юрыдыка, войт, магістрат, рада, лава, бурмістр, цэх, майстры, чаляднікі, гільдыя, шляхта, духавенства, мяшчанства, сялянства.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Ахарактарызуйце асаблівасці пазямельных адносін у ВКЛ у 14–16 стст.
2. Якімі шляхамі адбывалася пашырэнне феадальнага землеўладання ў ВКЛ у 14 – 16 стст.? Растлумачце прычыны росту прыватнага феадальнага землеўладання ў гэты перыяд.
3. Якія змены адбываліся ў становішчы сялянскай грамады на працягу 14 – 16 стст.?
4. Якія Вам вядомыя катэгорыі сялянства паводле юрыдычнага становішча?
5. Якія асноўныя віды феадальнай рэнты Вы ведаеце?
6. З чым было звязана фарміраванне “лініі Эльбы”? Якім чынам развіццё капіталізму ў Заходняй Еўропе ў 16 ст. паўплывала на эвалюцыю сельскай гаспадаркі ВКЛ?
7. Што такое фальварак? У чым яго адрозненне ад гаспадарскага двара?
8. Укажыце асноўныя палажэнні аграрнай рэформы 1557 г. Якія прычыны яе абумовілі?
9. Вызначце асноўныя вынікі правядзення валочнай памеры ў дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх маёнтках ВКЛ.
10. Назавіце асноўныя этапы запрыгоньвання сялян у ВКЛ.
11. Якія прычыны выклікалі рост гарадоў у ВКЛ у 14 – 16 стст.? Якія можна вызначыць асноўныя шляхі павелічэння гарадскога насельніцтва?
12. Якія адрозненні існавалі ў прававым статусе гарадоў ВКЛ у 14 – 16 стст.?

13. Што такое магдэбурскае права? Калі гэтае права атрымалі асноўныя гарады ВКЛ?
14. Што такое юрыдыкі? У чым палягала адрозненне юрыдычнага становішча гараджан, якія пражывалі ў юрыдыках і на самакіруемых тэрыторыях гарадоў?
15. Вызначце структуру кіравання ў гарадах, якія валодалі магдэбургскім правам.
16. Якія асноўныя віды рамяства атрымалі пашырэнне ў гарадах ВКЛ у 14 – 16 стст.?
17. Што такое цэхі? Дайце агульную характарыстыку дзейнасці цэхаў у гарадах ВКЛ.
18. Якія асноўныя віды гандлю атрымалі развіццё ў ВКЛ у 14 – 16 стст.? Што такое гільдыі?
19. Якія асноўныя саслоўі склаліся ў структуры грамадства ВКЛ у 14 – 16 стст.?
20. У чым выяўлялася прывілеяванае становішча шляхты ў ВКЛ?
21. Якія асноўныя сацыяльныя слаі можна вылучыць у межах мяшчанства ВКЛ?
22. У чым адлюстроўваецца спецыфіка прававога становішча нехрысціянскіх груп насельніцтва ў ВКЛ (яўрэі, татары)?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Эвалюцыя сялянскай грамады ў ВКЛ у 14 – 16 стст.
2. Сяляне – слугі ў ВКЛ.
3. Магдэбургскае права ў Полацку: фарміраванне, інстытуты самакіравання і іх эвалюцыя.
4. Купецкія гільдыі ў ВКЛ у 14 – 16 стст.
5. Фарміраванне шляхецкага саслоўя ў ВКЛ у святле заканадаўчых актаў 14 – 16 стст.
6. Утварэнне яўрэйскай абшчыны ў ВКЛ у 14 – 16 стст.
7. Татары ў ВКЛ: сацыяльна-эканамічнае і палітыка-прававое становішча.

## Тэма 5: Рэлігія і культура ВКЛ у 14 – 16 стст.

**1. Рэлігійныя адносіны ў ВКЛ у 14 – 16 стст.**
**2. Фарміраванне беларускай народнасці.**
**3. Культура ВКЛ у 14 – 16 стст.**

### 5.1. Рэлігійныя адносіны ў ВКЛ у 14 – 16 стст.

Важнейшай часткай жыцця традыцыйнага грамадства з’яўлялася рэлігія. На працягу ўсяго перыяду свайго існавання ВКЛ была *шматканфесійнай дзяржавай*. На яе тэрыторыі існавала некалькі рэлігійных канфесій, якія ў розны час мелі розныя прававы статус і ўплыў у грамадстве. Сярод канфесій, якія дзейнічалі ў ВКЛ, можна вылучыць:

- *хрысціянскія* (каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм);

- *нехрысціянскія* (іудаізм, іслам).

*Рымска-каталіцкая царква.*

Да канца 14 ст. у ВКЛ дзейнічалі толькі невялікія абшчыны католікаў. Пасля Крэўскай уніі 1385 г. каталіцызм становіцца пануючым веравызнаннем у ВКЛ. Ён быў прыняты вялікім князем і значнай часткай арыстакратыі. Прывілеі 1387 і 1413 гг. замацавалі прывілеяванае становішча каталіцкай царквы і каталіцкай шляхты. Каталіцкія біскупы займалі важнейшыя месцы ў складзе Паноў Рады. У канцы 14 – пачатку 15 стст. у каталіцызм было прымусова ахрышчана язычніцкае насельніцтва ВКЛ (пераважна балцкае). У выніку каталіцызм стала вызнаваць большасць насельніцтва ў заходняй, пераважна балцкай, частцы ВКЛ. У той жа час у цэнтры і на ўсходзе ВКЛ да канца 16 ст. колькасць католікаў была нязначнай, нават сярод шляхты. Дзяржаўныя ўлады, а таксама каталіцкая шляхта выдаткоўвалі значныя сродкі на будаўніцтва каталіцкіх храмаў, кляштароў, падаравалі ім землі і іншую маёмасць.

Уся каталіцкая царква прызнае вяршэнства рымскага папы. Паводле структуры яна падзяляецца на *біскупствы*. Усе біскупствы ў ВКЛ падпарадкоўваліся гнезненскаму арцыбіскупу ў Польшчы. На тэрыторыі ВКЛ існавалі наступныя біскупствы:

*Віленскае* (з 1388 г.)

*Жамойцкае* (з 1417 г.)

*Уладзімірска-Луцкае* (з 1425 г.).

У каталіцкай царкве вялікую ролю адыгрывалі *манаскія ордэны*, якія мелі значную аўтаномію ў межах царквы: дамініканцы, францысканцы, аўгусцінцы, бернардзінцы, кармеліты і інш.

*Праваслаўная царква*

Праваслаўе да 17 ст. вызнавала абсалютная большасць насельніцтва ва ўсходняй і цэнтральнай частцы ВКЛ, а таксама істотная частка насельніцтва на захадзе ВКЛ. Да праваслаўнай царквы належала значная частка шляхты ВКЛ. Паводле прывілеяў 1432 і 1434 гг. яна ўраўноўвалася ў грамадзянскіх правах з каталіцкай, а ў выніку прывілею 1563 г. – ураўноўвалася таксама ў палітычных правах. Праваслаўная царква мела шматлікія правы і прывілеі, якія гарантавалі яе функцыянаванне ў ВКЛ. Праваслаўная шляхта выдзяляла значныя сродкі на будаўніцтва праваслаўных храмаў, манастыроў і г.д.

Да канца 16 ст. уся праваслаўная царква ў ВКЛ падпарадкоўвалася Канстанцінопальскаму патрыярхату. На чале праваслаўнай царквы ў ВКЛ знаходзіўся *мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі*, рэзідэнцыя якога з 1458 г. знаходзілася ў Вільні або Навагародку. Кіеўская мітраполія падзялялася да канца 16 ст. на некалькі епархій:

*Кіеўская (мітрапаліцкая)*

*Полацкая*

*Турава-Пінская*

*Уладзімірска-Берасцейская*

шэраг епархій на тэрыторыі Украіны (*Львоўская, Луцкая, Холмская, Перамышльская*).

У 16 ст. надзвычай вялікую ролю ва ўнутраным кіраванні праваслаўнай царквы сталі адыгрываць свецкія асобы (шляхта, брацтвы ў гарадах), якія захапілі частку функцый духавенства.

*Рэфармацыя*

У 16 ст. на тэрыторыі амаль усёй Еўропы адбываецца *Рэфармацыя* – масавы рэлігійны рух, накіраваны супраць веравучэння і культу каталіцкай царквы і за аднаўленне прынцыпаў першапачатковага хрысціянства паводле Біблії. Перадумовай Рэфармацыі стала пераўтварэнне каталіцкай царквы ў магутную сацыяльна-эканамічную арганізацыю ў Еўропе, багацце якой засноўвалася на вялікім землеўладанні, зборы дзесяціны, гандлю індульгенцыямі (граматамі аб адпушчэнні грахоў за грошы), паборамі за выканнне вернікамі абрадаў. Веравучэнне і культ каталіцызму ўсё больш аддаляліся ад першапачатковых прынцыпаў хрысціянства. Гэта выклікала незадаволенасць сярод шырокіх слаёў грамадства, у тым ліку кіруючых колаў шэрагу дзяржаў, якія імкнуліся завалодаць уласнасцю каталіцкай царквы.

Фармальным пачаткам Рэфармацыі лічыцца *абвяшчэнне германскім манахам Марцінам Лютэрам у 1517 г. у Вітэнбергу “95 тэз”*, якія былі накіраваныя на рэформу каталіцкай царквы. Вынікам Рэфармацыі стала фарміраванне шэрагу *пратэстанцкіх канфесій* (лютэранства, кальвінізм, баптызм і г.д.).

Пратэстанты абвясцілі Біблію галоўным аўтарытэтам у справах веры, распрацавалі новыя дактрыны веравучэння і культ, якія, на іх думку, адпавядаюць прынцыпам ранняга хрысціянства, закладзеным у Бібліі. Прадстаўнікі рэфармацыйных канфесій выступалі за танную царкву, супраць індульгенцый, за права свецкіх асоб у рэлігійнай абшчыне выбіраць і кантраляваць дзейнасць духавенства, канфіскацыю царкоўнай маёмасці, выкарыстанне народнай мовы ў набажэнствах, а не лаціны, адмаўлялі культ ікон, святых, большасць каталіцкіх абрадаў. Пратэстанты, асабліва кальвіністы, пастуліравалі прынцып вяршэнства Свяшчэннага Пісання ў царкоўным і свецкім жыцці.

Для барацьбы з Рэфармацыяй каталіцкая царква актыўна выкарыстоўвала інквізіцыю, а таксама спецыяльна створаны ў 1540 г. ордэн езуітаў. Аднак на працягу 16 ст. паўночна-германскія княствы, шэраг гарадоў-дзяржаў у Швейцарыі, Швецыя, Данія, Англія, Шатландыя, Прусія афіцыйна падтрымалі пратэстантызм. У 1555 г. імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Карл V у Аўгсбургскім прывілеі юрыдычна замацаваў прынцып “чыя зямля таго і вера”, які дазваляў асобным князям у сваіх уладаннях уводзіць каталіцызм або пратэстантызм паводле ўласнага меркавання. У некаторых еўрапейскіх краінах супярэчнасці паміж католікамі і пратэстантамі прывялі да рэлігійных войнаў (Францыя, Нідэрланды).

*Рэфармацыя ў ВКЛ* пачынаецца ў сярэдзіне 16 ст. Вынікам стала ўзнікненне наступных канфесій:

- *евангеліцка-аўгсбургская (лютэранская)*
- *евангеліцка-рэфармацкая (кальвінісцкая)*

- *“Польскія і Літоўскія браты”* (*антытрынітарыі* – радыкальная плынь, якая адмаўляла дагматы аб траістасці Бога і боскасці Хрыста).

*Рэфармацыя ў ВКЛ мела шэраг асаблівасцяў*:

1) Яна не была справакавана жаданнем феадалаў атрымаць маёмасць каталіцкай царквы. У ВКЛ царкве належала 5% зямлі, у той час як, напрыклад, у Англіі 40%. Галоўным матывам прыняцця Рэфармацыі шляхтай было імкненне паставіць пад свой кантроль дзейнасць духавенства і абмежаваць уплыў Рыму.

2) Рэфармацыя распаўсюджвалася, галоўным чынам, сярод шляхты (Радзівілы, Валовічы, Пацы і г.д.) і часткі мяшчанства; і амаль не закранула сялянскія масы. У структуры пратэстанцкіх канфесій галоўную ролю адыгрывалі свецкія апякуны (з ліку уплывовай шляхты).

3) Найбольш уплывовымі накірункамі рэфармацыйнага руху сталі кальвінізм і антытрынітарызм, а не лютэранства.

4) На тэрыторыі ВКЛ Рэфармацыя была скіравана не толькі супраць каталіцкай, але і супраць праваслаўнай царквы.

Асноўнымі шляхамі распаўсюджання Рэфармацыі былі навучанне шляхты ў пратэстанцкіх універсітэтах Заходняй Еўропы, іміграцыя замежных настаўнікаў і мяшчан, цесныя палітычныя і эканамічныя кантакты з пратэстанцкімі Прусіяй і Інфлянтамі. Першай вядомай абшчынай пратэстантаў ВКЛ лічыцца лютэранская ў Слуцку, якая ў 1535 г. атрымала надзел зямлі ў горадзе ад князя Юрыя Алелькавіча. Найбольшае развіццё рэфармацыйнага руху у ВКЛ пачалося з 1553 г., калі канцлер ВКЛ Мікалай Радзівіл “Чорны” на свае сродкі пабудаваў кальвінісцкі збор і друкарню ў Берасці. У 1550-1560-я гг. у ВКЛ ужо ўзнікла 85 кальвінісцкіх і 7 антытрынітарных абшчын. На 1569 г. у складзе Паноў Рады ВКЛ было 15 пратэстантаў, 2 католікі (біскупы), 5 праваслаўных. Для каардынацыі дзеянняў розных рэфармацыйных груп ВКЛ у 1557 г. быў створаны сінод евангеліцка-рэфармацкіх абшчын у Вільні.

Дзейнасць адначасова некалькіх канфесій у ВКЛ прыводзіла да ўсталявання адносна мірных ўзаемаадносін паміж імі, *рэлігійнай талеранцыі*. Паводле *Віленскага прывілею 1563 г.* было абвешчана ўраўнаванне ў палітычных правах шляхты ВКЛ усіх хрысціянскіх веравызнанняў. Пасля стварэння Рэчы Паспалітай у 1573 г. быў абвешчаны акт *Варшаўскай канфедэрацыі*, які прадубліраваў Статут ВКЛ 1588 г., паводле якога ўся хрысціянская шляхта незалежна ад веравызнання атрымлівала роўныя грамадзянскія і палітычныя правы. Злачынствы на рэлігійнай глебе прыраўноўваліся да крымінальных. У большасці самакіруемых гарадоў дзейнічалі прынцыпы рэлігійнай цярпімасці ў адносінах паміж мяшчанамі розных канфесій. У прыватных уладаннях рэлігійная сітуацыя кантралявалася ўладальнікамі. Яны маглі або захоўваць рэлігійную цярпімасць або ствараць перавагі для пэўнага веравызнання або нават праводзіць рэпрэсіі ў адносінах да іншаверцаў нешляхецкага паходжання.

Рэлігійная цярпімасць прадугледжвалася ў ВКЛ для прадстаўнікоў нехрыціянскіх веравызнанняў (яўрэяў, мусульман), замацаваная спецыяльнымі прывілеямі.

*Такім чынам, у 14 – 16 стст. у ВКЛ склалася шматканфесійная сітуацыя. Афіцыйны пануючы статус быў замацаваны за каталіцкай царквой, аднак у грамадскім жыцці мелі таксама моцны ўплыў праваслаўная і пратэстанцкія канфесіі. Гэта прывяло да замацавання рэлігійнай талеранцыі ў міжканфесійных адносінах, пацверджанай на дзяржаўна-прававым узроўні.*

### 5.2. Фарміраванне беларускай народнасці.

Па пытаннях узнікнення *беларусаў як этнічнай супольнасці* ў асяроддзі навукоўцаў розных эпох вызначаюць некалькі падходаў-канцэпцый, асноўныя з якіх:

*Польская* (Л. Галембоўскі): беларусы – гэта сапсаваныя рускімі князямі і праваслаўнай рэлігіяй палякі.

*Вялікаруская* (А. Сабалеўскі, І. Сразнеўскі): беларусы – гэта сапсаваныя польскім уплывам рускія.

*Крывіцкая* (Я. Карскі, В. Ластоўскі): племянны саюз крывічоў разглядаўся як вызначальны фактар у стварэнні дзяржаўных і этнічных структур сучаснай Беларусі.

*Фінская* (І. Ласкоў): першым гістарычна вядомым насельніцтвам Беларусі абвяшчаюцца фіна-вугорскія плямёны. Менавіта яны сталі асновай, на якой сфарміраваўся беларускі народ, з часам славянізаваны. Пацверджаннем гэтага выступаюць шэраг назваў рэк і азёраў (Дзвіна).

*Балцкая* (У.Сядоў): адзначаецца вядучая роля балцкіх плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі. Менавіта яны сфарміравалі культуру і антрапалагічны тып сучасных беларусаў. У выніку славянізацыі балцкага субстрату і сфарміраваліся беларусы, як рускія – у выніку асіміляцыі славянамі вугра-фінаў і татар.

*Крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая* (М. Грынблат, М. Доўнар-Запольскі): беларуская народнасць узнікла ў выніку паступовага аб’яднання розных славянскіх плямёнаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі.

*Савецкая* (С. Токараў): у межах раннефеадальнай дзяржавы Кіеўская Русь у 9–13 стст. сфарміравалася т.зв. старажытнаруская народнасць, на аснове якой у 14 – 16 стст. узнікаюць рускія, украінцы і беларусы.

Працэс фарміравання этнічных супольнасцяў як аб’яднанняў людзей з аднолькавай самасвядомасцю, агульнай тэрыторыяй, эканамічным, палітычным і культурным жыццём мае складаны характар. Першаснымі і найбольш простымі формамі аб’яднання грамадства былі арганізацыі кроўных сваякоў – *роды*. Роды злучаліся спачатку ў плямёны, затым племянныя саюзы і іншыя этнічныя супольнасці. Тэрыторыя Беларусі ў эпоху першабытнага грамадства была заселена фінскімі і балцкімі плямёнамі, якія ў Сярэднявеччы асіміліраваліся славянамі, аднак перадалі частку сваёй культуры новым этнічным аб’яднанням. Этнакультурныя працэсы, якія

адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў сярэднія вякі ўключалі ў сябе славянскія (крывічы, дрыгавічы, радзімічы, валыняне) і балцкія (літва, яцвягі) племянныя этнічныя супольнасці.

Стымулюючым фактарам этнічнай кансалідацыі было ўтварэнне ВКЛ. Падпарадкаванне на працягу другой паловы 13–14 стст. звыш двух дзесяткаў княстваў адзінай цэнтральнай уладзе спрыяла стварэнню агульнай этнічнай тэрыторыі, актывізавала культурныя сувязі паміж рознымі яе тэрытарыяльнымі часткамі. У рамках Вялікага Княства Літоўскага 14 – 18 ст. адбывалася паступовае збліжэнне палітычных, эканамічных і культурных адрозненняў асобных рэгіёнаў, пачалося фарміраванне этнічных і моўных асаблівасцяў, характэрных для беларускай народнасці. *Народнасць* – аб’яднанне людзей на пэўнай тэрыторыі, з агульнай гісторыяй, мовай і культурай, умовамі жыцця. Але ў межах народнасці не было моцнай агульнай самасвядомасці. У 14 – 16 стст. розныя сацыяльныя групы насельніцтва ВКЛ мелі некалькі тыпаў самасвядомасці:

- *рэгіянальная самасвядомасць* (палачане, віцябляне, палешукі, гарадзенцы, жамойты і г.д.);
- *канфесійная самасвядомасць* (Русь, русіны – г.зн. праваслаўныя; лаціняне – г.зн. каталікі);
- *агульнадзяржаўная самасвядомасць* (літвіны, г.зн. жыхары ВКЛ).

З 16 ст. фарміруецца паняцце *літоўскага палітычнага народу*, пад якім разумелася ўся шляхта ВКЛ незалежна ад этнічнага паходжання і веравызнання. Шляхта разглядала сябе як самастойную супольнасць, надзеленую асобымі правамі і этнічна аддзеленую ад астатняга насельніцтва (абгрунтаванню гэтага служылі легенды пра паходжанне арыстакратыі ВКЛ ад старажытных рымлян або ад старажытных стэпавых качэўнікаў – сарматаў, што абумовіла фарміраванне ў 17 – 18 стст. ідэалогіі сарматызму).

Назва *“Беларусь”* узнікла і замацавалася за нашымі тэрыторыямі не адразу. У 12 ст. яна адносіцца да Ўладзіміра-Суздальскага княства. Крыжакі (напр. П. Сухенвірт у 1360) пасля сканчэння ўжывання этноніма “крывічы” у сярэдзіне 13 – 14 стст. размяшчалі Белую Русь паміж Літвой і Масквой, называючы Полацкія, Смаленскія і Пскоўскія землі. У 14 – 16 ст. канфесіёнім “рускі” азначаў праваслаўных Рэчы Паспалітай, у адрозненне ад “маскавітаў” – падданых Масквы. Згодна са звесткамі паляка Я. Чарнкоўскага, Полацк называецца “крэпасцю Белай Русі”, а наёмнік-італьянец у 16 ст. А.Гваніні і яго наступнікі называюць тэрмінам “беларусцы” жыхароў Падзвіння і Падняпроўя, а жыхароў Меншчыны і Гарадзеншчыны азначаюць як “літву”, адрозніваючы ад балтамоўнай “жмудзі”. У 17 – 18 стст. Магілеўская праваслаўная епархія называлася “беларускай”. Толькі ў выніку дзейнасці стваральнікаў беларускай літаратуры і нацыянальнага руху ў 19 – пачатку 20 стст канчаткова этнонім “беларусы” замацаваўся і пачаў прызнавацца за саманазву за ўсімі жыхарамі нашай тэрыторыі.

На працэс фарміравання беларускай народнасці вялікі ўплыў аказвала станаўленне *старабеларускай мовы*, якая фарміруецца на аснове царкоўнаславянскай мовы і мясцовых гаворак і з 14 ст. стала выцясняць з

афіцыйнага ўжытку царкоўнаславянскую мову. У 14 – 16 стст. у асяроддзі шляхты і адукаванага насельніцтва старабеларуская мова замацоўваецца ў якасці асноўнай. Гэтая мова становіцца агульнадзяржаўнай, на ёй выдаюцца дзяржаўныя дакументы, ажыццяўляецца справаводства ў канцылярыі ВКЛ і ва ўсіх рэгіянальных органах улады. З другой паловы 16 ст. у асяроддзі шляхты і адукаванага насельніцтва пачынае пераважаць *польская мова*. Важную ролю ў грамадскім жыцці адыгрывалі таксама *лацінская мова* (мова рымска-каталіцкай царквы, міжнародных зносін) і *царкоўнаславянская мова* (мова праваслаўнай царквы).

*Такім чынам, у 14 – 16 стст. адбываецца працэс фарміравання беларускай народнасці. Аднак гэты працэс запавольваўся шматканфесійным і шматмоўным характарам насельніцтва ВКЛ, наяўнасцю розных тыпаў самасвядомасці ва ўмовах карпаратыўнага сярэднявечнага грамадства.*

**5.3. Культура ВКЛ у 14 – 16 стст.**

Культурнае жыццё ў ВКЛ у 14 – 16 стст. знаходзілася пад пераважным уплывам рэлігіі. У той жа час пад уплывам культурных кантактаў з Заходняй Еўропай і распаўсюджаннем ідэй Адраджэння адбываецца ўмацаванне свецкіх элементаў культуры. Для культуры *Адраджэння* характэрныя павышаная ўвага да праблем чалавека і яго месца ў свеце, свецкіх гуманітарных ведаў і мастацтва, станаўленне нацыянальных моў і літаратур. Культура Адраджэння аказала вялікі ўплыў на адукацыю, станаўленне кнігадрукавання і розныя формы мастацкай культуры ВКЛ.

*Адукацыя*

Да 16 ст. адукацыя ў ВКЛ развівалася вельмі павольна. Яе асноўнымі формамі былі школы пры праваслаўных і каталіцкіх цэрквах і манастырах; у іх праграму навучання якіх ўваходзілі пераважна багаслоўе, граматыка, рыторыка, часткова матэматыка, а таксама хатняя адукацыя пры дварах буйной шляхты. Для атрымання вышэйшай адукацыі ў 15 – 16 стст. распаўсюдзілася практыка выезду шляхецкай моладзі на вучобу ў Кракаўскі ўніверсітэт (Польшча), а таксама заходнееўрапейскія ўніверсітэты (Падуя, Балонья, Вітэнберг, Базэль, Кёльн і г.д.).

З пачаткам Рэфармацыі на сродкі магнатаў, якія яе падтрымлівалі, узнікаюць шматлікія *рэфармацыйныя школы*: кальвінісцкія ў Вільні, Берасці, Слуцку, Заслаўі, Менску і г.д., антытрынітарная – у Іўі. У іх разам з вывучэннем багаслоўя важнае месца надавалася замежным і класічным мовам, гісторыі, рыторыцы. Рэктар антытрынітарнай школы ў Іўі Я. Намыслоўскі распрацаваў і выдаў шэраг падручнікаў па логіцы і прыродазнаўству.

З канца 16 ст. на сродкі шляхты і мяшчан узнікаюць *праваслаўныя брацкія школы* ў Полацку, Віцебску, Магілёве. У іх вывучалася шырокае кола пераважна гуманітарных дысцыплін. Для падрыхтоўкі настаўнікаў адчыніліся праваслаўныя семінарыі ў Менску, Вільні, Берасці. Першымі падручнікамі па граматыцы ўсходнеславянскіх моў былі творы Л. Зізанія (1595) і М. Сматрыцкага (1619).

*Кнігадрукаванне*

Пашырэнне агульнага ўзроўню адукаванасці абумовіла ўзнікненне попыту на кнігі. У 14 – 16 стст. цэнтрамі перапіскі кніг з’яўляліся праваслаўныя манастыры (скрыпторыі ў Навагародку, Полацку, Вільні, Віцебску, Лаўрышаве, Супраслі), дзяржаўная канцылярыя ў Вільні, канцылярыі буйных магнатаў. Аднак скрыпторыі ўжо не маглі задаволіць ўзрастаўшага попыту на кніжнае слова.

Заснавальнікам кнігадрукавання ў ВКЛ з’яўляецца *Францыск Скарына* (каля 1490 – каля 1551). У 1517-1519 гг. у Празе ён пераклаў і выдаў (з каментарыямі) *Псалтыр* і *22 кнігі Старога запавету Бібліі* на старабеларускай мове з істотнымі элементамі царкоўнаславянскай мовы. У 1522 г. Ф. Скарына пераехаў у Вільню, дзе заснаваў першую на тэрыторыі ВКЛ друкарню, з якой вышлі “*Малая падарожная кніжыца*” (1522 г.) і “*Апостал*” (1525 г.).

Да канца 16 ст. у ВКЛ дзейнічалі шматлікія *друкарні* – канфесійныя: пратэстанцкія, праваслаўныя, каталіцкія, а таксама прыватныя, пазаканфесійныя. Выдавалася самая розная літаратура на старабеларускай, польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай мовах – як багаслоўская, так і свецкая, у тым ліку, прававая. Так, ў 1588 г. у друкарні Мамонічаў у Вільні ўпершыню быў надрукаваны Статут ВКЛ.

Вельмі шырокую *кнігавыдавецкую дзейнасць* на тэрыторыі ВКЛ разгарнулі пратэстанты. У 1563 г. на грошы М. Радзівіла Чорнага ў Берасці была выдадзена Біблія. Тэкст быў напісаны па польску, але са значнымі элементамі беларускай лексікі. Рэфармацыйныя друкарні ў 1560-1570-я гг. дзейнічалі ў Берасці, Нясвіжы, Вільні, Слуцку, Лоску, Іўі, Ашмянах. Першую пратэстанцкую кірылічную кнігу (на старажытнабеларускай мове) – “*Катэхізіс”* выдалі *Сымон Будны* і *Лаўрэнцій Крышкоўскі* ў Нясвіжскай друкарні ў 1562 г. У 1570-я гг. у маёнтку Цяпіна на Полаччыне заснаваў друкарню шляхціц – антытрынітарый *Васіль Цяпінскі*, які выдаў “Евангелле” на царкоўнаславянскай мове з паралельным перакладам на старабеларускую мову.

*Літаратура*

У 14 – 16 стст. працягвалася распаўсюджанне *рукапісных зборнікаў,* якія ўключалі ў сябе багаслоўскую, богаслужэбную літаратуру, творы антычных аўтараў. У эпоху Адраджэння да іх дабавіліся пераклады заходнееўрапейскіх *свецкіх раманаў* (найбольш вядомыя ў ВКЛ “Гісторыя пра Атылу”, “Аповесць пра Трыстана і Ізольду”, “Александрыя”, “Троя”).

З 14 ст. у ВКЛ з’явілася *летапісанне*. Найбольш вядомыя яго помнікі – “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” (прыкладна першая трэць 15 ст.), “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага” (першая палова 16 ст.), “Хроніка Быхаўца” (2 чвэрць 16 ст.). У летапісах і хроніках гісторыя мела белетрызаваны характар, абгрунтоўвалася неабходнасць стварэння ВКЛ, абаранялася цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў.

Ва ўмовах шматканфесійнай сітуацыі ў ВКЛ, асабліва пасля Рэфармацыі, шырока распаўсюдзілася *рэлігійна-палемічная літаратура*. Найбольш

вядомымі прадстаўнікамі дадзенага жанру з’яўляліся католікі *Аўгустын Ратундус*, *Пётр Скарга*, пратэстанты *Андрэй Волан*, *Пётр Гілёўскі*, антытрынітарыі *Сымон Будны*, *Марцін Чаховіц*, праваслаўныя *Арцемій*, *Герасім Сматрыцкі*. Ва ўсіх палемічных творах ставіліся па сутнасці адны і тыя ж задачы: абарона ўласнай канфесіі, доказыісціннасці свайго веравызнання, абгрунтаванне правільнасці дзеянняў сваіх прыхільнікаў, абвяржэнне довадаў праціўнікаў і абгрунтаванне ілжывасці іх поглядаў, дыскрэдытацыя дзеянняў праціўнікаў.

Ва ўмовах актывізацыі сацыяльна-палітычнага жыцця ў ВКЛ у 16 ст. шырокае распаўсюджанне атрымлівае *грамадска-палітычная літаратура*. Галоўнымі яе праблемамі становяцца *праблемы дзяржаўна-палітычнага ўладкавання, палітычнай і грамадзянскай свабоды, талеранцыі*. Найбольш вядомымі помнікамі літаратуры гэтага жанру з’яўляюцца прадмовы і пасляслоўі да выдання Біблії *Францыска Скарыны*, “Трактат аб норавах татар, літвінаў і маскавіцян” (каля 1550) *Міхалона Літвіна*, ананімны твор “Размова Паляка з Літвінам” (каля 1565-1566), “Пра палітычную або грамадзянскую свабоду” (1572) *Андрэя Волана*, “Аб свецкай уладзе” (1583) *Сымона Буднага*, а таксама палітычная сатыра (”Прамова Мялешкі”).

Шырока распаўсюджваецца *лацінамоўная паэзія*. Першымі яе помнікамі былі паэма “Пруская вайна” (1516) *Яна Вісліцкага*, у якой аўтар апісвае перамогу над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве, а таксама паэма *Міколы Гусоўскага* “Песня пра зубра” (1523), у якой аўтар, абапіраючыся на асабістыя назіранні і пачуцці, усхваляў мінулае, прыроду і жыхароў ВКЛ, параўноўваючы родны край з волатам беларускіх пушчаў – зубром.

У другой палове 16 ст. распаўсюджваецца *панегірычная паэзія*, якая праслаўляла гербы і гістарычныя дасягненні магнацкіх фамілій ВКЛ. Найлепшымі прадстаўнікамі гэтага накірунку з’яўлюцца *Андрэй Рымша* (каля 1550–пасля 1599), *Ян Радван* (? – пасля 1591).

Адметнай рысай літаратуры эпохі Адраджэння з’яўляецца распаўсюджанне *асабістай карэспандэнцыі, дзённікаў (дыярыюшаў)* і *мемуараў*, якія данеслі да нашых дзён асабістыя назіранні і адчуванні сучаснікаў гістарычных падзей. Яркія малюнкі ўтрымліваюць дзённікі навагародскага шляхціца *Фёдара Еўлашоўскага* (1546 – пасля 1616), нататкі пра падарожжы ў Палесціну *Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі* (1582–1584), у Масковію *Гальяша Пельгрымоўскага* (1601), пра ўдзел у маскоўскай грамадзянскай вайне “Смуце” (1607–1610) *Язэпа Будзілы* і шэраг іншых.

*Архітэктура*

Архітэктура ВКЛ у 14 – 16 стст. знаходзілася пад значным уплывам заходнееўрапейскай культурных стыляў і тэхналогій. Гэта, у першую чаргу, датычылася абарончых збудаванняў, асабістых рэзідэнцый магнатаў і культавых будынкаў пратэстантаў і католікаў. Абсалютная большасць жылля працягвала ствараца з дрэва ў мясцовых традыцыях.

Найбольш значнымі збудаваннямі эпохі, верагодна, зробленымі пад кіраўніцтвам нямецкіх майстроў, з’яўляюцца *замкі 15 ст.* у раманскім і

гатычным стылі ў Вільні, Гародні, Троках, Крэве, Геранёнах, Лідзе, Навагародку.

У перыяд Адраджэння пашыраліся культурныя сувязі буйной шляхты ВКЛ з Італіяй, адкуль запрашаюцца архітэктары для забудовы рэгулярнай гарадской планіроўкі Слуцка, Быхава, Міра, Нясвіжа. Са змяненнем стыляў у будаўніцтве і ўвядзеннем новых прынцыпаў фартыфікацыі прыватныя замкі пачалі трансфармавацца ў *палацава-замкавыя комплексы* (Нясвіж, Гародня, Гальшаны, Ляхавічы). Акрамя іх будаваліся палацы з кампактнай цэнтральна-восевай планіроўкай без унутранага двара (дом-крэпасць у Гайцюнішках, Ружанскі замак).

У культавым будаўніцтве прасочваюцца асноўныя накірункі і стылі характэрныя для Еўропы таго часу: *готыка* (касцёлы ў Ішкалдзі, Іўі, Супрасльская царква-крэпасць, Мікалаеўскі сабор у Берасці), *абарончыя цэрквы* (Мурванка, Сынкавічы, Маламажэйкава) і *барока* (Нясвіжскі і Гарадзенскі фарны касцел). Прычым касцёл у Нясвіжы, які пабудаваў італьянскі архітэктар *Ян Бернардоні* (1587–1594), з'яўляецца другім па часе у свеце помнікам барока.

У адрозненне ад пышнага і ўрачыстага каталіцкага барока пратэстанцкая архітэктура характэрызуецца прастатой і лаканічнасцю форм. Да нашых дзён у Беларусі захаваліся будынкі былых кальвініскіх збораў (Заслаўе, Койданава, Новы Свержань).

З пашырэннем магдэбурскага права ў гарадах узнікла грамадзянская архітэктура – *ратушы,* дзе размяшчаліся органы самакіравання (Нясвіж, другая палова XVI ст.).

*Выяўленчае мастацтва*

Галоўную ролю працягвала адыгрываць культавае мастацтва. *Іканапіс* у 14–15 стст. развіваецца пераважна пад уплывам візантыйскіх узораў. У 16 ст. у іконапісе адчуваюцца рысы Адраджэння – з'яўляюцца элементы бытавога характару і г.д.

У свецкім жывапісе вылучаецца *партрэтны жанр*. Для 14 – 15 стст. характэрны *партрэты-іконы* (прыклад – партрэт-ікона Еўфрасінні Полацкай). На *партрэтах эпохі Адраджэння* пераважае больш аб'ёмнае прадстаўленне чалавека, з'яўляюцца элементы рэалізму, мастакі пачынаюць улічваць законы оптыкі, перспектывы і прапорцый (невядомымі мастакамі створаны партрэты княгіні Кацярыны Слуцкай, князя Юрыя Алелькавіча і г.д. (канец 16 ст.).

З развіццём кнігадрукавання атрымала пашырэнне *кніжная графіка*. Рукапісныя кнігі аздабляліся мініяцюрамі, друкаваныя – гравюрамі. Заснавальнікам кніжнай гравюры ў ВКЛ стаў Францыск Скарына. Яго выданні былі багата аздоблены сюжэтнымі кампазіцыямі і ілюстрацыямі прыкладнога характару, арнаментам.

З пашырэннем у ВКЛ каталіцызму звязана з'яўленне *скульптуры*. Самы ранні помнік драўлянай скульптуры, што захаваўся да нашага часу – "Распяцце" з в. Галубічы Глыбоцкага раёна (14 ст.). У 15–16 стст. у касцёлах з'яўляюцца гатычныя алтары са скульптурамі. Працягваюць развівацца

традыцыі *дэкаратыўнага аздаблення інтэр'ераў* (разьба па дрэве і кафельнае мастацтва).

*Музычнае мастацтва* развівалася пераважна ў межах рэлігійных устаноў. У царкоўных і манастырскіх школах рыхтавалі спевакоў. З будаўніцтвам каталіцкіх храмаў пашыралася *арганная* музычная культура У самым канцы 16 ст. пры каталіцкіх кляштарах сталі ўтварацца *капэлы* – калектывы, якія складаліся з аркестра і групы вакалістаў.

У 14 - 16 стст. шырокую папулярнасць у народзе атрымаў лялечны тэатр – *батлейка*. Прадстаўленні даваліся падчас ярмарак, на рынках; запрашалі лялечнікаў і да двароў магнатаў.

*Такім чынам, у культурным жыцці ВКЛ 14 – 16 стст. назіралася паступовае развіццё адукацыі, літаратуры, розных форм выяўленчага мастацтва, узнікла кнігадрукаванне. Вызначальную ролю пры гэтым меў уплыў заходнееўрапейскай культуры Адраджэння.*

**Асноўныя паняцці:**

Шматканфесійная дзяржава, рымска-каталіцкая царква, праваслаўная царква, брацтва, Рэфармацыя, пратэстантызм, лютэранства, кальвінізм, антытрынітарызм, Віленскі прывілей 1563 г., Варшаўская канфедэрацыя 1573 г., этнагенэз, народнасць, літоўскі палітычны народ, Русь, Літва, Беларусь, старабеларуская мова, Адраджэнне (Рэненсанс), рэфармацыйныя школы, брацкія школы, кнігадрукаванне, летапісанне, палемічная літаратура, панегірычная паэзія, мемуары, дыярыюшы, готыка, барока, ратуша, батлейка.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія асноўныя канфесіі дзейнічалі ў ВКЛ у 14 – 16 стст.?
2. Параўнайце грамадскае і прававое становішча каталіцкай і праваслаўнай цэркваў у ВКЛ у 14 – 16 стст.
3. Якая структура замацавалася ў каталіцкай і праваслаўнай цэрквах у 14 – 16 стст. Зрабіце параўнальны аналіз?
4. Што такое Рэфармацыя? Дзе і калі яна пачалася? Вызначце яе прычыны і наступствы.
5. Калі Рэфармацыя пачалася ў ВКЛ? Якія сацыяльныя слаі насельніцтва найперш яе падтрымалі?
6. Назавіце асноўныя рэфармацыйныя канфесіі, якія дзейнічалі на тэрыторыі ВКЛ у 16 ст.
7. Вызначце асноўныя асаблівасці рэфармацыйнага руху ў ВКЛ.
8. Што такое рэлігійная талеранцыя? Якія факты пацвярджаюць яе функцыянаванне ў ВКЛ у 16 ст.?
9. У чым сутнасць Віленскага прывілею 1563 г. і акту Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.? Ці можна сцвярджаць, што талеранцыя ў ВКЛ мела выключна шляхецкі характар?
10. Назавіце асноўныя канцэпцыі этнагенэзу беларусаў? Якая з гэтых канцэпцый падаецца Вам найбольш пераканаўчай? Абгрунтуйце сваю думку.

11. Што такое народнасць? У межах якой дзяржавы ствараюцца прадумовы для фарміравання беларускай народнасці?
12. Якія тыпы самасвядомасці мелі месца сярод насельніцтва ВКЛ у 14 – 16 стст.? Што азначае паняцце літоўскага палітычнага народу?
13. Калі фарміруецца старабеларуская мова? Які статус яна мела ў ВКЛ?
14. Прасачыце эвалюцыю паняцця "Беларусь".
15. Паспрабуйце вызначыць, якія фактары спрыялі, а якія перашкаджалі фарміраванню беларускай народнасці ў ВКЛ у 14 – 16 стст.
16. Што такое Адраджэнне? Які ўплыў яго ідэі мелі на культуру ВКЛ?
17. Якую ролю адыграла Рэфармацыя ў развіцці адукацыі ў ВКЛ?
18. Калі ў ВКЛ з'яўляецца кнігадрукаванне? Дзе дзейнічалі вядомыя Вам друкарні ў ВКЛ у 16 ст.?
19. Каго з літаратараў эпохі Адраджэння Вы можыце назваць?
20. Якія новыя формы літаратуры ўзнікаюць у 16 ст.?
21. Які будынак лічыцца другой у свеце пабудовай ў стылі барока?
22. Якія стылі былі характэрныя для беларускай архітэктуры эпохі Адраджэння?
23. Якія законы пачынаюць улічваць мастакі ў 16 ст.?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Фарміраванне самастойнай праваслаўнай мітраполіі ў ВКЛ у 14–15 стст.
2. Каталіцкія манаскія ордэны ў ВКЛ у 15 – 16 стст.
3. "Польскія і Літоўскія браты" ў ВКЛ.
4. Рэлігійная талеранцыя ў грамадска-палітычным і сацыяльна-культурным жыцці ВКЛ 14 – 16 стст.
5. Паняцці "Літва" і "Русь" у 14 – 16 стст.
6. Літоўскі палітычны народ: фарміраванне, ідэалогія, самасвядомасць.
7. Рэфармацыйнае кнігадрукаванне на тэрыторыі ВКЛ.
8. Грамадска-палітычная думка ВКЛ 14 – 16 стст.

## Модуль 2. Цывілізацыйная спадчына Новага часу і Беларусь.

### Тэма 6: Грамадска-палітычнае развіццё ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (апошняя трэць 16 – першая палова 17 стст.)

**1. Люблінская унія. Яе перадумовы і вынікі.**

**2. Дзяржаўна-палітычны лад Рэчы Паспалітай і месца ў ім ВКЛ.**

**3. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у канцы 16 – першай палове 17 стст.**

#### 6.1. Люблінская унія. Яе перадумовы і вынікі.

У сярэдзіне 16 ст. назіраецца працэс больш цеснага збліжэння паміж Польшчай і ВКЛ, вынікам якога стала стварэнне адзінай федэратыўнай

дзяржавы. Асноўнымі прычынамі інтэграцыі паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам з’яўляліся:

- імкненне польскай шляхты да пашырэння палітычнага і эканамічнага ўплыву на землі ВКЛ;
- цяжкасці ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны: страта Полацка ў 1563 г., неабходнасць ваенна-палітычнай і фінансавай падтрымкі ад Польшчы;
- імкненне дробнай і сярэдняй шляхты ВКЛ атрымаць прывілеі, якімі на той момант карысталася шляхта ў Польшчы, дзе на той час была ўстаноўлена шляхецкая дэмакратыя;
- наяўнасць працяглага досведу папярэдніх уній;
- асабістая воля караля Жыгімонта Аўгуста.

Ініцыятарам уніі з’яўлялася польская шляхта, якую падтрымліваў кароль. Паводле польскага праекта уніі, прадугледжвалася фактычнае далучэнне ВКЛ да Польскага каралеўства. Палітычная эліта ВКЛ пагаджалася з неабходнасцю уніі ў складаных знешнепалітычных умовах, але ў якасці саюза раўнапраўных дзяржаў. Да захавання найбольшай самастойнасці ВКЛ імкнулася групоўка арыстакратыі на чале з Радзівіламі, якая баялася страты сваёй манаполіі на палітычную ўладу. Паводле прапанаванага ёй праекта уніі, прадугледжвалася стварэнне агульных соймаў Польскага каралеўства і ВКЛ для правядзення агульных выбараў манарха і вырашэння ключавых пытанняў знешнепалітычнай бяспекі пры захаванні асобных соймаў, Паноў Рады, дзяржаўнага апарату, судаводства, войска і фінансавай сістэмы. Іншыя групоўкі арыстакратыі, а таксама сярэдняя і дробная шляхта пазітыўна ставіліся да ідэі уніі. У верасні 1562 г. у вайсковым лагеры пад Віцебскам адбыўся з’езд шляхты ВКЛ, сабранай на вайну з маскоўскімі войскамі, які выступіў з патрабаваннямі стварэння супольных соймаў з Польшчай, уніфікацыі прававой сістэмы ВКЛ і Польшчы; аднак, пры гэтым падкрэслівалася неабходнасць захавання самастойнасці ВКЛ (асобныя дзяржаўныя пасады, войска і г.д.).

10 студзеня 1569 г. у Любліне быў скліка      ны сумесны сойм прадстаўнікоў Польшчы і ВКЛ, на якім вырашалася пытанне уніі дзвюх дзяржаў. Патрабаванні польскай шляхты аб поўным і безумоўным далучэнні ВКЛ да Польшчы былі адхіленыя дэлегацыяй ВКЛ на чале з М. Радзівілам “Рудым”, Я. Хадкевічам, Я. Валовічам, якая пакінула сойм. Пасля гэтага *ў сакавіку 1569 г.* з мэтай прымусіць палітычную эліту ВКЛ да хутчэйшага заключэння уніі *паводле рашэння Жыгімонта Аўгуста да Польшчы была далучана значная частка тэрыторыі ВКЛ*: Кіеўшчына, Валынь, Падолле, Падляшша. Шляхта дадзеных зямель падтрымала гэтую акцыю ў спадзяванні на атрыманне правоў і прывілеяў польскай шляхты (за выключэннем шляхты Мазырскага павета, які застаўся ў складзе ВКЛ). Тэрыторыя ВКЛ зменшылася да тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы. Арыстакратыя ВКЛ выказала пратэст супраць падобных дзеянняў і адмаўлялася працягваць перамовы наконт уніі, аднак шляхта ВКЛ на спецыяльна скліканых сойміках выказалася за унію. Таму дэлегацыя ВКЛ вымушана была вярнуцца на Люблінскі сойм і падпісала акт *Люблінскай уніі 1 ліпеня 1569 г.*

Паводле ўмоваў уніі, ВКЛ і Польскае каралеўства аб'ядноўваліся ў адзіную федэратыўную дзяржаву, якая атрымала назву ***Рэч Паспалітая*** (пераклад з лацінскай мовы – агульная справа, рэспубліка). Унія прадугледжвала наступныя палажэнні:

1) У ВКЛ і Польшчы павінен быць адзіны манарх, які адначасова з'яўляецца польскім каралём і вялікім князем літоўскім. Ён абіраецца сумесна шляхтай абедзвюх дзяржаў.

2) Ствараецца агульны вальны сойм Рэчы Паспалітай, асобныя соймы ВКЛ і Польшчы былі скасаваны.

3) Абвяшчаецца адзінства знешняй палітыкі дзвюх дзяржаў.

4) Абвяшчаецца права на набыццё зямельнай маёмасці шляхтай ВКЛ і Польшчы на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай.

5) Лівонія (Інфлянты) пераўтвараецца ў сумеснае ўладанне ВКЛ і Польшчы (рэальна з 1588 г.), а Курляндскае герцагства становіцца васалам Польшчы і ВКЛ.

6) Абвяшчаецца палітычнае і эканамічнае раўнапраўе шляхты ВКЛ і Польшчы ў межах Рэчы Паспалітай.

7) У ВКЛ захоўваюцца асобная арганізацыя дзяржаўнай улады, заканадаўства, войска, фінансавая і мытная сістэма, а таксама атрыбуты дзяржаўнай улады: герб, пячатка, тытулы.

8) Дзяржаўныя пасады ў ВКЛ і Польшчы маглі займаць толькі мясцовыя ўраджэнцы.

*Такім чынам, у выніку Люблінскай уніі ствараецца новая федэратыўная дзяржава – Рэч Паспалітая. Разам з тым ВКЛ захавала значную самастойнасць у межах дадзенай дзяржавы. Унія стала вынікам кампрамісу паміж шляхтай ВКЛ і Польшчы, яна садзейнічала працэсам палітычнага, эканамічнага і культурнага збліжэння дзвюх дзяржаў. Аб'яднанне садзейнічала пашырэнню палітычных правоў і прывілеяў шляхты ВКЛ. Магнаты ВКЛ, хаця і страцілі былыя пазіцыі ў кіраванні дзяржавай, але захавалі свой палітычны і эканамічны ўплыў.*

### 6.2. Дзяржаўна-палітычны лад Рэчы Паспалітай і месца ў ім ВКЛ.

Формай дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай становіцца *элекцыйная манархія*, пры якой кіраўнік дзяржавы (манарх) атрымлівае ўладу ў выніку выбараў. Са смерцю Жыгімонта Аўгуста (1572) скончылася праўленне ў ВКЛ і Польшчы дынастыі Ягелонаў. З гэтага часу замацоўваецца прынцып пажыццёвага абрання на трон каралёў (вялікіх князёў) з ліку некалькіх кандыдатаў. Як правіла, каралямі выбіраліся прадстаўнікі замежных каралеўскіх дынастый. Працэс выбрання каралёў шляхтай называўся *элекцыя*.

У палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай вядучымі органамі ўлады з'яўляліся кароль і двухпалатны сойм.

Да функцый *караля* належалі:

- абарона дзяржавы, кіраўніцтва войскам;
- кіраванне правядзеннем унутранай палітыкі;

- ажыццяўленне вышэйшага суда;
- кіраўніцтва адміністрацыйным апаратам дзяржавы;
- кіраванне ажыццяўленнем міжнародных адносін;
- зацвярджэнне заканадаўчых актаў;
- прызначэнне чыноўнікаў на вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

Улада караля абмяжоўвалася палатамі сойма. Прававым адлюстраваннем гэтага выступала тое, што перад каранацыяй кароль вымушаны быў зацвердзіць два дакументы – "*пакта канвента*" і "*Генрыкавы артыкулы*", выкананне якіх з'яўлялася ўмовай захавання вернасці шляхты каралю.

"*Пакта канвента*" – акт, у якім пацвярджаліся гарантыі прывілеяў і вольнасцяў дзяржавы, выдадзеных ранейшымі каралямі і вялікімі князямі.

"*Генрыкавы артыкулы*" (назва паходзіць ад першага караля Генрыха Валуа (1573–1574), які іх зацвердзіў у 1573 г.) – акт, які ўтрымліваў палажэнні, што абмяжоўвалі каралеўскую ўладу:

- кароль не меў права прэтэндаваць на перадачу ўлады па спадчыне;
- гарантыі свабоды веравызнання для шляхты ў межах хрысціянства (акт Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г.);
- кожныя два гады павінен склікацца сойм, без згоды якога нельга ўводзіць новыя падаткі і склікаць вайсковае апалчэнне;
- без згоды Сената каралю забаранялася ажыццяўляць міжнародныя справы, прызначаць і звальняць вышэйшых дзяржаўных чыноўнікаў;
- калі кароль не выконваў умоваў "артыкулаў", шляхта мела права на стварэнне *канфедэрацыі* (часовага шляхецкага саюзу, накіраванага на дасягненне пэўнай мэты, у межах якога рашэнні прымаліся большасцю галасоў) і арганізацыю ўзброенага выступлення (*рокаш*).

*Вальны сойм Рэчы Паспалітай* склікаўся з перыядычнасцю раз у два гады. Нярэдка адбываліся надзвычайныя соймы. Як правіла, сойм працягваўся шэсць тыдняў. Месцам правядзення соймаў звычайна была Варшава. Пасля 1673 г. кожны трэці вальны сойм адбываўся на тэрыторыі ВКЛ у Гародні. Функцыі соймаў:

- выбары караля (элекцыйныя і каранацыйныя сеймы);
- пытанні аб вайне і міры;
- збор і памер падаткаў на ваенныя патрэбы;
- міжнародныя пытанні;
- прыняцце законаў (канстытуцый);
- ажыццяўленне суду па крымінальных справах вышэйшых чыноўнікаў;
- прыняцце хадайніцтваў павятовай шляхты.

Вальны сойм складаўся з дзвюх палат: Сената і Пасольскай ізбы.

*Сенат* (каралеўская рада і вышэйшая палата) складаўся з ліку ранейшых сенатараў Польскага Каралеўства, а таксама прадстаўнікоў Паноў Рады ВКЛ (каталіцкія біскупы, ваяводы і кашталяны, маршалак найвышэйшы, канцлер, падканцлер, пабскарбі земскі, маршалак дворны). У Сенаце існавала іерархія сенатарскіх годнасцей. Месца першага сенатара займаў гнезненскі арцыбіскуп. Сенатары ВКЛ і Польскага каралеўства засядалі асобна. Падчас пасяджэнняў сойму сенатары не галасавалі, а выказвалі свае меркаванні

(вотум) па вынесеных на разгляд пытаннях паводле старшынства. Пасля абмеркавання кароль ці па яго даручэнні канцлер фармулявалі агульнае канчатковае рашэнне паводле пэўнага пытання (яно было не аднадумным, а абапіралася на меркаванне большасці сенатараў, да якога далучаўся кароль). У кампетэнцыю Сената ўваходзіла канчатковае рэдагаванне і зацвярджэнне законаў. У поўным складзе Сенат збіраўся рэдка. Сталым органам з’яўлялася выбраная соймам на два гады *рада сенатараў-рэзідэнтаў* (пастаянная дарадчая камісія пры каралю, фактычна існавала з 1606 г.), якая складалася з 16 сенатараў (з 1641 г. – 28) і несла адказнасць перад соймам.

*Пасольская ізба* складалася са 180 паслоў (дэпутатаў), абраных шляхтай. З іх ліку 46 з’яўляліся прадстаўнікамі ад ВКЛ. Выбары дэпутатаў адбываліся на сойміках; у ВКЛ выбіраліся па два паслы ад кожнага ваяводства і павета. На сойміках дэпутатам даваліся інструкцыі, у якіх дакладна вызначаліся палажэнні, якія павінен быў адстойваць на сойме пасол. На пасяджэннях Пасольскай ізбы акрамя паслоў, якія мелі права голасу, прысутнічаць мог любы шляхціц. У Пасольскай ізбе абмяркоўваліся пытанні, прапанаваныя каралём і Сенатам, а таксама выносіліся ўласныя прапановы. Мэтай абмеркавання было дасягненне кансенсусу паводле пэўных пытанняў. Праекты законаў, выпрацаваныя Пасольскай ізбой перадаваліся ў Сенат, які мог уносіць папраўкі, заўвагі, але мог і адхіліць законапраект, што нярэдка прыводзіла да завяршэння сойма без прыняцця рашэнняў.

У дзейнасці сойму існавала права *лібэрум вета* (аднагалоснае прыняцце рашэнняў). Гэта азначала, што з-за выказанай услых нязгоды аднаго пасла адмяняліся ўсе рашэнні сойму. Упершыню дадзенае права было выкарыстана ў 1652 г. Актыўнае яго ўжыванне ў другой палове 17 – 18 стст. прывяло ў выніку да дэзарганізацыі дзейнасці соймаў.

Вынікам працы сойма з’яўляліся *канстытуцыі (ухвалы)*, якія мелі заканадаўчую сілу. Для іх зацвярджэння патрабавалася агульная згода караля, Сената і Пасольскай ізбы. Прадугледжваліся асобныя канстытуцыі для Польшчы і ВКЛ.

Вялікую ролю ва ўнутрыпалітычным развіцці Рэчы Паспалітай мелі перыяды паміж смерцю або адстаўкай чарговага караля і абраннем новага караля, якія мелі назву *бескаралеўі*. У гэтыя перыяды фармальным кіраўніком дзяржавы з’яўляўся архіепіскап гнезненскі. Паводле яго загаду падчас бескаралеўя склікаліся тры соймы:

- *канвакацыйны* – на ім падводзіліся вынікі папярэдняга праўлення, разглядаліся найбольш важныя грамадскія і дзяржаўныя праблемы, вызначалася працэдура выбараў новага караля;

- *элекцыйны* – на ім праходзілі выбары караля з ліку некалькіх кандыдатаў;

- *каранацыйны* – на ім адбывалася каранацыя новаабранага караля, які падпісваў “пакта канвента” і “Генрыкавы артыкулы”.

Асаблівасцю канвакацыйнага і элекцыйнага сеймаў было тое, што на іх не дзейнічала права “лібэрум вета”, што давала магчымасць адначасова праводзіць істотныя дзяржаўныя рэформы.

Значную ролю ў сістэме дзяржаўнай улады мелі органы шляхецкага самакіравання – *соймікі*. Яны ўяўлялі з сябе сходы шляхты пэўнага павета. Існавала некалькі *відаў соймікаў*:

- *перадсоймавыя* – збіраліся напярэдадні соймаў для выбрання паслоў на сойм і выпрацоўкі для іх інструкцый;
- *рэляцыйныя* – збіраліся пасля соймаў, на іх дэпутаты з сойму рабілі справаздачы аб сваёй дзейнасці, прымаліся ўхвалы па рэалізацыі соймавых канстытуцый, а таксама па справах, якія на соймах перадаваліся на разгляд соймікаў (пра згоду на падаткавыя соймавыя ўхвалы, выбранне павятовых зборшчыкаў падаткаў і г.д.);
- *дэпутацкія* – збіраліся штогод для выбараў суддзяў Трыбунала ВКЛ;
- *элекцыйныя* – збіраліся для выбараў кандыдатаў у склад земскага павятовага суда і некаторых іншых мясцовых чыноўнікаў;
- *гаспадарчыя* – збіраліся для вырашэння пытанняў мясцовага гаспадарчага жыцця: размеркаванне падаткаў, выбары падатковых зборшчыкаў падаткаў і г.д. Ва ўмовах дэзарганізацыі дзейнасці соймаў у другой палове 17 – 18 стст. павялічваецца роля соймікаў у арганізацыі грамадска-палітычнага жыцця.

Спецыфічным органам ўлады з’яўляўся *Галоўны соймік ВКЛ*, існаванне якога падкрэслівала аўтаномію ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Ён уяўляў з сябе з’ездаў сенатараў і паслоў, абраных на сойм на павятовых сойміках ад ВКЛ, які склікаўся ў Ваўкавыску ці Слоніме. На галоўных сойміках узгадняліся інструкцыі павятовых соймікаў і пазіцыі соймавых паслоў усіх паветаў ВКЛ, а таксама вызначаліся мэты і задачы ўсіх прадстаўнікоў ВКЛ на агульным сойме. Часамі каралём скліканіся асобныя з’езды прадстаўнікоў шляхты ВКЛ (*віленская канвакацыя*) для вырашэння пэўных пытанняў (галоўным чынам для таго, каб дабіцца ўхвалы на збор падаткаў у тым выпадку, калі такой ухвалы на даваў вальны сойм), а таксама з’езды, скліканне якіх арганізоўвалася сенатарамі або шляхецкай супольнасцю ВКЛ, для вырашэння надзвычайных праблем.

*Судовая сістэма ВКЛ* захавала ў асноўным структуру, якая склалася да Люблінскай уніі. Вышэйшым апеляцыйным судом замест вялікакняскага суда стаў *Трыбунал ВКЛ*, створаны ў 1581 г. і замацаваны Статутам ВКЛ 1588 г. Ён складаўся з ліку суддзяў, абраных ад шляхты кожнага павета на штогадовых дэпутацкіх сойміках. Сесіі Трыбунала праводзіліся ў Вільні (для заходняй часткі ВКЛ) і Менску (для ўсходняй часткі).

*Заканадаўства ВКЛ* ажыццяўлялася на аснове *трэцяга Статута ВКЛ 1588 г.,* які змяшчаў 14 раздзелаў і 488 артыкулаў. Статут замацаваў тыя формы дзяржаўна-палітычнага ладу, якія склаліся пасля Люблінскай уніі. У той жа час Статут вельмі моцна падкрэсліваў дзяржаўную самастойнасць ВКЛ. У ім нічога не гаварылася аб дзяржаўнай сувязі з Польшчай; вышэйшым заканадаўчым органам улады абвяшчаўся сойм ВКЛ, хаця фактычна дзейнічалі супольныя соймы Рэчы Паспалітай. У Статуце падкрэслівалася самастойнасць дзяржаўна-адміністрацыйнага апарату, пячаткі, войска, фінансавай, падатковай, мытнай сістэмы ВКЛ; забаранялася

займанне дзяржаўных пасад і масавае набыццё зямельнай маёмасці асобамі, якія не з'яўляліся ўраджэнцамі ВКЛ (пункт наконт зямельнай маёмасці непасрэдна супярэчыў акту Люблінскай уніі).

У Статуце 1588 г. знайшла адлюстраванне тэорыя дакладнага падзелу ўлада на:

– заканадаўчую (сойм);
– выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат);
– судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, якія выбіраліся шляхтай і не залежалі ад адміністрацыі).

Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзелу ў ВКЛ вылучаліся ваяводствы і паветы:

*Віленскае ваяводства* (*Ашмянскі, Браслаўскі, Віленскі, Вількамірскі, Лідскі паветы);*

*Троцкае ваяводства (Гарадзенскі, Ковенскі, Троцкі, Упіцкі паветы);*

*Новагародскае ваяводства (Ваўкавыскі, Новагародскі, Слонімскі паветы);*

*Менскае ваяводства (Менскі, Рэчыцкі, Мазырскі паветы);*

*Берасцейскае ваяводства (Берасцейскі, Пінскі паветы);*

*Віцебскае ваяводства (Віцебскі, Аршанскі паветы);*

*Полацкае ваяводства;*

*Мсціслаўскае ваяводства;*

*Жамойцкая зямля;*

*Смаленскае ваяводства* (у 1611 – 1654 гг.).

Ва ўмовах элекцыйнай манархіі ўсталявалася *шляхецкая дэмакратыя*, пад якой разумеецца форма грамадска-палітычнага ладу, паводле якой вызначаўся прывілеяваны статус *шляхты як палітычнага народу* (польскага і літоўскага) і яго кіруючая роля ў сістэме дзяржаўнай улады. У рашэнні Віленскага сойму ВКЛ 1566 г., на якім быў прыняты другі Статут ВКЛ, было пацверджана, што ўся шляхта ВКЛ з'яўляецца часткай "адзінага высакароднага народа", абавязак якога абараняць краіну.

Юрыдычна шляхта лічылася адзінай супольнасцю, якая функцыянавала на прынцыпах свабоды і фармальнай роўнасці:

- асабістая недатыкальнасць;
- выключнае права на займанне дзяржаўных пасад і ўдзел ў грамадска-палітычным жыцці;
- свабода веравызнання;
- выключнае права ўласнасці на зямлю;
- раўнапраўе ў межах шляхецкага саслоўя.

Палітычныя рэформы 1560-х гг. і унія з Польшчай прывялі да ліквідацыі пануючага статусу арыстакратыі ВКЛ. Аднак, нягледзячы на фармальную роўнасць, эканамічныя пазіцыі розных слаёў шляхты не былі аднолькавымі. Вылучалася групоўка багатых уплывовых *магнатаў*, пераважна з ліку ранейшых арыстакратычных родаў, а таксама некаторых прадстаўнікоў разбагацеўшай сярэдняй шляхты (Радзівілы, Сапегі, Агінскія, Пацы, Хадкевічы, Храптовічы і г.д.). Дробная і сярэдняя шляхта трапляла ў розныя

формы эканамічнай і палітычнай залежнасці ад магнатаў, пераўтваралася ў яе *кліентэлу*. Такім чынам, паступова шырокія масы шляхты выкарыстоўваліся ў якасці палітычнага інструмента буйнымі магнацкімі групоўкамі, якія фактычна вызначалі грамадска-палітычнае жыццё дзяржавы. Такая сістэма атрымала назву *магнацкая алігархія*. Найбольш яскрава яна праявілася ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ у другой палове 17 – 18 стст.

*Такім чынам, на працягу апошняй трэці 16 – 18 стст. Рэч Паспалітая ўяўляла з сябе элекцыйную манархію, у межах якой сфарміравалася спецыфічная форма грамадска-палітычнага ладу – шляхецкая дэмакратыя. Вялікае княства Літоўскае захавала значную дзяржаўную самастойнаць у межах Рэчы Паспалітай.*

### 6.3. Унутраная і знешняя палітыка ВКЛ у канцы 16 – першай палове 17 стст.

Рэч Паспалітая на момант яе ўтварэння была адной з самых вялікіх дзяржаў Еўрапейскага кантынента. Яе суседзямі з'яўляліся Маскоўская дзяржава, Крымскае ханства (васал Асманскай імперыі), Свяшчэнная Рымская імперыя, Шведскае каралеўства, Малдаўскае і Трансільванскае княствы.

Пасля смерці апошняга караля і вялікага князя з дынастыі Ягелонаў Жыгімонта Аўгуста першым абраным усёй шляхтай Рэчы Паспалітай каралём стаў французскі прынц *Генрых Валуа* (1573 – 1574). Аднак у хуткім часе ён з'ехаў у Францыю, дзе заняў каралеўскі трон.

Наступным каралём быў абраны трансільванскі князь *Стэфан Баторый* (1576–1586). Ва ўнутранай палітыцы ён імкнуўся да ўмацавання цэнтральнай дзяржаўнай улады і войска перадусім для паспяховага завяршэння Інфлянцкай вайны 1558 – 1582 гг. Стэфан Баторый аказваў шырокую падтрымку каталіцкай царкве і асабліва ордэну езуітаў; у той жа час, аднак, прытрымліваўся прынцыпаў рэлігійнай талеранцыі, пацвярджаў правы праваслаўнай царквы, караў удзельнікаў антыпратэстанцкіх пагромаў.

У знешняй палітыцы галоўным накірункам дзейнасці С. Баторыя была барацьба з Маскоўскай дзяржавай за кантроль над Інфлянтамі і адваяванне занятых маскоўскімі войскамі ў 1563 г. зямель ВКЛ. Ваенныя дзеянні паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй аднавіліся ў 1577 г., калі маскоўскія войскі захапілі большую частку Інфлянтаў. Швецыя выступіла ў вайне на баку Рэчы Паспалітай. Паводле рашэння сойма 1578 г., было сабрана вялікае войска, пераважна наёмнае (немцы і венгры). У 1579 г. войскі РП занялі Полацк, а ў наступным годзе – Усвят, Вялікія Лукі, Холм, Старую Русу; у 1581 г. быў узяты ў аблогу Пскоў. Паводле *Ям-Запольскага перамір'я 1582 г.* ВКЛ вярнула Полаччыну. Пад супольнае кіраўніцтва ВКЛ і Польскага каралеўства адышла большая частка Інфлянтаў, толькі поўнач Эстоніі быў далучаны да Шведскага каралеўства. У выніку вайны насельніцтва Полацка скарацілася да 3 тыс. чалавек, а ў рэгіёне пуставала да 2/3 двароў.

Пасля смерці С. Баторыя (1586) у выніку жорсткай палітычнай барацьбы каралём і вялікім князем быў абраны шведскі прынц *Жыгімонт Ваза* (1588–

1532), які па задумцы магнатэрыі павінен быў аб'яднаць пад сваёй уладай Рэч Паспалітую і Шведскае каралеўства, стварыць дынастычную унію і далучыць паўночную Эстонію да Рэчы Паспалітай. У 1594 г. ён быў каранаваны каралём Швецыі, аднак у выніку змовы на чале з будучым каралём Карлам IX Сундэрманландскім у 1598 г. быў пазбаўлены шведскага трона. Гэта прывяло да дынастычнай вайны паміж прыхільнікамі Жыгімонта Вазы і Карла Сундэрманландскага ў Швецыі, якая потым перарасла ў вайну Швецыі і Рэчы Паспалітай.

Унутраная палітыка Жыгімонта Вазы ў першыя дзесяцігоддзі была накіравана на ўмацаванне інстытутаў цэнтральнай улады. Гэта выклікала шырокую незадаволенасць шляхты ВКЛ і Польшчы, вынікам якой стаў узброены *рокаш М. Зэбджыдоўскага – Я. Радзівіла 1606 – 1609 гг.* Рокаш быў падаўлены, аднак, Жыгімонт Ваза адмовіўся ад планаў цэнтралізацыі ўлады. Падчас каралявання Жыгімонта Вазы праводзілася актыўная падтрымка каталіцкай царквы і ордэна езуітаў. На сенатарскія пасады прызначаліся толькі асобы каталіцкага веравызнання; дзякуючы падобнай палітыцы і езуіцкай прапагандзе большая частка пратэстанцкай і праваслаўнай шляхты перайшла ў каталіцызм. Паводле ініцыятывы Жыгімонта Вазы, была ажыццёўлена Берасцейская царкоўная унія 1596 г., якая прадугледжвала далучэнне праваслаўнай царквы да каталіцкай, што выклікала востры *праваслаўна–уніяцкі канфлікт*. У той жа час свабода веравызнання для шляхты была захавана.

Ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ падчас каралявання Жыгімонта Вазы абазначаюцца некалькі значных *сацыяльных праблем*:

- рэлігійныя канфлікты паміж католікамі, праваслаўнымі і пратэстантамі;

- грабежніцкія дзеянні вайсковых наёмнікаў падчас вядзення войнаў і атрадаў казакаў (найбольш значная падзея – казацкае паўстанне Налівайкі 1594-1596 г.);

- праблема арганізацыі фінансавай, падатковай сістэмы, фарміравання, укамплектавання і забеспячэння войска падчас правядзення войнаў.

*Асноўныя накірункі знешняй палітыкі ВКЛ падчас каралявання Жыгімонта Вазы*:

1) *Барацьба са Швецыяй* за кантроль над Інфлянтамі. Яе адлюстраваннем сталі *войны са Швецыяй 1600 – 1611 і 1617 – 1629 гг.* У 1600 – 1611 гг. войскі ВКЛ на чале з Крыштофам Радзівілам і Янам Каралем Хадкевічам сумесна з польскімі войскамі праводзілі паспяховую барацьбу супраць шведскіх войскаў; Інфлянты засталіся пад кантролем РП. Найбольш значнай падзеяй гэтай вайны была перамога войска на чале з Я. К. Хадкевічам *пад Кірхгольмам* (Саласпілс) у 1605 г. Аднак у выніку вайны 1617–1629 гг. шведскія войскі захапілі Рыгу і большую частку Інфлянтаў. Паводле Альтмаркскага перамір'я 1629 г., да Швецыі адышла частка Інфлянтаў на ўсход ад Зах. Дзвіны з Рыгай і прускія порты. Рэч Паспалітая пазбавілася магчымасці развіваць ваены флот на Балтыцы. У складзе Рэчы Паспалітай заставаліся паўночна-усходняя Лівонія (Латгалія) і васальнае Курляндскае герцагства.

2) *Барацьба з Маскоўскай дзяржавай* за геапалітычны кантроль ва Ўсходняй Еўропе і за ўладанне сумежнымі тэрыторыямі. У 1600 г. ва ўмовах барацьбы са Швецыяй кіруючыя колы РП прапаноўвалі ідэю палітычнага саюзу з Масковіяй, накіраванага супраць Швецыі і Турцыі, аднак гэты праект быў адхілены маскоўскімі ўладамі. На пачатку 17 ст. у Маскоўскай дзяржаве пачынаецца грамадзянская вайна ("Смута"), у якой удзельнічалі розныя групоўкі баярства, дваранства, казацтва, мяшчанства. У дадзеных умовах шляхта, мяшчане і казакі Рэчы Паспалітай з мэтай уласнага ўзбагачэння актыўна прымаюць удзел у гэтай вайне на баку Ілжэдмітрыя І (1605–1606), а ў 1608–1609 г. удзельнічалі ў паходзе на Маскву Ілжэдзмітрыя ІІ (Ілжэдзітрыі абвяшчалі сябе цудоўнавыратаваным царэвічам Дзмітрыем Іванавічам, які загінуў пры нявысветленых абставінах у дзіцячым узросце) і змагаліся за трон. Карыстаючыся з відавочнай слабасці Маскоўскай дзяржавы, Рэч Паспалітая пачала *вайну* супраць яе *1609-1618 гг.* Ва ўмовах грамадзянскай вайны большасць маскоўскіх баяр у 1610 г. абвясцілі царом Уладыслава, сына Жыгімонта Вазы. У 1610-1612 гг. войскі Рэчы Паспалітай занялі Маскву. Аднак ва ўмовах унутранай барацьбы ў Масковіі войскі Рэчы Паспалітай былі выдалены ў 1612 г. з Масквы. У 1617-1618 гг. войска на чале з Уладыславам Вазам і казацкім гетманам П. Сагайдачным ажыццявіла паход на Маскву, але ён скончыўся беспаспяхова. Паводле Дэўлінскага перамір'я 1618 г. да ВКЛ адыйшла Смаленская зямля, а ў склад Польшчы ўключаны Чарнігаўская і Ноўгарад-Северская землі.

3) *Барацьба сумесна з Польшчай супраць Крымскага ханства і Асманскай імперыі* за кантроль над тэрыторыямі Ніжняга Падняпроўя і за ўплыў у наддунайскіх княствах (Малдавія, Валахія). Найбольш значнай падзеяй з'яўлялася *вайна з Турцыяй і Крымскім ханствам 1620-1621 гг.* Кульмінацыйным момантам вайны была *Хацімская бітва 1621 г.*, у якой войскі ВКЛ і Польскага каралеўства атрымалі перамогу.

4) *Саюз з Габсбургскай Аўстрыяй.* Рэч Паспалітая аказвала дыпламатычную падтрымку Габсбургскаму блоку ў *Трыццацігадовай вайне* (1618 – 1648), у які ўваходзілі Аўстрыя, Іспанія і шэраг каталіцкіх княстваў Германіі, што супрацьстаялі Швецыі, Францыі, Даніі, Галандыі і пратэстанцкім княствам Германіі.

Новым каралём пасля смерці Жыгімонта Вазы быў абраны яго сын *Уладыслаў Ваза* (1632 – 1648). Ва ўнутранай палітыцы Ўладыслаў спрабаваў вырашыць асноўныя сацыяльныя праблемы, якія існавалі ў дзяржаве. У 1632 – 1635 гг. адбылася легалізацыя праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай і аднаўленне яе іерархіі, што некалькі змякчыла рэлігійную праблему. Аднак рэлігійныя супярэчнасці не былі цалкам вырашаны. Абвастраецца казацкая праблема; казакі, выступаючы за пашырэнне сваіх прывілеяў, выкарыстоўвалі рэлігійнае пытанне, абвяшчаючы сябе абаронцамі праваслаўя.

У знешняй палітыцы РП падчас каралявання Ўладыслава Вазы найбольш значнай падзеяй стала *вайна з Маскоўскай дзяржавай 1632 – 1634 гг.* Мэтай вайны была спроба Масковіі вярнуць сабе Смаленскую зямлю. Маскоўскія войскі ўзялі ў аблогу Смаленск, аднак войска ВКЛ здолела зняць асаду.

Паводле *Палянаўскага міру 1634 г.* былі захаваны ранейшыя межы паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай.

*Такім чынам, у апошняй трэці 16 – першай палове 17 стст. Рэч Паспалітая, і ў яе складзе ВКЛ, з'яўлялася адной з найбольш уплывовых дзяржаў у Еўропе. Аднак у той жа час унутраныя сацыяльна-палітычныя праблемы (барацьба паміж шляхецкімі групоўкамі, міжканфесійныя канфлікты, казацкая праблема) сталі перадумовамі палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай у сярэдзіне 17 ст.*

**Асноўныя паняцці**:

Люблінская унія, Рэч Паспалітая, элекцыйная манархія, кароль, "пакта канвента", "Генрыкавы артыкулы", Вальны сойм, Сенат, Пасольская ізба, лібэрум вета, канстытуцыя (ухвала), бескаралеўе, канвакацыйны сойм, элекцыйны сойм, соймік, Галоўны соймік ВКЛ, Трыбунал ВКЛ, Статут ВКЛ 1588 г., шляхецкая дэмакратыя, палітычны народ, магнацкая алігархія, кліентэла, канфедэрацыя, рокаш.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Укажыце асноўныя прычыны заключэння Люблінскай уніі.
2. Якім чынам розныя групоўкі пануючага саслоўя ў ВКЛ успрымалі ідэю уніі з Польшчай? Чым можна растлумачыць падобныя пазіцыі.
3. Якія тэрыторыі адышлі да Польшчы ў 1569 г.? Падумайце, чаму шляхта дадзеных тэрыторый пазітыўна ўспрыняла дадзеныя змены?
4. Якія асноўныя палажэнні прадугледжвала Люблінская унія?
5. Які статус ВКЛ мела ў складзе Рэчы Паспалітай? Якія з'явы сведчылі пра захаванне дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ?
6. Што такое элекцыйная манархія? Як Вы лічыце, чаму менавіта ў Рэчы Паспалітай склалася такая сістэма дзяржаўна-палітычнага ладу?
7. Падумайце, чаму на каралеўскі трон у Рэчы Паспалітай абіраліся пераважна прадстаўнікі замежных дынастый?
8. Што такое "пакта канвента" і "Генрыкавы артыкулы"? Якім чынам гэтыя дакументы абмяжоўвалі каралеўскую ўладу?
9. Што такое канфедэрацыя і рокаш?
10. Вызначце асноўныя функцыі вальнага сойму? Якой была структура дадзенага органа ўлады?
11. Якія функцыі выконваў Сенат? Якім чынам ён фарміраваўся?
12. Якім чынам фарміравалася Пасольская ізба? Што такое пасольскія інструкцыі?
13. Апішыце ў асноўных рысах ход пасяджэнняў вальных соймаў Рэчы Паспалітай? Што такое канстытуцыі сойму?
14. Што такое лібэрум вета? Якія наступствы выкарыстанне гэтага права мела для развіцця парламенцкай сістэмы Рэчы Паспалітай?
15. Якую ролю ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай мелі бескаралеўі?
16. Што такое Галоўны соймік ВКЛ? Калі ён склікаўся і якія меў функцыі?

17. Вызначце характар фарміравання і кампетэнцыю Трыбунала ВКЛ?
18. Якія дасягненні палітыка-прававой думкі зафіксаваў Статут ВКЛ 1588 г.? Якія палажэнні Статута падкрэслівалі самастойнасць ВКЛ?
19. Што такое шляхецкая дэмакратыя? Якія правы і прывілеі шляхты падкрэслівалі яе выключнае месца ў сацыяльна-палітычным жыцці РП?
20. Якім чынам у сацыяльна-палітычным жыцці ВКЛ сфарміравалася магнацкая алігархія?
21. Назавіце імёны каралёў Рэчы Паспалітай апошняй трэці 16 – першай паловы 17 стст.?
22. Вызначце асноўныя накірункі ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ падчас каралявання Стэфана Баторыя.
23. Ахарактарызуйце ўнутраную палітыку Жыгімонта Вазы. Якія сацыяльныя праблемы выявіліся ў ВКЛ у канцы 16 – першай палове 17 стст.?
24. З якімі краінамі Рэч Паспалітая вяла войны падчас каралявання Жыгімонта Вазы?
25. Паспрабуйце вызначыць месца і ролю Рэчы Паспалітай у сістэме міжнародных адносін канца 16 – першай паловы 17 стст.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Соймікі ВКЛ: гісторыя фарміравання, сістэма функцыянавання.
2. Статут ВКЛ 1588 г.: агульная характарыстыка.
3. Генеральныя з'езды шляхты ВКЛ: фарміраванне і эвалюцыя інстытуту.
4. Сістэма кліентэлы ў шляхецкім асяроддзі ВКЛ.
5. Палітыка ВКЛ у Інфлянтах (канец 16 – пачатак 17 стст.).
6. Паўстанне казакаў пад кіраўніцтвам С. Налівайкі.
7. Рокаш 1606-1609 гг. М. Зэбжыдоўскага – Я. Радзівіла.
8. Удзел шляхты ВКЛ у "Смуце" ў Маскоўскай дзяржаве.

## Тэма 7: Грамадска-палітычнае развіццё ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (апошняя трэць 16 – першая палова 17 стст.). Падзелы Рэчы Паспалітай.

**1. Сацыяльна-палітычны крызіс у ВКЛ у другой палове 17 ст.**

**2. ВКЛ у перыяд праўлення Саксонскай дынастыі (1697 – 1763).**

**3. Палітычны крызіс у апошняй трэці 18 ст. Падзелы Рэчы Паспалітай.**

### 7.1. Сацыяльна-палітычны крызіс у ВКЛ у другой палове 17 ст.

У другой палове 17 ст. Рэч Паспалітая трапляе ў стан *палітычнага крызісу*, які быў выкліканы шэрагам сацыяльна-палітычных прычын:

- *Барацьба за ўладу паміж рознымі магнацкімі групоўкамі*; дэзарганізацыя дзейнасці цэнтральнай улады, недзеяздольнасць дзяржаўнага апарату.

- *Рэлігійная праблема*: барацьба паміж living рознымі рэлігійнымі канфесіямі. Ва ўмовах нарастання контррэфармацыйнага руху прадстаўнікі некаталіцкіх канфесій пачынаюць шукаць падтрымку за мяжой.

- *Казацкая праблема*: казакі патрабавалі для сябе павелічэння сацыяльна-палітычных правоў і прывілеяў.

- *Нарастанне супярэчнасцяў паміж шляхтай і непрывілеяванымі станамі* (сялянствам, мяшчанствам) ва ўмовах узмацнення феадальнай эксплуатацыі.

Пачаткам палітычнага крызісу стала *казацкая вайна 1648 – 1653 гг.* Казацтва, якое выконвала функцыі абароны паўднёвых межаў Рэчы Паспалітай ад набегаў крымскіх татар, вельмі хутка колькасна павялічвалася. Цэнтрам казацтва становіцца *Запарожская Сеч* у Ніжнім Падняпроўі. Сеч вельмі хутка стала месцам масавага прыцягнення сялян–уцекачоў і авантурыстаў з розных рэгіёнаў Рэчы Паспалітай. Казацкая супольнасць адкрытым галасаваннем абірала сабе гетмана і іншых вайсковых кіраўнікоў. Запарожскія казакі не толькі абараняліся ад татар, але рабілі набегі на землі Крымскага ханства і Асманскай імперыі. Яны адыгрывалі важную ролю ў войсках Рэчы Паспалітай у войнах першай паловы 17 ст. са Швецыяй, Масковіяй, Асманскай імперыяй. Сярод казацтва існавалі дзве асноўныя сацыяльныя групы: *рэестравыя казакі*, якія афіцыйна знаходзіліся на службе Рэчы Паспалітай і атрымлівалі за гэта грашовую ўзнагароду, і *казацкая галота*, якая не мела афіцыйнага статусу.

Паступова паміж казацтвам і сацыяльна-палітычнай элітай Рэчы Паспалітай нарасталі супярэчнасці. Казацкая вярхушка патрабавала колькаснага павелічэння рэестравага казацтва, павышэння аплаты за сваю службу, надання новых прывілеяў. Перыядычна гэтыя супярэчнасці выяўляліся ў лакальных казацкіх паўстаннях. У сваіх палітычных мэтах казацтва выкарыстоўвала рэлігійны канфлікт у Рэчы Паспалітай, выступаючы ў якасці абаронцаў праваслаўя. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі ў другой палове 16 – першай палове 17 стст., асабліва ва Украіне, прыводзіла да падтрымкі казацтва сярод сялян і гарадскога плебсу, масавага “паказачвання” сялян, якія ўцякалі ад прыгону.

Такім чынам, *прычынамі казацкай вайны* сталі:

- імкненне казацкай вярхушкі да ўзвышэння свайго сацыяльнага статусу;
- узмацненне феадальнай эксплуатацыі;
- рэлігійныя супярэчнасці.

Вясной 1648 г. пачалося казацкае паўстанне ў Запарожскай Сечы. Па часе яно супала са смерцю Уладыслава Вазы і абраннем каралём яго малодшага брата *Яна Казіміра Вазы* (1648 – 1668). Казацкае паўстанне ўзначаліў гетман *Багдан Хмяльніцкі*. У 1648-1649 гг. казацкае войска ў саюзе з Крымскім ханствам заняла большую частку тэрыторыі Украіны. Ва ўмовах вайны з Польшчай казацкае кіраўніцтва на чале з Б.Хмяльніцкім для пашырэння свайго ўплыву накіроўвала казацкія атрады – *загоны* – на тэрыторыю ВКЛ. Летам – восенню 1648 г. казацкія загоны захапілі шэраг гарадоў на поўдні ВКЛ: Рэчыцу, Мазыр, Кобрын, Берасце, Пінск, Бабруйск і г.д. На баку

казакаў, як правіла, выступалі гарадскі плебс, праваслаўнае духавенства, частка сялянства. У той жа час казакі жорстка вынішчалі рымска-каталіцкае і ўніяцкае духавенства, асабліва езуітаў, каталіцкую шляхту і яўрэяў.

У канцы 1648 – першай палове 1649 гг. войска ВКЛ на чале з *Янушам Радзівілам* выгнала казакаў з занятых імі гарадоў; праводзіліся жорсткія рэпрэсіі ў дачыненні казакаў і тых, хто іх падтрымліваў (так, у выніку штурму Пінска загінула каля 3 тыс. чалавек). У ліпені 1649 г. паводле загаду Б. Хмяльніцкага на тэрыторыю ВКЛ быў накіраваны новы буйны загон на чале з М. Крычэўскім. Аднак у *бітве пад Лоевам* 31 ліпеня 1649 г. пры спробе пераправы праз Днепр ён быў разбіты войскамі Я. Радзівіла.

У жніўні 1649 г. паміж Польскім каралеўствам і казацтвам было заключана перамір'е, паводле якога Польшча прызнавала існаванне аўтаномнай казацкай дзяржавы на тэрыторыі Ўкраіны, павялічвалася рэестравае казацкае войска. Аднак захаванне супярэчнасцяў прывяло да ўзнаўлення вайны ў красавіку 1651 г. У ВКЛ былі пасланы новыя казацкія загоны. Казакі захапілі Крычаў; аднак, у бітве каля Лоева 6 ліпеня 1651 г. яны зноў былі разгромлены войскам ВКЛ. У гэты час казацкае войска Б. Хмяльніцкага ў чэрвені-ліпені 1651 г. у выніку адыходу крымскіх татараў пацярпела паражэнне ва Ўкраіне пад Берастэчкам. Адначасова войска Я. Радзівіла 8 жніўня 1651 г. заняло Кіеў. Гэтыя падзеі вымусілі казацкае кіраўніцтва да заключэння новага перамір'я, якое, аднак, таксама не было трывалым. На тэрыторыі Ўкраіны ваенныя дзеянні працягваліся ў 1652 – 1653 гг. На тэрыторыі ВКЛ у гэты час загонаў не было; разрозненныя праказацкія выступленні падаўляліся шляхтай.

У студзені 1654 г. украінскае казацтва заключае палітычны саюз з Маскоўскай дзяржавай, паводле якога яно на аўтаномных пачатках прызнавала ўладу маскоўскага цара. Дадзеная падзея азначала пачатак вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай. Абапіраючыся на падтрымку казацтва, улады Масковіі заявілі аб прэтэнзіях на ўладаранне над землямі ВКЛ.

*Вайна Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654-1667 гг.* мела два этапы:

1) 1654 – 1656 гг.;
2) 1658 – 1667 гг.

У пачатку 1654 г. аб'яднаныя маскоўска-казацкія войскі пачынаюць вайну супраць Рэчы Паспалітай. Казакі вялі вайну пераважна супраць Польшчы; маскоўскае войска сканцэнтравала асноўныя сілы супраць ВКЛ. Вясной 1654 г. маскоўскія ўлады сканцэнтравалі на мяжы з ВКЛ 3 арміі агульнай колькасцю каля 160 тыс. чалавек пры падтрымцы 20-тысячнага казацкага войска. Ім супрацьстаяла каля 30 тыс. апалчэнцаў і наёмнікаў войска ВКЛ. Перад пачаткам наступлення царскія дыпламаты абяцалі, што захаваюць шляхце Рэчы Паспалітай іх правы і прывілеі, а простаму народу абяцалі захоўваць дысцыпліну войска і законнасць. Разыгрываючы рэлігійную карту, было заяўлена аб тым, што ”ляхам і жыдам не быць” і гарантавалася абарона праваслаўя.

Ваенныя дзеянні пачаліся ў маі 1654 г. Нягледзячы на дастаткова паспяховую манеўраную вайну войска Я. Радзівіла і перамогу пад Шкловам, маскоўска-казацкае войска паспяхова ажыццяўляла наступленне. Да канца 1654 г. яно захапіла ўсё Падзвінне і Падняпроўе (Магілёў, Віцебск, Полацк, Смаленск, Рэчыца, Гомель). Зімой 1654–1655 г. войскі ВКЛ няўдала спрабавалі арганізаваць контрнаступленне. Падчас наступнай кампаніі вясной – летам 1655 г. маскоўска-казацкія войскі занялі ўсю тэрыторыю ВКЛ, акрамя Быхава, Слуцка, Берасця, Пінска, Жамойці,Ількамірскага, Упіцкага, Браслаўскага павета. 31 ліпеня 1655 г. была захоплена Вільня. Маскоўскім царом *Аляксеем Міхайлавічам* Раманавым было абвешчана аб анексіі тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага.

Гарады і населеныя пункты, якія маскоўскім войскам прыходзілася браць штурмам, выніщчаліся (Мсціслаў). Шляхта і гарады, што не ўдзельнічалі ў ваенных дзеяннях супраць Масковіі, часткова захоўвалі свае правы і прывілеі. Пануючы статус набывала праваслаўная царква. Забаранялася дзейнасць уніяцкай царквы, а таксама пратэстантаў і іудзеяў, істотна абмяжоўваліся правы рымска-каталіцкай царквы.

Ва ўмовах ваенных паражэнняў Рэчы Паспалітай у вайне з Масковіяй у 1655 г. шведскае войска ўварвалася на яе тэрыторыю і за кароткі час захапіла большую частку Польшчы, а таксама Жамойць, што паклала пачатак *вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1655 – 1660 гг.* У кастрычніку 1655 г. частка шляхты ВКЛ на чале з Я. Радзівілам заключыла *Кейданскую унію*, паводле якой адмаўлялася ад палітычнага саюзу з Польшчай і абвяшчала вялікім князем літоўскім шведскага караля і палітычны саюз са Швецыяй. За гэта шведскія ўлады абяцалі дапамагчы ВКЛ у выгнанні маскоўскіх войскаў з большай часткі яе тэрыторыі.

Іншая частка шляхты захавала вернасць Яну Казіміру і саюзу з Польшчай. У кастрычніку 1656 г. Рэч Паспалітая заключае *Віленскае перамір'е* з Масковіяй і ў саюзе з ёй праводзіць ваенныя дзеянні супраць Швецыі ў Інфлянтах. У антышведскі саюз увайшлі таксама Габсбургсая Аўстрыя і Данія. У выніку на працягу 1656 г. шведскія войскі пакінулі Жамойць і большую частку Польшчы. Істотную ролю ў ваенных перамогах над шведскім войскам ў Польшчы адыграла войска ВКЛ на чале з *Паўлам Сапегам*.

У 1657 г. Швецыя заключае саюз з Трансільваніяй, войска якой за хуткі час заняла частку Польшчы, а таксама Берасце (да лета 1658 г.). Аднак у хуткім часе яно было вымушана адступіць пад ударамі польска-літвінскіх і крымска-татарскіх войскаў. Таксама з тэрыторыі Польшчы адышлі войскі Швецыі, супраць якой пачала вайну Данія пры падтрымцы Брандэнбурга, Аўстрыі і Галандыі. У 1660 г. заключаны *Аліўскі мір* Рэчы Паспалітай са Швецыяй, паводле якога захаўваліся ранейшыя межы паміж дзяржавамі.

На *тэрыторыі ВКЛ, занятай маскоўскімі войскамі,* сфарміравалася новая сістэма адміністрацыі, у якой галоўную ролю адыгрывалі маскоўскія чыноўнікі. Дапаможную ролю мела мясцовая шляхта, якая прысягнула на вернасць цару. У некаторых раёнах адміністрацыя фарміравалася казакамі, да

якіх далучалася частка мясцовага насельніцтва. З 1656 – 1658 гг. пачынаюцца канфлікты паміж царскай адміністрацыяй і казакамі. Маскоўскія ўлады праводзілі палітыку жорсткай эксплуатацыі захопленых зямель. Каля 300 тыс. рамеснкаў было вывезена ў Маскоўскую дзяржаву. Мяшчанства і сялянства абкладалася высокімі падаткамі і павіннасцямі. Царскія войскі часта праводзілі гвалт і рабункі сярод насельніцтва. Адбывалася вынішчэнне каталіцкага і ўніяцкага духавенства, яўрэяў. Палітыка маскоўскіх уладаў выклікала масавы партызанскі рух *шышоў*. Шышы знішчалі дробныя аддзелы праціўніка, нават вызвалялі асобныя тэрыторыі.

У 1658 г. казакая старшына на чале з І. Выгоўскім і І. Нячаем разарвала саюз з Маскоўскай дзяржавай і заключыла Гадзяцкі дагавор з Польшчай, паводле якой запарожцы перайшлі на бок Рэчы Паспалітай і прымусілі капітуліраваць маскоўскія войскі на Правабярэжнай Украіне.

У 1659 г. аднавіліся баявыя дзеянні паміж войскамі Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы. Казацтва лавіравала паміж двума бакамі, падтрымліваючы то адных, то другіх. З 1660 – 1661 гг. у вайне назіраецца паварот на карысць Рэчы Паспалітай. Войскі ВКЛ і Польшчы разбілі колькасна пераважаючыя маскоўскія арміі каля р. Палонка пад Ляхавічамі 28 чэрвеня 1660 г., р. Бася пад Магілёвам 8 кастрычніка 1660 г. і в. Кушлікамі пад Полацкам 4 лістапада 1661 г. Да канца 1661 г. была адваявана большая частка ВКЛ, у тым ліку Вільня, Менск, Магілёў. Значную дапамогу войскам Рэчы Паспалітай аказалі антымаскоўскія паўстанні ў гарадах, найбольш значым з якіх стала *Магілёўскае паўстанне* ў лютым 1661 г, падчас якога быў знішчаны 7-тысячны маскоўскі гарнізон.

Далейшая барацьба мела зацяжны характар і працягвалася да 1667 г. (з перапынкам у 1664 – 1666 гг.). 30 студзеня 1667 г. было падпісана *Андрусаўскае перамір’е*, паводле якога да Маскоўскай дзяржавы адыходзіла Смаленская зямля, з польскіх тэрыторый – Левабярэжная Украіна (Кіеў перадаваўся ім на 2 гады, але так і не быў вернуты Польшчы). За маскоўскім царом быў замацаваны “абавязак” абараняць праваслаўнае насельніцтва Рэчы Паспалітай. У 1686 г. новую мяжу паміж дзяржавамі замацаваў “*Вечны мір*”.

У выніку вайны 1654-1667 гг. насельніцтва ВКЛ скарацілася ў 2 разы (з 2,9 млн. да 1,4 млн.). На поўначы ВКЛ насельніцтва скарацілася да 80%, у цэнтры да 60%. Шмат людзей, асабліва рамеснікаў, было прымусова вывезена ў Масковію або прададзена на рабскіх рынках прычарнаморскіх гарадоў. Гаспадарка знаходзілася ў катастрафічным стане. Падзеі, звязаныя з войнамі 1648 – 1667 гг., увайшлі ў гісторыю пад назвай *“крывавы патоп”*.

У Рэчы Паспалітай падчас “патопу” ўзмацняецца барацьба за ўладу магнацкіх груповак. Кароль Ян Казімір у 1660-я гг. імкнуўся да правядзення рэформ, накіраваных на ўзмацненне цэнтральнай улады (выбары новага караля пры жыцці дзеючага, адмена лібэрум вета, увядзенне пастаянных падаткаў). У знешняй палітыцы у 1660-я гг. ён бярэ курс на збліжэнне з Францыяй і аддаленне ад Аўстрыі. Супраць каралеўскіх планаў выступіў шэраг уплывовых магнацкіх груповак Польшчы і ВКЛ, якія арганізавалі *рокаш 1665-1666 гг.* на чале з польскім магнатам Е. Любамірскім. Рокаш быў

падаўлены, аднак Ян Казімір адмовіўся ад планаў рэформ і ў верасні 1668 г. сыйшоў у адстаўку.

Новым каралём выбралі *Міхаіла Карыбута Вішнявецкага* (1669-1673), багацейшага магната Рэчы Паспалітай, які валодаў вялікімі латыфундыямі ва Ўкраіне. Перыяд яго каралявання характарызуецца ўзмацненнем барацьбы магнацкіх груповак. У гэтых умовах пачынаецца *вайна Рэчы Паспалітай з Турцыяй 1672 – 1676 гг.*, у якой турэцкі бок падтрымала казацтва Правабярэжнай Украіны на чале з гетманам Пятром Дарашэнкам.

Падчас каралявання Яна Сабескага (1674 – 1696) галоўным накірункам знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай стала барацьба з Асманскай імперыяй за кантроль над украінскімі землямі і прыдунайскімі княствамі. Паводле *Журавінскага міра 1676 г.* Падолле была перададзена Турцыі. У 1683 – 1699 гг. пачалася новая вайна з Турцыяй. Саюзнікамі Рэчы Паспалітай у барацьбе з Турцыяй выступалі Габсбургская Аўстрыя, Венцыя, папства і шэраг дробных германскіх дзяржаў. Войскі ВКЛ уваходзілі ў склад аб'яднанага войска Рэчы Паспалітай і германскіх князёў на чале з Янам Сабескім, якое ў верасні 1683 г. разбіла турэцкія сілы ў *бітве пад Венай*, што дазволіла выратаваць Аўстрыю ад разгрома. Паводле Карлавіцкага міру 1699 г., Польскаму каралеўству было вярнута Падолле.

Ва ўнутранай палітыцы Ян Сабескі лавіраваў паміж рознымі магнацкімі групоўкамі. У 1680-1690-я гг. у ВКЛ значна ўзмацняецца ўплыў магнацкай групоўкі *Сапегаў*, прадстаўнікі якой займаюць асноўныя дзяржаўныя пасады. Адбываецца ўмацаванне пануючага статусу каталіцкай царквы. Прымаюцца нарматыўныя акты, якія абмяжоўваюць палітычныя правы шляхты (забарона займаць дзяржаўныя пасады) і грамадзянскія правы мяшчанства некаталіцкага веравызнання.

*Такім чынам, у выніку унутры- і знешнепалітычных супярэчнасцяў Рэч Паспалітая, і ў яе складзе ВКЛ, у другой палове 17 ст. апынулася ў стане сацыяльна-палітычнага крызісу, які адлюстроўваўся ў серыі войн на яе тэрыторыі. Нягледзячы на захаванне дзяржаўнага самастойнасці, Рэч Паспалітая страціла статус моцнай дзяржавы ў рэгіёне. Ваенныя дзеянні нанеслі вялікія дэмаграфічныя і эканамічныя страты ВКЛ.*

### 7.2. ВКЛ у перыяд праўлення Саксонскай дынастыі (1697 – 1763).

Перыяд 1697 – 1763 гг. адзначаны ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай праўленнем каралёў з дынастыі саксонскіх курфюрстаў *Аўгуста II* (1697 – 1733) і яго сына *Аўгуста III* (1733 – 1763).

Аўгуст II ва ўнутранай палітыцы імкнуўся да ўмацавання каралеўскай улады шляхам лавіравання паміж рознымі магнацкімі групоўкамі і прызначэння на пасады саксонскіх чыноўнікаў. Падобная палітыка Аўгуста II выклікала незадаволенасць значнай часткі шляхты. Абранне на трон Аўгуста II абвастрыла барацьбу ў ВКЛ паміж магнацкімі групоўкамі Сапегаў ("*сапежынцаў*") і кааліцыі іх праціўнікаў ("*рэспубліканцаў*"), на чале якіх знаходзіліся Агінскія (іх пераважна падтрымліваў кароль), што прывяло да *грамадзянскай вайны 1697-1704 гг.*

Палітычнай праграмай “рэспубліканцаў” стала патрабаванне ўраўнаваць правы шляхты ВКЛ з правамі шляхты Польшчы, што прадугледжвала абмежаванне паўнамоцтваў гетмана і іншых чыноўнікаў цэнтральнага дзяржаўнага апарату ВКЛ (гэтыя пасады ў асноўным займалі Сапегі). Адпаведная пастанова была прынята элекцыйным соймам ў чэрвені 1697 г. Цэнтрамі ўзброенай барацьбы сталі ўладанні Сапегаў. Акрамя шляхецкіх войскаў у вайне выкарыстоўваліся ўзброеныя сялянска-казацкія атрады, якія стваралі ў сваіх уладаннях Сапегі. Кульмінацыйнай падзеяй вайны стала *бітва каля Алькенікаў у лістападзе 1700 г.*, якая завяршылася паражэннем Сапегаў, пасля чаго яны былі пазбаўлены дзяржаўных пасад і часткі зямельных уладанняў. Узброеная барацьба, аднак, працягвалася. Асяродкамі супраціўлення з боку Сапегаў заставаліся іх буйнейшыя ўладанні, асабліва Стары Быхаў. З 1704 г. грамадзянская вайна стала часткай Паўночнай вайны, у якой бакі падтрымлівалі адпаведна Швецыю і Расію.

У пачатку 18 ст. тэрыторыя ВКЛ стала арэнай *Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг.* Яе прычынай сталі супярэчнасці паміж шэрагам дзяржаў за геапалітычнае панаванне ў рэгіёне Балтыйскага мора. Да пачатку 18 ст. эканамічнае і палітычнае панаванне ў рэгіёне належала Швецыі. У 1700 г. кааліцыя дзяржаў (Паўночная ліга), у склад якой увайшлі Масковія (Расія), Данія і Саксонія пачалі вайну супраць Швецыі за геапалітычны кантроль над Балтыкай. Аўгуст II у якасці саксонскага князя імкнуўся заняць Інфлянты і пераўтварыць іх у спадчыннае княства сваёй дынастыі. Праз тэрыторыю Рэчы Паспалітай саксонскае войска выступіла ў паход на Рыгу.

Аднак пачатак вайны быў няўдалым для дзяржаў Паўночнай лігі. У 1700 – 1701 гг. шведскае войска ў некалькіх баях разбіла войскі Даніі і Расіі, а таксама перамагло саксонскае войска каля Рыгі і зняла з горада аблогу. У 1702 г. шведскія войскі ўступілі на тэрыторыю Рэчы Паспалітай, паколькі яна была месцам дыслакацыі саксонскіх войскаў, занялі Вільню і Гародню, а потым Варшаву і Кракаў. Саксонскія войскі ў 1702 – 1703 гг. пацярпелі паражэнні на тэрыторыі Польшчы.

Вайна выклікала абвастрэнне барацьбы магнацкіх груповак у ВКЛ і Польскім каралеўстве. Частка шляхты ВКЛ (на чале з Сапегамі) і Польшчы падтрымала Швецыю і ў ліпені 1704 г. выбрала ў Варшаве каралём пазнанскага ваяводу *Станіслава Ляшчынскага*, які абвясціў саюз са Швецыяй. Верная Аўгусту II шляхта восенню 1704 г. заключыла дагавор з Расіяй і абвясціла вайну Швецыі. На дапамогу ім на тэрыторыю ВКЛ увайшло расійскае войска. На тэрыторыі ВКЛ у 1705 – 1708 гг. адбывалася вайна паміж шведскімі і расійскімі войскамі, якіх падтрымлівалі адпаведна розныя мясцовыя магнацкія групоўкі.

Да канца лета 1705 г. большая частка тэрыторыі ВКЛ кантралявалася расійскімі войскамі (асноўныя сілы былі сканцэнтраваны ў Гародні, дзе да іх далучылася група саксонскага войска на чале з Аўгустам II). Але з пачатку 1706 г. войска шведскага караля Карла XII перайшло з Польшчы ў ВКЛ, заняло Гародню і выцясніла расійскія войскі ў Падняпроўе. Летам 1706 г. пасля бітвы пад Фраўштатам Аўгуст II вымушаны быў падпісаць

*Альтранштацкі мір*, паводле якога ён адмаўляўся ад кароны Рэчы Паспалітай, разрываў саюз з Расіяй, выплочваў значную кантрыбуцыю Швецыі. Заключыўшы саюз з гетманам украінскага казацтва І. Мазепам, які хацеў выйсці з-пад улады маскоўскага цара, у 1708 г. войска Карла XII распачала баявыя дзеянні на ўсходзе ВКЛ. У ліпені 1708 г. шведскія войскі атрымалі перамогу ў бітве пад Галоўчынам; аднак, калі асноўныя шведскія сілы ўжо былі ва Ўкраіне, 28 верасня 1708 г. расійскія войскі ў бітве каля в. Лясной разграмілі корпус пад камандаваннем А.Л. Левенгаўпта, які рухаўся з вялікім абозам ва Ўкраіну (да войскаў Карла XII дабраліся толькі 7 тыс. чал. без абозу).

У выніку паражэння шведскага войска ад расійскай арміі на чале з царом Пятром І пад Палтавай ва Украіне ў чэрвені 1709 г. шведскія войскі былі выведзены з тэрыторыі Рэчы Паспалітай; цалкам адноўлена ўлада Аўгуста ІІ і саюз з Расіяй, Саксоніяй і Даніяй супраць Швецыі. Расійскія войскі занялі шведскія Інфлянты, якія былі далучаны да Расіі. Па прычыне рознагалоссяў наконт валодання Інфлянтамі РП выйшла ў 1710 г. з вайны.

*Вынікам вайны* сталі вялікія людскія страты (колькасць насельніцтва зменшылася з 2,2 млн. да 1,5 млн.), разбурэнне гаспадаркі (многія гарады былі спалены ваюючымі бакамі) і ўзмацненне залежнасці Рэчы Паспалітай ад замежных дзяржаў, найперш Расіі.

На тэрыторыі Рэчы Паспалітай захоўваліся расійскія ваенныя гарнізоны. Нягледзячы на падтрымку Аўгуста ІІ, улады Расіі, Аўстрыі і Прусіі не дапускалі магчымасці ўзмацнення цэнтральнай дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай, заахвочалі барацьбу паміж магнацкімі групоўкамі. Паводле рашэння т.зв. “нямога” сойму 1717 г., прынятага пад націскам Расіі, значна абмяжоўвалася ўлада вышэйшых дзяржаўных асоб, асабліва гетмана, пацверджана права лібэрум вета; значна скарачалася войска ВКЛ (да 6 тыс. чал.) і Польшчы (да 18 тыс. чал.). У той жа час працягвалася абмежаванне палітычных правоў “*дысідэнцкай*” (некаталіцкай) шляхты. У 1732 г. на Варшаўскім сойме было забаронена выбіраць “дысідэнтаў” на соймы і ў склад трыбуналаў, прымаць на працу ў ваяводствах, гарадах і замках.

Пасля смерці Аўгуста ІІ шляхта ў 1733 г. на сойме выбрала каралём Станіслава Ляшчынскага, стаўленіка Францыі. Але гэта не адпавядала інтарэсам Расіі. На тэрыторыю Рэчы Паспалітай былі ўведзены расійскія войскі, арганізаваны новыя выбары, дзе каралём быў абраны сын *Аўгуст ІІІ*. У выніку вайны паміж прыхільнікамі кандыдатаў 1733 – 1735 гг. перамог Аўгуст ІІІ пры дапамозе расійскіх і саксонскіх войскаў.

У сярэдзіне 18 ст. (час каралявання Аўгуста ІІІ) Рэч Паспалітая знаходзілася ў стане глыбокага *палітычнага крызісу*:

1) У адрозненне ад сваіх суседзяў (Прусіі, Расіі, Аўстрыі) Рэч Паспалітая не была цэнтралізаванай абсалютнай манархіяй. Улада выбарнага караля была абмежаваная заканадаўча і практычна магнацкімі групоўкамі. Так, прыбытак С. Радзівіла быў большы за каралеўскі ў 1,5 разы, яго прыватнае войска складала 8 тыс. чалавек, у той час, як дазволенае міжнароднымі дамовамі дзяржаўнае войска ВКЛ налічвала 6 тыс. Мясцовыя ўлады ў

паветах і ўплывовыя магнаты праводзілі сваю незалежную палітыку і змагаліся адзін з адным, абапіраючыся на палітычную і фінансавую падтрымку замежных дзяржаў. Барацьба магнацкіх груповак (Чартарыйскіх, Вішнявецкіх, Радзівілаў, Сапегаў, Пацаў, Агінскіх) за ўладу і карупцыя прывялі да дэзарганізацыі ўсёй дзяржаўнай сістэмы.

2) Дзеянне разгалінаванай юрыдычнай сістэмы супрацьвагаў і права лібэрум вета паралізавала дзейнасць соймаў. На працягу 18 ст. больш 80% соймаў было сарвана.

3) Адбываецца ўзрастанне залежнасці дзяржаўнай улады і асобных магнацкіх груповак ад суседніх дзяржаў, асабліва Расіі, Прусіі і Аўстрыі. У міжнароднай палітыцы Рэч Паспалітая перастала адыгрываць самастойную ролю; праз яе тэрыторыю праходзілі замежныя войскі. З 1720 г. Прусія і Расія становяцца гарантамі "залатых шляхецкіх вольнасцяў" (па сутнасці магнацкай алігархіі). Больш таго, яны пастаянна ўздымалі пытанне аб "дысідэнтах" у Рэчы Паспалітай у якасці сродку націску на ўлады краіны. Расія абвясціла аб сваей абароне правоў праваслаўных, а Прусія – пратэстантаў.

*Такім чынам, перыяд праўлення Саксонскай дынастыі ў Рэчы Паспалітай (1697 – 1763) стаў часам уваходжання Рэчы Паспалітай у паласу глыбокага сацыяльна-палітычнага крызісу, устанаўленнем яе палітычнай залежнасці ад замежных дзяржаў. Прычынамі гэтага сталі слабасць інстытутаў дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай, магнацкая алігархія, актыўнае ўмяшанне замежных дзяржаў ва ўнутыпалітычныя справы краіны.*

### 7.3. Палітычны крызіс у апошняй трэці 18 ст. Падзелы Рэчы Паспалітай.

Пасля абрання на пасаду караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* (1764 – 1795) у 1764 – 1766 гг. кіруючая магнацкая групоўка Чартарыйскіх правяла шэраг рэформ па ўмацаванню дзяржаўнай улады:

- адмена права лібэрум вета ў вырашэнні эканамічных пытанняў;
- рэарганізацыя адміністрацыйнага апарату (была створана Скарбавая камісія – спецыяльны орган па кіраванні фінансамі, ажыццяўленні судовых функцый па фінансавых справах, нагляду за гандлем);
- адмена ўнутраных гандлёвых пошлін;
- праведзенне рэвізіі дзяржаўных маёнткаў;
- устанаўленне адзіных для краіны мер вагі, аб'ёму і даўжыні.

Дадзеныя рэформы сутыкнуліся з супрадзеяннем большасці магнатаў, якія пабачылі ў іх замах на шляхецкія прывілеі, што адлюстравалася ў дзейнасці *Радамскай канфедэрацыі* 1767 г. на чале з К.С. Радзівілам "Пане-каханку". Іх падтрымалі Расія і Прусія. Замежныя дзяржавы актыўна выкарыстоўвалі таксама рэлігійнае пытанне як зачэпку да ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. З ініцыятывы Прусіі і Расіі ўзнікаюць *Торуньская* пратэстанцкая і *Слуцкая* праваслаўная канфедэрацыі. Сойм 1768 г. пад націскам расійскіх войскаў прыняў пастанову аб ураўнаванні ў правах

некаталіцкай шляхты з каталіцкай; былі пацверджаны непарушнасць дзяржаўнага ладу, прывілеі шляхты, права лібэрум вета. Расія абвяшчалася гарантам захавання гэтай сістэмы.

Але патрыятычна настроеная частка шляхты і каталіцкае духавенства рашуча выступілі супраць умяшання Расіі ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай і згодніцкай палітыкі каралеўскай улады. У 1768 г. яны ўтварылі *Барскую канфедэрацыю*, якая пры падтрымцы Францыі і Турцыі збірае 12-тысячнае войска. У 1768-1772 гг. у ВКЛ і Польшчы адбываліся баявыя дзеянні паміж канфедэратамі, з аднаго боку, і ўрадавымі і расійскімі войскамі, з другога. Рашаючая бітва на тэрыторыі ВКЛ адбылася ў верасні 1771 г. каля *Сталовічаў*, у якой расійскае войска на чале з А. Суворавым разбіла 3-тысячны атрад канфедэратаў на чале з М.К. Агінскім. Прыхільнікі Барскай канфедэрацыі пацярпелі паражэнне.

Па прапанове Фрыдрыха II, караля Прусіі, адбыўся *першы падзел Рэчы Паспалітай* паміж Прусіяй, Аўстрыйскай і Расійскай імперыямі, які быў замацаваны Пецярбургскім дагаворам ад 5 жніўня 1772 г.:

| ПРУСІЯ | АЎСТРЫЯ | РАСІЯ |
|---|---|---|
| Паўночна-заходняя частка Польшчы | Поўдзень Польшчы і Галіцыя | Землі на ўсход ад Дзвіны і Дняпра:<br>▪ Інфлянцкае ваяводства;<br>▪ Правабярэжнае Полацкае і Віцебскае ваяводства;<br>▪ Мсціслаўскае ваяводства;<br>▪ Рагачоўскі павет.<br>92 тыс. км$^2$ |

Сойм 1773 – 1775 гг., нягледзячы на супраціўленне часткі шляхты, найбольш яркім прадстаўніком якой быў навагародскі шляхціц Т. Рэйтан, зацвердзіў першы падзел Рэчы Паспалітай.

Палітычная эліта Рэчы Паспалітай успрыняла першы падзел як нацыянальную трагедыю. Таму актывізавалася дзейнасць па рэфарміраванні дзяржаўнай сістэмы. Сойм 1773 – 1775 гг. зацвердзіў шэраг рэформ, накіраваных на мадэрнізацыю грамадскага ладу ў Рэчы Паспалітай:

- перадача маёмасці забароненага рымскім папам ордэна езуітаў *Адукацыйнай камісіі* – першаму ў Еўропе свецкаму міністэрству адукацыі;
- абмежаванне права лібэрум вета па гаспадарчых пытаннях;
- увядзеннне (паўторна) адзінай генеральнай мытнай пошліны, абавязковай для ўсіх, хто займаецца знешнім гандлем – у тым ліку і шляхты;
- увядзенне адзінай працэнтнай стаўкі па пазыках;
- дазвол шляхце займацца гандлем;
- дазвол мяшчанам набываць зямельную маёмасць.

У 1775 г. быў створаны орган пастаянна дзеючай дзяржаўнай адміністрацыі – *Пастаянная рада*, якая складалася з 5 дэпартаментаў (замежных спраў, паліцыі, абароны, юстыцыі, фінансаў). Пастаянная рада складалася з караля, 18 сенатараў і 18 дэпутатаў сойма. Членаў Рады выбіралі на сойме тайным галасаваннем на 2 гады, пасля чаго праводзіліся перавыбары 1/3 яе складу. Старшынстваваў у Радзе кароль, які меў права заканадаўчай ініцыятывы і вырашальнага голасу пры нязгодзе астатніх членаў. Пастаянная рада вырашала пытанні склікання соймаў, прызначэння на дзяржаўныя пасады, кантролю над дзяржаўным скарбам. Кандыдатаў у Раду кароль узгадняў з расійскім паслом, што змяншала яе самастойнасць.

Найбольш паслядоўныя рэформы звязаны з дзейнасцю *Чатырохгадовага сойма 1788-1792 гг.* На ім пераважалі рэфарматары на чале з Г. Калантаем і І. Патоцкім, якіх пэўны час падтрымліваў кароль. Сойм абвясціў сябе канфедэрацыяй, імкнучыся правесці істотныя дзяржаўныя рэформы і тым самым пазбавіцца залежнасці ад Расіі. Асноўныя рэформы чатырохгадовага сойму:

- скасаванне Пастаяннай рады як сімвалу залежнасці ад Расіі; замест яе створана *Стража правоў*, якой падпарадкоўваліся камісіі (міністэрствы);

- стварэнне ў ваяводствах і паветах *цывільна-вайсковых камісій*, выбіраемых шляхтай на два гады, як пастаянных органаў мясцовай выканаўчай улады;

- увядзенне ў Сенат уніяцкага мітрапаліта;

- стварэнне асобнай праваслаўнай мітраполіі ў Рэчы Паспалітай, падначаленай Канстанцінопальскаму патрыярху (паводле рашэння Пінскай кангрэгацыі 1791 г.), што пазбаўляла Расійскую імперыю магчымасці ўмешвацца ў жыццё праваслаўных краіны.

Дзейнасць Чатырохгадовага сойму супала па часе з пачаткам *Вялікай Французкай рэвалюцыі* ў 1789 г., якая прывяла да ўстанаўлення ў Францыі канстытуцыйнай манархіі, а затым рэспублікі, скасавання феадальных перажыткаў і саслоўных прывілеяў. Частка рэфарматараў з Чатырохгадовага сойма сімпатызавала ідэям Французкай рэвалюцыі.

Кульмінацыяй рэформ Чатырохгадовага сойма стала прыняцце *Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г.* Яна была другой канстытуцыяй у свеце (пасля ЗША) і першай у Еўропе. Канстытуцыя 3 мая прадугледжвала наступныя палажэнні:

- ліквідацыя выбарнасці караля і ўвядзенне спадчыннай манархіі;

- павелічэнне інтэграцыі паміж Каронай і ВКЛ, пры захаванні за каралём тытулу вялікага князя літоўскага і асобных судаводства і фінансаў ВКЛ; прадугледжвалася роўнае прадстаўніцтва ВКЛ і Польшчы ў сойме, камісіях Стражы правоў і іншых дзяржаўных інстытутаў (узаемаадносіны паміж ВКЛ і Польскім каралеўствам былі зацверджаны ў канстытуцыйным акце "*Узаемнае заручэнне абодвух народаў*" у кастрычніку 1791 г.);

- устанаўленне заканадаўчай улады за пастаянна дзеючым *двухпалатным соймам*, паслы якога выбіраюцца на 2 гады мясцовымі соймікамі. Пасольская ізба складалася з 204 дэпутатаў (з іх 24 – прадстаўнікі гарадоў з правам

дарадчага голасу); Сенат – з 132 чыноўнікаў, уключаючы караля. Сенат быў пазбаўлены права заканадаўчай ініцыятывы, але меў права адкладальнага вета.

- устанаўленне ўзроставага і маёмаснага цэнзу для шляхты на сойміках: права выбарчага голасу атрымлівалі асобы ва ўзросце ад 19 год, якія мелі гадавы даход больш за 100 злотых;

- выканаўчая ўлада надавалася каралю і Стражы правоў. Міністры са Стражы правоў маглі быць звольнены 2/3 галасоў дэпутатаў сойма;

- адмена права лібэрум вета, забарона шляхецкіх канфедэрацый і рокашаў; разам з тым гарантавалася непахінасць усіх шляхецкіх правоў і прывілеяў, карпаратыўнасць і адзінаўладдзе шляхецкага саслоўя;

- скасаванне пажыццёвага займання дзяржаўных пасад; выбарнасць мясцовай адміністрацыі на сойміках;

- абвяшчэнне свабоды веравызнання з захаваннем пануючага статусу каталіцызму, перавод епіскапату на дзяржаўнае ўтрыманне;

- павышэнне грамадска-палітычнага статусу мяшчанства: гарантыя асабістай недатыкальнасці, права на набыццё зямлі, займанне ніжэйшых адмінстрацыйна-судовых і царкоўных пасад, атрыманне шляхецтва за дзяржаўную і ваенную службу; 24 прадстаўнікі дзяржаўных гарадоў атрымлівалі прадстаўніцтва ў сойме з правам дарадчага голасу;

- дэклараванне апекі права і дзяржавы над сялянамі.

Такім чынам, Канстытуцыя 3 мая 1791 г. прапанавала мадэль канстытуцыйнай манархіі замест элекцыйнай у Рэчы Паспалітай, некалькі абмяжоўвала шляхецкую дэмакратыю, стварала ўмовы для больш хуткага развіцця капіталістычных адносін у грамадстве.

Прыняцце Канстытуцыі выклікала хвалю патрыятызму сярод значнай часткі грамадства. 27 з 34 соймікаў ВКЛ віталі рашэнні Чатырохгадовага сойма і Канстытуцыю 3 мая 1791 г. У Лявонпалі, Глыбокім і Бездзежы шляхта пабудавала помнікі–калоны з гэтай нагоды. У той жа час частка магнатэрыі выступіла супраць Канстытуцыі, углядаючы ў ёй пагрозу магнацкай алігархіі і аналаг Французкай рэвалюцыі. Рэзка негатыўна дзейнасць Чатырохгадовага сойма была ўспрынята ў Расіі, Прусіі і Аўстрыі, якія не былі зацікаўлены ва ўзмацненні дзяржаўных інстытутаў у РП, а таксама баяліся магчымага развіцця рэформ у духу Французкай рэвалюцыі. Група незадаволеных рашэннямі сойма магнацкіх груповак (Жавускія, Браніцкія, Патоцкія, Касакоўскія) стварыла т.зв. *Таргавіцкую канфедэрацыю*, якая выступіла супраць Канстытуцыі ў абарону “шляхецкіх вольнасцяў” і звярнулася за дапамогай да Расіі.

Гэта стала зачэпкай да пачатку *вайны Расіі супраць Рэчы Паспалітай*. На працягу мая – ліпеня 1792 г. расійскім войскам пад камандаваннем А. Суворава была захоплена ўся тэрыторыя ВКЛ і большая частка Польшчы. Пад абаронай расійскіх войскаў Таргавіцкая канфедэрацыя, да якой далучыўся кароль, захапіла ўладу; лідэры рэфарматараў эмігрыравалі. Абвясціўшы лозунг аб “недапушчэнні Французкай рэвалюцыі”, расійскія рэгулярныя ваенныя гарнізоны былі размешчаны ў гарадах ВКЛ.

У дадзеных умовах Расія і Прусія ініцыіравалі *другі падзел Рэчы Паспалітай*, замацаваны Пецярбургскім пагадненнем у студзені 1793 г.:

| ПРУСІЯ | РАСІЯ |
|---|---|
| • Вялікапольшча;<br>• Мазовія;<br>• Гданьск;<br>• Торунь. | • Цэнтральная частка Беларусі па лініі Друя-Пінск;<br>280 Падолле і Цэнтральная Украіна;<br>281 тыс. км$^2$ |

Гарадзенскі сойм 1793 г., скліканы пад наглядам расійскіх войскаў, зацвердзіў акт падзелу, а таксама афіцыйна абвясціў скасаванне Канстытуцыі 3 мая і ўсіх рэформ Чатырохгадовага сойму.

Апошняй спробай захаваць незалежнасць Рэчы Паспалітай стала *паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі* (ураджэнца Берасцейшчыны). Паўстанне пачалося 12 сакавіка 1794 г. 24 сакавіка ў Кракаве быў абвешчаны акт паўстання. "Кракаўскі акт паўстання" абяцаў вярнуць Канстытуцыю 3 мая 1791 г., вызваліць тэрыторыю дзяржавы ад іншаземных войскаў і замацаваць суверэнітэт Рэчы Паспалітай. Вясной 1794 г. большая частка Польскага каралеўства была занята паўстанцамі. Быў створаны паўстанцкі ўрад – Нацыянальная рада на чале з Т. Касцюшкам.

У сярэдзіне красавіка 1794 г. паўстанне пачалося ў ВКЛ. 22–24 красавіка 1794 г. паўнцы занялі Вільню, мясцовы расійскі гарнізон быў разгромлены. Для кіраўніцтва паўстаннем у ВКЛ ствараецца *Найвышэйшая Літоўская Рада* на чале з *Якубам Ясінскім*, які таксама ўзначальвае ўзброеныя сілы ВКЛ. У маі 1794 г. яго атрад разбівае каля в. Паляны пад Ашмянамі расійскія сілы, якія выводзяцца з ВКЛ на лінію другога падзела.

Паўстанцы выступалі за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. пад лозунгам: "*вольнасць, цэласць, незалежнасць*". Сярод паўстанцаў можна вылучыць дзве асноўныя плыні:

- *памяркоўныя* – прыхільнікі рэформ Чатырохгадовага сойма і Канстытуцыі 3 мая 1791 г.; лічылі галоўнай рухаючай сілай паўстання шляхту; пераважалі ў кіраўніцтве паўстаннем у Польшчы;
- *радыкалы* – прыхільнікі сацыяльных і палітычных рэформ у духу Французкай рэвалюцыі (пераўтварэнне манархіі ў дэмакратычную рэспубліку; адмена прыгоннага права і прызнанне права ўласнасці сялян – удзельнікаў паўстання на зямлю, якую тыя апрацоўвалі; адмена саслоўных абмежаванняў для мяшчан); выступалі за прыцягненне да паўстання шырокіх мас насельніцтва; пераважалі ў кіраўніцтве паўстаннем у ВКЛ.

Паміж гэтымі дзвюма плынямі адбывалася ўнутрыпалітычная барацьба. Пад націскам памяркоўных Т. Касцюшка ў чэрвені 1794 г. распусціў

Найвышэйшую літоўскую раду; замест яе была створана Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ на чале з М. Вяльгорскім.

Пераважную масу паўстанцаў складалі прадстаўнікі дробнай і сярэдняй шляхты. Каб прыцягнуць на свой бок сялян, Т. Касцюшка 7 мая 1794 г. выдаў "*Паланецкі ўніверсал*", згодна з якім сяляне атрымлівалі асабістую свабоду; скарачалася на 33-50% паншчына (поўная адмена для тых, хто ўдзельнічаў у паўстанні); за сялянамі замацоўвалася права на тую зямлю, якую яны апрацоўвалі. Прадугледжвалася заключэнне паміж землеўладальнікамі і сялянамі дагавораў аб наёмнай працы. У паўстанцкіх атрадах былі групы сялян, узброеных пераважна сякерамі і перакаванымі косамі, якія атрымалі назву *касінераў*. Але ў цэлым шляхта насцярожана ставілася да "Паланецкага ўніверсала" і фактычна сабатавала яго. Таму большасць сялянства займала пасіўную пазіцыю падчас паўстання.

Найвялікшага ўздыму паўстанне дасянула ў чэрвені – жніўні 1794 г., калі ў паўстанцкіх узброеных сілах ВКЛ налічвалася да 25 тыс. чалавек. Рабіліся спробы пашырыць паўстанне за межы тэрыторыі другога падзелу. У чэрвені і жніўні атрады М.К. Агінскага і С. Грабоўскага ажыццяўлялі рэйды на тэрыторыю Меншчыны. У чэрвені 1794 г. атрад на чале з М.К. Агінскім спрабаваў заняць Дынабург.

У ліпені 1794 г. ініцыятыва пераходзіць да расійскіх войскаў. Пасля працяглай аблогі (18 ліпеня – 12 жніўня 1794 г.) была занята Вільня. У верасні з тэрыторыі Украіны ў ВКЛ прыбывае корпус А. Суворава. Буйнейшая бітва падчас паўстання на тэрыторыі ВКЛ адбылася 19 верасня 1794 г. каля *в. Крупчыцы*, у якой корпус А. Суворава нанёс паражэнне паўстанцам. 1 кастрычніка 1794 г. паўстанцы пакінулі Гародню; баявыя дзеянні перайшлі на тэрыторыю Польшчы. Тут на дапамогу расійскім войскам прыйшлі прускія і аўстрыйскія. 10 кастрычніка ў Мацяёвіцкай бітве расійскія войскі разбілі асноўныя вайсковыя сілы паўстанцаў (Т. Касцюшка быў узяты ў палон). 6 лістапада 1794 г. расійскія войскі пасля крывавага штурма (падчас яго загінуў Я. Ясінскі) захапілі Варшаву. Канчаткова паўстанне на тэрыторыі Польшчы было падаўлена 16 лістапада 1794 г.

Прычынамі паражэняя паўстання 1794 г. былі:

- істотная перавага ў матэрыяльных і людскіх рэсурсах кааліцыі Расіі, Прусіі і Аўстрыі;

- недастаткова выокі ўзровень арганізацыі паўстання; унутрыпалітычная барацьба сярод кіраўніцтва паўстаннем;

- вузкасць сацыяльнай базы (сялянства ў асноўнай масе абыякава паставілася да паўстання, паколькі паўстанцкія ўлады не ажыццявілі істотных крокаў да паляпшэння становішча сялян).

Па выніках ваенных дзеянняў, Прусія, Расія і Аўстрыя канчаткова ліквідавалі Рэч Паспалітую як дзяржаву. У кастрычніку 1795 г. у адпаведнасці з Пецярбургскай канвенцыяй быў зацверджаны *трэці падзел Рэчы Паспалітай* паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Паводле якога пераможцы атрымалі:

| ПРУСІЯ | АЎСТРЫЯ | РАСІЯ |
|---|---|---|
| • Мазовія<br>• Тэрыторыя Літвы да р. Неман<br><u>48 тыс. км</u><br><u>11 млн. жыхароў</u> | Тэрыторыя паўднёвай і цэнтральнай Польшчы (Кракаў, Сандамір, Хелм, Люблін)<br><u>47 тыс.км</u><br><u>11,5 млн. жыхароў</u> | • Заходняя Беларусь<br>• Літва<br>• Курляндыя<br>• Частка Валыні<br><u>120 тыс. км</u><br><u>11,2 млн. жыхароў</u> |

Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі 25 лістапада 1795 г. адрокся ад кароны на карысць расійскай імператрыцы Кацярыны ІІ і праз некалькі год памёр у Гародні. Рэч Паспалітая (Польскае каралеўства і Вялікае княства Літоўскае) спыніла сваё існаванне.

*Такім чынам, сацыяльна-палітычны крызіс, які ахапіў Рэч Паспалітую к сярэдзіне 18 ст., вымусіў кіруючыя колы дзяржавы ажыццявіць шэраг рэформ, накіраваных на цэнтралізацыю дзяржаўнай улады і мадэрнізацыю грамадскага ладу. Вяршыняй дадзенага працэсу стала абвяшчэнне Канстытуцыі 3 мая 1791 г. Аднак умяшанне замежных дзяржаў і барацьба супраць рэформ магнацкай алігархіі прывялі да паглыблення палітычнага крызісу і ліквідацыі Рэчы Паспалітай як дзяржавы ў выніку трох падзелаў.*

**Асноўныя паняцці:**

Казацкая вайна 1648 – 1653 гг., Запарожская Сеч, вайна Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654 – 1667 гг., вайна Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1655 – 1660 гг., Кейданская унія, Аліўскі мір 1660 г., шышы, Магілёўскае паўстанне 1661 г., Андрусаўскае перамір’е 1667 г., “Вечны мір” 1686 г., рокаш 1665 – 1666 гг., Саксонкая дынастыя, грамадзянская вайна 1697 – 1704 гг., “сапежынцы”, “рэспубліканцы”, Паўночная вайна 1700 – 1721 гг., “дысідэнты”, Радамская канфедэрацыя, Слуцкая канфедэрацыя, Барская канфедэрацыя, першы падзел Рэчы Паспалітай, Пастаянная рада, Чатырохгадовы сойм, Стража правоў, Канстытуцыя 3 мая 1791 г., Таргавіцкая канфедэрацыя, другі падзел Рэчы Паспалітай, паўстанне 1794 г., Найвышэйшая літоўская рада, Паланецкі ўніверсал, касінеры, трэці падзел Рэчы Паспалітай.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Назавіце асноўныя прычыны сацыяльна-палітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай ў другой палове 17 ст.
2. Якія фактары абумовілі казацкую вайну 1648 – 1653 гг. Якія мэты ставіла перад сабой казацтва ў гэтай вайне?
3. Калі казацкая вайна закранула тэрыторыю ВКЛ і якія рэгіёны? Якім было стаўленне мясцовага насельніцтва да казакаў?

4. Што стала прычынай пачатку вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 г.?
5. Растлумачце, якія прычыны абумовілі перамогу маскоўскіх войскаў на першым этапе вайны 1654 – 1667 гг.?
6. Якія найбольш значныя бітвы вайны 1654 – 1667 гг. вы можаце назваць?
7. Якім было стаўленне насельніцтва ВКЛ да маскоўскіх уладаў падчас вайны 1654 – 1667 гг.? Хто такія шышы?
8. Ахарактарызуйце асноўныя падзеі вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1655 – 1660 гг. Што такое Кейданская унія? Якія яна мела вынікі?
9. Як змяніліся межы Рэчы Паспалітай пасля вайны 1654 – 1667 гг.?
10. Ахарактарызуйце ўнутрыпалітычнае жыццё ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай ў другой палове 17 ст. Падумайце, чаму скончыліся правалам спробы дзяржаўных рэформ Яна Казіміра Вазы ў 1660-я гг.?
11. Якім быў галоўны накірунак знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай ў апошняй чвэрці 17 ст.?
12. Чаму перыяд 1697 – 1763 гг. у гісторыі Рэчы Паспалітай называецца перыядам Саксонскай дынастыі?
13. Вызначце асноўныя прычыны, ход і вынікі грамадзянскай вайны ў ВКЛ 1697 – 1704 гг.
14. Якія дзяржавы ўдзельнічалі ў Паўночнай вайне? Ахарактарызуйце асноўныя падзеі, звязаныя з дадзенай вайной, у ВКЛ.
15. Якія асноўныя бітвы перыяду Паўночнай вайны на тэрыторыі ВКЛ Вы ведаеце?
16. Якія страты панеслі землі ВКЛ у выніку войнаў другой паловы 17 – пачатку 18 стст.?
17. Назавіце асноўныя прычыны і фактары ўнутрыпалітычнага крызісу Рэчы Паспалітай у сярэдзіне 18 ст.?
18. Якія асаблівасці дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай прадвызначылі сацыяльна-палітычны крызіс у 18 ст.?
19. Якія дзяржавы ўмешваліся ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай у 18 ст. і якім чынам?
20. Дайце агульную характарыстыку рэформ у Рэчы Паспалітай 1760-х гг. Якім чынам гэтыя рэформы былі ўспрынятыя ў магнацкіх колах і ва ўрадах суседніх дзяржаў?
21. Якія канфедэрацыі былі створаны напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай?
22. Якія землі страціла Рэч Паспалітая ў выніку першага падзелу?
23. У чым заключалася рэфарматарская дзейнасць Чатырохгадовага сойму?
24. Вызначце і ахарактарызуйце асноўныя палажэнні Канстытуцыі 3 мая 1791 г.? Якія змены ў грамадска-палітычным ладзе Рэчы Паспалітай яна прадугледжвала?
25. Якую ролю ў грамадска-палітычных падзеях Рэчы Паспалітай адыгрываў уплыў Французскай рэвалюцыі?

26. Укажыце асноўныя прычыны другога падзелу Рэчы Паспалітай і яго вынікі.
27. Ахарактарызуйце перадумовы і ход паўстання 1794 г. у ВКЛ.
28. Якія грамадска-палітычныя плыні вылучаліся ў межах паўстання 1794 г.?
29. Ці можна сцвярджаць, што паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі мела рэвалюцыйны характар?
30. Вызначце асноўныя прычыны паражэння паўстання 1794 г. Калі адбыўся трэці падзел Рэчы Паспалітай?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Казацкая вайна на тэрыторыі ВКЛ у 1648 – 1651 гг.
2. Кейданская унія: перадумовы заключэння і вынікі.
3. Землі ВКЛ пад уладай Маскоўскай дзяржавы падчас вайны 1654 – 1667 гг.
4. Барацьба магнацкіх груповак за ўладу ў ВКЛ ва ўмовах Паўночнай вайны.
5. Расійская дыпламатыя і Рэч Паспалітая ў 18 ст.
6. “Дысідэнцкае пытанне” ва ўнутрыпалітычным жыцці Рэчы Паспалітай у 18 ст.
7. Канстытуцыя 3 мая 1791 г.: агульная характарыстыка.
8. Гродзенскі сойм 1793 г.: апошні сойм Рэчы Паспалітай.

## Тэма 8: Сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ у 17 – 18 стст.

**1. Сельская гаспадарка ў 17 – першай палове 18 стст.**
**2. Гарады, рамяство і гандаль у 17 – першай палове 18 стст.**
**3. Сацыяльна-эканамічны ўздым у другой палове 18 ст.**

### 8.1. Сельская гаспадарка ў 17 – першай палове 18 стст.

У другой палове 17 – першай палове 18 стст. сельская гаспадарка ВКЛ апынулася ў стане цяжкага крызісу. Прычынамі яго былі шматлікія вынішчальныя войны. Рэзка скарацілася колькасць насельніцтва. Калі ў 1654 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі было каля 2,9 млн. жыхароў, у 1667 г. – каля 1,4 млн. Да 1700 г. колькасць насельніцтва ўзрасла да 2,2 млн, але пасля Паўночнай вайны скарацілася да 1,5 млн. чалавек. Не было працаўнікоў, таму значна зменшылася колькасць ворыўных зямель і цяглавай жывёлы. Пасяўныя плошчы скараціліся больш чым на палову.

Гаспадаркі буйных землеўладальнікаў пацярпелі ад крызісу ў меншай ступені, таму ў структуры землеўладання павялічваецца ўдзельная вага *буйных латыфундый*. У 18 ст. 16 магнацкім сем’ям (Радзівілам, Сапегам, Агінскім, Чартарыйскім і інш.) належала на тэрыторыі ВКЛ 30% усіх зямель. Буйныя землеўладанні захоўваліся ў руках каралеўскай адміністрацыі, а таксама каталіцкай і ўніяцкай цэркваў. Найбольш пацярпелі ад крызісу

гаспадаркі сярэдняй і дробнай шляхты, што прывяло да ўзмацнення эканамічнай залежнасці дробнай шляхты ад магнатэрыі.

Падчас *аднаўлення* сельскай гаспадаркі шляхта выкарыстоўвала ў асноўным *два метады*:

- перавод сялян на чынш;
- пашырэнне фальварка.

*Перавод на чынш* праводзіўся часцей за ўсё там, дзе разбурэнне было асабліва вялікім і востра не хапала рабочых рук (усходняя частка краіны). У гэтых маёнтках шляхта вымушана была адмаўляцца ад самастойнага вядзення гаспадаркі, перадавала часова зямлю сваіх фальваркаў сялянам і пераводзіла іх з паншчыны на чынш.

*Пашырэнне фальварачных запашак* пераважала там, дзе насельніцтва, якое хоць і памяншалася, але ў масе сваёй заставалася на месцы. У 1730-1740-я гг. фальварачныя гаспадаркі ўзмацніліся на захадзе і ў цэнтральнай частцы ВКЛ.

Для аднаўлення фальваркаў патрэбны былі грашовыя сродкі, якіх у шляхты пастаянна не хапала. Таму з другой паловы 17 ст. стала шырока практыкавацца *перадача маёнтка ў арэнду або залог*. Арандатарамі былі шляхціцы, а часам купцы, яўрэі; пераважала кароткатэрміновая арэнда на 1-3 гады.

Паступова адбывалася *аднаўленне сялянскай гаспадаркі*. Сяляне пашыралі сваю гаспадарку шляхам запашкі пазанадзельнай зямлі, з якой яны не выконвалі павіннасці (бо ўтойвалі), ці плацілі невялікія падаткі. У аднаўленчы перыяд дзяржаўная ўлада і шляхта ўводзілі розныя ільготы для сялян, якія бралі для апрацоўкі дадатковы надзел, захвочвалі для пасялення на сваіх землях сялян з іншых раёнаў, вызваляючы іх на некалькі гадоў ад усіх павіннасцяў. Такая палітыка станоўча ўплывала на стан сялянскай гаспадаркі і садзейнічала яе аднаўленню. Тым не менш у сувязі з гаспадарчым разбурэннем павялічылася колькасць малазямельных беззямельных сялян.

Сялянскія надзелы па-ранейшаму падзяляліся на *цяглавыя* (пераважна на захадзе і ў цэнтры ВКЛ) і *чыншавыя* (пераважна на ўсходзе ВКЛ). Максімальныя памеры павіннасцяў вызначаліся ў *інвентарах*. Але яны паўсюдна парушаліся арандатарамі і адміністрацыяй маёнткаў.

Па меры аднаўлення гаспадаркі ільготы для сялян скасоўваліся. На працягу 18 ст. аб’ём павіннасцей у ВКЛ павялічыўся ў 3 разы. Рэкорд быў дасягнуты ў маёнтку Блювенічы Лідскага павету, дзе паншчына ў 1746 г. складала 24 дні на тыдні з валокі. Асабліва негатыўна адбілася на матэрыяльным становішчы сялянства пашырэнне арэнды ў маёнтках буйных магнатаў. Арандатары, заплаціўшы ўладальніку пэўную суму грошай, імкнуліся за кароткі выціснуць з сялян як мага большы прыбытак.

Узмацненне феадальнага прыгнёту выклікала шэраг лакальных сялянскіх паўстанняў: у Слонімскім павеце 1700–1703 гг., у Крычаўскім старостве ў 1743–1744 гг., на Каменшчыне (Мазырскі павет) у 1754 – 1756 гг. Найбольш значным было *паўстанне ў Крычаўскім старостве*. Доўгія гады мясцовыя

сяляне вялі ўпартую барацьбу супраць самавольства арандатараў (старастам быў Г. Радзівіл). Звычайныя формы барацьбы – скаргі, адмовы выконваць павіннасці, уцёкі – вынікаў не давалі. У канцы 1743 г. выбухнула ўзброенае паўстанне, якое ўзначаліў *Васіль Вашчыла*. Сяляне і мяшчане Крычава прагналі арандатараў, замест іх абралі новую адміністрацыю. Паўстанне падаўлена вайсковай сілай у студзені 1744 г. Але Г. Радзівіл пайшоў на саступкі: ён замяніў паншчыну на чынш, зняў абмежаванні для сялян у гандлі, на некаторы час не аддаваў староства ў арэнду.

*Такім чынам, другая палова 17 – першая палова 18 стст. адзначаецца моцным эканамічным крызісам у сельскай гаспадарцы ВКЛ, выкліканым шматлікімі войнамі. Аднаўленне гаспадаркі адбывалася шляхам некаторага змяншэння феадальнага прыгнёту сялянства. Аднак ва ўмовах стабілізацыі эканомікі шляхта накіроўвала намаганні на павелічэнне даходнасці сваіх гаспадарак у першую чаргу шляхам ўзмацнення эксплуатацыі прыгоннага сялянства.*

### 8.2. Гарады, рамяство і гандаль у 17 – першай палове 18 стст.

Войны другой паловы 17 – пачатку 18 стст. нанеслі гарадам і мястэчкам яшчэ большыя страты, чым сельскай гаспадарцы. Была разбурана большасць гарадоў, а некаторыя цалкам разрабаваны і спалены. Падчас вайны з Маскоўскай дзяржавай 1654-1667 гг. рамеснікі хрысціянскага веравызнання ў масавым парадку прымусова вывозіліся ў Масковію. Вынікам стала тое, што ў сярэдзіне 18 ст. у гарадах стала дамінаваць яўрэйскае насельніцтва. Унутраны рынак рэзка звузіўся. Частка гарадскіх рамеснікаў была вымушана перасяляцца ў вёску або займацца сельскай гаспадаркай у горадзе, бо не было заказаў пакупнікоў.

Ва ўмовах заняпаду гарадоў магнаты, выкарыстоўваючы свае прывілеі і вайсковыя сілы, рабавалі купецкія абозы, самавольна патрабавалі грошай з гарадоў, а часам проста ажыццяўлялі рабаўнічыя напады на гарады і рынкі. Ствараліся прыватныя ўнутраныя мытні ва ўладаннях магнатаў. Значна выраслі падаткі з дзяржаўных гарадоў, і адначасова раслі юрыдыкі.

З аднаўленнем сельскай гаспадаркі паступова пачынае адраджацца гаспадарка гарадскіх паселішчаў. Хутчэй, чым іншыя, адбудоўваюцца буйныя гарады на галоўных гандлёвых шляхах – Менск, Магілёў, Віцебск, Нясвіж, Навагародак – у іх лягчэй было з дапамогай права абмежаваць магнацкае свавольства. У найбольшай ступені насельніцтва гарадоў і мястэчак павялічвалася за кошт яўрэяў, паколькі прыток людзей з вёскі быў складанай справай з-за панавання прыгоннага права.

У гарадах у першай палове 18 ст. адраджаецца рамесная вытворчасць, адзначаецца спецыялізацыя раёнаў. У Віцебску ў першай палове 18 ст. пашыралася гарбарная вытворчасць, апрацоўка мінеральнай сыравіны і дрэва; у Магілёве – вытворчасць мыла і пальчатак; у Слуцку – пярсцёнак. Адраджэнне рамяства суправаджалася аднаўленнем *цэхаў*. Адначасова ўзрастае роля *скупшчыка-пасярэдніка* паміж вытворцам і рынкам. Гэтай справай займаюцца не толькі гандлёвыя людзі, але і цэхавыя майстры. Цэхі

ўжо не ахопліваюць большасць рамеснікаў горада. Павялічваецца праслойка нецэхавых рамеснікаў. Узрастае канкурэнцыя паміж цэхамі і нецэхавымі рамеснікамі.

У сярэдзіне 17 ст. прыкметна звузіўся памер унутранага і знешняга гандлю. Прычынамі былі агульны заняпад гаспадаркі; збядненне асноўнай масы насельніцтва; вузкасць унутранага рынку і г.д. З сярэдзіны 18 ст. гандаль у гарадах некалькі ажывіўся за кошт вывазу на экспарт вырабаў сельскай гаспадаркі і лясных промыслаў. Увозілі ў якасці імпартных тавараў тканіны, палотны, жалеза і вырабы з яго, медзь, розныя галантарэйныя вырабы. Пашырыліся гандлевыя сувязі з Прыбалтыкай і Расіяй.

*Такім чынам, на працягу другой паловы 17 – першай паловы 18 стст. гарадская гаспадарка знаходзіцца ў стане моцнага крызісу. К сярэдзіне 18 ст. назіраецца некаторае ажыўленне. Аднак тым не менш разбураная інфраструктура гарадоў, адсутнасць значнага мяшчанскага капіталу, які б мог стаць асновай пашыранага развіцця эканомікі садзейнічалі захаванню сярэднявечных форм эканамічнай дзейнасці.*

### 8.3. Сацыяльна-эканамічны ўздым у другой палове 18 ст.

У другой палове 18 ст. адбылося значнае ажыўленне ва ўсіх сферах эканомікі ВКЛ. *Прычынамі ажыўлення былі*:

1) Хуткі рост насельніцтва (у 1791 – налічвалася звыш 3,6 млн. жыхароў, з 11% гарадское насельніцтва).

2) Узрастанне попыту на сельскагаспадарчыя прадукты як у самім ВКЛ, так і за яе межамі. Попыт на аграрную прадукцыю павялічваўся таму, што рэзка выраслі цэны на збожжа на замежным рынку ў другой палове 18 ст. (у 3-5 разоў) ва ўмовах паскарэння эканамічнага развіцця і росту гарадоў. Гэта садзейнічала развіццю таварнай фальваркавай гаспадаркі.

3) Дзяржаўныя рэформы 1760-1770-х гг.: узмацненне цэнтральнага апарату дзяржаўнай улады, адмена ўнутраных мытняў і пошлін, дазвол мяшчанам набываць маёнткі, а шляхце займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю і гандлем; устанаўленне адзіных мытных пошлін для ўсіх экспарцёраў Рэчы Паспалітай, уніфікацыя сістэмы мер і вагі.

4) Захады з боку дзяржавы па развіцці гандлю і сродкаў зносін: пракладваюцца пінска-слонімскі і пінска-валынскі тракты; праводзяцца работы па ачыстцы і рэгуліроўцы рэк, збудаванню рачных партоў, будаўніцтву дарог і мастоў. У 1781-1784 гг. быў пабудаваны *Прыпяцка-Нёманскі і Прыпяцка-Бугскі каналы*.

*Сельская гаспадарка*

Прыкметамі *эканамічнага росту ў сельскай гаспадарцы* сталі:

- пашырэнне фальварачнай запашкі на захадзе і ў цэнтры ВКЛ;
- асваенне новых зямель;
- удасканаленне агратэхнікі;
- рост пагалоўя хатняй жывёлы;
- павышэнне ўраджайнасці;

- павелічэнне таварнасці шляхецкай сельскай гаспадаркі, пашырэнні яе сувязяў з рынкам.

У другой палове 18 ст. павялічваюцца надзелы сялянскіх гаспадарак. Сяляне асвойвалі пустуючыя землі, а таксама расчышчалі ад лесу новыя плошчы. Сярэдні зямельны надзел прыватнаўласніцкіх сялян у другой палове 18 ст. склаў 0,63 валокі на адну гаспадарку. На ўсходзе ВКЛ ён быў некалькі большым, чым у заходніх і цэнтральных рэгіёнах. Пры чыншавай сістэме гаспадарання ў сяляніна была магчымасць апрацоўваць большую дзялянку зямлі. Сялянскія павіннасці заставаліся тымі ж, але змяніліся іх памеры. У цэлым павіннасці ў гэты час павялічыліся ў сярэднім ў 1,5 разы ў параўнанні з папярэднім перыядам.

Пачынаецца працэс *сацыяльнага расслаення ў вёсцы*. Каля 10% сялян не мелі сваёй гаспадаркі і працавалі па найме ў заможных сялян або на панскай гаспадарцы. У той жа час вылучаецца невялікая група заможных сялян, якая часам арандавала ў шляхты млыны, цагельныя заводы і г.д.

З мэтай павелічэння прыбытковасці дзяржаўных маёнткаў падскарбій ВКЛ Антоній Тызенгаўз у 1765 г. правёў *аграрную рэформу ў каралеўскіх эканоміях* – дзяржаўных зямельных уладаннях, прызначаных для задавальнення патрэб двара манарха і прыдворнага скарбу. Сутнасць яе заключалася ва ўмацаванні фальваркавай сістэмы гаспадарання. Рэформа пачалася з перапісу і фіксацыі зямельнай маёмасці і павіннасцяў сялян, што дазволіла выпрацаваць агульныя нормы выканання павіннасцяў (галоўным відам павіннасцяў была паншчына) за карыстанне пэўнай колькасцю зямлі. Была адменена арэнда ў эканоміях. Дадзеныя меры зменшылі злоўжыванні дзяржаўнай адміністрацыі ў адносінах да сялян і садзейнічалі павелічэнню рэнтабельнасці сялянскіх гаспадарак. Уводзілася дзяржаўнае страхаванне на выпадак неўраджаяў і бедстваў, ствараліся школы для сялянскіх дзяцей. Дадзеная рэформа дазволіла павялічыць прыбытковасць дзяржаўных маёнткаў. Аднак у той жа час яна прывяла да павелічэння павіннасцяў сялян, што прыводзіла да росту сацыяльнай напружанасці ў вёсцы. Найбольш яркім прыкладам гэтага стала *паўстанне сялян Шаўліскай эканоміі 1769 г.*

Некаторыя землеўладальнікі ў сваіх маёнтках пачалі ў гэты перыяд уводзіць *капіталістычныя метады гаспадарання*, г.зн. такія метады, якія былі заснаваны на выкарыстанні вольнанаёмнай працы. У такіх гаспадарках праца ў фальварках ажыццяўлялася не шляхам паншчыны прыгонных сялян, якія пераводзіліся на чынш, а шляхам працы наёмных сельскагаспадарчых рабочых (пераважна з ліку малазямельных і беззямельных сялян) за заработную плату. З мэтай павелічэння даходнасці ў такіх маёнтках уводзіліся новыя формы агратэхнікі і арганізацыі працы, тэхнічныя ўдасканаленні. Падобныя мерапрыемствы ажыццяўляліся ў маёнтках І. Храптовіча, П.К. Бжастоўскага, Т. Ваўжэцкага і іншых магнатаў. Аднак большасць шляхты працягвала ажыццяўляць гаспадарчую дзейнасць традыцынымі метадамі.

*Гарады, рамяство і гандаль*

Да канца 18 ст. была адноўлена большасць гарадскіх паселішчаў. Насельніцтва гарадоў і мястэчак дасягнула каля 370 тыс., што складала каля 11% усяго насельніцтва. Аднак агульная колькасць гарадоў да канца 18 ст. не дасягнула ўзроўню першай паловы 17 ст.

Галоўную ролю адыгрывалі вялікія гарады на галоўных гандлёвых шляхах – Вільня, Віцебск, Гародня, Магілёў, Менск. Рамеснае насельніцтва ў вялікіх гарадах складала 30-40%, у малых 10-25% ад агульнай колькасці жыхароў. Акрамя рамяства важнымі заняткамі жыхароў гарадоў заставаліся сельская гаспадарка, а таксама розныя промыслы – рыбная лоўля, сплаў лесу і інш.

*Асноўныя віды рамёстваў*:

- апрацоўка металаў (ім займалася каля 20-30% ад агульнай колькасці рамеснага насельніцтва гарадоў);
- апрацоўка скур;
- выраб адзення;
- будаўнічыя рамёствы.

У буйных гарадах налічвалася да 45-60 рамесных прафесій.

Пануючае становішча ў гарадах заставалася за *цэхавым рамяством*, але колькасць цэхаў скарачалася да канца 18 ст. Адначасова расла колькасць рамеснікаў, якія працавалі па-за межамі цэха. Яны пачалі выкарыстоўваць наёмных работнікаў. Такое становішча павялічвала канкурэнцыю і садзейнічала паступоваму разбурэнню цэхавай арганізацыі вытворчасці.

*Мануфактурная вытворчасць*

Новай з'явай у сацыяльна-эканамічным развіцці становіцца стварэнне мануфактур. *Мануфактурная вытворчасць* – буйная прамысловая вытворчасць, заснаваная на падзеле працы пры захаванні ручной тэхнікі. У Заходняй Еўропе шырока развіваецца з 16-17 стст. У ВКЛ першыя мануфактуры з'яўляюцца толькі ў 18 ст. Пераважная большасць з іх знаходзілася ў мястэчках і маёнтках, якія належалі каралю або магнатам. Таму яны называліся *вотчыннымі мануфактурамі*.

Першай мануфактурай у ВКЛ лічыцца шкляны завод у Налібоках (1720-я гг.). Большасць мануфактур спецыялізавалася на вытворчасці прадметаў раскошы. Найбольш вядомымі з'яўляліся мануфактуры ў мястэчку Ўрэчча Бабруйскага павета (шкляныя вырабы і люстэркі), мястэчку Свержань (фарфоравыя вырабы), Нясвіжы і Слуцку (шаўковыя паясы). У 1760-1770-я гг. у каралеўскіх эканоміях паводле ініцыятывы А. Тызенгаўза была заснавана 21 мануфактура ў раёне Гародні, Берасця і Пастаў (выраб шоўку, сукна, зброі і г.д.).

Мануфактуры працавалі пераважна не на выраб масавай прадукцыі на продаж, а на задавальненне попыту ў прадметах раскошы магнацкай эліты. У якасці рабочых на большасці мануфактур выкарыстоўваліся прыгонныя сяляне, для якіх праца ў прамысловасці стала своеасаблівай павіннасцю. На працягу 18 ст. былі заснаваны 53 мануфактуры, на якіх працавала 2400 рабочых, пераважна прыгонных.

*Гандаль*

Адбываецца ажыўленне гандлёвых сувязяў як на ўнутраным, так і на знешнім рынку. Гэтаму садзейнічалі ўзнаўленне сельскай гаспадаркі; уздым рамеснай і станаўленне мануфактурнай вытворчасці; пашырэнне таварна-грашовых адносін; паляпшэнне шляхоў зносін.

У развіцці ўнутранага гандлю асноўная роля належала *кірмашам*. Найбольш буйнымі былі кірмашы ў Бешанковічах і Зэльве. З'яўляецца рэгулярны гандаль праз крамы.

У структуры *знешняга гандлю* на экспарт вывозіліся збожжа, воск, мёд, скуры, лён, лес і г.д. Імпартаваліся пераважна прадметы заходнееўрапейскай мануфактурнай прамысловасці. Асноўнымі пунктамі знешняга гандлю былі балтыйскія порты Гданьск, Каралявец, Рыга. Паралельна пашыраліся гандлёвыя сувязі з Расійскай імперыяй.

Развіваюцца крэдытна-грашовыя адносіны. У 1776 г. у Гародні быў заснаваны першы на тэрыторыі Беларусі *банк*.

*Такім чынам, у другой палове 18 ст. у ВКЛ назіраецца сацыяльна-эканамічны ўздым. Новымі з'явамі становяцца фарміраванне капіталістычных метадаў гаспадарання ў вёсцы, стварэнне прамысловых прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу. Аднак у той жа час феадальна-прыгонніцкія адносіны застаюцца пераважнымі формамі і механізмамі мабілізацыі гаспадарчых рэсурсаў, што абумовіла эканамічнае адставанне ВКЛ ад перадавых краін Заходняй Еўропы, якія ў гэты час развіваліся па капіталістычнаму шляху.*

**Асноўныя паняцці:**

Арэнда, інвентары, паўстанне ў Крычаўскім старостве, Прыпяцка-Нёманскі канал, Прыпяцка-Бугскі канал, аграрная рэформа ў каралеўскіх эканоміях, капіталістычныя метады гаспадарання, мануфактура, вотчынная мануфактура, банк.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія прычыны выклікалі востры крызіс у сацыяльна-эканамічным жыцці ВКЛ у другой палове 17 – першай палове 18 стст.?
2. Растлумачце, чаму у другой палове 17 – першай палове 18 стст. павялічваецца ўдзельная вага буйных латыфундый у структуры землеўладання?
3. Якія асноўныя метады выкарыстоўвала шляхта для аднаўлення сваіх гаспадарак у другой палове 17 – першай палове 18 стст.?
4. У сувязі з чым у 18 ст. распаўсюдзілася арэнда зямлі ў буйных маёнтках? Якія наступствы гэта мела для сялянства?
5. Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае становішча сялянства ў другой палове 17 – першай палове 18 стст.
6. Назавіце буйнейшыя сялянскія паўстанні ў першай палове 18 ст. Чым яны былі выкліканы?
7. Якім чынам змяніўся этнічны склад гарадоў ВКЛ у 18 ст?

8. Ахарактарызуйце агульнае становішча гарадоў ВКЛ у другой палове 17 – першай палове 18 стст.
9. У якіх гарадах аднаўленне гаспадаркі адбываецца больш хуткім тэмпамі і чаму?
10. Вызначце стан унутранага і знешняга гандлю ў ВКЛ у другой палове 17 – першай палове 18 стст.
11. Якія прычыны вызначылі сацыяльна-эканамічны ўздым у ВКЛ у другой палове 18 ст.?
12. Якія шляхі камунікацый былі пабудаваныя на сродкі дзяржавы і магнатаў ВКЛ у другой палове 18 ст.?
13. Укажыце прыкметы эканамічнага росту ў сельскай гаспадарцы ВКЛ у другой палове 18 ст.
14. Ахарактарызуйце становішча сялянскай гаспадаркі ў другой палове 18 ст.
15. У чым заключаліся асноўныя накірункі аграрнай рэформы А. Тызенгаўза ў каралеўскіх эканоміях? Якія яна мела вынікі?
16. У чым спецыфіка капіталістычных метадаў гаспадарання ў шляхецкіх маёнтках? Падумайце, чаму дадзеныя метады не атрымалі шырокага распаўсюджання ў сельскай гаспадарцы ВКЛ?
17. Ахарактарызуйце асаблівасці развіцця гарадоў і рамяства ў ВКЛ у другой палове 18 ст.
18. Што такое мануфактура? Дзе з’яўляюцца першыя мануфактуры ў ВКЛ?
19. Што такое вотчынныя мануфактуры? у чым палягае іх спецыфіка? Падумайце, чым было выклікана іх стварэнне?
20. Ахарактарызуйце працэс развіцця ўнутранага і знешняга гандлю ў ВКЛ у другой палове 18 ст.
21. Дзе на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца першы банк і калі?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Каралеўскія эканоміі ў другой палове 17 – 18 стст.
2. Сялянскае паўстанне ў Крычаўскім старостве: прычыны, ход, вынікі.
3. Барацьба гарадоў ВКЛ з магнацкім самавольствам у другой палове 17 – першай палове 18 стст.
4. “Паўлаўская рэспубліка” ва ўладаннях П.К. Бжастоўскага.
5. Эканамічная палітыка А. Тызенгаўза ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ (1765 – 1780).
6. Развіццё шляхоў зносін у ВКЛ у другой палове 18 ст.
7. Крэдытна-грашовая сістэма ў ВКЛ у 18 ст.

## Тэма 9: Рэлігія і культура ВКЛ 17 – 18 стст.

**1. Рэлігійныя адносіны.**

**2. Этнічныя працэсы.**

**3. Адукацыя і навука.**

**4. Культура.**

**9.1. Рэлігійныя адносіны.**

17 – першая палова 18 стст. адзначаюцца ў рэлігійным жыцці ВКЛ істотным ростам палітычнага, эканамічнага і ідэалагічнага ўплыву *рымска-каталіцкай царквы*. Гэтаму садзейнічала *Контррэфармацыя* – рух, які ахапіў усе каталіцкія краіны Еўропы і быў накіраваны на ўзмацненне ролі і значэння каталіцкай царквы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, а таксама на барацьбу з варожымі адносна царквы вучэннямі, асабліва пратэстанцкімі.

Галоўнай сілай у ажыццяўленні Контррэфармацыі становіцца створаны ў сярэдзіне 16 ст. манаскі *ордэн езуітаў*. На тэрыторыі ВКЛ езуіты з'яўляюцца ў 1569 г. А ўжо на пачатку 1770-х гг. тут дзейнічала каля 90 езуіцкіх устаноў. Пашыралася дзейнасць і іншых каталіцкіх манаскіх ордэнаў (дамініканцы, францысканцы, кармеліты, бенедэктынцы, піяры, бернардзінцы, аўгусцінцы).

*Асноўныя накірункі Контррэфармацыі*:

- актыўная прапаганда сярод насельніцтва, асабліва шляхты, на карысць каталіцызму;
- актыўная палітычная і эканамічная падтрымка каталіцкай царквы з боку дзяржавы;
- арганізацыя сеткі каталіцкіх, найперш езуіцкіх, навучальных устаноў;
- арганізацыя пры каталіцкіх манаскіх ордэнах дабрачыннай і культурнай дзейнасці (бясплатныя шпіталі, тэатры і г.д.);
- гвалтоўныя дзеянні часткі духавенства і езуітаў у адносінах да іншаверцаў (пагромы, падпалы культавых будынкаў і г.д.). Так, па ініцыятыве езуітаў адбыліся антыпратэстанцкія пагромы ў Вільні ў 1581, 1591, 1611, 1639, 1682 гг.

Ва ўмовах Контррэфармацыі каталіцкая царква ўзмацніла намаганні, накіраваныя на падпарадкаванне праваслаўнай царквы. Вышэйшае праваслаўнае духавенства ў канцы 16 ст. прыхільна ставілася да ідэі аб'яднання з каталіцкай царквой, паколькі спадзявалася такім чынам вызваліцца з-пад апекі свецкіх апякуноў. Ідэя царкоўнай уніі знайшла падтрымку з боку дзяржаўнай улады падчас каралявання Жыгімонта Вазы.

6-9 кастрычніка 1596 г. на царкоўным саборы ў Берасці большасць праваслаўных епіскапаў Рэчы Паспалітай на чале з мітрапалітам Міхаілам Рагозам прыняла рашэнне пра далучэнне да каталіцкай царквы.

*Умовы Берасцейскай царкоўнай уніі*:

- праваслаўная царква Рэчы Паспалітай прызнавала ўладу рымскага папы і выходзіла з-пад падпарадкавання Канстанцінопальскага патрыярхату;
- праваслаўная царква прызнавала каталіцкае веравучэнне;
- захоўваліся ранейшыя абрады, традыцыі, мова набажэнстваў праваслаўнай царквы.

Аднак у той жа час большасць сярэдняга і дробнага праваслаўнага духавенства і некаторыя епіскапы, а таксама шырокія колы праваслаўнай шляхты і мяшчан выступілі супраць уніі. У кастрычніку 1596 г. яны правялі ў

Берасці альтэрнатыўны сабор, які абвясціў адлучэнне ад царквы епіскапаў-уніятаў і пацвердзіў падпарадкаванне Канстанцінопальскаму патрыярху. Такім чынам, адбыўся *раскол царквы на уніяцкую і праваслаўную*.

Дзяржаўная ўлада актыўна падтрымлівала уніяцкую царкву. Афіцыйна ўсе правы і прывілеі, якія належалі праваслаўнай царкве, пераходзілі да ўніяцкай. На падставе гэтага дзяржаўныя (гарадскія) праваслаўныя цэрквы перадаваліся уніятам, а калі ў горадзе не было прыняўшых унію святароў, храмы зачыняліся. Здараліся выпадкі прымусовага навяртання праваслаўных да уніі. Праваслаўная царква была пазбаўлена фактычна сталага юрыдычнага статусу і не мела легітымнай іерархіі.

Дадзеная сітуацыя стала асновай *праваслаўна-уніяцкага рэлігійнага канфлікту*. Праваслаўныя спрабавалі давесці незаконнасць уніі; паміж праваслаўнымі і уніятамі ішлі пастаянныя спрэчкі за царкоўную маёмасць. Праваслаўная шляхта разам з пратэстанцкай актыўна выступала на соймах і сойміках з патрабаваннямі гарантый юрыдычных правоў для праваслаўнай царквы. Найбольшую актыўнасць у канфлікце мелі праваслаўныя і уніяцкія брацтвы, якія складаліся пераважна з ліку мяшчан. Брацтвы наладжвалі свае канфесійныя друкарні, школы, выдавалі палемічную літаратуру.

Асабліва абвастрыўся праваслаўна-уняцкі канфлікт пасля таго, як у 1620 г. іерусалімскім патрыярхам Феафанам была пасвечана новая праваслаўная іерахія. Дадзены акт фактычна абвяшчаў пазбаўленне уніяцкіх епіскапаў іх пасад. Дзяржаўныя ўлады не прызналі дадзенага пасвячэння і пачалі праследаванні прыхільнікаў новай іерахіі. Канфлікт у некаторых месцах набыў узброеныя формы. Найбольш вядомым актам насілля стала забойства ў Віцебску ў 1623 г. полацкага уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча. Паступова рэлігійны канфлікт сталі выкарыстоўваць як ўнутраныя палітычныя сілы (казакі), так і знешнія (Маскоўская дзяржава), абвяшчаючы сябе абаронцамі праваслаўя у Рэчы Паспалітай.

Для суцішэння рэлігійнага канфлікту кароль Уладыслаў Ваза ў 1632 г. абвясціў пра *аднаўленне правоў праваслаўнай царквы* ў Рэчы Паспалітай у складзе трох епархій на чале з кіеўскім мітрапалітам. Тэрыторыя ВКЛ уваходзіла ў склад *Магілёўскай епархіі*. Дзяржава афіцыйна прызнала правы і прывілеі праваслаўнай царквы. У 1632-1635 гг. быў прыняты шэраг дакументаў, паводле якіх адбываўся падзел храмаў і маёмасці паміж праваслаўнымі і уніятамі (толькі ў Полацку і Віцебску забаранялася дзейнасць праваслаўных храмаў). Аднак канфлікт паміж праваслаўнымі і ўніятамі працягваўся; у 1630-1640-я гг. яго галоўнай формай сталі маёмасныя спрэчкі ў судах. Гэты канфлікт адыгрываў значную ролю падчас казацкай вайны 1648-1653 гг. і вайны з Маскоўскай дзяржавай 1654-1667 гг.

*Уніяцкая царква* ў Рэчы Паспалітай захавала ранейшую структуру праваслаўнай царквы. У выніку уніі зменшыўся ўплыў свецкіх асоб. На ўзор каталіцкіх быў створаны уніяцкі манаскі *ордэн базыльян*, які адыгрываў вядучую ролю ў прапагандзе уніяцтва, а таксама ў развіцці уніяцкай адукацыі і літаратуры. Тым не менш да другой паловы 17 ст. уніяцтва мела значна меншую колькасць вернікаў у параўнанні з праваслаўем. У 1647 г. у Рэчы

Паспалітай налічвалася каля 4 тыс. уніяцкіх абшчын, у той час як праваслаўных – каля 13,5 тыс.

Аднак дыскрымінацыя і змяншэнне аўтарытэту праваслаўнай царквы пасля "вялікага патопу", актыўная падтрымка з боку дзяржавы прывялі да імклівага пашырэння уніяцтва ў канцы 17 – 18 стст. У канцы 18 ст. у ВКЛ уніятамі былі звыш 2/3 насельніцтва (у тым ліку сярод сялянства – каля 80%). У той жа час у гэты перыяд назіралася паступовае набліжэнне культу уніяцкай царквы да рымска-каталіцкай. Дадзеная тэндэнцыя знайшла была афіцыйна замацавана рашэннямі *Замойскага сабору 1720 г.*

Уплыў *праваслаўнай царквы* ў канцы 17 – 18 стст. істотна зменшыўся. У канцы 18 ст. праваслаўныя складалі каля 6,5% насельніцтва ВКЛ. З 1686 г. праваслаўная царква Рэчы Паспалітай перайшла ў падпарадкаванне Маскоўскага патрыярхату. Выкарыстоўваючы гэта, Маскоўская (Расійская) дзяржава часта ўмешвалася ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай на падставе абароны правоў праваслаўнай меншасці.

У выніку Контррэфармацыі пераважная большасць пратэстанцкай і праваслаўнай шляхты ВКЛ да канца 17 ст. пераходзіць у каталіцызм. У шляхецкай свядомасці з гэтага часу замацоўваецца ўсведамленне тоеснасці паміж шляхецтвам і каталіцызмам. Шырокая падтрымка контррэфармацыйнага руху з сярэдзіны 17 ст. не толькі з боку дзяржавы, але і большай часткі шляхты прыводзіць да абмежавання рэлігійнай талеранцыі ў Рэчы Паспалітай. Гэта адлюстроўвалі наступныя заканадаўчыя акты і з'явы:

- выгнанне ў 1658-1662 гг. з тэрыторыі Рэчы Паспалітай антытрынітарыяў;
- забарона пераходу з каталіцызму ў іншыя веравызнанні паводле соймавай канстытуцыі 1668 г.;
- забарона замацоўваць дзяржаўнай пячаткай дакументы, якія б прадугледжвалі карысць для асоб некаталіцкага веравызнання;
- забарона для некаталіцкай шляхты займаць дзяржаўныя пасады і выбірацца ў сойм паводле соймавых пастаноў 1717 і 1733 гг.

Пад уплывам Контррэфармацыі мела месца дыскрымінацыя правоў мяшчан праваслаўнага і пратэстанцкага веравызнання ў гарадах.

Аднак у той жа час юрыдычная правамоцнасць акту Варшаўскай канфедэрацыі захоўвалася да канца існавання Рэчы Паспалітай. Захоўваліся правы і прывілеі іншаэтнічных этнаканфесійных груп. Дадзеныя з'явы сведчылі аб ўздзеянні традыцыі талеранцыі ў ВКЛ.

*Такім чынам, у рэлігійным жыцці ВКЛ у 17 – 18 стст. найбольш істотнымі з'явамі сталі развіццё контррэфармацыйнага руху, стварэнне і паступовае пашырэнне ўплыву уніяцкай царквы, змяншэнне ўплыву праваслаўнай і пратэстанцкіх канфесій, прававое абмежаванне рэлігійнай талеранцыі.*

### 9.2. Этнічныя працэсы.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы ў ВКЛ у 17 – 18 стст. запаволілі складванне беларускай народнасці.

Моцным ударам па беларускай народнасці і культуры сталі войны 16 – 18 стст. Асабліва моцны ўдар быў нанесены гарадам. Гарадское насельніцтва ў 17 – першай палове 18 стст. значна скарацілася. Паколькі менавіта гарады з’яўляюцца цэнтрамі фарміравання народнай (нацыянальнай) самасвядомасці, то іх заняпад садзейнічаў запавольванню працэсаў нацыяўтварэння і захаванню сярэднявечных форм самасвядомасці (рэгіянальная, карпаратыўная, канфесійная).

У 17 – 18 стст. канчаткова завяршаецца працэс фарміравання карпаратыўнай саслоўнай супольнасці – *палітычнага шляхецкага народа Рэчы Паспалітай*. У аснове яе самасвядомасці знаходзіліся ідэалогія сарматызму і польская мова як сродак унутранай камунікацыі.

Пад *сарматызмам* разумеецца ідэалогія, якая абгрунтоўвае асаблівы статус шляхты як пануючага саслоўя ў грамадскай сістэме краіны. У падмурку знаходзіўся міф пра паходжанне шляхты Рэчы Паспалітай ад старажытных сарматаў – плямёнаў, якія жылі ў 1–4 стст. на тэрыторыі сучаснай Украіны. Дадзены міф падкрэсліваў, з аднаго боку, адасобленасць шляхты ад іншага насельніцтва, з другога – роўнасць і аднароднасць шляхецкага стану Рэчы Паспалітай. У межах сарматызму сцвярджаліся наступныя прынцыпы:

– адданасць каталіцызму (падкрэсліваліся заслугі шляхты Рэчы Паспалітай у барацьбе з “нявернымі” (туркамі, татарамі), “схізматыкамі” (маскавітамі), “ератыкамі” (шведамі);

– кансерватызм у эканамічных і грамадска-палітычных адносінах; сцвярджэнне нязменнасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і непарушнасці “шляхецкіх вольнасцяў”;

– патрыярхальнасць (сцвярджэнне ідэалу патрыярхальных адносін паміж шляхтай і сялянамі, а таксама ў шляхецкай сям’і).

Ідэалогія сарматызму праводзіла думку пра ідэальны лад Рэчы Паспалітай і ўзорнае палітычнае жыццё краіны; Рэч Паспалітая разглядалася як падмурак хрысціянства, апора каталіцызму ва Усходняй Еўропе.

Абвяшчэнне шляхтай сваёй адасобленасці ад астатняга насельніцтва і паступовае адмаўленне яе ад выкарыстання старабеларускай мовы на карысць польскай садзейнічалі дэзінтэграцыі беларускай народнасці.

Разрабаваныя падчас войнаў гарады і мястэчкі перастаюць засяляцца сялянамі, якія патрапілі ў прыгонную залежнасць, і засяляюцца яўрэйскім насельніцтвам. Такім чынам, беларуская культура кансервуецца толькі ў вёсцы, на ніжэйшай ступені сацыяльных структур.

За беларускай мовай і яе носьбітамі замацаваўся статус “простай” і “мужыцкай”. Паступова старабеларуская мова пачынае замяняцца польскай у дзяржаўным справаводстве. Згодна з пастановай *сойму 1696 г.* яна страціла статус дзяржаўнай у ВКЛ. Хаця, нельга казаць аб поўнай паланізацыі вышэйшых слаёў грамадства. Аб веданні беларускай мовы ў шэрагах шляхты ВКЛ нават у канцы 18 ст. сведчыць, напрыклад, абвешчаны ў 1785 г. тост караля Рэчы Паспалітай С. Панятоўскага на піры у А. Радзівіла Пане-каханку: “Пане, кажы віна даці, каб гора не знаці!”

*Такім чынам, этнічныя працэсы на землях ВКЛ у 17 – 18 стст. характарызаваліся паступовай дэзінтэграцыяй беларускай народнасці, кансервацыяй старых форм грамадскай самасвядомасці, канчатковым фарміраваннем палітычнага шляхецкага народу і яго культурнай паланізацыяй.*

**9.3. Адукацыя і навука.**

У выніку Контррэфармацыі на тэрыторыі ВКЛ ствараецца сетка каталіцкіх сярэдніх навучальных установаў – *калегіумаў*, найперш езуіцкіх. Калегіумы давалі класічную гуманітарную адукацыю. Навучанне было бясплатным, прымаліся юнакі любых саслоўяў і веравызнанняў. Усе дысцыпліны выкладаліся на лацінскай мове.

Цэнтрам езуіцкай адукацыі становіцца вышэйшая навучальная ўстанова – *Віленская акадэмія* (з 1579 г.). Яна стала буйнейшым культурным цэнтрам у краіне. Адукацыя ў межах акадэміі мела двухузроўневы характар. Тэрмін 4-гадовага навучання прадугледжваў сярэднюю адукацыю. Дадатковы 2-4-гадовы курс даваў вышэйшую адукацыю. У склад акадэміі першапачаткова ўваходзілі два факультэты: філасофскі і тэалагічны. На першым выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу: фізіка, метафізіка, матэматыка, логіка, рыторыка, паэтыка, геаграфія, старажытныя і сучасныя еўрапейскія мовы; на другім – тэалогія, кананічнае права, казуістыка. У 1644 г. пачаў дзейнічаць юрыдычны факультэт. У 1753 г. пры акадэміі была заснавана абсерваторыя. Выпускнікі акадэміі атрымлівалі тытул магістра.

У 17-18 стст. Віленская акадэмія з’яўлялася цэнтрам навуковага жыцця ў ВКЛ. Тут ажыццяўляліся даследаванні ў сферы матэматыкі, фізікі, астраноміі, сацыяльна-гуманітарных навук.

На ўзор езуіцкіх калегіумаў ствараюцца школы іншых каталіцкіх ордэнаў (дамініканцы, францысканцы, піяры) і уніяцкага ордэну базыльян. Да сярэдзіны 18 ст. каталіцкія адукацыйныя ўстановы дзейнічалі фактычна ва ўсіх буйных гарадах ВКЛ. У праваслаўных *брацкіх школах* з пачатку 17 ст. паступова пачынае ўводзіцца адукацыйная методыка, выпрацаваная езуітамі (выкладанне, аднак, ажыццяўляецца на царкоўнаславянскай мове). Цэнтрам праваслаўнай адукацыі ў Рэчы Паспалітай становіцца Кіева-Магілянская акадэмія, створаная ў 1632 г.; навучальны працэс у яе межах быў арганізаваны на ўзор Віленскай акадэміі.

У 1740-1760-я гг. ажыццяўляецца *рэформа піярскіх калегіумаў*. У межах навучальнага працэсу пашыраюцца курсы матэматыкі, прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, замежных моў. Замест лаціны выкладанне пераводзіцца на польскую мову. Піярскія школы дзейнічалі ў Вільні, Віцебску, Лужках, Лідзе, Глыбокім і інш. У піярскіх школах выкладанне вялося на польскай мове, а таксама вялікая ўвага ў іх надавалася прыродазнаўчым навукам.

У 1773 г. паводле рашэння рымскага папы быў скасаваны ордэн езуітаў. У Рэчы Паспалітай уся маёмасць ордэна перадавалася створанай у тым жа годзе *Адукацыйнай Камісіі*, якая ўяўляла з сябе агульнадзяржаўнае ведамства

па справах адукацыі. Былыя езуіцкія калегіумы пераўтвараліся ў падначаленыя дзяржаве свецкія *акруговыя і падакруговыя школы*. У ВКЛ была створана спецыяльная навучальная акруга, кіраўніцтва якой ажыццяўляла *Галоўная школа ВКЛ* (былая Віленская езуіцкая акадэмія). У межах акругі намаганнямі Адукацыйнай камісіі на базе былых езуіцкіх калегіумаў былі заснаваны 5 акруговых і 25 падакруговых школ. Створаныя школы знаходзіліся на дзяржаўным утрыманні. Навучальныя праграмы набылі свецкі характар, у іх структуры павялічвалася роля прыродазнаўчых і сацыяльных навук.

Віленская акадэмія ў 1781 г. атрымала назву Галоўная школа ВКЛ; навучанне ў ёй таксама атрымлівае свецкі характар. Школа падзялялася на маральны і фізічны факультэты. На першым выкладаліся старажытныя мовы, гісторыя, тэалогія, рыторыка і г.д.; на другім – матэматыка, астраномія, механіка, фізіка, хімія, медыцына. У Гародні ў 1775 г. па ініцыятыве французкага навукоўца Ж. Жалібера былі створаны медыцынская школа і гарадскія аптэкі, а брытанец Г.Форстэр адкрывае тут батанічны сад. У 1781 г. батанічны сад і медыцынская школа былі пераведзены ў Галоўную школу ВКЛ.

На развіццё навукі ў другой палове 18 ст. значны ўплыў мелі ідэі Асветніцтва. *Асветніцтва* – агульнаеўрапейскі сацыяльны і культурны рух 18 ст., накіраваны на перабудову ўсіх сфер грамадскага жыцця на аснове прынцыпаў розуму. Характэрнай рысай асветніцкай ідэалогіі з’яўлялася вера ў тое, што шляхам распаўсюджання ведаў можна дасягнуць усеагульнага дабрабыту і грамадскай справядлівасці.

Найбольш значнымі накірункамі развіцця *навукі* ў ВКЛ у 17 – 18 стст. з’яўляліся:

- логіка і матэматыка (М. Сміглецкі, К. Нарбут і інш.);
- фізіка і астраномія (А. Каяловіч, М. Пачобут-Адляніцкі і інш.);
- гісторыя (А. Нарушэвіч, Ю. Нямцэвіч і інш.);
- сацыяльна-гуманітарныя навукі (А. Алізароўскі, І. Храптовіч, Г. Страйноўскі).

На пачатку 18 ст. у Амстэрдаме *Іван Капіевіч* выдаў 20 кніг па арыфметыцы, гісторыі, марской справе і інш. Там жа *Казімір Семяновіч* выдаў падручнік па балістыцы, феерверках і ракетабудаванні (першае апісанне шматступенчатых ракет) “Вялікае мастацтва артылерыі”, які быў лепшым у Еўропе на працягу двух стагоддзяў.

*Такім чынам, у 17 – 18 стст. на тэрыторыі ВКЛ ствараецца сетка адукацыйных устаноў, якая ўключае ў сябе ўстанову вышэйшай адукацыі. На базе Віленскай акадэміі адбываецца правядзенне навуковых даследаванняў. З апошняй чвэрці 18 ст. у ВКЛ арганізуецца свецкая сістэма адукацыі. Разам з тым адукацыя і навука ў ВКЛ у гэты перыяд мелі элітарны характар; абсалютная большасць насельніцтва заставалася немісьменнай.*

**9.4. Культура.**

У культурным жыцці 17 – першай палове 18 стст. у ВКЛ назіраўся ўплыў Контррэфармацыі. У другой палове 18 ст. вядучым фактарам развіцця культуры становяцца ідэі Асветніцтва.

*Літаратура*

У 17 ст. ва ўмовах Контррэфармацыі і рэлігійнай барацьбы дасягае росквіту *рэлігійная палемічная літаратура*. Найбольш вядомымі яе прадстаўнікамі з'яўляюцца *Мацей Бембус, Іпацій Пацей, Язэп Руцкі* (з боку рыма-католікаў і уніятаў), *Мялецій Сматрыцкі, Афанасій Філіповіч, Сільвестр Косаў* (з боку праваслаўных). Жорсткім рэпрэсіям падвяргалася літаратура, у якой змяшчалася вальнадумства ў сферы рэлігіі. За антырэлігійныя выпады, выкладзеныя ў "Трактаце аб не існаванні Бога", у Варшаве у 1689 г. быў спалены *Казімір Лышчынскі*.

Працягвае развівацца *грамадска-палітычная літаратура*, якая ў гэты час, аднак пераважна выступае ў выглядзе рэлігійнай палемікі або палітычнай сатыры ("Ліст да Абуховіча", 1654). У другой палове 18 ст. распаўсюджваецца ананімная літаратура, у якой змяшчаліся праекты рэфармавання розных бакоў грамадскага ладу ВКЛ, у тым ліку адмены прыгоннага права ("Аб польскіх прыгонных", 1788 і г.д.).

У 17 – 18 стст. далейшае развіццё атрымліваюць мемуарная літаратура, асабістая карэспандэнцыя, лакальныя хронікі ("Баркулабаўская хроніка", "Хроніка горада Магілёва").

У 17 ст. вядучым стылем літаратуры ў ВКЛ становіцца *барока*. Да стылю барока належаць паэтычныя творы *Сімяона Полацкага* (зборнікі "Сад шматколерны"(1678), "Рыфмалагіён"(1680).

*Тэатр*

Адным з першых відаў тэатру ў ВКЛ стала *батлейка* – народны лялечны тэатр, вядомы яшчэ з 16 ст. У 17 ст. з развіццём школьнай адукацыі і драматургіі асобую ролю набывае *школьны тэатр*. У ім ставіліся п'есы рэлігійнага і гістарычнага зместу, а таксама *інтэрмедыі* – кароценькія п'ескі на беларускай ці польскай мове. Першыя *прыватныя прыгонныя тэатры* былі адкрытыя: Радзівіламі ў 1740-я г. у Нясвіжы і Слуцку, у Слоніме і Гародні – Агінскімі, Шклове – графам Зорычам.

Асноўнымі формамі тэатральных пастановак былі п'есы і ідыліі, якія знаходзіліся пад уплывам маралізму, характэрнага для эпохі Асветніцтва. Сюжэт гэтых твораў быў просты: ён распавядаў аб лёсе сялян ці шляхты, якія парушылі нейкія правілы і былі за гэта пакараныя. Найбольш вядомым аўтарам 18 ст. з'яўляецца *Францішка Уршуля Радзівіл*, якая напісала 16 п'ес і оперных лібрэта ("Гульня фартуны","Ідылія" і інш.). Мовай твораў была польская і французкая, але для таго, каб паказаць шчырага і дасціпнага селяніна, выкарыстоўваліся беларуская мова і фальклор. У 1787 г. у школьным Забельскім тэатры на Полаччыне была пастаўлена першая беларускамоўная п'еса – "Камедыя", аўтарам якой быў мясцовы настаўнік *К. Марашэўскі*.

*Архітэктура* ВКЛ у разглядаемы перыяд шырока выкарыстоўвала стыль *барока*. Яно было пашырана ў двух накірунках:

1) двухвежавая пабудова храмаў (Полацкая Сафія, Беразвецкі кляштар (архітэктар – Я.К. Глаўбіц), ратуша ў Віцебску) з павышанай пластычнасцю фасадаў і вежаў, якая атрымала назву *віленскага барока;*

2) *ракако*, што ўяўляла з сябе больш багатую на аздабленне мадыфікацыю барока (Гарадзенскі і Нясвіжскі фарны касцёл).

Для абарончых мэтаў пачынаюць выкарыстоўвацца бастыённыя сістэмы (Ляхавічы, Быхаў). Замкі перабудоўваюцца ў палацы, побач з якімі разбіваюцца паркі у французкім, італьянскім і англійскім стылях. На грошы магнатаў будуюцца мястэчкі з рэгулярнай планіроўкай: Радзівіламі разбудоўваецца Нясвіж, Агінскімі – Слонім, Сапегамі – Ружаны, Храптовічамі – Шчорсы і Бешанковічы, С. Панятоўскім – Гародня і Воўчын, А. Тызенгаўзам – Паставы і г.д.

Пад уплывам еўрапейскай моды барока паступова перараджаўся ў *класіцызм*, для якога характэрныя спробы аднавіць антычныя архітэктурныя ўзоры (каланады, портыкі, ордэры) на новым узроўні развіцця тэхналогій. Найбольш яркім прыкладам такой архітэктуры з'яўляецца палац Сапегаў у Ружанах.

*Выяўленчае мастацтва*.

У 17 ст. у выяўленчым мастацтве з'яўляецца такі накірунак як свецкі партрэт. Пачаткам яго лічыцца *сармацкі партрэт*. Прадстаўнікоў магнацкіх фамілій малявалі з максімальна магчымай адпаведнасцю да арыгінала, змяшчалі побач з імі прыкметы іх статусу (гетманам – булаву, пісцам – пяро, канцлерам – пячатку і гд.) і легенду, на якой быў герб і пералічваліся пасады, якія займаў гэты чалавек. На лаканічным шэрым ці чорным фоне мужчыны звычайна маляваліся ў парадным узбраенні, а жанчыны ў святочнай вопратцы, прычым аўтары ўжо спрабавалі паказаць іх прыгажосць і пачуцці (напрыклад партрэты Барбары Радзівіл і Соф'і Алелькі-Радзівіл). На сродкі магнатэрыі ствараюцца родавыя партрэтныя галерэі (Радзівілы, Сапегі, Хадкевічы) і прыватныя зборы мастацтва (Нясвіж, Вільня).

У 18 ст. асноўным накірункам выяўленчага мастацтва становіцца *ман'ерызм*, для якога характэрныя псіхалагічнасць і пышнасць малюнка. Сармацкі партрэт пераўтвараецца ў парадны (для рэпрэзентатыўных функцый ў родавых галерэях) і трумны (выстаўляўся падчас пахавання шляхціца і ўяўляў з сябе дакладнае адлюстраванне яго аблічча на цёмным фоне). У канцы 18 ст. адбываецца пераход да класіцызму, для якога характэрныя антычныя сюжэты і вопраткі нават для паказу сучасных падзеяў і герояў (Ф. Смуглевіч, Я. Рустэм).

*Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*

Пышная барочная і класічная архітэктура багата аздаблялася высокамастацкай ляпнінай, аб'емнай разьбой і рэалістычный скульптурай, а таксама фрэскамі (Нясвіжскі палац). Працягваюць развівацца мясцовыя школы іканапісу ў Полацку, Менску і Гародні. З-за вымушанай міграцыі беларускіх майстроў і разрабавання гарадоў падчас "патопу" помнікі нашай культуры раскіданыя па музеях свету. Магілёўскія дойліды сталі аднымі з пачынальнікаў украінскага барока. Аб'ёмная разьба з пазалотай, багатай

раслiннымi i жывёльнымi матывамi (т.зв. “беларуская рэзь”) упрыгожвае храмы ў Маскве.

У 18 ст. узнiкае свецкае *музычнае мастацтва*. Пры тэатрах iснавалi аркестры i капэлы. М. Радзiвiл стварыў оперу “Агатка”, якая з поспехам некалькi дзесяцiгоддзяў ставiлася на сцэнах Еўропы. Р. Агiнскi стаў аўтарам артыкула аб арфе ў першым выданнi французкай энцыклапедыi, а яго сын М.К. Агiнскi – паланэзу “Развiтанне з Радзiмай”.

*Такiм чынам, развiццё мастацкай культуры ВКЛ у 17 – 18 стст. адбывалася пад моцным уплывам стыляў барока i класiцызму, а з канца 18 ст. таксама iдэй Асветнiцтва.*

**Тэмы дакладаў i рэфератаў**:

1. Праваслаўна-унiяцкi рэлiгiйны канфлiкт у Вiльнi 1606 – 1610 гг.
2. Дзейнасць ордэна базыльян у ВКЛ.
3. Пратэстанцкiя абшчыны ў ВКЛ у 17 – 18 стст.
4. Сарматызм у грамадска-палiтычнай думцы i мастацкай лiтаратуры ВКЛ 16 – 18 стст.
5. Полацкi езуiцкi калегiум: гiсторыя ўзнiкнення i развiцця.
6. Пiярскiя калегiумы ў ВКЛ у 18 ст.
7. Станаўленне прыродазнаўчых навук у межах Вiленскай акадэмii 17 – 18 стст.

## Модуль 3. Беларусь у складзе Расiйскай iмперыi.

### Тэма 10: Грамадска-палiтычнае жыццё i эвалюцыя палiтыкi царызму на землях Беларусi ў канцы 18 - першай палове 19 стст.

**1. Палiтыка царызму на тэрыторыi Беларусi ў канцы 18 – пачатку 19 стст.**

**2. Грамадска-палiтычная сiтуацыя на тэрыторыi Беларусi напярэдаднi i падчас вайны 1812 г.**

**3. Грамадска-палiтычны рух на беларускiх землях у другой палове 1810-1820-я гг.**

**4. Паўстанне 1830-1831 гг. i Беларусь.**

**5. Палiтыка царызму ў Беларусi ў 1830-1850-я гг.**

**6. Грамадска-палiтычны рух на землях Беларусi ў 1830-1850-я гг.**

#### 10.1. Палiтыка царызму на тэрыторыi Беларусi ў канцы 18 – пачатку 19 стст.

*Устанаўленне адмiнiстрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу i стварэнне органаў дзяржаўнага кiравання.*

Пасля iнкарпарацыi ў склад Расiйскай iмперыi на тэрыторыi Беларусi была ўстаноўлена расiйская сiстэма адмiнiстрацыйна-тэрытарыяльнага

падзелу. Уся тэрыторыя падзялялася *на генерал-губернатарствы*, *губерні* і *паветы*. З 1801 г. яна набыла наступны выгляд:

<table>
<tr><td colspan="7">генерал-губернатарствы</td></tr>
<tr><td colspan="3">Літоўскае</td><td colspan="4">Беларускае</td></tr>
<tr><td colspan="3">Губерні</td><td></td><td colspan="3">губерні</td></tr>
<tr><td>Віленская</td><td>Гродзенская</td><td>Мінская</td><td></td><td>Віцебская</td><td>Магілёўская</td><td>Смаленская</td></tr>
<tr><td colspan="7">Паветы</td></tr>
</table>

Выканаўчая ўлада ў губернях належала *генерал-губернатарам* і *губернатарам*, якія прызначаліся непасрэдна імператарам. На чале павятовай адміністрацыі знаходзіўся *павятовы начальнік*, якога прызначаў міністр унутраных спраў. У губернскіх гарадах ствараліся органы расійскага адміністрацыйнага кіравання: губернскія ўправы, казённыя палаты, прыказы і г.д. Уся сістэма дзяржаўнай улады была сфарміравана паводле вертыкальнага прынцыпу. Кіруючыя пасады займалі чыноўнікі, прысланыя з расійскіх губерняў. Аднак пры гэтым другарадныя пасады ў губернскай і павятовай адміністрацыі займалі пераважна прадстаўнікі мясцовай шляхты.

Характэрнай рысай прававой сістэмы з'яўлялася захаванне дзейнасці тых палажэнняў Статута ВКЛ 1588 г., якія не супярэчылі расійскаму заканадаўству. У сістэме судовых органаў улады паводле расійскага ўзору былі створаны ў губернях *палаты грамадзянскага і крымінальнага судоў*, *верхнія земскія суды*; у паветах – *павятовыя і ніжнія земскія суды*. Сярод чыноўнікаў судовага апарату ў канцы 18 – першай палове 19 стст. пераважалі прадстаўнікі мясцовай шляхты. У справаводстве часткова выкарыстоўвалася польская мова.

*Саслоўная палітыка царызму.*

Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў канцы 18 – пачатку 19 стст. мела спецыфічныя рысы ў дачыненні да асобных саслоўяў. Можна вылучыць палітыку ў адносінах да шляхты, гарадскога насельніцтва, сялянства і яўрэяў.

*Палітыка царызму ў адносінах да шляхты.*

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай шляхта атрымала правы расійскага дваранства і захоўвала свае зямельныя ўладанні пры ўмове прынясення прысягі на вернасць Расійскай імперыі. Пераважная большасць шляхты прысягнула новай уладзе. Частка шляхты адмовілася прыносіць вернападданніцкую прысягу і накіраваліся ў эміграцыю, а яе маёнткі былі канфіскаваны ў дзяржаўны зямельны фонд.

На тэрыторыю Беларусі была распаўсюджана дзейнасць "*Даравальнай граматы расійскаму дваранству*" 1785 г. Паводле яе, ствараліся органы дваранскага самакіравання – *губернскія і павятовыя дваранскія сходы* на чале з выбарнымі прадвадзіцелямі дваранства. Акрамя таго шляхта атрымлівала права выбіраць членаў губернскіх і павятовых земскіх судоў, вызвалялася ад

падаткаў. Разам з тым у параўнанні з часамі Рэчы Паспалітай шляхта страціла ўплыў на працэсы дзяржаўна-палітычнага кіравання: адменена дзейнасць сойму і соймікаў, забаронены правы на стварэнне канфедэрацыі, прыватных войскаў і ўмацаванняў.

У канцы 18 – пачатку 19 стст. царызм актыўна насаджаў буйное расійскае землеўладанне на тэрыторыі Беларусі шляхам падараванняў дзяржаўных зямель і зямель, канфіскаваных у шляхты, расійскім арыстакратам (Г. Пацёмкін, А. Сувораў і інш.). Аднак вялікія памеры падараванняў (па 5-25 тыс. сялян на аднаго ўладальніка) не садзейнічалі з’яўленню ў Беларусі вялікай колькасці расійскіх дваран. Большасць расійскіх землеўладальнікаў (таксама як і мясцовыя магнаты) аддавалі сваю зямельную ўласнасць у арэнду.

Асаблівасцю тэрыторый былой Рэчы Паспалітай з’ўлялася наяўнасць вялікай праслойкі дробнай беззямельнай і малазямельнай шляхты, якая ў выніку ліквідацыі шляхецкіх вольнасцяў варожа ставілася да расійскіх уладаў. У дачыненні да яе царызм праводзіў палітыку “*разбору шляхты*”. Сутнасць яе палягала ў захаванні правоў шляхецтва толькі за тымі асобамі, якія здолелі дакументальна засведчыць сваё шляхецкае паходжанне. Адсутнасць падобных сведчанняў прыводзіла да пераводу іх ў стан дзяржаўных сялян ці мяшчан.

*Палітыка царызму ў адносінах да гарадскога насельніцтва.*

Пасля ажыццяўлення падзелаў Рэчы Паспалітай ў беларускіх гарадах былі ліквідаваны магдэбургскае права, а таксама шляхецкія юрыдыкі. Прыватныя гарады і мястэчкі, якія сталі адміністрацыйнымі цэнтрамі, былі выкуплены дзяржавай. Для кіравання гарадскім жыццём ствараўся выбарны прадстаўнічы орган улады – *гарадская дума* на чале з гарадскім галавой. Але дума ў сваёй дзейнасці была цалкам падпарадкавана царскай адміністрацыі.

Гарадское насельніцтва належала пераважна да саслоўяў *купцоў* і *мяшчан*. Прадстаўнікі дадзеных саслоўяў мелі розныя правы, а таксама выконвалі розныя павіннасці на карысць дзяржавы. Галоўнай павіннасцю купцоў была выплата падаткаў з капіталу. Мяшчане плацілі *падушны падатак* (падаткаабкладанне ажыццяўлялася з кожнай асобы мужчынскага полу). Акрамя таго на мяшчан была ўскладзена *рэкруцкая павіннасць* (абавязак пастаўляць пэўную колькасць асоб для вайсковай службы, якая ў той час працягвалася 25 год).

*Палітыка царызму ў адносінах сялянства.*

Становішча сялянства ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у асноўным засталося без змен. Захавалася і нават узмацнілася феадальная эксплуатацыя сялян, што выяўлялася ў павелічэнні павіннасцяў, асабліва паншчыны, здачы прыгонных сялян у наём падрадчыкам на будаўнічыя работы, практыцы продажу сялян без зямлі. У выніку падараванняў расійскім арыстакратам дзяржаўных і канфіскаваных зямель павялічылася колькасць прыватнаўласніцкіх сялян. На сялян Беларусі была распаўсюджана расійская сістэма дзяржаўных павіннасцяў, сярод якіх галоўнае месца займалі падушны падатак, земскі збор і рэкруцкая павіннасць. Да 1811 г. сяляне з тэрыторый

былой Рэчы Паспалітай плацілі падатак серабром, у той час як у расійскіх губернях – асігнацыямі, рыначны курс якіх у адносінах да сярэбраных грошай быў у некалькі разоў меншы.

*Палітыка царызму ў адносінах да яўрэяў.*

Паводле ўказа ад 23 чэрвеня 1794 г. устанаўлівалася асобная *мяжа яўрэйскай аселасці* на тэрыторыі беларускіх, літоўскіх, латышскіх і часткова ўкраінскіх губерняў. Яўрэям дазвалялася сяліцца ў гарадах і мястэчках толькі гэтых губерняў, займацца рамяством і гандлем. Земляробствам займацца ім не дазвалялася. Яўрэі маглі запісвацца ў мяшчанскія і купецкія саслоўі з умовай выплаты дзяржаўных падаткаў у падвойным памеры ў параўнанні з хрысціянскім насельніцтвам. У канцы 18 – пачатку 19 стст. адбываўся працэс прымусовага перасялення яўрэяў, якія жылі ў вёсках, у гарады і мястэчкі.

Да 1844 г. яўрэйскае насельніцтва падпарадкоўвалася паводле эканамічных, грамадзянскіх і адміністрацыйных пытанняў непасрэдна кіраўніцтву сваёй абшчыны – кагала. Кагал выступаў як прадстаўнічая арганізацыя яўрэяў перад дзяржаўнымі органамі ўлады, адказвала за выкананне павіннасцяў і выплату падаткаў.

*Канфесійная палітыка царызму.*

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі пануючай канфесіяй становіцца праваслаўе. Дзяржава аказвала актыўную матэрыяльную і маральную падтрымку праваслаўнай царкве. У пачатку 19 ст. на тэрыторыі Беларусі існавала 5 праваслаўных епархій: Гродзенская, Літоўская, Магілёўская, Мінская, Полацкая.

Палітыка царызму ў дачыненні рымска-каталіцкай царквы мела супярэчлівы характар. З аднаго боку, імкнучыся знайсці сацыяльную базу ўлады ў асяроддзі мясцовай шляхты, дэкларавалася свабода веравызнання для католікаў. Захоўвалася ў недатыкальнасці ўласнасць каталіцкіх касцёлаў і кляштараў. Ва ўсходняй Беларусі, далучанай да Расійскай імперыі ў 1772 г., працягвалася дзейнасць ордэна езуітаў (нягледзячы на афіцыйнае скасаванне ордэна паводле булы папы рымскага Клімента XIV 1773 г.). Езуіты захавалі ўсю сваю маёмасць, а таксама атрымалі прывілей на вызваленне ад падаткаў. З другога боку, царызм імкнуўся абмежаваць ўплыў Ватыкана на каталіцкую царкву ў межах Расійскай імперыі і падпарадкаваць яе самадзяржаўю. У 1774 г. згодна з імператарскай даравальнай граматай было заснавана *Беларускае каталіцкае біскупства* з цэнтрам у Магілёве. Беларускі, як і іншыя каталіцкія біскупы ў Расійскай імперыі, фактычна знаходзіліся ў залежнасці ад царскай адміністрацыі.

Іншую палітыку праводзілі расійскія ўлады ў дачыненні да уніяцкай царквы. Падчас царавання Кацярыны II быў прыняты план аб паступовым далучэнні уніятаў да праваслаўнай царквы. У канцы 18 – пачатку 19 стст. перыяды масавага прымусовага пераводу уніятаў у праваслаўе змяняліся перыядамі, калі навернутым дазвалялася вяртанне ва уніяцтва.

Сярод рэлігійных меншасцяў у Беларусі ў гэты час дзейнічалі таксама хрысціянскія (лютэране, кальвіністы, стараверы) і нехрысціянскія канфесіі (іудзеі, мусульмане).

**10.2. Грамадска-палітычная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі напярэдадні і падчас вайны 1812 г.**

У канцы 18 – пачатку 19 стст. у Еўропе існавала складаная міжнародная сітуацыя, якая адзначалася бесперапыннымі войнамі. Падчас іх адбывалася супрацьстаянне паслярэвалюцыйнай Францыі і блока манархічных дзяржаў Еўропы на чале з Англіяй і Расіяй. У выніку шэрагу войнаў пад кантролем Францыі апынулася значная частка кантынентальнай Еўропы. У 1806 г. пасля разгрому Прусіі на польскіх тэрыторыях, якія трапілі пад уладу Прусіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, было створана *Варшаўскае герцагства* – польская дзяржава, якая знаходзілася ў фактычнай залежнасці ад Францыі (у 1809 г. да яго была далучана частка польскіх зямель, якія дагэтуль знаходзіліся пад уладай Аўстрыі).

У 1807 г. паміж Расіяй і Францыяй быў заключаны мір. Паводле яго, Расія прызнала Варшаўскае герцагства. Беластоцкая акруга, якая раней належала Прусіі, была далучана да Расіі. Аднак мір не прывёў да злагоджвання эканамічных і палітычных супярэчнасцяў паміж Францыяй і Расіяй; бакі рыхтаваліся да новай вайны за панаванне на кантыненце.

Сярод палітычнай эліты былога ВКЛ у гэты час з'яўляюцца планы аднаўлення Рэчы Паспалітай з дапамогай аднаго з бакоў у будучай вайне. У асяроддзі шляхты выявіліся прыхільнікі прарасійскай і прафранцузкай арыентацыі. Да прыхільнікаў *прарасійскай арыентацыі* належала група буйных магнатаў (А. Чартарыйскі, М.К. Агінскі і інш.). На пачатку 1812 г. у яе асяроддзі быў распрацаваны праект адраджэння Вялікага княства Літоўскага пад пратэктаратам Расійскай імперыі. Да прыхільнікаў *прафранцузкай арыентацыі* належалі частка магнатаў (Д. Радзівіл і інш.), а таксама шматлікія прадстаўнікі сярэдняй і дробнай шляхты. У іх асяроддзі Варшаўскае герцагства разглядалася як першы этап да аднаўлення Рэчы Паспалітай. На працягу 1807-1812 гг. многія прадстаўнікі шляхты былога ВКЛ эмігравалі ў герцагства.

З 1810 г. расійскі ўрад пачаў падрыхтоўку да вайны. Адбываліся рэарганізацыя арміі, будаўніцтва ўмацаванняў, паляпшэнне дарог. На тэрыторыі Беларусі былі сканцэнтраваны 1-я і 2-я Заходнія арміі пад кіраўніцтвам М. Барклая дэ Толі (Вільня) і П. Баграціёна (Ваўкавыск). Сацыяльна-эканамічныя і ваенныя мерапрыемствы царызму ў Беларусі напярэдадні вайны былі цалкам накіраваны на максімальнае выкарыстанне яе людскіх і матэрыяльных рэсурсаў. Мела месца павелічэнне павіннасцяў для насельніцтва, што адлюстроўвалася ў буйных пастаўках правіянту, фуражу, падвод для арміі, працах на будаўніцтве абарончых збудаванняў, павелічэнні рэкруцкіх набораў.

Вайна паміж Францыяй і Расіяй пачалася *12(24) чэрвеня 1812 г.* з уступлення на тэрыторыю Расійскай імперыі французкага войска на чале з імператарам *Напалеонам I Банапартам*. План французкага камандавання заключаўся у разгроме расійскага войска ў вялікай бітве на тэрыторыі былога ВКЛ. У аснову плана баявых дзеянняў расійскага камандавання была

пакладзена ідэя адыходу ў глыбіню краіны з мэтай адарвання праціўніка ад яго аперацыйнай базы. Таму 1-я і 2-я арміі павінны былі адыходзіць для таго, каб пазбегнуць разгрому паасобку, а потым злучыцца.

Першапачаткова наступленне французкай арміі было хуткім. Адбываліся асобныя ар'ергардыя баі (Мір, 27-28 чэрвеня; Салтанаўка, 11-12 ліпеня; Клясціцы, 18 ліпеня і г.д.). Ужо 16 чэрвеня французкім войскам была занята Вільня. Да пачатку жніўня 1812 г. большая частка тэрыторыі Беларусі, за выключэннем паўднёвай яе часткі і Бабруйскай крэпасці, знаходзілася пад кантролем французкага войска. З 16 ліпеня да 1 жніўня 1812 г. Напалеон знаходзіўся ў Віцебску, адкуль спрабаваў арганізаваць перамовы з расійскім царом Аляксандрам І. Няўдача плану перамоваў прымусіла Напалеона распачать паход на Маскву. 22 ліпеня адбылося злучэнне 1-й і 2-й расійскіх армій пад Смаленскам, агульнае камандаванне якімі было даручана фельдмаршалу М. Кутузаву. 26 жніўня адбылася буйнешая падчас вайны 1812 г. бітва каля в. Барадзіно. Нягледзячы на велізарныя ахвяры з абодвух бакоў, зыход бітвы быў няпэўным. Неўзабаве расійскае войска пакінула Маскву і ў яе ўступіла французская армія.

Адносіны насельніцтва Беларусі да варагуючых бакоў не былі адназначныя. Большасць шляхты падтрымала французкае войска, разлічваючы з дапамогай Францыі аднавіць Вялікае княства Літоўскае ў складзе адроджанай Рэчы Паспалітай. Сялянства першапачаткова разлічвала з дапамогай французаў дамагчыся адмены прыгоннага права (у Варшаўскім герцагстве прыгоннае права было адменена ў 1807 г.). Таму падчас адступлення расійскага войска нярэдка адбываліся выступленні сялян супраць памешчыкаў. Аднак з прыходам французкіх войскаў, камандаванне апошніх, лічачы за галоўнае забяспечыць падтрымку з боку шляхты, загадвала сялянам выконваць усе феадальныя павіннасці ў поўным аб'ёме. Адмова ад разгляду сялянскага пытання, а таксама шматлікія рэквізіцыі, марадзёрства французкіх салдат нараджалі незадаволенасць сярод сялянства, а таксама мяшчан; месцамі насельніцтва аказвала ўзброенае супраціўленне французкім войскам і стварала партызанскія атрады. Антыфранцузкія настроі спрабавала выкарыстаць расійская прапаганда: распаўсюджваліся чуткі пра адмену прыгоннага права царом у выпадку выгнання французаў.

На тэрыторыі заходняй часткі Беларусі і Літвы ў адпаведнасці з загадам Напалеона І ад 1 ліпеня 1812 г. былі арганізаваны новыя органы ўлады на чале з *Часовай урадавай камісіяй ВКЛ* у Вільні. У склад камісіі ўваходзілі камітэты харчавання, паліцыі, фінансаў, ваеннага, судовага, унутраных спраў, народнай асветы і рэлігіі. Была ўведзена новая адміністрацыйная сістэма на французкі ўзор. Тэрыторыя адноўленага ВКЛ падзялялася на 4 *дэпартаменты*, а тыя на *дыстрыкты* і *кантоны*. Галоўнымі напрамкамі ў дзейнасці Часовай урадавай камісіі былі арганізацыя матэрыяльных рэсурсаў краю на патрэбы французскай арміі і фарміраванне вайсковых адзінак у дапамогу напалеонаўскаму войску. Агульная колькасць апошніх налічвала каля 19 тыс. чалавек. Ва ўсходняй частцы Беларусі органы ўлады

падпарадкоўваліся не Часовай урадавай камісіі ВКЛ, а непасрэдна французкаму ваеннаму камандаванню.

На пачатку кастрычніка 1812 г. адбываецца пералом у ходзе вайны. Дрэннае матэрыяльнае забеспячэнне і, як вынік, маральнае разлажэнне войска, масавыя марадзёрства і дэзерцірства, дзеянні расійскіх ваенных атрадаў вымусілі войска Напалеона І адступіць з Масквы па спустошанай Смаленскай дарозе. У лістападзе 1812 г. пры пераправе праз р. Бярэзіну каля в. Студзёнка французкае войска было фактычна разгромлена, але імператар і яго гвардыя выратаваліся. У снежні 1812 г. уся тэрыторыя Расійскай імперыі кантралявалася царскім войскам.

У 1813-1814 гг. вайна паміж Расіяй і створанай ёй кааліцыяй, з аднаго боку, і Францыяй, з другога, адбывалася на тэрыторыі Еўропы і скончылася разгромам Францыі, звяржэннем Напалеона І і рэстаўрацыяй дарэвалюцыйнай манархіі Бурбонаў. У 1814-1815 гг. праходзіў міжнародны кангрэс у Вене, дзе вырашалася праблема паляваеннага ўладкавання Еўропы. Паводле яго рашэнняў, да Расійскай імперыі была далучана большая частка тэрыторыі былога Варшаўскага герцагства. На ёй было створана аўтаномнае *Каралеўства Польскае.* Аляксандр І абвясціў сябе каралём польскім і дараваў Польшчы Канстытуцыйную хартыю, якая абвяшчала недатыкальнасць асобы, незалежнасць суда, свабоду друку, права выбару дэпутатаў сойму, які павінен быў абмяжоўваць выканаўчую ўладу).

На тэрыторыі Беларусі вайна прынесла велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. У выніку ваенных дзеянняў, голаду і эпідэмій насельніцтва Беларусі скарацілася на 1/4, прычым насельніцтва гарадоў зменшылася ў 2-3 разы. Напалову скараціліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы. Цяжкія вынікі вайны для беларускага народа ўзмацняліся і палітыкай царызму. На беларускія губерні ў 1813-1814 гг. былі ўскладзены шматлікія павіннасці, накіраваныя на забеспячэнне расійскага войска падчас новай ваеннай кампаніі; праводзіліся новыя рэкруцкія наборы.

Супярэчлівую палітыку праводзіў царскі ўрад у адносінах да шляхты, што падтрымлівала французкае войска падчас вайны. З аднаго боку, была праведзена канфіскацыя маёмасці шэрагу актыўных прафранцузкіх дзеячоў, большасць з якіх эмігравала. З другога боку, на працягу 1812-1814 гг. царскі ўрад правёў амністыю для большасці тых, хто падтрымліваў французаў падчас вайны. Большасць канфіскаваных маёнткаў паступова вярталіся ранейшым уладальнікам. Такая палітыка была выклікана імкненнем царызму заручыцца падтрымкай шляхты ва ўмовах далучэння да Расіі часткі Польшчы. У пасляваенны час актрымалі шырокае распаўсюджанне ідэі аб далучэнні зямель былога ВКЛ да Каралеўства Польскага і нават аб аднаўленні Рэчы Паспалітай пад пратэктаратам Расіі. У той жа час без змен засталося становішча сялян і мяшчан. Спадзяванні на ліквідацыю прыгону пасля разгрому арміі Напалеона не спраўдзіліся. Царскім маніфестам ад 30 жніўня 1814 г. сялянам прапаноўвалася атрымаць “мзду свою от Бога”.

**10.3. Грамадска-палітычны рух на беларускіх землях у другой палове 1810-1820-я гг.**

Пасля вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі назіраецца ажыўленне грамадскага жыцця. Шырокую актыўнасць праяўляюць арганізацыі *масонаў* – дзеячоў рэлігійна-філасофскага руху, да якога далучаліся прадстаўнікі розных плыняў інтэлектуальнай эліты грамадства. У другой палове 1810-х гг. сярод масонаў Каралеўства Польскага і былога ВКЛ панавала ідэя адраджэння Рэчы Паспалітай пад уладай расійскага імператара. У 1819 г. у Каралеўстве Польскім фарміруецца арганізацыя “*Нацыянальнае масонства*”, адгалінаванне якой узнікае таксама ў Вільні.

З пачатку 1820-х гг. палітыка царызму набывае яскрава акрэслены рэакцыйны характар. Звужаецца аўтаномія Каралеўства Польскага, парушаюцца дэмакратычныя правы. У 1820 г. з тэрыторыі Расійскай імперыі былі выдаленыя езуіты, зачынены ўсе езуіцкія навучальныя ўстановы, у тым ліку Полацкая акадэмія. Падобная палітыка прывяла да краху спадзяванняў грамадскасці на аднаўленне Рэчы Паспалітай пад пратэктаратам Расіі. У межах масонскіх арганізацый узнікаюць радыкальныя плыні, варожа настроеныя да палітыкі царызму. Гэта прыводзіць да забароны дзейнасці масонаў на тэрыторыі Расійскай імперыі ў 1822 г.

Рэакцыйныя мерапрыемствы царызму выклікаюць фарміраванне апазіцыйнага руху на тэрыторыі Беларусі. Дадзены рух меў два накірункі:

- польскі нацыянальна-вызваленчы рух;
- рух расійскіх дваранскіх рэвалюцыянераў – дзекабрыстаў.

Абодва дадзеныя рухі аб’ядноўвала крытыка царызму, імкненне да пераўтварэння грамадства на ліберальных пачатках.

*Польскі нацыянальна-вызваленчы рух* на землях Беларусі знаходзіў сацыяльную базу сярод мясцовай апалячанай шляхты і інтэлігенцыі. Галоўным асяродкам яго распаўсюджання з’яўляліся навучальныя ўстановы, у першую чаргу Віленскі універсітэт. У яго межах ў 1817-1823 гг. дзейнічала тайнае студэнцкае таварыства *філаматаў* (найбольш вядомыя актывісты: А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот). Цесную сувязь з ім падтрымлівалі легальныя студэнцкія аб’яднанні *прамяністых* (1818-1820) і *філарэтаў* (1820-1823). Таварыствы прамяністых і філарэтаў, а таксама першапачаткова філаматаў афіцыйна мелі толькі культурна-асветніцкія задачы. Галоўнай мэтай сваёй дзейнасці актывісты студэнцкіх таварыстваў ставілі выхаванне моладзі ў духу польскай культуры. Паступова філаматы сталі выстаўляць палітычныя задачы. Галоўнай з іх абвяшчалася аднаўленне Рэчы Паспалітай як незалежнай польскай дзяржавы. У якасці ідэалу дзяржаўна-палітычнага ўладкавання сцвярджалася канстытуцыйнае кіраванне; прадугледжваліся ліквідацыя прыгонніцтва, верацярпімасць. Галоўнай рухаючай сілай грамадска-палітычных пераўтварэнняў, на думку філаматаў, павінна стаць шляхта (ідэя *шляхецкага рэвалюцыянарызму*). У 1819 – 1823 гг. тайныя таварыствы падобнага накірунку існавалі сярод вучняў сярэдніх навучальных устаноў у Мінску, Свіслачы, Полацку, Віцебску.

У 1823 – 1824 гг. дадзеныя арганізацыі былі выкрытыя паліцыяй, а яе удзельнікі падвергліся рэпрэсіям. Карныя санкцыі закранулі таксама частку прафесарска-выкладчыцкага складу Віленскага універсітэту. Быў узмоцнены паліцэйскі кантроль у навучальных установах.

У той жа час у на тэрыторыі былога ВКЛ ўзніклі арганізацыі тайнага польскага “*Патрыятычнага таварыства*”, якое сфарміравалася ў 1821 г. на базе забароненага ўладамі “Нацыянальнага масонства”. На чале гэтых арганізацый знаходзіўся Літоўскі савет, які ўзначальвалі М.Ромер, К.Радзівіл, К.Прозар. Галоўнай мэтай “Патрыятычнага таварыства” з’яўлялася аднаўленне Рэчы Паспалітай.

Рух *дзекабрыстаў* сфарміраваўся ў асяроддзі ліберальна настроенага расійскага дваранства. На тэрыторыі Беларусі ён распаўсюджваўся сярод афіцэрства дыслацыраваных тут частак расійскай арміі. Дзекабрысты выступалі за ліквідацыю самадзяржаўя і правядзенне ў грамадстве шырокіх рэформ (у першую чаргу, ліквідацыя прыгонніцтва). Рухаючай сілай пераўтварэнняў абвяшчалася прагрэсіўнае дваранства.

У 1823 г. быў распрацаваны “*Бабруйскі план паўстання*”, паводле якога прадугледжваўся арышт цара Аляксандра І падчас прыезду ў Бабруйскую крэпасць для агляду войска з далейшай рэалізацыяй паходу на Маскву пры адначасовым паўстанні ў Пецярбургу. Аднак з-за няўдалай падрыхтоўкі план не быў ажыццёўлены.

Пад уплывам дзекабрыстаў у 1825 г. сярод афіцэраў Літоўскага асобага корпуса на Гродзеншчыне было створана канспіратыўнае "*Таварыства ваенных сяброў*" на чале з К. Ігельстромам. Пры таварыстве дзейнічалі дзве тайныя арганізацыі: “Згода”, якая складалася з грамадзянскіх асоб (пераважна інтэлігенцыі) і “Заране”, у якую ўваходзілі вучні Беластоцкай і Свіслацкай гімназій.

14 снежня 1825 г., пасля смерці цара Аляксандра І і падчас ўступлення на трон Мікалая І (1825-1855) дзекабрысты паднялі няўдалае паўстанне ў Пецярбургу. У снежні 1825 і лютым 1826 гг. былі спробы ўзняць паўстанне сярод салдат Бабруйскай крэпасці. Усе выступленні дзекабрыстаў былі падаўлены царскімі ўладамі, іх удзельнікі падвергліся жорсткім рэпрэсіям.

У першай палове 1820-х гг. мелі месца спробы наладжвання сувязяў паміж польскім нацыянальна-вызваленчым і дзекабрысцкім рухам. Галоўнай праблемай устанаўлення саюзу з’яўляліся дзяржаўна-палітычныя адносіны будучых Польшчы і Расіі. Польскія дзеячы выступалі за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Большасць дзекабрыстаў дапускалі незалежнасць Польшчы, але пры захаванні пад уладай Расіі зямель былога ВКЛ і Украіны.

Разгром большасці апазіцыйных арганізацый на тэрыторыі Беларусі не спыніў, аднак, далейшага развіцця грамадска-палітычнага руху. Сярод дзеячоў польскага нацыянальна-вызваленчага руху выспявала ідэя неабходнасці ўзброенай барацьбы за адраджэнне Рэчы Паспалітай.

### 10.4. Паўстанне 1830-1831 гг. і Беларусь.

*28-29 лістапада 1830 г.* у Каралеўстве Польскім пачалося паўстанне, якое часткова ахапіла таксама землі Беларусі, Літвы і Ўкраіны. Асноўнымі прычынамі паўстання былі наступныя:

- абмежаванне царызмам аўтаноміі Каралеўства Польскага, пастаянныя парушэнні канстытуцыі 1815 г.;
- рэпрэсіўная палітыка царызму ў сферах грамадска-палітычнага і культурнага жыцця.

Непасрэдным штуршком да пачатку паўстання з'явілася вестка аб намеры цара Мікалая I паслаць польскае войска на падаўленне рэвалюцыі ў Францыі і Бельгіі ў 1830 г. Паўстанне пачалося ў польскіх вайсковых частках, размешчаных у Варшаве, да якіх далучылася значная частка насельніцтва Варшавы. Расійскія войскі пакінулі Варшаву, а ў пачатку снежня – і Каралеўства Польскае. 18 снежня 1830 г. польскі сойм абвясціў нацыянальнае паўстанне, а ў студзені 1831 г. афіцыйна пазбавіў польскага трону Мікалая I і дынастыю Раманавых. У якасці органа вышэйшай выканаўчай улады быў створаны Нацыянальны ўрад на чале з *Адамам Чартарыйскім.* Урад разлічваў дамагчыся незалежнасці Польшчы шляхам знаходжання падтрымкі з боку буйнейшых еўрапейскіх дзяржаў, у першую чаргу Англіі і Францыі.

Дадзеныя падзеі выклікалі вайну паміж Расіяй і паўстаўшай Польшчай, якая працягвалася з лютага да кастрычніка 1831 г. У яе межах умоўна можна вылучыць два этапы:

1) люты-май 1831 г. – захаванне адноснай раўнавагі паміж ваюючымі бакамі;

2) чэрвень-кастрычнік 1831 г. – наступленне расійскай арміі і разгром паўстання.

Сярод удзельнікаў паўстання вызначыліся дзве плыні:

| плынь | асноўныя прадстаўнікі | асноўныя ідэі |
|---|---|---|
| Кансерватыўная | Адам Чартарыйскі | Аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як нацыянальнай польскай дзяржавы ў форме канстытуцыйнай манархіі; захаванне прывілеяванага статусу шляхецкага саслоўя; вызначэнне ў якасці галоўнай рухаючай сілы паўстання шляхты |
| Радыкальная | Іахім Лелявель | Аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як нацыянальнай польскай дзяржавы ў форме рэспублікі; правядзенне сацыяльна-палітычных рэформ, накіраваных на пераўтварэнне Польшчы ў дэмакратычную дзяржаву; ліквідацыя прыгонніцтва; апора на шырокія сацыяльныя пласты насельніцтва ў правядзенні паўстання |

Пануючая роля ў кіраўніцтве паўстаннем належала кансерватарам. Праекты сацыяльных рэформ, прапанаваныя радыкаламі, не былі разгледжаныя.

Паўстанцкія ўлады Каралеўства Польскага да самага пачатку вялікую ўвагу надавалі перспектыве распаўсюджання паўстання на землі былога ВКЛ і Правабярэжнай Украіны. 25 студзеня 1831 г. Нацыянальны ўрад у Варшаве абвясціў зварот да жыхароў Беларусі, Літвы і Украіны з заклікам да паўстання. У студзені-лютым 1831 г. для падрыхтоўкі паўстання ствараецца падпольны *Віленскі цэнтральны камітэт*. Аднак ён не змог забяспечыць адначасовае выступленне паўстанцаў і каардынацыю іх дзеянняў у розных раёнах. Таму паўстанне пачыналася ізалявана па асобных паветах.

У канцы сакавіка – красавіку 1831 г. паўстанне ахапіла Літву і паўночна-заходнюю Беларусь (Ашмянскі, Браслаўскі, Свянцянскі і Дзісенскі паветы); у маі – Гродзенскую губерню, у чэрвені-ліпені – Рэчыцкі, Мазырскі і Пінскі паветы, а таксама Валынь. У маі 1831 г. на дапамогу паўстанцам на Віленшчыне і Гродзеншчыне быў накіраваны 12-тысячны польскі корпус Г. Гелгуда. 19 чэрвеня 1831 г. каля Вільні адбылася буйнейшая падчас паўстання бітва на тэрыторыі былога ВКЛ, у якой перамагло расійскае войска.

Падчас паўстання ў кожным павеце шляхта выбірала ўрад і вайсковага камандзіра. Урады ў паветах прыводзілі да прысягі мясцовае насельніцтва, праводзілі наборы ў паўстанцкія атрады, выдавалі адозвы з заклікамі далучыцца да барацьбы. Галоўнай рухаючай сілай паўстання з’яўлялася дробная і сярэдняя шляхта. Сялянства ў пераважнай большасці ставілася да паўстання індыферэнтна з-за адсутнасці сацыяльных кампанентаў у праграме паўстанцаў. Усяго ў паўстанні на тэрыторыі Беларусі прыняло ўдзел каля 30 тыс. чалавек.

Царскі ўрад у кантэксце барацьбы з паўстаннем са снежня 1830 г. увёў на тэрыторыі заходняй Беларусі і Літвы ваеннае становішча. Шляхціцы-паўстанцы прыцягваліся да суда, а іх маёнткі канфіскоўваліся. У той жа час з мэтай перацягуць на свой бок сялянства ў красавіку 1831 г. быў выдадзены загад, паводле якога сялянам дараваўся ўдзел у паўстанні, калі яны добраахвотна пакінуць паўстанцкія атрады.

У жніўні 1831 г. паўстанне было канчаткова падаўлена на тэрыторыі Беларусі і Літвы, а ў кастрычніку – на тэрыторыі Польшчы. Значная частка паўстанцаў накіравалася ў эміграцыю. Шмат удзельнікаў паўстання было рэпрэсіравана; у Сібір выселены тысячы шляхецкіх сем’яў. Маёмасць рэпрэсіраваных і эміграваўшых удзельнікаў паўстання падлягала канфіскацыі. Непасрэдным вынікам паўстання было скасаванне аўтаноміі Каралеўства Польскага. Былі ліквідаваны асобнае польскае войска і Літоўскі асобны корпус.

Да ліку *асноўных прычын паражэння паўстання* належаць:

- слабая матэрыяльна-тэхнічная і арганізацыйная падрыхтоўка паўстання;

- істотная перавага царызму ў матэрыяльных і людскіх рэсурсах ў параўнанні з польскай паўстанцкай уладай;

- адмаўленне паўстанцкіх уладаў вырашаць сялянскае пытанне, што абумовіла вузкасць сацыяльнай базы паўстання;

- неўмяшанне заходніх дзяржаў у ход узброенай барацьбы, на што спадзяваліся паўстанцы.

### 10.5. Палітыка царызму ў Беларусі ў 1830-1850-я гг.

Шырокі ўдзел шляхты з тэрыторый Беларусі і Літвы ў паўстанні 1830-1831 гг. абумовіў змены ў палітыцы царызму ў 1830-1850-я гг. У гэты перыяд адбываецца адыход ад палітыкі кампрамісу ў адносінах да мясцовай шляхты і рэалізуецца курс на паслядоўную *русіфікацыю* краю. У 1832 г. пры ўрадзе Расійскай імперыі быў створаны "*Асобны камітэт па справах заходніх губерняў*" з мэтай распрацоўкі і ажыццяўлення мерапрыемстваў па русіфікацыі краю ў розных сферах сацыяльнага жыцця.

Можна вылучыць асноўныя накірункі палітыкі царызму ў разглядаемы перыяд:

1) *Русіфікацыя заканадаўства*: У 1830–1831 г. была адменена дзейнасць Статута ВКЛ 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях, а ў 1840 г. на ўсёй тэрыторыі былога ВКЛ. Замест яго ўводзілася расійскае заканадаўства.

2) *Русіфікацыя адміністрацыйнай сістэмы*: На падставе царскіх указаў ад 30 кастрычніка 1831 г. і 11 студзеня 1832 г. усім дзяржаўным установам і пасадам на землях былога ВКЛ былі дадзены расійскія назвы. Паводле указаў ад 1832 г. дзейнасць усіх судовых устаноў пераведзена на рускую мову. У мясцовыя адміністрацыйныя і судовыя ўстановы сталі запрашацца чыноўнікі з уласна расійскіх губерняў, якіх заахвочвалі павышанымі акладамі і хуткім ростам кар'еры, магчымасцю на ільготных умовах набыць зямельныя ўладанні. Указам ад 18 чэрвеня 1840 г. цар Мікалай І забараніў выкарыстоўваць назвы "Беларусь" і "Літва". Замест іх уводзілася назва "*Северо-Западный край*".

3) *Русіфікацыя землеўладання*: Адбылася канфіскацыя зямельных уладанняў удзельнікаў паўстання, якія на ільготных умовах раздаваліся расійскім дваранам. Тым не менш у структуры памешчыцкага землеўладання колькасна пераважала мясцовае "польскае".

4) *Узмацненне палітыкі "разбору шляхты"*: Паводле царскіх указаў ад 1831, 1847 і 1857 гг. зрабіліся больш жорсткімі ўмовы пацвярджэння шляхецкага статусу – доказам гэтага маглі быць толькі арыгіналы прывілеяў і граматы вялікіх князёў або каралёў. Тыя, хто іх не меў, пазбаўляліся права валодання маёнткамі з прыгоннымі і пераводзіліся ў падатковыя саслоўі. Усё гэта прывяло да таго, што за некалькі дзесяцігоддзяў колькасць шляхты ў Беларусі скарацілася з 12-13% да 3% ад агульнай колькасці насельніцтва.

5) *Дыскрымінацыйная палітыка ў дачыненні рымска-каталіцкай і уніяцкай цэркваў*: Пасля падаўлення паўстання на тэрыторыі Беларусі былі ліквідаваны 191 з 304 каталіцкіх кляштараў. Большасць з іх была пераўтворана ў прыходскія касцёлы ці перададзена праваслаўнай царкве. Таксама зачыняліся або пераўтвараліся ў праваслаўныя цэрквы некаторыя каталіцкія касцёлы. У кастрычніку 1836 г. улады забаранілі службовым асобам касцёла ў Беларусі весці публічныя пропаведзі на польскай мове без папярэдняй цэнзуры. У 1836 г. быў выдадзены указ аб забароне духавенству

неправаслаўнага веравызнання набываць у прыгоннае ўладанне праваслаўных сялян, а ў 1841 г. адбылася канфіскацыя нерухомасці ў каталіцкага духавенства. У адносінах да уніяцкай царквы была ажыццёўлена яе поўная ліквідацыя. У лютым 1839 г. у Полацку пад кантролем дзяржаўных улад быў скліканы сабор іерархаў уніяцкай царквы, на якім прыняты акт аб далучэнні да праваслаўнай царквы. Усе уніяты, якія складалі на той час большасць насельніцтва Беларусі, прымусова пераводзіліся ў праваслаўе.

6) *Русіфікацыя адукацыі*: У 1832 г. улады зачынілі Віленскі ўніверсітэт як ачаг вальнадумства і распаўсюджвання польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Таксама былі зачынены ўсе навучальныя ўстановы, арганізаваныя каталіцкімі ордэнамі. Навучанне ў школах цалкам пераводзіцца на рускую мову. З 1836 г. забараняецца выкладанне польскай мовы ў школах як вучэбнага прадмета. Для працы ў сістэме адукацыі актыўна прыцягваюцца настаўнікі з расійскіх губерняў.

7) *Узмацненне ідэалагічнай працы сярод насельніцтва*: У 1830-я гг. канцэптуальна фарміруецца афіцыйная дзяржаўная ідэалогія Расійскай імперыі, сутнасць якой засяроджваецца ў формуле “Праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць”. Спецыфіка дадзенай ідэалогіі на тэрыторыі Беларусі праяўляецца ў фарміраванні канцэпцыі т.зв. *заходнерусізму*. Паводле яе карэннае насельніцтва Беларусі абвяшчаецца заходняй часткай адзінага рускага народу, а фундаментам дадзенага адзінства разглядаецца праваслаўе. Цэнтрамі прапаганды дзяржаўнай ідэалогіі становяцца праваслаўная царква, школа і афіцыйны друк, галоўную ролю сярод якіх мелі мясцовыя перыядычныя выданні “Губернские ведомости”, якія пачалі выдавацца з канца 1830-х гг. ва ўсіх губернскіх цэнтрах.

*У выніку ажыццёўленых мерапрыемстваў узмацніўся рэпрэсіўны характар дзяржаўнай улады, умацаваліся пазіцыі рускага дваранства і чыноўніцтва ў розных сферах грамадскага жыцця Беларусі. Але разам з тым польская шляхта здолела захаваць значны ўплыў у сістэме землеўладання, у пэўнай ступені таксама ў сістэме адміністрацыі і культуры. Дадзеная сітуацыя з’яўлялася глебай для ўзнікнення новых сацыяльна-палітычных канфліктаў.*

**Грамадска-палітычны рух на землях Беларусі ў 1830-1850-я гг.**

Падаўленне паўстання 1830-1831 гг. прывяло да заняпаду грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі Беларусі. Большасць дзеячоў польскага нацыянальна-вызваленчага руху эмігравала. Пераважная частка мясцовай шляхты перайшла на пазіцыі згодніцтва з царскім урадам. У грамадскім жыцці ўзмацняюцца ідэі *кансерватызму*. Цэнтрамі распаўсюджання кансерватыўных ідэй становяцца польскамоўныя перыядычныя выданні, якія выходзілі як у Вільні (“Рубон”), так і за межамі тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай (“Пецярбургскі штотыднёвік”).

Разам з тым у абмежаваных формах працягвалася дзейнасць польскага нацыянальна-вызваленчага руху. На працягу 1830-х гг. ажыццяўляліся спробы засылкі на тэрыторыю былога ВКЛ эмісараў польскіх эміграцкіх

арганізацый, якія павінны былі ствараць з мясцовых жыхароў узброеныя атрады для разгортвання партызанскай барацьбы. Найбольш значнай такой спробай з’яўляецца “Экспедыцыя палкоўніка Ю. Заліўскага” 1833 г. Аднак істотных вынікаў падобныя акцыі не атрымалі. Большасць эмісараў арыштоўваліся ўладамі.

У 1830-1840-я гг. у розных гарадах былога ВКЛ узнікалі падпольныя арганізацыі польскага нацыянальна-вызваленчага руху: “*Садружнасць польскага народа*”, якая мела свае аддзяленні на тэрыторыі былога ВКЛ (1835-1837), “*Дэмакратычнае таварыства*” ў Вільні (1836-1838), “*Брацкі саюз літоўскай моладзі*” (1846-1849) з аддзяленнямі ў Вільні, Ашмянах, Гродне, Лідзе і Мінску, *Мінская тайная арганізацыя* (1848-1849). Пераважную большасць членаў дадзеных арганізацый складалі прадстаўнікі радыкальна настроенай шляхецкай моладзі. Дадзеныя арганізацыі разам з патрабаваннямі аднаўлення незалежнасці Рэчы Паспалітай змяшчалі ў сваіх праграмах патрабаванні істотных грамадска-палітычных пераўтварэнняў у будучай нележнай дзяржаве. Найлепшай формай дзяржаўна-палітычнага ўладкавання абвяшчалася дэмакратычная рэспубліка, у межах якой павінны гарантавацца свабода і роўнасць усіх людзей, падрэслівалася неабходнасць ліквідацыі саслоўных прывілеяў і прыгоннага права. У якасці шляху да рэалізацыі сацыяльна-палітычных ідэалаў сцвярджалася нацыянальна-дэмакратычная рэвалюцыя, рухаючай сілай якой павінны былі стаць усе сацыяльныя слаі грамадства, а не толькі шляхта.

Аднак істотнага ўплыву на грамадска-палітычныя працэсы на землях Беларусі дадзеныя арганізацыі не мелі. Усе яны былі выкрыты царскімі ўладамі, а іх дзеячы рэпрэсіраваны.

**Асноўныя паняцці**:

Беларускае каталіцкае біскупства, гарадская дума, генерал-губернатарства, губерня, губернскія і павятовыя дваранскія сходы, губерня, мяжа яўрэйскай аселасці, павет, падушны падатак, “разбор шляхты”, рэкруцкая павіннасць, Варшаўскае герцагства, Часовая ўрадавая камісія ВКЛ, Каралеўства Польскае, масоны, польскі нацыянальна-вызваленчы рух, дзекабрысты, філаматы, прамяністыя, філарэты, шляхецкі рэвалюцыянарызм, “Патрыятычнае таварыстыства”, “Бабруйскі план паўстання”, “Таварыства ваенных сяброў”, паўстанне 1830-1831 гг., Віленскі цэнтральны камітэт, “Асобы камітэт па справах заходніх губерняў”, русіфікацыя, “Северо-Западный край”, Полацкі сабор 1839 г., заходнерусізм, “Садружнасць польскага народа”, “Дэмакратычнае таварыства”, “Брацкі саюз літоўскай моладзі”.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Які характар мела сістэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на тэрыторыі Беларусі пасля яе далучэння ў склад Расійскай імперыі? Якія былі сфарміраваны адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі?

2. Дайце характарыстыку сістэмы дзяржаўнага кіравання, якая склалася на тэрыторыі Беларусі ў канцы 18 – пачатку 19 стст.?
3. Параўнайце прававое становішча шляхты беларускіх зямель да і пасля падзелаў Рэчы Паспалітай? Якія прывілеі былі захаваны за шляхтай і якія былі страчаны?
4. Растлумачце, у чым палягала сутнасць палітыкі “разбору шляхты”? Чаму палітыка царызму адносна дробнай шляхты мела рэпрэсіўны характар?
5. Прааналізуйце, як змянілася становішча гарадскога насельніцтва пасля падзелаў Рэчы Паспалітай? Якія новыя павіннасці былі ўведзены для мяшчанства?
6. У чым адлюстроўвалася ўзмацненне эксплуатацыі сялянства пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі? Якім чынам змяніліся дзяржаўныя павіннасці сялянства?
7. Вызначце асноўныя накірункі палітыкі царызму ў дачыненні яўрэяў? Паспрабуйце растлумачыць, чым было абгрунтавана з боку царскіх улад увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці?
8. Параўнайце прававое становішча рымска-каталіцкай і ўніяцкай цэркваў у Расійскай імперыі? Растлумачце, у чым палягае прычына адрозненняў?
9. Растлумачце, чаму царскія ўлады захавалі на тэрыторыі сваёй дзяржавы дзейнасць ордэна езуітаў, нягледзячы на яго роспуск паводле ініцыятывы папства?
10. Якія пазіцыі займалі прадстаўнікі палітычнай эліты былога ВКЛ напярэдадні вайны 1812 г.?
11. Якія характар мелі баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў першы перыяд вайны 1812 г.? Растлумачце прычыны першапачатковых перамог французкага войска?
12. Які характар мелі адносіны розных груп насельніцтва Беларусі да французкіх улад на акупаванай тэрыторыі? Растлумачце прычыны і матывы тых ці іншых адносін?
13. Прааналізуйце асноўныя накірункі палітыкі французкай адміністрацыі на землях былога ВКЛ? Вызначце характар і матывы дадзенай палітыкі?
14. Вызначце характар баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў апошні перыяд вайны 1812 г.? Растлумачце прычыны паражэнняў французкага войска?
15. Якія вынікі прынесла вайна 1812 г. для розных груп насельніцтва Беларусі?
16. Чым можна растлумачыць ажыўленне грамадска-палітычнага жыцця на землях былога ВКЛ у другой палове 1810 – пачатку 1820-х гг.? Якія ў гэты час функцыяніруюць грамадскія арганізацыі?
17. Прасачыце, якім чынам змянялася палітыка царызму ў адносінах да “польскага пытання” на працягу другой паловы 1810 – першай паловы 1820-х гг.? Да якіх гэта прывяло палітычных наступстваў?
18. Якія накірункі меліся ў межах апазіцыйнага руху на тэрыторыі Беларусі ў першай палове 1820-х гг.? Якія паміж імі меліся агульныя рысы і разыходжанні?

19. Ахарактарызуйце сацыяльныя і ідэйныя асновы польскага нацыянальна-вызваленчага руху першай паловы 1820-х гг.? Растлумачце сутнасць ідэі шляхецкага рэвалюцыянарызму?
20. Растлумачце, хто такія дзекабрысты? Дайце характарыстыку ідэалогіі і сацыяльнага складу дзекабрысцкага руху.
21. Вызначце прычыны і перадумовы паўстання 1830-1831 гг.
22. Якія мерапрыемствы ажыцяўляліся паўстанцкімі ўладамі Польшчы ў 1830-1831 гг.? Вызначце характар дадзеных мерапрыемстваў?
23. Якія палітычныя плыні меліся сярод удзельнікаў паўстання 1830-1831 гг.?
24. Якія тэрыторыі ахапіў паўстанцкі рух у 1830-1831 гг. ў Беларусі? Якія сацыяльныя групы насельніцтва пераважна ўдзельнічалі ў паўстанні?
25. Якія можна вылучыць асноўныя прычыны паражэння паўстання 1830-1831 гг.?
26. Якія можна вылучыць асноўныя накірункі палітыкі царызму пасля падаўлення паўстання 1830-1831 гг.?
27. Абгрунтуйце прычыны ўзмацнення русіфікатарскай палітыкі царызму пасля паражэння паўстання 1830-1831 гг.?
28. Паспрабуйце вызначыць, якія сацыяльныя групы насельніцтва на тэрыторыі Беларусі найбольш пацярпелі ў выніку рэпрэсіўнай палітыкі царызму ў 1830-1850-я гг. і чаму?
29. Чым можна растлумачыць змены ў канфесійнай палітыцы царызму ў 1830-1850-я гг.?
30. Які характар меў польскі нацыянальна-вызваленчы рух ў 1830-1850-я гг. на тэрыторыі Беларусі?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Фарміраванне расійскай сістэмы дзяржаўнага кіравання ў Беларусі ў канцы 18 – пачатку 19 стст.
2. Шляхта Беларусі ў пачатку 19 ст.
3. Яўрэі Беларусі ў канцы 18 – першай палове 19 стст.
4. Дзейнасць ордэна езуітаў на тэрыторыі Расійскай імперыі.
5. Землі Беларусі ва ўмовах французкай акупацыі 1812 г.
6. Дзейнасць масонскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі (другая палова 1810 – пачатак 1820-х гг.).
7. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі падчас паўстання 1830-1831 гг.
8. Ліквідацыя уніяцкай царквы на тэрыторыі Расійскай імперыі.

## Тэма 11: Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове 19 ст.

**1. Сельская гаспадарка. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.**
**2. Прамысловасць.**
**3. Гарады. Гандаль.**

## 11.1. Сельская гаспадарка. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.

У першай палове 19 ст. сельская гаспадарка заставалася вядучай галінай эканомікі беларускіх зямель. У структуры землеўладання ў гэты перыяд, як і раней, панавалі дзве формы ўласнасці: *дзяржаўная* і *прыватная*. Сяляне лічыліся толькі карыстальнікамі зямлі і абавязаны былі за дадзенае права карыстання выконваць павіннасці на карысць уласніка зямлі. Акрамя таго сяляне знаходзіліся ў асабістай залежнасці ад уладальніка.

У выніку падараванняў расійскім чыноўнікам часткі дзяржаўных і канфіскаваных шляхецкіх зямель пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, вайны 1812 г. і паўстання 1830-1831 гг. павялічылася роля *буйнапамеснага землеўладання*. Так, уладанні князя Вітгенштэйна ўключалі ў сябе 500 тыс. дзесяцін зямлі, на якіх працавалі 60 тыс. прыгонных сялян. Буйныя ўладанні (звыш 100 тыс. дзесяцін) мелі князі Радзівілы, Патоцкія, Паскевічы. Канцэнтрацыя буйнога землеўладання суправаджалася скарачэннем удзельнай вагі землеўладання сярэдняй і дробнай шляхты.

Характэрнай рысай развіцця памешчыцкай гаспадаркі дадзенага перыяду з'яўлялася *ўзрастанне яе таварнасці*. Індустрыялізацыя ў Заходняй Еўропе і звязаная з ёй урбанізацыя выклікалі павелічэнне попыту на сельскагаспадарчыя прадукты і адпаведна рост цэн на іх. У гэтых умовах буйныя землеўласнікі ўзмацнялі арыентацыю на продаж прадукцыі сваіх гаспадарак на знешнім і ўнутраным рынку і імкнуліся да павелічэння прыбыткаў. У некаторых буйных маёнтках сталі выкарыстоўвацца капіталістычныя метады гаспадарання: увядзенне травасеяння і шматпольных севазваротаў, прымяненне ўдасканаленых сельскагаспадарчых машын (малатарні, веялкі, сечкары, сеялкі, жнейкі), выкарыстанне працы наёмных рабочых.

Аднак большасць памешчыкаў імкнуліся да павелічэння даходнасці сваіх гаспадарак шляхам узмацнення феадальнай эксплуатацыі сялянства. Гэта праяўлялася ў пашырэнні фальваркаў шляхам абеззямельвання сялян, перасялення іх на горшыя землі, а таксама ў павелічэнні паншчыны і іншых павіннасцяў. Перавага аддавалася стварэнню сярэдніх па велічыні маёнткаў з колькасцю прыгонных 200-500 чал., якія здаваліся ў арэнду.

Сялянства гэтага перыяду падзялялася на дзве асноўныя групы: *прыватнаўласніцкія* (каля 70%) і *дзяржаўныя* (каля 27%). У Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях пераважала сялянскае падворнае землекарыстанне, а ў Віцебскай і Магілёўскай – абшчыннае. Асноўнымі формамі феадальных павіннасцяў сялян заставаліся паншчына (яе ўдзельная вага павялічвалася) і чынш. Амаль ва ўсіх сялянскіх гаспадарках панавалі прымітыўная сельскагаспадарчая тэхніка і трохпольныя севазвароты.

У той жа час назіраецца некаторы ўплыў таварна-грашовых адносін у сялянскай гаспадарцы:

- павелічэнне колькасці сялян, занятых промыславай дзейнасцю (лесараспрацоўкі, сплаўныя работы, будаўніцтва і г.д.);

- некаторае расслаенне сялянства: паступова вылучаюцца групы заможных і збяднелых, беззямельных сялян;

- з'яўленне ў гаспадарках некаторых заможных сялян удасканаленых прылад працы, шматпольных севазваротаў.

Павышэнне таварнасці сельскай гаспадаркі Беларусі ў першай палове 19 ст. прывяло да змен у структуры сельскагаспадарчай вытворчасці. Пачынаецца вырошчванне ў якасці таварных культур бульбы, цукровых буракоў, кармавых траў.

У сярэдзіне 19 ст. назіраецца *крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы* ў сельскай гаспадарцы Беларусі. Прыкметамі гэтага былі:

- зніжэнне ўраджайнасці, пагалоўя жывёлы;

- прагрэсіруючае разарэнне сялянскіх гаспадарак; пра гэта сведчыць пастаянны рост нядоімак сялян па дзяржаўных падатках (так, паводле дадзеных на 1856 г., нядоімкі па 5 беларускіх губернях складалі 8 млн. руб з агульнай сумы нядоімак па Расійскай імперыі 23 млн.);

- зніжэнне даходнасці памешчыцкіх гаспадарак, павелічэнне колькасці маёнткаў, якія былі закладзены ў банк і прададзены з таргоў;

- узрастанне колькасці сялянскіх хваляванняў.

Прычынай гэтых з'яў была *супярэчнасць паміж аб'ектыўнымі працэсамі паступовага ўваходжання сельскай гаспадаркі ў сістэму капіталістычных таварна-грашовых адносін і захаваннем феадальных вытворчых адносін*. Гэтая супярэчнасць праяўлялася ў наступным: У буйных памешчыцкіх гаспадарках, якія ўсё больш арыентаваліся на рынак, ствараліся аб'ектыўныя ўмовы для развіцця шматгаліновай вытворчасці і павышэння таварнасці шляхам інтэнсіфікацыі працы. Аднак ва ўмовах панавання прыгоннага права памешчыкі лічылі найбольш аптымальным шляхам павышэння даходнасці сваіх гаспадарак ўзмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства. Сялянскія гаспадаркі ўцягваліся ў рынак амаль выключна з мэтай знаходжання грошай для выплаты дзяржаўных і памешчыцкіх падаткаў. У дадзенай сітуацыі ў памешчыцкіх гаспадарках не было стымулаў, а ў сялянскіх – магчымасцяў для тэхнічнай мадэрнізацыі і рацыяналізацыі вытворчасці. Значнае ўзмацненне павіннасцяў сялянства прыводзіла да яго разарэння, а потым, як вынік, і зніжэння даходнасці памешчыцкіх гаспадарак.

У дадзеных умовах дзяржаўныя ўлады спрабавалі змякчыць адзначаную супярэчнасць шляхам правядзення некаторых рэформ у сельскай гаспадарцы. Найбольш значнымі сярод іх былі рэформа дзяржаўнай вёскі П.Д. Кісялёва 1837-1841 гг. і інвентарная рэформа 1844-1857 гг.

*Рэформа дзяржаўнай вёскі 1837-1841 гг.* праводзілася па ініцыятыве міністра дзяржаўнай маёмасці Расійскай імперыі П.Д. Кісялёва. Рэформа мела тры накірункі:

- *рэформа сістэмы кіравання дзяржаўнымі сялянамі*: была адменена арэнда дзяржаўных маёнткаў; уводзілася мясцовае самакіраванне для сялян пад наглядам дзяржаўных органаў улады; дзяржаўныя сяляне атрымлівалі некаторыя грамадзянскія правы: атрыманне спадчыны, уласнасці, заняткі гандлем;

- *“папячыцельская палітыка”*: уключала ў сябе арганізацыю харчовай дапамогі сялянам, агранамічных мерапрыемстваў, пачатковага навучання для дзяцей і медыцынскай дапамогі ў дзяржаўнай вёсцы;

- *люстрацыя дзяржаўных маёмасцяў*: прадугледжвала пераразмеркаванне зямельнага фонду паміж маёнткамі і сялянскімі дварамі, рэгламентацыю сялянскіх павіннасцяў. Яна праводзілася ў два этапы:

да 1844 г. – пры захаванні фальваарачна-паншчыннай сістэмы;

з 1844 г. па 1857 г. – шляхам паскоранага пераводу сялян з паншчыны на аброк.

Мэтай дадзенай рэформы з’яўлялася павышэнне плацежаздольнасці дзяржаўнай вёскі. Вынікам яе стала змяншэнне феадальных павіннасцяў дзяржаўных сялян і некаторае павышэнне таварна-грашовых адносін у вёсцы.

Аднак памешчыцкія сяляне не былі ахоплены дадзенай рэформай. Спробай рэгуляцыі адносін паміж памешчыкамі і іх прыгоннымі з’явілася ўвядзенне абавязковых *інвентароў* (гаспадарчага апісання памешчыцкіх маёнткаў) на падставе спецыяльнага закона 1844 г. Інвентары павінны былі змяшчаць фіксіраваныя нормы сялянскіх надзелаў і павіннасцяў, якія выконваліся за карыстанне імі. Аднак правядзенне дадзенай рэформы праходзіла марудна. Да 1857 г. інвентары былі ўведзены толькі ў 1/10 частцы памешчыцкіх маёнткаў. Да таго ж нормы інвентароў складаліся камісіямі, галоўная роля ў якіх належыла самімі памешчыкам. Таму істотных вынікаў інвентатная рэформа не прынесла.

*Такім чынам, у сельскай гаспадарцы Беларусі у першай палове 19 ст. назіраецца паступовае развіццё капіталістычных таварна-грашовых адносін. Аднак панаванне прыгоннага права істотна тармазіла дадзены працэс. Супярэчнасць паміж аб’ектыўнымі працэсамі паступовага ўваходжання сельскай гаспадаркі ў сістэму капіталістычных таварна-грашовых адносін і захаваннем феадальных вытворчых адносін прывяла да крызісу прыгонніцкай сістэмы.*

### 11.2. Прамысловасць.

У структуры прамысловых прадпрыемстваў дадзенага перыяду можна вылучыць тры тыпы: дробныя рамесныя прадпрыемствы, мануфактуры, фабрыкі.

| *Тып прамысловых прадпрыемстваў* | *Спецыфіка прамысловай вытворчасці* |
|---|---|
| Дробныя рамесныя прадпрыемствы | Вытворчая дзейнасць ажыццяўляецца сіламі рамеснікаў-майстроў, членаў іх сем’яў, невялікай колькасці чаляднікаў і вучняў; выкарыстоўваюцца ручныя прылады працы; спецыялізаваны падзел працы адсутнічае. |
| Мануфактуры | Вытворчая дзейнасць ажыццяўляецца калектывам рабочых, у межах якога існуе прафесійная спецыялізацыя і звязаны з ёй падзел працы; выкарыстоўваюцца ручныя прылады працы. |

| | |
|---|---|
| Фабрыкі | Вытворчая дзейнасць ажыццяўляецца калектывам рабочых, у межах якога існуе прафесійная спецыялізацыя і звязаны з ёй падзел працы; выкарыстоўваюцца машыны ў якасці асноўных сродкаў вытворчасці. |

Вядучую ролю ў структуры прамысловасці мелі *дробныя рамесныя прадпрыемствы*. У канцы 1850-х гг. на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 16,5 тыс. рамеснікаў. Большасць рамеснікаў ў разглядаемы перыяд была аб'яднана ў цэхі. Аднак пашырэнне таварна-грашовых адносін прыводзіла да ўзмацнення сацыяльнага расслаення ўнутры цэхаў. З аднаго боку, некаторыя майстэрні перарасталі ў прадпрыемствы, на якіх працавала значная колькасць наёмных рабочых; з другога, незаможныя члены цэхаў нярэдка наймаліся рабочымі на фабрыкі і мануфактуры.

На працягу першай паловы 19 ст. павялічваецца колькасць і ўдзельная вага ў структуры прамысловасці *мануфактурных прадпрыемстваў*. На 1861 г. налічвалася 127 мануфактур, на іх было сканцэнтравана каля ¼ усіх рабочых на тэрыторыі Беларусі. У разглядаемы перыяд існавалі мануфактуры двух тыпаў:

- *вотчынныя*: належалі буйным памешчыкам, дзейнічалі пераважна ў іх маёнтках, выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян;
- *капіталістычныя*: належалі пераважна купцам і мяшчанам, дзейнічалі пераважна ў гарадах і мястэчках, выкарыстоўвалася праца вольнанаёмных рабочых.

На пачатку 19 ст. большасць мануфактур з'яўляліся вотчыннымі. Аднак на працягу першай паловы 19 ст. частка іх была арэндавана або выкуплена купцамі і мяшчанамі. Ствараліся новыя капіталістычныя мануфактуры. Таксама адбываўся працэс узбуйнення мануфактур. Буйнейшым сярод іх быў металургічны завод у Налібоках князя Вітгенштэйна.

У 1820-я гг. на тэрыторыі Беларусі пачынаецца стварэнне *прадпрыемстваў фабрычнага тыпу*. Першымі з іх сталі суконныя заводы у м. Хомск Кобрынскага і м. Косава Слонімскага паветаў, якія належалі памешчыку Пуслоўскаму. У другой чвэрці 19 ст. з'явіліся паравыя рухавікі на некаторых прадпрыемствах мукамольнай, цукровай, лесапільнай, жалезаапрацоўчай і іншых галін прамысловасці.

Узнікненне фабрычных прадпрыемстваў з'яўлялецца пачаткам такога сацыяльнага працэсу як *прамысловая рэвалюцыя*, што азначае пераход ад працы, заснаванай на ручной тэхніцы, да машыннай індустрыі, у выніку якога прамысловасць пераўтвараецца ў галоўную галіну грамадскай вытворчасці. У краінах Заходняй Еўропы дадзены працэс адбываецца на працягу канца 18 – першай паловы 19 стст., вынікам чаго становіцца фарміраванне *індустрыяльнага грамадства*. На землях Беларусі ў першай палове 19 ст. быў зроблены толькі першы крок ў стварэнні перадумоў прамысловай рэвалюцыі. Фабрыкі ў сярэдзіне 19 ст. былі невялікімі, заснаванымі на апрацоўцы мясцовай сыравіны і складалі невялікую долю ў структуры прамысловасці.

У структуры прамысловай вытворчасці на землях Беларусі ў дадзены перыяд пераважалі наступныя галіны: суконная, папяровая, харчовая, шкляная, г.зн. галіны, заснаваныя на перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай сыравіны.

*Такім чынам, у першай палове 19 ст. назіраецца працэс паступовага развіцця прамысловасці на тэрыторыі Беларусі, узмацнення ў ёй ролі капіталістычных элементаў. Аднак панаванне феадальна-прыгонніцкіх адносін замаруджвала дадзены працэс: натуральная гаспадарка ў прыгоннай вёсцы стрымлівала попыт на прамысловыя тавары; прымусовая праца прыгонных сялян на прадпрыемствах была неэфектыўнай.*

**11.3. Гарады. Гандаль.**

У першай палове 19 ст. назіраецца хуткі рост гарадскога насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. З 1796 па 1861 г. яно павялічылася з 80 да 320 тыс.чал. К 1861 г. у гарадах пражывала каля 10% усяго насельніцтва. Найбольш буйнымі гарадамі былі Віцебск, Мінск, Магілёў, Гродна. У гарадах павялічваецца ўдзельная вага рамесна-гандлёвага насельніцтва. Значную ролю ў гэтым адыграла ўвядзенне мяжы яўрэйскай аселасці і прымусовае перасяленне яўрэяў з вёсак у гарады і мястэчкі. К сярэдзіне 19 ст. каля 70% гарадскога насельніцтва складалі яўрэі.

Развіццё прамысловасці і рост гарадскога насельніцтва стымулявалі развіццё *гандлю*. Гэтаму садзейнічаў ўздым цэн на хлеб у першай палове 19 ст. Асноўнай арганізацыйнай формай гандлёвых адносін у першай палове 19 ст. былі *кірмашы*. Большасць кірмашоў з'яўляліся універсальнымі, на іх можна было гандляваць любымі таварамі. Самымі буйнымі былі кірмашы ў Зэльве Гродзенскай губерні, Бешанковічах і Любавічах Магілеўскай губерні.

Значная месца займаў таксама *развозна-разносны гандаль*. Многія гарадскія купцы скуплялі ў вёсках сельскагаспадарчую прадукцыю, сартавалі яе, збіралі ў вялікія партыі і прадавалі аптавікам. Амаль ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі дзейнічалі *штотыднёвыя базары*. Пашыраўся таксама *стацыянарны гандаль*, які адбываўся ў штодзённа працуючых гандлёвых установах – лаўках, крамах, карчмах, кавярнях і г.д.

Важная роля ў развіцці ўнутранага рынку і таварна-грашовых адносін належала *транспарту*. Да сярэдзіны 19 ст. яго асноўным відам з'яўляўся водны, які ажыццяўляўся па сістэме рэк і каналаў. У разглядаемы перыяд узнікаюць першыя параходы. Другім відам шляхоў зносін былі сухапутныя. У першай палове 19 ст. ажыццяўлялася *будаўніцтва гасцінцаў*. Праз тэрыторыю Беларусі праляглі Маскоўска-Варшаўская, Пецярбургска-Кіеўская і Маскоўска-Рыжская шашэйныя дарогі.

Развіццё шляхоў зносін садзейнічала пашырэнню *знешняга гандлю*. За мяжу з беларускіх губерняў вывозілі прадукты земляробства і жывёлагадоўлі, лес і драўляныя вырабы, прадукцыю перапрацоўчай прамысловасці. Імпартаваліся еўрапейскія фабрычныя тавары, металы, соль, рыба, фабрычнае абсталяванне.

*Такім чынам, у эканоміцы беларускіх зямель у першай палове 19 ст. адбываецца працэс паступовага развіцця капіталістычных таварна-грашовых адносін. Аднак панаванне феадальна-прыгонніцкай сістэмы істотна тармазіла і дэфармавала дадзены працэс. К сярэдзіне 19 ст. у эканамічнай сістэме Беларусі панаваў аграрны сектар; сельская гаспадарка мела пераважна натуральны характар; у прамысловасці дамінавала дробная рамесная вытворчасць, заснаваная на перапрацоўцы мясцовай сыравіны.*

**Асноўныя паняцці:**

Буйнапамеснае землеўладанне, дзяржаўныя сяляне, прыватнаўласніцкія сяляне, рэформа дзяржаўнай вёскі 1837-1841 гг., рэформа сістэмы кіравання дзяржаўнымі сялянамі, “папячыцельская палітыка”, люстрацыя, дробныя рамесныя прадпрыемствы, мануфактуры, фабрыкі, прамысловая рэвалюцыя, кірмашы, развозна-разносны гандаль, стацыянарны гандаль.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Які характар мела структура землеўладання на землях Беларусі ў першай палове 19 ст.?
2. Якімі фактарамі можна патлумачыць узрастанне ў першай палове 19 ст. ролі і значэння буйнапамеснага землеўладання?
3. У чым выяўлялася ўзрастанне таварнасці памешчыцкай гаспадаркі ў першай палове 19 ст.? Чым можна растлумачыць дадзеную з’яву?
4. Растлумачце, чаму, нягледзячы на аб’ектыўныя магчымасці, памешчыкі не былі зацікаўлены ў капіталістычнай перабудове сваіх гаспадарак. Якія шляхі яны выкарыстоўвалі для павышэння даходнасці сваіх гаспадарак?
5. Які ўплыў таварна-грашовыя адносіны ў першай палове 19 ст. мелі на сялянскую гаспадарку Беларусі і ў якой ступені?
6. Якім чынам змянілася структура сельскагаспадарчай вытворчасці на землях Беларусі ў першай палове 19 ст.?
7. У якіх фактах знаходзіць пацвярджэнне тэзіс пра крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы ў першай палове 19 ст.? Якая галоўная прычына дадзенага крызісу?
8. Растлумачце прычыны нізкіх тэмпаў тэхнічнай мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі ў разглядаемы перыяд.
9. Якія рэформы ажыццяўляў царскі ўрад ў сельскай гаспадарцы ў сярэдзіне 19 ст.?
10. Які характар мела структура прамысловасці Беларусі ў першай палове 19 ст.? Чым выклікана вядучая роля дробнай раменай прамысловасці?
11. Якія змены адбываліся ў структуры мануфактурнай прамысловасці Беларусі першай паловы 19 ст.?
12. Растлумачце, у чым выяўляецца спецыфіка фабрычнай вытворчасці. Дзе на тэрыторыі Беларусі ўзнікаюць першыя фабрыкі?
13. Вызначце сутнасць паняцця “прамысловая рэвалюцыя”. Падумайце, ці можна ў сувязі з узнікненнем першых фабрык на тэрыторыі Беларусі ў

першай палове 19 ст., гаварыць пра ажыццяўленне тут прамысловай рэвалюцыі?

14. Якія галіны прамысловай вытворчасці на землях Беларусі ў разглядаемы перыяд адыгрывалі вядучую ролю? Якімі фактарамі гэта выклікана?

15. Растлумачце, ці ёсць сувязь паміж павольнымі тэмпамі развіцця прамысловасці на тэрыторыі Беларусі ў першай палове 19 ст. і захаваннем ў гэты перыяд прыгоннага права і ў чым палягае дадзеная сувязь.

16. Якімі фактарамі можна патлумачыць рост гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў першай палове 19 ст.?

17. Якія формы гандлю пераважалі на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд? Паспрабуйце растлумачыць асаблівае значэнне кірмашоў.

18. Якія змены адбыліся ў транспартнай сістэме на землях Беларусі ў першай палове 19 ст. і як яны паўплывалі на развіццё гандлю?

19. Які характар мела структура знешняга гандлю ў разглядаемы перыяд?

20. Паспрабуйце вызначыць узровень развіцця эканомікі Беларусі ў першай палове 19 ст. у цэлым і растлумачце прычыны гэтага.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Структура шляхецкага землеўладання на землях Беларусі ў першай палове 19 ст.
2. Сялянскія павіннасці на землях Беларусі ў першай палове 19 ст.
3. Рэформа дзяржаўнай вёскі на тэрыторыі Беларусі: прычыны, ход і вынікі.
4. Фарміраванне фабрычнай прамысловасці з беларускіх губернях.
5. Эканоміка беларускіх зямель у кантэксце заходнееўрапейскай індустрыялізацыі першай паловы 19 ст.
6. Беларускі горад у першай палове 19 ст.

## Тэма 12: Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове 19 ст.

**1. Аграрная рэформа 1861 г. і асаблівасці яе ажыццяўлення на тэрыторыі Беларусі.**

**2. Сельская гаспадарка.**

**3. Прамысловасць.**

**4. Гарады, гандаль, транспартная сістэма.**

### 12.1. Аграрная рэформа 1861 г. і асаблівасці яе ажыццяўлення на тэрыторыі Беларусі.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай гаспадаркі, які стаў відавочны ў сярэдзіне 19 ст., вымусіў царскі ўрад шукаць шляхі да рэфармавання вытворчых адносін. Неабходнасць адмены прыгоннага права стала ўсведамляцца правячымі коламі пасля паражэння Расійскай імперыі ў Крымскай вайне 1853-1856 гг., якая паказала тэхнічную адсталасць Расіі ў параўнанні з індустрыялізаванымі заходнееўрапейскімі краінамі. Шляхам

адмены прыгоннага права царызм спадзяваўся стварыць умовы для тэхнічнай мадэрнізацыі гаспадаркі імперыі.

Падрыхтоўка да адмены прыгоннага права пачалася са стварэння "Сакрэтнага камітэта па сялянскіх справах" у студзені 1857 г. Урад імкнуўся правядзенне рэформы паставіць на шырокае абмеркаванне ў колах дваранства. Першым рэгіёнам, у якім меркавалася прыцягнуць памешчыкаў да рэалізацыі ідэі аграрнай рэформы, сталі землі Беларусі і Літвы. Тлумачыцца гэта тым, што памешчыкі гэтага рэгіёну былі ў большай ступені падрыхтаваны да адмены прыгоннага права, таму што іх гаспадаркі былі ўцягнуты ў таварна-грашовыя адносіны праз еўрапейскі рынак. Да вясны 1858 г. ва ўсіх губернях Беларусі і Літвы, а да канца года ў большасці губерняў Расійскай імперыі былі створаны *губернскія камітэты* з прадстаўнікоў дваранства, якім даручалася скласці праекты рэформы.

***19 лютага 1861 г.*** расійскі імператар Аляксандр II падпісаў *Маніфест аб адмене прыгоннага права* і дапасаваныя да яго "*Агульнае палажэнне*", "*мясцовыя палажэнні*" і дадатковыя правілы, якія ілюстравалі змест аграрнай рэформы. Сутнасць праводзімай аграрнай рэформы палягала ў наступным:

1) Сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і грамадзянскія правы: яны маглі гандляваць, набываць рухомую і нерухомую маёмасць, паступаць у навучальныя ўстановы і на службу, несці асабістую адказнасць перад судом і г.д.; памешчыкі не маглі больш прадаваць і караць сялян.

2) Памешчыкі прызнаваліся ўласнікамі ўсёй зямлі, якая належала ім да рэформы. Частка гэтай зямлі адводзілася для надзялення сялян у пастаяннае карыстанне. На працягу дзевяці гадоў сяляне павінны былі выконваць за выдзеленыя ім надзелы павіннасці на карысць памешчыка (паншчына або чынш). На гэты перыяд яны лічыліся *часоваабавязанымі* і не маглі пакінуць сваё месца жыхарства без дазволу памешчыка.

3) Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся *ўстаўнымі граматамі*, складанне якіх даручалася памешчыкам і спецыяльна ўведзеным для гэтага чыноўнікам – міравым пасярэднікам у двухгадовы тэрмін.

4) Памеры надзелаў, якія адводзіліся сялянам, вызначаліся ў залежнасці ад мясцовых умоў. У Віцебскай і Магілёўскай, дзе панавала абшчыннае землекарыстанне, устанаўліваліся *вышэйшыя і ніжэйшыя памеры надзелаў* у залежнасці ад колькасці і якасці зямлі ў пэўнай мясцовасці. Вышэйшы надзел складаў 4-5,5 дзесяціны, "ніжэйшы" адпаведна 1,2-1,8 дзесяціны на душу мужчынскага полу. У выпадку, калі дарэформенны надзел быў большым, чым вышэйшы памер надзела, праводзіліся *адрэзкі* лішкаў зямлі на карысць памешчыка. У Магілёўскай і Віцебскай губернях у выніку адрэзкаў сяляне страцілі 25-40% зямлі. Для забеспячэння выканання сялянамі павіннасцяў у абшчынах уводзілася кругавая парука. У Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і чатырох паветах Віцебскай губерні, дзе існавала падворнае землекарыстанне, нормы сялянскіх надзелаў не вызначаліся; за сялянамі захоўваліся тыя надзелы, якімі яны карысталіся да 1861 г. Адрэзкі дапускаліся, калі ў памешчыка заставалася менш 1/3 часткі зручных земель; у той жа час

сялянскі надзел нельга было паменшыць больш як на 1/6. Пры выкананні павіннасцяў дзейнічала асабістая адказнасць селяніна.

5) Сяляне атрымлівалі права выкупу ва ўласнасць вызначаных для іх надзелаў са згоды памешчыка. Пасля ажыццяўлення выкупу часоваабавязаныя адносіны сялян спыняліся. *Выкупная сума* была такога памеру, каб памешчык, паклаўшы яе ў банк (пад 6% гадавых), мог атрымліваць прыбытак, роўны штогадоваму чыншу з зямлі, якая перайшла ва ўласнасць селяніна. Аднак сяляне не мелі такой сумы грошай. Дзяржава выступіла ў якасці пасярэдніка паміж памешчыкамі і сялянамі. Пры выкупе надзелаў сяляне павінны былі заплаціць 20-25% ад выкупной сумы, а астатнюю частку атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер. У выніку гэтай аперацыі сяляне павінны былі на працягу 49 гадоў плаціць дзяржаве *выкупныя плацяжы*, якія ўключалі ў сябе доўг і працэнты за выдзеленую пазыку.

6) Стваралася *сістэма сялянскага самакіравання*. Сяляне, якія пражывалі на пэўнай тэрыторыі і складалі сельскую абшчыну, на агульным сходзе выбіралі старасту, зборшчыка падаткаў і іншых службовых асоб. Некалькі сельскіх абшчын утваралі *валасць*. *Валасны сход* (сход сялян пэўнай валасці) выбіраў *валасную ўправу* на чале са старшынёй і *валасны суд*. У сваёй дзейнасці яны падпарадкоўваліся дзяржаўнай павятовай адміністрацыі.

Умовы правядзення аграрнай рэформы выклікалі незадаволенасць сялянства. У масавым парадку сяляне адмаўляліся падпісваць устаўныя граматы, выконваць павіннасці. Уздым сялянскага руху ў 1861-1863 гг. супаў па часе з польскім нацыянальна-вызваленчым паўстаннем 1863-1864 гг. Дадзеная акалічнасць стварала для царскіх улад пагрозу масавага далучэння сялян да паўстання. У падобных умовах царызм у 1863-1864 гг. пайшоў на некаторыя саступкі сялянам:

- адмена часоваабавязанага становішча для сялян беларускіх губерняў у 1863-1864 гг. і перавод іх на абавязковы выкуп;
- змяншэнне сумы выкупных плацяжоў па розных губернях ад 20% да 75%;
- вяртанне сялянам часткі адрэзаных раней зямель; у выніку сярэднія памеры надзелаў былых памешчыцкіх сялян Беларусі аказаліся вышэйшымі, чым у цэлым па Расійскай імперыі (у Беларусі 4,2-5,7 дзесяціны, у Расійскай імперыі – 3,3 дзесяціны).

У 1863 г. былі створаны камісіі, якія павінны былі праверыць памеры сялянскіх надзелаў і скласці выкупныя акты. Складанне выкупных актаў на тэрыторыі Беларусі было завершана ў асноўным да пачатку 1870-х гг.

У 1867 г. была праведзена *рэформа дзяржаўных сялян*. Яны пераводзіліся з аброку на выкуп зямлі і станавіліся прыватнымі ўладальнікамі зямельных надзелаў, але выкуп для іх не быў абавязковы. Дзяржаўныя сяляне ў асноўным захавалі свае надзелы, якія аказаліся вышэйшымі, чым у памешчыцкіх.

Такім чынам, *адмена прыгоннага права ліквідавала асабістую залежнасць сялян ад памешчыкаў і стварыла больш спрыяльныя, чым раней,*

*умовы для развіцця капіталістычных таварна-грашовых адносін у сельскай гаспадарцы і эканоміцы ў цэлым. Разам з тым асаблівасці правядзення рэформы, накіраваныя перш за ўсё на забеспячэнне інтарэсаў памешчыкаў і дзяржавы, абумовілі захаванне істотных феадальных перажыткаў, крыніцай якіх з'яўлялася сялянскае малазямелле, дапоўненае ўзмацненнем падатковага ціску з боку дзяржавы ў выглядзе выкупных плацяжоў.*

**12.2. Сельская гаспадарка.**

У другой палове 19 ст. эканоміка беларускіх зямель захоўвала пераважна аграрны характар. У сельскай гаспадарцы працягвала панаваць буйное памешчыцкае землеўладанне. У другой палове 1870-х гг. памешчыкам належала звыш 50% прыдатнай зямлі, звыш 10% - дзяржаве і царкве, астатнія землі размяркоўваліся сярод сялянства. Па велічыні буйнога памешчыцкага землеўладання Беларусь знаходзілася на адным з першых месцаў сярод рэгіёнаў Расійскай імперыі: на 1877 г. зямельныя ўладанні з колькасцю звыш 500 дзесяцін складалі 88,6% зямельнай уласнасці.. Пасля паўстання 1863-1864 гг. адбыліся некаторыя змены ў нацыянальным складзе буйных землеўладальнікаў. На працягу 1865-1870 гг. уладанні памешчыкаў расійскага паходжання, дзякуючы падтрымцы царскага ўраду, павялічыліся ў 2 разы. Разам з тым было забаронена памешчыкам-каталікам набываць новыя зямельныя ўладанні, а сялянам-каталікам купляць больш за 60 дзесяцін на чалавека. Забаранялася мець зямлю яўрэям. Дадзеныя абмежаванні стрымлівалі перспектывы фарміравання бессаслоўнага землеўладання.

Адмена прыгоннага права паскорыла працэсы ўцягвання сельскай гаспадаркі ў рыначныя адносіны і яе тэхнічнай мадэрнізацыі. Дадзеным працэсам спрыялі таксама працяг узрастання попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю ў краінах Заходняй Еўропы, рост гарадоў, прамысловасці і чыгуначнага будаўніцтва ў самой Беларусі і суседніх рэгіёнах Расійскай імперыі. У многіх памешчыцкіх і некаторых заможных сялянскіх гаспадарках сталі распаўсюджвацца шматпольныя севазвароты, сельскагаспадарчыя машыны. Аднак у цэлым тэхнічная мадэрнізацыя адбывалася марудна. У буйных памешчыцкіх гаспадарках у гэты перыяд выкарыстоўваліся дзве асноўныя сістэмы гаспадарання:

1) *капіталістычная*: сутнасць яе палягае ў тым, што памешчыцкая зямля апрацоўвалася наёмнымі сельскагаспадарчымі рабочымі з дапамогай прылад працы і рабочай жывёлы ўласніка;

2) *адпрацовачная*: сутнасць яе палягае ў тым, што сяляне арандавалі частку зямлі памешчыкаў і за гэта адпрацоўвалі на памешчыцкай зямлі са сваімі прыладамі працы і рабочай жывёлай, або аддавалі памешчыкам частку сельскагаспадарчай прадукцыі.

У многіх памешчыцкіх гаспадарках суіснавалі элементы абедзвюх названых сістэм. Элементы капіталістычнай сістэмы пераважалі ў памешчыцкіх гаспадарках на захадзе і ў цэнтры тэрыторыі Беларусі, дзе землеўладальнікі традыцыйна былі больш цесна звязаныя з рынкам, а адпрацовачная сістэма – на ўсходзе.

Да 1880-х гг. асноўнай галіной сельскай гаспадаркі з'яўлялася вытворчасць зерневых культур. Аднак сітуацыя змянілася ў выніку *сусветнага аграрнага крызісу 1880-1890-х гг.* Прычынай крызісу стаў увоз у Еўропу таннага хлеба з ЗША, Канады, Аргенціны, Аўстраліі, што прывяло да рэзкага падзення цэн на зерне на ўнутраных рынках еўрапейскіх краін, а таксама Расіі. Хлебны гандаль пачаў цярпець вялікія страты. На землях Беларусі сітуацыя абвастралася таксама з прычыны тарыфнай палітыкі царскага ўрада, які, абараняючы інтарэсы расійскіх памешчыкаў, устанавіў для іх значна ніжэйшы тарыф на экспарт збожжа, чым для памешчыкаў заходніх губерняў. У выніку збожжавая гаспадарка Беларусі не здолела прыстасавацца да новых умоў рынку і стала стратнай. У дадзеных умовах адбывалася пераарыентацыя таварнай гаспадаркі на новыя галіны вытворчасці. Склалася новая спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі, якую вызначалі наступныя галіны:

- *малочная жывёлагадоўля* (уключаючы масларобства і сыраварэнне);
- *ільноводства*;
- *бульбаводства*.

Аграрны крызіс 1880-1890-х гг. меў наступныя сацыяльна-эканамічныя вынікі:

1) Разарэнне часткі памешчыцкіх гаспадарак, якія не здолелі пераарыентавацца на новыя ўмовы рынку. К канцу 19 ст. каля 57% усіх прыватнаўласніцкіх зямель беларускіх губерняў былі закладзены ў банках, частка з іх прадавалася з таргоў. З 1877 па 1905 гг. дваранскае землеўладанне ў беларускіх губернях скарацілася на 1,3 млн. дзесяцін; у той жа час павялічылася землеўладанне заможных сялян, купцоў і мяшчан.

2) Умацаванне капіталістычнай сістэмы гаспадарання, якая стала пануючай ў заходніх і цэнтральных рэгіёнах Беларусі; на ўсходзе замацоўваецца змешаная адпрацовачна-капіталістычная сістэма.

3) Паскарэнне працэсу ўкаранення ў гаспадарках памешчыкаў і заможных сялян машыннай тэхнікі, насенняводства, пераходу да шматпольных севазваротаў з мэтай зніжэння выдаткаў вытворчасці і павелічэння прыбыткаў.

4) Пашырэнне капіталістычнай арэнды зямлі (на 1887 г. 2,5 млн. дзесяцін дваранскай зямлі знаходзілася ў арэндзе на рыначнай аснове).

5) Узрастанне сацыяльнага расслаення сярод сялянства. У канцы XIX ст. доля гаспадарак заможных сялян складала 10% ад агульнай колькасці сялянскіх двароў, сераднякоў – 30%, бедных сялян – 60%. Заможнае сялянства ўмацоўвалася за кошт куплі часткі зямель тых памешчыкаў, якія разараліся ў выніку крызісу. Істотную дапамогу ім у гэтым аказваў *Сялянскі банк*, створаны ў 1882 г. У пошуках заробкаў беззямельныя і малазямельныя сяляне выязджалі на працу ў будаўніцтве і прамысловасці ў іншыя рэгіёны імперыі (за пасляреформенны перыяд колькасць сялян-адыходнікаў павялічылася ў 6,6 разы і на 1890-я гг. складала каля 300 тыс. штогод).

Пералічаныя з’явы сведчылі пра тое, што наступствы сусветнага аграрнага крызісу 1880-1890-х гг. садзейнічалі развіццю капіталістычных рыначных адносін у сельскай гаспадарцы. Аднак дадзенае развіццё адбывалася павольнымі тэмпамі, што было выклікана шэрагам фактараў:

1) *Малазямелле сялянства*. У выніку сямейных раздзелаў сялянскія гаспадаркі пастаянна змяншаліся (да 1900 г. сярэдняя колькасць зямлі на аднаго чалавека складала ад 2,1 да 3,2 дзесяціны). Магчымасці такіх гаспадарак не дазвалялі весці ў значных памерах таварную вытворчасць, выкарыстоўваць удасканаленыя прылады і спосабы працы, набываць прамысловую прадукцыю.

*2) Захаванне абшчыны ва ўсходніх губернях*. Абшчынная сістэма не дазваляла збяднелым сялянам цалкам парваць сувязі з вёскай і перайсці на працу ў прамысловасць або будаўніцтва.

*3) Высокія дзяржаўныя падаткі для сялянства*, уключаючы выкупныя плацяжы, што садзейнічалі збядненню большай часткі сялян.

4) *Цераспалоснае валоданне сялянамі зямлёй*, што перашкаджала наладжванню рацыянальных метадаў гаспадарання.

*Такім чынам, на працягу другой паловы 19 ст. назіраецца працэс развіцця капіталістычных рыначных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі. Асаблівы імпульс дадзенаму працэсу быў нададзены сусветным аграрным крызісам 1880-1890-х гг. Аднак у той жа час істотныя перажыткі феадалізму ў сельскай гаспадарцы істотна тармазілі развіццё таварна-грашовых адносін, кансервавалі элементы натуральнай гаспадаркі з прымітыўнымі формамі гаспадарання і тэхнікі.*

### 12.3. Прамысловасць.

Адмена прыгоннага права стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця прамысловасці на землях Беларусі. У другой палове 19 ст. можна вылучыць чатыры асноўныя тыпы прамысловасці:

- рамесна-саматужная прамысловасць;
-дробнакапіталістычная прамысловасць;
- мануфактурная прамысловасць;
-фабрычна-заводская прамсловасць.

| Тып прамысловасці | Спецыфіка вытворчасці | Колькасць прадпрыемстваў на 1900 г. | Колькасць рабочых на 1900 г. |
|---|---|---|---|
| Рамесна-саматужная | Вытворчы працэс ажыццяўляецца сіламі рамесніка-уладальніка прадпрыемства, членаў яго сям’і і рабочых ў колькасці менш 5 чал. без спецыялізаванага падзелу працы пры дапамозе ручных прылад працы | 58,1 тыс. | 110 тыс. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Дробнакапіталістычная | Вытворчы працэс ажыццяўляецца сіламі рабочых ў колькасці ад 5 да 16 чал. без спецыялізаванага падзелу працы пры дапамозе ручных прылад працы | 17 тыс. | 63,5 тыс. |
| Мануфактурная | Вытворчы працэс ажыццяўлялецца сіламі рабочых у колькасці ад 16 чал. пры дакладна вызначаным падзеле працы, пры дапамозе ручных прылад працы | 760 | 28,8 тыс. |
| Фабрычна-заводская | Вытворчы працэс ажыццяўляецца рабочымі пры дакладна вызначаным падзеле працы і выкарыстанні машынных прылад працы | 1130 | 33,6 тыс. |

Рост колькасці прадпрыемстваў, рабочых і аб’ёмаў вытворчасці назіраўся ў межах усіх тыпаў прамысловасці разглядаемага перыяду. Асабліва хуткімі тэмпамі развівалася фабрычна-заводская прамысловасць, аб’ём прадукцыі якой на працягу 1860-1900 гг. павялічыўся ў 37 разоў. Характэрна тое, што пасля рэформы 1861 г. у Беларусі зніклі прыгонныя фабрыкі і мануфактуры; усе прамысловыя прадпрыемствы былі пераведзены на капіталістычны лад.

Аднак сярод фабрык пераважалі невялікія прадпрыемствы, на кожным з якіх працавала менш як 50 чалавек. На канец 19 ст. на землях Беларусі налічвалася толькі 9 буйных прадпрыемстваў з колькасцю рабочых звыш 500. Да ліку буйнейшых фабрык у Беларусі належалі машынабудаўнічы і чыгуналіцейны завод Якабсона, Ліўшыца і К° у Мінску, льнопрадзільная фабрыка “Дзвіна” ў Віцебску, тытунёвая фабрыка Шарашэўскага ў Гродне, папяровая фабрыка ў Добрушы, запалкавыя фабрыкі ў Пінску і Барысаве. Таксама буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі з’яўляліся чыгуначныя майстэрні і дэпо ў Пінску, Гомелі, Мінску, Віцебску.

Развіццё прамысловасці абумовіла стварэнне *акцыянерных кампаній* – фінансава-прамысловых груп, у межах якіх аб’ядноўваліся капіталы некалькіх асобных уласнікаў. Паколькі канцэнтрацыя вытворчасці на землях Беларусі была невысокай, іх колькасць на канец 19 ст. не перавысіла 10. У асноўным акцыянерныя таварыствы ствараліся ў сферы эксплутацыі гарадскіх камунікацый (напрыклад, бельгійскае акцыянернае таварыства “Віцебскі трамвай” з 1898 г.).

У структуры прамысловай вытворчасці пераважалі галіны, заснаваныя на перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Па аб’ёмах вытворчасці дамінавалі наступныя прамысловыя галіны:

*харчовая* (перавагу мела вінакурства);

*дрэваапрацоўчая* (пераважалі запалкавая і папярова-друкарская вытворчасць);

*тэкстыльная*;

*металаапрацоўчая* (разам з чыгуначнымі майстэрнямі);

*сілікатна-керамічная і будаўніча-рамонтная*.

У апошняй трэці 19 ст. у эканамічным жыцці Беларусі значную ролю пачалі адыгрываць *банкі*. Сярод іх вылучаліся:

1) Банкі, заснаваныя з дапамогай мясцовага капіталу: *Віленскі камерцыйны банк* з аддзяленнямі Бабруйску, Гомелі, Гродне і Слоніме; *Мінскі камерцыйны банк*; *Беластоцкі камерцыйны банк*.

2) Аддзяленні буйнейшых расійскіх банкаў: *Дзяржаўнага банка*, *Азова-Данскога банка, Пецярбургска-Азоўскага банка*.

У Беларусі, дзе пераважалі дробныя капіталістычныя і мануфактурныя прадпрыемствы, функцыяніравалі таксама невялікія банкірскія канторы, якія займаліся крэдытнымі аперацыямі па абслугоўванню дробных прамыславікоў і гандляроў. Галоўныя сферы ўкладання сродкаў для камерцыйных банкаў – гандаль, першасная апрацоўка лесу і льну.

Развіццё прамысловасці Беларусі знаходзілася пад уплывам сусветнага эканамічнага цыкла. *Эканамічныя крызісы* 1873-1875 гг. і 1881-1882 гг. прывялі да скарачэння дробнай і мануфактурнай вытворчасці, пры захаванні росту ў фабрычна-заводскай прамысловасці. У 1890-я гг. назіраецца *прамысловы ўздым*, які ахапіў амаль усе галіны вытворчасці. Падчас яго сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыі склалі 8,2%. Удзельная вага беларускай прамысловасці ў прамысловасці Расійскай імперыі склала каля 5%, колькасць рабочых – 10%.

У той жа час да пачатку 20 ст. прамысловасць не пераўтварылася ў вядучы сектар экономікі на землях Беларусі. Узровень яе развіцця быў невысокі не толькі ў параўнанні з краінамі Заходняй Еўропы, але і ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі еўрапейскай часткі Расійскай імперыі. Нягледзячы на рост фабрычна-заводскай вытворчасці, асноўная прамысловая прадукцыя выраблялася ў межах рамесна-саматужнай і дробнакапіталістычнай вытворчасці, заснаванай на перапрацоўцы мясцовай сыравіны, пры нізкім узроўні тэхнічнага забеспячэння. Асноўнымі прычынамі маруднага развіцця буйной прамысловасці з’яўляліся:

1) *Адсутнасць сыравіны, неабходнай для буйной вытворчасці*. Пераважала сельскагаспадарчая, лясная і мінеральная сыравіна, на базе якой працавалі дробныя прадпрыемствы.

2) *Адсутнасць буйных капіталаў*. Асноўныя капіталаўкладанні ў прамысловасць ажыццяўляла мясцовае яўрэйскае насельніцтва, якое было пазбаўлена правоў на валоданне зямлёй і яе нетрамі, не мела ў сваёй большасці значных сродкаў для заснавання буйных прадпрыемстваў і займалася ў асноўным рамяством. Буйны расійскі і замежны капітал лічыў для сябе больш выгадным укладанне сродкаў у гандаль і развіццё транспартнай інфраструктуры, а не ў прамысловасць.

3) *Каланіяльная палітыка царызму*, які быў зацікаўлены ў паскораным развіцці найперш цэнтральных прамысловых раёнаў і ў захаванні Беларусі як аграрнага прыдатку імперыі.

*Такім чынам, у другой палове 19 ст. мела месца істотнае развіццё прамысловай вытворчасці на землях Беларусі. Аднак у цэлым узровень яе развіцця ў агульнаеўрапейскім кантэксце быў невысокі.*

**12.4. Гарады, гандаль, транспартная сістэма.**

Істотным фактарам развіцця гарадоў, прамысловасці і гандлю на землях Беларусі ў другой палове 19 ст. стала шырокамашабнае *чыгуначнае будаўніцтва*. Яно ажыццяўлялася па ініцыятыве царскага ўрада, а таксама буйнога расійскага і мясцовага капіталу. Галоўнымі матывамі будаўніцтва з’яўляліся патрэбы інтэнсіфікацыі гандлёвых сувязяў, а таксама ваенна-стратэгічныя мэты. У 1860-1890-я гг. праз тэрыторыю Беларусі праляглі наступныя чыгункі:

*Пецярбургска-Варшаўская* (праз Гродна); пабудавана ў 1862 г.;

*Рыга-Арлоўская* (праз Дзвінск, Полацк, Віцебск); пабудавана ў 1866 г.;

*Маскоўска-Брэсцкая* (праз Смаленск, Оршу, Мінск, Баранавічы); пабудавана ў 1870-я гг.;

*Лібава-Роменская* (праз Вільню, Маладзечна, Мінск, Бабруйск, Жлобін); пабудавана ў 1871-1874 гг.;

*Гомельска-Бранская*; пабудавана ў 1877 г.;

*Палескія*: Пінск-Гомель, Беласток-Баранавічы; пабудаваныя ў 1882-1886 гг.;

*Пецярбургска-Адэская* (праз Віцебск, Оршу, Магілёў); пабудавана з канца 19 ст. да 1902 г.

На пачатку 20 ст. Беларусь сярод рэгіёнаў Расійскай імперыі была на адным з першых месцаў па насычанасці чыгункамі. Узніклі буйныя чыгуначныя вузлы: Мінск, Віцебск, Гомель, Орша, Брэст, Баранавічы.

З пачаткам будаўніцтва чыгунак пачала хутка памяншацца роля кірмашовага гандлю. Усё большае значэнне набываў стацыянарны гандаль у крамах і лаўках. Гэта сведчыла пра тое, што рыначныя сувязі беларускіх гарадоў, мястэчак і вёсак, а таксама Беларусі з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі станавіліся больш трывалымі.

У гэты час тэрыторыя Беларусі інтэгруецца ў сістэму *агульнарасійскага рынку*. Спецыялізацыя гандлю Беларусі ў дадзенай сістэме характарызавалася перавагай вывазу сельскагаспадарчай і лясной сыравіны. Разам з тым Беларусь выступала рынкам збыту прамысловых тавараў і збожжа, якія ўвозіліся з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі. Захоўваліся знешнегандлёвыя сувязі з краінамі Заходняй Еўропы, асабліва з Германіяй. Структура экспарту і імпарту прадукцыі ў цэлым не змянілася ў параўнанні з папярэднім перыядам.

У другой палове 19 ст. назіраецца рост гарадоў у Беларусі. З 1860 па 1900 гг. колькасць гарадскога насельніцтва ўзрасла з 350 да 650 тыс. чалавек. Прычынамі дадзенага росту з’яўляліся развіццё прамысловасці і гандлю,

хуткае чыгуначнае будаўніцтва, ліквідацыя прыгоннай залежнасці сялян у выніку рэформы 1861 г. Значнымі гандлёва-прамысловымі цэнтрамі сталі найперш гарады, якія выступалі галоўнымі чыгуначнымі вузламі. Буйнейшым горадам на тэрыторыі Беларусі становіцца Мінск, насельніцтва якога на 1897 г. налічвала 90 тыс. жыхароў. Узнікаюць новыя формы транспартных камунікацый: З’явіліся конна-чыгуначныя дарогі (конкі) у Мінску і Магілёве (1890-я гг.), трамвай у Віцебску (1898).

У той жа час у Беларусі не сфарміраваліся буйныя прамысловыя цэнтры з сотнямі тысяч насельніцтва, якія ў гэты час складваюцца ў Еўропе. Галоўная прычына гэтага – спецыялізацыя беларускай прамысловасці на перапрацоўцы мясцовай сыравіны, што абумовіла яе размяшчэнне ў асноўным ў сельскай мясцовасці і невялікіх мястэчках. К канцу 19 ст. толькі 31% усёй прамысловай прадукцыі выраблялася ў гарадах.

У гарадах і мястэчках у гэты перыяд пачынае фарміравацца новая сацыяльная структура, у якой дамінуючае месца займалі сацыяльныя класы індустрыяльнага грамадства: буржуазія і пралетарыят (рабочы клас).

Клас *буржуазіі* складаўся з уласнікаў гандлёвых і прамысловых капіталаў. Яго фарміраванне адбывалася з ліку дваран-прадпрымальнікаў, разбагацеўшых купцоў і мяшчан. Спецыфіка буржуазіі на беларускіх землях заключалася ў тым, што сярод яе пераважалі дробныя і сярэднія прадпрымальнікі. Буржуазія была неаднароднай па нацыянальнай прыкмеце: асноўная маса дваран-прадпрымальнікаў дэкларавала сябе рускімі або палякамі; большасць капіталістаў з ліку купцоў і мяшчан былі яўрэямі.

Клас *пралетарыяту* ўяўляе з сябе вольнанаёмных рабочых, якія пазбаўлены ўласнасці на сродкі вытворчасці і працуюць на прадпрыемствах рознага тыпу за акрэсленую заработную плату. Яго фарміраванне адбывалася за кошт збяднелых сялян, рамеснікаў і дробных гандляроў. Асаблівасцямі структуры рабочага класа Беларусі былі распыленасць па дробных прадпрыемствах, нязначная ўдзельная вага занятых на буйных фабрыках, невялікая колькасць пастаянных і кваліфікаваных рабочых. Пралетарыят таксама з’яўляўся неаднародным па нацыянальнай прыкмеце: сярод кваліфікаваных кадраў чыгуначных майстэрань і дэпо, тэлеграфістаў пераважалі рускія; у дробнай і рамеснай прамысловасці, гандлі, сферы абслугоўвання – яўрэі; на будаўніча-рамонтных работах, прамысловых прадпрыемствах у сельскай мясцовасці – беларусы.

У той жа час у сацыяльнай структуры гарадскога насельніцтва вялікую ўдзельную вагу складалі дробныя рамеснікі і гандляры, якія не належалі да асноўных класаў капіталістычнага грамадства. Гэта было вынікам панавання ў гарадах дробнай і рамесна-саматужнай прамысловасці.

*Такім чынам, у эканоміцы беларускіх зямель у другой палове 19 ст. адбываецца працэс развіцця капіталістычных таварна-грашовых адносін. Аднак да пачатку 20 ст. Беларусь заставалася аграным краем; сельская гаспадарка мела ў значнай ступені натуральны характар; у прамысловасці дамінавала дробнакапіталітычная і рамесная вытворчасць, заснаваная на перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Гэта стала вынікам захавання значных*

*фаедальных перажыткаў у сельскай гаспадарцы, адсутнасці на тэрыторыі Беларусі значных рэсурсаў і капіталаў для развіцця буйной прамысловай вытворчасці, каланіяльнай палітыкі царызму.*

**Асноўныя паняцці:**

Адмена прыгоннага права 1861 г., часоваабавязаныя сяляне, адрэзкі, выкупныя плацяжы, воласць, рэформа дзяржаўных сялян 1867 г., адпрацовачная сістэма гаспадарання ў памешчыцкіх уладаннях, капіталістычная сістэма гаспадарання ў памешчыцкіх уладаннях, сусветны аграрны крызіс 1880-1890-х гг., фабрычна-заводская прамысловасць, акцыянерныя кампаніі, камерцыйныя банкі, эканамічны крызіс, прамысловы ўздым, чыгуначнае будаўніцтва, агульнарасійскі рынак, буржуазія, пралетарыят.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія прычыны штурхнулі царскі ўрад на правядзенне аграрнай рэформы 1861 г.?
2. Растлумачце, чаму царскі ўрад вырашыў пачаць правядзенне аграрнай рэформы з губерняў Беларусі і Літвы?
3. Якія асноўныя накірункі змяшчала ў сабе аграрная рэформа 1861 г.?
4. Што азначае паняцце “часоваабавязаныя сяляне”? Чаму царскі ўрад імкнуўся павялічыць тэрмін залежнасці сялян ад памешчыкаў?
5. Растлумачце, з якой мэтай падчас рэформы 1861 г. ажыццяўляліся адрэзкі сялянскай зямлі на карысць памешчыкаў?
6. На якіх умовах ажыццяўляўся выкуп сялянамі зямлі ва ўласнасць? З якой мэтай дзяржава выступіла пасярэднікам паміж памешчыкамі і сялянамі падчас выкупной здзелкі?
7. Які характар мела створаная ў выніку рэформы 1861 г. сістэма сялянскага самакіравання? Наколькі значнай была ступень яе самастойнасці?
8. Растлумачце, чаму адмена прыгоннага права ў Беларусі прайшла на больш выгадных для сялянства ўмовах у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. Якія саступкі ў адносінах да сялянства былі праведзены царызмам у 1863-1864 гг.?
9. Вызначце сутнасць і характар аграрнай рэформы 1861 г. Паразважайце над тым, якія яна змяшчала ў сабе наступствы для далейшага эканамічнага развіцця краю.
10. Якую структуру мела землеўладанне на землях Беларусі ў другой палове 19 ст.? Растлумачце значную перавагу тут буйнога памешчыцкага землеўладання.
11. Якія фактары спрыялі развіццю рынковых адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі ў другой палове 19 ст.? У чым выяўлялася дадзенае развіццё?
12. Параўнайце асаблівасці капіталістычнай і адпрацовачнай форм гаспадарання ў памешчыцкіх уладаннях. Якая з гэтых форм у большай ступені спрыяла ўцягванню сельскай гаспадаркі ў рыначныя адносіны?

13. Якую ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі меў сусветны аграрны крызіс 1880-1890-х гг.? Якім чынам змянілася ў выніку крызісу спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі?
14. Растлумачце, чаму ў выніку аграрнага крызісу 1880-1890-х гг. адбываецца разарэнне значнай колькасці памешчыцкіх гаспадарак, якія выкарыстоўвалі адпрацовачныя формы гаспадарання і ўмацоўваецца капіталістычная сістэма гаспадарання ў памешчыцкіх маёнтках.
15. Укажыце фактары, якія тармазілі працэс развіцця капіталістычных рыначных адносін у сельскай гаспадарцы.
16. Растлумачце прычыны хуткага развіцця фабрычна-заводскай вытворчасці ў канцы 19 ст. Чаму большасць фабрык на тэрыторыі Беларусі былі адносна невялікімі?
17. Назавіце найбольш буйныя прамысловыя прадпрыемствы, якія ўзніклі ў Беларусі ў другой палове 19 ст.?
18. Што такое акцыянерныя кампаніі? Якую ролю яны мелі ў развіцці прамысловасці Беларусі ў другой палове 19 ст.?
19. Які характар мела структура прамысловасці Беларусі другой паловы 19 ст.? Паспрабуйце вызначыць абумоўленасць такой структуры.
20. Якую ролю ў эканамічным развіцці Беларусі адыгрывалі банкі? Растлумачце, чаму банкаўскі капітал лічыў за лепшае ўкладваць сродкі ў гандаль і першасную апрацоўку сыравіны, а не ў развіццё прамысловасці.
21. Паспрабуйце растлумачыць, чаму царскі ўрад не быў зацікаўлены ў развіцці буйной прамысловасці на землях Беларусі.
22. Якую ролю ў развіцці прамысловасці і гандлю Беларусі мела чыгуначнае будаўніцтва другой паловы 19 ст.? Назавіце асноўныя пабудаваныя чыгункі.
23. Якім чынам і чаму будаўніцтва чыгунак абумовіла змены ў структуры гандлю на тэрыторыі Беларусі?
24. Які характар мела спецыялізацыя Беларусі ў сістэме агульнарасійскага рынку?
25. Вызначце прычыны росту гарадскога насельніцтва ў другой палове 19 ст. Якія гарады развіваліся найбольш значнымі тэмпамі?
26. Ці можна весці гаворку пра фарміраванне на землях Беларусі буйных індустрыяльных цэнтраў? Чым можна патлумачыць дадзеную сітуацыю?
27. Якія новыя сацыяльныя класы фарміруюцца ў беларускіх гарадах і мястэчках у другой палове 19 ст.?
28. Паспрабуйце вызначыць узровень развіцця эканомікі Беларусі ў другой палове 19 ст. у цэлым і растлумачце прычыны гэтага.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Падрыхтоўка і ажыццяўленне аграрнай рэформы 1861 г. у Беларусі.
2. Сялянскае пытанне і паўстанне 1863-1864 гг.
3. Фарміраванне сістэмы сялянскага самакіравання.
4. Рэгіянальная спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці ў Беларусі ў другой палове 19 ст.
5. Сусветны аграрны крызіс 1880-1890-х гг. і Беларусь.

6. Развіццё фабрычна-заводскай прамсловасці ў Беларусі ў другой палове 19 ст.
7. Чыгуначнае будаўніцтва ў Беларусі ў другой палове 19 ст.
8. Змены ў беларускім горадзе другой паловы 19 ст.

## Тэма 13: Сацыяльна-палітычнае жыццё Беларусі ў другой палове 19 ст.

**1. Паўстанне 1863 г.: перадумовы, ход, вынікі.**
**2. Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці 19 ст.**
**3. Грамадска-палітычны рух ў апошняй трэці 19 ст.**
**4. Фарміраванне рабочага руху ў апошняй трэці 19 ст.**

### 13.1. Паўстанне 1863 г.: перадумовы, ход, вынікі.

З сярэдзіны 19 ст. у палітыцы царызму выявіліся некаторыя змены. Паражэнне Расійскай імперыі ў Крымскай вайне 1853-1856 гг. абазначыла эканамічную і тэхнічную адсталасць Расіі ў параўнанні з развітымі заходнееўрапейскімі дзяржавамі. Кіруючыя колы імперыі ўсведамляюць неабходнасць правядзення рэформ у розных сферах грамадскага жыцця, накіраваных на мадэрнізацыю грамадства, вынікам чаго стала адмена прыгоннага права ў 1861 г.

Правядзенне рэформ выклікала некаторую лібералізацыю грамадска-палітычнага жыцця ў Расійскай імперыі, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі. Яна звязвалася з пачаткам царавання новага імператара *Аляксандра II* (1855 – 1881). У першыя гады яго праўлення была праведзена амністыя палітычных зняволеных, якая распаўсюджвалася на былых дзекабрыстаў, удзельнікаў паўстання 1830-1831 гг. і г.д., былі некалькі паслаблены цэнзура, абмежаванні ў адносінах да нацыянальных і канфесійных меншасцяў.

Падобныя мерапрыемствы выклікалі ўздым грамадскай актыўнасці ў былым Каралеўстве Польскім і на землях былога ВКЛ. Пачынаючы з 1860 г. у Варшаве і іншых польскіх гарадах перыядычна адбываюцца *патрыятычныя маніфестацыі*, прысвечаныя памяці знакамітых палякаў ці прымеркаваныя да нацыянальных памятных дат. У хуткім часе падобныя акцыі праводзяцца і ў гарадах на землях былога ВКЛ. Асноўнымі ўдзельнікамі маніфестацый былі інтэлігенцыя, студэнцкая і вучнёўская моладзь, каталіцкае духавенства, прадстаўнікі сярэдніх слаёў польскамоўнага гарадскога насельніцтва. У грамадскай думцы ўзнікаюць спадзяванні на аднаўленне аўтаноміі Каралеўства Польскага.

На мяжы 1850-1860-х гг. аўтанамісцкія настроі актывізуюцца і сярод грамадскай эліты на землях былога ВКЛ. Цэнтрам руху за аўтаномію дадзеных зямель сталі *Віленскі музей старажытнасцяў* і створаная пры ім Археалагічная камісія (створаны ў 1855 г.). Найбольш актыўнымі дзеячамі названага руху з'яўляліся *Адам Кіркор*, *Яўстахій і Канстанцін Тышкевічы, Міхал Балінскі, Тэадор Нарбут*. Ідэйным выразнікам руху стаў часопіс "*Віленскі партфель*" (рэдактар – А. Кіркор), які выдаваўся з канца 1850-х гг.

Палітычным адлюстраваннем дзейнасці дадзенага руху сталі праекты рэфармавання грамадства, адрасаваныя расійскаму імператару Аляксандру II.

Аднак царскі ўрад адмаўляў ідэю палітычнай аўтаноміі як зямель былога ВКЛ, так і Польшчы. На мяжы 1850-1860-х гг. палітыка частковых саступак мясцовым элітам спалучалася з рэпрэсіямі ў адносінах да ўдзельнікаў польскага нацыянальнага руху. Так, у красавіку 1861 г. у Варшаве была расстраляна дэманстрацыя, у выніку чаго загінула больш за 100 чалавек. Няздольнасць царскага ўрада вырашыць "польскае пытанне" садзейнічала радыкалізацыі грамадскага руху ў Польшчы і на землях былога ВКЛ, у выніку чаго ў 1861-1863 гг. адбываецца фарміраванне сеткі падпольных арганізацый польскага нацыянальна-вызваленчага руху, якія ставілі сваёй мэтай аднаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай шляхам паўстання.

У межах польскага нацыянальна-вызваленчага руху ў гэты перыяд вылучаліся дзве плыні: *белыя* і *чырвоныя*.

| Назва плыні | Асноўныя арганізацыі | Лідэры плыні | Сацыяльны склад | Праграма нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва | Сацыяльна-палітычная праграма | Метады рэалізацыі мэтаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Белыя | Гарадская дэлегацыя і Дырэкторыя ў Варшаве | Анджэй Замойскі Леапольд Кроненберг Якуб Гейштар | буйныя зе-млеўласнікі, купцы, частка інтэлігенцыі, каталіцкае духавенства | аднаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як нацыянальнай польскай дзяржавы | дэмакратычная рэспубліка з захаваннем прывілеяў для шляхты; захаванне ў асноўным існуючай сацыяльна-эканамічнай сістэмы | арыентацыя на кампраміс з царызмам або на дапамогу замежных дзяржаў – Англіі і Францыі |
| Чырвоныя | Цэнтральны нацыянальны камітэт у Варшаве | Яраслаў Дамброўскі Канстанцін Каліноўскі Валерый Урублеўскі | дробная і сярэдняя шляхта, частка інтэлігенцыі, студэнцкая і вучнёўская моладзь, часткова каталіцкае духавенства | аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. як федэрацыі Польшчы з землямі Беларусі, Літвы, Украіны | дэмакратычная рэспубліка з роўнымі правамі для прадстаўнікоў усіх сацыяльных слаёў насельніцтва; правядзенне радыкальнай аграрнай рэформы | арыентацыя на арганізацыю ўсенароднага масавага паўстання з удзелам усіх слаёў насельніцтва |

Летам 1862 г. у Вільні з мэтай падрыхтоўкі да паўстання ў краі быў створаны *Літоўскі правінцыйны камітэт* (ЛПК). Фармальна ён быў падначалены Цэнтральнаму нацыянальнаму камітэту ў Варшаве. У ЛПК уваходзілі прадстаўнікі як "чырвоных" так і "белых", аднак перавага належала "чырвоным" на чале з *Канстанцінам Каліноўскім*. ЛПК займаўся стварэннем мясцовых падпольных арганізацый, зборам грошай і зброі для арганізацыі паўстання, правядзеннем прапаганды сярод насельніцтва. Друкаванымі выданнямі ЛПК былі падпольныя газеты "*Мужыцкая праўда*" (на беларускай мове, выйшла 7 нумароў) і "*Сцяг свабоды*" (на польскай мове,

выйшлі 3 нумары). Выданне беларускамоўнай “Мужыцкай праўды” было абумоўлена імкненнем “чырвоных” да шырокага прыцягнення беларускага сялянства да паўстання ва ўмовах уздыму сялянскага руху пасля аграрнай рэформы 1861 г. На старонках дадзенага выдання шырока асвятлялася сацыяльная праблематыка, асуджаліся метады правядзення аграрнай рэформы царскім урадам.

У студзені 1863 г. у Польшчы пачалося *ўзброенае паўстанне*. Цэнтральны нацыянальны камітэт 22 студзеня 1863 г. абвясціў сябе *Часовым нацыянальным урадам* і выдаў Маніфест, у якім змяшчаўся заклік да паўстання, абвяшчаліся аднаўленне Рэчы Паспалітай, свабода і роўнасць усіх грамадзян незалежна ад сацыяльнага і нацыянальнага паходжання. Да Маніфеста далучаліся два зямельныя дэкрэты, паводле якіх прадугледжваліся скасаванне ўсіх феадальных павіннасцей для сялян, пераход ва ўласнасць сялян надзелаў, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, надзяленне беззямельных сялян невялікімі надзеламі за кошт дзяржаўных маёнткаў.

У хуткім часе паўстанне распаўсюдзілася на землі Беларусі і Літвы. 1 лютага 1863 г. ЛПК выдаў адозву да насельніцтва з заклікам падтрымаць паўстанне, абвясціў аб падпарадкаванні Часоваму нацыянальнаму ўраду ў Польшчы і аб падтрымцы яго праграмы. ЛПК быў пераўтвораны ў *Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі* на чале з К. Каліноўскім. Да вясны 1863 г. на тэрыторыі Літвы, а таксама заходняй і цэнтральнай часткі Беларусі былі створаны падпольныя органы ўлады і паўстанцкія атрады. Пачаліся сутычкі паўстанцкіх атрадаў з царскімі войскамі і паліцыяй.

Асноўную масу паўстанцаў складалі прадстаўнікі дробнай і сярэдняй шляхты, студэнцкая і вучнёўская моладзь. Каля 20% паўстанцаў складалі *касінеры*. Арганізатары паўстання спрабавалі пашырыць яго геаграфію на ўсход і поўнач: у красавіку 1863 г. паўстанцкі атрад на чале з Л. Звяждоўскім пры падтрымцы студэнтаў мясцовага земляробчага інстытута на адзін дзень заняў Горкі; напрыканцы красавіка атрад на чале з З. Серакоўскім спрабаваў ажыццявіць рэйд на тэрыторыю Латвіі, аднак быў разбіты расійскімі войскамі ў бітве каля Біржаў. Вясна 1863 г. стала часам найбольшага ўздыму паўстання. 8 мая 1863 г. каля в. Мілавіды адбыўся буйнейшы бой паміж паўстанцамі і расійскімі войскамі.

Ход паўстання суправаджаўся суперніцтвам у лагеры паўстанцаў паміж “чырвонымі” і “белымі”. У студзені-сакавіку 1863 г. перавага ў кіраўніцтве паўстаннем належала “чырвоным”. У сакавіку 1863 г. вядучая роля пераходзіць да “белых”. Адлюстраваннем гэтага стала замена Часовага правінцыйнага ўрада Літвы і Беларусі на чале з К. Каліноўскім *Аддзелам кіравання правінцыямі Літвы* на чале з прадстаўніком “белых” *Якубам Гейштарам*. З чэрвеня 1863 г. перавага ізноў пераходзіць да “чырвоных”; у ліпені Аддзел кіравання правінцыямі Літвы ўзначальвае К. Каліноўскі.

На падаўленне паўстання царскія ўлады накіравалі 200-тысячнае войска. У маі 1863 г. віленскім генерал-губернатарам быў прызначаны *М.Мураўёў*, які атрымаў за сваю жорсткасць мянушку “Вешальнік”. Адміністрацыя М. Мураўёва праводзіла, з аднаго боку, рэпрэсіі супраць паўстанцаў, з

другога, шырока выкарыстоўвала сацыяльную дэмагогію з мэтай прыцягнення на свой бок сялянства. Афіцыйная прапаганда сцвярджала, што паўстанне арганізавалі польскія паны з мэтай аддзялення ад Расіі, каб аднавіць прыгоннае права. Таксама шырока выкарыстоўваўся рэлігійны фактар: абвяшчалася, што паўстанцы-католікі імкнуцца знішчыць праваслаўе ў краі. Па ініцыятыве адміністрацыі М. Мураўёва былі перагледжаны ўмовы аграрнай рэформы 1861 г. на карысць сялян.

Дадзеная палітыка прынесла свае вынікі. Да восені 1863 г. паўстанцкія атрады на тэрыторыі Беларусі былі ліквідаваны; да канца года спынілася партызанская дзейнасць на тэрыторыі Літвы. Летам 1864 г. паўстанне было задушана на тэрыторыі Польшчы. На тэрыторыі Беларусі апошняя падпольная арганізацыя была ліквідавана летам 1864 г. у Навагрудку. Некаторыя ўдзельнікі паўстання эмігравалі.

Падаўленне паўстання суправаджалася жорсткімі рэпрэсіямі супраць яго ўдзельнікаў. У Літве і Беларусі 128 чалавек, у тым ліку К. Каліноўскі, былі пакараны смерцю, больш як 850 сасланы на катаргу, больш як 760 аддадзена ў арыштанцкія роты, 12,5 тыс. чалавек выселена. Сядзібы рэпрэсіраваных і эміграваўшых удзельнікаў паўстання разбураліся, а маёмасць канфіскоўвалася.

*Да ліку асноўных прычын паражэння паўстання належаць*:

1) Слабая матэрыяльна-тэхнічная і арганізацыйная падрыхтоўка паўстання; адсутнасць скаардынаванага кіраўніцтва паўстаннем і наяўнасць сур’ёзных рознагалоссяў у межах паўстанцкай улады.

2) Істотная перавага царызму ў матэрыяльных і людскіх рэсурсах ў параўнанні з польскай паўстанцкай уладай.

3) Вузкасць сацыяльнай базы паўстання. Асноўную масу паўстанцаў складала дробная і сярэдняя шляхта. Сялянства пераважна было настроена ў адносінах да паўстання індыферэнтна або варожа, што тлумачылася абмежаванасцю аграрнай праграмы паўстанцкіх уладаў.

4) Неўмяшанне заходніх дзяржаў у ход узброенай барацьбы, на што спадзяваліся паўстанцы.

Характар паўстання выклікае розныя ацэнкі гісторыкаў. Сярод іх можна вылучыць два асноўныя падыходы:

1) паўстанне 1863-1864 гг. па сваёй сутнасці было *буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй*, паколькі было накіравана супраць самадзяржаўя, рэштка ў прыгонніцтва і саслоўнай няроўнасці, тым самым імкнулася да стварэння ўмоў для больш хуткага развіцця капіталістычных адносін у эканоміцы і дэмакратызацыі палітычнай сістэмы;

2) паўстанне 1863-1864 гг. па сваёй сутнасці было *шляхецкім нацыянальна-вызваленчым паўстаннем*, галоўнай мэтай якога было аднаўленне Рэчы Паспалітай у форме або нацыянальнай польскай дзяржавы або федэрацыі Польшчы і Літвы-Беларусі; планы сацыяльных пераўтварэнняў, хаця і прысутнічалі ў праграмах паўстанцаў, аднак не мелі ў іх вызначальнай ролі.

## 13.2. Палітыка царызму на тэрыторыі Беларусі ў апошняй трэці 19 ст.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. у палітыцы царызму на тэрыторыі Беларусі ўзмацняецца рэпрэсіўная скіраванасць. Галоўнай мэтай мерапрыемстваў, праводзімых царскімі ўладамі з'яўляецца паслядоўная русіфікацыя краю. Можна вылучыць асноўныя накірункі палітыкі царызму ў апошняй трэці 19 ст.:

1) *Русіфікацыя землеўладання*: Адбылася канфіскацыя зямельных уладанняў удзельнікаў паўстання, якія па сімвалічных коштах прадаваліся расійскім чыноўнікам. У той жа час землеўладальнікам каталіцкага веравызнання забаранялася купляць і арандаваць зямлю, а для сялян-католікаў устанаўлівалася максімальная норма зямельнай мёмасці – 60 дзесяцін на адну гаспадарку. У выніку ў структуры памешчыцкага землеўладання істотна ўзрасла ўдзельная вага расійскіх уладальнікаў. Хаця ў цэлым па-ранейшаму колькасна пераважала мясцовае "польскае" землеўладанне.

2) *Русіфікацыя адміністрацыйнай сістэмы*: Пасля паўстання адбылася "чыстка" мясцовага адміністрацыйнага апарату. Многія мясцовыя кадры пераводзіліся на працу ў цэнтральныя расійскія губерні, а на іх месца запрашаліся расійскія чыноўнікі.

3) *Аднаўленне палітыкі "разбору шляхты".*

4) *Дыскрымінацыйная палітыка ў дачыненні рымска-каталіцкай царквы*: Былі зачынены ўсе каталіцкія кляштары, а таксама многія касцёлы. Некаторыя касцёлы пераўтвараліся ў праваслаўныя храмы. У некаторых мясцовасцях адбываліся спробы прымусовага пераводу католікаў у праваслаўе. Адначасова разгарнулася масавае будаўніцтва праваслаўных храмаў. Праваслаўная царква атрымлівала ад дзяржавы вялікую матэрыяльную і маральную падтрымку.

5) *Дыскрымінацыйная палітыка ў адукацыйнай сферы*: У 1864 г. быў зачынены Горы-Горацкі земляробчы інстытут за падтрымку студэнтамі паўстання. Скарацілася колькасць сярэдніх і пачатковых навучальных устаноў. За тымі адукацыйнымі ўстановамі, што засталіся, быў узмоцнены паліцэйскі і царкоўны кантроль. Адзінай мовай выкладання ў школах прызнаецца руская.

6) *Узмацненне ідэалагічнай працы сярод насельніцтва*: Умацоўваецца ідэалогія *заходнерусізму*, цэнтрамі прапаганды якой выступаюць праваслаўная царква, школа і афіцыйны друк. З мэтай абгрунтавання "гістарычных правоў" Расіі на беларускія землі ажыццяўляюцца шматлікія археаграфічныя, этнаграфічныя, археалагічныя і інш. даследаванні.

У выніку праведзеных мерапрыемстваў узмацніўся рэпрэсіўны характар дзяржаўнай улады, умацаваліся пазіцыі рускага дваранства і чыноўніцтва ў розных сферах грамадскага жыцця Беларусі. Уплыў польскай шляхты значна зменшыўся ў сістэме адміністрацыі і культуры, аднак яна захавала дастаткова моцныя пазіцыі ў сферы землеўладання.

У агульнаімперскім маштабе палітыка ўрада цара Аляксандра II была накіравана на захаванне абсалютысцкай сістэмы; аднак, пры гэтым лічылася неабходным некалькі прыстасаваць яе да новых сацыяльна-эканамічных умоў. У сувязі з гэтым у 1860-1870-я гг. быў праведзены шэраг рэформ у розных сферах грамадскага жыцця. На тэрыторыі Беларусі, улічваючы абставіны, якія там склаліся пасля паўстання 1863-1864 гг., дадзеныя рэформы былі праведзены са спазненнем і не ў поўным аб'ёме. Сярод рэформ вылучаюцца наступныя:

1) *Земская рэформа 1864 г.* Паводле яе ў губернях і паветах ствaралася сістэма органаў мясцовага самакіравання – губернскія і павятовыя земствы з прадстаўнікоў розных саслоўяў, якія займаліся пытаннямі мясцовай гаспадаркі, аховы здароўя, народнай адукацыі і г.д. На тэрыторыі Беларусі дадзеная рэформа не была праведзена да 1911 г.

2) *Гарадская рэформа 1870 г.* На тэрыторыі Беларусі праведзена ў 1876 г. Паводле яе, у гарадах ствараліся ўсесаслоўныя органы грамадскага самакіравання – *гарадскія думы* і *гарадскія ўправы*. Выбары праходзілі на аснове *маёмаснага цэнзу*. У беларускіх гарадах, дзе большасць насельніцтва складалі "іншаверцы" – яўрэі, былі ўведзены абмежаванні для гэтай катэгорыі гараджан. Яны мелі права займаць толькі 1/3 частку месцаў у органах гарадскога самакіравання, а паводле Гарадавога палажэння 1892 г. – толькі 1/10 частку. У распараджэнні гарадскіх дум і ўпраў былі пытанні развіцця прамысловасці і гандлю; арганізацыі адукацыі і медыцынскага абслугоўвання; утрымання пажарнай аховы, паліцыі і казармаў. Думы і ўправы не мелі органаў выканаўчай улады і падпарадкоўваліся губернатарам і міністру ўнутраных спраў.

3) *Судовая рэформа 1864 г.* Паводле яе, ліквідаваліся саслоўныя суды і ствараліся новыя ўсесалоўныя органы судовай улады:

*судовыя палаты* – разглядалі апеляцыі і займаліся палітычнымі справамі, абслугоўвалі некалькі губерняў;

*акруговыя суды* – дзейнічалі на ўзроўні губерні;

*міравыя суды* – дзейнічалі на ўзроўні павета.

*Суд станавіўся адкрытым, публічным і незалежным ад урада.* Ствараўся інстытут *адвакатуры* і *прысяжных засядацеляў*, а для засведчання розных юрыдычных актаў уводзілася пасада *натарыуса*. Усе справы разглядаліся ў прысутнасці абвінавачанага, сведкаў і публікі, друкаваліся ў газетах. На тэрыторыі Беларусі судовая рэформа пачалася ў 1872 г. з увядзеннем міравых судоў. Акруговыя суды, пракуратура і інстытут прысяжных засядацеляў былі створаны толькі ў 1882 г. У адрозненне ад расійскіх губерняў, дзе суддзяў выбіралі земствы, на беларускіх землях яны прызначаліся міністэрствам юстыцыі.

4) *Ваенная рэформа 1874 г.* Паводле яе, адмянялася сістэма рэкруцкіх набораў. Была ўведзена *абавязковая вайсковая павіннасць* для ўсіх асоб мужчынскага полу, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Уводзіўся скарочаны тэрмін службы: для сухапутных войскаў – 6 гадоў службы і 9 гадоў запасу,

для флоту 7 гадоў службы і 3 гады запасу. Для асоб, якія мелі адукацыю, тэрмін службы значна скарачаўся.

5) *Адукацыйная рэформа 1864 г.* Адукацыйная сістэма набывала ўсесаслоўны характар. Асновай сярэдняй адукацыі станавіліся гімназіі, якія дзейнічалі на платнай аснове. У сістэме пачатковай адукацыі грамадскім арганізацыям і прыватным асобам дазвалялася па ўзгадненні з уладамі адкрываць народныя 4-класныя вучылішчы.

Рэформы 1860-1870-х гг. у пэўнай ступені садзейнічалі развіццю капіталістычных адносін і фарміраванню элементаў грамадзянскай супольнасці. На тэрыторыі Беларусі яны мелі абмежаваны эфект у выніку дзеяння тут рэжыму выключных законаў.

Падчас царавання наступніка Аляксандра ІІ *Аляксандра ІІІ* (1881-1894) і ў першыя гады царавання *Мікалая ІІ* (1894-1917) у палітыцы расійскіх улад узмацняецца рэакцыйны накірунак. У 1880-1890-я гг. ажыццяўляецца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне абсалютысцкай дзяржаўнай улады і прывілеяванага становішча дваранства. Дадзеныя мерапрыемствы атрымалі назву *контррэформы*:

1) *Судовыя контррэформы 1887-1889 гг.* Паводле іх, быў зменены цэнз для выбрання прысяжных засядацеляў у судзе з мэтай павелічэння колькасці прадстаўнікоў ад дваран. Заканадаўча замацоўваліся канфіскацыя шэрагу судовых спраў (асабліва тых, якія датычылі супраціўлення ўладам) з вядзення суда прысяжных і абмежаванне публічнасці судоў.

*2) Закон аб земскіх начальніках 1889 г.* Паводле яго, скасоўваўся інстытут міравых судоў. Замест іх судовая ўлада ў паветах у адносінах да сялянства ажыццяўлялася *земскімі начальнікамі*, якія прызначаліся з ліку мясцовага дваранства. Інстытут земскіх начальнікаў быў уведзены ў Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай губернях у 1900 г. У Віленскай і Гродзенскай губернях ён не ўводзіўся, паколькі сярод мясцовага дваранства пераважала каталіцкая шляхта, якой царскі ўрад не аказваў даверу.

3) *“Цыркуляр аб кухарчыных дзецях” 1887 г.* Паводле яго, аднаўляліся элементы саслоўнасці ў сярэдняй школе. Забараняўся прыём у гімназіі дзяцей асобных катэгорый насельніцтва: фурманаў, прачак, дробных крамнікаў і г.д.

4) *Гарадская контррэформа 1892 г.* Паводле яе, ніжэйшыя слаі гарадскога насельніцтва адхіляліся ад удзелу ў выбарах у органы гарадскога самакіравання; абмяжоўвалася прадстаўніцтва ў думах і управах яўрэяў.

*Такім чынам, у апошняй трэці 19 ст. палітыка царызму была накіравана перадусім на ўмацаванне абсалютысцка-бюракратычнай дзяржаўнай сістэмы. На землях Беларусі спецыфіка дадзенай палітыкі праяўлялася ў арыентацыі на паслядоўную русіфікацыю краю з дапамогай рэжыму выключных законаў, устаноўленага пасля падаўлення паўстання 1863-1864 гг.*

### 13.3. Грамадска-палітычны рух ў апошняй трэці 19 ст.

Падаўленне паўстання 1863-1864 гг. прывяло да заняпаду грамадска-палітычнага руху на тэрыторыі Беларусі. Значна ўзмацняюцца паліцэйскі

кантроль у грамадскім жыцці і цэнзура. На тэрыторыі Беларусі адсутнічалі незалежныя ад дзяржавы грамадскія арганізацыі і перыядычныя выданні (да 1886 г.). У асяроддзі каталіцкай шляхты адбываецца заняпад ідэй польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Пануючымі становяцца погляды аб неабходнасці супрацоўніцтва з царызмам.

У першае дзесяцігоддзе пасля падаўлення паўстання 1863-1864 гг. на тэрыторыі Беларусі адсутнічалі арганізацыі, якія б дэкларавалі барацьбу з царызмам. Іх адраджэнне адбываецца з сярэдзіны 1870-х гг. У аснову ідэалогіі гэтых арганізацый былі пакладзены ідэі *сацыяльнай рэвалюцыі*. Галоўнымі накірункамі рэвалюцыйнага руху ў апошняй чвэрці 19 ст. становяцца народніцтва і марксізм.

*Народніцтва* – агульнарасійскі грамадскі рух апошняй трэці 19 – пачатку 20 стст. Дадзены рух сфарміраваўся ў асяроддзі апазіцыйна настроенай інтэлігенцыі. Абагульнена вылучаюць два асноўныя тыпы народніцтва:

- рэвалюцыйнае народніцтва;
- ліберальнае народніцтва.

Ідэалогія *рэвалюцыйнага народніцтва* грунтавалася на палітычных тэорыях расійскіх радыкальных палітычных дзеячаў сярэдзіны – другой паловы 19 ст. – *А. Герцэна, М. Бакуніна, М. Чарнышэўскага, П. Лаўрова*. Сацыяльны ідэал рэвалюцыйнага народніцтва – *сацыялізм*, пад якім разумеецца грамадскі лад, заснаваны на панаванні калектыўнай уласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці. Магчымасць пераходу да сацыялізму бачылася ў наяўнасці для гэтага аб’ектыўных сацыяльна-эканамічных перадумоў. Пад гэтым разумелася існаванне такога сялянскай абшчыны, у функцыянаванні якой змяшчаліся элементы сацыялізму (традыцыі абшчыннага самакіравання, перыядычныя перадзелы зямлі). Капіталізм разглядаўся рэвалюцыйнымі народнікамі як штучнае ўтварэнне, якое насаджаецца дзяржаўнай уладай для павелічэння даходаў кіруючай эліты. Пераход да сацыялістычнага грамадства звязваўся з народнай рэвалюцыяй, якая павінна знішчыць самадзяржаўе, устанавіць дэмакратычны палітычны лад і стварыць умовы для вырашэння карэнных сацыяльных пытанняў. У падрыхтоўцы рэвалюцыі галоўнай рухаючай сілай павінна стаць прагрэсіўная інтэлігенцыя.

Шырокае распаўсюджанне рэвалюцыйна-народніцкага руху сярод інтэлігенцкай моладзі ў гарадах Расійскай імперыі адносіцца да 1870-х гг. Асноўным метадам дзейнасці рэвалюцыйных народнікаў першапачаткова з’яўлялася “*хаджэнне ў народ*” – правядзенне прапагандысцкай працы сярод народных мас пад выглядам сельскіх спецыялістаў, вандроўнікаў і г.д. з мэтай пазбаўлення народа ад ўкаранёных сацыяльных стэрэатыпаў і забабонаў, распаўсюджання крытычных адносін да рэчаіснасці і такім чынам падрыхтоўкі да рэвалюцыйных дзеянняў. У 1876 г. з некалькіх рэвалюцыйна-народніцкіх гурткоў утварылася арганізацыя “*Зямля і воля*”. У другой палове 1870-х гг. гурткі “Зямлі і волі” ўзнікаюць у буйнейшых гарадах Беларусі. У іх уваходзілі пераважна прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі шляхецкага або мяшчанскага паходжання.

“Хаджэнне ў народ” скончылася няўдачай: сяляне не зразумелі ў ідэй рэвалюцыянераў, а царызм узмацніў рэпрэсіі. У выніку сярод рэвалюцыйных народнікаў узніклі рознагалоссі, якія завяршыліся расколам “Зямлі і волі” на дзве арганізацыі – “*Чорны перадзел*” (1879 – 1881 гг.) і “*Народную волю*” (1879 – 1882 гг.). “Чорны перадзел” працягваў традыцыі “Зямлі і волі” (арыентацыя на правядзенне актыўнай асветніцка-прапагандысцкай дзейнасці інтэлігенцыі сярод народных мас). Прадстаўнікі “Народнай волі” імкнуліся наблізіць сацыяльную рэвалюцыю шляхам тэрарыстычных актаў супраць носьбітаў дзяржаўнай улады.

На тэрыторыі Беларусі большасць рэвалюцыйна-народніцкіх гурткоў далучыліся да “Чорнага перадзелу”. У Мінску была заснавана цэнтральная друкарня арганізацыі і некаторы час тут знаходзілася кіраўніцтва “Чорнага перадзелу” на чале з *Г. Пляханавым* і *А. Бонч-Асмалоўскім*. Аднак у 1881 г. гурткі чорнапераздзельцаў былі выкрыты паліцыяй; многія іх дзеячы зняволены, а кіраўнікі на чале з Г. Пляханавым апынуліся ў эміграцыі. З гэтага моманту ўзрастае ўплыў “Народнай волі”. У 1882 г. была створана “*Паўночна-Заходняя арганізацыя Народнай волі*” з цэнтрам у Вільні. Кульмінацыйным момантам дзейнасці “Народнай волі” забойства цара Аляксандра II *1 сакавіка 1881 г.* Тэрарыстычны акт здзейсніў выхадзец з Беларусі *Ігнат Грынявіцкі*. У выніку царскіх рэпрэсій на працягу 1881 – 1882 гг. арганізацыі “Народнай волі” былі разгромлены.

У 1880-х – першай палове 1890-х гг. рэвалюцыйнае народніцтва перажывала заняпад ва ўмовах узмацнення рэпрэсій. Дзейнічалі нешматлікія гурткі рэвалюцыйна-народніцкай арыентацыі ў беларускіх гарадах, пераважна сярод вучнёўскай моладзі, а таксама сярод беларускіх студэнтаў у Пецярбургскім універсітэце.

Сярод апошніх фарміруюцца ідэі аб неабходнасці спалучэння задач сацыяльнай рэвалюцыі з вырашэннем беларускага нацыянальнага пытання. У 1884 г. у Пецярбургу ўзнікае *Беларуская сацыял-рэвалюцыйная група “Гоман”*, якую ўзначальвалі беларускія студэнты А.Марчанка, Х.Ратнер, М.Стацкевіч, У.Крупскі. Група выдавала часопіс з аднайменнай назвай (выйшлі 2 нумары). Гоманаўцы лічылі неабходным аб’яднаць усе рэвалюцыйныя сілы Расійскай імперыі для звяржэння самадзяржаўя. Яны ўпершыню ў гісторыі Беларусі заявілі аб існаванні самастойнай беларускай нацыі. Зыходзячы з прынцыпу раўнапраўя ўсіх народаў, гоманаўцы абвяшчалі права беларускага народа на нацыянальную дзяржаўнасць. У сваёй праграме яны лічылі неабходным пераўтварэнне Расійскай імперыі ў федэрацыю самастойных рэспублік, адной з якіх павінна стаць Беларусь. Гоманаўцы спрабавалі абвясціць сябе цэнтрам усіх народніцкіх арганізацый Беларусі, але стварыць адзіную арганізацыю не здолелі. У выніку царскіх рэпрэсій група “Гоман” спыніла сваё існаванне.

У другой палове 1890-х гг. назіраецца адраджэнне рэвалюцыйна-народніцкага руху. У 1901 – 1902 гг. у выніку аб’яднання рэвалюцыйна-народніцкіх гурткоў у Расійскай імперыі ўзнікае *Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (ПСР). На працягу 1902 – 1904 гг. арганізацыі партыі

аформіліся ў большасці значных гарадоў Беларусі і Літвы. У 1904 г. адбылося іх аб'яднанне ў *Паўночна-Заходнюю абласную арганізацыю ПСР*.

Ва ўмовах крызісу рэвалюцыйнага народніцтва ў 1880-1890-я гг. фарміруецца г. зв. *ліберальнае народніцтва*. Яго асноўныя ідэйна-тэарэтычныя палажэнні:

– ідэя мірнага эвалюцыйнага пераўладкавання грамадства ў дэмакратычным накірунку;

– сцвярджэнне ў якасці ідэалу сацыяльнага ўладкавання гарманічнага спалучэння свабоды асобы і грамадскай салідарнасці;

– абвяшчэнне інтэлігенцыі галоўнай рухаючай сілай і каталізатарам грамадскага прагрэсу;

–*тэорыя “малых спраў*”, якая прадугледжвала неабходнасць выканання інтэлігенцыяй “абавязку перад народам” праз сумленныя адносіны да ўласных прафесійных абавязкаў. Тэорыя і практыка “малых спраў” акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці правядзення канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на карысць народных мас, у эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферы.

На тэрыторыі Беларусі цэнтрам прапаганды ліберальнага народніцтва становіцца першая легальная недзяржаўная газета “*Минский листок*” (1886 – 1902 гг.). У цэлым газета як легальнае выданне вымушана была выказваць ліберальныя ідэі вельмі асцярожна. У “Минском листке” прапагандуюцца ідэі асветы і распаўсюджання сацыяльна значных ведаў; пры гэтым звяртаецца ўвага на тое, што яны павінны спалучацца з канкрэтнымі дзеяннямі па паляпшэнню жыцця народа.

У 1880-я гг. на землях Беларусі складваецца новы накірунак грамадска-палітычнага руху – *марксізм*. Як накірунак еўрапейскай сацыяльна-палітычнай думкі марксізм пачынае фарміравацца ў сярэдзіне 19 ст. у творчасці нямецкіх грамадска-палітычных дзеячоў і навукоўцаў *Карла Маркса* і *Фрыдрыха Энгельса*. З другой паловы 19 ст. ён пераўтвараецца ў шырокі грамадска-палітычны рух, які ахапіў большасць краін Еўропы, а затым распаўсюджваецца і на іншых кантынентах. У аснове сацыяльна-палітычнай ідэалогіі марксізму знаходзіліся наступныя ідэі:

–сацыяльным ідэалам абвяшчаецца *сацыялізм (камунізм)*, што павінен прыйсці на змену капіталізму як заканамерны вынік развіцця апошняга;

–пераход ад сацыялізму да капіталізму павінен адбыцца шляхам абумоўленай аб’ектыўнымі фактарамі *сацыялістычнай рэвалюцыі*, галоўнай рухаючай сілай якой разглядаецца рабочы клас; у выніку сацыялістычнай рэвалюцыі рабочы клас павінен атрымаць палітычную ўладу і ажыццявіць сацыялістычныя мерапрыемствы.

У другой палове 1880 – першай палове 1890-х гг. у буйнейшых гарадах Беларусі ўзнікаюць марксісцкія гурткі, якія першапачаткова мелі асветніцкі характар (у склад гурткоў уваходзілі інтэлігенты, якія займаліся самаадукацыяй у духу ідэй марксізму). Яны падтрымлівалі сувязь з марксісцкімі арганізацыямі ў Расіі, Польшчы і краінах Заходняй Еўропы. Марксісты

акцэнтавалі ўвагу на неабходнасці ажыццяўлення *буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі*, мэтай якой лічылася ліквідацыя абсалютызму і перажыткаў феадалізму, увядзенне дэмакратычнага палітычнага рэжыму, што павінна было стварыць умовы для паскоранага развіцця капіталізму. Капіталізм разглядаўся як неабходная і непазбежная стадыя грамадскага развіцця, якая створыць неабходныя ўмовы для выспявання сацыялізму. У адрозненне ад народнікаў, марксісты адмаўлялі наяўнасць элементаў сацыялізму ў дакапіталістычных грамадскіх структурах.

З 1890-х гг. марксісцкія арганізацыі пераходзяць да актыўнай прапагандысцкай дзейнасці сярод рабочых, што садзейнічае іх колькаснаму росту. У гэты час яны сталі называцца *сацыял-дэмакратамі*. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі на тэрыторыі Беларусі ў канцы 19 – пачатку 20 стст. уваходзяць у склад шэрагу палітычных партый марксісцкай арыентацыі: *Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя* (з 1898 г., І з'езд адбыўся ў Мінску), *Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз Польшчы, Літвы і Расіі* (*Бунд*, з 1897 г.), *Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы* (з 1893 г.), *Польская партыя сацыялістычная на Літве* (з 1902 г.), *Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя* (з 1896 г.), *Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі* (1899 – 1900 гг.). Найбольш уплывовай арганізацыяй з'яўляўся Бунд, што тлумачылася перавагай яўрэяў у структуры гарадскога насельніцтва Беларусі.

У пачатку 20 ст. сярод палітычных арганізацый рэвалюцыйнага накірунку з'яўляецца партыя, якая належала да беларускага нацыянальнага руху – *Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ)*. Яна ўзнікае ў 1902 – 1903 гг. на базе нацыянальна-культурных гурткоў беларускай моладзі ў Мінску, Вільні і Пецярбургу. Заснавальнікамі і лідэрамі арганізацыі былі браты *Іван і Антон Луцкевічы*, *Алаіза Пашкевіч (Цётка)*, *Вацлаў Іваноўскі* і інш. У 1903 г. адбыўся І з'езд БСГ, на якім была ўхвалена праграма партыі. Сваёй галоўнай мэтай БСГ абвяшчала пабудову сацыялістычнага грамадства. Да бліжэйшых задач адносіліся звяржэнне самадзяржаўя, фарміраванне дэмакратычнага палітычнага рэжыму, забеспячэнне палітычных і эканамічных правоў чалавека, рэалізацыя правоў народаў, у тым ліку і беларускага на нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэнне, ліквідацыя памешчыцкага землеўладання і сацыялізацыя зямлі. У цэлым у праграме партыі сінтэзаваліся элементы ідэй народніцтва і марксізму у спалучэнні з абвяшчэннем задач беларускага нацыянальнага руху.

*Такім чынам, на працягу апошняй трэці 19 ст. назіраецца працэс паступовага ажыўлення грамадска-палітычнага жыцця на тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым характэрнай з'явай выступае ўзрастанне ўплыву радыкальных сацыяльна-палітычных рухаў, такіх як народніцтва і марксізм, што сведчыла пра наяўнасць перадумоў палітычнага крызісу царызму.*

### 13.4. Фарміраванне рабочага руху ў апошняй трэці 19 ст.

Фарміраванне рабочага класа ў выніку развіцця капіталістычных адносін прывяло да з'яўлення новага феномена ў грамадскім жыцці Беларусі –

*рабочага руху* – руху наёмных рабочых за паляпшэнне свайго эканамічнага і палітычнага становішча.

У сілу спецыфікі прамысловага развіцця рэгіёну (наяўнасць мноства дробных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю занятых на іх рабочых) становішча пралетарыяту Беларусі было больш цяжкім, чым у Расійскай імперыі ў цэлым. Яго характарызавалі 13-14-гадзінны працоўны дзень, нізкая аплата працы, адвольныя штрафы, дрэнныя жыллёвыя ўмовы, адсутнасць страхавога і пенсійнага забеспячэння, тэхнікі бяспекі на працы.

Першапачаткова (у 1860-1870-я гг.) асноўнай формай супраціўлення рабочых з’яўляліся стыхійныя выступленні, галоўным чынам уцёкі з месца працы. Гэтыя выступленні мелі пераважна абарончы характар, былі выкліканы несвоечасовымі выплатамі заробкаў і іншымі формамі невыканання дамоўленасцяў з боку наймальнікаў.

Паступова асноўнай формай рабочага руху становіцца *стачка* – арганізаванае спыненне працы рабочымі з мэтай выканання наймальнікамі канкрэтных патрабаванняў у сферы вытворчых адносін. У 1870-я гг. на тэрыторыі Беларусі адбылося 7 стачак, у 1880-я – 10, у 1890-я – 59. Найбольш значныя стачкі адбыліся на будаўніцтве чыгуначных дарог Вільня-Баранавічы (1884 г.), Лібава-Ромны (1886, 1894, 1899 гг.), а таксама ў чыгуначных майстэрнях у Пінску (1893 г.), прамысловых прадпрыемствах у Смаргоні (1896 г.), на тытунёвай фабрыцы Шарашэўскага ў Гродне (1899 г.). Патрабаванні рабочых былі накіраваны на паляпшэнне матэрыяльнага становішча (павышэнне заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня, паляпшэнне ўмоў працы, спыненне адвольнага спагнання штрафаў).

З 1880-х гг. пэўны ўплыў на рабочы рух пачынаюць аказваць рэвалюцыйныя палітычныя арганізацыі. У буйнейшых гарадах з’яўляюцца рабочыя гурткі, у межах якіх праводзілася палітычная самаадукацыя рабочых. З другой паловы 1890-х гг. радыкальныя палітычныя арганізацыі, у першую чаргу марксісцкія, пачынаюць актыўна ўдзельнічаць у барацьбе рабочых за свае эканамічныя правы. Пад іх уплывам у некаторых гарадах адбываецца святкаванне рабочымі *1 мая* – дня міжнароднай салідарнасці рабочых.

Пад уплывам рабочага руху царскі ўрад у 1880-1890-я гг. вымушаны быў абмежаваць выкарыстанне дзіцячай і жаночай працы (1882, 1885 гг.), памеры штрафу (1886 г.), працягласць працоўнага дня 11,5 гадзінамі (1897 г.). Для выканання гэтых і іншых абмежаванняў была ўведзена ў 1882 г. фабрычная інспекцыя. Аднак кантроль за ажыццяўленнем законаў аказаўся вельмі слабым; да таго ж яны не распаўсюджваліся на дробную і рамесна-саматужную вытворчасць, якая пераважала менавіта на тэрыторыі Беларусі.

*Такім чынам, у апошняй трэці 19 ст. у Беларусі ўзнікае новая сацыяльная з’ява – рабочы рух, які паступова становіцца істотным фактарам сацыяльна-палітычнага жыцця.*

**Асноўныя паняцці:**

Паўстанне 1863-1864 гг., патрыятычныя маніфестацыі, “белыя”, “чырвоныя”, Цэнтральны нацыянальны камітэт, Літоўскі правінцыйны камітэт, “Мужыцкая праўда”, Часовы нацыянальны ўрад Польшчы, Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі, Аддзел кіравання правінцыямі Літвы, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, шляхецкае нацыянальна-вызваленчае паўстанне, земская рэформа 1864 г., гарадская рэформа 1870 г., судовая рэформа 1864 г., ваенная рэформа 1874 г., адукацыйная рэформа 1864 г., гарадскія думы, гарадскія ўправы, судовыя палаты, акруговыя суды, міравыя суды, контррэформы, земскія начальнікі, рэвалюцыйнае народніцтва, сацыялізм, “хаджэнне ў народ”, “Зямля і воля”, “Народная воля”, “Чорны перадзел”, “Гоман”, Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, ліберальнае народніцтва, “Минский листок”, марксізм, Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя, Бунд, Польская партыя сацыялістычная на Літве, Беларуская Сацыялістычная Грамада, рабочы рух.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія змены адбыліся ў палітыцы царызму ў другой палове 1850 – пачатку 1860-х гг.? Чым яны былі выкліканы?
2. Чым выкліканы грамадскі ўздым у Польшчы, Беларусі і Літве на мяжы 1850-1860-х гг.? Якія факты сведчаць пра наяўнасць ўздыму?
3. Чым можна патлумачыць радыкалізацыю польскага нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку 1860-х гг. у Польшчы і на тэрыторыі былога ВКЛ?
4. Якія плыні сфарміраваліся ў межах польскага нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку 1860-х гг.? У чым паміж імі існавалі адрозненні паводле сацыяльнага складу, праграм нацыянальна-дзяржаўнага і сацыяльна-палітычнага будаўніцтва, метадаў рэалізацыі пастаўленых мэтаў?
5. Укажыце асноўныя падзеі падчас паўстання 1863-1864 гг. Якім чынам на развіццё паўстання маглі паўплываць супярэчнасці сярод кіраўніцтва паўстаннем?
6. Якія асноўныя мерапрыемствы праводзіла адміністрацыя М. Мураўёва для падаўлення паўстання 1863-1864 гг.? Які яны мелі эфект?
7. Паспрабуйце растлумачыць, чаму сяляне беларукіх зямель у асноўнай масе не падтрымалі паўстанне 1863-1864 гг.
8. Да якіх вынікаў прывяло падаўленне паўстання 1863-1864 гг.? Вызначце асноўныя прычыны паражэння паўстання.
9. Якія існуюць асноўныя падыходы ў гістарычнай навуцы пры вызначэнні характару паўстання 1863-1864 гг.? Які з гэтых падыходаў здаецца Вам больш правільным і чаму?
10. Якія адбыліся змены ў палітыцы царызму на тэрыторыі Беларусі пасля паражэння паўстання 1863-1864 гг.?
11. Якія грамадскія рэформы былі праведзены царызмам у 1860-1870-я гг.? Падумайце, якое яны мелі значэнне для капіталістычнай мадэрнізацыі.

12. У чым заключалася спецыфіка правядзення рэформ 1860-1870-х гг. на тэрыторыі Беларусі? Чаму на гэтых землях яны праводзіліся са спазненнем і не ў поўным аб'ёме?
13. Што такое контррэформы? Падумайце, чаму царызм у 1880-я гг. адмовіўся ад працягу рэформ, праводзімых у 1860-1870-я гг.
14. Назавіце асноўныя контррэформы 1880-1890-х гг. Якую ролю яны мелі для далейшага развіцця грамадства?
15. У чым выяўлялася спецыфіка правядзення контррэформ на тэрыторыі Беларусі? Чаму прадваранская палітыка царызму не была на землях Беларусі дастаткова паслядоўнай?
16. Які ўплыў мела падаўленне паўстання 1863-1864 гг. на грамадскае жыццё Беларусі? Якая афіцыйная ідэалогія панавала ў другой палове 19 ст.?
17. Калі на тэрыторыі Беларусі пачынаецца ажыўленне рэвалюцыйнага руху? У чым адрозненне антыцарскага руху на землях Беларусі ў апошняй трэці 19 ст. ад антыцарскіх рухаў папярэдніх перыядаў?
18. Якія вылучаюцца асноўныя накірункі рэвалюцыйнага руху ў апошняй чвэрці 19 ст.? У чым адрозненне паміж імі?
19. Якім быў сацыяльны склад рэвалюцыйных арганізацый на тэрыторыі Беларусі ў апошняй чвэрці 19 ст.?
20. Вызначце асноўныя этапы ў развіцці рэвалюцыйнага народніцтва на землях Беларусі? Назавіце асноўныя арганізацыі?
21. Што такое ліберальнае народніцтва? Якія яго асноўныя ідэі?
22. Калі на тэрыторыі Беларусі пачынаецца распаўсюджанне марксізму? Якія этапы можна вылучыць у развіцці марксісцкага (сацыял-дэмакратычнага) руху да пачатку 20 ст.?
23. Назавіце палітычныя партыі марксісцкага кірунку, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі на мяжы 19-20 стст.
24. Якая палітычная партыя рэвалюцыйнага кірунку на мяжы 19-20 стст. абараняла задачы беларускага нацыянальнага руху? У чым спецыфіка праграмы дадзенай партыі?
25. Што такое рабочы рух? Калі ён фарміруецца на тэрыторыі Беларусі? Якімі прычынамі было выклікана яго развіццё?
26. Які характар мела дынаміка рабочага руху ў Беларусі ў 1870-1890-я гг.? Растлумачце прычыны падобнай дынамікі?
27. Якія Вы ведаеце асноўныя формы рабочага руху на тэрыторыі Беларусі?
28. Якія асноўныя нарматыўныя акты складалі рабочае заканадаўства Расійскай імперыі канца 19 ст.? Ці распаўсюджвалася дадзенае заканадаўства на ўсіх рабочых?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Грамадска-палітычная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі напярэдадні паўстання 1863-1864 гг.
2. "Мужыцкая праўда": аналіз асноўных ідэй.
3. Адносіны да паўстання 1863-1864 гг. розных сацыяльных груп насельніцтва Беларусі.

4. Каталіцкая царква ў Беларусі ў апошняй трэці 19 ст.
5. Контррэформы ў Беларусі: спецыфіка правядзення.
6. Газета "Минский листок" і яе ўплыў на ідэалогію ліберальнага народніцтва Беларусі.
7. Станаўленне палітычных партый на тэрыторыі Беларусі на мяжы 19-20 стст.

## Тэма 14: Фарміраванне беларускай нацыі. Культура Беларусі ў 19 ст.

**1. Перадумовы фарміравання беларускай нацыі.**

**2. Адукацыя і навука.**

**3. Мастацкая культура.**

### 14.1. Перадумовы фарміравання беларускай нацыі.

Эпоха прамысловай рэвалюцыі і капіталістычнай мадэрнізацыі ў гісторыі Еўропы, якая ахоплівае канец 18 – 19 стст., разглядаецца адначасова як эпоха фарміравання нацый. *Нацыя* – гэта пэўная сацыяльная супольнасць, для якой характэрныя:

- агульная тэрыторыя пражывання;
- агульная літаратурная мова;
- наяўнасць адносна трывалых эканамічных і культурных сувязяў;
- развітая *нацыянальная самасвядомасць* (атаясамленне асобных індывідаў з пэўнай нацыянальнай супольнасцю).

*Фарміраванню нацый, як правіла, папярэднічалі наступныя фактары*:

- стварэнне суверэнных цэнтралізаваных дзяржаў;
- пэўны ўзровень сацыяльнай камунікацыі, сфарміраваны эканамічнымі і тэхнічнымі фактарамі ва ўмовах прамысловай рэвалюцыі;
- распаўсюджанне пісьменнасці сярод значнай часткі насельніцтва.

Фарміраванне нацый у Еўропе ў разглядаемы перыяд адбывалася двума асноўнымі шляхамі:

1) Канструяванне нацый у межах асобных цэнтралізаваных дзяржаў дзякуючы дзяржаўнай палітыцы (нацыянальная свядомасць пры гэтым атаясамлівалася з грамадзянскай прыналежнасцю: напрыклад, француз – г.зн. грамадзянін Францыі). Такім шляхам адбывалася складаванне большасці нацый у Заходняй Еўропе: англійскай, французкай, шведскай і інш.

2) Складванне нацый на базе гістарычна ўзнікшых у даіндустрыяльную эпоху этнічных супольнасцяў (народнасцей). Фарміраванне такіх нацый адбывалася па-за межамі дзяржаўных утварэнняў (нацыянальная самасвядомасць атаясамлівалася не з грамадзянскай, а з этнічнай прыналежнасцю: напрыклад, чэх – г.зн. той, хто размаўляе на адным з чэшскіх моўных дыялектаў, прытрымліваецца чэшскіх этнакультурных традыцый). Галоўным каталізатарам складвання нацый з'яўляліся нацыянальныя рухі. Такім шляхам ішло фарміраванне большасці нацый у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе: чэшскай, польскай, украінскай і інш.

Фарміраванне беларускай нацыі адбывалася па другім шляху. Аб'ектыўнымі перадумовамі дадзенага працэсу з'яўляліся:

- *наяўнасць спецыфічных этнічных (моўных, культурных) прыкмет у большасці насельніцтва, што пражывала на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, часткова Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў Расійскай імперыі*;

- *развіццё рыначных капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы і прамысловасці, што спрыяла пашырэнню міжрэгіянальных эканамічных і культурных сувязяў*.

Аднак станаўленне нацыі на тэрыторыі Беларусі запавольвалася наяўнасцю спецыфічных умоў:

1) *Працэсы капіталістычнай мадэрнізацыі ў дадзены перыяд толькі пачыналіся*: Беларусь з'яўлялася аграрным краем; сельская гаспадарка мела пераважна натуральны характар; эканамічныя і культурныя сувязі паміж рэгіёнамі былі слабыя; большая частка насельніцтва з'яўлялася непісьменнай; захоўваўся саслоўны падзел грамадства – у такіх умовах не існавала аб'ектыўных фактараў для шырокага распаўсюджання нацыянальнай самасвядомасці; пераважалі дамінуючыя ў ранейшыя часы рэгіянальная, канфесійная, саслоўная самасвядомасць.

2) *Адсутнасць самастойнай дзяржаўнасці*: землі Беларусі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі, улады якой праводзілі русіфікатарскую палітыку ў розных сферах грамадскага жыцця.

3) *Канфесійны падзел грамадства на праваслаўных і католікаў*; дадзеная акалічнасць выкарыстоўвалася расійскімі ўладамі і польскімі элітамі, якія спрабавалі навязаць адпаведна ўсім праваслаўным расійскую, а католікам – польскую нацыянальную самасвядомасць.

4) *Перавага іншаэтнічнага насельніцтва (перадусім яўрэяў) у гарадах* ва ўмовах мяжы яўрэйскай аседласці і забароны яўрэям пасяляцца ў сельскай мясцовасці. Збяднелыя сяляне з беларускіх вёсак адыходзілі на працу ў прамысловасці і будаўніцтве ў буйнейшыя гарады Расійскай імперыі (Пецярбург, Масква, Адэса). У беларускіх гарадах, дзе панавала дробная прамысловасць, попыт на працоўную сілу цалкам задавальняўся за кошт яўрэйскага насельніцтва (на 1897 г. у гарадах пяці заходніх губерняў пражывала ўсяго 14,5% беларусаў, у той час як яўрэяў – 53,5%; на 1897 г. з 90 тыс. жыхароў Мінска толькі 8,2 тыс. былі беларусамі, у той час як у Пецярбургу пражывала 66,5 тыс. беларусаў).

5) *Уключэнне эканамічнай, палітычнай і інтэлектуальнай эліты грамадства (дваранства, купецтва, духавенства, інтэлігенцыя) ў працэсы фарміравання расійскай і польскай нацый*, якія гістарычна пачаліся раней; адсутнасць на тэрыторыі Беларусі вышэйшых навучальных устаноў, якія б маглі стаць цэнтрамі фарміравання новай інтэлектуальнай эліты.

*Станаўленне беларускага нацыянальнага руху*.

Як ужо адзначалася, у працэсе фарміравання нацый, якія не мелі ўласнай дзяржаўнасці, галоўнай рухаючай сілай з'яўляліся нацыянальныя рухі. *У першай палове 19 ст. складваюцца перадумовы фарміравання беларускага*

*нацыянальнага руху*. У гэты перыяд пачынаецца навуковае гістарычнае, этнаграфічнае, археалагічнае вывучэнне Беларусі. У значнай ступені гэта звязана з панаваннем у духоўнай культуры гэтага перыяду ідэй рамантызму, для якіх уласцівы павышаны інтарэс да гістарычнага мінулага, у якім шукаліся светапоглядныя і сацыяльныя ідэалы. Навуковае вывучэнне ажыццяўлялася пераважна прадстаўнікамі мясцовай польскамоўнай, у меншай ступені рускамоўнай, інтэлігенцыі (Зарыян Даленга-Хадакоўскі, Ян і Канстанцін Тышкевічы, Тэадор Нарбут, Адам Кіркор, Павел Шпілеўскі і інш.). У першай палове 19 ст. пачынае фарміравацца беларускамоўная літаратура (Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Рамуальд Падбярэзскі і інш.). У навуковых і літаратурных творах першай паловы 19 ст. сцвярджалася самабытнасць беларускай народнай мовы і традыцыйнай культуры. Аднак пры гэтым беларусы не разглядаліся як самастойная нацыя, а толькі як этнаграфічная супольнасць, якая павінна паступовa ўліцца ў склад польскай або расійскай нацыі.

З сярэдзіны 19 ст. беларуская мова стала выкарыстоўвацца ў рэвалюцыйнай публіцыстыцы (агітацыйная літаратура падчас паўстання 1863-1864 гг., некаторыя выданні расійскіх і польскіх народнікаў).

Пасля разгрому паўстання 1863-1864 гг. царскія ўлады разгарнулі актыўную дзейнасць у накірунку навуковага гісторыка-этнаграфічнага вывучэння Беларусі, мэтай якога з’яўлялася абгрунтаванне таго, што дадзены край спрадвечна рускі. Вынікі даследаванняў, нягледзячы на іх заходнерускую скіраванасць, ускосна пацвярджалі факт існавання асобнай беларускай этнічнай культуры і мовы.

Напрыканцы 19 ст. пачынае фарміравацца *беларускі нацыянальна-культурны рух*. Пра гэта сведчыць станаўленне беларускай літаратуры, у межах якой паслядоўна адстойваецца ідэя пра існаванне самастойнай беларускай нацыі (Францішак Багушэвіч, Янка Лучына, Адам Гурыновіч, Карусь Каганец і інш.); узнікненне гурткоў нацыянальнай інтэлігенцыі (пераважна выхадцаў з сялянства і дробнай шляхты) як у самой Беларусі, так і ў Пецярбургу і Маскве сярод беларускіх студэнтаў, выданне імі публіцыстычных твораў. Нацыянальна-культурны рух, як правіла, акцэнтаваў сябе як апазіцыйны ў адносінах да царскага рэжыму. У яго межах фарміруюцца першыя элементы *палітычнага нацыянальнага руху* з патрабаваннямі стварэння беларускай дзяржаўнасці (група “Гоман”). На пачатку 20 ст. палітычны нацыянальны рух афармляецца ва ўзнікненні і дзейнасці Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

У межах беларускага нацыянальнага руху канца 19 – пачатку 20 стст. знайшлі ўвасабленне наступныя ідэі:

– абгрунтаванне *самастойнасці беларускага этнасу*, самабытнасці беларускай мовы і культуры;

– сцвярджэнне ідэі беларускай нацыі як *этнічнай супольнасці* (вызначальная роля надавалася развіццю беларускай мовы як галоўнага нацыятворчага фактару);

– *канцэпцыя беларусаў як плебейскай нацыі* з няпоўнай сацыяльнай структурай, адбываецца атаясамленне сацыяльнай дыхатаміі з нацыянальнай (пануючыя сацыяльныя слаі – рускія і палякі // працоўныя масы – беларусы);

– сцвярджэнне неабходнасці фарміравання *нацыянальнай інтэлектуальнай эліты* з прадстаўнікоў беларускага народа, якая павінна выступаць каталізатарам абуджэння ў народзе нацыянальнага духу.

Такім чынам, да канца 19 ст. адбываецца складванне беларускага нацыянальнага руху. Аднак у той жа час яго дзейнасць абмяжоўвалася вузкім колам беларускай інтэлігенцыі і істотнага ўплыву на развіццё масавай нацыянальнай самасвядомасці не мела.

*Можна зрабіць выснову, што ў 19 ст. адбываецца складванне перадумоў фарміравання беларускай нацыі, пра што сведчаць зрухі ў накірунку капіталістычнай мадэрнізацыі грамадства, зараджэнне беларускага нацыянальнага руху. Аднак разам з тым павольныя тэмпы мадэрнізацыі, спецыфічныя сацыяльна-палітычныя і этнаканфесійныя ўмовы жыццядзейнасці грамадства абумовілі тое, што працэс фарміравання нацыі знаходзіўся да пачатку 20 ст. яшчэ на пачатковай стадыі.*

**14.2. Адукацыя і навука.**

У развіцці адукацыі і навукі на землях Беларусі можна вылучыць некалькі этапаў.

*Першы этап з канца 18 ст. да канца 1820-х гг.* вызначаўся захаваннем пераемнасці з папярэдняй эпохай. Навучальныя ўстановы ў гэты перыяд падзяляліся на свецкія і рэлігійныя. Сістэма свецкай адукацыі была ўпарадкавана паводле рэформы 1803 г., згодна з якой уся тэрыторыя Расійскай імепрыі падзялялася на некалькі навучальных акруг, якія падпарадкоўваліся Міністэрству народнай асветы. На тэрыторыі былога ВКЛ была ўтворана *Віленская навучальная акруга*. Былі вызначаны некалькі ўзроўняў адукацыйнай сістэмы: аднакласныя *пачатковыя школы* (навучанне, якое прадугледжвала засвойванне элементарных ведаў і практычных навыкаў), чатырохкласныя *павятовыя вучылішчы* (пачатковая адукацыя), сямікласныя *гімназіі* ў губернскіх гарадах (сярэдняя адукацыя), *Віленскі ўніверсітэт* (вышэйшая адукацыя). Прадугледжвалася пераемная сувязь паміж адукацыйнымі ўстановамі розных ступеняў; адукацыя фармальна з'яўлялася ўсесалоўнай. Нягледзячы на тое, што афіцыйнай мовай у гэты перыяд становіцца руская, навучанне, асабліва ў гімназіях і ва ўніверсітэце, ажыццяўляецца пераважна на польскай мове.

Акрамя свецкіх дзейнічалі таксама шматлікія рэлігійныя навучальныя ўстановы, найперш каталіцкія. Да 1820 г. на паўночных і ўсходніх землях Беларусі працягвае функцыянаваць сетка езуіцкіх калегіумаў; іх цэнтрам становіцца створаная ў 1812 г. *Полацкая езуіцкая акадэмія*. Таксама дзейнічалі калегіумы піяраў, дамініканцаў і іншых каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай адбываецца хуткае развіццё праваслаўных рэлігійных адукацыйных устаноў. Дзейнічалі таксама уніяцкія

адукацыйныя ўстановы. У гэты перыяд былі арганізаваны прыватныя пансіёны і школы.

Цэнтрамі развіцця навукі ў гэты перыяд з’яўляліся вышэйшыя навучальныя ўстановы – *Віленскі універсітэт* (1803-1832) і *Полацкая езуіцкая акадэмія* (1812-1820).

Віленскі універсітэт узнікае ў 1803 г. шляхам пераўтварэння Галоўнай Віленскай школы (былой Галоўнай школы ВКЛ). У ім былі ўтвораны 4 факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычны (выкладалася пераважна тэалогія), літаратурны. Колькасць студэнтаў узрасла з 290 у 1804 г. да 1130 у 1830 г. Пры ўніверсітэце дзейнічалі батанічны сад, абсерваторыя, анатамічны музей, клініка, фізічная і хімічная лабараторыі, вялікая бібліятэка. Сярод галоўных накірункаў навуковых даследаванняў можна адзначыць наступныя:

- *матэматыка і логіка* (асноўныя прадстаўнікі: Ян Снядэцкі, Анёл Доўгірд);
- *прыродазнаўчыя навукі*: фізіка, хімія, астраномія (асноўныя прадстаўнікі: Ян Снядэцкі, Анджэй Снядэцкі, Вінцэнт Карчэўскі, Мікалай Глушневіч);
- *медыцынскія навукі* (асноўны прадстаўнік – В. Пелікан).
- *гістарычныя навукі* (асноўныя прадстаўнікі: Іахім Лелявель, Міхаіл Баброўскі, Ігнат Даніловіч).

Навуковыя даследаванні ў цэлым абапіраліся на традыцыі Асветніцтва. Прапаганда асветніцкіх ідэй ажыццяўлялася праз часопіс “*Віленскі дзённік*”.

Полацкая езуіцкая акадэмія ўзнікае ў 1812 г. на базе раней існаваўшага калегіума. У ёй дзейнічалі 3 факультэты: моўны, філасофіі і вольных навук, тэалагічны. У акадэміі навучалася каля 700 студэнтаў. Шырока праводзіліся навуковыя даследаванні ў сферы фізікі, хіміі, біялогіі, грамадскіх навук. Да ліку буйнейшых навукоўцаў, якія працавалі ў Полацкай акадэміі належаць Ю. Цітовіч (хімія), Ф. Брандэнбург (хімія), В. Бучынскі (філасофія, рыторыка). У адрозненне ад Віленскага ўніверсітэта навуковыя даследаванні тут базіраваліся на традыцыйнай каталіцкай ідэалогіі. Праз часопіс “*Полацкі штомесячнік*” (1818 – 1820 гг.) адбывалася палеміка з ідэямі Асветніцтва. Пасля выгнання езуітаў з Расійскай імперыі ў 1820 г. Полацкая акадэмія разам з усімі езуіцкімі калегіумамі былі распушчаны, маёмасць прададзена альбо перавезена ў Пецярбург.

*Другі этап ахоплівае перыяд з канца 1820-х гг. да пачатку 1860-х гг.* Ён характарызуецца ліквідацыяй створанай у часы Рэчы Паспалітай сістэмы адукацыі, у тым ліку класічнай вышэйшай адукацыі, узмацненнем русіфікацыі, умацаваннем дзяржаўнага кантролю, прынцыпу саслоўнасці ў сферы адукацыі.

У 1824 г. была скасавана Віленская навучальная акруга. Тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі далучаны да Пецярбургскай навучальнай акругі. На астатняй тэрыторыі была ўтворана *Беларуская навучальная акруга*. У 1828 г. быў уведзены новы статут навучальных устаноў, паводле якога прадугледжваліся дзве сістэмы атрымання адукацыі,

якія грунтаваліся на саслоўным прынцыпе. Спецыяльны царскі ўказ 1827 г. абмяжоўваў магчымасць атрымання вышэйшай і сярэдняй адукацыі для прадстаўнікоў непрывілеяваных саслоўяў.

Пасля паражэння паўстання 1830-1831 гг. па ініцыятыве царскага ўрада пачаўся актыўны працэс русіфікацыі ў сферы адукацыі. Былі зачынены Віленскі універсітэт, ліквідаваны ўсе рэлігійныя каталіцкія і уніяцкія навучальныя ўстановы. Многія мясцовыя настаўнікі высылаліся з Беларусі. Узмацніўся кантроль над адукацыяй з боку праваслаўнай царквы.

На базе распушчанага Віленскага універсітэта былі створаны *Віленская медыка-хірургічная акадэмія* і *Віленская духоўная рымска-каталіцкая акадэмія*. Аднак у 1842 г. першая з іх была пераведзена ў Кіеў і далучана да Кіеўскага універсітэта, а другая – пераведзена ў Пецярбург. Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі была ліквідавана сістэма класічнай вышэйшай адукацыі. Разам з тым у 1840 г. у Горках была адчынена *Горы-Горацкая земляробчая школа*, якая ў 1848 г. была пераўтворана ў інстытут і стала першай у Расійскай імперыі вышэйшай агранамічнай навучальнай установай.

Нягледзячы на складаную сітуацыю, адукацыйная сістэма ў Беларусі развівалася. У 1860-я гг. дзейнічала 576 навучальных устаноў, сярод іх 453 – пачатковыя школы. Ва ўсіх школах навучалася каля 17 тыс. чалавек.

Пэўную ролю ў развіцці асветы адыграла ўвядзенне афіцыйнага *перыядычнага друку* (з 1838 г. усе губернскія праўленні пачынаюць выдаваць газеты “*Губернскія ведамасці*”), адкрыццё публічных бібіліятэк.

Цэнтрамі *навуковых даследаванняў* у дадзены перыяд з’яўляліся Віленская медыка-хірургічная акадэмія (да 1842 г.) і Горы-Горацкі земляробчы інстытут. У першым атрымалі развіццё *біялагічныя і медыцынскія навукі* (асноўныя прадстаўнікі: А. Адамовіч, І. Каржанеўскі, С. Горскі); у другім – *хімічныя навукі* (асноўныя прадстаўнікі: І. Цютчаў, К. Шміт). У дадзены перыяд у значных беларускіх гарадах узнікаюць метэаралагічныя станцыі. Істотным элементам у развіцці навукі сталі даследаванні ў галінах археалогіі і этнаграфіі (Т. Нарбут, К. і Я. Тышкевічы, А. Кіркор, П. Шпілеўскі, Р. Падбярэзскі).

*Трэці этап ахоплівае апошнюю трэць 19 ст.*, у перыяд пасля паўстання 1863-1864 гг. Ён характарызаваўся ўзмацненнем русіфікацыі ў сферы адукацыі, замацаваннем перыферыйнага статусу Беларусі ў агульнаімперскай сістэме адукацыі, пра што сведчыла поўная ліквідацыя тут устаноў вышэйшай адукацыі. У той жа час для дадзенага перыяду ўласцівае пашырэнне пачатковай адукацыі, аслабленне саслоўных пачаткаў у адукацыйнай сферы на тэрыторыі Беларусі, што адпавядала патрэбам капіталістычнай мадэрнізацыі.

Адзіная вышэйшая навучальная ўстанова на тэрыторыі Беларусі, якая існавала дагэтуль – Горы-Горацкі земляробчы інстытут – была зачынена ў 1864 г. Таксама былі зачынены некалькі сярэдніх навучальных устаноў: Навагрудская гімназія, Свіслацкая і Маладзечанская прагімназіі. З навучальных устаноў Беларусі і Літвы было выключана каля 2 тыс. чалавек. Акрамя таго, у 1866 г. ва ўніверсітэтах і навучальных інстытутах Расійскай

імперыі ўводзілася працэнтная норма для студэнтаў каталіцкага веравызнання. Пасля паўстання 1863-1864 гг. узмацнілася русіфікацыя школ; адбываліся масавыя звальненні са школ настаўнікаў каталіцкай веры.

У 1864 г. у Расійскай імперыі была праведзена *адукацыйная рэформа*. Адукацыйная сістэма набывала ўсесаслоўны характар (у 1880-я гг. саслоўныя абмежаванні ў галіне асветы былі часткова адноўлены ў выніку контррэформ). Асновай сярэдняй адукацыі станавіліся *гімназіі*, якія дзейнічалі на платнай аснове. Яны былі двух тыпаў: *класічныя* і *рэальныя* (тэрміны навучання – 7 і 6 год адпаведна). Першыя рыхтавалі сваіх выхаванцаў для паступлення ва ўніверсітэты, другія – да тэхнічных інстытутаў і працы ў прамысловасці і гандлі. У сістэме пачатковай адукацыі грамадскім арганізацыям і прыватным асобам дазвалялася па ўзгадненні з уладамі адкрываць *народныя 4-класныя вучылішчы*, а з 1872 г. і *гарадскія вучылішчы*, якія падпарадкоўваліся Міністэрству народнай адукацыі.

У Беларусі народныя вучылішчы адкрываліся не за кошт дзяржавы, а на сродкі сялян і збораў з землеўладальнікаў за ўдзел у паўстанні. Таму іх колькасць была тут адносна невялікай. У сістэме пачатковай адукацыі колькасна пераважалі *царкоўнапрыходскія школы*, якія ўтрымліваліся на сродкі праваслаўнай царквы. Іх на тэрыторыі Беларусі дзейнічала некалькі тысяч. Царкоўнапрыходскія школы мелі выразную рэлігійна-русіфікатарскую накіраванасць.

Ва ўмовах развіцця пачатковай адукацыі была створана сістэма падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для пачатковых школ. Для гэтага служылі *настаўніцкія семінарыі*. Першая настаўніцкая семінарыя была адчынена ў Маладзечне ў 1864 г. Затым такія ж установы з’явіліся ў Нясвіжы, Свіслачы і Полацку. На вучобу ў семінарыі трапляла шмат дзяцей сялян.

Пэўную ролю ў развіцці асветы мела распаўсюджанне перыядычных выданняў. Амаль усе яны належалі дзяржаве або праваслаўнай царкве. Толькі ў канцы 19 ст. адбываецца выданне адзінай у Беларусі незалежнай літаратурна-палітычнай газеты “Минский листок” (1886-1902).

Нягледзячы на некаторыя поспехі ў развіцці народнай асветы ў 1860-1890-я гг., яе ўзровень заставаўся невысокім. На канец 19 ст. каля ¾ насельніцтва Беларусі было непісьменным. Асабліва нізкай была пісьменнасць у сельскай мясцовасці.

Ліквідацыя вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі змяніла характар *навуковых даследаванняў*. Навуковая дзейнасць у Беларусі ў другой палове 19 ст. вылучалася, па-першае, палітызаванасцю, па-другое, развіццём пераважна гуманітарных навук. Пасля паўстання 1863-1864 гг. царскі ўрад мабілізаваў афіцыйную навуку для абгрунтавання канцэпцыі заходнерусізму. Дадзенай мэце падпарадкоўваліся даследаванні ў галіне гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, мовазнаўства.

Зборам і выданнем гістарычных дакументаў, звязаных з мінулым “Паўночна-Заходняга краю”, з 1864 г. актыўна займаліся *Віленская археаграфічная камісія* і ўпраўленне Віленскай навучальнай акругі. Былі выдадзены значныя навуковыя працы, прысвечаныя гісторыі беларускіх

зямель (*М. Каяловіч, М. Доўнар-Запольскі, М. Любаўскі, М. Уладзімірскі-Буданаў, А. Сапуноў* і інш.).

У 1867-1874 гг. у Вільні дзейнічаў аддзел *Рускага геаграфічнага таварыства*, па ініцыятыве якога праводзіліся археалагічныя экспедыцыі, збіраліся старадаўнія рэчы і гістарычныя дакументы. У апошняй трэці 19 ст. з'яўляюцца прысвечаныя Беларусі фундаментальныя этнаграфічныя і мовазнаўчыя працы. У 1870 г. быў выдадзены першы "Слоўнік беларускай гаворкі", створаны *І. Насовічам*. Таксама вялікі ўнёсак у развіццё беларускай этнагарафіі і мовазнаўства ўнеслі *П. Шэйн, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, М. Федароўскі, П. Уладзіміраў, Я. Карскі* і інш. Нягледзячы на афіцыйную скіраванасць большасці сацыяльна-гуманітарных навуковых даследаванняў, іх вынікі мелі вялікае значэнне ў вывучэнні гістарычнага мінулага, мовы, побыту, фальклору беларускага народа.

Пэўныя дасягненні меліся ў апошняй трэці 19 ст. і ў межах навуковага вывучэння прыродных рэсурсаў Беларусі. Прырода Палесся вывучалася Заходняй экспедыцыяй па асушэнню балот (1873-1898), якую ўзначальваў *І.І. Жылінскі*. Даследаванне асобных азёр на тэрыторыі Беларусі было ажыццёўлена ў 1894-1895 гг. экспедыцыяй пад кіраўніцтвам *Д. Анучына*.

*Аднак, нягледзячы на пэўныя навуковыя дасягненні апошняй трэці 19 ст., развіццё навукі ў Беларусі істотна стрымлівалася з-за адсутнасці ў краі вышэйшых навучальных установ і спецыялізаваных навуковых цэнтраў.*

### 14.3. Мастацкая культура.

У мастацкай культуры Беларусі 19 ст. можна вылучыць два этапы.

На *першым этапе*, які ў асноўным супадае з першай паловай 19 ст., пануе рамантызм у якасці галоўнага стылю мастацкай культуры. Пад *рамантызмам* разумеецца агульнаеўрапейскі культурны рух першай паловы 19 ст., у межах якога ажыццяўляецца крытыка індустрыяльнай цывілізацыі і рацыяналістычнага светапогляду. У супрацьвагу гэтаму сцвярджаецца ідэал цэласнага развіцця асобы і сацыяльнай гармоніі. У мастацкай культуры рамантызму ўзрастае ўвага да ўнутранага свету чалавека. Сутнасцю рамантызму было імкненне супрацьпаставіць рэльнай рэчаіснасці абагулены ідэальны вобраз. Характэрнай выступае апалогія гістарычнага мінулага, што прыводзіць да ўзрастання зацікаўленасці традыцыйнай культурай.

Уплыў рамантызму меў месца ў розных накірунках мастацкай культуры першай паловы 19 ст.:

*Літаратура*. У першай палове 19 ст. літаратура на землях Беларусі з'яўлялася пераважна польскамоўнай. Буйнейшым яе прадстаўніком, ураджэнцам Беларусі з'яўляецца *Адам Міцкевіч* (аўтар паэм "Пан Тадэвуш", "Дзяды", "Мешка, князь Навагрудка" і інш.). Таксама вялікі ўнёсак ў развіццё польскамоўнай рамантычнай літаратуры зрабілі *Уладзіслаў Сыракомля*, *Ян Чачот, Ян Баршчэўскі і інш.*

У той жа час пад уплывам рамантызму сярод польскамоўных літаратараў узнікае цікавасць да беларускага фальклору і мовы, на якой ён быў створаны. Вынікам становіцца фарміраванне ў першай палове 19 ст. *беларускамоўнай*

*мастацкай літаратуры* (вершы, балады, апавяданні, п'есы). Да найбольш вядомых прадстаўнікоў гэтай літаратуры належаць *Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч* (п'есы "Сялянка", "Пінская шляхта", апавяданні "Вечарніцы, "Гапон" і інш.), *Ян Баршчэўскі* (зборнік апавяданняў "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" і г.д.), *Аляксандр Рыпінскі* (творы "Беларусь", "Нячысьцік"). Некаторыя беларускамоўныя творы былі ананімнымі (сатырычныя паэмы "Энеіда навыварат", "Тарас на Парнасе"). Вядомы таксама беларускамоўны верш сялянскага паэта *Паўлюка Багрыма* "Зайграй, зайграй, хлопча малы".

*Тэатр і музыка.* У першай палове 19 ст. працягваюць дзейнічаць прыватныя магнацкія тэатры. Оперы ставілі ў Слуцкім і Нясвіжскім тэатрах Радзівілаў, Дзярэчынскім і Ружанскім тэатрах Сапегаў і інш. У 1845-1847 гг. у губернскіх гарадах ствараліся *пастаянныя прафесійныя тэатры*, якія знаходзіліся пад кантролем тэатральнай дырэкцыі. Рэпертуар тэатраў быў двухмоўным – польскім і рускім. На сцэне ставіліся п'есы польскіх, рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў. Разам з прафесійным развіваўся *аматарскі тэатр*, які быў вельмі папулярны сярод шляхты, чыноўнікаў і афіцэраў. У 1840-я – на пачатку 1860-х гг. дзейнічаў музычна-драматычны гурток у маёнтку В. Дуніна-Марцінкевіча. У яго межах у 1852 г. адбылася прэм'ера першай беларускамоўнай оперы «Сялянка». Аўтарам музыкі стаў *Станіслаў Манюшка* (адзін з заснавальнікаў класічнай польскай оперы), а лібрэта створана на аснове п'есы В. Дуніна-Марцінкевіча.

*Архітэктура.* Рост гарадоў у першай палове 19 ст. знайшоў адлюстраванне ў горадабудаўніцтве. Гарады забудоўваліся па праектах рэгулярнай планіроўкі. Характэрнымі прынцыпамі забудовы былі сіметрычнае размяшчэнне кварталаў, прамалінейнасць вуліц.

У адрозненне ад іншых накірункаў культуры ў архітэктуры ў разглядаемы перыяд пануе стыль *класіцызму*. Вялікую ролю ў развіцці дадзенага стылю ў Беларусі адыгралі *Віленская архітэктурная школа*, творчасць рускіх архітэктараў М.Львова, В.Стасава, А.Мельнікава, англічаніна Дж.Кларка. Яркімі прыкладамі архітэктуры ў стылі класіцызму гэтага перыяду з'яўляюцца палацава-паркавы ансамбль Румянцавых у Гомелі, палацавы комплекс у Снове (Нясвіжскі раён), губернатарскія палацы ў Віцебску, Мінску і Гродне, Іосіфаўскі праваслаўны сабор у Магілёве і інш.

*Выяўленчае мастацтва.* У развіцці беларускага выяўленчага мастацтва першай паловы 19 ст. цесна пераплятаюцца элементы рамантызму і класіцызму. Важную ролю ў гэты перыяд адыграла *Віленская школа жывапісу*, створаная пры аддзяленні выяўленчага мастацтва ў Віленскім універсітэце, якая прытрымлівалася класічных канонаў у жывапісе. Яе заснавальнікам быў прафесар *Ф.Смуглевіч*. На працягу першай чвэрці 19 ст. школа падрыхтавала больш 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў і выкладчыкаў малявання для навучальных устаноў Беларусі. Падрыхтоўка прафесійных мастакоў у Беларусі вялася таксама ў Полацкай езуіцкай акадэміі. Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта вышэйшую мастацкую адукацыю стала магчыма набыць у Пецярбургскай акадэміі мастацтваў.

Гэтыя акалічнасці адбіліся на беларускай школе выяўленчага мастацтва, дзе фарміруюцца адметныя *жанры*:

- *гістарычны* (Я. Сухадольскі, Ф. Смуглевіч, Я. Дамель);
- *партрэтны* (І. Аляшкевіч, В. Ваньковіч);
- *бытавы* (У. Бычкоўскі, Ю. Карчэўскі, К. Русецкі);
- *пейзажны* (Н. Орда, В. Дмахоўскі);
- *нацюрморт* (І. Хруцкі).

У першай палове 19 ст. развіваецца *скульптурнае мастацтва*. Першым прафесійным скульптарам у Беларусі лічыцца *К. Ельскі*. Ён стварыў галерэю (больш за 50) партрэтаў гістарычных дзеячоў, працаваў над аздабленнем культавых і грамадскіх будынкаў.

*Другі этап* у развіцці мастацкай культуры Беларусі разглядаемага перыяду прыпадае на другую палову 19 ст. Для яго ўласцівым з’яўляецца засваенне ў якасці пануючага мастацкага стылю *рэалізму*, для якога характэрна адлюстраванне рэчаіснасці такой, якой яна з’яўляецца сама па сабе, павышаная ўвага да сацыяльных праблем. Разам з тым станаўленне дадзенага накірунку ў мастацтве істотна тармазілася сацыяльна-палітычнымі ўмовамі, што склаліся ў Беларусі пасля паўстання 1863-1864 гг. Так, царызм абмяжоўваў развіццё мастацкай літаратуры на польскай мове; з 1867 г. забаранялася выданне твораў на беларускай мове лацінскім шрыфтам. У цэлым да канца 19 ст. мастацкая культура ў Беларусі развівалася павольна.

*Літаратура*. У другой палове 19 ст. літаратура на беларускіх землях развіваецца пераважна на рускай і польскай мовах. У апошнія дзесяцігоддзі 19 ст. назіраецца паступовае развіццё беларускамоўнай літаратуры. Характэрнымі яе рысамі з’яўляліся цесная сувязь з беларускім нацыянальным рухам, вострая сацыяльная скіраванасць, сцвярджэне ідэалаў рэалізму. Асноўнымі прадстаўнікамі беларускай літаратуры другой паловы 19 ст. з’яўляюцца:

*Францішак Багушэвіч* (1840-1900), аўтар зборнікаў вершаў, якія мелі паслядоўную нацыянальную і сацыяльную скіраванасць, “Дудка беларуская” і “Смык беларускі”, апавядання “Траляляначка” (выдадзены за мяжой, у Аўстра-Венгрыі ў 1890-я гг.).

*Янка Лучына* (І.Л. Неслухоўскі) (1851-1897), аўтар вершаў на беларускай, рускай і польскай мовах, актыўны супрацоўнік часопіса “Минский листок”. Яго зборнік беларускамоўных вершаў “Вязынка” быў выдадзены пасмяротна ў Пецябургу (1903).

*Адам Гурыновіч* (1869-1894), аўтар шэрагу беларускамоўных вершаў, напісаных з выразных сацыяльна-крытычных пазіцый.

Прадстаўнікамі беларускамоўнай літаратуры з’яўляліся *Альгерд Абуховіч, Фелікс Тапчэўскі, Аляксандр Ельскі, Карусь Каганец*. Беларуская мова часам выкарыстоўвалася ў рэвалюцыйнай публіцыстыцы.

*Тэатр і музыка*. Пасля падаўлення паўстання 1863-1864 гг. узмацняецца русіфікацыя тэатральнай дзейнасці. Паводле распараджэння віленскага генерал-губернатара М. Мураўёва, былі забаронены тэатральныя прадстаўленні на польскай мове. Спынілі дзейнасць аматарскія тэатры,

арганізаваныя дзеячамі польскамоўнай культуры. Царскія ўлады адводзілі тэатру значную ролю ў выхаванні грамадскасці ў вернападданніцкім духу.

Напрыканцы 19 ст. тэатральнае жыццё ў Беларусі істотна актывізавалася. Амаль ва ўсіх буйнейшых гарадах Беларусі былі пабудаваны пастаянныя тэатральныя памяшканні. Разам з мясцовымі ў губернскіх гарадах выступаюць шматлікія рускія і ўкраінскія тэатральныя калектывы. Рэпертуар складалі ў асноўным творы рускай і заходнееўрапейскай класічнай драматургіі. У межах музычнай культуры ў 1871 г. было створана Мінскае музычнае вучылішча арганістаў. У губернскіх гарадах фарміруюцца *музычна-тэатральныя і літаратурныя гурткі*.

*Архітэктура*. На развіццё архітэктуры другой паловы 19 ст. значны ўплыў аказалі хуткае развіццё прамысловасці і рост гарадоў. Вялікую ролю набыло грамадзянскае, жыллёвае і прамысловае будаўніцтва, якое вялося згодна з тыпавымі праектамі. Развівалася будаўнічая тэхніка, шырока выкарыстоўваліся новыя будаўнічыя матэрыялы – бетон, металічныя канструкцыі. Гэта суправаджалася пошукам новага архітэктурнага стылю, які павінен быў адпавядаць новым умовам. У цэлым у архітэктуры панавала *эклектыка* – спалучэнне элементаў розных стыляў пры будаўніцтве і ў афармленні будынка. У апошняй трэці 19 – пачатку 20 стст. хутка развіваецца культавае будаўніцтва: адбываеца масавае ўзвядзенне *цэркваў-"мураўёвак"*, пабудаваных у руска-візантыйскім (або псеўдарускім) стылі (вясковыя цэрквы, Крыжаўздвіжанскі храм у Полацку). Новыя каталіцкія храмы будуюць у стылі псеўдаготыкі (Сар'я, Крэва).

*Выяўленчае мастацтва*. У выяўленчым мастацтве пануюе рэалістычны напрамак. Асноўнымі жанрамі ў жывапісе гэтага перыяду з'яўляліся:

- *гістарычны* (К. Альхімовіч);
- *бытавы* (Н. Сіліварновіч, Ю. Пэн);
- *пейзажны* (А. Гараўскі, Ф. Рушчыц, Г. Вейсенгоф).

*Мастацкая культура Беларусі 19 ст. была неаднароднай па нацыянальнай прыкмеце*. Цэнтрамі рускай культуры з'яўляліся гарады, у першую чаргу губернскія (перыядычныя выданні, тэатры, музеі, бібіліятэкі, літаратурна-мастацкія гурткі і інш.), а таксама праваслаўныя цэрквы. Польская культура ў першай трэці 19 ст. актыўна развівалася ў межах адукацыйных устаноў; з сярэдзіны 19 ст. яе цэнтрамі становяцца маёнткі буйных землеўладальнікаў, якія атаясамлівалі сябе з польскай нацыяй (прыватныя бібіліятэкі, зборы помнікаў матэрыяльнай культуры, польскамоўныя літаратурныя гурткі і інш.), а таксама каталіцкія касцёлы. У гарадах значную ролю мела яўрэйская культура, якая канцэнтравалася вакол шматлікіх сінагог, іудзейскіх навучальных устаноў, дабрачынных таварыстваў, хатніх бібліятэк. Беларуская нацыянальная культура ў 19 ст. толькі пачынае фарміравацца (беларускамоўная літаратура, тэатр).

*Такім чынам, у 19 ст. працягваецца паступовае развіццё мастацкай культуры на землях Беларусі ў рэчышчы агульнаеўрапейскіх культурных працэсаў. У той жа час дадзенае развіццё ў значнай ступені дэфармавалася спачатку паланізацыяй, а затым русіфікатарскай палітыкай царызму.*

**Асноўныя паняцці:**

Нацыя, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальны рух, Віленская навучальная акруга, пачатковыя школы, павятовыя вучылішчы, гімназіі, Віленскі універсітэт, Полацкая езуіцкая акадэмія, “Віленскі дзённік”, “Полацкі штомесячнік”, Віленская медыка-хірургічная акадэмія, Горы-Горацкі земляробчы інстытут, “Губернскія ведамасці”, класічныя гімназіі, рэальныя гімназіі, народныя вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы, настаўніцкія семінарыі, Віленская археаграфічная камісія, Рускае геаграфічнае таварыства, рамантызм, беларускамоўная мастацкая літаратура, віленская архітэктурная школа, віленская школа жывапісу, рэалізм.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Вызначце сутнасць і асноўныя характарыстыкі паняцця “нацыя”? Падумайце, чаму фарміраванне нацый робіцца магчымым толькі ва ўмовах капіталістычнай мадэрнізацыі.
2. Якія можна вызначыць два асноўныя шляхі фарміравання нацый у Еўропе 19 ст.? Які з гэтых шляхоў знайшоў рэалізацыю пры фарміраванні беларускай нацыі?
3. Вызначце, якія меліся аб’ектыўныя перадумовы фарміравання беларускай нацыі ў 19 ст.?
4. Чаму фарміраванне беларускай нацыі ў 19 ст. адбывалася вельмі павольнымі тэмпамі? Якія асаблівасці сацыяльна-эканамічнай і сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Беларусі абумовілі гэта?
5. Падумайце, які адбітак на працэсы фарміравання нацый на тэрыторыі Беларусі мела канфесійная разнастайнасць грамадства?
6. Растлумачце, чаму прадстаўнікі эканамічнай, палітычнай і інтэлектуальнай эліты беларускага грамадства ўключаліся пераважна ў працэсы фарміравання рускай і польскай, а не беларускай нацыі? Якія гэта мела наступствы для станаўлення беларускай нацыі?
7. Паспрабуйце вызначыць асноўныя этапы ў станаўленні беларускага нацыянальнага руху і іх асаблівасці.
8. Якую ролю адыграла навуковае беларусазнаўства 19 ст. у станаўленні беларускага нацыянальнага руху? Прывядзіце доказы на карысць гэтага.
9. Якія асноўныя ідэі сфарміраваліся ў межах беларускага нацыянальнага руху ў канца 19 ст.? Дайце іх характарыстыку.
10. Якія можна вылучыць этапы ў развіцці адукацыі і навукі на тэрыторыі Беларусі ў 19 ст.? У чым палягае іх спецыфіка?
11. Якія тыпы навучальных устаноў дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў першай трэці 19 ст.?
12. Якую ролю ў развіцці навукі Беларусі першай трэці 19 ст. мелі Віленскі ўніверсітэт і Полацкая езуіцкая акадэмія?
13. Якія прычыны прывялі да змен у адукацыйнай палітыцы царызму ў 1820-1830-я гг.? У чым канкрэтна праявіліся дадзеныя змены?

14. Падумайце, чаму царскі ўрад імкнуўся абмежаваць доступ прадстаўнікоў непрывілеяваных саслоўяў да адукацыі? Якія гэта мела вынікі?
15. У якіх установах ажыццяўляліся навуковыя даследаванні ў Беларусі ў другой трэці 19 ст.? Дайце характарыстыку дадзеных даследаванняў.
16. Якія факты сведчаць пра ўзмацненне палітыкі русіфікацыі з боку царызму ў адукацыйнай сферы ў апошняй трэці 19 ст.? Якія гэта мела наступствы для культурнага развіцця Беларусі?
17. У чым сутнасць адукацыйнай рэформы 1864 г.? У чым спецыфіка яе праяўлення ў Беларусі?
18. Чым можна патлумачыць істотную перавагу ў сістэме адукацыі Беларусі царкоўнапрыходскіх школ? Які змест мела навучанне ў гэтых школах?
19. Якія можна зрабіць агульныя высновы адносна ўзроўню адукаванасці беларускага насельніцтва ў 19 ст.?
20. Якія асаблівасці мелі навуковыя даследаванні ў Беларусі ў апошняй трэці 19 ст.? У якіх галінах яны пераважна ажыццяўляліся?
21. Які культурны накірунак панаваў у мастацкай культуры Беларусі першай паловы 19 ст.? Якім чынам ён праявіўся ў розных яе галінах?
22. Якія рысы рамантызму паўплывалі на фарміраванне беларускамоўнай літаратуры першай паловы 19 ст.?
23. Якія змены адбываюцца ў тэатральным жыцці Беларусі ў першай палове 19 ст.?
24. Якім чынам адбываецца развіццё беларускай літаратуры ў другой палове 19 ст.?
25. Ахарактарызуйце тэатральнае жыццё ў Беларусі ў другой палове 19 ст. Вызначце яго спецыфіку?
26. Параўнайце развіццё архітэктуры Беларусі ў першай і другой палове 19 ст.
27. Якія стылі і жанры пераважалі ў выяўленчым мастацтве Беларусі ў 19 ст.?
28. Якім чынам праяўлялася нацыянальная разнастайнасць мастацкай культуры Беларусі 19 ст.? Падумайце, якая сувязь маецца паміж фарміраваннем нацый і развіццём нацыянальных культур?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Моўна-культурная і канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў 19 ст.
2. Станаўленне беларускага нацыянальнага руху ў 19 ст.
3. Віленскі універсітэт як цэнтр развіцця культуры на землях былога ВКЛ у першай трэці 19 ст.
4. Полацкая езуіцкая акадэмія (1812-1820): дзейнасць, вынікі.
5. Гімназіі ў Беларусі 19 ст.
6. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні 19 ст. і іх роля ў стварэнні перадумоў беларускага нацыянальнага руху.
7. Польскамоўная літаратура ў Беларусі ў 19 ст.
8. Гарадскія тэатры ў Беларусі 19 ст.

## Тэма 15: Беларусь на пачатку 20 ст. (рэвалюцыя 1905-1907 гг. і перыяд 1907-1914 гг.).

**1. Прычыны і перадумовы рэвалюцыі 1905-1907 гг.**

**2. Ход, асноўныя этапы і вынікі рэвалюцыі 1905-1907 гг.**

**3. Эканамічнае развіццё Беларусі на пачатку 20 ст. Сталыпінская аграрная рэформа.**

**4. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў 1907-1914 гг.**

**5. Беларускі нацыянальны рух у 1905-1914 гг.**

### 15.1. Прычыны і перадумовы рэвалюцыі 1905-1907 гг.

На пачатку 20 ст. Расійская імперыя апынулася ў стане сістэмнага грамадскага крызісу, які выклікаў рэвалюцыю 1905-1907 гг. Асноўнымі прычынамі рэвалюцыі былі глыбокія *сацыяльныя праблемы*:

1) *Праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання.* Дзяржаўна-палітычны лад Расійскай імперыі вызначаўся як абсалютная манархія. Пры фарміраванні і функцыянаванні органаў дзяржаўнай улады адстунічалі элементы выбарнасці, адкрытасці і галоснасці. У дзяржаве амаль адсутнічалі грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды; панавала паліцэйска-бюракратычнае самавольства; захоўваўся саслоўны падзел грамадства з living рознымі правамі і абавязкамі для прадстаўнікоў розных саслоўяў. Станаўленне элементаў грамадзянскай супольнасці ў выніку капіталістычнай мадэрнізацыі (стварэнне грамадскіх арганізацый у эканамічнай і культурнай сферах, узнікненне элементаў сістэмы мясцовага і гарадскога самакіравання, фарміраванне рабочага руху) патрабавала дэмакратызацыі састарэлай сацыяльна-палітычнай сістэмы.

2) *Аграрная праблема.* Пераважная большасць насельніцтва пражывала ў вёсцы. Пазямельныя адносіны характарызаваліся перавагай буйнога памешчыцкага землеўладання. Сялянскае малазямелле і звязаныя з ім феадальныя перажыткі, захаванне абшчыны і кругавой парукі, вялікія выкупныя плацяжы і дзяржаўныя падаткі тармазілі развіццё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы і замаруджвалі развіццё прамысловасці. Патрэбы мадэрнізацыі грамадства дыктавалі неабходнасць глыбокіх пераўтварэнняў у аграрнай сферы.

3) *Нацыянальная праблема.* Па меры фарміравання нацый абвастраліся супярэчнасці паміж вялікадзяржаўнай русіфікатарскай палітыкай царызму і залежнымі ад яго народамі, якія цярпелі дыскрымінацыю з боку імперскіх уладаў у розных сферах (палітычнай, эканамічнай, адукацыйнай, рэлігійнай, моўнай і г.д.). Сярод іх у 19 – пачатку 20 стст. фарміруюцца самастойныя нацыянальныя рухі, што патрабавалі стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці ў форме аўтаноміі або поўнай незалежнасці (польскі, фінскі, украінскі, літоўскі, латышскі, грузінскі і інш.).

4) *Рабочая праблема.* Вытворчыя адносіны ў сферы прамысловасці і гандлю суправаджаліся кепскімі ўмовамі жыцця і працы рабочага класа (нізкая аплата працы, працяглы працоўны дзень, дрэнныя бытавыя ўмовы,

грамадзянскае бяспраўе). Дадзеныя ўмовы садзейнічалі развіццю рабочага руху і яго паступовай палітызацыі, што патрабавала карэнных пераўтварэнняў у сферы адносін паміж рабочымі і наймальнікамі.

На пачатку 20 ст. дадзеныя сацыяльныя праблемы асабліва абвастрыліся пад уплывам двух фактараў:

1) *Сусветны эканамічны крызіс 1900-1903 гг. і эканамічная дэпрэсія 1904-1908 гг.*, якая наступіла пасля яго. Крызіс стаў наступствам перавытворчасці ва ўмовах прамысловага ўздыму 1890-х гг. Яго праявамі сталі спыненне або скарачэнне вытворчасці на многіх прадпрыемствах, рост беспрацоўя, скарачэнне зарплаты рабочых. Усё гэта садзейнічала ўзрастанню сацыяльнай напружанасці ў грамадстве.

2) *Вайна Расійскай імперыі з Японіяй 1904-1905 гг.* за перадзел сфер уплыву на Далёкім Усходзе. Ваенныя няўдачы расійскага войска, шматлікія чалавечыя ахвяры садзейнічалі нарастанню грамадскай незадаволенасці.

У 1901-1904 гг. назіраецца *сацыяльна-палітычны крызіс царскага рэжыму*. Пра гэта сведчаць наступныя з’явы:

1) *Развіццё рабочага руху*. На працягу 1901 – 1904 гг. значна ўзрасла колькасць рабочых выступленняў; на тэрыторыі Беларусі, у стачках, звязаных з эканамічнымі прычынамі, прыняло ўдзел 20 тыс. чалавек. Адметнай рысай рабочага руху ў 1901 – 1904 гг. становіцца яго палітызацыя: у стачках, звязаных з палітычнымі прычынамі, у 1901 – 1904 гг. на тэрыторыі Беларусі прыняло ўдзел 34 тыс. чалавек.

2) *Актывізацыя рэвалюцыйнага палітычнага руху*. У 1901 – 1904 гг. узрастае ўплыў рэвалюцыйных партый і арганізацый. Ва ўсіх значных гарадах і некаторых мястэчках дзейнічалі арганізацыі ПСР, РСДРП, Бунда, ППС на Літве, БСГ, групы анархістаў. Рэвалюцыйныя суполкі актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі стачак, палітычных дэманстрацый і маніфестацый; узрасла іх прапагандысцкая актыўнасць.

3) *Палітыка лавіраванняў з боку царскай улады*. Царызм з мэтай змяншэння грамадскай незадаволенасці пайшоў на правядзенне некаторых рэформ у розных сферах сацыяльнага жыцця: увядзенне рабочага заканадаўства ў дробнай і рамеснай прамысловасці, скасаванне кругавой парукі сялян пры спагнанні падаткаў 1903 г., адмена цялесных пакаранняў для сялян 1904 г. З мэтай нейтралізаваць уплыў рэвалюцыйнага руху ажыццяўлялася падтрымка кантралюемых уладамі грамадскіх рухаў, да якіх належыць залічыць “паліцэйскі сацыялізм” і сіянізм.

“*Паліцэйскі сацыялізм*” уяўляў з сябе арганізацыю некаторымі прадстаўнікамі ўлады рабочых саюзаў, якія ставілі сваёй задачай забеспячэнне элементарных эканамічных і культурных патрабаванняў рабочых, каб тым самым ізаляваць іх ад палітычнай барацьбы. Паколькі ў Беларусі колькасна пераважаў яўрэйскі пралетарыят, “паліцэйскі сацыялізм” укараняўся перадусім сярод яўрэйскіх рабочых. У 1901-1903 гг. у Мінску, Вільні і Адэсе ў дадзеным накірунку дзейнічала *Яўрэйская незалежная рабочая партыя*, якая на кароткі час атрымала дастаткова значны ўплыў.

*Сіянізм* узнікае ў канцы 19 ст. і уяўляе з сябе сусветны рух яўрэяў за вяртанне ў Палесціну і ўтварэнне там яўрэйскай дзяржавы. Сіяністы прапагандавалі ідэі аб богаабранасці яўрэйскага народа і шкоднасці для яго нацыянальных інтарэсаў удзелу ў грамадска-палітычным руху краін дыяспары. У сувязі з гэтым царызм не перашкаджаў дзейнасці сіяністаў і спрабаваў яго выкарыстаць для пераадолення ўплыву рэвалюцыйных арганізацый сярод яўрэйскіх рабочых. У 1902 г. з дазволу ўлад у Мінску адбыўся *усерасійскі сіянісцкі з'езд*. Аднак колькасны рост сіянізму прывёў да фарміравання ў ім радыкальных плыняў. У сувязі з гэтым прапаганда сіянізму ў Расійскай імперыі летам 1903 г. была забаронена.

*Такім чынам, на пачатку 20 ст. на землях Беларусі назіралася сітуацыя грамадска-палітычнага крызісу, выкліканага цэлым шэрагам сацыяльных праблем, які прывёў да рэвалюцыі 1905-1907 гг.*

**15.2. Ход, асноўныя этапы і вынікі рэвалюцыі 1905-1907 гг.**

Непасрэдным пачаткам рэвалюцыі сталі падзеі *9 студзеня 1905 г.* у Пецярбургу (*"Крывавая нядзеля"*). У гэты дзень адбылося 140-тысячнае мірнае шэсце рабочых да царскага палаца па ініцыятыве лідэра рабочай арганізацыі, створанай першапачаткова ў духу "паліцэйскага сацыялізму", Г. Гапона з патрабаваннямі дэмакратычных рэформ, спынення вайны з Японіяй і паляпшэння матэрыяльнага становішча пралетарыяту. Паводле загаду царскіх улад шэсце было расстраляна, у выніку чаго загінула звыш 1 тыс. чалавек. Вестка пра гэтыя падзеі выклікала шырокае грамадскае абурэнне, якое стала пачаткам масавых рэвалюцыйных дзеянняў.

Рэвалюцыя 1905-1907 гг. у Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Беларусі, у сваім развіцці прайшла праз некалькі этапаў:

*Першы этап* працягваўся са студзеня па верасень 1905 г. Ён характарызаваўся паступовым нарастаннем рэвалюцыйнага руху, галоўнай формай якога з'яўляліся палітычныя стачкі і вулічныя выступленні (дэманстрацыі, мітынгі, маніфестацыі).

На тэрыторыі Беларусі рэвалюцыя пачынаецца ў студзені 1905 г. з правядзення *забастовак салідарнасці* з пецярбургскімі рабочымі, што ахапілі 30 гарадоў і мястэчак і суправаджаліся масавымі дэманстрацыямі і мітынгамі. У забастоўках салідарнасці ў Беларусі прынялі ўдзел каля 34 тыс. чалавек. У лютым-сакавіку 1905 г. хваля палітычных выступленняў рэзка знізілася, але ў красавіку-чэрвені назіраецца новы ўздым, звязаны са святкаваннем 1 Мая, а таксама з пратэстамі супраць рэпрэсій царскага ўрада. У палітычных стачках у гэтыя месяцы ўдзельнічала каля 100 тыс. чалавек. У Пінску ў красавіку 1905 г. палітычная забастоўка набыла ўсеагульны характар. У антыўрадавых палітычных выступленнях у гарадах Беларусі прымалі ўдзел прадстаўнікі розных сацыяльных слаёў: рабочыя, служачыя, рамеснікі, дробныя гандляры, інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь.

Адначасова з палітычнымі выступленнямі назіраўся ўздым *эканамічных стачак рабочых* з патрабаваннямі скарачэння працоўнага дня, павелічэння заработнай платы, паляпшэння ўмоў працы, дапушчэння ўдзелу сваіх

прадстаўнікоў у вырашэнні пытанняў, звязаных з устанаўленнем расцэнак, прыёмам і звальненнем з працы і інш. У выніку забастовак, праведзеных вясной і летам 1905 г., рабочыя Беларусі ў многіх выпадках дамагліся істотнага павышэння заробкаў, скарачэння працоўнага дня да 9-10 гадзін, абмежавання самавольства ўласнікаў прадпрыемстваў і г.д.

Паступова рэвалюцыйныя хваляванні перакінуліся ў вёску. У студзені-чэрвені 1905 г. у Беларусі адбылося 290 сялянскіх выступленняў. Паводле прыкладу прамысловых рабочых арганізоўваюцца *забастоўкі сельскагаспадарчых рабочых* у памешчыцкіх маёнтках з патрабаваннямі павелічэння зарплаты і скарачэння працоўнага дня. Найбольш значнай сярод іх была забастоўка сялян-падзёншчыкаў і батракоў у чэрвені 1905 г. у маёнтках Навагрудскага павета.

Летам 1905 г. рэвалюцыйны рух ахапіў амаль усе рэгіёны Расійскай імперыі. У некаторых гарадах адбыліся масавыя антыўрадавыя выступленні (Варшава, Лодзь, Іванава-Вазнясенск, Адэса). У чэрвені выбухнула паўстанне матросаў Чарнаморскага флота на браняносцы “Пацёмкін”. Дадзеныя падзеі вымусілі царскі ўрад дэкларавацць пэўныя саступкі. 6 жніўня 1905 г. цар Мікалай ІІ падпісаў маніфест аб заснаванні *Дзяржаўнай думы*, праект якой быў распрацаваны міністрам унутраных спраў А.Р. Булыгіным (адсюль назва “булыгінская дума”). Дзяржаўная дума павінна была стаць прадстаўнічым органам, прызначаным для абмеркавання праектаў законаў, бюджэту і г.д. і падачы рэкамендацый, аднак яна не мела права самастойнага прыняцця законаў, што заставалася прэрагатывай імператара. Выбары ў думу былі шматступеннымі, а прадстаўніцтва розных сацыяльных слаёў непрапарцыянальнае; большая частка насельніцтва наогул была пазбаўлена выбарчых правоў. Усе рэвалюцыйныя і частка ліберальных арганізацый заклікалі да байкоту выбараў у “булыгінскую думу”. У цэлым хваля рэвалюцыйных выступленняў у жніўні-верасні 1905 г. значна зменшылася.

*Другі этап* прыходзіўся на кастрычнік-снежань 1905 г. Для яго характэрны найвышэйшы ўздым рэвалюцыі, адзначаны масавымі антыўрадавымі выступленнямі. 7-17 кастрычніка па ўсёй імперыі разгарнулася *Усерасійская палітычная стачка*, якая пачалася з усеагульнай стачкі чыгуначнікаў. У межах усёй дзяржавы спыніліся чыгункі, большасць прамысловых прадпрыемстваў, амаль не працавала сувязь. Стачка адбывалася пад лозунгам ліквідацыі самадзяржаўя і ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі. На тэрыторыі Беларусі стачка распаўсюдзілася на 32 населеныя пункты; у ёй удзельнічала толькі ў прамысловасці каля 66 тыс. чалавек. На ўзроўні асобных буйных прадпрыемстваў і некаторых чыгуначных вузлоў стачкай кіравалі выбраныя рабочымі *стачачныя камітэты*. Рэвалюцыйныя арганізацыі для каардынацыі дзеянняў на ўзроўні гарадоў утваралі *кааліцыйныя саветы і камісіі*. Стачка суправаджалася масавымі мітынгамі і дэманстрацыямі.

Ва ўмовах нарастання рэвалюцыйнага руху цар Мікалай ІІ падпісаў *маніфест 17 кастрычніка*, паводле якога Дзяржаўная дума надзялялася заканадаўчымі паўнамоцтвамі, пашыраўся кантынгент выбаршчыкаў,

абвяшчалася ўвядзенне дэмакратычных свабод: слова, друку, сходаў, саюзаў, сумлення і г.д. Пасля абвяшчэння маніфеста наступіла некаторая лібералізацыя грамадскага жыцця: адбывалася стварэнне новых палітычных партый і грамадскіх арганізацый, былі легалізаваны некаторыя нізавыя арганізацыі рэвалюцыйных партый, пачалі легальна выходзіць апазіцыйныя друкаваныя выданні. У той жа час царызм спалучаў палітыку саступак рэвалюцыйнаму руху з рэпрэсіямі. Так, 18 кастрычніка 1905 г., паводле распараджэння мінскага губернатара Курлова, у Мінску быў расстраляны масавы 20-тысячны мітынг, у выніку чаго загінула каля 100 чалавек.

Нягледзячы на спыненне ўсеагульнай стачкі рэвалюцыйныя выступленні ў краіне працягваліся. У снежні 1905 г. адбылася новая *Усерасійская палітычная стачка*, якая пачалася зноў з усеагульнай стачкі чыгуначнікаў. У Маскве і некаторых іншых расійскіх гарадах яна перарасла ва ўзброенае паўстанне. У Беларусі стачка ахапіла 17 гарадоў і мястэчак; у ёй удзельнічалі каля 44 тыс. чалавек. На чале стачкі знаходзіліся чыгуначныя камітэты і кааліцыйныя саветы рэвалюцыйных арганізацый. Найбольш значныя выступленні ў гэты час адбыліся ў Баранавічах і Гомелі. У кастрычніку-снежні 1905 г. назіраўся значны ўздым сялянскага руху: за два месяцы ў Беларусі былі зафіксаваны 494 сялянскія выступленні. У Гродне, Брэсце і Бабруйску адбываліся хваляванні салдат.

Царызму ўдалося задушыць снежаньскія выступленні ў гарадах і сялянскія хваляванні з дапамогай войска і паліцыі. Былі праведзены жорсткія рэпрэсіі, зачынены многія апазіцыйныя выданні. У той жа час царскія ўлады, імкнучыся ўмацаваць сваё становішча, ішлі на некаторыя саступкі рэвалюцыйнаму руху. У снежні 1905 г. была адменена крымінальная адказнасць за ўдзел у стачках; у сакавіку 1906 г. дазволена дзейнасць *прафесійных саюзаў* рабочых. 11 снежня 1905 г. быў абвешчаны *закон аб выбарах* у першы расійскі парламенцкі орган улады – Дзяржаўную думу.

*Трэці этап рэвалюцыі* працягваўся са студзеня 1906 г. да чэрвеня 1907 г. Яго адметнасцю сталі дзве тэндэнцыі: паступовае затуханне стачачнага руху і вулічных выступленняў і перанясенне палітычнай барацьбы ў парламент.

Пасля разгрому рэвалюцыйных выступленняў канца 1905 г. галоўная ўвага грамадскасці была засяроджана на *выбарах у I Дзяржаўную думу*, з якой многія звязвалі надзеі на правядзенне грамадскіх рэформ. Паводле закона аб выбарах, шматлікія катэгорыі ніжэйшых слаёў насельніцтва, а таксама жанчыны, былі пазбаўлены выбарчага права. Выбары былі няроўныя і шматступеньчатыя. Усе выбаршчыкі ў залежнасці ад саслоўнай прыналежнасці падзяляліся на курыі; прадстаўніцтва ад курый было арганізавана такім чынам, што фактычна 1 голас двараніна быў роўны 3,5 галасам гарадской буржуазіі, 15 галасам сялян і 45 галасам рабочых.

На пачатак 1906 г. у грамадска-палітычным жыцці Беларусі выразна былі выяўлены *3 палітычныя блокі*: правы (кансерватыўны), цэнтрысцкі (ліберальны), левы (рэвалюцыйна-дэмакратычны).

Да *правага блоку* належалі ў першую чаргу *Саюз рускага народа* (чарнасоценцы) і *Саюз 17 кастрычніка* (акцябрысты). У Беларусі арганізацыі

дадзеных партый узніклі амаль ва ўсіх значных гарадах і некаторых мястэчках. На чале іх знаходзіліся рускія чыноўнікі-дваране і праваслаўнае духавенства. У той жа час у склад арганізацый уваходзілі і манархічна настроеныя прадстаўнікі ніжэйшых слаёў грамадства. У аснове ідэалогіі дадзеных партый знаходзіліся манархізм і рускі нацыянал-шавінізм, які культываваў варожасць да нярускіх народаў, у першую чаргу яўрэяў (галоўны лозунг "Расія для рускіх"). На землях Беларусі правыя сілы лічылі сваёй апорай праваслаўнае насельніцтва, якое абвяшчалася рускім. Ва ўсіх сацыяльных праблемах, з якімі сутыкалася "рускае" насельніцтва вінаватымі абвяшчаліся яўрэі і каталікі-палякі, з імі ж атаясамліваліся і рэвалюцыйныя сілы. Пад уплывам чарнасоценнай агітацыі адбыліся яўрэйскія пагромы ў Мінску (загінулі 54 чалавекі), Гомелі, Беластоку, Оршы, Рэчыцы; ажыццяўляліся напады на антыўрадавыя дэманстрацыі і мітынгі, забойствы рэвалюцыйных дзеячоў.

Галоўнай сілай *цэнтрысцкага, ліберальнага блоку* з'яўлялася *Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя народнай свабоды (кадэты)*, якая ўзнікла ў кастрычніку 1905 г. У аснове ідэалогіі дадзенай партыі знаходзіўся лібералізм. У праграме кадэтаў змяшчаліся наступныя асноўныя ідэі:

–эвалюцыйная трансфармацыя Расійскай імперыі ў канстытуцыйную манархію;

–станаўленне і развіццё дэмакратычных грамадзянскіх і палітычных свабод; ліквідацыя саслоўных і нацыянальных абмежаванняў;

–развіццё мясцовага самакіравання, наданне народам імперыі нацыянальна-культурнай аўтаноміі (права на дзяржаўную аўтаномію прызнавалася толькі за Фінляндыяй і Польшчай);

–вырашэнне аграрнай праблемы шляхам частковага пераразмеркавання памешчыцкай зямлі на карысць сялян.

У Расіі аснову кадэцкай партыі складалі дзеячы земстваў і акадэмічная інтэлігенцыя. У Беларусі з-за адсутнасці земстваў і вышэйшых навучальных устаноў невялікія групы кадэтаў узніклі толькі ў Маглёве і Пінску. Аднак кадэтаў падтрымлівалі тут яўрэйскія ліберальныя арганізацыі (*Саюз дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі* і інш.), сіяністы. Да ліберальнага блоку належала таксама *Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Беларусі і Літвы*, створаная ў пачатку 1906 г. па ініцыятыве каталіцкага духавенства. Яе дзейнасць разгортвалася пераважна ў Віленскай губерні. Праграма партыі была блізкай да кадэцкай, аднак упор у ёй рабіўся на неабходнасці шырокага мясцовага самакіравання на землях Беларусі і Літвы, абароне свабоды каталіцкага веравызнання; у адрозненне ад кадэтаў абвяшчалася непахіснасць памешчыцкага землеўладання. Усе ліберальныя арганізацыі лічылі неабходным для дасягнення сваіх мэт актыўна ўдзельнічаць у парламенцкай дзейнасці.

*Рэвалюцыйна-дэмакратычны блок* прадстаўлялі левыя партыі і арганізацыі (РСДРП, ПСР, Бунд, ППС на Літве, БСГ, анархісты). Нягледзячы на ідэйныя адрозненні паміж імі, усе яны выступалі за рэвалюцыйнае

звяржэнне самадзяржаўя і правядзенне карэнных грамадскіх рэформ у духу ідэй сацыялізму. Будучае паслярэвалюцыйнае дзяржаўна-палітычнае ўладкаванне большасць рэвалюцыйных арганізацый бачыла як федэрацыю раўнапраўных дэмакратычных рэспублік. Паводле аграрнага пытання левыя сілы выступалі за поўную ліквідацыю памешчыцкага землеўладання і перадачу зямлі сялянам. Выбары ў І Дзяржаўную думу яны байкатавалі, адзначаючы недэмакратычнасць выбарчага заканадаўства і спадзеючыся на новы ўздым масавых выступленняў.

На выбарах у *І Дзяржаўную думу* ад Беларусі было абрана 36 дэпутатаў, сярод якіх было 29 прадстаўнікоў ліберальных сіл. Ва ўмовах байкоту выбараў левымі гэта сведчыла пра апазіцыйнасць грамадскіх настрояў у Беларусі ў цэлым. І Дума пачала працаваць у красавіку 1906 г. Буйнейшай фракцыяй у ёй стала *кадэцкая*. Група сялянскіх дэпутатаў ўтварыла больш левую фракцыю *трудавікоў*. Многія дэпутаты ад нацыянальных ускраін імперыі, у тым ліку ад Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі, далучыліся да фракцыі *аўтанамістаў*. Правыя сілы апынуліся ў яўнай меншасці. У цэнтры думскіх дэбатаў паўстала аграрнае пытанне. Былі прадстаўлены два асноўныя законапраекты: кадэцкі, які прадугледжваў частковую перадачу памешчыцкіх і дзяржаўных зямель сялянам, і фракцыі трудавікоў, згодна з якім памешчыцкае землеўладанне скасоўвалася, праводзілася перадача зямлі ў грамадскі фонд, з якога яна размяркоўвалася паміж сялянамі паводле ўраўняльнага прынцыпу. Для царызму падобныя праекты былі непрымальныя. Дэпутаты Думы абвясцілі недавер царскаму ўраду і патрабавалі яго адстаўкі. У адказ цар 9 ліпеня 1906 г. разагнаў Думу, абвясціўшы пры гэтым аб новых выбарах.

Падчас працы І Думы вясной-летам 1906 г. назіраецца некаторы ўздым рэвалюцыйнага, рабочага і сялянскага руху. Спадзеючыся на яго рост, частка дэпутатаў разагнанай Думы 10 ліпеня 1906 г. выдала адозву да народа ("*Выбаргская адозва*"), у якой заклікала да масавага грамадзянскага непадпарадкавання. Аднак масавага руху не адбылося, галоўнай прычынай чаго стала *палітыка рэпрэсій*, якую стаў актыўна праводзіць царскі ўрад на чале з П.А. Сталыпіным. Паводле яго распараджэнняў, ствараліся *ваенна-палявыя суды*, якія ў паскораным парадку вялі справы супраць удзельнікаў рэвалюцыйных выступленняў; шырока практыкавалася пакаранне смерцю. Падвяргаліся праследам апазіцыйныя партыі, прафсаюзы, незалежныя перыядычныя выданні.

У падобных умовах праходзілі выбары ў *ІІ Дзяржаўную думу*. Левыя сілы з-за правалу байкоту ў І Думу таксама ўдзельнічалі ў іх. На выніkі выбараў істотна паўплывалі адміністрацыйны націск і шырокая прапаганда з боку правых. Сярод 36 дэпутатаў, абраных ад Беларусі, 15 належалі да правага блока, 11 – да аўтанамістаў, 2 – да кадэтаў, 8 былі беспартыйнымі. Ніводзін кандыдат ад левых сіл у Думу не трапіў.

Аднак у цэлым у ІІ Дзяржаўнай думе, якая пачала працу 20 лютага 1907 г., пераважалі левыя; кадэты і аўтанамісты ўтваралі ўплывовыя цэнтрысцкія фракцыі; правыя знаходзіліся ў меншасці. У такіх умовах Дума

спрабавала вырашыць тыя пытанні, якія стаялі і перад I Думай, што хутка прывяло дя яе канфлікту з царскім урадам. Улічваючы істотны спад рэвалюцыйнага руху, цар *3 чэрвеня 1907 г.* разагнаў Думу і выдаў *новы выбарчы закон*. Паводле гэтага закону шматступенчатая сістэма выбараў была перапрацавана такім чынам, што надавала яўную перавагу дваранскаму прадстаўніцтву (1 голас двараніна фактычна быў роўны 4 галасам гарадской буржуазіі, 260 галасам сялян, 543 галасам рабочых). Гэтая падзея азначала канец рэвалюцыі 1905-1907 гг.

*Такім чынам, рэвалюцыя 1905-1907 гг., паводле меркавання большасці гісторыкаў, з'яўлялася буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй, паколькі была накіравана на стварэнне ўмоў для больш хуткага развіцця капіталістычных адносін у эканоміцы і дэмакратызацыі грамадска-палітычнай сістэмы.*

*У цэлым рэвалюцыя 1905-1907 гг. пацярпела паражэнне, паколькі не здолела змяніць асновы сацыяльна-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу, не змагла вырашыць галоўныя сацыяльныя праблемы, якія з'яўляліся прычынамі рэвалюцыі.* Аднак у выніку рэвалюцыі царызмам былі праведзены некаторыя пераўтварэнні, накіраваныя на змякчэнне дадзеных праблем:

- стварэнне агульнадзяржаўнага органа парламенцкай улады, які некалькі абмяжоўваў царскі абсалютызм;
- абвяшчэнне грамадзянскіх і палітычных правоў і свабод – слова, друку, правядзення сходаў, стварэння палітычных партый і грамадскіх арганізацый (аднак не ў поўным аб'ёме і без гарантый іх захавання);
- адмена з 1907 г. выкупных плацяжоў для сялянства; некаторае абмежаванне чыноўніцкага і памешчыцкага самавольсва ў вёсцы;
- паляпшэнне рабочага заканадаўства; дазвол на дзейнасць прафсаюзаў;
- дазвол на выкарыстанне ў друку і часткова ў сферы адукацыі моў нацыянальных меншасцяў Расійскай імперыі.

*Аднак дадзеныя мерапрыемствы здолелі толькі часткова зменшыць грамадскія супярэчнасці, якія ў цэлым заставаліся нявырашанымі і стваралі глебу для будучых сацыяльных канфліктаў.*

### 15.3. Эканамічнае развіццё Беларусі на пачатку 20 ст. Сталыпінская аграрная рэформа.

У эканоміцы Беларусі на пачатку 20 ст. па-ранейшаму галоўнай сферай заставалася сельская гаспадарка. Аграрная праблема была ў ліку найбольш вострых як у Беларусі, так і ў цэлым у Расійскай імперыі, пра што сведчыў моцны выбух сялянскага руху падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Усё гэта абумовіла правядзенне царскім урадам аграрнай рэформы, накіраванай на паскарэнне развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, павышэнне яе прадукцыйнасці, а таксама стварэнне ў вёсцы новай апоры царызму з ліку прадпрымальных заможных сялян. Указ аб правядзенні рэформы быў выдадзены 9 лістапада 1906 г. Паколькі яе галоўным ініцыятарам з'яўляўся кіраўнік царскага ўрада П.А. Сталыпін, яна атрымала назву *сталыпінскай*. Рэформа ўключала ў сябе наступныя накірункі:

- замацаванне за сялянамі права на выхад з абшчыны і пераход зямельных надзелаў, якія імі апрацоўваліся, у прыватную ўласнасць;

- наданне сялянам права аб’ядноўваць надзелы, якія імі апрацоўваліся ва ўмовах цераспалосіцы, у адзіным комплексе (*водруб*), або ўвогуле высяляцца з вёскі і фарміраваць асобную сядзібу з прылеглымі да яе сельскагаспадарчымі ўгоддзямі (*хутар*);

- арганізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на развіццё агратэхнікі, меліярацыі, распаўсюджанне сельскагаспадарчых машын і абсталявання, падрыхтоўку аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынараў, заахвочванне развіцця сельскагаспадарчай кааперацыі;

- матэрыяльная падтрымка заможнага сялянства ў набыцці зямлі, сельскагаспадарчых машын, увядзенні перадавых форм гаспадарання, у першую чаргу шляхам выдачы крэдытаў праз Сялянскі пазямельны банк;

- арганізацыя перасялення сялян на свабодныя землі Сібіры, Цэнтральнай Азіі і Далёкага Усходу з мэтай змяншэння сялянскага малазямелля ў еўрапейскай частцы імперыі;

- адмена для сялян абмежаванняў на свабодны выбар пастаяннага месца жыхарства, паступленне ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Спецыфіка сітуацыі ў Беларусі складалася ў тым, што ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях абшчына на той час ужо не існавала, таму праблема фарміравання сялянскай прыватнай зямельнай уласнасці тут была неактуальнай. Рэформа праводзілася пераважна на тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Блізкасць гэтых губерняў да тэрыторый з падворным землекарыстаннем, а таксама адносна высокі ўзровень развіцця рынкавых адносін у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі абумовілі тут высокія тэмпы правядзення рэформы.

Правядзенне рэформы ажыццяўлялася губернскімі і павятовымі землеўпарадкавальнымі камісіямі. У некаторых месцах разбурэнне абшчыны адбывалася з дапамогай прымусовых сродкаў, што выклікала незадаволенасць сялянства. У цэлым у выхадзе з абшчыны былі зацікаўлены ў першую чаргу заможныя і бяднейшыя сяляне. Першыя – для таго, каб стварыць умовы для больш эфектыўнага вядзення гаспадаркі; другія – для таго, каб атрымаць магчымасць продажу сваіх невялікіх надзелаў і знайсці больш выгадныя для сябе ўмовы продажу рабочай сілы (у прамысловасці, гандлі і г.д.). Сярэдняе сялянства было пераважна непрыхільна настроена ў адносінах да рэформы і выступала за захаванне абшчыны.

Ажыццяўленне рэформы прыходзілася на 1906-1916 гг. За гэты перыяд яна прынесла наступныя *вынікі*:

1) Да 1915 г. 48% сялян Магілёўскай і Віцебскай губерняў пакінулі абшчыну і замацавалі свае зямельныя надзелы ў прыватную ўласнасць (для параўнання: у Расійскай імперыі ў цэлым – 22%).

2) Да 1916 г. на хутары ў беларускіх губернях перасялілася 12% сялян (у Расійскай імперыі ў цэлым – 10%).

3) На працягу 1906-1916 гг. актыўна праходзіў працэс продажу часткі памешчыцкіх зямель ва ўласнасць заможным сялянам, купцам і мяшчанам.

4) Да 1914 г. з беларускіх губерняў у Сібір і Цэнтральную Азію перасялілася каля 350 тыс. чалавек (з іх вярнулася каля 10%); паскорыўся працэс перасялення сялян у гарады Расійскай імперыі, а таксама ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыкі (за 1903-1913 гг. з беларускіх зямель за мяжу эмігравала каля 1,5 млн. чалавек, з якіх вярнулася на радзіму каля 600 тыс.).

5) Умацаванне капіталістычнай сістэмы гаспадарання ў памешчыцкіх зяельных уладаннях; узрастанне колькасці наёмных сельскагаспадарчых рабочых (да 1914 г. у сельскай гаспадарцы на аснове капіталістычнага найму працавала каля 200 тыс. рабочых).

6) Узмацненне сацыяльнага расслаення сярод сялянства. На пачатак Першай сусветнай вайны незаможнае сялянства складала каля 68% двароў, сярэдняе – 20%, заможнае – 12%.

7) Паскарэнне тэхнічнай мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, паляпшэнне агратэхнікі, развіццё сельскагаспадарчай кааперацыі, значнае павелічэнне колькасці сельскагаспадарчых спецыялістаў.

8) Развіццё таварна-грашовых рыначных сувязяў у сельскай гаспадарцы; рост сельскагаспадарчага экспарту. Умацоўваецца спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі на такіх галінах як бульбаводства, ільноводства, мяса-малочная жывёлагадоўля.

*Сталыпінская аграрная рэформа была перарвана ў сувязі з Першай сусветнай вайной. Праведзеныя ў яе межах мерапрыемствы садзейнічалі развіццю рыначных капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Аднак дадзеныя працэсы не маглі карэнным чынам паскорыць мадэрнізацыю сельскай гаспадаркі, галоўнымі прычынамі чаго з'яўляліся захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання і сялянскае малазямелле. Таму рэформа толькі часткова зменшыла вастрыню аграрнай праблемы.*

У *прамысловасці* Беларусі пасля працяглай эканамічнай дэпрэсіі 1904-1908 гг. адбываецца *прамысловы ўздым 1909-1914 г.* Сярэднегадовыя тэмпы росту прамысловай прадукцыі складалі 13,9%. Яго асноўнымі прычынамі з'яўляліся:

- сусветныя эканамічныя працэсы, звязаныя з выхадам сусветнай эканомікі з дэпрэсіі і пачаткам яе росту, што выклікала агульнае павелічэнне попыту на прамысловую прадукцыю;

- пашырэнне ўнутранага рынку, што было звязана з больш хуткім ў параўнанні з папярэднімі часамі ўцягваннем сельскай гаспадаркі ў таварна-грашовыя рыначныя адносіны ва ўмовах сталыпінскай аграрнай рэформы;

- падрыхтоўка царызму да буйной вайны, што садзейнічала росту капіталаўкладанняў і заказаў у прамысловасці.

Прамысловы ўздым выклікаў наступныя працэсы ў прамысловасці Беларусі:

1) *Канцэнтрацыя вытворчасці*: Адбываецца паскораны рост буйной фабрычна-заводскай прамысловасці. За перыяд 1900-1913 гг удзельная вага вырабленай на буйных прадпремствах прадукцыі ўзрасла з 33% да 46,5%. Сярод буйнейшых прадпрыемстваў, што ўзніклі ў пачатку 20 ст., можна назваць мінскую шпалерную фабрыку, абутковую фабрыку "Арол" у Мінску,

шклозавод “Неман” у Лідскім павеце. Дынаміка суадносін буйной, дробнай і рамесна-саматужнай прамысловасці адлюстравана ў наступнай табліцы.

| Прамысловыя прадпрыемствы | Колькасць прадпрыемстваў | | | Колькасць рабочых, тыс. чал. | | | Валавая прадукцыя, млн. руб. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 | 1913 | 1913, % да 1900 | 1900 | 1913 | 1913, % да 1900 | 1900 | 1913 | 1913, % да 1900 |
| Буйная | 799 (0,9%) | 1282 (1,3%) | 161,2 | 31,1 (17,7%) | 54,9 (22,9%) | 176,5 | 38,4 (33,0%) | 88,3 (46,5%) | 229,6 |
| Дробная | 7297 (8,6%) | 7778 (7,8%) | 106,6 | 14,8 (8,5%) | 16,0 (6,7%) | 108,1 | 10,7 (9,2%) | 11,7 (6,2%) | 110,0 |
| Рамесна-саматужная | 77050 (90,5%) | 90763 (90,9%) | 117,8 | 129,2 (73,8%) | 168,8 (70,4%) | 130,6 | 67,3 (57,8%) | 89,8 (47,3%) | 163,1 |
| Усяго | 85146 | 99823 | 117,2 | 175,1 | 239,7 | 136,9 | 119,4 | 189,8 | 163,1 |

2) *Канцэнтрацыя капіталу*: Адбываецца працэс стварэння новых прадпрыемстваў у выніку злучэння капіталаў розных уладальнікаў шляхам арганізацыі *акцыянерных таварыстваў*. У 1914 г. у Беларусі дзейнічалі 34 акцыянерныя прадпрыемствы, палова з якіх узнікла ў перыяд 1908 – 1914 гг. З 1900 да 1913 г. аб’ём вытворчасці на акцыянерных прадпрыемствах Беларусі павялічыўся ў 5,2 разы. Адначасова з’яўляюцца *манапалістычныя аб’яднанні* – аб’яднанні некалькіх прадпрыемстваў пэўнай галіны вытворчасці для дасягнення кантролю над рынкамі сыравіны, збыту і цэнамі на прадукцыю. У Беларусі найбольш хутка працэсы манапалізацыі праходзілі ў лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці. Да ліку буйнейшых манаполій належалі Камітэт запалкавых фабрыкантаў Заходняга краю, Саюз лесапрамыслоўцаў Паўночна-Заходняга краю і інш. Некаторыя з іх уваходзілі ва ўсерасійскія манапалістычныя групы.

3) *Рост замежных інвестыцый*: Замежны капітал (нямецкі, аўстрыйскі, французскі, бельгійскі, амерыканскі) стаў актыўна пранікаць у прамысловасць Беларусі, асабліва ў лесараспрацоўку. У 1913 г. яго ўдзельная вага ў валавой прадукцыі буйной прамысловасці складала 6,7%.

4) *Узмацненне ролі ў прамысловай вытворчасці банкаўскага капіталу*: Да 1914 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі аддзяленні Дзяржаўнага і 18 камерцыйных банкаў, з якіх найбольш буйнымі былі аддзяленні Руска-Азіяцкага, Азова-Данскога, Руска-Французскага, Віленскага камерцыйнага банкаў. Праз прыватныя банкірскія канторы, што выступалі ў ролі пасярэднікаў, ажыццяўляліся інвестыцыі банкаў у прамысловасць. Аб’ём банкаўскіх інвестыцый у эканоміку за 1902-1914 гг. узрос у 5,2 разы.

5) *Рост рабочага класа ў прамысловасці* (239,7 тыс. чалавек на 1913 г.); павелічэнне сярод яго долі кваліфікаваных рабочых; некаторае паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых.

У структуры прамысловасці Беларусі найбольш хутка развіваліся і мелі перавагу галіны, заснаваныя на перапрацоўцы мясцовай сыравіны: харчовая, дрэваапрацоўчая, шкляная, тэкстыльная, гарбарна-абутковая.

У цэлым, нягледзячы на рост канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу, у прамысловасці Беларусі пераважала дробная і рамесна-саматужная

вытворчасць, якая давала 53,5% усёй прамысловай прадукцыі (для параўнання: у Расійскай імперыі ў цэлым – 31,4%). У 1913 г. у Беларусі на душу насельніцтва прыпадала амаль у 2 разы менш прамысловай прадукцыі, чым у Расійскай імперыі. У структуры нацыянальнага даходу Беларусі на 1913 г. доля прамысловасці складала толькі 20,4%.

Развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі абумовіла пашырэнне *транспартнай сістэмы*. Працягвалася чыгуначнае будаўніцтва. Самай вялікай чыгуначнай лініяй, пабудаванай на пачатку 20 ст., з'яўлялася лінія Балагое-Полацк-Маладзечна-Седлецк.

У *гандлі* Беларусі хутка павялічвалася роля аптовага і рознічнага тавараабароту, які выцясняў кірмашы і базары. Ішоў працэс канцэнтрацыі гандлёвага капіталу: у 1913 г. у Беларусі налічвалася 220 гандлёвых дамоў і акцыянерных таварыстваў. Узрастала значэнне банкаў у правядзенні гандлёвых аперацый. Пашыраліся знешнегандлёвыя сувязі: асноўнымі прадметамі экспарту выступалі лес, лён, мяса-малочная прадукцыя; імпарту – прадукты прамысловай вытворчасці.

Развіццё прамысловасці і гандлю абумовіла далейшы рост гарадоў. На пачатку 20 ст. у якасці буйнейшых гандлёва-прамысловых цэнтраў Беларусі вылучаліся Мінск і Віцебск. Аднак працэнт гарадскога насельніцтва за перыяд 1900-1913 г. вырас нязначна – з 14% да 16%.

*Такім чынам, на пачатку 20 ст. у эканоміцы беларускіх зямель назіраецца паскарэнне развіцця рыначных капіталістычных адносін; адбываецца канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу. Істотны штуршок гэтаму дала сталыпінская аграрная рэформа. Аднак у цэлым Беларусь заставалася аграрным краем. У сельскай гаспадарцы працягвалі захоўвацца элементы натуральнай гаспадаркі, перажыткі феадалізму, што стрымлівала працэс мадэрнізацыі. У прамысловасці пераважала дробная вытворчасць, заснаваная на перапрацоўцы мясцовай сыравіны. Па ўзроўні эканамічнага развіцця Беларусь адставала як ад развітых краін Еўропы, так і найбольш перадавых эканамічных рэгіёнаў Расійскай імперыі.*

### 15.4. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў 1907-1914 гг.

У перыяд 1907-1914 гг. галоўныя намаганні царскага ўрада былі накіраваны на ўмацаванне палітычных пазіцый царызму, якія пахіснуліся падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. На тэрыторыі Беларусі можна вылучыць наступныя накірункі палітыкі царызму:

1) Правядзенне рэпрэсій у адносінах да "палітычна неблаганадзейных" асоб, закрыццё большасці апазіцыйных перыядычных выданняў, прафсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый.

2) Узмацненне русіфікатарскай палітыкі ў сферы землеўладання (стварэнне асобных фондаў дзяржаўных зямель для ільготнага продажу рускім перасяленцам), адміністрацыі, адукацыі.

Ва ўмовах рэпрэсій царызму спынілася дзейнасць на тэрыторыі Беларусі усіх рэвалюцыйных палітычных партый. Таксама распусціліся кадэцкія арганізацыі. У той жа час адбываецца значны рост правых манархічных

арганізацый. Разам з агульнаімперкімі ўзнікаюць мясцовыя манархічныя арганізацыі: “Крестьянин”, “Белорусское общество” і г.д. Шпарка развівалася сетка перыядычных выданняў манархісцкіх арганізацый, у межах якіх адбывалася прапаганда ідэй заходнерусізму і праводзілася актыўная агітацыя супраць палякаў, яўрэяў, каталіцкага касцёла, ліберальных і рэвалюцыйных арганізацый, а таксама беларускага нацыянальнага руху. Ліберальная апазіцыя ў Беларусі была прадстаўлена яўрэйскімі нацыянальнымі арганізацыямі, а таксама *Краёвай партыяй Літвы і Беларусі*, створанай у 1907 г. Дадзеная партыя абапіралася ў першую чаргу на польска-каталіцкую шляхту і каталіцкі касцёл; яна дамагалася скасавання дыскрымінацыйных законаў у адносінах да каталіцкага насельніцтва і выступала за наданне землям былога ВКЛ шырокага абласнога самакіравання.

У дзяржаўна-палітычнай сістэме Расійскай імперыі працягвала функцыянаваць Дзяржаўная дума. Пасля ўвядзення новага выбарчага заканадаўства 3 чэрвеня 1907 г. у *III Дзяржаўнай думе* (1907-1912) і *IV Дзяржаўнай думе* (1912-1917) перавагу мелі правыя сілы; лібералы знаходзіліся ў меншасці, а левыя ўвогуле мелі нязначнае прадстаўніцтва. На выбарах у III і IV Думу ў беларускіх губернях абсалютную большасць дэпутацкіх месцаў атрымалі кандыдаты ад правых сіл. Пры гэтым на выбарах 1907 і 1912 гг. у “Паўночна-Заходнім краі” саслоўнае прадстаўніцтва было дапоўнена нацыянальным – утвараліся “руская”, “польская” і “яўрэйская” курыі; пры гэтым усе праваслаўныя аўтаматычна залічваліся да рускіх, а каталікі – да палякаў. Выбарчая сістэма была арганізавана такім чынам, каб забяспечыць перавагу “рускім”, якія галасавалі пераважна за манархістаў.

У выніку рэпрэсій царызму назіраецца заняпад рабочага руху. Пры гэтым рабочыя Беларусі амаль цалкам адыходзяць ад палітычнай барацьбы. Значна скарацілася колькасць сялянскіх выступленняў.

Разам з правядзеннем рэпрэсій царызм, імкнучыся пашырыць сацыяльную базу ў краі, праводзіў у гэты перыяд некаторыя *рэформы ў накірунку грамадска-палітычнай лібералізацыі*:

1) *Дазвол пераходу з праваслаўя ў іншыя хрысціянскія веравызнанні, паводле закону аб верацярпімасці 1905 г.* У адпаведнасці з гэтым адбываўся масавы пераход нашчадкаў былых уніятаў, гвалтоўна пераведзеных у праваслаўе, да каталіцызму.

2) *Дазвол на адкрыццё школ з мовамі выкладання нацыянальных меншасцяў імперыі ў адпаведнасці з законам 1905 г. і скасаванне абмежаванняў на развіццё друку на мовах нацыянальных меншасцяў.* Гэта прывяло да фарміравання на тэрыторыі Беларусі польскамоўных школ. Развіваўся польскамоўны друк: толькі ў Вільні ў 1914 г. налічвалася 28 польскамоўных перыядычных выданняў. У той жа час адкрыццё беларускамоўных школ забаранялася, паколькі беларусы афіцыйна не прызнаваліся самастойнай нацыяй. Аднак дазвалялася дзейнасць беларускамоўных перыядычных выданняў.

3) *Земская рэформа 1911 г.* у Віцебскай, Мінскай і Магілёўкай губернях. Паводле яе, у губернях і паветах стваралася сістэма органаў мясцовага

самакіравання – *земствы*. Земствы ўяўлялі з сябе выбарныя мясцовым насельніцтвам прадстаўнічыя органы – губернскія і павятовыя *земскія сходы*, якія прызначалі пастаянна дзеючыя выканаўчыя органы – *земскія ўправы*. У функцыі земстваў уваходзіла развіццё мясцовай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, шляхоў зносін, культуры, адукацыі, аховы здароўя за кошт сродкаў, сабраных са спецыяльных мясцовых (земскіх) падаткаў. У той жа час земскія ўстановы знаходзіліся пад кантролем губернатара і міністра ўнутраных спраў, якія маглі прыпыніць выкананне любой пастановы земскіх устаноў. Выбары ў земствы былі шматступеньчатымі і няроўнымі, дзейнічаў маёмасны цэнз. У адрозненне ад расійскіх губерняў, дзе выбаршчыкі падзяляліся на саслоўныя курыі, у беларускіх губернях выбары ажыццяўляліся па нацыянальных курыях – “рускай” і “польскай”; пры гэтым маёмасны цэнз для выбаршчыкаў “рускай” курыі быў удвая ніжэйшы, што забяспечвала ім перавагу. У той жа час у Віленскай і Гродзенскай губернях земствы так і не былі ўведзены з-за перавагі католікаў ў структуры насельніцтва. Нягледзячы на недэмакратычны характар выбараў і абмежаваныя магчымасці, земствы адыгралі ў цэлым прыкметную ролю ў развіцці мясцовай эканомікі, адукацыі і аховы здароўя.

Пэўныя зрухі адбыліся і ў *адукацыйнай палітыцы*. Пачынаецца працэс паступовай замены царкоўнапрыходскіх школ 4-класнымі народнымі вучылішчамі; колькасць вучняў у іх за 1905-1914 гг. павялічваецца ў 3 разы і дасягае 305 тыс. Таксама павялічваецца колькасць сярэдніх навучальных устаноў – гімназій і рэальных вучылішчаў (з 28 у 1900 г. да 122 у 1914 г.). Аднак рэальны доступ да сярэдняй адукацыі з прычыны высокай платы за навучанне мелі толькі прадстаўнікі заможных слаёў насельніцтва. Востры недахоп спецыялістаў-педагогаў абумовіў адкрыццё ў 1909-1916 гг. новых настаўніцкіх семінарый у Рагачове, Оршы, Барысаве, Гомелі і Бабруйску, якія давалі няпоўную сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама *настаўніцкіх інстытутаў* у Віцебску, Магілёве і Мінску, якія давалі сярэднюю спецыяльную адукацыю. Фарміравалася *сістэма прафесійнага навучання*, накіраванага на падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых, якую забяспечвалі Горацкае рамеснае і Гомельскае тэхнічнае чыгуначнае вучылішчы, шэраг школ і класаў пры агульнаадукацыйных школах.

У пачатку 20 ст. працягвалася навуковае гістарычнае, археалагічнае, этнаграфічнае, лінгвістычнае вывучэнне беларускага краю, якім займалўся шэраг устаноў: *Віцебская вучоная архіўная камісія, Смаленская вучоная архіўная камісія, Мінскі царкоўны гісторыка-археалагічны камітэт*, *Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства*, польскае *Таварыства сяброў навукі* ў Вільні, *Таварыства вывучэння Беларускага краю* ў Магілёве і г.д. Пры падтрымцы названых навуковых устаноў у пачатку 20 ст. былі створаны *краязнаўчыя музеі* ў Віцебску, Магілёве, Гродне, Мінску і Вільні. Вялікі ўнёсак у развіццё беларускай навукі зрабілі ў гэты час гісторыкі М. Любаўскі, М. Доўнар-Запольскі, А. Сапуноў, І. Лапо, этнографы Е. Раманаў, М. Федароўскі, М. Нікіфароўскі, Я. Карскі, А. Сержпутоўскі.

Навуковыя даследаванні ў разглядаемы перыяд ажыццяўляліся і ў галінах прыродазнаўства. Значнай з’явай навуковага жыцця Беларусі ў пачатку 20 ст. стала дзейнасць *Таварыства мінскіх урачоў*. Першымі навуковымі ўстановамі прыродазнаўчага профілю сталі *доследныя станцыі — Беняконская сельскагаспадарчая* ў Віленскай губерні (1910) і *Мінская балотная* (1913). У Мінску ў 1912-1916 гг. выдаваўся першы ў Расійскай імперыі часопіс па культуры балот – “*Болотоведение*”. Усяго ж у Беларусі з 1901 да 1917 г. выходзіла каля 20 прыродазнаўчых перыядычных выданняў. У той жа час развіццё навукі ў Беларусі замаруджвалася адсутнасцю тут вышэйшых навучальных устаноў.

Адзнакай грамадскага і культурнага стала развіццё друку і кнігадрукавання. У 1914 г. у беларускіх губернях выходзіла 109 перыядычных выданняў.

*Такім чынам, грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Беларусі ў 1907-1914 гг. характарызавалася умацаваннем пазіцый царызму, узмацненнем русіфікатарскай палітыкі і рэпрэсій у дачыненні рэвалюцыйнага руху. Аднак у той жа час адбываліся некаторыя мерапрыемствы, накіраваныя аб’ектыўна на мадэрнізацыю грамадска-палітычных і сацыяльна-культурных адносін у рэгіёне.*

### 15.5. Беларускі нацыянальны рух у 1905-1914 гг.

Напярэдадні і падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. галоўным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху з’яўлялася Беларуская Сацыялістычная Грамада. У ходзе рэвалюцыйных падзей 1905-1907 гг. дзеячы БСГ выступалі сумесна з прадстаўнікамі іншых рэвалюцыйных партый у Беларусі, удзельнічалі ў антыўрадавых выступленнях. У студзені 1906 г. у Мінску адбыўся *II з’езд БСГ*, на якім была прынята новая праграма партыі, выбраны Цэнтральны камітэт у складзе Івана і Антона Луцкевічаў, Вацлава Іваноўскага і Алеся Бурбіса. У праграме БСГ абвяшчалася неабходнасць рэвалюцыйнага звяржэння самадзяржаўя сіламі ўсіх працоўных Расійскай імперыі і пераўтварэнне імперыі ў федэратыўную дэмакратычную рэспубліку. Для Беларусі БСГ патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі са сталіцай у Вільні. Абвяшчалася неабходным адчужэнне памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных зямель на карысць сялян.

У склад БСГ падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. уваходзіла каля 2 тыс. чалавек. Структурна яна падзялялася на 2 краёвыя камітэты з цэнтрамі ў Вільні і Мінску; таксама ў складзе БСГ дзейнічалі Мінскі рабочы камітэт, Віленская група рабочых, Віленская арганізацыя вучнёўскай моладзі, Пецярбургская арганізацыя, мясцовыя арганізацыі ў Лідскім, Дзісненскім і Бельскім паветах. Па ініцыятыве БСГ, а таксама ПСР быў арганізаваны *Беларускі сялянскі саюз*.

У цэлым уплыў беларускага нацыянальнага руху на палітычнае жыццё ў ходзе рэвалюцыі 1905-1907 гг. быў нязначны. Гэта тлумачыцца адсутнасцю трывалай сацыяльнай базы: у гарадах, якія з’яўляліся цэнтрамі палітычнага руху, беларускае насельніцтва было вельмі нешматлікім, а сяляне ў асноўнай

масе заставаліся малапісьменнымі і не мелі выразнай палітычнай і нацыянальнай самавядомасці.

Падчас спаду рэвалюцыі, згодна з рашэннем канферэнцыі БСГ, была заснавана першая легальная беларускамоўная газета – “*Наша доля*” (выдавалася ў Вільні з 1 верасня 1906 г., падрыхтавана 6 нумароў). Публікацыі газеты мелі радыкальны характар; у сувязі з гэтым большасць нумароў газеты ці былі канфіскаваны, ці на іх быў накладзены арышт. А ў студзені 1907 г. рашэннем Віленскай судовай палаты выданне “Нашай долі” было назаўсёды спынена.

У выніку паражэння рэвалюцыі БСГ фактычна самараспусцілася, яе дзеячы адмовіліся ад падпольнай дзейнасці. Кіраўніцтва БСГ засяродзіла сваю дзейнасць у нацыянальна-культурным руху. Яго цэнтрам становіцца новае легальнае перыядычнае выданне – газета “*Наша ніва*”, якая пачала выходзіць з 10 лістапада 1906 г. да 1915 г. у Вільні лацінкай і кірыліцай (рэдактарам у 1906-1914 гг. з’яўляўся А. Уласаў, у 1914-1915 гг. Янка Купала).

У мэтах захавання газеты “Наша ніва” пазбягала радыкальных палітычных дэкларацый, па агульнапалітычных і сацыяльна-эканамічных пытаннях займала ў асноўным ліберальна-асветніцкія пазіцыі. Яе дзеячы засяродзілі сваю публіцыстычную дзейнасць на наступных накірунках:

- тэарэтычнае абгрунтаванне факту існавання самастойнага беларускага этнасу са сваёй самабытнай мовай і культурай;
- крытыка русіфікатарскай палітыкі царызму і паланізатарскай палітыкі польска-каталіцкага руху;
- патрабаванні ўвядзення беларускай мовы ў сістэме адукацыі, грамадскіх і рэлігійных установах;
- прапаганда беларускай нацыянальнай самасвядомасці, беларускай культуры.

У перыяд паміж рэвалюцыяй 1905-1907 гг. і Першай сусветнай вайной “Наша ніва” пераўтварылася ў своеасаблівы цэнтр беларускага нацыянальна-культурнага руху. Пад яе эгідай пачалі выдавацца “Беларускі каляндар”, сельскагаспадарчы часопіс “Саха”, літаратурны месячнік для моладзі “Лучынка”, літаратурны і грамадска-палітычны альманах “Маладая Беларусь”, дзейнічалі беларускія выдавецтвы “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша ніва”, “Наша хата” і інш. У нашаніўскім руху ўдзельнічалі прадстаўнікі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі пераважна сялянскага або дробнашляхецкага паходжання.

Разам з “Нашай нівай” фарміруецца другі цэнтр беларускага нацыянальна-культурнага руху – газета “*Беларус*”, якая выдавалася на беларускай мове лацінкай са студзеня 1913 г. (рэдактары – А. Бычкоўскі і Б. Пачобка). Газета была арганізавана галоўным чынам прадстаўнікамі каталіцкага духавенства, якія далучыліся да беларускага нацыянальнага руху. У публікацыях выдання вырашэнне нацыянальна-культурных задач беларусаў звязвалася з абаронай каталіцкага веравызнання.

Намаганнямі дзеячоў беларускага нацыянальнага руху адбывалася станаўленне беларускай літаратуры. У 1908-1914 гг. было выдадзена 77 кніг

на беларукай мове. Вялікі ўнёсак у развіццё *мастацкай беларускай літаратуры* зрабілі звязаныя пераважана з "Нашай нівай" паэты і пісьменнікі *Янка Купала, Якуб Колас, Цётка (Алаіза Пашкевіч), Карусь Каганец, Алесь Гарун, Максім Багдановіч, Цішка Гартны, Максім Гарэцкі* і інш. У 1910 г. быў сфарміраваны першы *беларускі нацыянальны прафесійны тэатр* у мястэчку Празарокі Дзісенскага павета на чале з *Ігнатам Буйніцкім*, які выступаў у розных гарадах і мястэчках Беларусі, а таксама ў Пецярбургу і Варшаве. У *1910 г.* была выдадзена ў Вільні "*Кароткая гісторыя Беларусі*" *Вацлава Ластоўскага*, у якой упершыню была адлюстравана нацыянальная канцэпцыя гісторыі Беларусі.

*Такім чынам, на пачатку 20 ст. назіраўся прыкметны рост беларускага нацянальнага руху як у палітычнай, так і ў культурнай форме. Адбывалася фарміраванне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, якая кіравала дадзеным рухам. Аднак уплыў беларускага нацыянальнага руху на шырокія народныя масы быў нязначны з-за шэрагу спецыфічных фактараў станаўлення беларускай нацыі.*

**Асноўныя паняцці:**

Сусветны эканамічны крызіс 1900-1903 гг, "паліцэйскі сацыялізм", сіянізм, рэвалюцыя 1905-1907 гг., "Крывавая нядзеля", забастоўкі салідарнасці, "булыгінская дума", Усерасійская палітычная стачка, стачачныя камітэты, кааліцыйныя саветы і камісіі, маніфест 17 кастрычніка, Дзяржаўная дума, Саюз рускага народа, Саюз 17 кастрычніка, Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя народнай свабоды, Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Беларусі і Літвы, выбарчы закон 3 чэрвеня 1907 г., прафсаюзы, сталыпінская аграрная рэформа, водруб, хутар, прамысловы ўздым 1909-1914 гг., канцэнтрацыя вытворчасці, канцэнтрацыя капіталу, манаполіі, Краёвая партыя Літвы і Беларусі, земская рэформа 1911 г., земствы, настаўніцкія інстытуты, ІІ з'езд БСГ, "Наша доля", "Наша ніва", "Беларус".

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Вызначце асноўныя прычыны рэвалюцыі 1905-1907 гг. Дайце іх разгорнутую характарыстыку.
2. Якія падзеі пачатку 20 ст. садзейнічалі абвастрэнню сацыяльных праблем у Расійскай імперыі і прывялі да пачатку рэвалюцыі?
3. Якія з'явы ў грамадскім жыцці Беларусі сведчылі пра набліжэнне рэвалюцыі? Дайце кароткую характарыстыку дынамікі рабочага, сялянскага і рэвалюцыйнага руху напярэдадні рэвалюцыі 1905-1907 гг.
4. Што такое сіяніскі рух? Падумайце, чаму царызм, нягледзячы на антысеміцкую скіраванасць яго палітыкі, першапачаткова не перашкаджаў развіццю сіяніскага руху?
5. Калі пачалася рэвалюцыя 1905-1907 гг.? Якія падзеі сталі пачаткам рэвалюцыі?
6. Ахарактарызуйце спецыфіку рэвалюцыйнага руху ў Беларусі са студзеня да верасня 1905 г. Назавіце асноўныя звязаныя з ім падзеі.

7. Якія сацыяльныя групы ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху 1905-1907 гг.? Якія пераважалі формы рэвалюцыйнай барацьбы?
8. Што такое “булыгінская Дума”? Якая была рэакцыя грамадскасці на маніфест пра яе ўвядзенне?
9. Растлумачце, чаму кастрычнік-снежань 1905 г. лічыцца перыядам найвышэйшага ўздыму рэвалюцыі?
10. Якія пераўтварэнні ў дзяржаўна-палітычным ладзе Расійскай імперыі абвясціў маніфест 17 кастрычніка?
11. Растлумачце сутнасць выбарчага заканадаўства, паводле якога ажыццяўляліся выбары ў І і ІІ Дзяржаўную думу. Ці можна лічыць яго дэмакратычным?
12. Ахарактарызуйце расстаноўку грамадска-палітычных сіл падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг. Назавіце асноўныя палітычныя партыі і арганізацыі, якія ўзніклі ў гэты час і вызначце іх палітычныя пазіцыі.
13. Дайце параўнальную характарыстыку дзейнасці І і ІІ Дзяржаўных дум. Растлумачце, чаму іх дзейнасць скончылася няўдачай.
14. Якая падзея лічыцца датай завяршэння рэвалюцыі 1905-1907 гг.? Ахарактарызуйце новае выбарчае заканадаўства Расійскай імперыі.
15. Падумайце, чаму рэвалюцыя 1905-1907 гг. пацярпела ў цэлым паражэнне? Якія змены адбыліся ў грамадстве ў яе выніку?
16. Чым было абумоўлена правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы? Назавіце яе асноўныя накірункі.
17. Да якіх вынікаў прывяло правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы ў Беларусі? У чым была спецыфіка правядзення рэформы на беларускіх землях?
18. Ці можна сцвярджаць, што сталыпінская аграрная рэформа прывяла да развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.
19. Якімі фактарамі быў выкліканы прамысловы ўздым 1909-1914 гг.?
20. Што такое манапалістычныя аб’яднанні ў прамысловасці? У якіх галінах прамысловасці Беларусі яны найперш складваліся? Што перашкаджала хуткай манапалізацыі прамысловасці ў Беларусі?
21. Ахарактарызуйце структуру беларускай прамысловасці на пачатку 20 ст.? Якімі фактарамі яна абумоўлена?
22. Паспрабуйце вызначыць агульны ўзровень развіцця эканомікі Беларусі на пачатку 20 ст.
23. Якія асноўныя працэсы адбываліся ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў 1907-1914 гг.?
24. Падумайце, з чым было звязана ўзмацненне палітыкі русіфікацыі з боку царызму ў 1907-1914 гг.
25. У чым сутнасць земскай рэформы 1911 г.? Якія яна мела вынікі? Падумайце, чаму царызм не адважыўся ўвесці земствы ў заходніх беларускіх губернях?
26. Якія змены адбываюцца ў адукацыйнай сферы Беларусі ў пачатку 20 ст.?

27. У якіх галінах адбываліся навуковыя даследаванні ў Беларусі ў пачатку 20 ст.? Назавіце вядомыя Вам навуковыя арганізацыі.
28. Ахарактарызуйце дзейнасць Беларускай Сацыялістычнай Грамады падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг.
29. Якая Вам вядомая першая беларускамоўная легальная газета? Чым абумоўлены кароткі тэрмін яе існавання?
30. Якую ролю ў развіцці беларускага нацыянальнага руху адыграла газета "Наша ніва"? Вызначце асноўныя накірункі яе дзейнасці.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Сіянісцкі рух на тэрыторыі Беларусі.
2. Уплыў падзей "Крывавай нядзелі" на развіццё грамадскага руху ў Беларусі.
3. Сялянскі рух ў Беларусі падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг.
4. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у I і II Дзяржаўных думах.
5. Станаўленне хутарской сістэмы ў Беларусі.
6. Развіццё крэдытна-банкаўскай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1900-1914 гг.
7. Рух "краёўцаў" на тэрыторыі Беларусі ў 1907-1914 гг.
8. Фарміраванне ідэалогіі беларускага нацыянальнага руху ў публікацыях газеты "Наша ніва".

## Модуль 4. Беларусь у перыяд сусветных войнаў і рэвалюцый 1914 – 1945 гг. Фарміраванне беларускай савецкай дзяржаўнасці.

### Тэма 16: Першая сусветная вайна і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі.

**1. Беларусь у Першай сусветнай вайне.**
**2. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі і яе вынікі.**
**3. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі і яе вынікі.**

#### 16.1. Беларусь у Першай сусветнай вайне.

На пачатку 20 ст. у свеце склалася складаная геапалітычная сітуацыя. Яна характарызавалася супрацьстаяннем буйнейшых дзяржаў таго часу ў барацьбе сусветныя рынкі збыту прадукцыі і капіталу, за калоніі. Барацьба фактычна адбывалася за перадзел свету. Яе вынікам стала *Першая сусветная вайна 1914-1918 гг.* У гэтай вайне прымалі ўдзел 33 краіны. У ёй адно аднаму супрацьстаялі краіны ваенна-палітычнага блоку *Антанты* (Расія, Англія, Францыя) і іх саюзнікі (Італія, Румынія, Сербія, Бельгія, Грэцыя, з 1917 г. ЗША і інш.), з аднаго боку, і краіны т.зв. *Чацвярнога саюзу* (Германія, Аўстра-Венгрыя, Балгарыя, Турцыя), з другога.

Зачэпкай для пачатку вайны паслужыла забойства паўднёваславянскімі тэрарыстамі аўстрыйскага эрцгерцага Франца Фердынанда, пасля чаго *28 ліпеня 1914 г.* Аўстра-Венгрыя абвясціла вайну Сербіі. *1-4 жніўня 1914 г.*

краіны Антанты, з аднаго боку, і Германія і Аўстра-Венгрыя, з другога, абвясцілі адно аднаму вайну. Пачаліся баявыя дзеянні.

Да сярэдзіны 1915 г. баявыя дзеянні паміж рускімі і германскімі войскамі адбываліся на тэрыторыі Польшчы і Ўсходняй Прусіі. Летам – восенню 1915 г. Германскае войска арганізавала *наступленне*, у выніку якога заняла тэрыторыі Польшчы, Літвы, Курляндыі і заходняй часткі Беларусі (Гродзенская і большая частка Віленскай губерняў). Да кастрычніка 1915 г. расійска-германскі фронт стабілізаваўся па лініі *Дзвінск-Паставы-Баранавічы-Пінск*. Дадзеная лінія фронту заставалася нязменнай да пачатку 1918 г. У 1916 г. камандаванне расійскай арміі ажыццявіла дзве наступальныя аперацыі (*Нарачанскую* і *Баранавіцкую*), імкнучыся адсунуць лінію фронту на захад, аднак, беспаспяхова.

З пачаткам вайны, 5 жніўня 1914 г., на тэрыторыі беларускіх губерняў уводзілася ваеннае становішча: забараняліся забастоўкі, а таксама вулічныя шэсці і маніфестацыі, акрамя афіцыйна арганізаваных. Царскі ўрад пры дапамозе афіцыйнага друку і праваслаўнага духавенства праводзіў шырокую шавіністычныю прапаганду. У Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах імперыі, пракацілася хваля патрыятычных маніфестацый, малебнаў, сходаў. Царскі ўрад у вайне падтрымалі на пачатку не толькі праўрадавыя групоўкі, але таксама ліберальныя і некаторыя левыя партыі і арганізацыі.

З сярэдзіны 1915 г. землі Беларусі былі падзелены лініяй фронту; розныя яе часткі знаходзіліся пад кантролем расійскіх і германскіх уладаў. Абодва ваюючыя бакі разглядалі тэрыторыю Беларусі як крыніцу для забеспячэння патрэб фронту.

*Цэнтральная і ўсходняя частка Беларусі*. У якасці прыфрантавой тэрыторыі ў цэнтральнай і ўсходняй Беларусі ў 1915-1917 гг. знаходзілася каля 1,5 млн. расійскіх салдат. Беларусь была месцам размяшчэння *Стаўкі Галоўнага Вярхоўнага камандавання Расіі*: да лета 1915 г. яна знаходзілася ў Баранавічах, потым была пераведзена ў Магілёў. З беларускіх губерняў у царскае войска было мабілізавана каля 50% мужчын ва ўзросце 18-50 год.

Эканоміка краю перабудоўвалася на патрэбы фронту. Для кіравання эканамічнай дзейнасцю (размеркаванне сыравіны, паліва, транспарту, рабочай сілы, заказаў і г.д.) дзяржава стварала спецыяльныя *ваенна-прамысловыя камітэты*. На пачатак 1917 г. каля 2/3 буйных прамысловых прадпрыемстваў Беларусі былі пераарыентаваны на ваенны лад. Адбывалася будаўніцтва новых спецыялізаваных ваенных прадпрыемстваў. Для выкарыстання рэсурсаў сельскай гаспадаркі ў ваенных мэтах ствараліся спецыяльныя цывільныя і ваенныя камісіі для правядзення рэквізіцый збожжа, мукі, фуражу, коней, буйной рагатай жывёлы. Насельніцтва прыфрантавых тэрыторый у масавым парадку прыцягвалася да прымусовых работ па ўмацаванні баявых пазіцый.

Істотным фактарам сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў Беларусі становіцца *бежанства,* нярэдка прымусовае, з тэрыторый, занятых германскімі войскамі (агульная колькасць бежанцаў дасягнула 1,3 млн. чалавек). У выніку гарады цэнтральнай і ўсходняй Беларусі былі

перапоўнены бежанцамі, якія знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Гэта выклікала праблемы з харчовым забеспячэннем гарадскога насельніцтва, эпідэміі. Многія бежанцы накіроўваліся ўглыб Расійскай імперыі. У выніку масавых мабілізацый у войска і на прымусовыя работы, бежанства, збяднення значнай часткі насельніцтва адбыліся істотныя змены ў сацыяльнай структуры грамадства: павялічваецца колькасць *маргінальных слаёў грамадства,* якія ўключалі ў сябе людзей, выкінутых са звыклага сацыяльнага асяроддзя, што не мелі сталай працы, падтрымлівалі існаванне за кошт часовых заробкаў.

У 1916 г. эканоміка беларускіх зямель, як і ў цэлым Расійскай імперыі, апынулася ў стане *крызісу*. Яго прычынамі з'яўляліся:

- масавыя мабілізацыі і выкарыстанне на прымусовых работах насельніцтва, значныя рэквізіцыі сельскагаспадарчай прадукцыі;
- дэфіцыт тавараў масавага спажывання, выкліканы пераарыентацыяй большасці прамысловых прадпрыемстваў на выпуск ваеннай прадукцыі;
- разрыў эканамічных сувязяў з Германіяй;
- неэфектыўнае кіраванне эканомікай з боку дзяржаўных органаў.

*Прыкметамі крызісу* сталі:

- скарачэнне пасяўных плошчаў у сельскай гаспадарчы на 1/3, пагалоўя жывёлы – на 11%; пераход значнай часткі сялян да натуральнай гаспадаркі;
- скарачэнне аб'ёмаў прамысловай прадукцыі, ліквідацыя многіх прадпрыемстваў (за 1913-1917 гг. колькасць прадпрыемстваў буйной прамысловасці ў цэнтральнай і ўсходняй Беларусі зменшылася з 822 да 297);
- інфляцыя, рост цэн на прадукты харчавання і прамысловыя тавары ў 2–7 разоў, распаўсюджанне спекуляцыі;
- падзенне рэальнай заработнай платы і пагаршэнне матэрыяльнага становішча рабочых.

Ва ўмовах эканамічнага крызісу адбываецца рост незадаволенасці грамадства палітыкай царызму. Хутка развіваюцца антываенныя настроі як сярод грамадзянскага насельніцтва, так і ў войску. Масавы характар набывае дэзерцірства з арміі; вайсковыя злучэнні адмаўляюцца ісці ў наступленне, расійскія і нямецкія салдаты братаюцца. У кастрычніку 1916 г. успыхнула *паўстанне салдат на размеркавальным пункце ў Гомелі.*

У асноўных прамысловых цэнтрах Расійскай імперыі ў 1915-1916 гг. рэзка актывізуецца антыўрадавы рух. У Дзяржаўнай думе большасць дэпутатаў пераходзіць у апазіцыю да царскага ўрада, у тым ліку памяркоўная частка прадстаўнікоў правых партый. Аднак на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах прыфрантавой зоны, перанасычанай войскамі, органамі палітычнай бяспекі і ваеннай контрвыведкі, прыкмет антыўрадавага руху амаль не назіралася.

Падчас вайны назіраецца некаторае *ажыўленне беларускага нацыянальнага руху*. Пасля акупацыі германскімі войскамі Вільні і закрыцця газеты "Наша ніва" яго цэнтрамі становяцца беларускія таварыствы дапамогі пацярпелым ад вайны ў Мінску. У канцы 1916 – пачатку 1917 гг. у Петраградзе выдаваліся штотыднёвыя беларускамоўныя газеты – "*Дзянніца*" і "*Светач*".

*Заходняя частка Беларусі.* Занятая нямецкімі войскамі тэрыторыя Беларусі разам з землямі Літвы і Курляндыі была ўключана ў склад акругі *Обер-Ост.* У 1915-1917 гг. тут знаходзілася каля 1 млн. нямецкіх салдат. Прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы былі абкладзены высокімі падаткамі; у сельскай гаспадарцы шырока практыкаваліся рэквізіцыі, выкарыстанне насельніцтва на прымусовых работах на ваенных збудаваннях. У хуткім часе эканоміка краю апынулася ў крызісным стане.

Таксама як і ўсходняя Беларусь, занятыя нямецкімі войскамі тэрыторыі знаходзіліся на ваенным становішчы. Усялякая палітычная дзейнасць, забастоўкі, дэманстрацыі і мітынгі забараняліся. Права на функцыянаванне атрымалі толькі грамадскія камітэты дапамогі ахвярам вайны. Яны былі ўпаўнаважаны выказваць уладам прапановы ў сацыяльнай, асветніцкай і культурнай сферы.

Для стварэння сацыяльнай апоры ў краі і аслаблення ў ім расійскага і польскага ўплыву германскія ўлады абвясцілі раўнапраўе ўсіх нацый на занятых тэрыторыях: дазваляліся культурная дзейнасць, навучанне і выданне газет на роднай мове. Гэта прывяло да ажыўлення беларускага нацыянальна-культурнага руху, цэнтрам якога стала Вільня, дзе знаходзіліся многія былыя дзеячы БСГ і "Нашай нівы". У 1915-1917 гг. узнікае шэраг беларускіх грамадскіх арганізацый; з снежня 1916 г. выходзіла газета "*Гоман*". Была створана сетка *школ з беларускай мовай навучання* (да вясны 1918 г. іх налічвалася 79); з кастрычніка 1916 г. дзейнічала *беларуская настаўніцкая семінарыя ў Свіслачы.*

Нягледзячы на абмежаванні з боку германскіх улад, дзеячы беларускага нацыянальнага руху ставілі ў сваёй дзейнасці і палітычныя задачы. Утвораны на аснове камітэта дапамогі ахвярам вайны *Беларускі народны камітэт* (кіраўнікі І. і А. Луцкевічы) сумесна з адпаведнымі польскімі, літоўскімі і яўрэйскімі арганізацыямі выступіў з ініцыятывай аднаўлення Вялікага княства Літоўскага ў форме дэмакратычнай рэспублікі з соймам у Вільні. Дадзеныя арганізацыі ў снежні 1915 г. утварылі *Канфедэрацыю Вялікага княства Літоўскага.* Аднак рознагалоссі паміж яе ўдзельнікамі і адсутнасць падтрымкі з боку германскіх улад абумовілі хуткі распад канфедэрацыі. У межах літоўскага нацыянальнага руху фарміруецца ідэя незалежнай літоўскай дзяржавы з цэнтрам у Вільні, якая б уключала ў сябе некаторыя землі заходняй Беларусі. Дзеячы полькага нацыянальнага руху таксама разглядалі землі Віленскай і Гродзенскай губерняў як частку тэрыторыі будучай польскай дзяржавы.

У той жа час дзеячы беларускага нацыянальнага руху рабілі некаторыя захады, накіраваныя на стварэнне беларускай дзяржаўнасці. У красавіку і чэрвені 1916 г. прадстаўнікі Беларускага народнага камітэта ўдзельнічалі ў *канферэнцыях народаў Расіі*, якія праходзілі ў Стакгольме і Лазане, дзе ставілі пытанне аб сваёй будучай палітычнай самастойнасці і выказалі рашучае жаданне пазбавіцца ад прыгнёту расійскіх улад. У 1916 г. узнікае групоўка "*Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі*" на чале з Вацлавам Ластоўскім. Яна адмаўлялася ад усялякіх саюзаў з літоўскім і польскім

нацыянальнымі рухамі і выступала за поўную дзяржаўную незалежнасць Беларусі ў яе этнаграфічных межах.

*Такім чынам, Першая сусветная вайна прывяла да вялікіх людскіх (загінула каля 1,2 млн. чалавек) і матэрыяльных страт на тэрыторыі Беларусі, істотнага пагаршэння жыццёвага ўзроўню народа. З сярэдзіны 1915 г. беларускія землі аказаліся падзеленымі паводле лініі фронту паміж двума ваюючымі бакамі, якія эксплуатавалі рэсурсы краю ў сваіх інтарэсах.*

**16.2. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі і яе вынікі.**

У 1916 – пачатку 1917 гг. у Расійскай імперыі склалася рэвалюцыйная сітуацыя. Прычынамі рэвалюцыі сталі сацыяльныя праблемы, якія не былі ў поўным аб'ёме вырашаны ў ходзе рэвалюцыі 1905-1907 гг. Ва ўмовах вайны, якая суправаджалася вялікімі людскімі стратамі і вострым эканамічным крызісам, яны асабліва абвастрыліся.

На пачатку 1917 г. у гарадах Расійскай імперыі значна ўзрастае рабочы рух, які вылучае палітычныя лозунгі, галоўным з якіх становіцца "Далоў самадзяржаўе!" 23-28 лютага 1917 г. усеагульная палітычная забастоўка ў Петраградзе, да якой далучыліся сканцэнтраваныя там войскі, прывяла да звяржэння царскага ўрада. Гэтая падзея атрымала назву *Лютаўская рэвалюцыя*. 2 сакавіка 1917 г. цар Мікалай II адрокся ад трона.

У выніку рэвалюцыі ў Петраградзе ўзніклі новыя органы ўлады: *Часовы ўрад*, які складаўся пераважна з прадстаўнікоў ліберальнай апазіцыі ў Дзяржаўнай думе, на чале з Г. Львовым і *Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў*, які складаўся з выбарных прадстаўнікоў ад рабочых калектываў і вайсковых частак, у яім пераважалі дзеячы левых палітычных партый. Часовы ўрад выступаў у якасці афіцыйнай улады. Аднак рэальнае ажыццяўленне ім улады было магчымае толькі дзякуючы падтрымцы Петрагарадскага Савета. Апошні прызнаў Часовы ўрад, аднак у той жа час кантраляваў яго дзейнасць, ставячы падтрымку ўрада ў залежнасць ад выканання шэрагу ўмоў. Такая сітуацыя атрымала назву *двоеўладдзя*.

У сакавіку 1917 г. царская адміністрацыя была ліквідавана ва ўсіх рэгіёнах Расійскай імперыі пры падтрымцы абсалютнай большасці насельніцтва. Ва ўсіх буйных гарадах прайшлі мітынгі і дэманстрацыі ў падтрымку рэвалюцыі, распускаліся органы царскай улады, раззбройваліся паліцыя і жандармерыя, вызваляліся палітычныя вязні.

У выніку рэвалюцыйных падзей у губернскіх і павятовых цэнтрах склаліся новыя органы ўлады па аналогіі з тымі, што ўзніклі ў Петраградзе – *грамадскія камітэты парадку* і *Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў*. Грамадскія камітэты парадку фарміраваліся з дзеячоў земстваў і гарадскіх дум, а таксама прадстаўнікоў ад Саветаў. На чале іх станавіліся губернскія і павятовыя камісары, якія прызначаліся Часовым урадам. Саветы ўтвараліся з ліку прадстаўнікоў прадпрыемстваў і вайсковых гарнізонаў. На працягу сакавіка-красавіка 1917 г. на тэрыторыі Беларусі ўтварылася 37 Саветаў. Саветы бачылі сваю галоўную задачу ў арганізацыі рабочых, салдат і сялян, абароне іх эканамічных і палітычных правоў. У розных

рэгіёнах адбываліся з’езды Саветаў, якія ўтваралі каардынацыйныя органы. У чэрвені 1917 г. прайшоў *І Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў*, а ў маі – *І Усерасійскі з’езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў*, якія абралі адпаведныя цэнтральныя выканаўчыя камітэты. У складзе Саветаў пераважалі прадстаўнікі левых партый (РСДРП, Бунд, ПСР).

Вынікам Лютаўскай рэвалюцыі стала шырокая *дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця*, якая выяўлялася ў наступных з’явах:

1) *Увядзенне свабоды слова, друку, сходаў*. Узнікае вялікая колькасць перыядычных выданняў рознага накірунку, бесперашкодна адбываюцца шматлікія палітычныя дэманстрацыі, мітынгі.

2) *Свабода дзейнасці палітычных партый і грамадскіх арганізацый*. Масавымі становяцца партыі кадэтаў, ПСР, РСДРП, Бунд. У той жа час страчваюць уплыў манархічныя партыі; многія з іх распускаюцца.

3) *Ліквідацыя ўсіх саслоўных, нацыянальных і рэлігійных абмежаванняў*. На тэрыторыі Беларусі былі адменены дыскрымінацыйныя законы ў адносінах да каталіцкага насельніцтва, ліквідавана мяжа яўрэйскай аседласці.

4) *Дэмакратызацыя войска*. Вайскоўцы атрымалі ўсе палітычныя і грамадзянскія правы нароўні з цывільнымі жыхарамі; дазвалялася дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый у войску; адмяняліся ваенныя чыны і званні; ліквідавалася адзінаначалле і ўводзілася салдацкае самакіраванне, органамі якога станавіліся выбарныя *салдацкія камітэты*. У красавіку 1917 г. адбыўся у Мінску *І з’езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту*, які абраў каардынацыйны орган – *Франтавы камітэт*.

5) *Арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых, легалізацыя забастовак і стачак, стварэнне фабрычна-заводскіх камітэтаў на прамысловых прадпрыемствах*. Рабочыя, аб’яднаныя ў прафсаюзы, пасля рэвалюцыі выстаўлялі патрабаванні аб паляпшэнні свайго эканамічнага становішча, скарачэнні працоўнага дня, павелічэнні зарплаты і г.д. Наймальнікі, як правіла, задавальнялі патрабаванні прафсаюзаў і Саветаў. *Фабрычна-заводскія камітэты*, якія складаліся з выбарных прадстаўнікоў працоўных на канкрэтных прадпрыемствах, змагаліся за ўдзел рабочых у кіраванні прадпрыемствамі і ў некаторых выпадках уводзілі *рабочы кантроль* над вытворчасцю.

6) *Увядзенне элементаў самакіравання ў вёсцы*. Пасля рэвалюцыі быў ліквідаваны інстытут земскіх начальнікаў; ствараліся *сялянскія камітэты* і *Саветы сялянскіх дэпутатаў*. У красавіку-маі 1917 г. прайшлі губернскія з’езды сялянскіх дэпутатаў, на дзейнасць якіх вялікі ўплыў мела ПСР.

7) *Адмена смяротнага пакарання на фронце і ў тыле; амністыя ўсіх палітычных зняволеных*.

Ва ўмовах усеагульнай дэмакратызацыі адбываецца абуджэнне *беларускага нацыянальнага руху*. Узнікае шмат нацыянальных арганізацый, гурткоў і суполак са сваімі перыядычнымі выданнямі як на тэрыторыі Беларусі, так і ў Петраградзе, Маскве, іншых гарадах, дзе знаходзіліся бежанцы, рабочыя і салдаты з Беларусі. У сакавіку 1917 г. аднавіла сваю

дзейнасць *Беларуская Сацыялістычная Грамада*, узнікаюць партыі ліберальнай скіраванасці – *Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС)*, *Хрысціянска-дэмакратычная злучнасць (ХДЗ)*. 25-27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з'езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый, у якім удзельнічала каля 150 чалавек. На з'ездзе быў створаны спецыяльны орган – *Беларускі нацыянальны камітэт* (БНК) на чале з лідэрам БПНС, былым аўтанамістам памешчыкам *Раманам Скірмунтам*. Камітэту даручалася дамагацца дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расійскай федэрацыі і адкрыцця беларускамоўных школ. Аднак Часовы ўрад адмовіўся разглядаць патрабаванні БНК. Амаль усе расійскія палітычныя сілы адмаўляліся прызнаваць факт самастойнага існавання беларускай нацыі.

Памяркоўныя пазіцыі кіраўніцтва БНК выклікалі незадаволенасць з боку БСГ, якая выступала за шырокія дэмакратычныя свабоды, дзяржаўную аўтаномію Беларусі, перадачу ўсёй памешчыцкай і дзяржаўнай зямлі сялянам, развіццё беларускай культуры і г.д. Пад яе уплывам прайшоў *з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый у ліпені 1917 г.*, які на змену БНК утварыў *Цэнтральную раду беларускіх нацыянальных партый і арганізацый* (з кастрычніка 1917 г. – *Вялікая Беларуская рада*), у склад якой уваходзілі толькі прадстаўнікі левых беларускіх арганізацый на чале з адным з лідэраў БСГ *Язэпам Лёсікам*. Восенню 1917 г. ствараліся беларускія арганізацыі ў войску. Для каардынацыі іх дзейнасці ў кастрычніку 1917 г. ўтварылася *Цэнтральная вайсковая беларуская рада (ЦВБР)*. Да восені 1917 г. у склад БСГ уваходзіла каля 10 тыс., а ў склад усіх беларускіх нацыянальных арганізацый каля 23 тыс. чалавек. Аднак уплыў беларускага нацыянальнага руху на шырокія народныя масы заставаўся ў цэлым на нізкім узроўні.

Нягледзячы на сур'ёзныя змены, якія адбыліся ў грамадскім жыцці ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі, галоўныя сацыяльныя праблемы заставаліся нявырашанымі. Такія пытанні як вызначэнне асноў дзяржаўна-палітычнага і прававога ладу, узаемаадносіны паміж цэнтрам і рэгіёнамі, аўтаноміі нацыянальных ускраін, адносіны ў аграрнай сферы, увядзенне рабочага заканадаўства і г.д., паводле пазіцыі Часовага ўрада, якую ў цэлым падзяляла кіраўніцтва Саветаў, павінен быў вырашыць *Устаноўчы сход* – усерасійскі парламенцкі орган, выбраны на дэмакратычных прынцыпах, для прыняцця дзяржаўнай канстытуцыі. Аднак выбары ў яго пастаянна адкладваліся. Працягвалася вядзенне вайны: новыя ўлады сцвярджалі, што пасля рэвалюцыі яе характар карэнным чынам змяніўся – яна пераўтварылася ў рэвалюцыйную вайну супраць германскай манархіі. Працягваў паглыбляцца эканамічны крызіс, які прыняў разбуральныя формы.

Усё гэта прывяло да хуткага росту незадаволенасці грамадства дзейнасцю Часовага ўрада, садзейнічала зніжэнню папулярнасці ліберальных партый. У войску імкліва нарасталі антываенныя настроі, масавым стала дэзерцірства, абвастрыліся адносіны паміж салдатамі і афіцэрамі. У дадзеных умовах дзейнасць Часовага ўрада была вельмі нестабільнай, суправаджалася шматлікімі крызісамі. У чэрвені 1917 г. у яго склад увайшлі шэраг

прадстаўнікоў Петраградскага Савета, у выніку чаго Часовы ўрад стаў уяўляць з сябе кааліцыю ліберальных і левых партый. У ліпені 1917 г. на чале кааліцыйнага ўрада стаў прадстаўнік ПСР *А.Ф. Керанскі*. Аднак дадзеныя мерапрыемствы не здолелі спыніць эканамічны і палітычны крызіс у дзяржаве і абумовілі далейшае развіццё рэвалюцыйных падзей.

*Такім чынам, Лютаўская рэвалюцыя ў хуткія тэрміны ліквідавала манархічную сістэму дзяржаўнай улады ў Расійскай імперыі. Яна садзейнічала імклівай дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця, развіццю беларускага нацыянальнага руху. Аднак працяг удзелу Расіі ў Першай сусветнай вайне, адкладванне вырашэння асноўных сацыяльных праблем, паглыбленне эканамічнага крызісу абумовілі крызіс новых інстытутаў улады і абвастрэнне грамадскіх супярэчнасцяў.*

### 16.3. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі і яе вынікі.

Летам – восенню 1917 г. землі Беларусі, як і ў цэлым Расійскай дзяржавы, знаходзіліся ў стане глыбокага сацыяльна-эканамічнага і сацыяльна-палітычнага крызісу. Працягваўся спад вытворчасці ва ўсіх галінах эканомікі; пагаршалася матэрыяльнае становішча насельніцтва. Адзнакай крызісу стаў хуткі рост рабочага і сялянскага руху. Паглыбляліся працэсы разлажэння войска.

Сацыяльна-палітычныя сілы ў гэты час падзяляліся на *тры блокі*:

1) *Правацэнтрысцкі блок* утваралі кансерватыўныя і ліберальныя арганізацыі, буйнейшай з якіх з’яўлялася партыя кадэтаў. Прадстаўнікі дадзенага блоку выступалі супраць далейшага развіцця рэвалюцыі, за ўстанаўленне моцнай дзяржаўнай улады, захаванне Расійскай імперыі як унітарнай дзяржавы. Правядзенне сацыяльна-эканамічных рэформ дакускалася толькі пры захаванні асноў існуючага грамадскага ладу. Лічыўся неабходным працяг вядзення вайны. Дадзены блок падтрымлівалі пераважна дваранства, гандлёва-прамысловая буржуазія, вышэйшы камандны састаў войска, частка інтэлігенцыі.

2) *Левацэнтрысцкі блок* утваралі партыі і арганізацыі сацыялістычнага кірунку: ПСР, РСДРП, Бунд, БСГ і г.д. Прадстаўнікі дадзенага блоку лічылі сваімі галоўнымі задачамі ўстанаўленне парламенцкай дэмакратыі, пераўтварэнне Расійскай імперыі ў дэмакратычную федэрацыю, правядзенне аграрнай рэформы шляхам *сацыялізацыі* (абагульнення) або *нацыяналізацыі* (адзяржаўлення) зямлі і яе размеркавання паміж асобнымі сялянскімі дварамі, забеспячэнне саўдзелу рабочых у кіраванні вытворчасцю і паляпшэнне іх матэрыяльнага становішча. Вырашэнне гэтых задач дапускалася толькі прававымі сродкамі праз Устаноўчы сход. Дэкларавалася неабходнасць завяршэння вайны шляхам дэмакратычнага міру паміж усімі ваюючымі бакамі; аднак нязгода на такі крок з боку краін Чацвярнога саюзу абумоўлівала неабходнасць працягу супраць іх “рэвалюцыйнай” вайны. Дадзены блок падтрымлівалі значная частка сялянства, рабочых і служычых, сярэднія слаі гарадскога насельніцтва, частка інтэлігенцыі.

3) *Левaрадыкальны блок* утваралі *бальшавікі* – фракцыя ўнутры РСДРП, якая ў 1917 г. канчаткова вылучылася ў самастойную партыю (з 1918 г. – *Расійская Камуністычная партыя (бальшавікоў)*, *левыя эсэры*, якія ў канцы 1917 г. стварылі самастойную *Партыю левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў*, а таксама анархісты, эсэры-максімалісты і інш. Прадстаўнікі дадзенага блоку лічылі неабходным ажыццяўленне новай рэвалюцыі, якая б стварыла падмурак для пераходу да сацыялістычнага грамадства. Уся ўлада павінна была перайсці да Саветаў, на якія ўскладалася задача правядзення карэнных пераўтварэнняў грамадскага ладу: сацыялізацыя або нацыяналізацыя зямлі, нацыяналізацыя буйной прамысловасці і фінансава-крэдытнай сістэмы, увядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю і г.д. Роля Устаноўчага сходу ў фарміраванні новай сацыяльна-палітычнай сістэмы дапускалася толькі пры ўмове прызнання ўлады Саветаў. Левыя радыкалы выступалі за неадкладнае спыненне вайны і заключэнне міру паміж ваюючымі дзяржавамі. Дадзены блок падтрымлівалі пераважна салдаты і радыкальна настроеная частка рабочых, служачых і бяднейшага сялянства.

Сацыяльна-палітычная сітуацыя ў дадзены перыяд была вельмі нестабільнай. 3-5 ліпеня 1917 г. радыкальна настроеныя салдаты і рабочыя Петраграда спрабавалі скінуць Часовы ўрад і абвясціць уладу Саветаў, аднак пацярпелі паражэнне. Напрыканцы жніўня 1917 г. адбыўся *ваенны мяцеж правых сіл на чале з Л.Карнілавым*. Мяцеж быў задушаны Часовым урадам пры падтрымцы левaрадыкальных сіл. У дадзеных умовах настроі рабочых і салдацкіх мас значна пахіснуліся "ўлева". На перавыбарах у Саветы ў верасні 1917 г. у буйных прамысловых цэнтрах і большасці вайсковых гарнізонаў перавагу атрымалі бальшавікі і левыя эсэры.

24-25 кастрычніка 1917 г. створаны Петрагарадскім Саветам Ваенна-рэвалюцыйны камітэт з дапамогай петраградскіх салдат і маракоў Балтыйскага флота ўзняў узброенае паўстанне, у выніку якога быў скінуты Часовы ўрад. У той жа час *II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў*, які праходзіў 25-27 кастрычніка 1917 г. абвясціў пераход усёй улады да Саветаў. Быў створаны новы ўрад – *Савет народных камісараў* (СНК), які ўяўляў з сябе кааліцыю бальшавікоў і левых эсэраў на чале з лідэрам бальшавікоў *У.І. Леніным*. Дадзеныя падзеі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай *Кастрычніцкай рэвалюцыі*.

Пераход улады да Саветаў у Петраградзе выклікаў аналагічныя падзеі і ў рэгіёнах, у тым ліку і ў Беларусі. Галоўную ролю ва ўстанаўленні Савецкай улады адыгралі *ваенна-рэвалюцыйныя камітэты*, створаныя з прадстаўнікоў левaрадыкальных сіл, якія абапіраліся на ўзброеную сілу рэвалюцыйных салдат. 2 лістапада 1917 г. была ўсталявана ўлада Саветаў у Мінску. Там, дзе ў Саветах колькасна пераважалі бальшавікі і левыя эсэры, дзейнасць ваенна-рэвалюцыйных камітэтаў ініцыiравалася самімі Саветамі (Мінск, часці і злучэнні Заходняга фронту). У тых мясцовасцях, дзе ў Саветах левыя радыкалы знаходзіліся ў меншасці, ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, абапіраючыся на ўзброеную падтрымку, дамагаліся перавыбараў у Саветы пад іх непасрэдным кантролем, у выніку чаго ў новых Саветах перавагу

атрымлівалі бальшавікі і левыя эсэры, якія абвяшчалі пераход улады да Саветаў (Магілёў, Віцебск, Гомель). На працягу лістапада 1917 – лютага 1918 гг. Савецкая ўлада была ўстаноўлена ва ўсіх губернях, паветах і валасцях цэнтральнай і ўсходняй Беларусі.

На тэрыторыі Мінскай губерні і Заходняга фронту выканаўчая ўлада належала *Аблвыканкамзаху* (Абласному выканаўчаму камітэту Заходняй вобласці і фронту); у Віцебскай і Магілёўскай губернях – адпаведным выканкамам пры губернскіх Саветах. Ранейшыя органы мясцовай улады – земствы і гарадскія думы – былі ліквідаваны. Была знішчана старая судовая сістэма, на месца якой ствараліся *рэвалюцыйныя трыбуналы*.

12-19 лістапада 1917 г. адбыліся выбары ва *Ўстаноўчы сход Расійскай Рэспублікі* шляхам усеагульнага, прамога, роўнага і тайнага галасавання. На тэрыторыі Беларусі большасць галасоў выбаршчыкаў атрымалі бальшавікі і левыя эсэры, галоўным чынам, дзякуючы знаходжанню тут вялікай колькасці радыкальна настроеных салдат Заходняга фронту. Аднак у цэлым большасць дэпутацкіх месцаў ва Ўстаноўчым сходзе атрымалі прадстаўнікі ПСР. 5 студзеня 1918 г. на сваім першым пасяджэнні Ўстаноўчы сход адмовіўся прызнаваць Савецкую ўладу, што выклікала яго хуткі разгон. Гэтыя падзеі выклікалі вострую палітычную канфрантацыю ў расійскім грамадстве. У 1918 г. у Расіі пачалася грамадзянская вайна, у ходзе якой супрацьстаянне паміж рознымі грамадска-палітычнымі сіламі прыняло ўзброеную форму.

Устанаўленне Савецкай улады суправаджалася звужэннем дэмакратычных свабод у грамадстве: увядзенне цэнзуры, абмежаванні ў правядзенні палітычных сходаў, дыскрымінацыя антыўрадавых партый і арганізацый. Для барацьбы з антыўрадавымі выступленнямі стваралася *Надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам (ЧК)*.

У выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі былі праведзены наступныя сацыяльныя мерапрыемствы:

1) *Зямельная рэформа*, праведзеная паводле *дэкрэту аб зямлі*: была ажыццёўлена нацыяналізацыя зямлі, адменена прыватная ўласнасць; нацыяналізаваная зямля размяркоўвалася паміж сялянскімі дварамі паводле ўраўняльнага прынцыпу. У выніку было ліквідавана памешчыцкае землеўладанне.

2) *Увядзенне рабочага кантролю* на прамысловых, гандлёвых, банкаўскіх прадпрыемствах.

3) *Нацыяналізацыя крэдытна-фінансавай сістэмы і прадпрыемстваў буйной прамысловасці*. На тэрыторыі Беларусі да лютага 1918 г. было нацыяналізавана 11 прадпрыемстваў.

4) *Пашырэнне рабочага заканадаўства*: увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня, сістэмы сацыяльнага страхавання, інспекцый працы для нагляду за ўмовамі працы, біржаў працы для барацьбы з беспрацоўем і г.д.

5) *Увядзенне бясплатнага школьнага навучання і медыцынскага абслугоўвання, барацьба з непісьменнасцю*.

6) Перасяленне рабочых, што жылі ў падвалах і бараках, у шматкватэрныя дамы, канфіскаваныя ў багацеяў (*камунальныя кватэры*).

7) *Аддзяленне царквы ад дзяржавы і школы ад царквы*; нацыяналізацыя зямельных угоддзяў, грашовых капіталаў і каштоўнай маёмасці, якая належала рэлігійным арганізацыям.

Разам з тым ажыццяўленне пераўтварэнняў ускладнялася адсутнасцю дастатковай колькасці кваліфікаваных кадраў новай улады, паглыбленнем эканамічнага крызісу, ростам злачыннасці. Агульная сітуацыя пагоршылася таксама ў выніку мяцяжу польскага корпусу на чале з генералам Доўбар-Мусніцкім у Мінскай і Магілёўскай губернях у студзені-лютым 1918 г.

Супярэчлівы характар мелі адносіны Савецкай улады да *беларускага нацыянальнага руху*. З аднаго боку, згодна з Дэкларацыяй правоў народаў Расіі, абвешчанай Савецкім урадам 2 лістапада 1917 г., сцвярджалася права ўсіх народаў на самавызначэнне, аж да аддзялення ад Расіі і стварэння незалежных дзяржаў (у адпаведнасці з ім Савецкая Расія прызнала незалежнасць Фінляндыі). З другога боку, на тэрыторыі самой Беларусі новая ўлада ажыццяўлялася пераважна вайсковымі прадстаўнікамі, што паходзілі з розных рэгіёнаў Расійскай імперыі (К. Ландар, А. Мяснікоў, В. Кнорын), якія лічылі беларускае нацыянальнае пытанне штучным, а факт існавання самастойнай беларускай нацыі – сумніўным.

Дзеячы беларускага нацыянальнага руху пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі настойвалі на стварэнні дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі. Са згоды Савецкага ўрада 14-17 снежня 1917 г. быў праведзены ў Мінску *Ўсебеларускі з'езд*. Галоўную ролю ў яго арганізацыі адыгралі Вялікая беларуская рада і *Беларускі абласны камітэт*, створаны ў Петраградзе пры Ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, што падтрымліваў пераважна левых эсэраў. У з'ездзе ўдзельнічалі 1872 дэлегаты, сярод якіх былі прадстаўнікі ад Саветаў, земстваў, зямельных камітэтаў, беларускіх нацыянальных арганізацый. Большасць дэлегатаў з'езда выступілі за дзяржаўную аўтаномію Беларусі і стварэнне органа краёвай улады ў выглядзе Ўсебеларускага Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў да склікання Ўсебеларускага Ўстаноўчага сходу. У адказ Аблвыканкамзах у ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. разагнаў з'езд. Абраная з'ездам Рада і яго рабочы орган – Выканаўчы камітэт Рады з'езда працягвалі дзейнічаць у нелегальных умовах.

У беларускім нацыянальным руху пасля разгону з'езда адбылося палітычнае размежаванне. Нацыянальныя арганізацыі ў расійскіх гарадах, у першую чаргу ў Петраградзе, працягвалі арыентавацца на Савецкі ўрад. Іх цэнтрамі з'яўляліся *Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя*, утвораная на аснове Петраградскай арганізацыі БСГ (потым далучылася да бальшавіцкай партыі), і *Беларускі нацыянальны камісарыят* (Белнацкам) на чале з *Аляксандрам Чарвяковым*, створаны 31 студзеня 1918 г. пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей Савецкага ўрада. У той жа час нацыянальныя арганізацыі ў самой Беларусі на чале з БСГ, якія адыгрывалі кіруючую ролю *Радзе і Выканаўчым камітэце Усебеларускага з'езда*, лічылі магчымым дасягненне дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі толькі пры супрацьдзеянні Савецкай уладзе.

*Такім чынам, у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі была ўстаноўлена новая сістэма ўлады, аснову якой складалі Саветы і створаныя пры іх выканаўчыя камітэты, у якіх пераважалі прадстаўнікі агульнарасійскіх левадарыкальных партый. Дадзеная ўлада абапіралася перадусім на салдат і радыкальна настроеных рабочых і ажыццявіла істотныя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, накіраваныя на вырашэнне карэнных грамадскіх праблем.* У ацэнцы характару рэвалюцыі сярод гісторыкаў існуюць розныя падыходы:

1) *сацыялістычная рэвалюцыя*: адбыліся пераўтварэнні, накіраваныя на пераход ад капіталізму да сацыялізму (панаванне дзяржаўнай уласнасці, грамадскі кантроль за вытворчасцю, ураўнаванне матэрыяльнага становішча розных слаёў насельніцтва);

2) *буржуазная рэвалюцыя*: адбыліся пераўтварэнні, накіраваныя перадусім на ліквідацыю перашкод для капіталістычнай мадэрнізацыі грамадства – ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, змяншэнне сялянскага малазямелля і г.д.; дзяржаўная ўласнасць пры гэтым разглядаецца як адзін з відаў уласнасці індустрыяльнага капіталістычнага грамадства, пры якім захоўваюцца характэрныя для яго вытворчыя адносіны паміж кіруючай адміністрацыяй і рабочымі;

3) *рэвалюцыя, якая абумовіла спецыфічны "ўсходні" варыянт мадэрнізацыі грамадства* з уласцівымі для яго панаваннем дзяржаўнай уласнасці і моцным кантролем органаў дзяржаўнай улады над рознымі сферамі сацыяльна-эканамічнага жыцця.

**Асноўныя паняцці:**

Першая сусветная вайна, Антанта, Чацвярны саюз, бежанства, Обер-Ост, Беларускі народны камітэт, Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага, Лютаўская рэвалюцыя, Часовы ўрад, Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, двоеўладдзе, грамадскія камітэты парадку, дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, салдацкія камітэты, прафсаюзы, фабрычна-заводскія камітэты, рабочы кантроль, Беларускі нацыянальны камітэт, Вялікая беларуская рада, Цэнтральная вайсковая беларуская рада, сацыялізацыя, нацыяналізацыя, Расійская камуністычная партыя (бальшавікоў), Партыя левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў, карнілаўскі мяцеж, Кастрычніцкая рэвалюцыя, Савет народных камісараў, Аблвыканкамзах, Устаноўчы сход, ЧК, дэкрэт аб зямлі, Усебеларускі з'езд, Беларускі абласны камітэт, Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя, Беларускі нацыянальны камісарыят, Рада і Выканаўчы камітэт Усебеларускага з'езда.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Вызначце асноўныя прычыны Першай сусветнай вайны. Якія ў ёй удзельнічалі ваенна-палітычныя блокі?
2. Калі тэрыторыя Беларусі становіцца тэатрам ваенных падзей Першай сусветнай вайны? Якая частка Беларусі была занята германскімі войскамі?

3. Якія палітычныя і эканамічныя мерапрыемствы праводзіліся царызмам на тэрыторыі Беларусі падчас Першай сусветнай вайны?
4. Растлумачце прычыны эканамічнага крызісу, які пачаўся падчас Першай сусветнай вайны? Якія можна вылучыць прыкметы дадзенага крызісу?
5. Які ўплыў на грамадскае жыццё цэнтральнай і ўсходняй Беларусі мела бежанства з заходніх тэрыторый?
6. Якім чынам змяняліся настроі грамадства ў адносінах да вайны? Падумайце, чым тлумачацца такія змены?
7. Растлумачце, чаму ва ўмовах ўздыму рабочага і рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі, на тэрыторыі Беларусі ён амаль зусім адсутнічаў?
8. Якія спецыфічныя рысы мела палітыка германскіх улад у заходняй частцы Беларусі?
9. Параўнайце ўмовы дзейнасці беларускага нацыянальнага руху на тэрыторыях, падкантрольных расійскім і германскім уладам?
10. Якія вынікі прынесла Беларусі Першая сусветная вайна?
11. Якім чынам адбывалася Лютаўская рэвалюцыя на тэрыторыі Беларусі? Паспрабуйце растлумачыць, чаму рэвалюцыя мела пераважна мірны характар і амаль не сустрэла супраціўлення з боку старой улады?
12. Якія новыя органы ўлады ўзніклі на тэрыторыі Беларусі ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі? Што такое двоеўладдзе?
13. Назавіце асноўныя накірункі дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця пасля Лютаўскай рэвалюцыі?
14. Якія новыя формы грамадскіх арганізацый узніклі на тэрыторыі Беларусі і на Заходнім фронце пасля Лютаўскай рэвалюцыі?
15. Дайце характарыстыку дзейнасці беларускага нацыянальнага руху пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Якія ў яго межах дзейнічалі партыі і арганізацыі?
16. Які характар мела стаўленне да беларускага нацыянальнага руху з боку расійскіх палітычных эліт у 1917 г.? Наколькі рэальнымі былі ў дадзеных умовах надзеі на рэалізацыю беларускай дзяржаўнасці?
17. Якія асноўныя сацыяльна-палітычныя блокі дзейнічалі ў палітычным жыцці Беларусі ў 1917 г.? Якія сацыяльныя сілы іх пераважна падтрымлівалі?
18. Якія падзеі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай Кастрычніцкай рэвалюцыі? Якім чынам Кастрычніцкая рэвалюцыя перамагла на тэрыторыі Беларусі?
19. Падумайце, якія фактары абумовілі хуткую перамогу левper радыкальных палітычных сіл напрыканцы 1917 г.? На якія сацыяльныя групы абапіралася Савецкая ўлада?
20. Якім чынам адбывалася перабудова сістэмы ўлады на тэрыторыі Беларусі ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі?
21. Ахарактарызуйце вынікі выбараў і дзейнасць Устаноўчага сходу. Падумайце, чаму, нягледзячы на перамогу на выбарах левацэнтрысцкіх сіл, ім не ўдалося замацаваць за сабой уладу?
22. Якія сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы былі праведзены Савецкай уладай у Беларусі ў кастрычніку 1917 – лютым 1918 гг.?

23. Растлумачце сутнасць праводзімай Савецкім урадам зямельнай рэформы паводле дэкрэта аб зямлі.
24. Які характар мела стаўленне Савецкай улады да беларускага нацыянальнага руху?
25. Калі адбыўся Ўсебеларускі з’езд? Якія ён прыняў рашэнні? У чым прычыны яго разгону?
26. Якія плыні ўтварыліся ў межах беларускага нацыянальнага руху пасля разгону Ўсебеларускага з’езду? Якім было іх стаўленне да Савецкай улады?
27. Якія Вам вядомыя гістарычныя канцэпцыі, якія тлумачаць характар Кастрычніцкай рэвалюцыі? Якая з іх падаецца Вам найбольш слушнай?
28. Падумайце, ці былі якія-небудзь рэальныя гістарычныя альтэрнатывы Кастрычніцкай рэвалюцыі ва ўмовах 1917-1918 гг.? Растлумачце сваю пазіцыю.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі падчас Першай сусветнай вайны.
2. Бежанства на беларускіх землях ва ўмовах Першай сусветнай вайны.
3. Нацыянальная палітыка германскіх улад у заходняй Беларусі ў 1915-1917 гг.
4. Дэмакратызацыя войска на Заходнім фронце ў 1917 г.
5. Дзейнасць прафсаюзаў пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі.
6. Станаўленне органаў Савецкай улады на тэрыторыі Беларусі.
7. Выбары ва Устаноўчы сход на тэрыторыі Беларусі і іх вынікі.
8. Усебеларускі з’езд: перадумовы, ход, вынікі.

## Тэма 17: Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1918-1921 гг.

**1. Ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі ў 1918 г. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.**
**2. Абвяшчэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР.**
**3. Савецка-польская вайна 1919-1920 гг. Другое абвяшчэнне БССР.**

### 17.1. Ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі ў 1918 г. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.

У хуткім часе пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Савецкі ўрад заключыў перамір’е з краінамі Чацвярнога саюзу і пачаў з імі мірныя перамовы. Перамовы паміж расійскімі і германскімі ўладамі адбываліся ў Брэсце. Да пачатку 1918 г. расійскае войска ў выніку масавага дэзерцірства і праведзенай савецкімі ўладамі частковай дэмабілізацыі амаль цалкам развалілася – на Заходнім фронце засталося не больш за 150 тыс. салдат. У гэтых умовах германскі бок імкнуўся заключыць мірны дагавор на максімальна выгадных для сябе ўмовах. У сярэдзіне лютага 1918 г. перамовы былі сарваны і баявыя дзеянні аднаўлены. Германскае войска амаль без супраціўлення заняла ўсю Мінскую, частку Віцебскай і Магілёўскай губерняў да лініі Орша – Магілёў –

Гомель. 3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, і Германіяй і Аўстра-Венгрыяй, з другога, быў заключаны *Брэсцкі мірны дагавор*. Паводле яго, тэрыторыі Польшчы, Літвы, Курляндыі і часткі Беларусі на захад ад лініі Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны, перадаваліся Германіі і Аўстра-Венгрыі, якія павінны былі вызначыць іх будучыню ў адпаведнасці з пажаданнямі мясцовага насельніцтва. Прызнавалася незалежнасць *Украінскай Народнай Рэспублікі*, якой перадаваліся тэрыторыі Брэсцкага, Пінскага, Рэчыцкага, Мазырскага і Гомельскага паветаў. Астатняя тэрыторыя, занятая германскімі войскамі да падпісання Брэсцкага міру, заставалася часова акупіраванай да часу выплаты вялікай кантрыбуцыі Расіяй.

Заходнебеларускія землі, уключаныя ў склад *Обер-Оста*, планавалася ўключыць у склад будучай Польскай дзяржавы. У той жа час прэтэнзіі на іх выказалі прадстаўнікі літоўскага нацыянальнага руху, якія абвясцілі 16 лютага 1918 г. незалежнасць Літоўскай Рэспублікі, якая была прызнана Германіяй 23 красавіка.

На *тэрыторыі, часова акупіраванай германскімі ўладамі,* была ўстаноўлена ўлада ваеннага камандавання. Галоўнай яе мэтай з'яўлялася максімальнае выкарыстанне людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краю для патрэб вядзення вайны. Дзеянні германскіх улад выклікалі незадаволенасць значнай часткі насельніцтва і абумовілі сацыяльную нестабільнасць, асноўнымі адзнакамі якой з'яўляліся:

- шматлікія сялянскія выступленні, выкліканыя аднаўленнем памешчыцкага землеўладання і падаткова-рэквізіцыйнай палітыкай германскіх улад;
- актывізацыя рабочага руху; самай значнай яго праявай стала забастоўка гомельскіх чыгуначнікаў у ліпені 1918 г.;
- арганізацыя партызанскага руху, які ўзначальвалі пераважна бальшавікі і левыя эсэры.

Ва ўмовах германскай акупацыі была ажыццёўлена спроба ўтварэння *незалежнай беларускай дзяржавы*. Падчас адступлення расійскіх войскаў з Мінска Выканаўчы камітэт Рады Ўсебеларускага з'езда з дапамогай створанага Першага Мінскага беларускага палка паспрабаваў узяць уладу ў горадзе. *21 лютага 1918 г.* ён звярнуўся да беларускага народа з *Першай Устаўной граматай*, у якой абвясціў сябе часовай уладай на тэрыторыі Беларусі, вылучыў са свайго складу орган выканаўчай улады – *Народны Сакратарыят* на чале з *Язэпам Варонкам* і абавязаўся склікаць Усебеларускі Устаноўчы сход. Германскія ўлады не прызналі дадзеных органаў улады, але не забаранілі іх дзейнасць.

Выканкам Рады Ўсебеларускага з'езда ў знак пратэсту супраць Брэсцкага міру *9 сакавіка 1918 г.* выдае *Другую Устаўную грамату*, у якой абвяшчалася *Беларуская Народная Рэспубліка (БНР)* у этнаграфічных межах пражывання беларускага народа, а сам Выканкам быў перайменаваны ў *Раду БНР*, прэзідыум якой узначаліў дзеяч БСГ *Ян Серада*. Граматай зацвярджаўся статус Рады і Народнага сакратарыята БНР як часовых органаў улады да склікання Ўсебеларускага Ўстаноўчага сходу. У ёй таксама абвяшчаліся

дэмакратычныя свабоды, культурная аўтаномія нацыянальных меншасцяў, сацыялізацыя зямлі, 8-гадзінны працоўны дзень. У склад Рады БНР былі ўведзены прадстаўнікі расійскіх і яўрэйскіх сацыялістычных партый, а таксама беларускіх нацыянальных дзеячоў з Вільні.

Сярод прадстаўнікоў БСГ у сакавіку 1918 г. набывала папулярнасць ідэя абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Гэта тлумачылася наступнымі фактарамі:

- крах спадзяванняў на ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці з дапамогай дэмакратычных сіл у Расіі;
- небяспека падзелу тэрыторыі Беларусі паміж некалькімі дзяржавамі.

***25 сакавіка 1918 г.*** Рада БНР выдала *Трэцюю Ўстаўную грамату*, паводле якой абвяшчалася поўная *незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі* ў яе этнаграфічных межах і змяшчалася патрабаванне перагляду ўмоў Брэсцкага міру.

Аднак дадзены акт не атрымаў міжнароднага прызнання (прызналі яго толькі Украіна і Літва). Германскія ўлады яго праігнаравалі. Абвяшчэнне незалежнасці выклікала крызіс ўнутры Рады БНР: супраць яго выступілі прадстаўнікі расійскіх і яўрэйскіх сацыялістычных партый, якія неўзабаве пакінулі Раду. У гэтых умовах правае крыло БСГ паспрабавала знайсці падтрымку ў германскіх улад; у склад Рады БНР былі ўведзены прадстаўнікі ліберальных і кансерватыўных арганізацый. Паводле іх ініцыятывы, Рада БНР у красавіку 1918 г. звярнулася да германскага імператара Вільгельма II з падзякай за вызваленне Беларусі і з просьбай дапамагчы ва ўмацаванні дзяржаўнай незалежнасці краю ў саюзе з Германіяй.

Аднак германскія ўлады адмовіліся прызнаць БНР. Рада і ўрад БНР не атрымалі ніякай рэальнай улады. Іх роля была абмежавана стварэннем дарадчых устаноў пры павятовых ваенных камендатурах і ажыццяўленнем культурна-асветніцкай дзейнасці. На акупіраванай германскімі войскамі тэрыторыі Беларусі ўзнікла больш за 160 беларускамоўных школ, *Беларускі педагагічны інстытут* у Мінску, таварыства драмы і камедыі, 14 друкаваных выданняў і г.д.

Паварот Рады БНР "управа" і цеснае супрацоўніцтва з германскімі ўладамі выклікалі яе ўнутраны крызіс. У якасці пратэсту Народны Сакратарыят на чале з Я. Варонкам падаў у адстаўку. Летам – восенню 1918 г. былі створаны два нетрывалыя ўрады БНР, якія не знаходзілі падтрымкі сярод большасці дзеячоў беларускага нацыянальнага руху. Адбыўся раскол БСГ, на месцы якой утварыліся новыя партыі: *Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (БСДП), Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў (БПСФ), Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР)*. БПСР з восені 1918 г. пераходзіць да актыўнай барацьбы з германскімі акупантамі, стварае падпольныя арганізацыі, аб'яднаныя ў *Сувязь беларускага працоўнага сялянства*.

Ва *ўсходняй частцы Беларусі, якая знаходзілася пад уладай Савецкай Расіі*, адбываўся пераход да аўтарытарнай палітычнай сістэмы. Вясной – летам 1918 г. абвастрыліся супярэчнасці паміж кіруючымі партыямі бальшавікоў і левых эсэраў. У ліпені 1918 г. левыя эсэры паднялі паўстанне ў

Маскве і некаторых іншых гарадах Расіі, але яны былі падаўлены бальшавікамі. Пасля гэтых падзей левыя эсэры былі выведзены з Савецкага ўрада і пачалася фарміравацца *аднапартыйная дыктатура бальшавікоў*. У ліпені 1918 г. была прынята Канстытуцыя *Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі* (РСФСР). Паводле яе, Саветы абвяшчаліся вышэйшымі органамі ўлады ў дзяржаве. Аднак, на практыцы ўсе асноўныя палітычныя рашэнні прымала кіраўніцтва бальшавіцкай партыі і ствараемыя ім надзвычайныя органы. З Саветаў выключаліся амаль усе апаненты большавікоў. Адбывалася згортванне дэмакратычных свабод: зачыняліся апазіцыйныя перыядычныя выданні, пераследвалася дзейнасць апазіцыйных палітычных арганізацый, былі адноўлены прынцыпы адзінаначалля ў войску, адноўлена пакаранне смерцю і г.д. З восені 1918 г. бальшавіцкая ўлада абвясціла палітыку *чырвонага тэрору* ў адносінах да "ворагаў Савецкай улады" (расстрэлы, зняволенні, узяцце закладнікаў па палітычных матывах), у ажыцяўленні якой галоўную ролю адыгрывала ЧК.

На тэрыторыі Смаленскай, усходніх частак Віцебскай і Магілёўскай губерняў у красавіку 1918 г. была ўтворана *Заходняя вобласць* (з верасня 1918 г. – *Заходняя камуна*), якая была звычайнай адмінстрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай. На чале створаных у ёй органаў улады знаходзіліся дзеячы былога Аблвыканкамзаха. Патрабаванні Белнацкома, беларускіх камуністычных і бежанскіх арганізацый аб аўтаноміі Беларусі ігнараваліся.

На працягу 1918 г. вызначыліся новыя накірункі ў *сацыяльна-эканамічнай палітыцы Савецкай улады*:

1) *Нацыяналізацыя ў прамысловасці* (распаўюджвалася не толькі на буйную, але і на сярэднюю і часткова дробную).

2) *Цэнтралізацыя кіравання эканомікай*; галоўнымі органамі яе ажыццяўлення станавіліся *саветы народнай гаспадаркі (саўнаргасы)*. Фактычна скасоўваліся рабочы кантроль і самакіраванне працоўных калектываў у прамысловасці і гандлі.

3) *Увядзенне рэквізіцый сельскагаспадарчай прадукцыі ў сялян* для забеспячэння патрэб войска ў грамадзянскай вайне; ствараліся *харчовыя атрады* з ліку вайскоўцаў і *камітэты беднаты* (*камбеды*) з ліку бяднейшага сялянства. Дзейнасць камбедаў выклікала масавую незадаволенасць сялянства; у некаторых паветах усходняй Беларусі летам 1918 г. адбыліся сялянскія паўстанні пад кіраўніцтвам левых эсэраў. Гэта абумовіла ліквідацыю камбедаў, аднак правядзенне рэквізіцый працягвалася. На канфіскаваных памешчыцкіх землях заахвочвалася стварэнне буйных дзяржаўных (дзяржгасы) і калектыўных (камуны, арцелі) гаспадарак.

У другой палове 1918 г. геапалітычная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі зноў стала змяняцца. У жніўні 1918 г. пасля выплаты Савецкай Расіяй часткі кантрыбуцыі германскія войскі адступілі на захад ад р. Бярэзіна. 3-9 лістапада 1918 г. у Германіі адбылася рэвалюцыя, якая прывяла да звяржэння манархіі. Новы германскі ўрад *11 лістапада 1918 г.* заключыў перамір'е з краінамі Антанты, што прывяло да *канца Першай сусветнай вайны*. У дадзеных умовах урад РСФСР ануляваў Брэсцкі мір. Германскае

войска паступова выводзілася з акупіраваных тэрыторый, якія займаліся расійскай Чырвонай арміяй. 10 снежня 1918 г. Чырвоная армія ўступіла ў Мінск. Да лютага 1919 г. бальшавіцкая ўлада была ўстаноўлена амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, акрамя зямель на захад ад лініі Вільня – Ліда – Слонім – Агінскі канал. Спробы Рады і новага ўрада (*Рады народных міністраў*) БНР на чале з А. Луцкевічам, а таксама расійскіх і яўрэйскіх левацэнтрысцкіх груповак атрымаць у гэтых умовах уладу або дамовіцца з бальшавікамі аб кааліцыі поспеху не мелі. У выніку Рада і ўрад БНР фактычна распаліся: частка іх дзеячоў засталася ў Мінску, разлічваючы на супрацоўніцтва з бальшавікамі, частка пераехала ў Вільню, а потым у Гродна, дзе выступала за дзяржаўны саюз з Літвой, частка – эмігравала за межы Беларусі.

*Такім чынам, у выніку ваенна-палітычных падзей 1918 г. была абвешчана першая незалежная беларуская нацыянальная дзяржава – Беларуская Народная Рэспубліка. Аднак дэклараваная дзяржаўнасць не стала фактам. Прычынамі гэтага былі:*

*- адсутнасць масавай падтрымкі беларускага нацыянальнага руху сярод беларускага насельніцтва (сацыяльная база руху была вельмі вузкай);*

*- адсутнасць сур'ёзных вайсковых і матэрыяльных рэсурсаў беларускага нацыянальнага руху;*

*- складаная геапалітычная сітуацыя (падзел Беларусі паміж некалькімі дзяржавамі, адсутнасць зацікаўленасці ў беларускай дзяржаўнасці з боку буйнейшых еўрапейскіх дзяржаў);*

*- непаслядоўнасць палітычнай дзейнасці і адсутнасць адзінства ў межах беларускага нацыянальнага руху.*

### 17.2. Абвяшчэнне БССР і Літоўска-Беларускай ССР.

Пасля аднаўлення Савецкай улады на большай частцы тэрыторыі Беларусі бальшавіцкі ўрад у Маскве змяніў адносіны да беларускага нацыянальнага пытання. Ён пайшоў на стварэнне беларускай дзяржаўнасці, залежнай ад Савецкай Расіі, на чым настойвалі прадстаўнікі прабальшавіцкай часткі беларускага нацыянальнага руху. Дадзеныя змены былі абумоўлены наступнымі фактарамі:

- неабходнасць дэманстрацыі перад міжнароднай супольнасцю павагі да абвешчанага права нацый на самавызначэнне (пасля абвяшчэння БНР факт існавання беларускай нацыі бальшавіцкімі ўладамі адкрыта не адмаўляўся);
- імкненне да стварэння альтэрнатывы антыбальшавіцкай БНР;
- імкненне да стварэння буфернай дзяржавы паміж Савецкай Расіяй і Польскай рэспублікай, якая была створана ў лістападзе 1918 г. і выяўляла прэтэнзіі на беларускія тэрыторыі.

У дадзеных умовах 30 снежня 1918 г. у Смаленску адбыўся I з'езд *Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б)*, якая стала аўтаномнай адзінкай у складзе РКП(б). У кіраўніцтве КП(б)Б пераважалі былыя дзеячы Аблвыканкамзаха (А. Мяснікоў, М. Калмановіч, В. Кнорын), якія непрыхільна ставіліся да ідэі беларускай дзяржаўнасці. Аднак пад

націскам Масквы яны выказаліся за пераўтварэнне Заходняй камуны ў *Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (БССР)*.

*1 студзеня 1919 г.* было афіцыйна абвешчана утварэнне БССР у *Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага ўрада БССР*, дзе былі вызначаны асноўныя палажэнні яе дзяржаўнага статусу. Тэрыторыя БССР ахоплівала Мінскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую, Смаленскую, часткі Віленскай і Чарнігаўскай губерняў. Сталіцай станавіўся Смаленск, а з 5 студзеня 1919 г. – Мінск. На чале Часовага рабоча-сялянскага ўрада стаў лідэр беларускіх камуністаў *Зміцер Жылуновіч*; але ў цэлым ва ўрадзе пераважалі былыя дзеячы Аблвыканкамзаха.

Але ўжо 16 студзеня Цэнтральны камітэт РКП(б) прыняў рашэнне аб перадачы Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў у склад РСФСР, а астатняй частцы БССР было дырэктыўна прапанавана стварыць сумесную дзяржаву з Савецкай Літвой, утворанай у снежні 1918 г. Гэта выклікала ўрадавы крызіс, у выніку якога ўрад БССР пакінулі 6 міністраў на чале з З.Жылуновічам. На чале ўрада стаў А.Ф. Мяснікоў.

2-3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся *I Усебеларускі з'езд Саветаў*, на якім прысутнічала 230 дэлегатаў. На ім была прынята першая *Канстытуцыя БССР*. Паводле яе, вышэйшым органам улады ў БССР абвяшчаўся *Усебеларускі з'езд Саветаў*, а ў перыяд паміж з'ездамі – выбіраемы з'ездам *Цэнтральны выканаўчы камітэт* (ЦВК). Функцыі выканаўчай улады ўскладаліся на *Вялікі прэзідыум*, фарміруемы ЦВК. У канстытуцыі дэклараваліся грамадзянскія і палітычныя правы працоўнага народа. У той жа час пазбаўляліся выбарчых і некаторых іншых палітычных правоў прадстаўнікі былых эксплуататарскіх класаў. Выбары ў Саветы з'яўляліся непрапарцыянальнымі, шматступеньчатымі і адкрытымі. Фактычна органы ўлады БССР знаходзіліся ў залежнасці ад Масквы.

У ходзе з'езда быў сфарміраваны Вялікі прэзідыум, у які ўвайшлі пераважна былыя дзеячы Аблвыканкамзаха на чале з А. Мясніковым.

27 лютага 1919 г. на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК БССР і Літоўскай ССР была створана адзіная *Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (ЛітБелССР)* са сталіцай у Вільні. Структура ўлады ў ЛітБелССР была падобнай да той, што стваралася ў БССР. Аднак у якасці вышэйшага органа выканаўчай улады прадугледжваўся *Савет народных камісараў (СНК)*. На чале ЦВК ЛітБелССР стаў К. Цыхоўскі, а СНК – В. Міцкявічус-Капсукас. Беларускіх камуністаў у складзе кіраўніцтва ЛітБелССР не было. ЛітБелССР уяўляла з сябе буферную дзяржаву ва ўмовах вайны з Польскай і Літоўскай рэспублікамі. Улады ЛітБелССР, таксама як і БССР фактычна падпарадкоўваліся кіраўніцтву РСФСР.

У канцы 1918 – пачатку 1919 гг. ва ўмовах абвастрэння эканамічнага крызісу і грамадзянскай вайны ў Расіі бальшавіцкія ўлады пачынаюць ажыццяўленне палітыкі "*ваеннага камунізму*", якая прадугледжвала наступныя мерапрыемствы:

- увядзенне *харчовай развёрсткі* – прымусовай рэквізіцыі ў сялян сельскагаспадарчай прадукцыі для пакрыцця выдаткаў на войска;

- увядзенне дзяржаўнай манаполіі на гандаль;
- нацыяналізацыя амаль усёй прамысловасці, уключаючы дробную;
- устанаўленне жорсткай сістэмы размеркавання харчовых і прамысловых тавараў;
- увядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці.

Характэрна тое, што канфіскаваныя на тэрыторыі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі памешчыцкія землі не перадаваліся сялянам, а пераўтвараліся ў дзяржаўныя і калектыўныя гаспадаркі. Палітыка "ваеннага камунізму", а таксама правядзенне мабілізацый у Чырвоную армію для ўдзелу ў грамадзянскай вайне ў Расіі выклікалі масавую незадаволенасць. У розных паветах адбыўся шэраг сялянскіх паўстанняў. Мелі месца хваляванні і ў Чырвонай арміі, самым значным сярод якіх было *паўстанне салдат у Гомелі і Рэчыцы пад кіраўніцтвам М. Стракапытава ў сакавіку 1919 г.* Падаўленне гэтых паўстанняў суправаджалася ўзмацненнем палітыкі чырвонага тэрору з боку бальшавіцкай улады.

Разам з тым дадзеныя акалічнасці абумовілі нетрываласць улады ў ЛітБелССР. Да восені 1919 г. амаль уся тэрыторыя ЛітБелССР была занята войскамі Польскай і Літоўскай рэспублік. Кіраўніцтва ЛітБел ССР і кампартыі Літвы і Беларусі перабраліся ў Смаленск. Фактычна дадзеная рэспубліка спыніла сваё існаванне.

*Такім чынам, у 1919 г. адбылося фарміраванне беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР, а затым ЛітБелССР, у межах якіх утварыліся дзяржаўныя структуры, якія знаходзіліся ў аўтаномных адносінах да Савецкай Расіі. Разам з тым гэтыя формы дзяржаўнасці на той момант аказаліся нетрывалымі, што абумоўлівалі тыя ж фактары, якія не спрыялі ажыццяўленню дзяржаўнасці ў форме БНР, а таксама адсутнасць дакладнага размежавання паўнамоцтваў паміж уладамі новаўтвораных рэспублік і Расіі.*

### 17.3. Савецка-польская вайна 1919-1920 гг. Другое абвяшчэнне БССР.

У выніку рэвалюцый у Германіі і Аўстра-Венгрыі ў лістападзе 1918 г. была абвешчана незалежнасць Польскай рэспублікі. Ад самага пачатку свайго існавання яе ўлады выказвалі тэрытарыяльныя прэтэнзіі на землі, якія ўваходзілі раней у склад Рэчы Паспалітай.

Ва ўмовах вываду германскіх войскаў з тэрыторый былой Расійскай імперыі польскія ўлады замацаваліся на частцы заходнебеларускіх зямель. У выніку да лютага 1919 г. склалася часовая польска-савецкая мяжа па лініі Вільня – Ліда – Слонім – Агінскі канал. Аднак такая сітуацыя не задавальняла абодва бакі. З аднаго боку, польскія ўлады лічылі неабходным прасунуць мяжу на ўсход і адмовіліся прызнаць ЛітБелССР. З другога, ўлады Савецкай Расіі разлічвалі на "экспарт рэвалюцыі" ў Польшчу. Гэтыя акалічнасці абумовілі *вайну паміж Польшчай і Савецкай Расіяй (напачатку фармальна толькі з ЛітБел ССР) 1919-1920 гг.*

*Савецка-польская вайна мела два этапы*, паміж якім было часовае перамір'е:

1) люты-верасень 1919 г.;

2) сакавік-кастрычнік 1920 г.

На *першым этапе* вайны польскія войскі дастаткова хутка занялі тэрыторыю заходняй і цэнтральнай Беларусі. Да верасня 1919 г. фронт усталяваўся на лініі рэк Беразіна – Днепр. Дадзеныя поспехі польскага войска былі абумоўлены некалькімі фактарамі:

- нязначная ўвага ўлад Савецкай Расіі да савецка-польскага фронту ва ўмовах канцэнтрацыі асноўных ваенных сіл у грамадзянскай вайне ў Расіі;

- шырокая ваенна-тэхнічная і эканамічная падтрымка Польшчы з боку краін Антанты, якія разлічвалі на тое, што моцная польская дзяржава стане ў Цэнтральнай Еўропе супрацьвагай Расіі і Германіі;

- адсутнасць масавай падтрымкі Чырвонай арміі ў тыле (незадаволенасць большай часткі беларускага насельніцтва палітыкай "ваеннага камунізму").

З верасня 1919 г. ваенныя дзеянні часова спыніліся. На занятых польскімі войскамі тэрыторыях ліквідаваліся створаныя бальшавікамі органы ўлады, распускаліся прабальшавіцкія арганізацыі. У органы грамадзянскай адміністрацыі ўваходзілі толькі тыя, хто лічыў сябе палякам. Дзяржаўнай мовай абвячалася польская. Аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне. Польскае войска ў шырокіх памерах праводзіла рэквізіцыі сельскагаспадарчай прадукцыі.

У той жа час польскія ўлады імкнуліся стварыць пэўную сацыяльную базу сярод беларускага насельніцтва. 29 красавіка 1919 г. начальнік Польскай рэспублікі *Юзэф Пілсудскі* ў Вільні выступіў са зваротам да насельніцтва былога ВКЛ, у якім абвяшчалася права народаў на самавызначэнне ў межах федэрацыі з Польшчай. У Мінскай акрузе, дзе польскія пазіцыі былі дастаткова слабымі, дазвалялася ўжыванне беларускай мовы ў грамадскім жыцці, быў адноўлены Беларускі педагагічны інстытут у Мінску. Дадзеныя фактары абумовілі супрацоўніцтва з польскім уладамі часткі дзеячоў беларускага нацыянальнага руху, асабліва прадстаўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і правацэнтрысцкіх беларускіх арганізацый, якія разлічвалі на стварэнне федэрацыі Беларусі з Польшчай у складзе абноўленай Рэчы Паспалітай. У той жа час другая частка беларускага нацыянальнага руху на чале з Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў выступала ў якасці легальнай апазіцыі польскім уладам.

У кастрычніку 1919 г. Ю. Пілсудскі даў дазвол на аднаўленне дзейнасці Рады БНР, маючы спадзяванні на перавагу ў ёй прыхільнікаў прапольскай арыентацыі і прыняцце рашэнняў пра далучэнне БНР да Польшчы. Аднак на сесіі ў снежні 1919 года адбыўся раскол Рады БНР. Антыпольская група (50 чалавек) утварыла *Народную раду БНР* на чале з сацыялістам-федэралістам П. Крачэўскім і кабінет міністраў на чале з беларускім эсэрам В. Ластоўскім. Яны заявілі аб вернасці Трэцяй Устаўной грамаце БНР і выказалі пратэст супраць акупацыі Беларусі польскай арміяй. Прапольская фракцыя (37 чалавек) утварыла *Найвышэйшую раду БНР* на чале з сацыял-

дэмакратам Я. Лёсікам і пацвердзіла паўнамоцтвы ўрада Антона Луцкевіча. У хуткім часе Народная рада БНР была забаронена, а многія яе лідэры арыштаваны. Прэзідыум і ўрад Народнай рады БНР з лістапада 1920 г. знаходзіліся ў сталіцы Літвы Коўне. Адмова польскіх улад разглядаць пытанне аб фарміраванні беларускай дзяржаўнасці прывяла да крызісу і распаду ў 1920 г. Найвышэйшай рады БНР і яе ўраду.

Палітыка польскіх уладаў выклікала незадаволенасць значнай часткі насельніцтва. Узброеную барацьбу супраць польскіх улад узначальвалі бальшавікі, беларускія эсэры, *Беларуская камуністычная арганізацыя* (узнікла на аснове левага крыла БПСР), яўрэйскія сацыялістычныя партыі (Бунд, Паалей-Цыён). У снежні 1919 г. паміж гэтымі партыямі было заключана пагадненне аб сумесных дзеяннях. У сакавіку 1920 г. сілы антыпольскага фронту стварылі *Беларускі паўстанцкі камітэт.* Напрыканцы 1919 – пачатку 1920 гг. БПСР становіцца найбольш масавай беларускай партыяй (да 20 тыс. чалавек). Партызанскі рух у першай палове 1920 г. набыў шырокі размах. Вясной 1920 г. польскія ўлады з-за дыверсій вымушаны былі спыніць ваенныя перавозкі амаль на ўсіх чыгуначных магістралях Беларусі.

У сакавіку 1920 г. аднавілася савецка-польская вайна. Бальшавіцкія ўлады перакідваюць на польскі фронт вялікія ваенныя сілы (грамадзянская вайна ў Расіі на той час паступова заціхае). У ліпені 1920 г. Чырвоная армія пад камандаваннем М. Тухачэўскага ажыццяўляе *наступленне* на тэрыторыі Беларусі. Да пачатку жніўня яна ўся знаходзілася пад іх кантролем. У сярэдзіне жніўня Чырвоная армія падышла да Варшавы і Львова.

У гэтых умовах Савецкая Расія імкнулася забяспечыць нейтралітэт з боку Літоўскай рэспублікі. *12 ліпеня 1920 года Савецкая Расія і Літва падпісалі дагавор*, згодна з якім РСФСР прызнавала незалежнасць Літоўскай рэспублікі з уключэннем у яе склад Віленскай і часткі Гродзенскай губерняў з гарадамі Вільня, Гродна, Ліда, Вілейка, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў. Дадзены дагавор азначаў фармальную ліквідацыю ЛітБелССР.

У дадзеных умовах бальшавіцкія ўлады вырашылі аднавіць беларускую савецкую дзяржаву. 31 ліпеня 1920 г. у Мінску была прынята *Дэкларацыя аб незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі*. Часовая ўлада перадавалася *Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту* (старшыня – А.Чарвякоў), які павінен быў дзейнічаць да II з’езда Саветаў Беларусі. Аднаўленне БССР акрамя бальшавікоў падтрымалі Бунд і Беларуская камуністычная арганізацыя, якая неўзабаве далучылася да бальшавіцкай партыі. БПСР патрабавала стварэння ўрада з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый, арганізацыі самастойнага беларускага войска і абвяшчэння поўнай незалежнасці Беларусі. Гэта выклікала разрыў саюзу паміж БПСР і бальшавікамі.

У снежні 1920 г. адбыўся *II Усебеларускі з’езд Саветаў* у Мінску. На ім у Канстытуцыю БССР былі ўнесены змяненні, згодна з якімі ЦВК станавіўся распарадчым органам з’езда, выканаўчая ўлада надавалася СНК БССР. Старшынёй ЦВК і СНК БССР стаў А. Чарвякоў. З’езд ратыфікаваў умовы

савецка-польскага пагаднення ад перамір'і і надаў ураду Савецкай Расіі права заключаць любыя міжнародныя пагадненні ад імя БССР.

У жніўні 1920 г. польскае войска здолела разбіць пад Варшавай Чырвоную армію, перайсці ў контрнаступленне і на працягу жніўня-кастрычніка 1920 г. ізноў заняць заходнюю частку Беларусі. 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе паміж Савецкай Расіяй і Польшчай было падпісана *перамір'е* і пачаліся мірныя перамовы.

Абодва бакі былі зацікаўлены ў хутчэйшым спыненні вайны. На гэта ўплывала складаная эканамічная і ваенна-палітычная сітуацыя ў абедзвюх дзяржавах. На тэрыторыі Беларусі, занятай як польскімі, так і савецкімі войскамі, адбываліся частыя хваляванні, дзейнічалі шматлікія паўстанцкія атрады. Пры падтрымцы польскага боку ў лістападзе 1920 г. на тэрыторыю Палесся ўвайшлі атрады (каля 20 тыс.чал.) пад кіраўніцтвам *С.Булак-Балаховіча*, які абвясціў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы. Яны занялі Пінск, Мазыр, Калінкавічы, але ў снежні 1920 г. яны былі разбітыя Чырвонай арміяй. З 27 лістапада па 28 снежня 1920 г. адбылося *Слуцкае ўзброенае паўстанне*, якое ўзначальвалі прыхільнікі незалежнай БНР. У паўстанні ўдзельнічала каля 4 тыс.чал. Антыбальшавіцкія паўстанні адбыліся ў Гомелі, Койданаве, Аршанскім, Бабруйскім, Барысаўскім і Ігуменскіх паветах.

У кастрычніку 1920 г. польскія войскі занялі Вільню і прылеглую да яе тэрыторыю, дзе была абвешчана новая дзяржава – *Сярэдняя Літва*, кіраўніцтва якой заявіла аб далучэнні да Польшчы. Гэта выклікала палітычны канфлікт Польшчы з Літвой.

*18 сакавіка 1921 г.* паміж Савецкай Расіяй і Польшчай быў падпісаны *Рыжскі мірны дагавор*. Паводле яго, заходняя частка Беларусі (Віленская, Гродзенская, частка Мінскай губерняў) адыходзіла да Польшчы; усходняя (Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына) – да Савецкай Расіі. Суверэнітэт БССР прызнаваўся на тэрыторыі 6 паветаў Мінскай губерні з тэрыторыяй 52 тыс. кв.км і насельніцтвам каля 1,5 млн. чалавек.

*Такім чынам, у выніку савецка-польскай вайны тэрыторыя Беларусі была падзелена паміж Польшчай і Расіяй. У той жа час была адноўлена беларуская савецкая дзяржава – БССР, якая ахоплівала невялікую тэрыторыю ўсходняй Беларусі і знаходзілася ў залежнасці ад Савецкай Расіі. Разам з тым гэтае ўтварэнне стала падмуркам развіцця беларускай дзяржаўнасці ў далейшым.*

**Асноўныя паняцці:**

Брэсцкі мірны дагавор, Першая Устаўная грамата Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з'езда, Беларуская Народная Рэспубліка, Народны Сакратарыят БНР, Рада БНР, Другая Устаўная грамата БНР, Трэцяя Устаўная грамата БНР, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў, Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, аднапартыйная дыктатура бальшавікоў, Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка, Заходняя вобласць (Заходняя камуна), чырвоны тэрор, харчовыя атрады, камбеды, Камуністычная партыя (бальшавікоў)

Беларусі, Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, I Усебеларускі з'езд Саветаў, Канстытуцыя БССР 1919 г., Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, "ваенны камунізм", савецка-польская вайна 1919-1920 гг., Народная рада БНР, Найвышэйшая рада БНР, савецка-літоўскі дагавор 1920 г., Дэкларацыя аб незалежнасці БССР 1920 г., Слуцкае паўстанне, Сярэдняя Літва, Рыжскі мірны дагавор.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якім чынам складваліся ваенна-палітычныя падзеі на тэрыторыі Беларусі ў лютым-сакавіку 1918 г.? Падумайце, чаму германскія войскі здолелі ў кароткі тэрмін часу авалодаць значнымі тэрыторыямі?
2. Якія асноўныя палажэнні Брэсцкага мірнага дагавора 1918 г.?
3. Якія дзяржаўна-палітычныя структуры былі ўтвораны дзеячамі беларускага нацыянальнага руху ў лютым-сакавіку 1918 г.? Якія яны ставілі перад сабой мэты?
4. Калі былі прыняты тры ўстаўныя граматы Беларускай Народнай Рэспублікі? Якія змяшчаліся ў іх палажэнні? Дайце іх характарыстыку?
5. Паспрабуйце растлумачыць, чаму лідэры беларускага нацыянальнага руху ў сакавіку 1918 г. пераходзяць ад ідэі дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі да ідэі поўнай дзяржаўнай незалежнасці?
6. Якія расколы адбыліся вясной 1918 г. у Радзе БНР? Чым яны былі выкліканы? Дайце характарыстыку палітычных пазіцый асноўных беларускіх арганізацый вясной – летам 1918 г.
7. Якія фактары перашкаджалі станаўленню беларускай дзяржаўнасці ў форме БНР?
8. Падумайце, якое значэнне мела абвяшчэнне БНР у гістарычным працэсе станаўлення беларускай дзяржаўнасці?
9. Якія змены адбыліся ў палітыцы Савецкай улады на тэрыторыі ўсходняй Беларусі ў 1918 г.?
10. Якія палітычныя падзеі ў Еўропе абумовілі ануляванне Брэсцкага мірнага дагавору і вывад германскіх войскаў з тэрыторыі Беларусі?
11. Падумайце, чаму напрыканцы 1918 г. бальшавіцкія ўлады змяняюць сваю пазіцыю адносна беларускага нацыянальнага пытання і ініцыіруюць стварэнне беларускай савецкай дзяржавы?
12. Калі была абвешчана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка? Якія былі створаны ў ёй органы дзяржаўнай улады?
13. Калі адбыўся I Усебеларускі з'езд Саветаў? Вызначце асноўныя спецыфічныя рысы Канстытуцыі БССР 1919 г.
14. Калі функцыянавала ЛітБелССР? Дайце характарыстыку органаў улады гэтай дзяржавы?
15. Падумайце, наколькі самастойнымі ў правядзенні сваёй палітыкі з'яўляліся органы ўлады ў БССР і ЛітБелССР?
16. Якое значэнне мела абвяшчэнне БССР у 1919 г. і ЛітБелССР у развіцці беларускай дзяржаўнасці?

17. Якія асаблівасці мела сацыяльна-эканамічная палітыка бальшавікоў у канцы 1918 – пачатку 1919 гг.? Растлумачце сутнасць палітыкі “ваеннага камунізму”?
18. Калі пачалася савецка-польская вайна? Якія прычыны яе выклікалі?
19. Дайце характарыстыку асноўных этапаў савецка-польскай вайны. Якое месца ў ваенных падзеях займала тэрыторыя Беларусі?
20. Які характар мела палітыка польскіх уладаў на занятай імі ў 1919 г. тэрыторыі Беларусі?
21. Ахарактарызуйце адносіны беларускага нацыянальнага руху да польскіх уладаў у 1919-1920 гг.
22. Якія палітычныя сілы займаліся арганізацыяй узброенай барацьбы супраць польскіх уладаў на тэрыторыі Беларусі ў 1919-1920 гг.? Чым можна патлумачыць палітычны саюз бальшавікоў з беларускімі эсэрамі?
23. Якія падзеі адбываліся на тэрыторыі Беларусі напрыканцы савецка-польскай вайны? Чым было выклікана перамір’е паміж ваюючымі бакамі ў кастрычніку 1920 г.?
24. Калі быў заключаны савецка-літоўскі мірны дагавор? Якія тэрыторыі Беларусі, паводле яго, адышлі да Літвы?
25. Чым было абумоўлена аднаўленне БССР у ліпені 1920 г.? У якіх тэрытарыяльных межах утваралася гэтая дзяржава?
26. Растлумачце, чаму новае абвяшчэнне БССР выклікала канец саюзу і пачатак канфрантацыі паміж бальшавікамі і БПСР?
27. Калі быў заключаны Рыжскі мірны дагавор? Якім чынам, згодна з ім, была падзелена тэрыторыя Беларусі?
28. Падумайце, якія вынікі меў Рыжскі мірны дагавор у кантэксце развіцця беларускай нацыі і беларускай дзяржаўнасці?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ва ўмовах германскай акупацыі 1918 г.
2. Дзейнасць Рады і ўрадаў БНР у 1918-1925 гг.
3. Палітыка “ваеннага камунізму”: сутнасць, асноўныя накірункі.
4. Беларускі нацыянальны рух ва ўмовах польскай акупацыі 1919-1920 гг.
5. Антыпольскі партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў 1919-1920 гг.
6. Слуцкае паўстанне: перадумовы, ход, вынікі.
7. Рыжскі мірны дагавор: гісторыя заключэння, асноўныя вынікі.

## Тэма 18: Новая эканамічная палітыка і палітыка беларусізацыі ў БССР

**1. Перадумовы і абвяшчэнне новай эканамічнай палітыкі.**
**2. Эканамічнае развіццё БССР у перыяд нэпа.**
**3. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1920-я гг.**
**4. Палітыка беларусізацыі і развіццё культуры ў 1920-я гг.**

## 18.1. Перадумовы і абвяшчэнне новай эканамічнай палітыкі.

У выніку войнаў і правядзення палітыкі “ваеннага камунізму” *эканоміка Савецкай дзяржавы апынулася ў глыбокім крызісе*:

1) Агульны аб’ём валавой прадукцыі прамысловасці склаў каля 15-20% да ўзроўню 1913 г. К канцу 1920 г. у савецкай частцы Беларусі працавалі з перабоямі толькі 40% буйных прадпрыемстваў, на якіх было занята каля 70% усіх рабочых даваеннага часу.

2) Пасяўныя плошчы скараціліся ў параўнанні з даваенным часам на 1/3, валавыя зборы зерня – напалову, рэзка знізіліся ўраджайнасць і пагалоўе жывёлы.

3) Амаль цалкам быў з-за недахопу паліва паралізаваны чыгуначны і водны транспарт.

4) Адбывалася хуткая інфляцыя, рост цэн.

Усё гэта прывяло да значнага пагаршэння матэрыяльнага становішча насельніцтва. Заработная плата рабочых у прамысловасці складала каля 10-20% даваеннага ўзроўню, насіла пераважна натуральны характар. Рэзка ўзрасло беспрацоўе, якое ў некаторых раёнах дасягала 75%. Многія рабочыя, каб знайсці сродкі да існавання ўцякалі ў навакольныя вёскі, дзе наймаліся на працу. У выніку правядзення харчразвёрсткі сялянская гаспадарка страчвала сувязі з рынкам і мела амаль выключна натуральны характар. Забарона свабоды гандлю разам з празмернай цэнтралізацыяй і дробязнай рэгламентацыяй гаспадарчай дзейнасці садзейнічала росту бюракратызму і хабарніцтва. Велізарных памераў дасягнула кантрабанда.

Палітыка “ваеннага камунізму” выклікала незадаволенасць шырокіх колаў насельніцтва. У 1920-1921 гг. пашыраліся забастоўкі рабочых, накіраваныя на абарону эканамічных інтарэсаў. У розных месцах адбываліся сялянскія выступленні супраць бальшавіцкай улады. У 1921 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі больш за 40 паўстанцкіх атрадаў, у якіх налічвалася звыш 5 тыс. чалавек. Сярод сялянства праводзілі дзейнасць прадстаўнікі палітычных сіл, якія арыентаваліся на Польшчу (прыхільнікі С. Булак-Балаховіча і партыя “Зялёны дуб”), з аднаго боку, а таксама прыхільнікі незалежнасці БНР (найперш БПСР), з другога.

Сітуацыя ўскладнілася пасля правядзення дэмабілізацыі ў Чырвонай арміі ў сувязі з завяршэннем савецка-польскай вайны, а таксама грамадзянскай вайны ў Расіі. Былыя салдаты папаўнялі шэрагі беспрацоўных і маргіналізаваных элементаў. Усё гэта спрыяла ўзрастанню грамадскай незадаволенасці, якая набыла палітычны характар. Апазіцыйныя настроі пранікаюць нават у шэрагі бальшавіцкай партыі. У лютым 1921 г. прайшлі забастоўкі і палітычныя дэманстрацыі ў Петраградзе. У канцы лютага – сакавіку 1921 г. адбываецца паўстанне маракоў у Кранштаце. Усё гэта сведчыла пра палітычны крызіс і стварала істотную небяспеку для бальшавіцкай улады. Бальшавіцкаму кіраўніцтву на чале з У. Леніным удалося задушыць антыўрадавыя выступленні, але разам з тым палітычны крызіс вымусіў яго пайсці на правядзенне рэформ.

На *X з'ездзе РКП(б)*, які адбыўся ў сакавіку 1921 г. было абвешчана ўвядзенне *новай эканамічнай палітыкі* (нэп). Яна прадугледжвала наступныя пераўтварэнні:

1) Замена харчразвёрсткі *харчовым падаткам*, які паступова зніжаўся з 20% прадукцыяй у 1921 г. да 5% грашыма ў 1925 г. (падатак меў прагрэсіўны характар, мелася сістэма ільгот для тых, хто пашыраў пасяўныя плошчы і павялічваў ураджайнасць).

2) Абвяшчэнне *свабоды форм землекарыстання* ў сельскай гаспадарцы (законнымі прызнаваліся абшчына, калектыўныя гаспадаркі, прыватнае ўладанне ў выглядзе вотрубаў ці хутароў).

3) Дазвол арэнды і наёмнай працы ў сельскай гаспадарцы.

4) Дазвол прыватнага гандлю сельскагаспадарчай прадукцыяй.

5) Дазвол на стварэнне акцыянерных і камерцыйных банкаў.

6) Дазвол на прыватызацыю і перадачу ў арэнду прыватным асобам і таварыствам дробных і сярэдніх гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў.

7) Дазвол на *канцэсіі* – здачу ў арэнду прадпрыемстваў замежным фірмам (на Беларусі канцэсіі не былі пашыраны).

8) Дэцэнтралізацыя сістэмы кіравання прамысловасцю: ствараліся *трэсты* – аб'яднанні прадпрыемстваў пэўнай галіны, якія атрымалі поўную гаспадарчую і фінансавую незалежнасць, а таксама *сіндыкаты* – аб'яднанні трэстаў на аснове кааперацыі.

9) Заахвочванне розных форм кааперацыі ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці і гандлі.

10) Зняцце абмежаванняў на павелічэнне заробкаў і перамену месца работы працоўных.

У кантэксце мерапрыемстваў нэпа была праведзена грашовая рэформа 1922-1924 гг., якая прывяла да стабілізацыі валюты.

*Такім чынам, новая эканамічная палітыка ўяўляла з сябе сукупнасць мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне эканамічнай сістэмы, якая спалучала пануючую ролю дзяржавы ў рэгуляванні эканамічных працэсаў з развіццём гаспадарчых суб'ектаў розных форм уласнасці, што валодалі адноснай эканамічнай свабодай. Дадзеная палітыка садзейнічала стварэнню рэгулюемай рыначнай эканомікі.*

### 18.2. Эканамічнае развіццё БССР у перыяд нэпа.

*Сельская гаспадарка ў перыяд нэпа*

Дзякуючы мерапрыемствам нэпа ў сельскай гаспадарцы аграрная вытворчасць на 1925/26 гг. у агульным дасягнула даваеннага ўзроўню. Пераважала развіццё жывёлагадоўлі з малочным і свінагадоўчым ухілам. Значныя плошчы займалі пасевы тэхнічных культур. Некалькі палепшылася матэрыяльнае становішча сялянства.

Увядзенне нэпа супала па часе з рэалізацыяй дэкрэта аб зямлі. Аднак пры пераразмеркаванні нацыяналізаваных зямель толькі 23% было перададзена сялянам, астатняе перайшло ў дзяржаўны і лясны зямельны фонд, было перададзена саўгасам і сельскагаспадарчым кааператывам. У

выніку сярэдняя забяспечанасць аднаго двара зямлёй заставалася амаль на ранейшым узроўні: да 1917 г. на адзін двор прыходзілася 8,35 дзесяціны зямлі, у 1924 г. – 8,41 дзесяціны.

Малазямелле сялянства павялічвалася ў выніку спынення ранейшай эміграцыі (забарона выезду за мяжу) і перасялення ў горад (крызіс у прамысловасці), натуральнага росту насельніцтва і пасямейных раздзелаў. Землезабяспечанасць сярэдняй беларускай сялянскай гаспадаркі была ніжэй сярэдняй па СССР на 1/3. Большасць гаспадарак мелі паўнатуральны характар і не валодалі сродкамі для ўкаранення новых спосабаў вядзення гаспадаркі, мелі нізкую пакупніцкую здольнасць. У параўнанні з даваенным часам таварнасць сельскай гаспадаркі знізілася ўдвая.

У перыяд нэпа дзяржаўныя ўлады рабілі стаўку на развіццё сялянскай гаспадарчай ініцыятывы ў справе развіцця сельскай гаспадаркі. Сельскагаспадарчая палітыка ў БССР у 1925-1928 гг. абазначаецца тэрмінам "*прышчэпаўшчына*". Д.Ф.Прышчэпаў, народны камісар земляробства БССР, быў прыхільнікам стварэння хутароў і невялікіх пасёлкаў. У выніку правядзення землеўпарадкавання на 1928 гг. каля 25% сялян перайшлі на хутары і водрубы.

У перыяд нэпа адбываецца пашырэнне *сельскагаспадарчай кааперацыі*, якая развівалася галоўным чынам у крэдытнай сферы, забеспячэнні і збыце прадукцыі вытворчасці. Да кастрычніка 1927 г. ступень кааперавання дасягнула 37% сялянскіх гаспадарак. Стварэнне вытворчых калектыўных гаспадарак ішло павольнымі тэмпамі, нягледзячы на дзяржаўную падтрымку. *Калектыўныя гаспадаркі* ў гэты час мелі тры асноўныя формы:

- *камуны* (адбывалася поўнае абагульненне маёмасці);
- *арцелі* (адбывалася абагульненне зямлі, працоўнай жывёлы, сельскагаспадарчага інвентару і гаспадарчых пабудоў, пры захаванні ў асабістым карыстанні прысядзібных надзелаў, дробных прылад працы, хатняй жывёлы);
- *таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі* (абагульнялася толькі зямля).

*Прамысловасць і гандаль.*

У ходзе правядзення нэпа паступова ішло аднаўленне прамысловасці. Да 1927 г. валавая прадукцыя буйной прамысловасці перавысіла ўзровень 1913 г. Была адноўлена палова буйных прадпрыемстваў, што дзейнічалі да Першай сусветнай вайны, колькасць рабочых дасягнула 94% ад даваеннага ўзроўню. Амаль усе прадпрыемствы буйной прамысловасці з'яўляліся дзяржаўнымі. Згодна з прынцыпамі нэпа, да канца 1922 г. дзяржаўная прамысловасць Беларусі была пераведзена на дзяржразлік. Да верасня 1924 г. было арганізавана 9 трэстаў у БССР. Праводзілася *электрыфікацыя* гаспадаркі. У 1925-1926 гг. у Беларусі дзейнічала 40 электрастанцый.

Адбывалася аднаўленне дробнай і саматужна-рамесніцкай прамысловасці. У 1927 г. дзейнічала 85,7% ад даваеннай колькасці прадпрыемстваў дадзеных тыпаў. На 1926 г. на іх было занята 73% рабочых, выраблялася 58% валавай прадукцыі усёй прамысловасці. Большую частку

дробнай вытворчасці складаў недзяржаўны сектар (прыватныя прыдпрыемствы і арэнда). Адбывалася развіццё *прамысловай кааперацыі*. Дзейнасць прыватных прадпрыемстваў абмяжоўвалася і рэгулявалася дзяржавай. Іх патрэбы ў абсталяванні, матэрыялах, атрыманні крэдытаў у апошнія гады існавання нэпа задавальняліся ў апошнюю чаргу, да таго ж, прыватныя прадпрыемствы выплочвалі вялікія падаткі. Таму ўдзельная вага прыватнай прамысловасці паступова зніжалася.

Асноўнымі галінамі прамысловасці БССР заставаліся харчовая, дрэваапрацоўчая, папяровая, металаапрацоўчая, гарбарная, шкляная.

У выніку прамысловага росту некалькі палепшылася матэрыяльнае становішча рабочага класа. Аднак у цэлым яно заставалася цяжкім. Даволі высокім быў узровень беспрацоўя.

*Такім чынам, нягледзячы на аднаўленне эканомікі ў перыяд нэпа, у цэлым яна па-ранейшаму мела аграрны характар. Удзельная вага сельскай гаспадаркі ў вытворчасці БССР склала 71,6%, прамысловасці – 22,3%. Каля 89% насельніцтва жыло ў вёсцы. Узровень сельскай гаспадаркі заставаўся нізкім: у выніку малазямелля сялянства гаспадарка мела паўнатуральны характар, вяляася пераважна пры дапамозе прымітыўнай тэхнікі. У прамысловасці пераважала дробная і рамесна-саматужная вытворчасць, якая базіравалася на мясцовай сыравіне. Усё гэта востра ставіла пытанне пра эканамічную мадэрнізацыю краіны.*

### 18.3. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1920-я гг.

У 1920-я гг. ва ўсходняй Беларусі, як і ў цэлым у Савецкай дзяржаве адбываецца станаўленне *аўтарытарнага палітычнага рэжыму*. Яго спецыфікай выступае ўстанаўленне пануючага статусу бальшавіцкай партыі (РКП(б), з 1925 г. – ВКП(б) (*Усесаюзная камуністычная партыя (бальшавікоў*), якая ўзяла пад кантроль усё палітычнае жыццё і фактычна ліквідавала ўсялякую легальную палітычную апазіцыю. Разам з тым дапускалася магчымасць праяўлення адноснай свабоды ў іншых сферах грамадскага жыцця: навуцы, культуры і г.д. Устанаўленне манаполіі бальшавіцкай партыі на ўладу не выключала адкрытай палітычнай барацьбы ўнутры самой партыі за ўладу ў гэты перыяд. Асаблівай вастрыні яна дасягнула пасля смерці У. Леніна ў студзені 1924 г.

30 снежня 1922 г. на Х Усерасійскім з’ездзе Саветаў (ён жа *I Усесаюзны з’езд Саветаў*) былі ўхвалены *Дэкларацыя і Дагавор пра стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік* (СССР). Новая дзяржава стваралася як федэрацыя чатырох савецкіх рэспублік: Расійскай Федэрацыі, Украіны, Закаўказскай Федэрацыі і БССР. Потым да іх на працягу 1920-1930-х гг. далучыліся іншыя саюзныя рэспублікі (у 1940 г. іх налічвалася 16). Да кампетэнцыі саюзнага ўрада адносіліся пытанні знешняй палітыкі, фінансаў, узброеных сіл, шляхоў зносін, сувязі, а таксама выпрацоўка агульных правілаў палітычнага і эканамічнага жыцця (агульнае планаванне народнай гаспадаркі і кіраўніцтва ёю, зацвярджэнне агульнасаюзнага бюджэту, функцыянаванне агульнай крэдытнай і грашовай сістэмы і г.д.). Вырашэнне

астатніх пытанняў заставалася за ўрадамі рэспублік. Асноўныя палажэнні Дагавора былі зацверджаны першай *Канстытуцыяй СССР 1924 г.* Фактычная аўтаномія асобных рэспублік ад самага пачатку была абмежаванай. Уся рэальная ўлада была сканцэнтравана ў руках партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў Маскве.

Падзел Беларусі паміж Польшчай і Савецкай Расіяй пасля 1921 г. абумовіў актыўнае выкарыстанне бальшавіцкімі ўладамі ў сваіх палітычных інтарэсах беларускага нацыянальнага пытання. Рабіліся намаганні паказаць, што нацыянальныя патрэбы ў Савецкай дзяржаве задаволены ў большай ступені, чым у Польшчы. Вынікам гэтага стала *ўзбуйненне БССР* за кошт ўсходнебеларускіх зямель. У сакавіку 1924 года да БССР было далучана 15 паветаў Віцебскай, Гомельскай (былой Магілёўскай) і Смаленскай губерняў. У снежні 1926 г. да БССР адышлі Гомельскі і Рэчыцкі паветы. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася больш чым у два разы. У 1924-1927 гг. была праведзена *адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа*, паводле якой тэрыторыя БССР была падзелена на 10 акруг, якія ў сваю чаргу падзяляліся на 10 раёнаў. У межах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцяў ствараліся *нацыянальныя Саветы* (яўрэйскія, польскія, рускія, латышскія, нямецкія, украінскія).

5-12 красавіка 1927 года на чарговым VIII з’ездзе Саветаў БССР была прынята новая *Канстытуцыя БССР*. Яна юрыдычна замацавала факт уваходжання БССР у склад СССР і вызначыла правы БССР у складзе СССР: самастойна прымаць канстытуцыю, уносіць у яе змены, ствараць вышэйшыя органы ўлады і кіравання, вызначаць адміністрацыйны падзел. Былі дэкларlivaны грамадзянскія і палітычныя правы грамадзян, аднак указваліся іх абмежаванні у адносінах “эксплуататарскіх элементаў” (тых, хто выкарыстоўваў наёмную працу) (апошнія, пазбаўляліся права ўдзелу ў выбарах, займання дзяржаўных пасад, абмяжоўвалася іх права паступлення ў ВНУ і г.д.). Праца абвяшчалася абавязкам усіх грамадзян. Вышэйшым органам улады з’яўляўся *Ўсебеларускі з’езд Саветаў*. Паміж з’ездамі вышэйшую заканадаўчую ўладу ажыццяўляў ЦВК Саветаў, а выканаўчую – сфарміраваны ім СНК БССР. Дзяржаўнымі мовамі былі зацверджаны беларуская, руская, польская і яўрэйская. Мовай міжнацыянальных зносін вызначалася беларуская.

Рэальная палітычная ўлада ў БССР належала кіраўніцтву Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, якая фактычна кантралявала дзейнасць усіх дзяржаўных органаў улады. Рэзка павялічвалася колькасць членаў КП(б)Б: за 1922-1929 гг. яна ўзрасла з 5 да 33 тыс. чалавек. Маскоўскае кіраўніцтва ўважліва сачыла за сітуацыяй у кампартыях рэспублік. Рэгулярна ў нацыянальныя рэгіёны СССР дасылаліся партыйныя работнікі з цэнтра.

Саветы ў гэты перыяд канчаткова пераўтварыліся ў фармальныя органы ўлады; іх дзейнасць практычна цалкам кантралявалася партыйнымі органамі. Разам з тым у перыяд нэпа рабіліся спробы павысіць ролю Саветаў у вырашэнні пытанняў мясцовага гаспадарчага і культурнага жыцця,

падатковай палітыкі. Прафсаюзы і іншыя грамадскія арганізацыі таксама пераўтвараліся ў дадатак дзяржаўна-адміністрацыйнага апарату.

У першай палове 1920-х гг. бальшавікам, дзякуючы поспехам нэпа, удалося задушыць антыўрадавыя ўзброеныя выступленні. У 1922 г. у БССР было адменена ваеннае становішча. Бальшавіцкія ўлады шляхам палітыкі лавіравання і рэпрэсій дамагліся ліквідацыі легальнай палітычнай апазіцыі. У 1921 г. пад націскам улад "самаліквідаваўся" Бунд, у 1923 г. – БСДП, у 1924 г. – БПСР.

*Такім чынам, у 1920-я гг. адбывалася далейшае развіццё беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР, якая ў дадзены перыяд істотна пашырыла сваю тэрыторыю і атрымала замацаваны прававым шляхам аўтаномны статус у складзе СССР. У гэты перыяд фарміруецца аўтарытарны аднапартыйны палітычны рэжым.*

### 18.4. Палітыка беларусізацыі і развіццё культуры ў 1920-я гг.

Выкарыстанне бальшавіцкімі ўладамі беларускага нацыянальнага пытання працягвалася і пасля ўзбуйнення БССР і адлюстравалася ў палітыцы *беларусізацыі*, пра якую афіцыйна было абвешчана ў *ліпені 1924 г.*

Палітыка беларусізацыі мела *вызначаныя накірункі*:

- перавод справаводства на беларускую мову (пры гэтым наладжвалася абавязковае вывучэнне дзяржаўнымі служачымі беларускай мовы);
- перавод адукацыйных устаноў на беларускую мову;
- вылучэнне на кіруючыя пасады ў дзяржаўных і мясцовых органах улады мясцовых ураджэнцаў (палітыка "*карэнізацыі*");
- падтрымка развіцця беларускай культуры і ўсебаковага навуковага вывучэння Беларусі, яе гісторыі, эканомікі і г.д.

*Палітыка беларусізацыі мела значныя вынікі*:

- беларуская мова заняла пануючае месца ў дзяржаўным справаводстве, часткова нават уводзілася ў часцях Чырвонай арміі на тэрыторыі БССР;
- замацаванне беларускай мовы ў сістэме агульнаадукацыйнай школы (да 1928 г. каля 80% школ было пераведзена на беларускую мову навучання);
- павелічэнне долі асоб беларускай нацыянальнасці ў сістэме дзяржаўнага апарату (на 1927 г. сярод кіраўнікоў акруговага і раённага маштабу яна складала 48%);
- хуткае развіццё краязнаўства, беларускай мастацкай літаратуры, тэатру, іншых форм беларускамоўнай культуры.

У выніку беларусізацыі ўзрасла нацыянальная свядомасць беларускага насельніцтва, што істотна паскорыла працэс фарміравання беларускай нацыі.

Беларусізацыя мела пазітыўныя вынікі для палітычнай стабілізацыі. Гэта выклікала змены ў адносінах да Савецкай дзяржавы з боку прадстаўнікоў беларускага нацынальнага руху як у самой Беларусі, так і ў эміграцыі. У іх асяроддзі пачынае набываць папулярнасць ідэя падтрымкі беларускай дзяржаўнасці ў савецкай форме. На *II канферэнцыі Рады БНР* у Берліне ў 1925 г. яе лідэры на чале з А. Цвікевічам абвясцілі аб *самароспуску Рады БНР* і прызнанні БССР адзінай формай беларускай дзяржаўнасці. Многія

беларускія эмігранты заявілі пра сваю лаяльнасць да бальшавіцкай улады, вярнуліся ў БССР і прымалі актыўны ўдзел у яе навуковым і культурным жыцці (В. Ластоўскі, А. Цвікевіч, А. Смоліч і інш.).

Правядзенне палітыкі беларусізацыі разглядалася як стратэгічная лінія, галоўным чынам, з боку беларускай часткі партыйнага кіраўніцтва БССР. Большасць партыйна-дзяржаўных кіраўнікоў разглядалі яе як часовы тактычны крок, накіраваны на павышэнне прэстыжу бальшавіцкай улады сярод насельніцтва і нейтралізацыю палітычных праціўнікаў.

У 1920-я гг. у БССР была створана *новая адукацыйная сістэма*. У яе ўваходзілі наступныя ўзроўні:

- пачатковая адукацыя (*чатырохгадовыя школы*);
- сярэдняя адукацыя (*сямігадовыя школы*);
- прафесійна-тэхнічная (*прафесійна-тэхнічныя школы*) і сярэдняя спецыяльная (*тэхнікумы*) адукацыя;
- вышэйшая адукацыя (*універсітэты і інстытуты*).

З 1927 г. было ўведзена ўсеагульнае пачатковае навучанне. У 1928/29 навучальным годзе ў БССР налічваліся 5723 пачатковыя і сярэднія школы, у якіх праходзіла навучанне 79% ад усёй колькасці дзяцей. Паралельна праводзіліся мерапрыемствы па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых. У выніку ў другой палове 1920-х гг. ужо больш паловы жыхароў БССР з'ўляліся пісьменнымі.

Для задавальнення патрэб у спецыялістах у розных галінах гаспадаркі і невытворчай сферы пашыралася сетка тэхнікумаў (педагагічных, сельскагаспадарчых, індустрыяльна-тэхнічных, эканамічных і г.д.). У 1928/29 навучальным годзе іх было 32 з 5,5 тыс. навучэнцаў.

У 1920-я гг. у Беларусі адраджаецца сістэма вышэйшай адукацыі. У 1921 г. у Мінску быў адчынены *Беларускі дзяржаўны універсітэт*. Потым з'явіліся *Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі* (1922), *Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія* ў Горках (1925), *Віцебскі ветэрынарны інстытут* (1924). У сярэдзіне 1920-х гг. ва ўсіх ВНУ БССР навучалася звыш 4 тыс. студэнтаў.

Цэнтрам навуковага жыцця ў БССР становіцца *Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт,)*, заснаваны ў 1922 г. Работа інстытута арганізоўвалася па секцыях. У 1926 г. дзейнічала 5 секцый: лінгвістычная, літаратурна-мастацкая, гісторыка-археалагічная, прыродазнаўчая, сацыяльна-эканамічная. Першым кіраўніком Інбелкульта быў *С.М.Некрашэвіч*, з 1924 г. – *У.М.Ігнатоўскі* (ён жа першы старшыня Акадэміі навук). На аснове Інбелкульта ў 1929 г. фарміруецца *Акадэмія навук БССР*. Навукова-даследчая работа праводзілася таксама ў межах вышэйшых навучальных устаноў. У 1920-я гг. у БССР фарміруюцца новыя доследныя станцыі ў галіне сельскай і лясной гаспадаркі.

У 1920-я гг. адбываецца арганізацыя культурна-асветніцкіх устаноў, якімі ў гарадах становяцца *клубы*, а ў сельскай мясцовасці – *хаты-чытальні*. Пры іх ажыццяўляліся папулярызацыя навуковых і тэхнічных ведаў сярод насельніцтва, чытанне газет і кніг, праводзіліся палітычная і антырэлігійная

прапаганда. Павялічвалася колькасць бібіліятэк. У 1922 г. адчынілася *Дзяржаўная бібліятэка БССР*. У 1921 г. створана *Дзяржаўнае выдавецтва БССР*, якое мела свае аддзяленні ва ўсіх значных гарадах рэспублікі. Гэта дазволіла значна павялічыць выданне літаратуры. Павялічылася колькасць перыядычных выданняў: у 1925 г. у БССР выдавалася 20 газет і 15 часопісаў.

У той жа час культурна-асветніцкая праца суправаджалася дыскрымінацыйнай палітыкай у адносінах да ўсіх рэлігійных канфесій. Культавыя рэлігійныя збудаванні зачыняліся і руйнаваліся; ажыццяўляліся рэпрэсіі ў адносінах да служыцеляў рэлігійнага культу.

Палітыка беларусізацыі садзейнічала развіццю беларускай мастацкай літаратуры і тэатру. Фарміруюцца беларускія літаратурныя аб'яднанні: "*Маладняк", "Узвышша", "Полымя*". Былі створаны *беларускія дзяржаўныя тэатры* ў Мінску і Віцебску. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей і беларусізацыі ў значнай ступені развіваліся жывапіс і музычнае мастацтва.

Разам з тым бальшавіцкія ўлады імкнуліся ў пэўнай ступені абмежаваць дзейнасць навукоўцаў і мастакоў і ўстанавіць ідэалагічны кантроль у сферы навукі і мастацтва. Аднак да канца 1920-х гг. ён не меў татальнага характару і дапускаў пэўную інтэлектуальную свабоду.

*Такім чынам, на працягу 1920-х гг. у БССР актыўна праводзілася палітыка беларусізацыі, якая хутка прынесла адчувальныя вынікі і садзейнічала паскарэнню працэсаў фарміравання беларускай нацыі. У гэты перыяд адбывалася хуткае развіццё адукацыі, навукі, культуры ва ўмовах адноснай інтэлектуальнай свабоды.*

**Асноўныя паняцці:**

Новая эканамічная палітыка (нэп), трэсты, сіндыкаты, "прышчэпаўшчына", кааперацыя, камуна, сельскагаспадарчая арцель, таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, электрыфікацыя, аўтарытарызм, Усесаюзная камуністычная партыя (бальшавікоў), Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, Канстытуцыя СССР 1924 г., узбуйненне БССР, адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа 1924-1927 гг., Канстытуцыя БССР 1927 г, беларусізацыя, "карэнізацыя", II канферэнцыя Рады БНР, тэхнікумы, Беларускі дзяржаўны універсітэт, Інбелкульт, Акадэмія навук БССР, Дзяржаўная бібліятэка БССР, Дзяржаўнае выдавецтва БССР.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Ахарактарызуйце асноўныя перадумовы ўвядзення новай эканамічнай палітыкі на тэрыторыі Беларусі?
2. Якія асноўныя мерапрыемствы прадугледжвала новая эканамічная палітыка?
3. У чым заключалася адрозненне харчовага падатку, уведзенага падчас нэпа, ад харчразвёрсткі?
4. Падумайце, чаму бальшавіцкія ўлады, якія ў перыяд "ваеннага камунізму", вялі барацьбу супраць прыватнай уласнасці ў розных сферах эканомікі, падчас нэпа дазволілі дзейнасць прыватнага сектару ў эканоміцы?

5. Што такое трэсты і сіндыкаты? Чым сістэма кіравання дзяржаўнай прамысловасцю ў перыяд нэпа адрознівалася ад “ваенна-камуністычнай” сістэмы?
6. Падумайце, як мерапрыемствы нэпа маглі паўпываць на адносіны розных сацыяльных груп насельніцтва да бальшавіцкай улады? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.
7. Калі сельская гаспадарка БССР дасягнула даваеннага ўзроўню? Якія галіны аграрнай вытворчасці БССР найбольш развіваліся ў 1920-я гг.?
8. Якія формы землекарыстання існавалі ў сельскай гаспадарцы БССР у 1920-я гг. Якія з іх былі пераважаючымі?
9. Што такое “прышчэпаўшчына”? Чым можна патлумачыць падтрымку дзяржаўнымі ўладамі БССР у 1920-я гг. хутарскіх гаспадарак?
10. Якія формы сельскагаспадарчай кааперацыі развіваліся ў БССР у перыяд нэпа?
11. Якім чынам адбывалася аднаўленне прамысловасці БССР у 1920-я гг.? Як паўплывалі на аднаўленчыя працэсы мерапрыемствы нэпа?
12. Дайце характарыстыку развіцця прыватнага сектара ў прамысловасці і гандлі БССР ва ўмовах нэпа?
13. Ахарактарызуйце асноўныя праблемы, якія мелі месца ў эканоміцы БССР у 1920-я гг.? Як можна вызначыць узровень яе развіцця ў кантэксце станаўлення індустрыяльнага грамадства?
14. Растлумачце, што такое аўтарытарны рэжым? Ці можна вылучыць адзнакі падобнага рэжыму ў БССР у 1920-я гг.? Абгрунтуйце сваю пазіцыю.
15. Калі быў створаны СССР? Якім чынам Дагавор пра стварэнне СССР размяжоўваў кампетэнцыю саюзнай і рэспубліканскіх улад?
16. Калі адбывалася ўзбуйненне БССР? Якія тэрыторыі былі далучаны да беларускай савецкай дзяржавы ў гэты час?
17. Якімі фактарамі было выклікана ўзбуйненне БССР? Які ўплыў гэта мела на адносіны да БССР прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху?
18. Калі была прынята другая Канстытуцыя БССР? Якія яна ўтрымлівала асноўныя палажэнні?
19. Якую ролю ў палітычным жыцці БССР у 1920-я гг. мела бальшавіцкая партыя? Чым быў абумоўлены т.зв. самароспуск апазіцыйных да яе палітычных партый?
20. Што такое беларусізацыя? Якія яна мела асноўныя накірункі?
21. Растлумачце сутнасць палітыкі “карэнізацыі”? Ці можна бачыць у дадзенай палітыцы дыскрымінацыю нацыянальных меншасцяў у БССР?
22. Якія вынікі мела палітыка беларусізацыі ў БССР у 1920-я гг.? Ці можна яе лічыць эфектыўнай?
23. Растлумачце, якое значэнне мела палітыка беларусізацыі для развіцця працэсу фарміравання беларускай нацыі?
24. Ахарактарызуйце сістэму адукацыі, якая ўзнікла ў БССР у 1920-я гг.
25. Падумайце, чаму ў адрозненне ад царызму, які варожа ставіўся да развіцця адукацыі, бальшавіцкая ўлада ўсяляк гэтаму садзейнічала?
26. У межах якіх устаноў адбывалася развіццё навукі ў БССР у 1920-я гг.?

27. Дайце характарыстыку развіцця культурна-асветніцкай дзейнасці ў БССР у 1920-я гг.
28. У якой ступені ў культурным жыцці БССР 1920-х гг. захоўвалася інтэлектуальная свабода? Якія меліся элементы ідэалагічнага кантролю?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Новая эканамічная палітыка ў БССР: заканадаўчая база, этапы, вынікі.
2. Развіццё кааперацыі ў БССР у перыяд нэпа.
3. Фінансава-крэдытная сістэма ў БССР у перыяд нэпа.
4. Землеўпарадкаванне ў БССР у 1920-я гг.
5. Узбуйненне БССР: перадумовы, этапы, вынікі.
6. Устанаўленне манаполіі КП(б)Б на ўладу ў першай палове 1920-х гг.
7. Беларусізацыя ў сістэме дзяржаўнага справаводства: ход, вынікі.
8. Барацьба з непісьменнасцю ў БССР як элемент культурна-адукацыйнай палітыкі Савецкай улады.

## Тэма 19: БССР у 1930-я гг.

**1. Індустрыялізацыя ў БССР у 1930-я гг.**
**2. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі БССР.**
**3. Усталяванне таталітарнага палітычнага рэжыму ў БССР.**
**4. Адукацыя і культура.**

### 19.1. Індустрыялізацыя ў БССР у 1930-я гг.

Пераважна аграрны характар эканомікі СССР, невысокі ўзровень развіцця прамысловасці ў параўнанні з эканамічна развітымі краінамі Захаду рабілі відавочнай адсталасць савецкай эканомікі. У гэтых умовах бальшавіцкае кіраўніцтва дзяржавы прыняла курс на паскарэнне працэсаў мадэрнізацыі, галоўным элементам якой выступала *індустрыялізацыя* – працэс пераўтварэння прамысловасці ў вядучую галіну эканомікі. Такім шляхам бальшавіцкія ўлады спадзяваліся пераўтварыць СССР у буйную прамысловую і ваенную дзяржаву. Ва ўмовах нэпа працэс індустрыялізацыі адбываўся павольна; стварэнне буйной прамысловасці патрабавала значных сродкаў, якіх у тагачасных сацыяльна-эканамічных умовах было недастаткова для выканання пастаўленых задач; традыцыйныя крыніцы індустрыялізацыі, такія як прыцягненне замежных інвестыцый і прыватнага капіталу бальшавіцкімі ўладамі даспускаліся толькі ў абмежаваным аб'ёме.

Праблема шляхоў і метадаў індустрыялізацыі выклікала шырокую дыкусію сярод бальшавіцкага кіраўніцтва, якая суправаджалася барацьбой за ўладу паміж living рознымі групоўкамі ўнутры партыйнай эліты. Устанаўленне напрыканцы 1920-х гг. аднаасобнай дыктатуры *Іосіфа Сталіна* (генеральны сакратар ВКП(б) у 1922-1953 гг.) суправаджалася пачаткам паскоранай індустрыялізацыі. Для яе ажыццяўлення былі згорнуты нэп і створана новая эканамічная сістэма. Да *аб'ектыўных фактараў, якія прывялі да ліквідацыі нэпа і пераходу да стратэгіі паскоранай індустрыялізацыі*, трэба залічыць:

- хранічнае невыкананне планаў нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, якая была галоўным экспартным прадуктам, за кошт чаго фарміраваліся сродкі на індустрыялізацыю. Гэта было абумоўлена нізкімі ўнутранымі цэнамі на сельскагаспадарчую прадукцыю ў параўнанні з прамысловай, а таксама беднасцю большасці сялянскіх гаспадарак;

- стварэнне пасля прыходу да ўлады бальшавікоў новага бюракратычнага апарату, прадстаўнікі якога не мелі, як правіла, адпаведнага прафесійнага і адукацыйнага ўзроўню (каля паловы кіраўнікоў адміністрацыйнага апарату мелі толькі пачатковую адукацыю). У выніку новая бюракратыя была больш схільная да кіравання эканомікай камандна-адміністрацыйнымі, а не рыначнымі метадамі.

Да *асноўных крыніц правядзення паскоранай індустрыялізацыі* належаць:

- выкачванне сродкаў з сельскай гаспадаркі ў прамысловасць шляхам канфіскацыі сельскагаспадарчай прадукцыі з далейшым яе продажам на знешнім рынку ў абмен на прамысловае абсталяванне (з мэтай больш эфектыўнай і планамернай экспрапрыяцыі аграрнай прадукцыі праведзена *прымусовая калектывізацыя сельскай гаспадаркі*);

- прымусовыя ўнутраныя пазыкі (*аблігацыі*), у выніку чаго адбывалася фактычная канфіскацыя грашовых зберажэнняў насельніцтва;

- стварэнне “*лагернай эканомікі*” (*ГУЛАГ*), якая прадугледжвала выкарыстанне рабскай працы зняволеных на будоўлях індустрыялізацыі. У 1930-1940-я гг. праз ГУЛАГ прайшло каля 600 тыс. жыхароў БССР (асноўныя лагеры ГУЛАГ размяшчаліся ў Сібіры, Казахстане, Урале);

- выкарыстанне “*стаханаўскай сістэмы*”: з’яўляліся т.зв. ударнікі вытворчасці, якія ў некалькі разоў перавыконвалі пастаўленыя планы – пасля гэтага на прадпрыемствах істотна павышаліся нормы выпрацоўкі прадукцыі за ранейшую зарплату, што дазваляла эканоміць на заробках рабочых.

Правядзенне індустрыялізацыі суправаджалася ўзмацненнем кантролю дзяржаўных органаў над эканамічным жыццём. Развіццё вытворчасці ажыццяўлялася ў адпаведнасці з загадзя вызначанымі і абавязковымі для выканання канкрэтнымі суб’ектамі эканамічнай дзейнасці *пяцігадовымі планамі*. Першая пяцігодка была праведзена ў 1928-1932 гг.

Пры ажыццяўленні індустрыялізацыі ў БССР галоўная ўвага надавалася развіццю лёгкай, дрэваапрацоўчай, харчовай, гарбарнай прамысловасці, што было абумоўлена наяўнасцю мясцовай сыравіны, склаўшыміся кадрамі. Разам з тым прадугледжвалася стварэнне галін прамысловасці, заснаваных на прывазной сыравіне, у першую чаргу сельскагаспадарчага машынабудавання і станкабудавання, а таксама развіццё паліўна-энергетычнай базы. У той жа час індустрыялізацыя ў БССР некалькі стрымлівалася дырэктывай урада СССР аб забароне будаўніцтва ў заходніх памежных раёнах буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Правядзенне індустрыялізацыі ў БССР у 1930-я гг. прынесла наступныя *вынікі*:

1) На працягу 1929-1940 гг. былі пабудаваны і рэканструяваны 1863 прамысловыя прадпрыемствы, якія выпускалі 90% усёй прадукцыі ў БССР. Сярод найбольш буйных прадпрыемстваў, пабудаваных у гэты час, можна адзначыць такія як швейная фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі” і панчошна-трыкатажная фабрыка “КІМ” у Віцебску, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Бабруйскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, Гомсельмаш, Аршанскі ільнокамбінат і інш. шэраг цеплавых і гідраэлектрастанцый.

2) Новая індустрыя вызначыла спецыялізацыю прамысловасці БССР у агульнасаюзным падзеле працы: у 1940 г. у БССР выраблялася 34% усёй фанеры ў СССР, 27% – запалак, 17% – панчошна-трыкатажных вырабаў, 10% – торфу, 10% – металарэзных станкоў.

3) У структуры прамысловасці сталі пераважаць буйныя прадпрыемствы, на якіх у 1940 г. выраблялася 57,3% прадукцыі, было занята больш паловы прамысловых рабочых. Амаль усе дробныя прыватныя прадпрыемствы зачыніліся ў выніку непасільных падаткаў і адміністрацыйнага ціску.

4) Аб’ём валавай прадукцыі прамысловасці перавысіў аб’ём валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

5) Паскарэнне працэсу *урбанізацыі* – перасялення насельніцтва з вёскі ў горад. Калі ў 1913 г. гарадское насельніцтва склала 14%, то ў 1940 г. – 21%. Такія гарады як Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель пераўтварыліся ў буйныя індустрыяльныя цэнтры.

У ходзе правядзення індустрыялізацыі была сфарміравана *каманднa-адміністрацыйная сістэма* кіравання эканомікай, якая ў розных гістарычных даследаваннях атрымала розныя назвы (*дзяржаўны капіталізм, дзяржаўны сацыялізм, палітарызм*). Асноўнымі рысамі дадзенай сістэмы з’яўляюцца:

- манапольная дзяржаўная ўласнасць на сродкі вытворчасці і вынікі працы;
- цэнтралізаванае размеркаванне ўсіх відаў рэсурсаў і прадукцыі;
- дырэктыўнае планаванне ўсіх відаў вытворчасці;
- іерархічная вертыкальная структура кіравання эканомікай;
- наяўнасць шматлікага бюракратычнага апарату, які распараджаўся дзяржаўнай уласнасцю і кадрамі;
- шырокае выкарыстанне прымусовых форм працы.

У 1930-я гг. адбыліся істотныя *змены ў структуры насельніцтва*. Былі амаль цалкам ліквідаваны некаторыя сацыяльныя групы, такія як прыватныя гандляры, рамеснікі і г.д. У якасці новай пануючай сацыяльнай эліты пачынае выступаць *дзяржаўная бюракратыя (наменклатура)*, кадры якой вельмі хутка раслі. Хутка павялічваўся рабочы клас, які на 1940 г. налічваў да 700 тыс. чалавек. У структуры рабочага класа 2/3 складалі былыя сяляне, якія не мелі дастатковай кваліфікацыі. У выніку хуткага прамысловага будаўніцтва амаль цалкам знікла беспрацоўе. Стварэнне буйной прамысловасці абумовіла фарміраванне значнай сацыяльнай групы *інжынерна-тэхнічных рабочых*. У той жа час большая частка насельніцтва да пачатку 1940-х гг. заставалася працаваць у сельскай гаспадарцы.

Метады правядзення індустрыялізацыі прывялі да пагаршэння матэрыяльнага становішча працоўных. Выкарыстанне “стаханаўскай сістэмы”, фактычнае павелічэнне працоўнага дня, а таксама рост цэн і інфляцыя, садзейнічалі паніжэнню рэальнай заработнай платы прамысловых рабочых. У 1928-1935 гг. дзейнічала картачная сістэма на асноўныя тавары спажывання. Хуткая урбанізацыя абумовіла вострую жыллёвую праблему.

Дадзеныя з’явы абумовілі рост *рабочага руху* на пачатку 1930-х гг., які выяўляўся ў забастоўках на шэрагу прамысловых прадпрыемстваў БССР. Аднак станаўленне таталітарнага рэжыму ў 1930-я гг. зрабіла практычна немагчымым выказванне незадаволенасці з боку насельніцтва. Бюракратычная сістэма кіравання прадугледжвала рэпрэсіўныя санкцыі ў дачыненні кіраўнікоў прадпрыемстваў, інжынерна-тэхнічнага персаналу і рабочых за невыкананне планаў, фабрыкаванне карнымі органамі “спраў” т.зв. “шкоднікаў” і “ворагаў народа”. Так, атрымалі шырокае распаўсюджанне судовыя працэсы над “шкоднікамі”, яны былі “знойдзены” ў Віцебскім чыгуначным дэпо, на фабрыцы “Сцяг індустрыялізацыі”, Гомельскім вагонарамонтным заводзе.

Да пачатку 1940-х гг. стала больш жорсткім *працоўнае заканадаўства*. У 1940 г. быў уведзены сямідзённы працоўны тыдзень. Адначасова забаранялася самавольна пакідаць прадпрыемствы і ўстановы; устанаўлівалася крымінальная адказнасць за спазненні на працу і парушэнні працоўнай дысцыпліны.

*Такім чынам, на працягу 1930-х гг. у БССР адбывалася правядзенне паскоранай індустрыялізацыі, як і ў цэлым у СССР. У выніку яе БССР ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку; значна ўзрос аб’ём вытворчасці ў буйной прамысловасці. Была сфарміравана каманднаадміністрацыйная сістэма кіравання экономікай. Разам з тым большая частка насельніцтва заставалася працаваць у сельскай гаспадарцы. Узровень развіцця прамысловай вытворчасці заставаўся значна ніжэйшым, чым у большасці еўрапейскіх краін. Захоўвалася адставанне ў эканамічным развіцці БССР ад прамыслова развітых рэгіёнаў СССР.*

### 19.2. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі БССР.

Правядзенне паскоранай індустрыялізацыі з боку дзяржавы ажыццяўлялася пераважна за кошт рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі на знешніх рынках. У перыяд нэпа органы дзяржаўнай улады арганізоўвалі масавыя закупкі збожжа ў сялянства. Аднак дадзеныя закупкі ажыццяўляліся нярэдка з вялікімі цяжкасцямі, прычынамі якіх з’яўляліся беднасць большасці сялянскіх гаспадарак і заніжаныя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. Напрыканцы 1920-х гг., калі адбывалася згортванне нэпа, было прынята рашэнне аб правядзенні *калектывізацыі сельскай гаспадаркі*. Сутнасць яе заключалася ў ліквідацыі дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак і ўключэнні іх у склад буйных адзяржаўленых калектыўных і дзяржаўных гаспадарак – *калгасаў*. Стварэнне такіх гаспадарак адпавядала спецыфіцы каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай, якая

сцвярджалася ў гэты час і дазваляла ўладам манапольна кантраляваць працэс вытворчасці і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Непасрэднай перадумовай усеагульнай калектывізацыі стаў хлебанарыхтоўчы крызіс 1927-1928 гг., у выніку якога рэзка знізіўся экспарт збожжа. Рэакцыяй на крызіс з боку ўладаў стала правядзенне надзвычайных мер: гвалтоўная канфіскацыя збожжа ў сялян, крымінальныя праследаванні ў адносінах да ўкрывальнікаў збожжа.

Пачатак усеагульнай калектывізацыі быў распачаты зімой 1929/30 г. Асобныя сялянскія гаспадаркі пры іх уключэнні ў калгасы ліквідаваліся; зямля, рабочая жывёла і асноўныя прылады працы пераходзілі ва ўласнасць калгасаў. Фармальна гэта выглядала як аб’яднанне індывідуальных гаспадарак у калектыўныя, фактычна – як дзяржаўная канфіскацыя маёмасці індывідуальных гаспадарак і пераўтварэнне сялян у пазбаўленых уласнасці сельскагаспадарчых рабочых буйных гаспадарак.

Сяляне, якія адмаўляліся ўваходзіць у калгасы, абкладаліся надзвычай высокімі падаткамі; для іх ствараліся неспрыяльныя ўмовы гаспадарання, што прыводзіла да разарэння. Дадзены фактар, а таксама адміністрацыйны націск, небяспека рэпрэсій вымушалі сялян да ўваходжання ў калгасы. Паралельна праводзілася т.зв. *раскулачванне* – прымусовая канфіскацыя маёмасці сялян, якіх улады адносілі да ліку заможных і называлі “кулакамі”. На практыцы да “кулакоў” залічвалі таксама тых сялян, якія супраціўляліся ўступленню ў калгасы. Сем’і раскулачаных сялян вывозілі ў паўночныя раёны Расіі, на Урал, у Казахстан, або пасялялі на спецыяльна выдзеленых тэрыторыях пад адміністрацыйным наглядам у якасці спецпасяленцаў. Частка раскулачаных сялян, перш за ўсё актыўныя праціўнікі калектывізацыі, былі зняволены і накіраваны ў лагеры ГУЛАГ або расстраляны.

Пераважная большасць сялянства адмоўна ставілася да масавай калектывізацыі, што прыводзіла да развіцця *сялянскага руху*. За зіму 1929-1930 г. адбылося 520 узброеных выступленняў сялян, якія былі падаўлены ўладамі. У той жа час частка бядне йшага сялянства падтрымлівала калектывізацыю пад уплывам агітацыі бальшавікоў і спадзяванняў на атрыманне долі падчас падзелу маёмасці “кулакоў”.

Усеагульная калектывізацыя прынесла наступныя *вынікі*:

- да 1939 г. было створана звыш 10 тыс. калгасаў, у якія было ўключана звыш 90% сялянскіх гаспадарак; у карыстанні калгасаў знаходзілася каля 96% пасяўных плошчаў;

- на працягу 1930-х гг. было раскулачана каля 10-15% сялянскіх гаспадарак; каля 600-700 тыс. чалавек былі вывезены за межы БССР;

- былі ўведзены *абавязковыя пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі* з боку калгасаў па цэнах, ніжэйшых ў 10-12 разоў за рыначныя, у выніку чаго дзяржава атрымлівала значныя сродкі для паскоранай індустрыялізацыі;

- паскараецца працэс перасялення працоўных з вёскі ў горад; былыя сяляне, якія не жадалі ўваходзіць у калгасы, папаўняюць шэрагі рабочага класа ў прамысловасці;

- некалькі паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі; цэнтрамі канцэнтрацыі новай тэхнікі становяцца дзяржаўныя *машынна-трактарныя станцыі* (на 1940 г. ва ўсходняй частцы БССР іх налічвалася 236 з трактарным паркам да 9,7 тыс. машын); аднак у цэлым тэхнічны ўзровень сельскай гаспадаркі заставаўся невысокі;

- узровень сельскагаспадарчай вытворчасці ў цэлым заставаўся на ўзроўні да правядзення калектывізацыі, а ў некаторых яе галінах нават назіраецца заняпад (гэта тлумачыцца цяжкім эканамічным становішчам калгасаў, адсутнасцю у калгаснікаў стымулаў да працы).

На працягу 1930-х гг. адбылася *уніфікацыя ўнутранай структуры калгасаў*. У калгасным карыстанні захоўваліся большая частка калектывізаванай зямельнай плошчы, працоўнай жывёлы, асноўныя прылады працы. У карыстанні індывідуальных гаспадарак калгаснікаў заставаліся сядзібы з невялікімі зямельнымі надзеламі, частка жывёлы, некаторыя прылады працы. Кіраўніцтва калгасаў прызначалася партыйнымі і дзяржаўнымі органамі ўлады і пільна кантралявалася з іх боку. Умовы працы калгаснікаў былі цяжкімі. Аплата працы была нізкай (у сярэднім у 3 разы ніжэй, чым у прамысловасці), у многіх калгасах яна мела натуральны або паўнатуральны характар; адсутнічалі абмежаванні працоўнага дня, аплочваемыя водпускі, сацыяльнае страхаванне, пенсіі для састарэлых. Асноўнай крыніцай для існавання калгаснага насельніцтва з’яўляліся прысядзібныя гаспадаркі, хаця іх прадукцыя таксама ўключалася ў планы абавязковых дзяржаўных паставак. У выніку дзяржаўных рэквізіцый сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1932-1933 гг. у многіх рэгіёнах СССР, асабліва ва Украіне, узнік голад, які закрануў таксама некаторыя паўднёвыя раёны БССР. З мэтай недапушчэння крадзяжоў дзяржаўнай і калгаснай маёмасці партыйна-дзяржаўныя ўлады ў 1932 г. прынялі пастанову, вядомую як “*закон пяці каласкоў*”. Яна прадугледжвала крымінальную адказнасць за крадзяжы ў любых памерах у выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін не ніжэй 10 гадоў або нават расстрэл. У БССР толькі ў 1933-1934 гг. паводле гэтай пастановы было асуджана каля 10 тыс. чалавек.

Цяжкія ўмовы жыцця і працы ў калгасах вымушалі калгаснікаў накіроўвацца на працу ў прамысловасць, на будаўнічыя работы, лесараспрацоўкі. У той жа час улады імкнуліся не дапусціць бескантрольнага перамяшчэння рабочай сілы з вёскі ў гарады. З гэтай мэтай сялянам не выдаваліся пашпарты, што фактычна азначала пазбаўленне іх грамадзянскіх правоў. Выхад з калгасаў былі магчымы толькі паводле спецыяльнага дазволу адпаведных улад.

*Такім чынам, у выніку усеагульнай калектывізацыі 1930-х гг, якая ажыцяўлялася прымысовымі метадамі, была ліквідавана маса дробных сялянскіх гаспадарак, на месцы якіх сфарміраваліся буйныя адзяржаўленыя аграрныя гаспадаркі. Сельская гаспадарка была ўключана ў каманднаадміністрацыйную сістэму кіравання эканомікай; яе рэсурсы выкарыстоўваліся пераважна для ажыццяўлення індустрыялізацыі.*

**19.3. Усталяванне таталітарнага палітычнага рэжыму ў БССР.**

Аднапартыйная сістэма ў БССР усталявалася пасля разгрому асноўных небальшавіцкіх сіл на пачатку 1920-х гг. У 1923 г. савецкія улады абвесцілі амністыю дзеячам антысавецкіх рухаў і арганізацый, многія з якіх занялі пачэсныя пасады ў сферы навукі і культуры БССР.

Аднак у 1930-я гг. адбылася эвалюцыя аўтарытарнага палітычнага рэжыму ў СССР і БССР да таталітарнага. Адметнай рысай *таталітарызму* з'яўляецца жорсткі дзяржаўны кантроль над усімі сферамі жыцця грамадства. У СССР таталітарны рэжым атрымаў у гістарычнай і палітычнай літаратуры назву *сталінізму*, паколькі фарміраванне рэжыму суправаджалася ўстанаўленнем асабістай дыктатуры і культу асобы І. Сталіна.

Фармальна ў СССР і БССР дэкларавалася дэмакратычныя прынцыпы грамадска-палітычнага жыцця. У 1936 г. была прынята новая *Канстытуцыя СССР*, а ў 1937 г. у адпаведнасці з ёй новая *Канстытуцыя БССР*. Згодна з ёй, вышэйшым органам дзяржаўнай улады абвяшчаўся Вярхоўны Савет БССР, які выбіраўся на 4 гады. Ён фарміраваў урад – СНК БССР. Усе вышэйшыя і мясцовыя органы ўлады ствараліся на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. Былі адменены выбарчыя абмежаванні для пэўных катэгорый насельніцтва. У канстытуцыі дэкларавалiся шматлікія грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды, якія не выконваліся ў рэальным жыцці.

У 1930-я гг. была праведзена *адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа*, згодна з якой замест акруг у БССР ствараліся вобласці, што адлюстравала тэндэнцыю да ўніфікацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў межах СССР.

Характэрнымі з'явамі, якія адлюстроўвалі фарміраванне таталітарызму ў грамадска-палітычнай сістэме БССР, як і ў цэлым у СССР, з'яўляюцца:

1) *Зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату кіравання*. На ўсіх узроўнях цэнтральнага і мясцовага кіравання дзейнасць дзяржаўнай адміністрацыі рэгулявалася і кантралявалася камітэтамі бальшавіцкай партыі. Фарміраванне Саветаў і іх выканаўчых камітэтаў адбывалася на аснове безальтэрнатыўных выбараў; кандыдаты загадзя вызначаліся адпаведнымі партыйна-дзяржаўнымі органамі ўлады.

2) *Пераўтварэнне ВКП(б)-КП(б)Б з палітычнай партыі ў масавую структуру, для кіраўніцтва якой стваралася вялікая бюракратычная іерархія, падначаленная непасрэдна І.Сталіну*. У дадзеных умовах прыналежнасць да партыі з'улялася абавязковым атрыбутам дзяржаўнай кар'еры і крыніцай атрымання сацыяльных прывілеяў. З мэтай умацавання партыйнага адзінства перыядычна праводзіліся "чысткі" шэрагаў партыі. Выключаліся "старыя" бальшавікі і былыя дзеячы іншых рэвалюцыйных арганізацый, якія маглі стварыць ідэйную апазіцыю ўладзе, а моладзь, якая прыходзіла на іх месца, была асабіста ўдзячная за сваю кар'еру, пазбаўленая палітычнай волі і сувязяў. Самая вялікая хваля чыстак КП(б)Б адбылася ў 1933 – 1937 гг., калі колькасць камуністаў у БССР скарацілася з 65 тыс. да

24,5 тыс., але ўжо ў 1941 г. у шэрагах КП(б)Б знаходзілася звыш 72 тыс. чалавек.

3) *Фарміраванне і развіццё масавых дзяржаўных грамадскіх арганізацый,* якія ахоплівалі практычна ўсё насельніцтва: прафсаюзы, камсамол, абаронныя таварыствы і г.д. Іх дзейнасць строга кантралявалася і рэгламентавалася з боку партыйна-дзяржаўных органаў улады; структура будавалася на ўзор ВКП(б)-КП(б)Б. Галоўнай задачай гэтых арганізацый было забеспячэнне кантролю над рознымі сацыяльнымі групамі насельніцтва (ідэалагічная апрацоўка, стварэнне атмасферы ўсеагульнай падазронасці).

4) *Згортванне палітыкі беларусізацыі*. Адлюстраваннем гэтага стала правядзенне працэсу па сфабрыкаванай справе *"Саюзу вызвалення Беларусі" (1930-1931)*, у ходзе якога былі асуджаны вядучыя дзеячы беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі (В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч, Я. Лёсік і інш.), абвінавачаныя ў імкненні да звяржэння савецкага ладу. Далейшым вынікам сталі рэпрэсіі 1930-х гг., накіраваныя супраць беларускай інтэлігенцыі і часткі партыйна-дзяржаўных дзеячаў, якія праводзілі палітыку беларусізацыі, пад лозунгам барацьбы з т.зв. "*нацыянал-дэмакратызмам*". У 1933 г. была праведзена рэформа правапісу беларускай мовы, якая наблізіла яе нормы да рускай мовы. Пануючы статус беларускай мовы ў афіцыйным справоводстве, друку, сферы адукацыі ў 1930-я гг. яшчэ захоўваўся, аднак, пераважнай становіцца тэндэнцыя павольнай русіфікацыі адміністрацыйнай і адукацыйнай сістэмы.

5) *Культ асобы І. Сталіна*, звязаны з гіпербалічным ухваленнем яго дзейнасці ў афіцыйнай прапагандзе і недапушчэнні крытыкі ў яго адрас.

6) *Масавыя рэпрэсіі* ў адносінах прадстаўнікоў розных сацыяльных груп насельніцтва, уключаючы прадстаўнікоў партыйна-дзяржаўнага апарату, западозраных у нелаяльнасці да існуючага рэжыму. Ажыццяўленне рэпрэсій ускладалася на спецыяльныя карныя органы, назва якіх некалькі разоў змянялася: ЧК, ОГПУ, НКВД. Ахвярамі рэпрэсій станавіліся ў першую чаргу прадстаўнікі былых пануючых сацыяльных груп (дваранства, буржуазіі), сяляне, якія супраціўляліся ўваходжанню з калгасы, інжынерна-тэхнічныя кадры, інтэлігенцыя, духавенства розных канфесій. Пасля 1934 г. следства па палітычных справах спрашчалася і перадавалася нарадам з 3-5 асоб мясцовых кіраўнікоў партыі і НКВД. "Тройкі" без прысутнасці абвінавачаных завочна выносілі прысуды, уключаючы смяротныя. Найбольш масавы характар рэпрэсіі набылі ў *1937-1938 гг.* У гэтыя гады былі рэпрэсіраваны большасць кіраўнікоў партыйна-дзяржаўнага апарату БССР, шматлікія кіраўнікі гаспадарчых і грамадскіх арганізацый, вышэйшыя ваенныя кадры, вядомыя навукоўцы і дзеячы культуры. Для абгрунтавання рэпрэсій НКВД праводзілася фабрыкаванне спраў розных "шпіёнска-дыверсійных", "тэрарыстычных", "шкодніцкіх" арганізацый, якія нібыта імкнуліся да звяржэння існуючага ладу і супрацоўнічалі з разведкамі замежных дзяржаў. Сярод іх справы *"Саюза вызвалення Беларусі"*, "Працоўнай сялянскай партыі", беларускага філіяла "Прампартыі", беларускага філіяла "Саюзнага бюро РСДРП (меншавікоў)", "Аб'яднанага антысавецкага падполля",

“Беларускай аўтакефальнай царквы”, “Беларускага нацыянальнага цэнтра” і інш. Усяго ахвярамі сталінскіх рэпрэсій у 1920-1950-я гг. стала каля 600 тыс. чалавек. Большасць рэпрэсіраваных накіроўваліся ў лагеры ГУЛАГ; значная частка была пакарана смерцю: толькі на працягу другой паловы 1930-х гг. было расстраляна каля 30 тыс. чалавек.

Галоўнымі мэтамі палітычных рэпрэсій з’яўляліся папярэджанне і знішчэнне магчымага супраціўлення таталітарнаму рэжыму, забеспячэнне таннай паднявольнай працоўнай сілай буйных будоўляў індустрыялізацыі.

*Такім чынам, на працягу 1930-х гг. на тэрыторыі БССР сфарміраваўся сталінісцкі таталітарны рэжым. Стварэнне строга цэнтралізаванай іерархічнай партыйна-дзяржаўнай сістэмы ўлады, а таксама масавыя рэпрэсіі абумовілі стабільнасць дадзенага рэжыму і немагчымасць існавання істотнага антыўрадавага руху.*

**19.4. Адукацыя і культура.**

У 1930-я гг. назіраецца значнае развіццё *адукацыйных устаноў*. Гэта тлумачыцца наступнымі фактарамі:

- фарміраванне буйной прамысловасці, што патрабавала стварэння значнага слою кваліфікаваных рабочых і інжынерна-тэхнічных кадраў;

- разгортванне афіцыйнай сталінісцкай прапаганды, для засваення якой патрабаваўся пэўны ўзровень пісьменнасці.

У сферы агульнаадукацыйнай школы ў 1930-я гг. адбылася *уніфікацыя адукацыі* ў межах СССР. З сярэдзіны 1930-х гг. у сярэдняй школе ўводзіцца дзесяцігадовае навучанне. Сямігадовая школа пераўтвараецца ў ступень базавай адукацыі. Да 1940 г. ва ўсходняй частцы БССР дзейнічала звыш 7 тыс. школ, у якіх працавала звыш 40 тыс. настаўнікаў. Актывізавалася праца па ліквідацыі непісьменнасці. Ужо ў 1941 г. ва ўсходніх раёнах БССР каля 85% насельніцтва з’яўляліся пісьменнымі. Кадры кваліфікаваных рабочых рыхтаваліся ў прафесійных школах, якія ў 1930 г. былі пераўтвораны ў *школы фабрычна-заводскага навучання* (ФЗН).

Хутка развіваліся сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя. У 1939/40 навучальным годзе ва ўсходняй частцы БССР дзейнічалі 22 вышэйшыя і 102 сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, у якіх займалася 49 тыс. студэнтаў і навучэнцаў. На 1941 г. у БССР працавала звыш 27 тыс. спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Аднак забяспечанасць кадрамі ўстаноў гаспадаркі і культуры заставалася недастатковай. Адмоўную ролю ў галіне адукацыі мелі рэпрэсіі, ахвярамі якіх сталі шматлікія настаўнікі і выкладчыкі ВНУ і тэхнікумаў.

З другой паловы 1930-х гг. пачала звужацца сфера выкарыстання беларускай мовы ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. З восені 1938 г. руская мова была ўведзена як абавязковы прадмет з першага класа. У пачатку 1940-х гг. у большасці гарадскіх школ беларуская мова ўжывалася толькі ў пачатковых класах.

У працэсе адукацыі істотная роля адводзілася *выхаванню мас у духу ідэалогіі сталінізму*. Акрамя адукацыйных устаноў важнае значэнне ў гэтай

справе надавалася клубам, хатам-чытальням, бібліятэкам, разнастайным гурткам, друкаваным выданням, радыё, кіно, мастацкай самадзейнасці і г.д. У 1938 г. у БССР выдавалася 199 газет з агульным тыражом амаль 1 млн. экзэмпляраў.

Праводзімая бальшавікамі індустрыялізацыя патрабавала адпаведнага *навуковага забеспячэння*. Адносіны дзяржаўных улад да навуковай сферы мелі дваісты характар:

з аднаго боку, улады выдзялялі значныя сродкі на стварэнне навукова-даследчых устаноў і падрыхтоўку навуковых кадраў;

з другога боку, узмацнялася адміністрацыйнае ўмяшанне дзяржаўных органаў у вырашэнне навуковых праблем.

У 1930-я гг. назіраецца пашырэнне *Акадэміі навук БССР*. З 1932 г. у яе складзе налічвалася 14 навукова-даследчых інстытутаў. На Акадэмію навук была ўскладзена задача каардынацыі навукова-даследчых прац, іх выканання і ўкаранення ў вытворчасць вынікаў. Навуковыя даследаванні праводзіліся таксама ў ВНУ. Значныя поспехі былі дасягнуты ў гэты час беларускімі навукоўцамі ў галіне біялогіі, хіміі, матэматыкі, фізікі металаў, сельскагаспадарчых навук, археалогіі, этнаграфіі. У 1940 г. у БССР налічвалася 67 навуковых устаноў, у якіх працавала звыш 2200 навуковых супрацоўнікаў. У той жа час на развіццё навукі, асабліва сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, адмоўна ўплываў жорсткі ідэалагічны кантроль, абмежаванне доступу да дасягненняў сусветнай навукі, што нярэдка падмяняла аб’ектыўнае навуковае вывучэнне праблем сцвярджэннем пастулатаў сталінісцкай ідэалогіі. Цяжкія страты беларускай навуцы прынеслі рэпрэсіі 1930-х гг. у адносінах шматлікіх навукоўцаў, у тым ліку кіраўнікоў Акадэміі навук. Напрыканцы 1930-х гг. даследаванні ў галіне сацыяльна-гуманітарных навук практычна былі спынены. Большасць акадэмічных інстытутаў і іншых навукова-даследчых устаноў працавалі выключна над вузкімі прыкладнымі праблемамі.

Фарміраванне таталітарнага рэжыму аказала істотны ўплыў на развіццё *літаратуры і мастацтва* ў БССР. Пэўны плюралізм ідэй, стыляў і накірункаў, які меў месца ў мастацкай культуры 1920-х гг. быў ліквідаваны. Гэта суправаджалася масавымі рэпрэсіямі ў адносінах пісьменнікаў, мастакоў, дзеячоў музыкі і тэатру. Тэматыка і змест твораў ва ўсіх галінах мастацкай культуры строга рэгламентаваўся. Афіцыйным мастацкім стылем становіцца “*сацыялістычны рэалізм*”. Сутнасць яго заключалася ў скіраванасці на ідэалізацыю існуючага ў СССР грамадскага ладу, гераізацыю дзейнасці бальшавіцкай партыі і яе кіраўнікоў.

У сферы *літаратуры* былі ліквідаваны ўсе пісьменніцкія арганізацыі, якія ўзніклі ў 1920-я гг. На іх месцы створаны ў 1934 г. адзіны *Саюз пісьменнікаў БССР*, цалкам падкантрольны ўладам, які стаў састаўной часткай Саюза пісьменнікаў СССР. У літаратурных творах усіх пісьменнікаў гэтага перыяду пераважала ідэалізаванае адлюстраванне працэсаў барацьбы бальшавікоў за ўладу, індустрыялізацыі, калектывізацыі, змагання з “ворагамі савецкай дзяржавы”. Найбольш значнымі прадстаўнікамі беларускай

мастацкай літаратуры 1930-х гг. з'яўляюцца Янка Купала, Якуб Колас, Змітрок Бядуля, Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва і інш.

У 1930-я гг. пашыраецца сетка *прафесійных драматычных тэатраў*. У 1932 г. узнікае *Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр* у Гомелі (расфарміраваны ва ўмовах рэпрэсій у 1937-1938 гг.), які ўзначальваў вядомы беларускі тэатральны дзеяч *Уладзіслаў Галубок*. Рэпертуар тэатральных пастановак падлягаў жорсткай цэнзуры з боку партыйна-дзяржаўных органаў улады.

Значнымі падзеямі ў развіцці *музычнага мастацтва* з'явілася адкрыццё ў 1932 г. *Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі*, а ў 1933 г. – *Беларускага тэатра оперы і балета*. У 1937 г. у Мінску пачала працаваць *Беларуская дзяржаўная філармонія*.

У разглядаемы перыяд у БССР з'яўляецца новы від мастацтва – *кіно*. У 1928 г. у Ленінградзе была створана кінастудыя мастацкіх фільмаў "*Савецкая Беларусь*", якая напрыканцы 1930-х гг. была пераведзена ў Мінск. Кінематограф становіцца гукавым, з'яўляецца рэспубліканская кінахроніка і фільмы для дзяцей, экранізуюцца літаратурныя творы. Найбольшае значэнне для гэтага перыяду мелі фільмы Ю. Тарыча і У. Корш-Сабліна.

У *жывапісе* разглядаемага перыяду стыль "сацыялістычнага рэалізму" праявіўся перадусім у стварэнні карцін, прысвечаных падзеям, звязаным з устанаўленнем бальшавіцкай улады і індустрыяльнаму будаўніцтву савецкага часу. Да ліку найбольш значных мастакоў 1930-х гг. можна залічыць І. Ахрэмчыка, У. Волкава, І. Давідовіча, Я. Зайцава, У. Кудрэвіча і інш.

У *архітэктуры* ўкараняецца стыль "*савецкага класіцызму*", для якога характэрныя пампезнасць і гігантаманія, што павінны былі падкрэсліць непарушнасць існуючага рэжыму. Найбольш вядомымі помнікамі дадзенага стылю з'яўляюцца Дамы ўрада, Чырвонай арміі, Акадэміі навук, у Мінску.

*Такім чынам, у 1930-я гг. ва ўмовах паскоранай мадэрнізацыі грамадства назіраўся працэс развіцця адукацыі, навукі і розных галін культуры. Разам з тым усталяванне таталітарнага рэжыму істотным чынам тармазіла дадзены працэс у выніку правядзення масавых рэпрэсій супраць інтэлігенцыі, а таксама жорсткага дзяржаўнага кантролю ў духоўнай сферы жыцця грамадства.*

**Асноўныя паняцці:**

Індустрыялізацыя, калектывізацыя, "лагерная эканоміка", ГУЛАГ, "стаханаўская сістэма", пяцігадовыя планы, урбанізацыя, каманднаадміністрацыйная сістэма, дзяржаўная бюракратыя (наменклатура), інжынерна-тэхнічныя рабочыя, калгасы, саўгасы, раскулачванне, машыннатрактарныя станцыі, "закон пяці каласкоў", таталітарызм, сталінізм, Канстытуцыя БССР 1937 г., "нацыянал-дэмакратызм", культ асобы І. Сталіна, масавыя рэпрэсіі, ОГПУ-НКВД, "сацыялістычны рэалізм", кіно, "савецкі класіцызм".

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Што такое індустрыялізацыя? Чаму бальшавіцкія ўлады СССР былі зацікаўлены ў яе паскораным ажыццяўленні?
2. З якімі палітычнымі падзеямі ў СССР быў звязаны пачатак паскоранай індустрыялізацыі? Падумайце, ці існуе сувязь паміж індустрыялізацыяй і ўстанаўленнем таталітарнага рэжыму ў СССР?
3. Якія аб'ектыўныя фактары садзейнічалі ліквідацыі нэпа ў савецкай эканоміцы?
4. Назавіце асноўныя крыніцы правядзення паскоранай індустрыялізацыі ў СССР і БССР.
5. Вызначце, якім чынам звязаны паміж сабой паскораная індустрыялізацыя і масавая калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў СССР?
6. Што такое "стаханаўская сістэма"? З якой мэтай яна ўводзілася на савецкіх прадпрыемствах?
7. Якія галіны прамысловасці вызначылі спецыялізацыю БССР у межах СССР? Якім чынам можна патлумачыць падобную спецыялізацыю?
8. Што такое урбанізацыя? Якім чынам яна ажыццяўлялася ў БССР у 1930-я гг.?
9. Што такое камандна-адміністрацыйная сістэма? Вызначце асноўныя рысы?
10. Якія змены адбыліся ў сацыяльнай структуры насельніцтва БССР ў 1930-я гг.?
11. Ахарактарызуйце матэрыяльнае становішча працоўных слаёў насельніцтва ва ўмовах паскоранай індустрыялізацыі?
12. Падумайце, якім чынам можна ахарактарызаваць у цэлым вынікі індустрыялізацыі 1930-х гг. для мадэрнізацыі беларускага грамадства?
13. Што такое калектывізацыя сельскай гаспадаркі? Калі яна пачалася ў БССР? Якія мэты перад ёй ставіліся?
14. Пры дапамозе якіх метадаў ажыццяўлялася калектывізацыя?
15. Што такое раскулачванне? З якой мэтай яно праводзілася і якія мела вынікі?
16. Якімі былі адносіны сялянства да правядзення калектывізацыі?
17. Назавіце асноўныя вынікі масавай калектывізацыі ў БССР? Дайце іх кароткую характарыстыку.
18. Якім чынам была арганізавана ўнутраная структура калгасаў? Якім было матэрыяльнае і юрыдычнае становішча калгаснікаў у 1930-я гг.?
19. Падумайце, якім чынам калектывізацыя адбілася ў цэлым на развіцці сельскай гаспадаркі БССР?
20. Што такое таталітарызм? Калі пачынаецца фарміраванне таталітарнага рэжыму ў СССР і БССР?
21. Вызначце асноўныя палажэнні Канстытуцый СССР 1936 і БССР 1937 гг. Наколькі яны адпавядалі існуючай палітычнай рэчаіснасці?
22. Якія з'явы грамадска-палітычнага жыцця БССР 1930-х гг. сведчаць пра фарміраванне таталітарнага рэжыму?

23. Падумайце, чаму партыйна-дзяржаўныя ўлады ў 1930-я гг. адмовіліся ад палітыкі беларусізацыі? Якія гэта мела сацыяльна-палітычныя наступствы?
24. Дайце характарыстыку масавых рэпрэсій 1930-х гг. Якія сацыяльныя групы ў першую чаргу станавіліся ахвярамі рэпрэсій? Падумайце, чым можна растлумачыць факт, што партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі ў вялікай колькасці былі рэпрэсіраваны ў гэты час?
25. Якія можна вылучыць асноўныя мэты правядзення масавых рэпрэсій з боку сталінскага рэжыму?
26. Якія фактары спрыялі павелічэнню колькасці адукацыйных устаноў у БССР у 1930-я гг.?
27. У межах якіх устаноў адбывалася развіццё навукі ў БССР у 1930-я гг.?
28. Што такое "сацыялістычны рэалізм"? Якую ролю ён выконваў у развіцці мастацкай культуры БССР 1930-х гг.?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Фарміраванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай у БССР.
2. Спецыфіка індустрыялізацыі ў БССР: прычыны, вынікі.
3. Матэрыяльнае становішча гарадскога насельніцтва ў БССР у 1930-я гг.
4. Раскулачванне ў БССР: перадумовы, ход, вынікі.
5. Механізмы фарміравання калгасаў у БССР у 1930-я гг.
6. Масавыя рэпрэсіі сталінскага рэжыму ў БССР.
7. Роля беларускага насельніцтва ў камплектаванні лагераў ГУЛАГ.
8. Беларуская навука ва ўмовах сталінскага рэжыму.

## Тэма 20: Заходняя Беларусь у складзе Польшчы.

**1. Грамадска-палітычнае жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921-1926 гг.**
**2. Заходняя Беларусь ва ўмовах "санацыі" 1926-1939 гг.**
**3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.**
**4. Адукацыя і культура ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.**

### 20.1. Грамадска-палітычнае жыццё ў Заходняй Беларусі ў 1921-1926 гг.

У выніку Рыжскага мірнага дагавору 1921 г. заходнія землі Беларусі апынуліся ў складзе Польшчы. Канчаткова межы Польскай Рэспублікі на ўсходзе былі ўсталяваны ў 1923 г., калі ў яе склад ўвайшла тэрыторыя Сярэдняй Літвы з Вільняй. Уся тэрыторыя Польшчы падзялялася на ваяводствы, паветы і гміны. Паняцце "*Заходняя Беларусь*" уключае ў сябе тэрыторыю 4 ваяводстваў: Віленскага, Навагрудскага, Беластоцкага і Палескага з насельніцтвам 3,5 млн. чалавек у 1921 г., 5 млн. – у 1935 г. Усяго Заходняя Беларусь ахоплівала 24% тэрыторыі Польскай Рэспублікі і 13% яе насельніцтва. Афіцыйна з боку ўлад гэтыя землі атрымалі назву "*паўночна-усходнія крэсы* (ускраіны)". Насельніцтва Заходняй Беларусі паводле свайго

складу было шматнацыянальным: беларусы, палякі, яўрэі, украінцы, літоўцы і інш. Згодна з афіцыйнымі польскімі дадзенымі, каля паловы яго складалі палякі, паколькі падчас перапісаў атаясамліваліся каталіцызм і польскасць. Аднак аб’ектыўнасць гэтых дадзеных ставіцца пад сумненне.

У палітычным жыцці Польскай Рэспублікі ў 1920-1930-я гг, вылучаюць два перыяды:

- 1921-1926 гг. – *парламенцкая дэмакратыя*;
- 1926-1939 гг. – *аўтарытарны рэжым“санацыі”*.

У сакавіку 1921 г. была прынята *Канстытуцыя Польскай Рэспублікі*. У адпаведнасці з ёй, Польшча абвяшчалася ўнітарнай парламенцкай рэспублікай. Вышэйшым органам заканадаўчай улады з’яўляўся *Нацыянальны сход*, які складаўся з дзвюх палат: *Сената і Сойма*. Дэпутаты сойму выбіраліся на аснове ўсеагульнага, прамога, роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні на 5 гадоў; сенат фарміраваўся прадстаўнікамі мясцовых улад. Нацыянальны сход выбіраў *прэзідэнта* рэспублікі тэрмінам на 7 гадоў і фарміраваў урад, які быў адказны ў сваёй дзейнасці перад соймам. Прэзідэнт валодаў абмежаванымі паўнамоцтвамі. Гарантавалася незалежнасць судовай улады. У Канстытуцыі абвяшчаліся роўнасць усіх грамадзян перад законам, грамадзянскія і палітычныя свабоды. Замацоўваўся дзяржаўны характар польскай мовы. У той жа час абвяшчалася права нацыянальных меншасцяў на адкрыццё ўласных школ і культурна-асветніцкіх устаноў.

Палітычнае жыццё Польскай Рэспублікі ў 1921-1926 гг. было нестабільным. У выбраным у 1922 г. сойме была прадстаўлена вялікая колькасць грамадска-палітычных сіл. Улічваючы адказнасць выканаўчай улады перад соймам гэта прыводзіла да частай змены ўрадаў (у 1922-1926 гг. дзейнічала 5 урадаў).

Асноўныя намаганні улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі скіраваны на *паланізацыю* краю, што выяўлялася ў наступных з’явах:

- паланізацыя сістэмы дзяржаўнай адміністрацыі (пры прызначэнні на дзяржаўныя пасады перавага аддавалася асобам польскай нацыянальнасці);
- паланізацыя землеўладання (заахвочванне ў набыцці зямельных надзелаў выхадцаў з польскіх зямель – асаднікаў);
- паланізацыя адукацыі (амаль усе навучальныя ўстановы пераводзіліся на польскую мову навучання);
- шырокая дзяржаўная падтрымка каталіцкага касцёла, які лічыўся галоўным носьбітам польскай культуры; дыскрымінацыйныя дзеянні ў адносінах праваслаўнай царквы (некаторыя праваслаўныя цэрквы пераўтвараліся ў каталіцкія, а іх землі канфіскоўваліся);
- шырокая прапаганда праз дзяржаўныя, рэлігійныя, адукацыйныя ўстановы, сродкі масавай інфармацыі польскага характару краю.

Грамадска-палітычнае жыццё Заходняй Беларусі першай паловы 1920-х гг. характарызуецца барацьбой паміж рознымі палітычнымі партыямі і групоўкамі. Галоўную ролю сярод іх адыгрывалі польскія партыі. Усе дадзеныя партыі можна падзяліць на тры асноўныя блокі:

- правацэнтрысцкі: у яго межах галоўнае месца займалі *Партыя нацыянальнай дэмакратыі* (эндэкі) і *Партыя хрыціянскай дэмакратыі* (хадэкі), якія выступалі за захаванне асноў існуючага грамадскага ладу і правядзенне палітыкі жорсткай паланізацыі;

- левацэнтрысцкі: галоўнае месца займалі *Польская партыя сацыялістычная* (ППС) і "*Вызваленне*", якія выступалі за правядзенне сацыяльных рэформ ў накірунку дэмакратычнага сацыялізму, дапускалі супрацоўніцтва з беларускім і яўрэйскім нацыыянальнымі рухамі;

- леварадыкальны: галоўнае месца займала *Польская камуністычная рабочая партыя*; выступала за пераўтварэнне Польшчы ў дзяржаву савецкага ўзору ў саюзе з СССР, прызнавала права БССР на заходнебеларускія землі.

Працягвалі дзейнічаць яўрэйскія палітычныя партыі (Бунд, Паалей-Цыён і інш.). На Палессі функцыяніравалі украінскія палітычныя партыі і групоўкі.

У межах *беларускага нацыянальнага руху* ў гэты перыяд вызначыліся тры плыні:

1) Плынь, якая выступала за легальныя метады дзейнасці ў накірунку дасягнення аўтаноміі Заходняй Беларусі. Яе прадстаўлялі *Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), Беларускі сялянскі саюз (БСС)*. У 1922 г. прадстаўнікі гэтай плыні ўдзельнічалі ў выбарах у сойм; у выніку было абрана ў сойм 11, у сенат – 3 беларускія дэпутаты, якія ўтварылі *Беларускі пасольскі клуб*.

2) Плынь, якая арыентавалася на Раду БНР і выступала за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы. Яе прадстаўнікі знаходзіліся ў цесным саюзе з дзяржаўна-палітычнымі коламі Літвы, зацікаўленай у падтрымцы антыпольскага руху на тэрыторыі Віленшчыны. Асноўнай партыяй гэтай плыні была *БПСР*. На пачатку 1920-х гг. яна выкарыстоўвала тактыку ўзброенай барацьбы супраць польскіх уладаў, стварыла шэраг партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Віленшчыны, Гродзеншчыны і Беласточчыны.

3) Плынь, якая арыентавалася на БССР і выступала за далучэнне да яе Заходняй Беларусі. Яна фарміравалася перадусім у межах камуністычнага руху. У 1923 г. у Польскай камуністычнай рабочай партыі афармляецца аўтаномная арганізацыя – *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі*, да якой далучылася левае крыло БПСР. У першай палове 1920-х гг. камуністы пры падтрымцы СССР шырока праводзілі падпольную барацьбу. Пракамуністычныя партызанскія атрады дзейнічалі пераважна на тэрыторыі Палесся, Навагрудчыны і Віленшчыны.

У сувязі з разгортваннем *партызанскага руху* ў 1923—1924 гг. урад увёў ваеннае становішча на тэрыторыі многіх паветаў, пачалі дзейнічаць ваенна-палявыя суды. У 1925 г. узброеная барацьба спынілася.

У сярэдзіне 1920-х гг. у сувязі з узбуйненнем БССР 1924-1926 гг. і палітыкай беларусізацыі, стратай надзей на дасягненне аўтаноміі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, разрывам адносін Рады БНР з урадам Літвы ў межах беларускага нацыянальнага руху ўзмацніліся прасавецкія настроі. БССР стала разглядацца як цэнтр беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. У 1923-1924 гг. самараспусціліся БСДП і БПСР. Многія іх дзеячы далучаліся да

камуністаў. Некаторыя прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху выязджалі ў БССР. Пераход КПЗБ да легальнай дзейнасці ў 1925 г. зрабіў яе вядучай партыяй у межах беларускага нацыянальнага руху.

*Такім чынам, у 1921-1926 гг. адбывалася фарміраванне польскай дзяржаўна-палітычнай сістэмы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Адметнай рысай праводзімай польскімі ўладамі палітыкі стала паланізацыя заходнебеларускіх зямель. Ігнараванне правоў беларускай нацыі ў Польскай дзяржаве, а таксама поспехі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР зрабілі камуністычную плынь вядучай у межах беларускага нацыянальнага руху да сярэдзіны 1920-х гг.*

### 20.2. Заходняя Беларусь ва ўмовах "санацыі" 1926-1939 гг.

Слабасць дэмакратычных інстытутаў, а таксама частыя эканамічныя крызісы абумовілі пераход Польскай рэспублікі ад парламенцкай дэмакратыі да аўтарытарнага рэжыму. Пачаткам гэтага пераходу стаў палітычны пераварот 12-15 мая 1926 г., здзейснены групай вайскоўцаў на чале з маршалам *Юзэфам Пілсудскім*. Ю. Пілсудскі і яго прыхільнікі абвясцілі палітыку "*санацыі*" ("аздараўлення"), афіцыйнымі задачамі якой выступалі дасягненне эканамічнай і палітычнай стабілізацыі ў краіне. У жніўні 1926 г. сойм прыняў папраўкі да Канстытуцыі, накіраваныя на ўзмацненне ролі выканаўчай улады ў дзяржаве. Фармальна дзяржаўна-палітычная сістэма ў цэлым не змянілася: працягвалі дзейнічаць канстытуцыя, парламенцкая сістэма, шматпартыйнасць, легальная апазіцыя. Аднак паступова ўся паўната ўлады пачынае канцэнтравацца ў руках Ю. Пілсудскага, які хаця фармальна на працягу 1926-1935 гг. займаў розныя пасады (прэм'ер-міністр, ваенны міністр і г.д.), фактычна ператвараецца ў аўтарытарнага дыктатара.

Супраць "санацыйнага" рэжыму выступілі польскія правацэнтрысцкія і левацэнтрысцкія партыі, а таксама арганізацыі нацыянальных меншасцяў, якія дасягнулі значнага поспеху на выбарах у сойм 1928 г. Аднак у 1930 г. Ю. Пілсудскі разагнаў сойм і распачаў палітыку рэпрэсій у адносінах да апазіцыі. У 1934 г. у Бярозе-Картузскай у Заходняй Беларусі быў створаны *канцэнтрацыйны лагер* для палітычных зняволеных, праз які за 1934-1939 гг. прайшло каля 10 тыс. чалавек. На выбарах у сойм 1930 г. ва ўмовах жорсткага адміністрацыйнага ціску перамаглі прыхільнікі Ю. Пілсудскага, што садзейнічала ўзмацненню яго ўлады.

У красавіку 1935 г. па ініцыятыве Ю. Пілсудскага была ўведзена новая *Канстытуцыя Польскай рэспублікі*. У адпаведнасці з ёй цэнтральнае месца ў сістэме ўлады займаў прэзідэнт, які выбіраўся тэрмінам на 7 гадоў на ўсеагульных выбарах. Ён атрымліваў правы прызначаць членаў урада без узгаднення з парламентам, склікаць і распускаць парламент, аднаасобна прымаць рашэнні і выдаваць дэкрэты, якія валодалі сілай закона; з'яўляўся кіраўніком узброеных сіл, заключаў і ратыфікаваў міжнародныя дамовы. Прэзідэнт атрымліваў права прызначаць трэцюю частку дэпутатаў сената.

Пачатак "санацыйнага" рэжыму супадае па часе з эканамічным уздымам 1926-1929 гг. Гэта абумовіла падтрымку яго ў гэты час значнай часткай

насельніцтва. У 1926-1927 гг. рэжым пайшоў на некаторыя саступкі беларускаму нацыянальнаму руху, дазволіўшы стварэнне шэрагу беларускамоўных школ. Аднак у далейшым ён працягвае праводзіць на заходнебеларускіх землях актыўную палітыку паланізацыі.

У другой палове 1920-х гг. назіраецца ўздым беларускага нацыянальнага руху. У 1926-1927 гг. яго буйнейшай арганізацыяй становіцца *Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ)*. На чале БСРГ стала група беларускіх дэпутатаў сойма, якія з сярэдзіны 1920-х гг. схіляліся да супрацоўніцтва з КПЗБ. Яе лідэрам быў *Браніслаў Тарашкевіч*. У склад БСРГ уваходзілі члены КПЗБ, якая бачыла ў Грамадзе форму ўласнай легальнай дзейнасці. У сваёй праграме БСРГ выступала за аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у "незалежнай рэспубліцы сялян і рабочых", дэмакратызацыю грамадства, перадачу памешчыцкіх зямель сялянам, увядзенне 8-гадзіннага працоўнага дня, змены у падатковай палітыцы на карысць немаёмных слаёў насельніцтва і г.д. Сацыяльныя лозунгі БСРГ садзейнічалі росту яе папулярнасці і пераўтварэнню ў масавую партыю. На пачатак 1927 г. дзейнічала каля 2 тыс. арганізацый партыі, у якія ўваходзілі каля 120 тыс. чалавек. Радыкальны характар дзейнасці партыі, а таксама сувязі з СССР прывялі да забароны БСРГ на пачатку 1927 г. Лідэры партыі, у тым ліку дэпутаты сойма, былі арыштаваны. У якасці пратэсту супраць ліквідацыі БСРГ у многіх гарадах Заходняй Беларусі адбыліся дэманстрацыі; дэманстрацыя ў Косаве Палескага ваяводства была расстраляна паліцыяй.

На выбарах 1928 г. былі праведзены ў сойм 10, а ў сенат 2 беларускіх дэпутатаў. 5 дэпутатаў сойма ўтварылі радыкальную фракцыю – "*Змаганне*", якая прэтэндавала на стварэнне вакол сябе масавай арганізацыі па тыпу БСРГ. Пасля разгону сойма ў 1930 г. дэпутаты фракцыі былі арыштаваны. У канцы 1920-х – на пачатку 1930-х гг. было праведзена некалькі судовых працэсаў над дзеячамі прасавецкага беларускага нацыянальнага руху, многія з якіх былі асуджаны на працяглыя тэрміны турэмнага зняволення.

У першай палове 1930-х гг. ва ўмовах жорсткага сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. узрастае сацыяльная напружанасць. Адбываецца рост *рабочага і сялянскага руху*. У 1931-1933 гг. у Заходняй Беларусі адбываецца 151 забастоўка рабочых і каля 460 выступленняў сялян. Для падаўлення сялянскіх выступленняў улады накіроўвалі карныя экспедыцыі з удзелам паліцыі і войска.

Пасля смерці ў маі 1935 г. Ю. Пілсудскага ўлада ў Польшчы пераходзіць да маршала *Эдварда Рыдз-Сміглага*. Падчас яго праўлення (1935-1939) адбываецца ўмацаванне аўтарытарнага рэжыму.

У 1935-1937 гг. у Польшчы, у тым ліку і ў Заходняй Беларусі, назіраецца актывізацыя антыўрадавага руху. Адбываліся шматлікія палітычныя і эканамічныя забастоўкі рабочых, а таксама антыўрадавыя дэманстрацыі і мітынгі. Найбольш значным выступленнем працоўных гэтага перыяду стала *забастоўка нарачанскіх сялян і рыбакоў 1935-1939 гг.* Назіраецца працэс кансалідацыі розных апазіцыйных груповак. У шэрагу гарадоў Заходняй Беларусі ствараліся *камітэты і камісіі адзінага фронту*, у якія ўваходзілі

прадстаўнікі КПЗБ, ППС, Бунда, Паалей-Цыёна і іншых арганізацый. У межах беларускага нацыянальнага руху адбылося пагадненне паміж дзвюма найбольш уплывовымі партыямі – КПЗБ і БХД (з 1936 г. – *Беларускае народнае аб'яднанне*) для барацьбы за стварэнне беларускамоўных школ.

У адказ на ўздым грамадскага руху ўзмацняюцца рэпрэсіі з боку ўладаў. У 1938-1939 гг. былі забаронены амаль усе апазіцыйна настроеныя палітычная партыі і грамадскія арганізацыі, зачынены апазіцыйныя газеты, ліквідаваны апошнія беларускія школы. Шматлікія дзеячы апазіцыйнага руху былі зняволены ў лагеры ў Бярозе Картузскай. Аслабленню антыўрадавага руху садзейнічалі таксама жорсткія рэпрэсіі сталінскага рэжыму ў адносінах да членаў КПЗБ, якія ўцяклі ў БССР. У 1938 г. паводле рашэння І. Сталіна міжнародная камуністычная арганізацыя Камінтэрн абвінавацiла кампартыю Польшчы, у тым ліку і КПЗБ, у супрацоўніцтве з польскімі спецслужбамі і распусціла яе. Многія лідэры КПЗБ былі расстраляны.

*Такім чынам, на працягу 1926-1939 гг. на тэрыторыі Беларусі адбывалася фарміраванне аўтарытарнага палітычнага рэжыму, які суправаджаўся ўзмацненнем палітыкі паланізацыі.*

### 20.3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.

Землі Заходняй Беларусі ў эканамічных адносінах ўяўлялі з сябе слабаразвітую аграрную правінцыю ў складзе Польшчы. Разам з тым на працягу 1920-1930-х гг. у розных сферах яе эканомікі назіраўся паступовы працэс мадэрнізацыі.

*Сельская гаспадарка*

У 1920-1930-я гг. каля 80% насельніцтва Заходняй Беларусі займалася сельскай гаспадаркай. У выніку ваенных дзеянняў у 1915 – 1920 гг. значна скараціліся пасяўныя плошчы, аб'ём сельскагаспадарчай прадукцыі, пагалоўе жывёлы. У структуры землеўладання пераважалі буйныя ўладанні з плошчай звыш 100 га (55% на 1921 г.). Большасць сялянскіх гаспадарак з'яўляліся малазямельнымі.

З мэтай аднаўлення сельскай гаспадаркі, развіцця ў ёй таварна-грашовых рынкавых адносін польскія ўлады праводзілі аграрную рэформу, закон аб якой быў прыняты ў 1925 г. Рэформа прадугледжвала наступныя накірункі:

1) *Парцэляцыя* – продаж з дапамогай зямельнага банку невялікімі надзеламі, ад 2 да 20 га, часткі памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных зямель. Да канца 1930-х гг. такім чынам у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах было прададзена каля 675 тыс. га. У выніку буйное памешчыцкае землеўладанне скарацілася на 16,5%; адбылося ўмацаванне заможных сялянскіх гаспадарак.

2) *Асадніцтва* – працэс перадачы часткі парцэляваных зямель былым вайскоўцам. Яны атрымлівалі надзелы ад 10 да 45 га бясплатна або з дапамогай невялікіх ільготных крэдытаў і пасяляліся хутарамі. Да 1939 г. у Заходняй Беларусі было расселена каля 10 тыс. асаднікаў. Большасць асаднікаў паходзілі з уласна польскіх зямель, выконвалі паліцэйскія функцыі і

таму іх рассяленне разглядалася як важны фактар пашырэння сацыяльнай апоры польскай улады і правядзення паланізацыі.

3) *Камасацыя* – ліквідацыя цераспалосіцы сялянскіх зямель, што, як правіла, суправаджалася высяленнем на хутары. Дзяржава давала сялянам некаторую дапамогу для ўладкавання хутарской гаспадаркі. Да 1939 г. у Заходняй Беларусі перасяліліся на хутары каля 43% сялянскіх гаспадарак. Сярэдні памер хутарской гаспадаркі складаў 7 – 10 га.

4) *Ліквідацыя сервітутаў* (права калектыўнага карыстання пашамі, сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі і г.д.) і прыватызацыя сервітутнай зямлі. Да 1939 г. сервітуты ў Заходняй Беларусі былі цалкам ліквідаваны; каля ¾ сервітутнай зямлі атрымалі буйныя землеўладальнікі.

Аграрная рэформа спрыяла развіццю сельскай гаспадаркі. Да 1929 г. быў адноўлены даваенны ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці. Рэформа садзейнічала развіццю ў вёсцы капіталістычных рыначных адносін, некалькі зменшыла сацыяльную напружанасць.

Разам з тым у цэлым узровень развіцця сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі быў невысокі. На нізкім узроўні знаходзіліся ўраджайнасць і тэхнічная забяспечанасць аграрнага сектара. Прычынамі гэтага былі ў першую чаргу малазямелле большасці сялянскіх гаспадарак, нізкія закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю ў параўнанні з высокімі на прамысловыя тавары, вялікія дзяржаўныя падаткі для сялянства. У выніку большасць сялян вялі паўнатуральную гаспадарку з дапамогай прымітыўных прылад працы і метадаў гаспадарання, не мелі магчымасці ў значных памерах набываць прадукцыю прамысловасці. Развіццё сельскай гаспадаркі замаруджвалася ў выніку эканамічных крызісаў, асабліва сусветнага крызісу 1929-1933 гг., якія суправаджаліся падзеннем цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю. Значная частка малазямельных і беззямельных сялян наймалася на працу ў якасці сельскагаспадарчых рабочых у памешчыцкія і заможныя сялянскія гаспадаркі, на прамысловыя прадпрыемствы, будаўніцтва. Значныя маштабы набыла *працоўная эміграцыя* за мяжу (пераважна ў Латвію, Францыю, ЗША, Канаду, краіны Лацінскай Амерыкі). У 1920-1930-я гг. з Заходняй Беларусі выехала за мяжу каля 100 тыс. чалавек.

*Прамысловасць і гандаль*

Заходняя Беларусь была адным з найбольш прамыслова адсталых рэгіёнаў Польшчы. Удзельная вага прамысловасці Заходняй Беларусі ў агульнай структуры польскай індустрыі складала 3-4%.

Прамысловае развіццё Заходняй Беларусі знаходзілася ў залежнасці ад сусветных эканамічных цыклаў. Пасля Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў прамысловасць знаходзілася ў глыбокім крызісе. У 1923-1924 гг. назіраецца пэўны ўздым прамысловай вытворчасці, які потым зноў змяніў крызіс 1924-1926 гг. Значны прамысловы ўздым адбыўся ў 1926-1929 гг., у выніку якога быў адноўлены даваенны аб'ём прамысловай прадукцыі.

Сур'ёзныя страты заходнебеларуская прамысловасць панесла падчас *сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг.* Яго вынікам стала закрыццё каля 17% прадпрыемстваў, скарачэнне амаль напалову колькасці рабочых.

Аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1930 г. паменшыўся на 30-40% у параўнанні з 1928 г. У другой палове 1930-х гг. у прамысловасці назіраўся ўздым, які дазволіў да 1938 г. наблізіцца да паказчыкаў вытворчасці 1928 г.

На працягу 1920-1930-х гг. назіраецца некаторая канцэнтрацыя прамысловай вытворчасці. У той жа час буйных прадпрыемстваў было няшмат. Сярод іх можна вызначыць шклозавод "Нёман" у Навагрудскім павеце, запалкавую фабрыку "Прагрэс-Вулкан" у Пінску, тытунёвую фабрыку ў Гродне і г.д. Каля 85% усіх прамысловых прадпрыемстваў складалі дробныя і саматужна-рамесніцкія. На нізкім узроўні знаходзілася электрыфікацыя прамысловасці.

У структуры прамысловай вытворчасці Заходняй Беларусі на першае месца выходзіць *дрэваапрацоўчая галіна* (фанерная, лесапільная, кардонна-папяровая вытворчасць), у якой было занята каля паловы ўсіх рабочых, а аб'ём прадукцыі к 1938 г. у два разы перавысіў узровень 1913 г. Далей па ступені значнасці ішлі харчовая (найперш вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі), лёгкая, хімічная.

Цяжкім з'яўлялася *матэрыяльнае становішча большай часткі рабочага класа ў прамысловасці*: нізкая заработная плата (яна складала каля 30-50% заробкаў рабочых у цэнтральнай Польшчы), дрэнныя ўмовы працы і быту. Высокім было беспрацоўе, якое падчас крызісу 1929 – 1933 гг. дасягала каля 47% працаздольнага гарадскога насельніцтва У той жа час у Польшчы была прынята сістэма *працоўнага заканадаўства*, згодна з якой устанаўліваліся 8-гадзінны працоўны дзень, сацыяльнае страхаванне ў выніку хваробы і страты працаздольнасці, пенсіі па ўзросту, дапамогі беспрацоўным, аплочваемыя адпачынкі. Але многія палажэнні працоўнага заканадаўства на практыцы часта парушаліся, а сацыяльныя выплаты былі мізэрнымі.

*Асноўныя прычыны нізкага ўзроўню развіцця прамысловасці Заходняй Беларусі*:

- адсутнасць значных мясцовых капіталаў, неабходных для развіцця і мадэрнізацыі вытворчасці;
- канкурэнцыя з боку больш таннай і якаснай прамысловай прадукцыі з Польшчы і краін замежжа;
- палітыка польскіх уладаў, накіраваная перадусім на эканамічную падтрымку прамысловасці цэнтральнай Польшчы;
- нізкая пакупніцкая здольнасць большай часткі мясцовага насельніцтва;
- абмежаванне магчымасцяў рэалізацыі прадукцыі на знешнім рынку ва ўмовах напружаных палітычных адносін Польшчы з краінамі-суседзямі – СССР, Германіяй, Літвой.

Структура гандлёвых устаноў заставалася амаль нязменнай у параўнанні з даваенным часам. Знешні гандаль ажыццяўляўся наступным чынам: з цэнтральных раёнаў Польшчы і з краін замежжа ў Заходнюю Беларусь імпартаваліся прадукцыя прамысловасці, нафтапрадукты, жалеза, цукар і г.д., на экспарт ішлі пераважна мясцовая сыравіна, асабліва лес і лён, і сельскагаспадарчыя прадукты. У экспарце лесу вялікую ролю выконваў замежны капітал.

*Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг. праходзіла марудна. Абсалютная большасць насельніцтва была занята ў сельскай гаспадарцы, узровень мадэрнізацыі якой быў вельмі нізкі. У прамысловасці пераважала апрацоўка мясцовых сыравінных рэсурсаў. Заходняя Беларусь з'яўлялася па сутнасці аграрна-сыравінным прыдаткам Польшчы.*

### 20.4. Адукацыя і культура ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.

*Адукацыйная сістэма* ў Польскай рэспубліцы мела наступную ўзроўневую структуру:

- *пачатковыя школы*;
- *гімназіі* (сярэдняя адукацыя);
- *прафесійна-тэхнічныя вучылішчы*;
- *семінарыі і тэхнікумы* (сярэдняя спецыяльная адукацыя);
- *універсітэты* (вышэйшая адукацыя).

На тэрыторыі Заходняй Беларусі адбывалася паступовае развіццё пачатковай адукацыі. У 1937/38 навучальным годзе тут налічвалася 4421 пачатковых школ з 546 тыс. навучэнцаў. Аднак разам з тым усеагульнае пачатковае навучанне не было рэалізавана: каля 13% дзяцей школьнага ўзросту не вучылася ў школе. У той жа час колькасць сярэдніх навучальных устаноў – гімназій – скарачалася (з 85 з 17,8 тыс. навучэнцаў у 1928 г. да 54 з 15,9 тыс. навучэнцаў у 1938 г.). Гэта тлумачыцца высокай платай за навучанне, аддаленасцю гімназій ад многіх населеных пунктаў (яны знаходзіліся толькі ў гарадах і некаторых мястэчках).

Важным накірункам адукацыйнай палітыкі польскіх уладаў з'яўлялася *паланізацыя школы*. Гэта суправаджалася дыскрымінацыяй беларускіх навучальных устаноў. Калі ў сярэдзіне 1920-х гг. у Заходняй Беларусі дзейнічала 77 беларускіх школ і 4 гімназіі (у Вільні, Радашковічах, Клецку, Навагрудку), то ў 1938 г. не засталося ніводнай.

У цэлым развіццё адукацыі суправаджалася істотнымі цяжкасцямі, такімі як недахоп школ, іх матэрыяльнага забеспячэння, настаўніцкіх кадраў. Узровень пісьменнасці насельніцтва заставаўся невысокім: у 1931 г. у Заходняй Беларусі налічвалася 43% непісьменных, што было значна вышэйшым паказчыкам, чым у цэнтральных раёнах Польшчы.

Важнай падзеяй ў развіцці адукацыі стала аднаўленне ў 1919 г. *Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя*, якія стаў буйнейшым навуковым і культурным цэнтрам Заходняй Беларусі. Найбольш значныя навуковыя даследаванні ва ўніверсітэце праводзіліся ў галіне філалогіі.

У розных сферах духоўнай культуры (літаратура, тэатр, друк, музыка, выяўленчае мастацтва) дамінаваў польскі ўплыў. Цэнтрамі беларускай культурна-асветніцкай дзейнасці з'яўляліся *Таварыства беларускай школы* (1921-1937), *Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры* (1926-1936), *Беларускае навуковае таварыства* (1918–1939), *Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей* (1921-1939), беларускамоўныя газеты, часопісы і выдавецтвы і г.д.

Для заходнебеларускай *літаратуры* характэрна перавага паэтычнага жанру, у межах якога дамінуюць грамадска-палітычныя, а таксама рамантычна-лірычныя матывы (М.Танк, В.Таўлай, М.Засім, Н.Арсеннева, К.Сваяк, У.Жылка, П.Пестрак і інш.).

*Выяўленчае мастацтва* было прадстаўлена наступнымі жанрамі:

- гістарычны і сімволіка-алегарычны (Я. Драздовіч);
- бытавы (М.Сеўрук, П.Сергіевіч);
- партрэтны і пейзажны (Г.Семашкевіч);
- карыкатурны (Я.Горыд).

Значны ўнёсак у развіццё музычнай культуры зроблены кампазітарамі К.Галкоўскім, Л.Раеўскім, оперным спеваком і выканаўцам народных беларускіх песень М.Забэйда-Суміцкім.

*Такім чынам, у 1920-1930-я гг. адбывалася паступовае развіццё адукацыі і розных форм духоўнай культуры ў Заходняй Беларусі. Аднак дадзены працэс істотна стрымліваўся павольнымі тэмпамі эканамічнай мадэрнізацыі, а таксама паланізатарскай палітыкай польскіх улад.*

**Асноўныя паняцці:**

Заходняя Беларусь, “паўночна-усходнія крэсы”, парламенцкая дэмакратыя, Канстытуцыя Польскай Рэспублікі 1921 г., Нацыянальны сход Польскай Рэспублікі, паланізацыя, Партыя нацыянальнай дэмакратыі, Партыя хрысціянскай дэмакратыі, Польская партыя сацыялістычная, Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі пасольскі клуб, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, “санацыя”, канцэнтрацыйны лагер у Бярозе Картузскай, Канстытуцыя Польскай Рэспублікі 1935 г., Беларуская Сялянска-работніцкая грамада, “Змаганне”, камітэты і камісіі адзінага фронту, Беларускае народнае аб’яднанне, парцэляцыя, асадніцтва, камасацыя, сервітуты, працоўная эміграцыя, сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг., Віленскі універсітэт імя Стэфана Баторыя, Таварыства беларускай школы, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія тэрыторыі, што адышлі да Польскай Рэспублікі ў 1921 г., атрымалі назву “Заходняя Беларусь”? Як афіцыйна называліся гэтыя тэрыторыі ў 1920-1930-я гг.?
2. Якія перыяды вылучаюць у палітычным жыцці Польскай Рэспублікі ў 1920-1930-я гг.?
3. Ахарактарызуйце асноўныя палажэнні Канстытуцыі Польскай Рэспублікі 1921 г. Якія органы ўлады атрымлівалі перавагу ў сістэме дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасці з дадзенай канстытуцыяй?
4. Што ўяўляла з сябе палітыка паланізацыі на заходнебеларускіх землях? Якія яе асноўныя накірункі?
5. Падумайце, чаму польскія ўлады актыўна падтрымлівалі каталіцкі касцёл у Заходняй Беларусі, а праваслаўная царква, наадварот, падвяргалася дыскрымінацыі?

6. Якія Вы ведаеце асноўныя польскія палітычныя партыі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі? У чым адрозненне іх сацыяльна-палітычных праграм?
7. Якія плыні сфарміраваліся ў межах беларускага нацыянальнага руху ў першай палове 1920-х гг.? У чым адрозненні паміж імі?
8. Якія палітычныя сілы праводзілі ўзброеную партызанскую барацьбу супраць польскіх улад у першай паловы 1920-х гг.? У сувязі з чым гэтая барацьба спынілася?
9. Падумайце, чым можна патлумачыць высокую папулярнасць палітычнай арыентацыі на БССР у межах нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі?
10. Што такое “санацыйны” рэжым”? Калі адбывалася яго ўсталяванне ў Польскай Рэспубліцы? У чым яго спецыфіка?
11. Якія змены ў дзяржаўна-палітычным ладзе Польскай Рэспублікі прадугледжвала Канстытуцыя 1935 г.?
12. Калі ўзнікае Беларуская сялянска-работніцкая грамада? Якія яна ставіла перад сабой задачы?
13. Дайце агульную характарыстыку развіцця рабочага, сялянскага і апазіцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг.
14. Чым можна патлумачыць ўзмацненне рэпрэсіўнай палітыкі “санацыйнага” рэжыму напярэдадні Другой сусветнай вайны?
15. Падумайце, чаму сталінскі рэжым ажыццявіў ліквідацыю КПЗБ і яе кіраўнікоў? Абгрунтуйце сваю думку.
16. Якія мерапрыемствы прадугледжвала аграрная рэформа ў Польшчы? Якія мэты яна перад сабой ставіла?
17. Што такое асадніцтва? Якія прычыны абумовілі падтрымку польскімі ўладамі дадзенай з’явы?
18. Растлумачце, наколькі аграрная рэформа спрыяла эканамічнай і тэхнічнай мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі?
19. Якія фактары абумовілі нізкі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі?
20. Якія маштабы набыла працоўная эміграцыя з тэрыторыі Заходняй Беларусі? Чым можна патлумачыць распаўсюджанне дадзенай з’явы?
21. Ахарактарызуйце ўзровень развіцця прамысловасці Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ў цэлым.
22. Дайце агульную характарыстыку матэрыяльнага становішча рабочага класа Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.
23. Паспрабуйце вызначыць агульны ўзровень эканамічнага развіцця заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы. Выкажыце думку, наколькі польскія ўлады былі зацікаўлены ў хуткай эканамічнай мадэрнізацыі дадзенага рэгіёну?
24. Якія ўзроўні мела адукацыйная сістэма ў Польскай Рэспубліцы? Дайце яе кароткую характарыстыку.
25. Падумайце, які ўплыў на развіццё асветы ў Заходняй Беларусі мела палітыка паланізацыі адукацыі?

26. Параўнайце ўзровень развіцця адукацыі ў Заходняй Беларусі і ў БССР у 1920-1930-я гг.
27. Якую ролю ў развіцці адукацыі, навукі і культуры Заходняй Беларусі мела адкрыццё Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя?
28. Дайце характарыстыку развіцця асноўных відаў мастацкай культуры ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Выбары ў парламенцкія ўстановы Польскай Рэспублікі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.
2. Партызанская барацьба ў Заходняй Беларусі ў першай палове 1920-х гг.
3. Палітыка паланізацыі ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.
4. Беларуская сялянска-работніцкая грамада: стварэнне, дзейнасць, вынікі.
5. Матэрыяльнае становішча рабочых і служачых Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг.
6. Хутарызацыя заходнебеларускай вёскі ў 1920-1930-я гг.: характар, ход, вынікі.
7. Дзейнасць Віленскага універсітэта імя Стэфана Баторыя (1919-1939).
8. Беларускія гімназіі ў 1920-1930-я гг.

## Тэма 21: Беларусь ва ўмовах Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.

**1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэнне Заходняй Беларусі да СССР і БССР.**

**2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.**

**3. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі (1941-1944).**

**4. Антыфашысцкі рух на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг.**

**5. Выгнанне нямецка-фашысцкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі ў 1943-1944 гг.**

### 21.1. Пачатак Другой сусветнай вайны. Далучэнне Заходняй Беларусі да СССР і БССР.

Пасля Першай сусветнай вайны барацьба паміж буйнейшымі дзяржавамі свету за сферы эканамічнага і ваенна-палітычнага ўплыву працягвалася. Асабліва яна абвастрылася пасля сусветнага эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. Сярод еўрапейскіх дзяржаў найбольш агрэсіўны характар барацьба за геапалітычнае і эканамічнае лідэрства набыла з боку Германіі, у якой з 1933 г. устанавіўся таталітарны палітычны рэжым на чале з *Нацыянал-сацыялістычнай нямецкай рабочай партыяй*, якую ўзначальваў *Адольф Гітлер*. Знешнепалітычнай мэтай дадзенага рэжыму было дасягненне Германіяй геапалітычнага панавання ў Еўропе (“*Трэці рэйх*”).

Напрыканцы 1930-х гг. у Еўропе склаліся тры асноўныя палітычныя блокі дзяржаў:

*Германія, Італія і іх саюзнікі*;

*Англія, Францыя і іх саюзнікі*;

*СССР*.

Удала выкарыстоўваючы міжнародныя супярэчнасці, нацысцкая Германія здолела на працягу 1938-1939 гг. далучыць да сваёй тэрыторыі Аўстрыю, Чэхію, Клайпедскі край Літвы.

23 жніўня 1939 г. Германія і СССР падпісалі *дагавор аб узаемным ненападзенні*, вядомы як "*пакт Рыбентропа-Молатава*", названы так у адпаведнасці з прозвішчамі міністраў замежных спраў абедзвюх дзяржаў. Разам з пактам аб ненападзенні быў падпісаны *сакрэтны дадатковы пратакол,* паводле якога размяжоўваліся сферы ўплыву ў Еўропе. У германскую "сферу інтарэсаў" адыходзілі Францыя, Брытанія і іх афрыканскія калоніі, некаторыя іншыя заходнееўрапейскія краіны, Літва; у савецкую – Фінляндыя, Эстонія, Латвія, частка Румыніі і некаторыя іншыя тэрыторыі. Тэрыторыя Польскай дзяржавы размяжоўвалася на сферы ўплыву па лініі рэк Нарэў – Буг – Вісла – Сан.

*1 верасня 1939 г.* нацысцкая Германія распачала баявыя дзеянні супраць Польшчы. Польскія ўлады разлічвалі на дапамогу Англіі і Францыі, якія 3 верасня 1939 г. аб'явілі вайну Германіі. Так пачалася *Другая сусветная вайна 1939-1945 гг.* Германскія ўзброеныя сілы мелі вялікую перавагу ў колькасці салдат і баявой тэхнікі, а таму, нягледзячы на ўпартае супраціўленне польскага войска, хутка прасоўваліся па тэрыторыі Польшчы. На працягу верасня 1939 г. яны занялі большую частку польскай тэрыторыі, у тым ліку частку Заходняй Беларусі: 13 верасня быў захоплены Брэст. Найбольш працяглыя баі разгарнуліся каля Варшавы, якая была занята 28 верасня. Англія і Францыя не аказалі Польшчы істотнай дапамогі.

*17 верасня 1939 г.* з усходу на тэрыторыю Польскай Рэспублікі ўступіла савецкая Чырвоная армія. Афіцыйна СССР не аб'яўляў вайны Польшчы; у дыпламатычнай ноце польскаму паслу было заяўлена, што польскай дзяржавы фактычна ўжо не існуе, а таму Чырвонай арміі аддадзены загад перайсці мяжу з Польшчай, каб "узяць пад апеку беларускае і ўкраінскае насельніцтва". На тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ўступіла 470-тысячнае савецкае войска (да кастрычніка 1939 г. савецкія сілы налічвалі каля 1 млн. салдат). Прасоўванне Чырвонай арміі адбывалася хутка і амаль бесперашкодна. Паводле загаду Э. Рыдз-Сміглы, польскай арміі прадпісвалася не аказваць супраціўлення савецкім войскам. Тым не менш у некаторых месцах адбыліся баі (найбольш значны каля Гродна). Савецкае войска ўзяла ў палон каля 250 тыс. салдат і афіцэраў. Усяго падчас паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну загінула па афіцыйных звестках 737 савецкіх салдат.

На пачатку кастрычніка 1939 г. польскія войскі канчаткова спынілі супраціўленне пад націскам германскай і савецкай армій. 25 верасня адбыўся сумесны парад савецкіх і германскіх войскаў у Брэсце. 28 верасня 1939 г. быў

заключаны *Дагавор аб дружбе і граніцы* паміж Германіяй і СССР. Паводле яго, мяжа паміж абедзвюма краінамі ўстанаўлівалася па лініі рэк Піса – Нараў – Буг – Сан, г.зн. далей на ўсход ад той, што прадугледжвалася "пактам Рыбентропа – Молатава". Узамен за гэта у прыкладзеным да дагавора сакрэтным пратаколе Германія адмаўлялася ад прэтэнзій на Літву, якая такім чынам пераходзіла ў савецкую зону ўплыву.

У выніку падзелу тэрыторыі Польскай дзяржавы Заходняя Беларусь апынулася пад кантролем Чырвонай арміі. Значная частка мясцовага насельніцтва прыхільна сустрэла яе прыход як вызваленне ад польскай улады. У некаторых месцах, асабліва на Палессі, Чырвонай арміі дапамагалі партызанскія атрады, якія фарміраваліся з мясцовых жыхароў. 10 кастрычніка 1940 г. кіраўніцтва СССР прыняла рашэнне аб перадачы Вільні і прылеглай да яе тэрыторыі Літве у абмен на ўвядзенне савецкіх войскаў на тэрыторыю гэтай дзяржавы.

22 кастрычніка 1939 г. былі праведзены выбары ў *Народны сход Заходняй Беларусі*, які павінен быў вызначыць будучы дзяржаўна-палітычны лад краю. Выбары праходзілі на савецкі ўзор, з удзелам загадзя вылучаных безальтэрнатыўных кандыдатаў пад кантролем Чырвонай арміі. 28-30 кастрычніка 1939 г. гэты сход адбыўся ў Беластоку. Народны сход прыняў дэкларацыі, у якіх абвяшчалася аб устанаўленні Савецкай улады, уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці і канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

Сесіі Вярхоўных Саветаў СССР і БССР у лістападзе 1939 г. канчаткова замацавалі юрыдычнае ўваходжанне Заходняй Беларусі ў склад БССР і СССР. У выніку тэрыторыя БССР павялічылася са 125,5 да 225,7 тыс. кв.км, а насельніцтва – з 5 млн. 562 тыс. чалавек да 10 млн. 239 тыс.

Да канца 1940 г. у асноўным завяршылася фарміраванне органаў новай улады ў Заходняй Беларусі. Кіруючыя пасады займалі пераважна партыйныя работнікі з усходніх абласцей БССР і РСФСР. На працягу 1939 – 1941 гг. прыбыла ў Заходнюю Беларусь звыш 14 тыс. партыйных кадраў. Да 1941 г. захоўвалася дэмаркацыйная лінія паміж усходняй і заходняй часткамі БССР. Станаўленне органаў новай улады суправаджалася складваннем у Заходняй Беларусі тых рыс таталітарнага рэжыму, які сфарміраваўся у СССР. Былі ліквідаваны ўсе некамуністычныя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, незалежныя друкваныя выданні.

Палітыка бальшавіцкай улады ўключала ў сябе наступныя *мерапрыемствы ў сацыяльна-эканамічнай і сацыяльна-культурнай галінах*:

- нацыяналізацыя банкаў і амаль усёй прамысловасці;

- пачатак правядзення індустрыялізацыі савецкага ўзору (у 1940 г. аб'ём прамысловай прадукцыі Заходняй Беларусі павялічыўся у два разы ў параўнанні з 1938 г.);

- амаль поўная ліквідацыя беспрацоўя у выніку паскарэння прамысловага развіцця і накіравання часткі беспрацоўных на фабрыкі ўсходняй часткі БССР;

- канфіскацыя памешчыцкіх і асадніцкіх зямель і іх размеркаванне сярод бяднейшых сялян; пачатак стварэння калгасаў (на 1941 г. у калгасы было ўключана каля 7% сялянскіх гаспадарак);

- развіццё адукацыйнай і культурна-асветніцкай сферы (узрасла колькасць школ, адчынена 25 сярэдніх спецыяльных установ, 4 інстытуты і г.д.), правядзенне беларусізацыі адукацыі.

Дадзеныя мерапрыемствы былі накіраваны на стварэнне значнай сацыяльнай базы бальшавіцкай улады сярод насельніцтва далучаных да БССР зямель. У той жа час таталітарныя метады кіравання выклікалі незадаволенасць часткі насельніцтва. На тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічалі польскія падпольныя арганізацыі, якія не прызнавалі далучэння Заходняй Беларусі да СССР і падпарадкоўваліся эмігранцкаму польскаму ўраду ў Лондане.

Для барацьбы з антыўрадавай дзейнасцю і ўмацавання сваёй улады бальшавікі праводзілі палітыку *рэпрэсій*. Адбываліся частыя арышты былых дзяржаўных і палітычных дзеячаў. На працягу 1939-1941 гг. па палітычных матывах было рэпрэсіравана каля 42 тыс. чалавек. У сакавіку 1940 і чэрвені 1941 гг. праводзіліся масавыя расстрэлы палітзняволеных. У красавіку-маі 1940 гг. у лясным масіве *Катынь* каля Смаленска было расстраляна каля 4,4 тыс. ваеннапалонных польскіх афіцэраў; падобныя расстрэлы адбываліся і ў некаторых іншых мясцовасцях Расіі і Украіны.

У 1940-1941 гг. бальшавіцкія ўлады правялі 4 прымусовыя *дэпартацыі* заходнебеларускага насельніцтва ва ўсходнія рэгіёны СССР (Сібір, Казахстан, Далёкі Усход). Сярод выселеных былі пераважна былыя дзяржаўныя служачыя, памешчыкі, асаднікі, духавенства, “буржуазныя элементы”, заможныя сяляне. Усяго дэпартавана звыш 100 тыс. чалавек.

*Такім чынам, у выніку пачатку Другой сусветнай вайны ў 1939 г. землі Заходняй Беларусі былі далучаны да БССР і СССР. Фактычна ўся этнічная тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе аднаго дзяржаўнага ўтварэння. Заходняя Беларусь была ўключана ў савецкую дзяржаўна-палітычную і сацыяльна-эканамічную сістэму.*

### 21.2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г.

Падзеі, звязаныя з ліквідацыяй Польскай дзяржавы, сталі пачаткам паспяховай захопніцкай палітыкі нацысцкай Германіі ў першы перыяд Другой сусветнай вайны. На працягу 1941 г. германскія войскі захапілі Нідэрланды, Бельгію, Францыю, Данію, Нарвегію, сумесна з войскамі Італіі і іншых дзяржаў-саюзнікаў уварваліся ў Югаславію і Грэцыю. Германія атрымала ў сваё распараджэнне эканамічныя і ваенныя рэсурсы большасці еўрапейскіх краін. Да сярэдзіны 1941 г. фактычна адзіным сур’ёзным праціўнікам Германіі на еўрапейскім кантыненце заставалася Англія. У гэтых умовах кіруючыя колы нацысцкай Германіі пачалі рыхтавацца да вайны з СССР, паколькі бачылі ў ім найбольш сур’ёзнага на той момант канкурэнта ў дасягненні геапалітычнага панавання ў Еўропе. Напрыканцы 1940 г. яны

распрацавалі план “*Барбароса*”, які прадугледжваў правядзенне хуткай, “маланкавай”, вайны супраць СССР, у выніку якой павінны быць імкліва захоплены асноўныя тэрыторыі еўрапейскай часткі дзяржавы і адбыцца капітуляцыя галоўных сіл савецкіх войскаў.

Да сярэдзіны 1941 г. германскае камандаванне сканцэнтравала вялкія сілы на мяжы з СССР. На беларускім ўчастку мяжы дыслацыравалася *група германскіх армій “Цэнтр”* (камандуючы – генерал-фельдмаршал фон Бок), якая налічвала 51,5 дывізій з 1,6 млн. чалавек, звыш 14,5 тыс. гармат і мінамётаў, 2 тыс. танкаў, 1,6 тыс. баявых самалётаў. З савецкага боку на гэтым участку дыслацыраваліся часці Заходняй асобай ваеннай акругі, пераўтворанай падчас вайны ў *Заходні фронт*, (камандуючы – генерал Д. Паўлаў) і 11-й арміі Прыбалтыйскай ваеннай акругі, якія складаліся з 48,5 дывізій з агульнай колькацю 715 тыс. чалавек, з наяўнасцю 10,8 тыс. гармат і мінамётаў, 2,4 тыс. танкаў, 1,9 тыс. баявых самалётаў.

22 чэрвеня 1941 г. войскі нацысцкай Германіі ўварваліся на тэрыторыю СССР. На баку Германіі ў вайне выступілі таксама Італія, Венгрыя, Румынія, Славакія, Балгарыя, Фінляндыя. Пачалася *Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гг.*, якая адкрыла новы этап Другой сусветнай вайны. Пачатак вайны Германіі з СССР прывёў да заключэння саюзу СССР з Англіяй, да якога ў снежні 1941 г. далучыліся ЗША, якія ўступілі ў вайну супраць Германіі, Японіі і іх саюзнікаў. Такім чынам з 1941 г. у Другой сусветнай вайне супрацьстаялі адзін аднаму два блокі дзяржаў:

1) Германія, Італія, Японія і іх саюзнікі;

2) *краіны антыгітлераўскай кааліцыі*: СССР, ЗША, Англія і іх саюзнікі.

З чэрвеня 1941 г. пачалося шырокамаштабнае наступленне войскаў нацысцкай Германіі на тэрыторыі СССР ад Балтыйскага да Чорнага мора. У першыя дні вайны адбыліся масавы артылерыйскі абстрэл прыгранічнай тэрыторыі і бомбавыя ўдары па аддаленых ваенных базах Чырвонай арміі, якая панесла велізарныя страты тэхнікі і людскіх рэсурсаў. Пачаліся баі ўздоўж дзяржаўнай мяжы. Найбольшае супраціўленне нямецкім войскам аказаў гарнізон *Брэсцкай крэпасці*, які вёў абарончыя баі на працягу амаль месяца.

Прарваўшы абарону пагранічных войскаў у БССР, дзве групоўкі германскіх армій “Цэнтр” накіраваліся на ўсход: адна з іх рушыла ад Сувалак на Вільню і Мінск, другая ад Брэста ў напрамку Баранавічы – Мінск. Яны мелі задачу абыйсці з поўначы і поўдня галоўныя сілы Заходняга фронту ў раёне Мінска і знішчыць іх. У выніку напружаных баёў злучэнні нямецкіх войскаў 28 чэрвеня захапілі Мінск. На тэрыторыі на захад ад Мінска ў акружэнне трапіла значная частка савецкіх войскаў (“*Навагрудскі кацёл*”). У палон было ўзята каля 330 тыс. савецкіх вайскоўцаў, захоплена шмат баявой тэхнікі і вайсковай маёмасці.

Пасля правядзення паскоранай мабілізацыі і перадыслакацыі з іншых рэгіёнаў некалькіх армій савецкае камандаванне на пачатку ліпеня 1941 г. арганізавала лінію стратэгічнай абароны ўздоўж рэк Заходняй Дзвіны і Дняпра. Упартае супраціўленне савецкіх войскаў адбывалася пры пераправе

германскіх злучэнняў праз р. Бярэзіну. 6 ліпеня прайшла буйнейшая падчас першага этапу вайны танкавая бітва ў раёне Сянно і Лепеля. З 3 па 27 ліпеня адбывался абарона Магілёва. Упартыя баі праходзілі ў раёне Віцебска, Оршы, Гомеля. Аднак нямецкім войскам удалося прарваць савецкую абарону і працягваць наступленне. Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя БССР апынулася пад кантролем германскіх войскаў. У выніку наступлення германскай арміі на тэрыторыі БССР загінула каля 300 тыс. савецкіх салдат, больш за 1,5 млн. патрапіла ў палон.

Да ліку *прычын, якія абумовілі паражэнні савецкіх войскаў у 1941 г.*, належаць:

- якасная перавага Германіі ў эканамічнай і тэхнічнай сферы (Германія выкарыстоўвала рэсурсы большасці краін Еўропы, якія былі больш эканамічна і тэхнічна развітымі ў параўнанні з СССР);
- непадрыхтаванасць да ваенных дзеянняў новай лініі мяжы СССР 1939 г.;
- стратэгічны пралікі савецкага камандавання (быў няправільна вызначаны асноўны накірунак наступу германскіх войскаў; панавала дактрына наступальнай вайны, войска было непадрыхтавана да тактыкі абарончых баёў);
- масавыя рэпрэсіі супраць каманднага саставу войска напярэдадні вайны (у 1941 г. амаль 75% камандзіраў палкоў і дывізій займалі свае пасады менш чым адзін год);
- дыпламатычныя пралікі сталінскага кіраўніцтва (разлік быў на тое, што ў хуткім часе Германія не распачне вайну).

У сувязі з пачаткам баявых дзеянняў у БССР, як і ў цэлым у СССР, адбывалася *мабілізацыя людскіх і матэрыяльных рэсурсаў на ваенныя патрэбы.* У адпаведнасці з дырэктывай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 29 чэрвеня 1941 г. партыйна-дзяржаўным арганізацыям прадпісвалася арганізаваць мабілізацыю людзей у Чырвоную армію, перабудаваць прамысловасць на выпуск ваеннай прадукцыі, правесці эвакуацыю вытворчых фондаў, матэрыяльных і культурных каштоўнасцяў, насельніцтва на ўсход.

Мабілізацыйныя мерапрыемствы ў асноўным праводзіліся ва ўсходняй частцы БССР, паколькі заходняя і цэнтральная частка была за вельмі кароткі тэрмін акупіравана германскімі войскамі. На працягу чэрвеня-жніўня 1941 г. у Чырвоную армію было мабілізавана каля 500 тыс. жыхароў БССР. Дапаможную ролю адыгрывалі знішчальныя батальёны, якія неслі ахову важных аб’ектаў, групы садзейнічання савецкім войскам, атрады і палкі народнага апалчэння, якія налічвалі каля 46 тыс. чалавек. Каля 2 млн. чалавек было мабілізавана на будаўніцтва абарончых збудаванняў. Праводзілася масавая работа па зборы матэрыяльных сродкаў на карысць Чырвонай арміі.

На прамысловых прадпрыемствах усходніх абласцей БССР адбывалася пераарыентацыя вытворчасці на выпуск ваеннай прадукцыі. Працоўны дзень быў павялічаны да 10-12 гадзін у суткі. Ва ўсходняй частцы БССР была праведзена буйнамаштабная *эвакуацыя* матэрыяльных рэсурсаў і

насельніцтва. У выніку яе на ўсход (пераважна ў Паволжа, на Урал і ў Сібір) былі вывезены 124 прамысловыя прадпрыемствы, энергетычныя ўстаноўкі, значная частка сельскагаспадарчай тэхнікі і працоўнай жывёлы, чыгуначнага саставу, фінансавыя сродкі, культурныя каштоўнасці і інш. Было эвакуіравана каля 1,5 млн. жыхароў БССР. Частка прадпрыемстваў, абсталявання і прадукцыі, якія не ўдалося вывезці, знішчалася (узарвана больш за 10 тыс. прамыслова-вытворчых будынкаў прадпрыемстваў).

Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і мабілізацыйныя мерапрыемствы дазволілі савецкаму кіраўніцтву сканцэнтраваць рэзервы і правесці абарончыя мерапрыемствы на маскоўскім напрамку. У баях пад Масквой у лістападзе – снежні 1941 г. наступленне нямецка-фашысцкіх войскаў было спынена.

Пачатак вайны суправаджаўся ўзмацненнем рэпрэсіўнасці сталінскага таталітарнага рэжыму. Прадстаўнікі вайсковага кіраўніцтва Заходняга фронту на чале з Д. Паўлавым, абвінавачаныя ў “баязлівасці”, былі расстраляны. Паводле загаду партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ад 16 жніўня 1941 г. прадугледжвалася пакаранне смерцю чырвонаармейцаў, якія здаваліся ў палон, дэзерціравалі або “праяўлялі трусасць”, а іх сем’і падлягалі высылцы ў аддаленыя раёны СССР.

*Такім чынам, у выніку пачатку Вялікай Айчыннай вайны на працягу чэрвеня – жніўня 1941 г. уся тэрыторыя БССР была захоплена войскамі нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў.*

**21.3. Нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым у Беларусі (1941-1944).**

У выніку акупацыі тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі войскамі былі ліквідаваны ўсе інстытуты ранейшай ўлады і створана новая сістэма органаў улады. Тэрыторыя Беларусі ўключана ў склад некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў:

Беласточчына і Гродзеншчына былі непасрэдна далучаны да “Трэцяга рэйха”;

паўднёвая частка Беларусі разам з гарадамі Брэст, Пінск, Мазыр уключана ў склад *рэйхскамісарыята “Украіна”*;

цэнтральная і частка заходняй Беларусі ўключаны ў склад *рэйхскамісарыята “Остланд”* з цэнтрам у Рызе; гэты рэйхскамісарыят падзяляўся на некалькі генеральных акруг: некаторыя раёны паўночна-заходняй Беларусі далучаны да *генеральнай акругі “Літва”*; на астатняй тэрыторыі ўтворана *генеральная акруга “Беларусь”*, якая складала каля 1/3 тэрыторыі БССР і падзялялася на 11 акруг;

усходняя частка Беларусі ўваходзіла ў склад *тылу групы армій “Цэнтр”*.

У рэйхскамісарыятах і генеральных акругах утваралася грамадзянская адміністрацыя. Вышэйшым органам улады ў генеральнай акрузе з’яўляўся *генеральны камісарыят* на чале з *гаўляйтэрам* (у генеральнай акрузе “Беларусь” гэтую пасаду займалі В. Кубэ (1941-1943), К. фон Готберг (1943-1944). Генеральныя акругі падзяляліся на *акругі* і *раёны*. Адміністрацыйны апарат складаўся ў асноўным з нямецкіх грамадзянскіх служачых. У якасці

дапаможных мясцовых устаноў ствараліся гарадскія і раённыя ўправы, валасныя старшыні і сельскія старасты. Іх работу накіроўвалі і кантралявалі спецыяльна прызначаныя германскія чыноўнікі – “камісары”, “каменданты”, “зондэрфюрэры” і г.д.

У тыле армій “Цэнтр” адміністрацыйныя функцыі выконвалі *армейскія палявыя і мясцовыя камендатуры*, якія надзяляліся ўсёй паўнатой улады ў зоне сваёй дзейнасці. Пры іх дзейнічалі мясцовыя грамадзянскія ўлады.

Узброенай асновай акупацыйнага рэжыму з’яўляліся вайсковыя гарнізоны – *ахоўныя дывізіі*, а таксама *каманды жандармерыі, групы тайнай палявой паліцыі, служба бяспекі СД*. Асаблівае месца ў сістэме сілавых органаў мелі *аператыўныя групы СС*, якія непасрэдна падпарадкоўваліся ўладам у Берліне; іх асноўныя функцыі палягалі ў правядзенні карных акцый і знішчэнні яўрэйскага насельніцтва. Дапаможную ролю ў падтрымцы акупацыйнага рэжыму мела *паліцыя*, створаная з мясцовых жыхароў. Агульная колькасць ваенна-паліцэйскіх сіл на тэрыторыі Беларусі дасягала 160 тыс. чалавек.

Палітыка германскіх уладаў на тэрыторыі Беларусі была накіравана на максімальнае выкарыстанне людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краю ў ваенна-гаспадарчых мэтах. Акрамя таго ставілася задача стварэння ўмоў для паступовай германізацыі Беларусі і яе зліцця з “Трэцім рэйхам”. Напярэдадні вайны у Мінітэрстве акупіраваных зямель Германіі быў распрацаваны план “*Ост*”, у адпаведнасці з якім прадугледжвалася знішчэнне каля 25% насельніцтва Беларусі (перадусім яўрэяў), 25% - павінна было быць перaселена за Урал, астатняе насельніцтва меркавалася выкарыстоўваць у якасці рабочай сілы на месцы або ў Германіі.

Для кіравання эканомікай акупіраваных тэрыторый СССР у Берліне быў створаны спецыяльны штаб “Ост”, які ўяўляў з сябе шматлікія спецыяльныя гаспадарчыя каманды, інспекцыі, атрады для збору сродкаў вытворчасці, а таксама 17 спецыяльных дзяржаўных і прыватных кампаній. Гэтыя арганізацыі праводзілі рэквізіцыі сельскагаспадарчай прадукцыі, нарыхтоўкі сыравіны, кіравалі дзейнасцю прамысловых прадпрыемстваў.

У перыяд германскай акупацыі на тэрыторыі Беларусі працавала каля 60 прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю рабочых звыш 30 чалавек, а таксама значная колькасць дробных і рамесна-саматужных прадпрыемстваў. Большасць асноўных прадпрыемстваў апынулася ў руках германскіх дзяржаўных і акцыянерных арганізацый. Адбывалася пераарыентацыя прамысловых прадпрыемстваў на выпуск прадукцыі ваеннага прызначэння. Аднак прамысловая вытворчасць знаходзілася ў крызіным стане з-за недахопу сыравіны і працоўнай сілы. Акупацыйныя ўлады ўвялі прымусовую працоўную мабілізацыю ў прамысловасці, абавязковы ўлік беспрацоўных на біржах працы. Матэрыяльнае становішча рабочых значна пагоршылася: працоўны дзень складаў 10-12 гадзін у суткі, частай з’явай з’яўляліся звышурочныя работы, зарплата была мізэрнай, адбываўся рост цэн, устанаўліваліся высокія падаткі для насельніцтва. У гарадах уводзілася картачная сістэма; распаўсюджваліся такія з’явы як голад і эпідэміі.

Акупацыйныя ўлады дазвалялі дробнае прыватнае прадпрымальніцтва, аднак на практыцы яго рэалізацыя была абмежаванай.

У сельскай гаспадарцы ўсходняй Беларусі былі захаваны калгасы і саўгасы, якія перайменоўваліся ў *абшчынныя гаспадаркі* і *дзяржаўныя маёнткі*. Калгасная сістэма ўяўлялася больш прыдатнай для выкарыстання сельскагаспадарчых рэсурсаў. У заходняй частцы Беларусі нешматлікія калгасы, утвораныя ў 1939 – 1941 гг., былі распушчаны. Вярталіся землі і маёмасць, канфіскаваныя ў 1939 – 1941 гг., былым уласнікам (аднак на зямельныя ўладанні плошчай звыш 60 га права прыватнай уласнасці не аднаўлялася, былыя гаспадары лічыліся толькі адміністратарамі сваіх маёнткаў). У 1942 – 1943 гг. выдаваліся распараджэнні аб аднаўленні прыватнай уласнасці на зямлю ва ўсходняй Беларусі. Аднак на практыцы аднаасабных прыватных гаспадарак было створана мала. Сялянскія гаспадаркі былі абкладзены вялікімі натуральнымі і грашовымі падаткамі. За невыкананне абавязковых паставак сельскагаспадарчай прадукцыі прадугледжваліся жорсткія пакаранні. Гэта прывяло да значнага падзення аграрнай вытворчасці ў Беларусі.

У шырокіх маштабах гітлераўскія ўлады вывозілі мясцовае насельніцтва на рабскую працу ў Германію. У 1941 – 1944 гг. на прымусовыя работы было вывезена каля 380 тыс. чалавек.

Для запалохвання мясцовага насельніцтва і барацьбы з антыфашысцкім рухам акупацыйны рэжым праводзіў *масавыя рэпрэсіі*. На тэрыторыі Беларусі было створана 260 *канцэнтрацыйных лагераў*, у якіх без суда і вызначэння тэрмінаў зняволення знаходзіліся дзесяткі тысяч чалавек. Яны падзяляліся на лагеры для ваеннапалонных (дулагі, шталагі, афлагі) і для цывільнага насельніцтва (працоўныя лагеры СД, перасыльныя лагеры СС, жаночыя лагеры, штрафныя лагеры). Яўрэйскае насельніцтва змяшчалася ў асобыя лагеры – *гета*. Найбольш цяжкім злачынствам нацызму стаў *Халакост* – масавае знішчэнне яўрэйскага насельніцтва. Буйнейшым лагерам на тэрыторыі Беларусі з'яўляўся *Трасцянец* каля Мінска, у якім падчас акупацыі было знішчана 206,5 тыс. чалавек. Вялікія лагеры смерці былі створаны паблізу станцый Лясная і Бронная гара на Брэстчыне, Грэбенеўскі ў Магілёве, Баравуха каля Полацка.

У зонах актыўнага партызанскага руху нацысты праводзілі карныя экспедыцыі, якія суправаджаліся масавым знішчэннем насельніцтва і населеных пунктаў. На працягу 1941 – 1944 гг. было ажыццёўлена 140 карных экспедыцый, падчас якіх спалена разам з жыхарамі 628 вёсак. Усяго падчас акупацыі на тэрыторыі БССР загінула звыш 1 млн. 400 тыс. цывільнага насельніцтва і каля 810 тыс. ваеннапалонных.

У той жа час германскія цывільныя ўлады імкнуліся прыцягнуць на свой бок частку мясцовага насельніцтва. З гэтай мэтай заахвочвалася прыцягненне мясцовых жыхароў у адміністрацыйныя органы, аднаўлялася дзейнасць рэлігійных устаноў, дазвалялася навуковая і культурная дзейнасць, арганізоўваліся беларускамоўныя школы (у генеральнай акрузе "Беларусь").

Супрацоўніцтва насельніцтва акупіраваных тэрыторый з нямецка-фашысцкімі ўладамі атрымала назву *калабарацыя*. У яе межах існавалі розныя плыні.

На тэрыторыі Беларусі найбольш значнай з’яўлялася беларуская нацыянальная калабарацыя. Яна была прадстаўлена такімі арганізацыямі як *Беларуская народная самапомач*, *Саюз беларускай моладзі* і інш. У іх удзельнічалі пераважна прадстаўнікі беларускага нацыянальнага руху, якія разлічвалі на стварэнне беларускай дзяржаўнасці пад пратэктаратам Германіі. У снежні 1943 г. з дазволу германскіх улад была створана *Белаурская цэнтральная рада* (БЦР) – прадстаўнічы орган беларускіх нацыянальных арганізацый пры адміністрацыі генеральнай акругі “Беларусь” на чале з *Радаславам Астроўскім*. Беларускія калабаранты актыўна ўдзельнічалі ў фарміраванні паліцэйскіх батальёнаў і іншых вайсковых адзінак. У сакавіку 1944 г. па ініцыятыве БЦР была абвешчана прымусовая мабілізацыя насельніцтва ў генеральнай акрузе “Беларусь” у *Беларускую краёвую абарону* (БКА), якая выкарыстоўвалася германскімі ўладамі як дапаможнае войска. Усяго ў БКА было прыцягнута каля 25 тыс. чалавек. Напярэдадні выгнання германскіх акупантаў беларускія калабаранты пад кантролем нямецкай адміністрацыі 27 чэрвеня 1944 г. правялі ў Мінску т.зв. “*Другі Усебеларускі кангрэс*”, які прыняў рэзалюцыі аб непрызнанні БССР і неправамоцнасці савецка-польскіх дагавораў, якія датычылі Беларусі.

Істотнай плынню ў межах калабарацыі з’яўлялася дзейнасць расійскіх прафашысцкіх арганізацый, якія ўтваралі вайсковыя адзінкі пераважна з ліку ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі: Руская вызваленчая народная армія, Руская нацыянальная народная армія і інш. Таксама на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі ўкраінскія, літоўскія, латышскія, казацкія, татарскія і іншыя калабаранцкія ваенна-паліцэйскія фарміраванні.

*Такім чынам, на працягу 1941-1944 гг. на тэрыторыі Беларусі быў усталяваны нямецка-фашысцкі акупацыйны рэжым. Яго спецыфічнымі рысамі з’яўляліся скіраванасць на татальнае выкарыстанне людскіх і матэрыяльных рэсурсаў краю на патрэбы вядзення вайны, а таксама правядзенне масавых рэпрэсій супраць мясцовага насельніцтва, якія мелі характар генацыду.*

### 21.4. Антыфашысцкі рух на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг.

Палітыка нямецка-фашысцкіх улад выклікала незадаволенасць большай часткі насельніцтва Беларусі, асабліва ва ўсходняй яе частцы, дзе ўлада належала ваеннаму камандаванню. На тэрыторыі Беларусі разгарнуўся шырокі антыфашысцкі рух, які праходзіў у двух асноўных формах: *партызанскі рух* і *антыфашысцкае падполле*.

Ужо падчас адступлення Чырвонай арміі летам 1941 г. савецкімі партыйна-дзяржаўнымі работнікамі была створана сетка *падпольных цэнтраў, арганізацый і груп*. Іх галоўнымі задачамі з’яўляліся арганізацыя партызанскіх атрадаў, правядзенне дыверсій і антыфашысцкай прапаганды. Да канца жніўня 1941 г. было створана 378 партызанскіх атрадаў і

дыверсійных груп, у якія ўваходзіла каля 8 тыс. чалавек. Аснову першых партызанскіх і падпольных фарміраванняў складалі чырвонаармейцы, якія трапілі ў акружэнне, савецкія партыйныя і камсамольскія актывісты. Буйнейшай у Беларусі сеткай падпольных арганізацый з'яўлялася *мінскае партыйнае падполле* на чале з *І.К. Кавалёвым*, якое актыўна дзейнічала да вясны 1942 г., калі было разгромлена нацысцкімі спецслужбамі. Буйныя падпольныя цэнтры дзейнічалі ў Магілёве, Віцебску, Оршы, Гомелі, Жлобіне, Брэсце, Баранавічах і іншых гарадах. Дзейнічаў падпольны друк, галоўнымі выданнямі якога з'яўляліся газеты "Звязда" і "Чырвоная змена".

Разам з развіцём падпольнага руху адбываецца ўтварэнне *партызанскіх атрадаў*. Да ліку буйнейшых з іх належалі:

атрад пад камандаваннем В. Каржа на тэрыторыі Пінскай вобласці;

атрад пад камандаваннем Ц. Бумажкова і Ф. Паўлоўскага на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Палескай вобласці;

атрад пад камандаваннем М. Шмырова ("Бацькі Міная") у Суражскім раёне Віцебскай вобласці;

падпольная група і партызанскі атрад пад кіраўніцтвам К. Заслонава ў раёне Оршы.

Аднак да канца 1941 г. партызанскі рух не меў масавага характару; адсутнічаў адзіны партызанскі цэнтр. У аснове яго развіцця знаходзілася перакідванне дыверсійных груп з савецкага тылу, якія часта знішчаліся.

*Перамогі Чырвонай Арміі ў бітвах пад Масквой (снежань 1941 г.), пад Сталінградам (лістапад 1942 – люты 1943 гг.) і на Курскай дузе (ліпень 1943 г.)* і звязаны з імі пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны на карысць савецкіх сіл выклікалі ўдым партызанскага і падпольнага руху ў Беларусі. Было аднаўлена мінскае партыйнае падполле (у яго складзе за ўвесь час акупацыі знаходзілася звыш 9 тыс. чалавек). У 1943 г. мінскія падпольшчыкі разам з партызанамі здзейснілі шэраг буйных дыверсій на гарадскіх прадпрыемствах і чыгуначным вузле, ажыццявілі забойства гауляйтэра В. Кубэ. Шырокі падпольны рух меў месца ў Віцебску, Магілёве, Гомелі, Брэсце, Обалі, Асіповічах і г.д. Асабліва актыўную дзейнасць падпольшчыкі праводзілі ў накірунку дыверсій на чыгуначных вузлах. Усяго да 1944 г. у антыфашысцкім падполлі ў Беларусі ўдзельнічала каля 70 тыс. чалавек.

Пачынаючы з вясны 1942 г. назіраецца хуткі рост партызанскага руху. Адбываецца працэс аб'яднання асобных партызанскіх атрадаў у *партызанскія брыгады і злучэнні*. Першая партызанская брыгада ў Беларусі ўзнікла на тэрыторыі Віцебшчыны пад кіраўніцтвам М. Шмырова. У выніку наступлення войскі Чырвонай арміі на пачатку 1942 г. выйшлі да мяжы БССР і ўступілі ў непасрэднае ўзаемадзеянне з партызанскімі атрадамі М. Шмырова. У выніку ўтварыўся 40-кіламетровы праход у лініі савецка-германскага фронту, так званыя "*Суражскія вароты*", які праіснаваў да верасня 1942 г. Праз яго партызанам перапраўлялася зброя і боепрыпасы, накіроўваліся спецыялісты па вядзенню дыверсій і інш.

Развіццю партызанскага руху ў Беларусі садзейнічала актыўная *дапамога савецкага тылу*. Адтуль партызаны атрымлівалі значную частку

зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў, сродкаў сувязі. Там праходзілі лячэнне параненыя партызаны, дастаўленыя з-за лініі фронту, рыхтаваліся кіруючыя кадры для партызанскага руху, дзейнічала школа па падрыхтоўцы партызанскіх спецыялістаў і інш.

З мэтай цэнтралізацыі аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам у маі 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання быў створаны *Цэнтральны штаб партызанскага руху* (ЦШПР) на чале з першым сакратаром ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкам, а з верасня 1942 г. пачаў працаваць *Беларускі штаб партызанскага руху* (БШПР), які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П. Калінін.

У выніку паспяховых баявых аперацый партызанскіх фарміраванняў на некаторых тэрыторыях Беларусі была ліквідавана нацысцкая ўлада і ўтвораны *партызанскія зоны.* Найбольш буйнымі зонамі былі Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская, Івянецка-Налібоцкая і інш. Да канца 1943 г. 20 партызанскіх зон кантралявалі 60% тэрыторыі БССР. У партызанскіх зонах аднаўлялася бальшавіцкая ўлада; гаспадарчыя рэсурсы падпарадкоўваліся патрэбам барацьбы з германскімі акупантамі. Палітыка генацыду, праводзімая акупацыйнымі ўладамі, садзейнічала росту падтрымкі партызан сярод мясцовага насельніцтва. У 1943 – 1944 гг. партызанскі рух набывае масавы характар. Да лета 1944 г. у складзе партызанскіх фарміраванняў налічвалася каля 370 тыс. чалавек.

Буйнейнай акцыяй партызанскага руху ў Беларусі была т.зв. “*рэйкавая вайна*” – правядзенне адначасовага масавага разбурэння чыгуначных камунікацый у розных рэгіёнах Беларусі. У ходзе акцыі партызаны разбуралі чыгуначныя шляхі, пускалі пад адхон эшалоны, узрывалі чыгуначныя станцыі, масты. Было знішчана каля 90% чыгункі БССР. “Рэйкавая вайна” праходзіла ў тры этапы:

1) жнівень-верасень 1943 г. – акцыя праходзіла ў падтрымку наступлення Чырвонай арміі пад Курскам;

2) друга палова верасня – кастрычнік 1943 г. (“Канцэрт”) – акцыя праходзіла ў падтрымку наступлення Чырвонай арміі ва ўсходніх раёнах Беларусі;

3) чэрвень-ліпень 1944 г. – акцыя праходзіла ў кантэксце буйнога наступлення Чырвонай арміі ў Беларусі.

Важнай часткай антыфашысцкага руху ў Беларусі 1941-1944 г. з’яўляўся *яўрэйскі рух супраціўлення,* які праявіўся ў правядзенні антыфашыцкай прапаганды ў гета, уцёках з гета, сабатажы лагерных мерапрыемстваў, дыверсійнай працы, узброеных паўстаннях і партызанскім руху.

Акрамя савецкага партызанскага і падпольнага руху на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі таксама іншыя антыфашысцкія арганізацыі.

Актыўна дзейнічала *польскае падполле*, якое падпарадкоўвалася польскаму эміграцкаму ўраду ў Лондане. Яго буйнейшай арганізацыяй, якая стварыла сетку партызанскіх атрадаў, з’яўлялася *Армія Краёва* (АК). На тэрыторыі Беларусі найбольш значныя сілы АК знаходзіліся на

Навагрудчыне. АК выступала за аднаўленне незалежнасці Польшчы ў межах 1939 г. У 1941 – 1943 гг. польскае падполле знаходзілася ў саюзе з савецкім. Пасля разрыву ў красавіку 1943 г. адносін паміж СССР і польскім эміграцкім урадам АК перайшла да тактыкі барацьбы супраць "двух ворагаў" – Германіі і СССР. Разам з тым летам 1944 г., у перыяд наступлення Чырвонай арміі, некаторыя атрады АК прынялі ўдзел у баях за Вільню. Усяго ў атрадах Арміі Краёвай у перыяд акупацыі ў Заходняй Беларусі налічвалася каля 14 тыс. чалавек.

На поўдні Беларусі ў 1942-1943 гг. дзейнічалі украінскія партызанскія атрады *Украінскай паўстанцкай арміі* (УПА) і т.зв. "*бульбаўцаў*", якія налічвалі ў гэтым рэгіёне каля 12 тыс. чалавек. Яны выступалі за стварэнне незалежнай украінскай дзяржавы, у склад якой павінны былі ўвайсці таксама землі паўднёвай Беларусі. Украінскія партызаны вялі ўзброеную барацьбу як супраць германскіх акупантаў, так і супраць савецкіх і польскіх партызан.

На тэрыторыі Беларусі існавалі таксама невялікія антыфашысцкія групы беларускага нацыянальнага руху, але яны не мелі значнага ўплыву.

*Такім чынам, у 1941-1944 гг. на тэрыторыі Белаурусі разгарнуўся шырокі партызанскі і падпольны рух, накіраваны супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. З 1943 г. ён набыў масавы характар і адыграў значную ролю ў разгроме войскаў нацысцкай Германіі.*

**21.5. Выгнанне нямецка-фашысцкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі ў 1943-1944 гг.**

З лета 1943 г., пасля Курскай бітвы, савецкія войскі канчаткова завалодалі ініцыятывай ў Вялікай Айчыннай вайне. Восенню – зімой 1943 – 1944 гг. мела месца буйнамаштабнае наступленне Чырвонай арміі на тэрыторыі ад Вялікіх Лук да Чорнага мора. Падчас яго ў верасні 1943 г. савецкія войскі занялі тэрыторыі на ўсходзе Беларусі – Камарын, Хоцімск, Клімавічы, Касцюковічы, Крычаў. У лістападзе былі ўзяты Рэчыца і Гомель, а ў студзені 1944 г. Мазыр і Калінкавічы.

Да лета 1944 г. становішча на савецка-германскім фронце склалася на карысць Чырвонай арміі, якая атрымала стратэгічную ініцыятыву. Лінія фронту ў Беларусі праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна, Бабруйска, далей на захад ад Мазыра і па рацэ Прыпяць да Ковеля, і ўяўляла сабой выступ, які атрымаў назву *"Беларускі балкон"*. Утрыманню гэтага выступу гітлераўскае камандаванне надавала асаблівае значэнне, бо ён прыкрываў галоўныя напрамкі наступлення Чырвонай арміі ў бок Германіі. Тут была створана моцная сістэма абароны, якую нямецкія ўлады назвалі "*Фатэрлянд*" ("Айчына"). Абарону ўтрымлівалі 63 дывізіі і 3 брыгады ў колькасці 1,2 млн чалавек, 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 баявых самалётаў.

У красавіку-маі 1944 г. Генеральны штаб Чырвонай арміі распрацаваў план наступальнай аперацыі па выгнанні нямецка-фашыцкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі, якая атрымала кодавую назву *"Баграціён"*. Для яе ажыццяўлення прыцягваліся войскі 1-га Беларускага (камандуючы

К. Ракасоўскі), 2-га Беларускага (камандуючы Г.Захараў), 3-га Беларускага (камандуючы І. Чарняхоўскі), 1-га Прыбалтыйскага (камандуючы І. Баграмян). У наступленні ўдзельнічалі Дняпроўская флатылія, французскі авіяполк "Нармандыя-Нёман". Каардынавалі дзеянні франтоў маршалы А.Васілеўскі і Г.Жукаў. Агульная колькасць савецкіх войскаў складала 2,4 млн чалавек, 36400 гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных артылерыйскіх установак і 5300 самалётаў. Такім чынам, перавага Чырвонай арміі ў вайсковай сіле і баявой тэхніцы склалася ў 2-4 разы.

*Аперацыя "Баграціён"* пачалася раніцай 23 чэрвеня 1944 г. Пачатак аперацыі супаў па часе з разгромам савецкімі войскамі ў першай палове 1944 г. буйных груповак нямецка-фашысцкіх войскаў пад Ленінградам, у Правабярэжнай Украіне і Крыме; адкрыццём у чэрвені 1944 г. другога фронту супраць Германіі і яе саюзнікаў ў Францыі англа-амерыканскімі войскамі. Наступленне Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі пачалося ў чатырох асноўных напрамках: віцебскім, багушэўскім, аршанскім, бабруйскім. Актыўную дапамогу савецкім войскам аказвалі партызаны. 24 чэрвеня лінія абароны была прарвана. 26 чэрвеня былі вызвалены Віцебск і Жлобін, 27 чэрвеня – Орша, 28 чэрвеня – Магілёў, Асіповічы. *3 ліпеня 1944 г.* савецкімі войскамі быў узяты Мінск.

У ходзе аперацыі "Баграціён" стварылася некалькі акружаных груповак германскіх войскаў – так званыя *"катлы"* (Віцебскі, Бабруйскі). У выніку баёў на захад ад горада ўтварыўся "*Мінскі кацёл"*, у які трапіла 100-тысячная групоўска германскіх войскаў (каля 70 тыс. нямецкіх салдат загінула, каля 35 тыс. здалася ў палон).

У ходзе далейшага наступлення савецкія войскі 4 ліпеня вызвалілі Полацк, 5 ліпеня – Маладзечна, 8 ліпеня – Баранавічы, 9 ліпеня – Навагрудак, 10 ліпеня – Слонім, 14 ліпеня – Пінск і Ваўкавыск, 16 ліпеня – Гродна, 28 ліпеня – Брэст. У выніку аперацыі "Баграціён" Чырвоная армія таксама заняла большую частку Літвы, частку Латвіі, усходніх раёнаў Польшчы.

У ходзе праведзенай наступальнай аперацыі уся тэрыторыя БССР была вернута пад кантроль савецкіх улад. З 110 дывізій і брыгад германскіх войскаў, якія прымалі ўдзел у баях, амаль 70 былі разгромлены, у тым ліку каля 20 знішчаны цалкам.

Разгром нямецка-фашысцкіх войскаў на тэрыторыі Беларусі паспрыяў іншым паспяховым наступальным аперацыям, праведзеным Чырвонай арміяй і войскамі дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі, што прывяло да поўнага разгрому войскаў нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. У 1944 – 1945 гг. у Чырвоную армію было мабілізавана 755 тыс. жыхароў Беларусі; усяго ў Чырвонай арміі ваявала каля 1 млн. 300 тыс. беларускіх жыхароў. *8 мая 1945 г.* Германія падпісала акт аб безумоўнай капітуляцыі, што азначала канец Вялікай Айчыннай вайны. *2 верасня 1945 г.* акт аб безумоўнай капітуляцыі падпісала Японія – скончылася Другая сусветная вайна.

*Такім чынам, у выніку паспяховай наступальнай аперацыі "Баграціён" нямецка-фашысцкія войскі былі выгнаны з тэрыторыі Беларусі і была аднаўлена савецкая ўлада.*

*Вялікая Айчынная вайна і германская акупацыя прынеслі беларускаму народу велізарныя страты. Паводле афіцыйных дадзеных, у Беларусі загінула больш за 2 млн. 200 тыс. жыхароў, на 85-90% скарацілася прамысловая вытворчасць, напалову – сельскагаспадарчая вытворчасць.*

**Асноўныя паняцці:**

Другая сусветная вайна, нацызм, "пакт Рыбентропа-Молатава", паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь, Дагавор аб дружбе і граніцы паміж Германіяй і СССР 28 верасня 1939 г., Народны сход Заходняй Беларусі, Катынскі расстрэл, дэпартацыі, "Барбароса", група армій "Цэнтр", Заходні фронт, Вялікая Айчынная вайна, антыгітлераўская кааліцыя, абарона Брэсцкай крэпасці, рэйхскамісарыят "Остланд", генеральная акруга "Беларусь", генеральны камісарыят, ахоўныя дывізіі, СС, "Ост", канцэнтрацыйныя лагеры, гета, Халакост, калабарацыя, Беларуская цэнтральная рада, Беларуская краёвая абарона, партызанскі рух, антыфашысцкае падполле, мінскае партыйнае падполле, партызанскія брыгады і злучэнні, "Суражскія вароты", Цэнтральны штаб партызанскага руху, Беларускі штаб партызанскага руху, партызанскія зоны, "рэйкавая вайна", Армія Краёва, Украінская паўстанцкая армія, "Беларускі балкон", "Фатэрлянд", аперацыя "Баграціён", "Мінскі кацёл".

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Калі пачалася Другая сусветная вайна? Якія міжнародныя падзеі ёй папярэднічалі?
2. Што такое "пакт Рыбентропа-Молатава"? Калі ён быў заключаны і што паводле яго прадугледжвалася?
3. Калі савецкія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны? Які характар мела наступленне Чырвонай арміі на заходнебеларускіх землях?
4. Якім чынам склаліся межы межы паміж Германіяй і СССР паводле Дагавору аб дружбе і граніцы ад 28 верасня 1939 г.?
5. Калі быў праведзены Народны сход Заходняй Беларусі? Які характар мелі выбары ў склад дадзенага органа? Якія рашэнні былі прыняты падчас яго пасяджэнняў?
6. Калі адбылося юрыдычнае замацаванне заходняй Беларусі ў складзе БССР і СССР? Падумайце, чаму савецкі ўрад вырашыў перадаць тэрыторыю Віленшчыны Літве?
7. Якія мерапрыемствы былі праведзены бальшавіцкай уладай у Заходняй Беларусі ў сацыяльна-эканамічнай і сацыяльна-культурнай галінах? На падтрымку якіх сацыяльных слаёў насельніцтва былі перадусім накіраваны дадзеныя мерапрыемствы?
8. Падумайце, чаму ў той час, калі ва ўсходняй Беларусі палітыка беларусізацыі ў 1930-я гг. была згорнута, у Заходняй Беларусі яна актыўна праводзілася ў 1939-1941 гг.?

9. Якія групы насельніцтва Заходняй Беларусі падлягалі дэпартацыі ў 1940-1941 гг.? Чым гэта было выклікана?
10. Паспрабуйце даць агульную характарыстыку вынікаў і значэння далучэння Заходняй Беларусі да БССР і СССР.
11. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна? Якімі былі суадносіны сіл германскіх і савецкіх войскаў на мяжы БССР напярэдадні вайны?
12. Якія асаблівасці мелі баявыя дзеянні на першым этапе Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі БССР?
13. У якіх мясцовасцях БССР праходзілі найбольш значныя баі ў чэрвені – жніўні 1941 г.?
14. Дайце агульную характарыстыку мабілізацыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі БССР на пачатку Вялікай Айчыннай вайны. У якіх рэгіёнах БССР яны праводзіліся найбольш эфектыўна?
15. Падумайце, ці можна вылучыць якія-небудзь з’явы грамадскага жыцця ў СССР, якія сведчылі пра ўзмацненне таталітарнага рэжыму падчас вайны?
16. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў была ўключана тэрыторыя Беларусі ва ўмовах германскай акупацыі?
17. Якія органы ўлады былі створаны на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах акупацыйнага рэжыму? Чым адрознівалася адміністрацыйная ўлада на тэрыторыях рэйхскамісарыятаў і тылу групы армій “Цэнтр”?
18. Ахарактарызуйце асноўныя мэты германскіх уладаў, якія яны мелі пры правядзенні сваёй палітыкі на землях Беларусі?
19. Дайце характарыстыку палітыкі масавых рэпрэсій, праводзімай германскімі ўладамі ў Беларусі ў 1941-1944 гг. Чым можна абумовіць рэпрэсіўны характар нацысцкай улады?
20. Якія Вам вядомыя буйнейшыя канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Беларусі? На якія катэгорыі падзяляліся лагеры?
21. Прывядзіце доказы на карысць таго, што палітыка нацысцкіх улад на тэрыторыі Беларуі мела характар генацыду?
22. Што такое калабарацыя? Якія Вы ведаеце плыні ў межах калабаранцкага руху на тэрыторыі Беларусі?
23. Якія мэты мелі перад сабой тыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху, якія падтрымлівалі акупацыйны рэжым? Назавіце асноўныя арганізацыі беларускай калабарацыі.
24. Калі ў Беларусі ўзніклі падпольныя арганізацыі? Якія яны ставілі перад сабой асноўныя задачы?
25. У якіх беларускіх гарадах дзейнічалі найбольш значныя падпольныя арганізацыі? Якіх Вы ведаеце дзеячоў антыфашысцкага падполля.
26. Калі адбываецца ўтварэнне на тэрыторыі Беларусі партызанскіх атрадаў? Якія Вы ведаеце найбольш буйныя партызанскія фарміраванні?
27. Калі партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі набывае масавы характар? Чым можна патлумачыць пераход да масавай барацьбы супраць акупантаў?
28. Што такое партызанскія зоны? Назавіце найбольш буйныя сярод іх.
29. Што такое “рэйкавая вайна”? Вылучыце яе асноўныя этапы?
30. Які характар меў антыфашысцкі рух сярод яўрэйскага насельніцтва?

31. Дайце агульную характарыстыку дзейнасці польскага і ўкраінскага падполля на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг.
32. Паспрабуйце вызначыць, якую ролю адыграў антыфашысцкі рух на тэрыторыі Беларусі ў агульным кантэксце Вялікай Айчыннай вайны?
33. Калі пачалося выгнанне нямецка-фашыцкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі? Якія раёны першымі былі вызвалены войскамі Чырвонай арміі?
34. Калі пачалося правязенне аперацыі "Баграціён"? Якімі былі суадносіны сіл на савецка-германскім фронце напярэдадні яе правядзення?
35. Назавіце асноўныя падзеі, звязаныя з правядзеннем аперацыі "Баграціён". Якія страты панесла германскае войска ў яе выніку?
36. Укажыце асноўныя вынікі правядзення аперацыі "Баграціён". Калі нямецка-фашысцкія войскі канчаткова былі выгнаны з тэрыторыі Беларусі?
37. Калі скончыліся Вялікая Айчынная і Другая сусветная вайна? Якімі былі іх вынікі?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Удзел беларускага насельніцтва ў Другой сусветнай вайне ў верасні 1939 г.
2. Дэпартацыі насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1940 – 1941 гг.
3. Абарона Брэсцкай крэпасці.
4. Абарона Магілёва войскамі Чырвонай арміі ў ліпені 1941 г.
5. Генацыд яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1941-1944 гг.
6. Беларуская калабарацыя ў 1941-1945 гг.
7. Дзейнасць мінскага партыйнага падполля ў 1941-1944 гг.
8. Партызанскія зоны: фарміраванне і функцыянаванне.
9. Армія Краёва на тэрыторыі Беларусі.
10. Аперацыя "Баграціён" і "рэйкавая вайна".

## Модуль 5. Беларусь у пасляваенны перыяд (другая палова 20 – пачатак 21 стст.). Станаўленне незалежнай беларускай дзяржавы.

### Тэма 22: БССР у другой палове 1940 – першай палове 1950-х гг.

**1. Аднаўленне эканамічнай сістэмы.**
**2. Палітычная сістэма.**
**3. Адукацыя, навука, культура.**

Летам 1944 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі была адноўлена бальшавіцкая ўлада. Паводле *дагавору аб мяжы паміж СССР і ўтворанай у 1945 г. Польскай народнай рэспублікай* 16 жніўня 1945 г. тэрыторыя Беласточчыны была аддадзена Польшчы.

#### 22.1. Аднаўленне эканамічнай сістэмы.

У выніку вайны эканоміка Беларусі панесла цяжкія страты:
- загінула звыш 2 млн. 200 тыс. чалавек;

- цалкам або часткова разбураны 209 гарадоў, 9200 сёл і вёсак;

- на 85% скарацілася колькасць прамысловых прадпрыемстваў, на 98% - электрастанцый, моцныя страты атрымаў транспарт;

- у сельскай гаспадарцы на 40% скараціліся пасяўныя плошчы, на 50% пагалоўе буйной рагатай жывёлы, на 61% - коней, на 89% - свіней, амаль цалкам знішчана аграрная тэхніка.

*Аднаўленне эканомікі БССР* уключае ў сябе два этапы:

1) 1943-1945 гг. (перыяд ва ўмовах вядзення вайны);

2) другая палова 1940-х – пачатак 1950-х гг. (пасляваенны перыяд).

*Першы этап аднаўлення эканомікі* характарызаваўся ў першую чаргу арганізацыяй гаспадаркі на патрэбы вядзення вайны. Таму галоўная ўвага надавалася аднаўленню цяжкай прамысловасці і транспарту.

З заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны пачынаецца *другі этап аднаўлення эканомікі*. Яго пачатак вызначыла пастанова Дзяржаўнага камітэта абароны СССР ад 26 мая 1945 г. “Аб мерапрыемтвах па перабудове прамысловасці ў сувязі са скарачэннем вытворчасці ўзбраенняў”. Аднаўленне эканомікі мела свае асаблівасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

*Прамысловасць*

Аднаўленне прамысловасці БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. адбывалася хуткімі тэмпамі Яно разглядалася як працяг індустрыялізацыі. Але калі да вайны галоўная ўвага надавалася лёгкай, дрэваапрацоўчай, харчовай вытворчасці, то з сярэдзіны 1940-х гг. ставілася задача стварэння ў БССР *буйной цяжкай прамысловасці* (машынабудавання, металаапрацоўкі, энергетыкі). На ажыццяўленне дадзенай мэты выдзяляліся значныя сродкі з саюзнага бюджэту. Для аднаўлення старых і будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў з розных рэгіёнаў СССР накіроўваліся неабходнае абсталяванне, сыравіна, кваліфікаваныя рабочыя кадры.

Крыніцы прамысловага будаўніцтва ў другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. былі тыя ж, што і ў 1930-я гг. (перацягванне сродкаў з сельскай гаспадаркі, прымусовыя ўнутраныя пазыкі, даходы ад “лагернай эканомікі”, жорсткая эксплуатацыя рабочых). У разглядаемы перыяд з’явілася новая крыніца сродкаў на развіццё прамысловасці – *рэпарацыі* з краін, якія пацярпелі паражэнне ў Другой сусветнай вайне. Рэпарацыі спаганяліся ў трох формах:

- прамысловае абсталяванне;

- таварныя пастаўкі прадукцыі;

- праца ваеннапалонных і інтэрніраваных.

У выніку к канцу чацвёртай пяцігодкі (1950 г.) аб’ём вытворчасці прамысловай прадукцыі павялічыўся на 15% у параўнанні з 1940 г. Былі цалкам адноўлены паліўна-энергетычная база прамысловасці і транспартная сістэма.

У другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. істотна змянілася структура беларускай прамысловасці. Значна ўзрасла доля *машынабудаўнічай і металаапрацоўчай вытворчасці, электраэнергетыкі*. З’яўляюцца новыя буйныя прадпрыемствы: *Мінскі трактарны завод, Мінскі аўтамабільны*

*завод, Мінскі мотавелазавод* і інш. У гэты перыяд пачынае фарміравацца спецыялізацыя БССР як “*зборачнага цэха” ў эканоміцы СССР*. У той жа час значна знізілася ўдзельная вага харчовай, тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай вытворчасці (аб’ём прадукцыі вытворчасці ў гэтых галінах на пачатак 1950-х гг. заставаўся ніжэй узроўню 1940 г.).

Пасляваеннае аднаўленне эканомікі суправаджалася *цяжкім матэрыяльным становішчам працоўных*. Заработная плата была нізкай; шырока ўкаранялася стаханаўская сістэма; цяжкімі былі жыллёвыя ўмовы. Да 1947 г. існавала *картачная сістэма* размеркавання прадуктаў. Да канца 1940-х гг. дзейнічала крымінальная адказнасць за самавольны адыход з прадпрыемстваў, прагулы, спазненні на працу, што каралася да 5-8 гадоў пазбаўлення волі ў ГУЛАГу. З канца 1940-х гг. назіраецца некаторае павышэнне заработнай платы і пенсій, зніжэнне цэн, пэўнае паляпшэнне жыллёвых умоў. Аднак рэальная заработная плата працоўных на пачатку 1950-х гг. заставалася ніжэйшай у параўнанні з даваенным узроўнем.

*Сельская гаспадарка*

У сельскай гаспадарцы БССР пасляваеннага перыяду існавалі пэўныя рэгіянальныя адрозненні: Ва ўсходняй частцы была цалкам адноўлена калгасна-саўгасная сістэма; у заходняй – да канца 1940-х гг. пераважалі індывідуальныя сялянскія гаспадаркі.

Аднаўленне сельскай гаспадаркі адбывалася значна больш павольна, чым у прамысловасці. Па стане на 1950 г. пасяўныя плошчы ў параўнанні з даваенным узроўнем склалі 94,3%, пагалоўе буйной рагатай жывёлы – 96,5%, коней – 62%, свіней – 64,4%, авечак – 55%. На нізкім узроўні знаходзіліся ўраджайнасць, прадукцыйнасць жывёлы. *Прычынамі маруднага развіцця сельскай гаспадаркі* з’яўляліся:

- значны недахоп тэхнікі, працоўнай жывёлы, а таксама кваліфікаваных працоўных кадраў у калгасах і саўгасах;
- малая матэрыяльная дапамога з боку дзяржавы;
- правядзенне ў вялікіх аб’ёмах абавязковых паставак сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве па заніжаных закупачных коштах;
- адсутнасць матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы з боку калгаснікаў, якія ў асноўнай масе працавалі бясплатна.

*Сацыяльна-эканамічнае і прававое становішча калгаснікаў* у разглядаемы перыяд характарызавалася наступнымі рысамі:

- надзвычай нізкі ўзровень аплаты працы (на 1948 г. толькі 6% калгаснікаў атрымлівалі грашовую зарплату; астатнія атрымлівалі або намінальную натуральную плату або зусім нічога);
- адсутнасць пашпартоў, пенсійнага забеспячэння, сацыяльнага страхавання;
- рэпрэсіі за парушэнні калгаснага парадку:

у 1947 г. быў адноўлены даваенны “закон аб трох каласках”;

у 1948 г. выдадзены закон, які прадугледжваў высяленне ў аддаленыя раёны дзяржавы на тэрмін да 8 гадоў тых калгаснікаў, якія ўхіляліся ад працы.

У дадзеных умовах фактычна адзінай крыніцай існавання калгаснікаў станавілася падсобная гаспадарка. Аднак асабістыя гаспадаркі павінны былі выконваць абавязковыя пастаўкі дзяржаве пэўнай колькасці малака, мяса, яек і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама былі абкладзены вялікімі грашовымі падаткамі. Невыкананне паставак і нявыплата падаткаў караліся вялікімі штрафамі. У выніку многія сем'і калгаснікаў знаходзіліся ў стане напаўгалоднага існавання.

З 1950 г. пачала праводзіцца палітыка аб'яднання дробных калгасаў у буйныя, а таксама перасялення сельскіх жыхароў з дробных вёсак і хутароў у буйныя пасёлкі.

У заходняй частцы БССР на мяжы 1940-1950-х гг. была праведзена *масавая калектывізацыя*. Яна праводзілася тымі ж сродкамі і метадамі, што і на ўсходзе ў 1930-я гг. Аднак яна была ажыццёўлена больш хутка, чым на ўсходзе. Калі на пачатку 1949 г. у калгасах знаходзілася 6,8% заходнебеларускіх сялян, то на канец 1952 г. – 95%. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі суправаджалася "раскулачваннем": толькі ў 1952 г. у Казахстан і Сібір было выселена каля 10 тыс. сялянскіх сем'яў.

*Такім чынам, на працягу другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. адбывалася аднаўленне разбуранай падчас Вялікай Айчыннай вайны эканомікі. Хуткімі тэмпамі развівалася прамысловасць, што суправаджалася фарміраваннем новых галін: машынабудавання, металаапрацоўкі. Марудна праходзіла аднаўленне сельскай гаспадаркі, што тлумачылася падпарадкаваным становішчам аграрнага сектара ў адносінах да прамысловасці ва ўмовах каманднаадміністрацыйнай сістэмы.*

### 22.2. Палітычная сістэма.

Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны суправаджалася аднаўленнем таталітарнага палітычнага рэжыму ў БССР. Галоўную ролю ў яго ўмацаванні адыгрывала партыйная вертыкаль улады; ёй падпарадкоўваліся органы дзяржаўнай улады, якія дзейнічалі паралельна з партыйнымі. Рашэнні партыйных арганізацый з'яўляліся абавязковымі не толькі для ніжэйшых арганізацый партыі, але і для ўсіх дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый.

З 1952 г. ВКП(б) была перайменавана ў *Камуністычную партыю Савецкага саюза (КПСС)*, а КП(б)Б – у *Камуністычную партыю Беларусі (КПБ)*. Адбываўся хуткі колькасны рост шэрагаў КПБ: з 48 тыс. чалавек у 1946 г. да 145 тыс. – у 1956 г. Пашырэнне шэрагаў партыі тлумачылася яе элітарным статусам: партыйнае членства з'яўлялася абавязковай умовай кар'ернага росту на дзяржаўнай службе, крыніцай некаторых сацыяльных прывілеяў. Унутры партыі ўмацоўваецца жорсткі цэнтралізм, камандна-іерархічны прынцып узаемаадносін паміж партыйнымі арганізацыямі. Разам з аднаўленнем партыйных арганізацый пасля Вялікай Айчыннай вайны аднаўляецца дзейнасць Саветаў і іх выканаўчых камітэтаў а таксама камсамола, прафсаюзаў і іншых афіцыйных грамадскіх арганізацый.

Грамадска-палітычнае жыццё другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. характарызавалася бязмежным узрастаннем *культу асобы І. Сталіна*. Вялізнымі тыражамі выходзілі працы І. Сталіна, ствараліся тысячы гурткоў па засваенню яго біяграфіі, праводзіліся масавыя сходы і мітынгі для ўшанавання І. Сталіна.

Партыйна-дзяржаўныя ўлады ў БССР у разглядаемы перыяд жорстка кантраляваліся ў сваёй дзейнасці саюзным кіраўніцтвам. Яно ажыццяўляла прызначэнне на галоўныя кіруючыя пасады ў рэспубліцы. Пры гэтым перавага аддавалася кадрам з іншых саюзных рэспублік. Першымі сакратарамі ЦК КПБ гэтага перыяду з'яўляліся:

П.К. Панамарэнка (1938-1947);

М.І. Гусараў (1947-1950);

М.С. Патолічаў (1950-1956).

Усе яны былі рускімі сталіністамі і да свайго прызначэння на дадзеныя пасады не мелі ніякага дачынення да Беларусі.

У гэты перыяд БССР пачынае фармальна выступаць як *суб'ект міжнароднай палітыкі*. У 1945 г. БССР становіцца адной з краін-заснавальніц *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН)*. Яна была прынятая ў гэтую арганізацыю разам з Украінскай ССР у знак прызнання значных людскіх і матэрыяльных страт, панесеных Беларуссю і Украінай у вайне з фашызмам. У 1944 г. ва ўрадзе БССР быў створаны *Народны камісарыят (з 1946 г. Міністэрства) замежных спраў*. Членства БССР у ААН адкрыла для яе перпектыву далучэння да дзейнасці шэрагу спецыялізаваных міжнародных устаноў: *Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, Міжнароднай арганізацыі працы, Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)* і інш., удзеле ў праграмах ААН. БССР прымала ўдзел у заключэнні мірных дагавораў з краінамі, якія ваявалі з СССР у Другой сусветнай вайне. Яна атрымлівала ў 1946-1947 гг. матэрыяльную дапамогу па праграме *Адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый (ЮНРРА)*.

Разам з тым адсутнічала заканадаўчае размежаванне паўнамоцтваў у знешнепалітычнай сферы паміж СССР і саюзнымі рэспублікамі. Фактычна ўся міжнародная дзейнасць урада БССР строга кантралявалася саюзнымі органамі ўлады. Адмоўны ўплыў на развіццё міжнародных кантактаў БССР меў пачатак "*халоднай вайны*" паміж СССР і заходнімі дзяржавамі на чале з ЗША. Вырашальнай акалічнасцю, якая абумовіла ўвядзенне знешнепалітычных функцый для ўрадаў БССР і іншых саюзных рэспублік, з'яўляўся палітычны разлік кіраўніцтва СССР у выкарыстанні іх для ўмацавання міжнароднага ўплыву.

Значнай з'явай грамадска-палітычнага жыцця БССР другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. было правядзенне масавых *рэпатрыяцый* насельніцтва. У Беларусь, згодна з міжнароднымі пагадненнямі, вярталіся былыя ваеннапалонныя, асобы, прымусова вывезеныя на працу ў Германію, былыя калабаранты. Многія з іх скіроўваліся ў спецлагеры НКВД і лагеры ГУЛАГ. Паводле пагаднення паміж урадамі БССР і Польшчы 1944 г. праводзілася перасяленне асоб, якія дэкларавалі сябе палякамі, з БССР у Польшчу і асоб

беларускай нацыянальнасці – з Польшчы ў БССР. У выніку на працягу 1944 – 1948 гг. з БССР у Польшчу выехала 274 тыс. чалавек, а ў БССР перасялілася з Польшчы 36 тыс.

Умацаванне таталітарнага рэжыму суправаджалася працягам палітыкі *рэпрэсій*. Хваля масавых рэпрэсій пракацілася ў БССР у 1944 – 1947 гг.: яна была скіравана супраць былых калабарантаў, а таксама тых, хто падазраваўся, часта беспадстаўна, у супрацоўніцтве з германскімі акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У далейшым рэпрэсіі закранулі розныя слаі насельніцтва, пераважна сялян, якіх абвяшчалі “кулакамі”, інтэлігенцыю, духавенства. На пачатак 1950-х гг. у сістэме ГУЛАГа знаходзілася звыш 100 тыс. жыхароў Беларусі. Рэпрэсіі закранулі і многіх кіруючых работнікаў. З канца 1940-х гг. праводзілася афіцыйная кампанія *барацьбы з “касмапалітызмам”*, накіраваная перадусім супраць інтэлігенцыі (забіты ў Мінску вядомы тэатральны дзеяч І. Меерхольд). У краіне панавала атмасфера страху, падазронасці; масавай з’явай сталі даносы.

Палітыка сталінскага рэжыму выклікала супраціўленне з боку розных слаёў насельніцтва, асабліва сялян і інтэлігенцыі. Антыўрадавы рух ажыццяўляўся ў двух формах: узброенай і мірнай.

*Узброены антыўрадавы рух* уключаў у сябе некалькі плыняў:

- фарміраванні, якія арыентаваліся на стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы (дзейнічалі пераважна ў заходняй частцы БССР);
- польскае падполле, галоўнай сілай якога выступала Армія Краёва, якое арыентавалася на аднаўленне польскай дзяржавы ў межах 1939 г. (дзейнічала ў заходняй частцы БССР);
- фарміраванні Украінскай паўстанцкай арміі, якія арыентаваліся на стварэнне незалежнай украінскай дзяржавы з уваходжаннем у яе склад тэрыторыі Палесся (дзейнічалі на поўдні БССР);
- літоўскія фарміраванні, якія арыентаваліся на стварэнне незалежнай літоўскай дзяржавы з уключэннем у яе склад шэрагу паўночна-заходніх тэрыторый Беларусі (дзейнічалі ў паўночна-заходняй частцы БССР);
- узброеныя фарміраванні без пэўнай палітычнай арыентацыі; нярэдка іх дзейнасць мела паўкрымінальны або чыста крымінальны характар.

Узброеныя антыўрадавыя арганізацыі праводзілі дыверсійныя акцыі, ажыццяўлялі тэрарыстычныя акты супраць прадстаўнікоў улады, займаліся антыўрадавай прапагандай, часамі ўступалі ва ўзброеныя сутычкі з міліцыяй. Некаторыя з іх падтрымлівалі сувязь з выведкамі заходніх краін. Аднак у выніку дзеянняў органаў дзяржаўнай бяспекі і міліцыі да сярэдзіны 1950-х гг. узброеныя антыўрадавыя фарміраванні былі цалкам ліквідаваны.

У другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі *падпольныя арганізацыі, якія арыентаваліся на мірныя формы барацьбы са сталінскім рэжымам*. Яны ствараліся пераважна прадстаўнікамі студэнцкай і вучнёўскай моладзі. У 1946-1947 гг. дзейнічалі падпольныя арганізацыі ў Баранавічах, Брэсце, Слоніме, Жыровічах, Ганцавічах, якія аб’ядноўваў *Цэнтр беларускага вызваленчага руху*. У 1946-1947 гг. сярод навучэнцаў педагагічных вучылішчаў Глыбокага і Пастаў існавала

падпольная арганізацыя *Саюз беларускіх патрыётаў*; у 1947 г. у Мінску, Маладзечанскай і Пінскай абласцях дзейнічала група "*Свабодная Беларусь*" і інш. Дадзеныя арганізацыі выступалі за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы, развіццё беларускай мовы і культуры, дэмакратызацыю грамадска-палітычнага жыцця. Яны праводзілі антыўрадавую прапаганду сярод насельніцтва, аднак, пры гэтым адмаўлялі ўзброеныя метады барацьбы. Да пачатку 1950-х гг. усе падпольныя арганізацыі былі выкрыты органамі дзяржбяспекі, а іх удзельнікі асуджаны на вялікія тэрміны пазбаўлення волі ў лагерах ГУЛАГ.

*Такім чынам, другая палова 1940-х – пачатак 1950-х гг. характарызаваліся ўмацаваннем таталітарнага рэжыму ў БССР. Узмацнялася цэнтралізаваная іерархічная партыйна-дзяржаўная сістэма ўлады, якая шырока выкарыстоўвала палітычныя рэпрэсіі і паспяхова падаўляла антыўрадавы рух. У дадзены перыяд БССР атрымлівае фармальны статус суб'екта міжнародных адносін, пачынае ажыццяўляць у абмежаваных маштабах знешнепалітычную дзейнасць.*

### 22.3. Адукацыя, навука, культура.

На працягу разглядаемага перыяду адбывалася аднаўленне сеткі *адукацыйных устаноў*, разбуранай падчас вайны. У 1950 г. у БССР налічвалася 11767 агульнаадукацыйных школ, у якіх навучалася каля 1,5 млн. вучняў. Характэрнымі тэндэнцыямі гэтага перыяду з'яўляліся:

- павелічэнне ўдзельнай вагі сямігадовых і сярэдніх школ; да сярэдзіны 1950-гг. было ў асноўным рэалізавана ўсеагульнае сямігадовае навучанне;
- паляпшэнне якасці настаўніцкіх кадраў (колькасць настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй павялічылася за 1944 – 1955 гг. з 20% да 50%);
- русіфікацыя школьнай адукацыі (так, калі ў Мінску ў 1944 г. з 28 школ 14 былі беларускамоўнымі, то ў 1952 г. толькі 9 з 46 школ);
- узмацненне сувязі навучання з прапагандай сталінісцкай ідэалогіі.

Адбывалася развіццё *прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі*. Колькасць тэхнікумаў і вучылішчаў за 1944 – 1955 гг. павялічылася з 66 да 123; колькасць асоб з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй дасягнула к 1957 г. 131 тыс. чалавек. Ішло паступовае развіццё сістэмы *вышэйшай адукацыі*. Колькасць асоб з вышэйшай адукацыяй у БССР павялічылася за 1941 – 1957 гг. з 27,7 тыс. да 83,5 тыс. чалавек.

У складаных умовах аднаўлялася дзейнасць *навуковых устаноў*. У 1950 г. у БССР працавала 77 навуковых устаноў, з іх 28 – у Акадэміі навук. Усяго ў 1954 г. у БССР працавала 4,1 тыс. навуковых работнікаў, з іх 125 дактароў і 1354 кандыдаты навук. З'яўленне новых галін гаспадаркі ў пасляваенны час прывяло да развіцця разам з традыцыйнымі ў Беларусі галінамі навук – сельскагаспадарчымі, сацыяльна-гуманітарнымі – фізікі, хіміі, матэматыкі, тэхнічных навук.

У той жа час істотным тормазам для развіцця навукі з'яўляўся жорсткі партыйна-дзяржаўны ідэалагічны кантроль і рэпрэсіі ў дачыненні навукоўцаў. Пры гэтым ідэалогія марксізму-ленінізму распаўсюджвалася не толькі на

грамадскія, але і на прыродазнаўчыя навукі. Так, была абвешчана ілжэнавукай генетыка; у Інстытуце біялогіі Акадэміі навук у 1947-1948 гг. ліквідаваны адпаведны аддзел, а дзеячы дадзенай навуковай дысцыпліны звольнены, у тым ліку прэзідэнт АН БССР А. Жэбрак.

У найбольшай ступені кантроль таталітарнага рэжыму праяўляўся ў *мастацкай культуры*, дзе працягваў далейшае развіццё стыль "сацыялістычнага рэалізму".

*Літаратурныя творы* разглядаемага перыяду вызначаліся бесканфліктнасцю і ідэалізацыяй савецкага ладу, усхваленнем І. Сталіна. Галоўнай тэмай беларускай літаратуры становяцца падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Аднак іх адлюстраванне з'яўлялася павярхоўным, героіка-парадным. Творчасць беларускіх паэтаў, пісьменнікаў і драматургаў падлягала строгай цэнзуры. Найбольш значнымі прадстаўнікамі беларускай мастацкай літаратуры гэтага перыяду былі К. Крапіва, А. Куляшоў, М. Лынькоў, І. Мележ, М. Танк і інш. У той жа час шматлікія беларускія літаратары былі рэпрэсіраваны ў другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. (А.Александровіч, Л. Геніюш, С.Грахоўскі, А.Звонак, С.Шушкевіч і інш.).

Паступова развівалася ў БССР у гэты перыяд *тэатральнае мастацтва*. Аднавілі пасля вайны сваю дзейнасць *Беларускі драматычны тэатр імя Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны тэатр імя Я. Коласа, Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета БССР* і інш. Аднак разам з тым адчуваўся значны ўціск таталітарнага рэжыму. Калі ў 1945 гг. у БССР працавала 12 тэатраў, то ў 1950 г. іх засталося толькі 8. У тэатральнай сферы праводзілася кампанія "ачышчэння" рэпертуару ад замежных твораў. Узмацнілася цэнзура над рэпертуарам тэатральных пастановак.

Пасля завяршэння вайны назіраецца развіццё *музычнага мастацтва*. Пачалі функцыянаваць *оперны тэатр, кансерваторыя, Белдзяржэстрада, Дзяржаўны народны аркестр БССР, Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР*. У 1952 г. створаны *Дзяржаўны народны хор БССР* на чале з Г. Цітовічам. У сімфанічнай і інструментальнай музыцы атрымалі вядомасць кампазітары М. Аладаў, А. Багатыроў, Я. Глебаў, Дз. Лукас, Р. Пукст, Я. Цікоцкі і інш.

У *жывапісе* разглядаемага перыяду стыль "сацыялістычнага рэалізму" праявіўся перадусім у стварэнні карцін, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны (В. Волкаў, І. Давідовіч, Я. Зайцаў, В. Хрусталёў, Я. Ціхановіч і інш.), індустрыяльна-калгаснаму будаўніцтву (Г. Бржазоўскі, К. Касмачоў і г.д.). Значнае месца займае таксама пейзажны жанр (В. Бялыніцкі-Біруля, Д. Дурчын, В. Кудрэвіч, В. Цвірка і інш.).

*Скульптурнае мастацтва* пасляваеннага перыяду адзначаецца стварэннем ансамбляў, кампазіцый, груп і бюстаў, вытрыманых у духу "сацыялістычнага рэалізму". Сярод найбольш вядомых скульптараў гэтага часу варта адзначыць З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава і інш.

Пасляваенная архітэктура адзначаецца манументалізмам (кампазіцыі праспекта Ф. Скарыны, Прывакзальнай плошчы). Пануе так званы імперскі стыль – *сталінскі ампір*.

*Такім чынам, у 1930-я гг. ва ўмовах паскоранай мадэрнізацыі грамадства назіраўся працэс развіцця адукацыі, навукі і розных галін культуры. Разам з тым усталяванне таталітарнага рэжыму істотным чынам тармазіла дадзены працэс у выніку правядзення масавых рэпрэсій супраць інтэлігенцыі, а таксама жорсткага дзяржаўнага кантролю ў духоўнай сферы жыцця грамадства.*

**Асноўныя паняцці:**

Аднаўленне эканомікі, буйная цяжкая прамысловасць, рэпарацыі, Мінскі трактарны завод, Мінскі аўтамабільны завод, "зборачны цэх", калектывізацыя ў Заходняй Беларусі, Камуністычная партыя Савецкага саюза, Камуністычная партыя Беларусі, культ асобы І. Сталіна, Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, Міністэрства замежных спраў, "халодная вайна", рэпатрыяцыя, Цэнтр беларускага вызваленчага руху, Саюз беларускіх патрыётаў, сталінскі ампір.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія тэрытарыяльныя змены адбыліся ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны? Падумайце, чым можна патлумачыць гэтыя змены?
2. Якія этапы можна вылучыць ў пасляваенным аднаўленні эканомікі БССР? У чым спецыфіка гэтых этапаў?
3. Якія структурныя змены адбыліся ў прамысловасці БССР у пасляваеннае дзесяцігоддзе? Дайце кароткую характарыстыку.
4. Ахарактарызуйце матэрыяльнае становішча працоўных у прамысловасці ў пасляваенны перыяд.
5. Укажыце, у чым выяўлялася спецыфіка аднаўлення сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд? Вызначце асноўныя прычыны маруднага развіцця сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд?
6. Паспрабуйце даць агульную характарыстыку сацыяльна-эканамічнага і прававога становішча калгаснікаў у БССР у другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг. Падумайце, ці можна вызначыць працу калгаснікаў як паднявольную?
7. Калі была праведзена калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходняй частцы БССР? Параўнайце яе з калектывізацыяй на ўсходзе БССР у 1930-я гг.
8. Паспрабуйце растлумачыць, чаму бальшавіцкія ўлады ў пасляваенны перыяд галоўнай задачай ставілі аднаўленне прамысловасці і значна менш увагі надавалі развіццю сельскай гаспадаркі?
9. Якія з'явы сведчаць пра ўмацаванне таталітарнага рэжыму ў БССР у пасляваенны перыяд? Дайце кароткую характарыстыку.
10. Якія асноўныя рысы характарызуюць дзейнасць камуністычнай партыі ў БССР у пасляваенны перыяд? Якую ролю выконвала партыя ў сістэме ўлады?
11. Падумайце, чаму сталінскія ўлады пры прызначэнні на вышэйшыя пасады партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў БССР не аказвалі даверу мясцовым кадрам, а накіроўвалі чыноўнікаў з іншых саюзных рэспублік?

12. Калі БССР пачынае выступаць у якасці суб’екта міжнароднай палітыкі? У чым гэта адлюстоўвалася?
13. Падумайце, ці можна разглядаць БССР як самастойны суб’ект міжнароднай палітыкі? Чаму кіраўніцтва СССР выступіла ў сярэдзіне 1940-х гг. за наданне ўраду БССР знешнепалітычных функцый?
14. Дайце кароткую характарыстыку рэпатрыяцый, праводзімых у БССР у пасляваенны перыяд. Чым можна патлумачыць вялікую колькасць асоб, якія выехалі з БССР у Польшчу ў 1944 – 1948 гг.?
15. Дайце агульную характарыстыку палітычных рэпрэсій сталінізму ў другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг.? Якія сацыяльныя слаі насельніцтва найбольш пацярпелі ад рэпрэсій?
16. Якія формы антыўрадавага руху Вам вядомыя на тэрыторыі БССР у другой палове 1940-х – пачатку 1950-х гг.? Чым можна абумовіць развіццё і разгром дадзенага руху?
17. Якія падпольныя арганізацыі дзейнічалі ў БССР у другой палове 1940-х гг.? Якімі былі іх сацыяльны склад і палітычныя мэты?
18. Якія рысы характарызавалі змены ў сістэме адукацыі БССР у пасляваенны перыяд?
19. У межах якіх установаў адбывалася развіццё навукі ў БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.? Ахарактарызуйце ў цэлым развіццё беларускага навукі дадзенага перыяду.
20. Якую ролю выконваў “сацыялістычны рэалізм” у развіцці мастацкай культуры БССР пасляваеннага перыяду?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:
1. Стварэнне буйнога машынабудавання ў БССР у пасляваенны перыяд.
2. Калгасная вёска ў БССР (другая палова 1940-х гг. – пачатак 1950-х гг.).
3. Калектывізацыя ў Заходняй Беларусі: сутнасць, ход, вынікі.
4. Рэпатрыяцыі беларускага насельніцтва ў пасляваенны перыяд.
5. Удзел БССР у фарміраванні Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.
6. Рэпрэсіі дзеячоў культуры БССР у пасляваенны перыяд.

## Тэма 23: БССР у другой палове 1950-х – 1980-я гг.

**1. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.**

**2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.**

**2.1. Развіццё прамысловасці.**

**2.2. Сельская гаспадарка.**

**2.3. Сацыяльнае развіццё.**

**3. Адукацыя, навука, культура ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.**

**4. Перабудова ў БССР (1985-1991 гг.).**

**23.1. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.**

У грамадска-палітычным жыцці БССР, як і ў цэлым у СССР, у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. назіраецца працэс паступовага змякчэння таталітарнага рэжыму, яго эвалюцыі ў бок аўтарытарызму.

Пачатак дадзенага працэсу супадае па часе са смерцю І. Сталіна ў 1953 г. У выніку ўнутрыпартыйнай барацьбы вярхоўная ўлада апынулася ў руках новага генеральнага сакратара ЦК КПСС *Мікіты Хрушчова* (1953-1964). Перыяд яго праўлення атрымаў у гісторыі назву "*хрушчоўская адліга*". Ключавой падзеяй дадзенага перыяду з'яўлялася правядзенне *ХХ з'езду КПСС* у лютым 1956 г., на якім была прынята пастанова, што змяшчала ў сабе вострую крытыку культу асобы І. Сталіна, асуджэнне рэпрэсій. Разам з тым асновы існуючага ў СССР грамадскага ладу, закладзеныя ў перыяд сталінізму, прызнаваліся адпавядаючымі "прынцыпам сацыялізму"; лічылася неабходным удасканаліць гэты лад шляхам пераадолення "памылак" сталінізму.

Падчас "хрушчоўскай адлігі" былі праведзены наступныя *пераўтварэнні ў грамадска-палітычным жыцці*:

1) Частковая рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій (у БССР рэабілітавана каля 30 тыс. чалавек).

2) Усеагульная амністыя палітычных зняволеных, ліквідацыя ГУЛАГа, пазасудовых карных органаў, спыненне масавых рэпрэсій.

3) Пашырэнне правоў саюзных рэспублік: з 1957 г. уводзілася самастойнасць рэспубліканскіх органаў улады ў сферы прыняцця прававых кодэксаў; у падпарадкаванне рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў пераходзілі многія прадпрыемствы і арганізацыі, якія раней падначальваліся саюзным уладам. У 1956 г. упершыню першым сакратаром ЦК КПБ стаў беларус *К. Мазураў* (1956 – 1965).

4) Некаторае пашырэнне правоў Саветаў: ім перадаваліся правы накіравання фінансавых сродкаў на жыллёвае будаўніцтва, камунальную гаспадарку, сацыяльную сферу за кошт звышпланавых накапленняў прадпрыемстваў. У Саветах з'явіліся камісіі па народнай адукацыі, культурна-асветніцкай працы, ахове здароўя, сацыяльнаму забеспячэнню, жыллёваму будаўніцтву. Аднак выбары ў Саветы па-ранейшаму мелі фармальны, безальтэрнатыўны характар.

5) Некаторае пашырэнне правоў прафсаюзаў: на буйных і сярэдніх прадпрыемствах вытворчыя нарады пераўтвараліся ў пастаянна дзеючыя пад кантролем прафсаюзаў; прафсаюзы сталі ўдзельнічаць у размеркаванні жылля, пуцёвак.

6) Скарачэнне бюракратычнага апарату; абмежаванне права на займанне вышэйшых партыйных пасад трыма тэрмінамі).

7) Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа 1962 г., у выніку якой ў БССР была падзелена на 6 абласцей: *Мінскую, Брэсцкую, Віцебскую, Гомельскую, Гродзенскую, Магілёўскую.*

Пасля XXII з'езду КПСС (1962) у якасці афіцыйнай праграмы партыі быў абвешчаны курс на пабудову камунізму ў СССР да 1980 г.

У выніку дзяржаўнага перавароту 1964 г. М. Хрушчоў быў адхілены ад улады. Генеральным сакратаром ЦК КПСС замест яго стаў *Леанід Брэжнеў* (1964 – 1982). Пасля яго смерці дадзеную пасаду займалі *Юрый Андропаў* (1982 – 1984) і *Канстанцін Чарненка* (1984 – 1985). У БССР у гэты час пасаду першага сакратара ЦК КПБ займалі *П. Машэраў* (1965 – 1980), *Ц. Кісялёў* (1980 – 1983), *М. Слюнькоў* (1983 – 1987).

У цэлым грамадска-палітычнае жыццё другой паловы 1960-х – першай паловы 1980-х гг. працягвала традыцыі "хрушчоўскай адлігі". У той жа час былі адменены некаторыя рэформы папярэдняга перыяду: зняты абмежаванні на права займання вышэйшых партыйных пасад; замаруджаны працэс рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Галоўным накірункам дзейнасці ўлады з'яўлялася захаванне палітычнай стабільнасці.

У 1977 г. была прынята новая *Канстытуцыя СССР*, а ў 1978 г. *Канстытуцыя БССР*. У параўнанні з папярэднімі канстытуцыямі ў іх падкрэслівалася асаблівая кіруючая роля КПСС-КПБ у грамадска-палітычным жыцці. У афіцыйнай ідэалогіі ў гэты час адбываецца пераход ад лозунгаў аб пабудове камунізму да канцэпцыі "*развітога сацыялізму*", якая падкрэслівала дасягненні савецкага ладу. У межах дадзенай канцэпцыі развівалася таксама ідэя аб фарміраванні ў межах СССР новай супольнасці – *савецкага народа*, які падмяняў сабой паступова ранейшыя нацыі. Дадзеная ідэя выступала абгрунтаваннем праводзімай у БССР палітыкі русіфікацыі.

Другая палова 1970-х – першая палова 1980-х гг. увайшлі ў гісторыю пад назвай "*эпоха застою*", знешняй рысай якога стала канцэнтрацыя вышэйшай дзяржаўнай улады ў СССР у руках групы састарэлых партыйных лідэраў. Адметнымі рысамі гэтага перыяду з'яўляліся:

- істотнае разрастанне партыйна-дзяржаўнага бюракратычнага апарату, карупцыі і пратэкцыянізму ў межах апарату;
- штучны рост шэрагаў партыі (колькасць членаў КПБ павялічылася за 1965 – 1986 гг. з 319 тыс. да 668 тыс. чалавек);
- узмацненне фармалізму ў працы партыйна-дзяржаўнага апарату;
- шырокая прапаганда з дапамогай СМІ "дасягненняў савецкага ладу", стварэнне ў пэўнай ступені культу кіраўнікоў партыі, асабліва Л. Брэжнева.

На працягу другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг. спыніліся масавыя рэпрэсіі. У той жа час забаранялася дзейнасць любых палітычных і грамадскіх арганізацый, ініцыятыў, правядзенне сходаў, акрамя афіцыйных; захоўваўся жорсткі цэнзурны кантроль за ўсімі сродкамі масавай інфармацыі; працягвалася дыскрымінацыя правоў рэлігійных арганізацый і вернікаў; абмяжоўваліся магчымасці выезду за мяжу. У дадзеных умовах прадугледжвалася крымінальная адказнасць за праявы іншадумства; шырокія маштабы прыняў кантроль з боку органаў дзяржбяспекі. У той жа час маштабы і ступень палітычных рэпрэсій істотна зменшыліся ў параўнанні з перыядам сталінізму. За антысавецкую дзейнасць у БССР у 1953 – 1985 гг. асуджана ўсяго 137 чалавек.

Сталінскія рэпрэсіі ў дачыненні нацыянальнай інтэлектуальнай эліты, хуткая ўрбанізацыя ў пасляваенны перыяд і нізкі статус беларускай мовы стварылі сітуацыю слабой нацыянальнай самасвядомасці беларускага насельніцтва і кіраўніцтва БССР. Беларуская мова яшчэ больш звузіла сферу свайго ўжытку, што непакоіла нацыянальную інтэлігенцыю. У 1968 г. група студэнтаў філалагічнага факультэту БДУ накіравала ліст у ЦК КПБ з патрабаваннем аб выкладанні ў ВНУ на беларускай мове. Гэты ліст быў расцэнены як "нацыяналістычны", і яго ініцыятараў А. Разанава і В. Яраца выключылі з ўніверсітэта. У 1972 г. беларускі пісьменнік І.Мележ накіраваў зварот да ЦК КПБ з просьбай паклапаціцца аб выданні нацыянальнай літаратуры. На гэты раз дзяржава задаволіла пажаданне пісьменнікаў – было створана выдавецтва "Мастацкая літаратура" для выдання кніг на беларускай мове. Аднак, калі ў красавіку 1974 г. на XXVI з'ездзе КПСС адбыўся разгром "нацыяналістаў", у БССР таксама абвастрылася неабгрунтаваная крытыка дзеячоў культуры.

*Міжнародная палітыка БССР* у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. працягвала заставацца ў рэчышчы знешнепалітычнага курсу СССР. У той жа час магчымасці ўдзелу БССР у міжнароднай дзейнасці Савецкага Саюза пашыраліся дзякуючы адмаўленню савецкага кіраўніцтва з другой паловы 1950-х гг. ад палітыкі жорсткай ізаляванасці ад астатняга свету, абвяшчэнню прынцыпу мірнага суіснавання дзяржаў з супрацьлеглымі грамадскімі сістэмамі. Разам з тым "халодная вайна" працягвалася фактычна да сярэдзіны 1980-х гг.

Калі ў канцы 1950-х гг. БССР была ўдзельніцай 54 міжнародных дагавораў, канвенцый і пагадненняў, то ў сярэдзіне 1980-х гг. – 168. У гэты прамежак часу яна прымала ўдзел у працы амаль 70 міжнародных арганізацый і іх органаў. Для падтрымання рэгулярных кантактаў з імі былі створаны пастаянныя прадстаўніцтвы БССР пры ААН у Нью-Йорку (1958), Еўрапейскім аддзяленні ААН у Жэневе (1962), пры ЮНЕСКА ў Парыжы (1962), пры міжнародных арганізацыях у Вене (1982). У 1974 – 1975 гг. БССР з'яўлялася непастаянным членам Савета Бяспекі. Рэспубліка пяць разоў выбіралася членам Эканамічнага і Сацыяльнага Савета ААН. У 1972 г. у Мінску былі адчынены генеральныя консульствы Польшчы і ГДР, у 1990 г. – Балгарыі. БССР наведалі дэлегацыі, кіраўнікі розных краін, палітычныя і грамадскія дзеячы. Дэлегацыі БССР таксама выязджалі ў іншыя краіны. Пашыраліся грамадскія, эканамічныя, навуковыя, культурныя сувязі з замежнымі дзяжавамі. Шырокі размах набыў рух пабрацімскіх сувязяў паміж беларускімі гарадамі і гарадамі іншых дзяржаў.

У той жа час саюзныя ўлады не ўзгаднялі з адпаведнымі рэспубліканскімі органамі свой знешнепалітычны курс, не інфармавалі аб плануемых ініцыятывах і прапановах у ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Нават бягучыя пытанні адносін БССР з замежнымі дзяржавамі і міжнароднымі арганізацыямі вырашаліся саюзнымі органамі. Улады БССР падтрымалі ўсе міжнародныя акцыі СССР і інтэрвенцыі савецкіх войскаў у Венгрыю (1953 г.), Чэхаславакію (1968 г., К. Мазураў кіраваў арыштам

чэшскага кіраўніцтва), Афганістане (1979 – 1989 гг.), беларусы прынялі актыўны ўдзел у баявых аперацыях.

*Такім чынам, на працягу другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг. адбываўся працэс паступовай трансфармацыі таталітарнага палітычнага рэжыму ў БССР і СССР у аўтарытарна-бюракратычны. У гэты перыяд некалькі павялічваецца аўтаномія БССР у межах СССР у эканамічных пытаннях, пашыраецца яе міжнародная дзейнасць пры захаванні кантролю з боку саюзных органаў улады.*

**23.2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.**

Сацыяльна-эканамічнае жыццё БССР другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг. характарызуецца перш за ўсё хуткім працэсам *індустрыялізацыі*, у выніку якога БССР да сярэдзіны 1980-х гг. пераўтвараецца ў *індустрыяльную рэспубліку*. Разам з тым у адрозненне ад папярэдняга перыяду працэс індустрыялізацыі суправаджаецца павышэннем матэрыяльнага і сацыяльна-культурнага ўзроўню жыцця насельніцтва, рэалізацыяй прынцыпу сацыяльнай дзяржавы.

**23.2.1. Развіццё прамысловасці.**

Індустрыяльнае будаўніцтва ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. адбывалася шпаркімі тэмпамі. На 1986 г. у БССР налічвалася 1490 прамысловых прадпрыемстваў. Агульны аб'ём прадукцыі беларускай прамысловасці ў 1985 г. перавысіў узровень 1940 г. у 38 разоў.

Карэнным чынам змянілася *структура прамысловасці* БССР. Асноўнымі яе галінамі сталі наступныя:

- *хімічная прамысловасць, вытворчасць мінеральных угнаенняў і хімічных валокнаў*; буйнейшыя прадпрыемствы: *калійныя камбінаты вытворчага аб'яднання "Беларуськалій" у Салігорску*, *азотна-тукавы завод "Азот" у Гродне*, *Магілёўскі камбінат "Хімвалакно"*, *Наваполацкі завод "Палімір"*, *Гомельскі хімічны завод*, *Светлагорскі завод штучнага валакна, Бабруйскі шынны завод, Лідскі лакафарбавы завод* і інш.;
- *нафтахімічная прамысловасць*; буйнейшыя прадпрыемствы: *Наваполацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы*; у 1964 г. пачалася *здабыча нафты ў раёне Рэчыцы*;
- *машынабудаўнічая і металаапрацоўчая прамысловасць*; буйнейшыя прадпрыемствы: *Мінскі трактарны завод, Мінскі аўтамабільны завод, Мінскі мотавелазавод, Мінскі завод аўтаматычыных ліній, Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіне, Беларускі металургічны завод у Жлобіне, Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання "Гомсельмаш"*;
- *электратэхнічная прамысловасць*; буйнейшыя прадпрыемствы: *завод "Вымяральнік" у Наваполацку, Мінскі завод тэлевізараў "Гарызонт", электралямпавы завод у Брэсце*.

Таксама развіваліся і іншыя галіны прамысловасці: лёгкая, дрэваапрацоўчая, будаўнічых матэрыялаў, гадзіннікавая, харчовая, гарбарная

і інш. У той жа час назіраліся дыспрапорцыі ў развіцці галін цяжкай прамысловасці і галін, якія забяспечвалі вытворчасць тавараў масавага спажывання. Так, за 1970–1985 гг. вытворчасць прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўчай прамысловасці ўзрасла ў 5,4 раза, галін па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны – 1,9 раза.

Захоўваўся пастаянны штогадовы *рост аб'ёмаў прамысловай прадукцыі*. У другой палове 1950-х – першай палове 1970-х гг. тэмпы росту вытворчасці складалі каля 10-12% штогод. Толькі з сярэдзіны 1970-х гг. назіраецца паступовае зніжэнне тэмпаў росту аб'ёмаў вытворчасці (у першай палове 1980-х гг. яны склалі 5,4% у год). Тэмпы росту аб'ёмаў вытворчасці і прадукцыйнасці працы ў БССР былі вышэйшымі, чым у цэлым у СССР.

У другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. значна ўзмацнілася *паліўна-энергетычная база прамысловасці* БССР. Пабудаваны новыя магутныя электрастанцыі: *Васілевіцкая ДРЭС, Лукомская ДРЭС, Бярозаўская ДРЭС* і інш. У паліўным балансе прамысловай вытворчасці значна ўзрасла доля найбольш эканамічных відаў паліва – нафты і газа.

У разглядаемы перыяд склалася *спецыялізацыя БССР у сістэме агульнасаюзнага падзелу працы*. Так, на 1976 г. удзельная вага БССР у агульнасаюзнай вытворчасці мінеральных угнаенняў складала 12,4%, у тым ліку калійных – 42,8%, хімічных валокнаў – 15,7%, трактароў – 15,4%, металарэзных станкоў – 14,1%, падшыпнікаў – 13,9%, гадзіннікаў – 12,6%, ільняных тканін – 10,7%, тэлевізараў – 7,6%, грузавых аўтамабіляў – 5,2%. За прамысловасцю БССР замацаваўся статус "зборачнага цэха" савецкай індустрыі. Спецыялізацыя прамысловасці БССР абумовіла інтэнсіфікацыю вытворчых сувязяў беларускіх прадпрыемстваў у межах СССР. У працэсе ўнутрысаюзнага пераразмеркавання БССР атрымлівала з Расіі, Украіны і іншых рэспублік СССР прамысловае абсталяванне, сталь, чугун, каштоўныя металы, бавоўну і г.д. Асабліва вялікай была залежнасць ад паставак энерганосьбітаў – нафты, газу, вугалю.

Адбываўся рост і *знешнеэканамічных сувязяў* беларускіх прадпрыемстваў. Калі ў 1956 г. падобныя сувязі мелі звыш 100 прамысловых прадпрыемстваў, то ў 1985 г. – каля 300. На экспарт накіроўваліся перш за ўсё трактары, грузавыя аўтамабілі, камбайны, калійныя ўгнаенні. Імпартавалася галоўным чынам прамысловае абсталяванне. Асноўнымі знешнегандлёвымі партнёрамі выступалі краіны т.зв. "*сацыялістычнага лагеру*" (Польшча, ГДР, Чэхаславакія, Венгрыя, Румынія, Балгарыя). Аднак у цэлым знешнеэканамічная дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў БССР развівалася даволі павольна. Гэта было абумоўлена тым, што дадзеная дзейнасць ажыццяўлялася і рэгламентавалася адпаведнымі саюзнымі ведамствамі, самі прадпрыемствы атрымлівалі нязначныя адлічэнні ад знешнегандлёвых аперацый.

Развіццё прамысловасці і вытворчых сувязяў стымулявала таксама развіццё *транспарту*. Галоўнымі відамі транспарту заставаліся чыгуначны, аўтамабільны, водны і паветраны. Адбывалася тэхнічнае ўдасканаленне чыгуначнага транспарту: электрыфікацыя асноўнай чыгуначнай лініі Брэст –

Масква і некаторых іншых участкаў, замена паравозаў цеплавозамі і электравозамі. Аб’ём чыгуначных перавозак за 1960 – 1985 гг. узрос амаль у 3 разы, пасажырскіх – у 4 разы. Імкліва развіваўся аўтамабільны транспарт: за перыяд 1960 – 1985 гг. агульны аб’ём перавозак узрос у 6 разоў. Істотна пашырыліся перавозкі пасажыраў аўтобусамі агульнага карыстання. На ўнутрыгарадскіх перавозках выкарыстоўваліся трамваі. З 1960 г. у Мінску, а затым і ў шэрагу іншых гарадоў з’явіліся тралейбусы; з 1984 г. у Мінску пачало дзейнічаць метро. Пастутова пашыраліся перавозкі пасажыраў і грузаў паветраным транспартам; авіяцыя выкарыстоўвалася ў авіяхімічных работах у сельскай і лясной гаспадарцы.

З 1960 г. у БССР з’яўляецца новы від транспарту – *трубаправодны*. Будуецца сетка газа- і нафтапровадаў, якія забяспечваюць адпаведнымі відамі паліва гарады і прадпрыемствы Беларусі, пастаўляюць сыравіну для нафтахімічных прадпрыемстваў, звязваюць радовішчы энерганосьбітаў СССР з краінамі Еўропы (“Дружба” і інш.).

У найбольш эканамічна развітых краінах свету з сярэдзіны 20 ст. хутка развіваецца *навукова-тэхнічная рэвалюцыя*, г.зн. *карэнная, якасная перабудова вытворчых сіл на аснове ператварэння навукі ў вядучы фактар развіцця вытворчасці*. У развіцці навукова-тэхнічнай рэвалюцыі можна вылучыць некалькі *напрамкаў*:

- комплексная аўтаматызацыя вытворчасці, а таксама кантролю і кіравання ёю;
- адкрыццё і выкарыстанне новых відаў энергіі;
- стварэнне і прымяненне новых матэрыялаў з загадзя вызначанымі ўласцівасцямі;
- стварэнне і развіццё інфармацыйных тэхналогій (з 1980-х гг. гэты напрамак становіцца вядучым).

Спецыфікай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР, як і ў цэлым у СССР, з’яўлялася тое, што яна пачалася тады, калі яшчэ працягвалася індустрыялізацыя. У гэтым умовах ажыцяўляюцца крокі, накіраваныя на *комплексную механізацыю і аўтаматызацыю прамысловай вытворчасці*. З’явіліся станкі з лікавым праграмным кіраваннем, станкі-аўтаматы, робататэхніка, пачынаюць укараняцца электронна-вылічальныя машыны. Аднак у той жа час комплексная механізацыя і аўтаматызацыя ахоплівалі ўсяго 10-15% прадпрыемстваў БССР; удзельная вага ручной працы ў прамысловасці складала 35 – 40%, у будаўніцтве – 50–55%. Гэта прыводзіла да якаснага адставання прамысловай прадукцыі БССР і СССР у цэлым ад перадавых краін Захаду. Прычынамі такой сітуацыі з’яўляліся:

- панаванне цэнтралізаванай камандна-адміністрацыйнай сістэмы кіравання эканомікай, якая перашкаджала хуткаму ўкараненню тэхналагічных інавацый;
- арыентацыя агульнасаюзнай эканомікі перадусім на атрыманне даходаў ад экспарту сыравіны (асабліва ў 1970-я гг. ва ўмовах значнага росту цэн на нафту і газ на сусветным рынку), у сувязі з чым недаацэньвалася значэнне тэхнічнай мадэрнізацыі прамысловасці;

- недастатковае фінансаванне навукі (у 1958 г. доля асігнаванняў на навуку ў БССР складала толькі 2,2% нацыянальнага даходу), што не садзейнічала цеснаму ўзаемадзеянню навукі і вытворчасці.

У другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. некалькі разоў праводзіліся рэформы, накіраваныя на ўдасканаленне дадзенай сістэмы.

У 1957 г. была зроблена спроба пераходу ад галіновага да тэрытарыяльнага кіравання прамысловасцю. Былі скасаваны створаныя ў часы сталінізму большасць агульнасаюзных міністэрстваў, якія кіравалі асобнымі галінамі прамысловасці, а замест іх у буйных адміністрацыйных раёнах створаны саветы народнай гаспадаркі (саўнаргасы). У Беларусі быў утвораны *Савет народнай гаспадаркі БССР*. Гэта прывяло да павелічэння гаспадарчай самастойнасці БССР у межах СССР.

Аднак разам з тым дзяржаўныя ведамствы працягвалі дробязна кантраляваць працэс вытворчасці і размеркавання прамысловай прадукцыі. Такая празмерная цэнтралізацыя прывяла да *пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў 1962-1965 гг.*, што адлюстравалася ў зніжэнні тэмпаў росту прамысловай прадукцыі, рэнтабельнасці прадпрыемтваў, росце цэн на тавары масавага ўжытку. Дадзеная сітуацыя ў значнай ступені абумовіла адхіленне ад улады М. Хрушчова.

Новае палітычнае кіраўніцтва пачало ажыццяўленне *эканамічнай рэформы 1965 г.*, якая атрымала назву *касыгінскай* (ад імя старшыні міністраў СССР А. Касыгіна). Яна прадугледжвала наступныя мерапрыемствы:

- *змена сістэмы планавання ў прамысловасці*: калі раней прамысловыя прадпрыемствы былі абавязаны выконваць звыш 100 вызначаных дзяржаўнымі ўстановамі планавых паказчыкаў, то ў выніку рэформы толькі 8 (у першую чаргу аб'ём рэалізаванай прадукцыі), а астатнія паказчыкі прадпрыемствы маглі планаваць самастойна;
- *увядзенне гаспадарчага разліку*: прадпрыемствам дазвалялася права свабодна распараджацца часткай прыбытку, ствараць грашовыя фонды для развіцця вытворчасці, матэрыяльнага заахвочвання і сацыяльнай сферы;
- *змены ў арганізацыі кіравання прамысловасцю*: былі ліквідаваны саўнаргасы і адноўлены агульнасаюзныя міністэрствы па галінах прамысловасці.

Касыгінская эканамічная рэформа пашырыла гаспадарчую самастойнасць прамысловых прадпрыемстваў. Яна прывяла да значнага павелічэння тэмпаў росту аб'ёмаў прамысловай прадукцыі ў другой палове 1960-х – першай палове 1970-х гг. Аднак да сярэдзіны 1970-х гг. у ажыццяўленне рэформы былі ўведзены шматлікія карэкціроўкі, у выніку якіх адбыўся ў пэўнай ступені зварот да дарэформеннай звышцэнтралізаванай сістэмы кіравання эканомікай. У выніку з канца 1970-х гг. назіраецца прыкметнае зніжэнне тэмпаў росту аб'ёмаў прамысловай вытворчасці.

### 23.2.2. Сельская гаспадарка

У другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. назіраюцца значныя зрухі ў развіцці сельскай гаспадаркі БССР.

Пасля смерці І. Сталіна ў 1953 г. партыйна-дзяржаўныя ўлады прынялі курс на збалансаванае развіццё прамысловасці і сельскай гаспадаркі. У 1950-я гг. былі праведзены *мерапрыемствы, накіраваныя на падняцце ўзроўню сельскай гаспадаркі*:

- павелічэнне капіталаўкладанняў у сельскую гаспадарку;
- павышэнне закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадцкцыю ў 2-5 разоў;
- зніжэнне абавязковых паставак селькагаспадарчай прадукцыі з боку калгасаў; адмена абавязковых паставак і грашовага падатку з асабістых гаспадарак калгаснікаў;
- ліквідацыя машынна-трактарных станцый і передача сельскагаспадарчай тэхнікі калгасам;
- паляпшэнне матэрыяльнага і юрыдычнага становішча калгаснікаў: у 1956 г. уведзена абавязковая заработная плата ў калгасах; з 1956 г. калгаснікам пачалі выдаваць пашпарты.

Дадзеныя мерапрыемствы прывялі да station станоўчых зрухаў у сельскай гаспадарцы: у1960 г. валавы збор збожжа ў БССР павялічыўся ў параўнанні з 1953 г. на 47%, вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі – на 70%, вырасла ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, узрасла колькасць сельскагаспадарчай тэхнікі.

Аднак *у першай палове 1960-х гг.* назіралася запавольванне тэмпаў росту аб’ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці; па асобных сектарах вытворчасці нават адбывался зніжэнне аб’ёмаў. Гэта было выклікана шэрагам фактараў:

- зніжэнне цэн на харчовую сыравіну на сусветным рынку;
- празмерная цэнтралізацыя кіравання сельскай гаспадаркай;
- валюнтарызм ў аграрнай палітыцы М. Хрушчова (канцэнтрацыя на асваенні цалінных зямель у Казахстане, Сібіры, Паволжы і на Алтаі пры недастатковай увазе да развіцця традыцыйных збожжавых рэгіёнаў, насаджэнне вырошчвання кукурузы амаль па ўсёй тэрыторыі СССР);
- увядзенне абежаванняў на ўтрыманне хатняй жывёлы ў падсобных асабістых гаспадарках.

У адпаведнасці з *эканамічнай рэформай 1965 г.* быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на паскарэнне развіцця аграрнага сектара:

- *змена сістэмы нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі*: увядзенне цвёрдага нязменнага плана нарыхтовак на пяць гадоў наперад для кожнага калгаса, саўгаса, раёна, вобласці, рэспублікі (раней планы даводзіліся толькі на адзін год, на працягу якога не аднойчы павышаліся);
- *павышэнне закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю ў 1,5-2 разы*;
- *зняцце абмежаванняў на ўтрыманне хатняй жывёлы ў падсобных асабістых гаспадарках*;
- *умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў*: пастаўка вялікай колькасці тэхнікі, спісанне часткі даўгоў;
- *дзяржаўныя капіталаўкладанні* ў меліярацыю, вапнаванне кіслых глеб, паляпшэнне лугоў і пашаў;

- *змяншэнне рэгламентацыі гаспадарчай дзейнасці калгасаў з боку партыйна-дзяржаўных органаў*;

- *увядзенне гарантаванай грашовай аплаты працы калгаснікаў, пенсійнага і сацыяльнага забеспячэння, прафсаюзаў*.

Праведзеныя мерапрыемствы мелі наступныя *вынікі*:

1) *Інтэнсіфікацыя аграрнай вытворчасці*: На працягу 1965 – 1985 гг. аб'ём валавой сельскагаспадарчай прадукцыі ўзрос у 1,6 раза, значна павялічылася ўраджайнасць. Пры гэтым сярэднегадовыя тэмпы росту сельскагаспадарчай вытворчасці складалі 11-14% (у той час як у СССР у цэлым 6-13%).

2) *Тэхнічная мадэрнізацыя*: на працягу 1955-1985 гг. колькасць трактароў у калгасах узрасла з 21 тыс. да 131 тыс., грузавых аўтамабіляў – з 16,5 тыс. да 88 тыс., збожжаўборачных камбайнаў – з 8 да 35 тыс.; з'явіліся камбайны на ўборцы бульбы, буракоў, ільну, траў, сельскагаспадарчая авіяцыя і г.д.

3) *Электрыфікацыя сельскай гаспадаркі і вёсак*: на пачатку 1980-х гг. механічныя рухавікі забяспечвалі 99% энергетычных магутнасцей.

4) *Хімізацыя сельскай гаспадаркі*: колькасць выкарыстаных мінеральных угнаенняў павялічылася за 1960 – 1985 гг. з 952 тыс. да 7,3 млн. тон.

5) *Меліярацыя забалочаных глеб*: асушана каля 30% агульнай плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў.

6) *Паглыбленне спецыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР* на такіх галінах як малочная і мясная жывёлагадоўля, вытворчасць бульбы, ільну і цукровых буракоў.

7) *Узрастанне колькасці кваліфікаваных кадраў у сельскай гаспадарцы*: на працягу 1960 – 1980 гг. з 14,8 тыс. да 88 тыс.

Аднак ва ўмовах хуткага дэмаграфічнага росту павелічэнне прадукцыі сельскай гаспадаркі ў разліку на душу насельніцтва было нязначным; узровень вытворчасці значна саступаў стандартам эканамічна развітых краін. Да таго звесткі афіцыйнай статыстыкі часта завышаліся; у перыяд "застою" у сельскай гаспадарцы распаўсюдзіліся прыпіскі, крадзяжы, страты пры транспарціроўцы, перапрацоўцы і захоўванні прадукцыі. У выніку сельская гаспадарка краіны была не ў стане цалкам забяспечыць патрэбы насельніцтва ў харчаванні; у другой палове 1970-х – першай палове 1980-х гг. значна павялічыўся імпарт сельскагаспадарчай прадукцыі.

### 23.2.3.Сацыяльнае развіццё.

Індустрыялізацыя і значны эканамічны рост прывялі да істотных змен у сацыяльнай структуры грамадства. Хуткімі тэмпамі ажыццяўлялася *урбанізацыя*. За 1960 – 1985 гг. удзельная вага гарадскога насельніцтва БССР павялічылася з 32% да 62%.

Характэрнай з'явай у дынаміцы *сацыяльнай структуры грамадства* выступае хуткі рост рабочага класа і служачых. Удзельная вага рабочых сярод занятага насельніцтва за 1960 – 1985 гг. павялічылася з 45% да 60%, служачых – з 14,6% да 25,4%. У той жа час удзельная вага калгаснікаў зменшылася за гэты перыяд з 40,4% да 14,6%. Разам з тым павялічваецца

грамадскае значэнне *партыйна-дзяржаўнай бюракратыі* (*наменклатуры)*. Толькі за 1970 – 1987 гг. колькасць партыйна-дзяржаўнага апарату ўзрасла з 435 тыс. да 695 тыс. чалавек; расходы на яго ўтрыманне за 1960 – 1985 гг. павялічыліся ў 3 разы. Абапіраючыся на ўладныя паўнамоцтвы, бюракратычная эліта пашырала свае прывілеі ў сферы медыцынскага, жыллёва-камунальнага абслугоўвання, матэрыяльнага забеспячэння і г.д.

На працягу другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг. эканамічны ўздым суправаджаўся павышэннем матэрыяльнага ўзроўню жыцця насельніцтва. У перыяд "хрушчоўскай адлігі" быў прыняты шэраг *заканадаўчых актаў*, накіраваных на аслабленне эксплуатацыі працоўных:

- скасаванне крымінальнай адказнасці за парушэнні працоўнай дысцыпліны і абмежаванняў на свабодную змены месца працы (1956);
- пераход на 5-дзённы працоўны тыдзень (1957);
- устанаўленне мінімальных памераў пенсій (1956);
- адмена абавязковых аблігацыйных займаў (1957);
- зніжэнне падаткаў з насельніцтва.

*Паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва* адлюстроўваюць наступныя з'явы:

1) *Павышэнне рэальных даходаў насельніцтва* за 1960 – 1985 гг. у 3 разы. Пры гэтым характэрнай выступае тэндэнцыя да ўраўнавання даходаў розных сацыяльных груп працоўных (так, калі ў 1970 г. заработная плата калгаснікаў складала 53% ад заробкаў рабочых і служачых, то ў 1985 г. – 89%). Разам з тым сярэдні ўзровень даходаў насельніцтва БССР быў ніжэйшы ў параўнанні з агульнасавецкім (91% на 1985 г.).

2) *Фарміраванне сістэмы гарантаванага пенсійнага забеспячэння*: з 1967 г. пенсійнае забеспячэнне стала ўсеагульным.

3) *Рост грамадскіх фондаў спажывання*: дзяржава аплочвала 2/3 выдаткаў грамадзян на жыллё, выплату пенсій, адукацыю, медыцынскае абслугоўванне, культурную сферу і г.д.

4) *Рост жыллёва-камунальнага будаўніцтва*: за 1956 – 1985 гг. у БССР пабудавана 120 млн. $м^2$ жылля.

5) *Развіццё сістэмы сувязі*: рост прадпрыемстваў пошты, тэлеграфа і тэлефона, значнае павелічэнне колькасці персанальных тэлефонных апаратаў, масавае з'яўленне ў быту радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў.

6) *Развіццё сістэмы аховы здароўя*. Ужо ў сярэдзіне 1960-х гг. працягласць жыцця ў БССР складала 73 гады, значна знізілася смяротнасць, павялічыўся прырост насельніцтва.

Паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва, высокі ўзровень рэгулявання дзяржавай сацыяльнага развіцця дазваляюць сцвярджаць пра фарміраванне ў БССР мадэлі "*сацыяльнай дзяржавы*". Яе ажыццяўленне прывяло да істотнага змяншэння сацыяльнай напружанасці ў грамадстве. У той жа час узровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва ў БССР, як і ў цэлым у СССР, быў ніжэйшы ў параўнанні з развітымі краінамі Захаду.

***Сітуацыя "застою" ў эканоміцы***

На мяжы 1970-1980-х гг. у эканоміцы БССР, як і СССР у цэлым, назіраецца ўзрастанне праблем, што прыводзіць да сітуацыі “*застою*”. Яна характарызавалася наступнымі рысамі:

- зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту (у СССР у цэлым у першай палове 1980-х гг. ён склаў 3,6%, у БССР – 5% у год);
- рост цэн на тавары і паслугі;
- рост дэфіцыту прадметаў масавага спажывання.

У гэтых умовах адбывалася замаруджванне росту рэальных даходаў насельніцтва, распаўсюдзіліся крадзяжы, карупцыя, схаванае беспрацоўе, “ценявая эканоміка”. Рост прывілеяў партыйна-дзяржаўнай бюракратыі ў дадзеных умовах прыводзіў да нарастання сацыяльнай напружанасці.

Асноўныя *прычыны* ўзнікнення “застою” ў эканоміцы:

- узрастанне неканкурэнтаздольнасці прадукцыі савецкай вытворчасці на сусветным рынку ва ўмовах маруднага засваення дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі;
- вялікія выдаткі на развіццё ваенна-прамысловага комплексу, “гонка ўзбраенняў” ва ўмовах “халоднай вайны”;
- значнае падзенне цэн на нафту і газ на сусветным рынку ў першай палове 1980-х гг.

***Вынікі***

*Такім чынам, на працягу другой паловы 1950-х – першай паловы 1980-х гг. Беларусь ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку. Завяршылася індустрыялізацыя, пачалося выкарыстанне ў вытворчасці дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Эканамічны рост суправаджаўся павышэннем матэрыяльнага ўзроўню жыцця насельніцтва. Разам з тым да сярэдзіны 1980-х гг. стала заўважным нарастанне эканамічных цяжкасцяў, што было выклікана вычарпаннем рэсурсаў камандна-адміністрацыйнай сістэмы для забеспячэння стабільнага эканамічнага росту.*

### 23.3. Адукацыя, навука, культура ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.

*Развіццё духоўнай сферы беларускага грамадства ў разглядаемы перыяд вызначаецца наступнымі рысамі*:

- прыстасаванне да ўмоў індустрыяльнага грамадства;
- падпарадкаванне афіцыйнай партыйна-дзяржаўнай ідэалогіі;
- паслабленне рэпрэсіўнасці з боку дзяржавы;
- русіфікацыя адукацыі і культуры.

Ва ўмовах хуткай мадэрнізацыі грамадства адбываюцца істотныя зрухі ў сферы *адукацыі*. У галіне агульнаадукацыйнай школы была праведзена рэформа, у адпаведнасці з якой базавыя сямігадовыя школы пераўтвараліся ў васьмігадовыя, а сярэднія – у адзінаццацігадовыя (з 1964 г. дзесяцігадовыя) з вытворчым навучаннем. Базавая агульная адукацыя з’яўлялася абавязковай. Масавы характар стала набываць атрыманне сярэдняй адукацыі: калі ў 1956 – 1960 гг. сярэднюю адукацыю штогод атрымлівала каля 69 тыс. чалавек, то ў

1981 – 1985 гг. – 169 тыс. Адметнымі рысамі ў развіцці агульнаадукацыйнай школы ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. з’яўляліся:

- умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы школ;

- павышэнне прафесійнага ўзроўню настаўніцкіх кадраў: удзельная вага настаўнікаў з вышэйшай адукацыяй павялічылася за 1958 – 1985 гг. з 22% да 81,4%;

- станаўленне сістэмы політэхнічнага навучання на базе цеснага спалучэння ў вывучэнні школьных прадметаў і асноў сучаснай вытворчасці.

У прафесійна-тэхнічнай адукацыі стваралася адзіная сістэма *прафесійна-тэхнічных вучылішчаў (ПТВ)*. У 1970-я гг. ПТВ пераходзяць да падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых з сярэдняй адукацыяй. У 1985 г. у БССР дзейнічала 233 ПТВ з 151 тыс. навучэнцаў.

Істотна ўзрасла ў разглядаемы перыяд колькасць устаноў *сярэдняй спецыяльнай адукацыі*: за 1960 – 1985 гг. – з 102 да 139, а колькасць навучэнцаў у іх – з 62,6 тыс. да 160,4 тыс. чалавек.

Развівалася таксама сістэма *вышэйшай адукацыі*. У 1985 г. у 33 вышэйшых навучальных установах БССР навучалася 182 тыс. студэнтаў. Колькасць выпускнікоў ВНУ павялічылася з 10 тыс. у 1960 г. да 31 тыс. у 1985 г. Па гэтым паказчыку ў разліку на душу насельніцтва рэспубліка займала адно з першых месц у Еўропе.

Практычным вынікам развіцця адукацыі ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. стаў значны *рост адукацыйнага ўзроўню насельніцтва*. За 1959 – 1985 гг. удзельнага вага асоб, якія мелі вышэйшую і сярэднюю адукацыю ў структуры насельніцтва павялічылася з 30% да 66%. У той жа час меліся і пэўныя *негатыўныя тэндэнцыі ў развіцці адукацыі*:

- фармалізм у арганізацыі працэсу навучання;

- недастатковае фінансаванне адукацыйнай сістэмы;

- русіфікацыя адукацыі: у БССР не было ніводнай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай навучальнай установы з беларускай мовай навучання; у сярэдзіне 1980-х гг. усяго каля 23% школ працавалі на беларускай мове (амаль усе ў сельскай мясцовасці).

Значныя зрухі ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. адбываюцца ў сферы *навукі*. Колькасць навуковых устаноў у БССР за 1956 – 1985 гг. вырасла з 76 да 167. Вядучая роля сярод іх належала навукова-даследчым інстытутам Акадэміі навук БССР. Значна павялічылася колькасць навуковых кадраў: лік навуковых работнікаў у БССР за 1956 – 1985 гг. узрос з 4,4 тыс. да 42,4 тыс. чалавек, з іх кандыдатаў навук – з 1,6 тыс. да 13,1 тыс., дактароў навук – са 134 да 1011 чалавек. Станоўчую ролю ў развіцці навукі адыграла спыненне масавых рэпрэсій і рэабілітацыя многіх рэпрэсіраваных у гады сталінізму навукоўцаў.

Ва ўмовах хуткай індустрыялізацыі, а таксама пачатку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі асабліваe значэнне набылі *прыродазнаўчыя і тэхнічныя навукі*. Найбольшыя дасягненні меліся ў наступных галінах навукі:

- матэматычныя навукі (тэорыя лікаў, алгебра, тэорыя інтэгральных ураўненняў, вылічальная матэматыка і г.д.);

- фізічныя навукі (фізіка элементарных часціц, спектраскапія, люмінісцэнцыя, квантавая электроніка, фізіка плазмы, цвёрдага цела, магнітных з'яў, паўправаднікоў, дыэлектрыкаў і г.д.);

- хімічныя навукі (хімія прыродных і высокамалекулярных злучэнняў, калоідная і аналітычна хімія);

- парашковая металургія;

- тэхнічная кібернетыка;

- геалогія;

- біялогія;

- сельскагаспадарчыя навукі.

Развіццё навукі ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі прыводзіла да ўсталявання цесных сувязяў паміж навукай і вытворчасцю. Да канца 1980-х гг. на прамысловых прадпрыемствах Беларусі налічвалася каля 2 тыс. *навуковых лабараторый*, у якіх працавала амаль 20 тыс. чалавек. Развіццю інтэграцыі навукі з вытворчасцю спрыяла стварэнне *навукова-вытворчых аб'яднанняў*. У 1974 г. упершыню ў СССР узнікла аб'яднанне "МАЗ-БПІ", куды ўвайшлі БелАЗ, МАЗ, Беларускі політэхнічны інстытут. Аднак у цэлым укараненне дасягненняў навукі ў вытворчым працэсе адбывалася павольна. Гэта тлумачылася наступнымі фактарамі:

- адсутнасць эканамічных стымулаў з боку прадпрыемстваў і арганізацый ва ўвядзенні новых распрацовак навукоўцаў;

- неэфектыўная сістэма ўкаранення навуковых распрацовак у вытворчасці;

- недастатковае фінансаванне навуковых даследаванняў.

Атрымалі сваё развіццё ў разглядаемы перыяд *сацыяльна-гуманітарныя навукі*, у першую чаргу філалогія, літаратуразнаўства, гісторыя, філасофія. Аднак яны ў большай ступені былі падпарадкаваны ідэалагічнаму кантролю з боку партыйна-дзяржаўных органаў улады.

У *мастацкай культуры* захоўваецца панаванне "сацыялістычнага рэалізму", партыйна-дзяржаўная цэнзура. Разам з тым назіраецца спалучэнне "сацыялістычнага рэалізму" з элементамі іншых мастацкіх накірункаў і стыляў. Спыніліся масавыя рэпрэіі супраць дзеячоў мастацкай культуры, вярнуліся да працы многія рэпрэсіраваныя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. Пачалі друкавацца многія раней забароненыя літаратурныя творы.

У межах *беларускай літаратуры* захаванне асноўных прынцыпаў "сацыялістычнага рэалізму" спалучалася з адыходам у дапушчальных межах ад бесканфліктнага адлюстравання рэчаіснасці, сцвярджэннем агульначалавечых маральных каштоўнасцяў, спробамі больш глыбокага пранікнення ў сутнасць сацыяльных працэсаў. Шэрагі Саюза пісьменнікаў БССР за 1959 – 1985 гг. павялічылася з 170 да 364 членаў. Буйнейшымі прадстаўнікамі беларускай літаратуры дадзенага перыяду з'яўляюцца *Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Пятрусь Броўка, Янка Брыль, Генадзь Бураўкін, Ніл Гілевіч, Уладзімір Караткевіч, Андрэй Макаёнак, Іван Мележ, Іван Навуменка, Барыс Сачанка, Максім Танк, Іван Чыгрынаў, Іван Шамякін* і інш. Асноўнымі тэмамі літаратурнай творчасці становяцца:

- падзеі Вялікай Айчыннай вайны;
- гісторыя Беларусі далёкага мінулага;
- сучаснае жыццё індустрыяльнага горада і вёскі;
- маральна-этычныя праблемы жыцця людзей.

У другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. атрымала далейшае развіццё беларускае *кіно*. Кожны год на кінастудыі "Беларусьфільм" выпускалася каля 70 фільмаў розных накірункаў. Мастацкая кінематаграфія звязана была перадусім з развіццём тэматыкі Вялікай Айчыннай вайны на аснове твораў беларускіх літаратараў.

Разглядаемы перыяд адзначаецца развіццём *тэатральнага мастацтва*. Колькасць тэатраў у БССР за 1960 – 1985 гг. павялічылася з 11 да 17 (2 музычныя, 6 лялечных, 9 драматычных). У рэпертуары тэатраў пераважалі творы беларускіх драматургаў, рускіх і сусветных класікаў, савецкіх аўтараў. Сусветнае прызнанне атрымлівае *балетная трупа Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета пад кіраўніцтвам В.Елізар'ева*.

*Музычнае мастацтва* адзначаецца перш за ўсё развіццём жанраў сімфоніі і інструментальнай музыкі (кампазітары У.Алоўнікаў, М.Аладаў, А.Багатыроў, І.Лучанок, У.Мулявін, П.Падкавыраў, Я.Цікоцкі). Наладжваецца цеснае супрацоўніцтва з тэатрамі (оперы М.Аладава, Дз.Лукаса, Р.Пукста, Дз.Смольскага, Ю.Семянякі). Кампазітары звяртаюцца да тэматыкі Вяліай Айчыннай вайны, увасаблення вобразаў рэальных гістарычных асоб. У 1970-1980-я гг. з'яўляюцца новыя тыпы музычных і танцавальных калектываў (вакальна-інструментальныя ансамблі "Песняры", "Верасы", "Сябры", фальклорна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі").

*Выяўленчае мастацтва* характарызуеца спалучэннем панавання "сацыялістычнага рэалізму" з выкарыстаннем новых мастацкіх прыёмаў. Дамінуючай з'яўлялася тэматычная карціна. Найбольш вядомымі мастакамі гэтага перыяду былі Г. Вашчанка, В. Волкаў, Ф. Дарашэвіч, А. Малішэўскі В. Стальмашонак, М. Савіцкі, В. Цвірко, Л. Шчамялёў і інш. Асноўнымі жанрамі жывапісу выступалі:
- адлюстраванне падзей Вялікай Айчыннай вайны;
- гісторыка-рэвалюцыйны;
- партрэтны;
- гарадскі пейзаж;
- бытавы жанр;
- нацюрморт.

*Беларуская графіка* прадстаўлена серыямі па гісторыі і сучаснасці, з выкарыстаннем розных прыёмаў (работы У.Басалыгі, С.Геруса, В.Шаранговіча). Дасягненнем *скульптурнага мастацтва* з'явіліся работы З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, А. Грубэ, С. Селіханава і інш. Найбольш вядомымі помнікамі беларускіх скульптараў сталі мемарыяльныя ансамблі і комплексы (гарэльефы для манумента Перамогі ў Мінску, комплексы "Хатынь", "Брэсцкая крэпасць-герой" і г.д.).

Значныя змены адбываюцца ў гэты час у *архітэктуры*. Пачынаецца масавае будаўніцтва жылля; распрацоўваюцца генпланы забудовы гарадоў, у

якіх плануецца месца пад цэлыя жылыя раёны і мікрараёны. Распаўсюджваецца буйнапанэльнае будаўніцтва, будаўніцтва буйных прамысловых комплексаў.

Пашыраюцца *кнігавыдавецтва* і *перыядычны друк*. У той жа час адзначаецца ўзмацненне русіфікацыі ў сферы духоўнай культуры: беларускамоўная друкаваная прадукцыя ў 1985 г. складала ўсяго 32%.

Пасля смерці І. Сталіна адбылося некаторае аслабленне рэпрэсій у адносінах да *рэлігійных арганізацый* розных канфесій. У той жа час на працягу разглядаемага перыяду, асабліва падчас праўлення М. Хрушчова, шырока практыкаваліся закрыццё і нават знішчэнне культавых будынкаў, дыскрымінацыя прадстаўнікоў духавенства. Удзел у дзейнасці рэлігійных арганізацый мог стаць істотнай перашкодай у прафесійнай кар'еры.

*Такім чынам, у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі дасягнуты значныя поспехі ў развіцці адукацыі, навукі і культуры, якія трапілі ў адпаведнасць са стандартамі індустрыяльнага грамадства. У той жа час панаванне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы істотным чынам замаруджвала далейшае развіццё духоўнай сферы жыцця грамадства, садзейнічала аслабленню элементаў нацыянальнай культуры.*

## 23.4. Перабудова ў БССР (1985-1991 гг.).

Перыяд 1985–1991 гг. у БССР, як і ў цэлым у СССР, адзначаны правядзеннем карэнных сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў, якія ў выніку прывялі да ліквідацыі ўлады КПСС, распаду СССР і фарміравання незалежнай беларускай дзяржавы. Дадзены перыяд увайшоў у гісторыю пад назвай *перабудовы* і супадае па часе з перыядам знаходжання на чале ўлады ў СССР апошняга генеральнага сакратара ЦК КПСС *Міхаіла Гарбачова*. Правядзенне перабудовы было выклікана абвастрэннем шэрагу *сацыяльных праблем*:

1) *Праблема дзяржаўна-палітычнага ўладкавання*. У СССР уся рэальная ўлада належала чыноўнікам партыйна-дзяржаўнага апарату. Былі абмежаваны грамадзянскія і практычна адсутнічалі палітычныя свабоды. Фарміраванне індустрыяльнага грамадства, якое суправаджалася агульным павышэннем матэрыяльнага, адукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва, патрабавала дэмакратызацыі сацыяльна-палітычнай сістэмы.

2) *Сацыяльна-эканамічная праблема*: Ва ўмовах індустрыялізацыі былі створаны новыя развітыя прадукцыйныя сілы. Далейшае іх развіццё патрабавала актыўнага засваення вынікаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Вытворчыя адносіны, заснаваныя на строга цэнтралізаванай каманднa-адміністрацыйнай сістэме кіравання эканомікай, не адпавядалі гэтым патрэбам, замаруджвалі развіццё тэхнічнага прагрэсу.

3) *Нацыянальная праблема*: Па меры развіцця нацый ва ўмовах індустрыяльнага грамадства абвастраліся супярэчнасці паміж імперскай палітыкай саюзнага кіраўніцтва і інтарэсамі асобных рэспублік і рэгіёнаў у складзе СССР. Да сярэдзіны 1980-х гг. адбываецца фарміраванне моцных мясцовых нацыянальных эліт (бюракратычных, гаспадарчых, навукова-

культурных), а потым адпаведных нацыянальных рухаў, якія выступалі за павышэнне самастойнасці нацыянальных рэгіёнаў у складзе СССР або за стварэнне незалежных дзяржаў.

*Ажыццяўленне перабудовы прайшло праз тры асноўныя этапы:*

*Першы этап* ахоплівае 1985–1987 гг. Для яго характэрна арыентацыя на частковае ўдасканаленне існуючай сацыяльна-эканамічнай сістэмы пры захаванні манаполіі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў палітычным жыцці. Дадзены этап перабудовы вызначаўся як "*курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця*", канцэпцыя якога была ўхвалена на красавіцкім пленуме ЦК КПСС 1985 г. і XXVII з'ездзе КПСС 1986 г. Яе галоўнай задачай абвяшчалася тэхнічная мадэрнізацыя эканомікі на аснове дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, асабліва ў галіне машынабудавання. На аснове дадзенай канцэпцыі былі праведзены наступныя пераўтварэнні:

- павелічэнне фінансавання перспектыўных галін эканомікі;
- пашырэнне гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў шляхам увядзення гаспадарчага разліку і *самафінасавання*.

Аднак, нягледзячы на захаванне штогадовага росту аб'ёмаў вытворчасці, істотнага прагрэсу ў эканамічным жыцці ў выніку рэалізацыі дадзенага курсу не адбылося. Гэта тлумачыцца шэрагам прычын:

- рост інфляцыі;
- аварыя на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка 1986 г. і звязаныя з ёй велізарныя матэрыяльныя страты і выдаткі (радыенуклідамі забруджана каля 20% тэрыторыі БССР, прыйшло ў непрыгоднасць каля 300 тыс. га сельскагаспадарчых угоддзяў, значная частка насельніцтва была выселена з забруджанай зоны);
- падзенне ў 2-3 разы цэн на нафту і газ на сусветным рынку;
- няўменне і нежаданне партыйна-дзяржаўнага апарату выкарыстоўваць новыя метады кіравання эканомікай.

*Другі этап* перабудовы ахоплівае 1987 – 1989 гг. Ён характарызуецца радыкалізацыяй сацыяльна-эканамічных рэформ і пачаткам правядзення рэформ у сацыяльна-палітычнай сферы. Абвяшчаецца пераход да т.зв. "*гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму*". У *сацыяльна-эканамічнай галіне* ў гэты перыяд праводзіліся наступныя рэформы:

- увядзенне элементаў рыначнай эканомікі ў сістэме тавараабмену дзяржаўных прадпрыемстваў (прадпрыемствы пастаўлялі на аснове абавязковага т.зв. дзярзаказу асноўную частку прадукцыі, астатняя частка магла рэалізоўвацца па свабодных цэнах);
- умацаванне гаспадарчага разліку, самафінансавання і самакіравання прадпрыемстваў (прадпрыемствы атрымалі магчымасць самастойна вызначаць колькасць работнікаў, узровень заработнай платы, выбіраць эканамічных партнёраў);
- увядзенне элементаў саўдзелу рабочых у кіраванні прадпрыемтвамі (права выбараў працоўнымі калектывамі кіраўнікоў прадпрыемстваў, справаздачнасць адміністрацыі перад саветамі працоўных калектываў);

- стварэнне недзяржаўнага сектара эканомікі ў форме кааперацыі і арэнды;

- канверсія вытворчасці ваенна-прамысловага комплекса.

Аднак увядзенне элементаў рыначнай эканомікі праходзіла марудна. Захоўваўся кантроль міністэрстваў і ведамстваў над вытворчасцю. Кааператыўны сектар ва ўмовах высокіх падаткаў і цэн на сыравіну і матэрыялы ўяўляў з сябе пераважна спекулятыўны гандаль дэфіцытнымі таварамі. На працягу дадзенага этапу захоўваўся і нават некалькі павялічыўся рост аб'ёмаў прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак негатыўныя фактары, якія мелі месца на першым этапе перабудовы, захаваліся і садзейнічалі нарастанню гаспадарчых цяжкасцяў.

У *сацыяльна-палітычнай сферы* адбываецца працэс дэмакратызацыі. Яе пачаткам стала абвяшчэнне палітыкі *галоснасці* на XIX партканферэнцыі ў чэрвені 1988 г. Яна ўключала ў сябе наступныя элементы:

- абмежаванне цэнзуры ў сродках масавай інфармацыі, публікацыя раней забароненых твораў, з'яўленне крытычных матэрыялаў у прэсе;

- кампанія па асуджэнні злачынстваў сталінізму, правядзенне масавай рэабілітацыі ахвяр сталінскіх рэпрэсій;

- легалізацыя дзейнасці незалежных грамадскіх арганізацый.

Кіраўніцтва СССР на чале з М. Гарбачовым імкнулася выкарыстаць палітыку галоснасці для абмежавання ўплыву той часткі партыйна-дзяржаўнага бюракратычнага апарату, якая выступала супраць правядзення ў краіне сацыяльна-эканамічных рэформ, абвяшчалася "тормазам перабудовы".

У той жа час была абвешчана *рэформа сістэмы палітычнай улады*. У канцы 1988 г. унесены папраўкі ў Канстытуцыю СССР, у адпаведнасці з якімі вышэйшым органам заканадаўчай улады станавіўся *з'езд народных дэпутатаў СССР*, які фарміраваў Вярхоўны Савет СССР. Тады ж быў прыняты новы выбарчы закон, паводле якога прадугледжваліся свабодныя выбары ва ўсе органы прадстаўнічай улады на альтэрнатыўнай аснове; разам з тым 1/3 месц у дадзеных органах рэзервавалася для прадстаўнікоў дзяржаўных грамадскіх арганізацый. У сакавіку 1989 г. адбыліся выбары ў I з'езд народных дэпутатаў СССР, 60 дэпутатаў якога былі абраны ад БССР. Пашыраюцца ўладныя функцыі Саветаў і іх выканаўчых камітэтаў; яны паступова вызваляюцца з-пад апекі партыйных органаў. У галіне міжнароднай палітыкі хутка адбываецца адыход ад канфрантацыі з краінамі Захаду да партнёрскіх адносін, што азначала канец "халоднай вайны".

Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва БССР на чале з першым сакратаром ЦК КПБ *Я. Сакаловым* (1987–1990) займала больш кансерватыўныя пазіцыі ў параўнанні з саюзным кіраўніцтвам і крытычна ставілася да хуткіх палітычных пераўтварэнняў. Разам з тым у БССР, як і ў цэлым у СССР, палітыка галоснасці прывяла да імклівага фарміравання грамадзянскай супольнасці: узнікалі грамадзянскія ініцыятывы, ствараліся дыскусійныя і рабочыя клубы, грамадскія арганізацыі.

Першапачаткова грамадскі рух развіваўся ў рэчышчы падтрымкі перабудовы. Аднак паступова яго радыкальная частка пераходзіць у апазіцыю

да ўлады. Яе прадстаўнікі ў чэрвені 1989 г. стварылі *Беларускі народны фронт (БНФ)* з мэтай дасягнення нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту і паглыблення дэмакратычных пераўтварэнняў у грамадстве.

*Трэці этап* перабудовы ахоплівае 1989–1991 гг., які можна ахарактарызаваць як *крызіс перабудовы*. У гэты перыяд у СССР пачынаецца глыбокі *сацыяльна-эканамічны крызіс*. Яго прыкметамі сталі:

- значны спад аб'ёмаў вытворчасці ва ўсіх галінах эканомікі (за 1989-1991 гг. у цэлым па СССР падзенне нацыянальнага даходу склала 33%);
- хуткі рост цэн, інфляцыя;
- узрастанне дэфіцыту на асноўныя тавары (у 1990 г. уводзіцца картачная сістэма на продаж шэрагу прадуктаў);
- імклівы рост "ценевай эканомікі", спекуляцыі.

*Прычынамі крызісу* сталі:

- няўменне бюракратычнага апарату спалучаць метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі з механізмамі рыначнай эканомікі;
- распад традыцыйных гаспадарчых сувязяў;
- - працяглае падзенне цэн на нафту і газ на сусветным рынку.

Характэрнай рысай эканомікі БССР у гэты перыяд з'яўляецца адносная стабільнасць на фоне агульнасавецкай эканомікі. Спад вытворчасці пачынаецца толькі ў 1991 г. (за гэты год скарачэнне нацыянальнага прадукту склала 3%). Тым не менш ва ўмовах эканамічнага крызісу паўстае пытанне аб неабходнасці новай эканамічнай рэформы.

Паглыбленне сацыяльна-эканамічнага крызісу прывяло да *ўздыму грамадска-палітычнага руху ў СССР*. У розных рэгіёнах краіны адбываюцца масавыя выступленні працоўных (забастоўкі, стачкі), дэманстрацыі, мітынгі, якія паступова пачалі набываць палітычны характар. Папулярнасць палітыкі М. Гарбачова, якая была вельмі высокай у папярэднія гады, у 1989-1991 гг. імкліва змяншалася. На развіццё грамадска-палітычнага руху значны ўплыў аказалі паспяховыя дэмакратычныя рэвалюцыі 1989-1990 гг. у краінах Цэнтральнай Еўропы. У сакавіку 1990 г. III з'езд народных дэпутатаў прыняў папраўку да канстытуцыі, паводле якой скасоўвалася прывілеяванае становішча КПСС у сістэме дзяржаўнай улады.

У дадзеных умовах адбываецца хуткае нарастанне ўплыву *нацыянальных рухаў* у саюзных і аўтаномных рэспубліках СССР; абвастраюцца супярэчнасці паміж саюзнымі ўладамі і рэспубліканскімі элітамі. На працягу 1990 г. усе рэспублікі СССР прымаюць дэкларацыі аб суверэнітэце, у якіх патрабуюць пашырэння сваёй самастойнасці.

У сакавіку – красавіку 1990 г. прайшлі першыя ў гісторыі БССР выбары ў Вярхоўны Савет на альтэрнатыўнай аснове. *Вярхоўны Савет БССР XII склікання* пачаў сваю працу ў чэрвені 1990 г. у складзе 360 дэпутатаў. Большасць дэпутатаў складалі прыхільнікі правячага партыйна-дзяржаўнага апарату. Каля 100 дэпутатаў утварылі апазіцыйны *Дэмакратычны клуб*, які выступаў за паскарэнне рэформ у эканамічным і палітычным жыцці. З яго шэрагаў 30 дэпутатаў увайшлі ў склад *апазіцыйнай фракцыі БНФ*. Старшынёй Вярхоўнага Савета быў абраны *Мікалай Дземянцей*. Аднachасова

пры падтрымцы парламенцкай большасці быў сфарміраваны Савет міністраў на чале з *Вячаславам Кебічам*.

У 1990 – першай палове 1991 гг. адбываюцца істотныя пераўтварэнні ў палітычным жыцці БССР:

- ліквідацыя цэнзуры ў сродках масавай інфармацыі, з'яўленне новых масавых перыядычных выданняў;
- фарміраванне шматпартыйнасці: узнікаюць Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Беларуская сялянская партыя і г.д.;
- стварэнне незалежных прафсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый;
- падзенне аўтарытэту КПСС, узмацненне антыкамуністычных настрояў у грамадстве (у 1990 г. КПСС-КПБ пакінула 63 тыс. чалавек);
- пачатак беларусізацыі ў розных сферах грамадскага жыцця, адукацыі, культуры ў адпаведнасці з Законам аб мовах 1990 г., паводле якога адзінай дзяржаўнай мовай у БССР абвяшчалася беларуская.

У першай палове 1991 г., у сувязі з эканамічным крызісам і пагаршэннем жыццёвага ўзроўню насельніцтва абвастраецца грамадска-палітычная сітуацыя. У красавіку 1991 г. адбываюцца масавыя *забастоўкі рабочых* у розных гарадах Беларусі з патрабаваннямі паляпшэння матэрыяльнага становішча. Паступова да эканамічных лозунгаў далучаліся палітычныя: дэмакратызацыя грамадска-палітычнага ладу, нацыяналізацыя маёмасці КПСС-КПБ. Забастоўкі скончыліся кампрамісам.

Да сярэдзіны 1991 г. СССР знаходзіўся ў стане глыбокага сістэмнага крызісу. Урад М. Гарбачова выявіў няздольнасць вырашэння сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных праблем. У гэтых умовах частка прадстаўнікоў вышэйшага партыйна-дзяржаўнага апарату 19-21 жніўня 1991 г. зрабіла спробу дзяржаўнага перавароту, абвясціла пра адстаўку М. Гарбачова і ўвядзенне надзвычайнага становішча; імі быў утвораны ў Маскве асобы орган – Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП). Гэтыя падзеі ўвайшлі ў гісторыю пад назвай *жнівеньскі путч*. Аднак кіраўніцтва РСФСР на чале прэзідэнтам Б. Ельцыным і дэмакратычныя сілы Расіі рашуча выступілі супраць ГКЧП. У выніку 21 жніўня путч быў ліквідаваны. Падаўленне путчу прывяло да рэвалюцыйных пераўтварэнняў палітычнай сістэмы: была адменена дзейнасць КПСС і нацыяналізавана ўся яе маёмасць; савецкія рэспублікі абвясцілі пра дзяржаўную незалежнасць, адбыўся распад СССР. Урад М. Гарбачова страціў усякую ўладу і ў снежні 1991 г. спыніў сваё існаванне.

*Такім чынам, перабудова 1985-1991 гг. прывяла да істотных сацыяльна-эканамічных і сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў у БССР. Аднак пралікі ў правядзенні рэфармавання, а таксама негатыўныя знешнеэканамічныя фактары прывялі да глыбокага сістэмнага крызісу, страты улады КПСС-КПБ, распаду СССР і набыцця дзяржаўнай незалежнасці Беларусі.*

**Асноўныя паняцці:**

“Хрушчоўская адліга”, XX з’езд КПСС, Канстытуцыя СССР 1977 г., Канстытуцыя БССР 1978 г., “развіты сацыялізм”, савецкі народ, “эпоха застою”, індустрыяльная рэспубліка, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, Савет народнай гаспадаркі БССР, эканамічная рэформа 1965 г., гаспадарчы разлік, урбанізацыя, навуковыя лабараторыі, навукова-вытворчыя аб’яднанні, перабудова, “курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця”, аварыя на Чарнобыльскай АЭС, галоснасць, з’езд народных дэпутатаў СССР, Беларускі народны фронт, сацыяльна-эканамічны крызіс 1989-1991 гг., Вярхоўны Савет XII склікання, Дэмакратычны клуб, Закон аб мовах 1990 г., жнівеньскі путч, распад СССР.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Якія факты сведчаць пра працэс паступовай эвалюцыі таталітарнага рэжыму ў СССР да аўтарытарнага пасля смерці І. Сталіна?
2. Што такое “хрушчоўская адліга”? Якія грамадска-палітычныя пераўтварэнні адбываюцца ў СССР і БССР у гэты перыяд?
3. Якія можна вылучыць адрозненні грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. у параўнанні з перыядам “хрушчоўскай адлігі”?
4. Які сэнс укладваецца ў паняцце “эпоха застою”? Якія адметныя рысы вызначанага перыяду?
5. Якім чынам у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. змяняюцца адносіны да праяў іншадумства ў грамадстве ў параўнанні з эпохай сталінізму?
6. Падумайце, у якой ступені пашырыліся правы БССР на міжнароднай арэне ў параўнанні з часамі сталінізму і ў чым захавалася залежнасць ад саюзнай улады?
7. Якія факты сведчаць пра пераўтварэнне БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. у індустрыяльную рэспубліку?
8. Вызначце адрозненні ў правядзенні індустрыялізацыі ў БССР у перыяд сталінізму і ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.
9. Якім чынам змяняецца структура прамысловасці БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.? Назавіце асноўныя галіны.
10. Вызначце спецыялізацыю прамысловасці БССР разглядаемага перыяду ў агульнасаюзным падзеле працы. Падумайце, чым можа быць абумоўлена менавіта такая спецыялізацыя?
11. Дайце характарыстыку гаспадарчых сувязяў прамысловых прадпрыемстваў БССР у межах СССР і знешнеэканамічных сувязяў.
12. Якія змены адбываюцца ў развіцці транспартнай сістэмы БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.?
13. Што такое навукова-тэхнічная рэвалюцыя? Якія асаблівасці ажыццяўлення навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР і СССР? Якія можна вылучыць прычыны яе маруднага разгортвання?
14. Ахарактарызуйце асноўныя рэформы ў прамысловасці БССР і СССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.

15. Дайце агульную характарыстыку развіцця сельскай гаспадаркі БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг.
16. Якія змены ў развіццё сельскай гаспадаркі прынесла касыгінская эканамічная рэформа?
17. Якія пераўтварэнні адбыліся ў сельскай гаспадарцы БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг.?
18. Што такое ўрбанізацыя? Якія маштабы меў дадзены працэс ў БССР у разглядаемы перыяд? Якія яго прычыны?
19. Якія змены адбываюцца ў сацыяльнай структуры грамадства ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.?
20. Якія факты адлюстроўваюць паляпшэнне матэрыяльнага становішча працоўных у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.?
21. Калі ў эканоміцы БССР і СССР з'яўляецца сітуацыя "застою"? Якія яе прыкметы і прычыны?
22. Якія змены адбываюцца ў развіцці агульнаадукацыйнай школы ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.?
23. Якія рысы мела развіццё сістэмы вышэйшай адукацыі ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.?
24. Якія галіны навукі ў БССР дасягнулі найбольшых поспехаў у сваім развіцці ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.? Чым можна гэта патлумачыць?
25. Якія тэндэнцыі характарызуюць развіццё мастацкай культуры ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.? Якія змены адбыліся ў дадзенай сферы ў параўнанні з часамі сталінізму?
26. Што такое перабудова? Якімі фактарамі выклікана яе ажыццяўленне?
27. Якія можна вылучыць этапы перабудовы ў СССР і БССР? Дайце іх кароткую характарыстыку.
28. Што такое палітыка галоснасці? Якімі фактарамі было выклікана яе ўвядзенне? Да якіх сацыяльна-палітычных вынікаў яна прывяла?
29. Калі ў СССР пачынаецца сістэмны сацыяльна-эканамічны крызіс? Якія яго праявы і прычыны? Якім чынам ён паўплываў на актывізацыю грамадска-палітычнага руху ў СССР і БССР?
30. Калі быў сфарміраваны Вярхоўны Савет БССР XII склікання? Ахарактарызуйце яго склад.
31. Якія змены адбываюцца ў грамадска-палітычным жыцці БССР у 1990 – першай палове 1991 гг.?
32. Што такое жнівеньскі путч? Да якіх сацыяльна-палітычных вынікаў у СССР і БССР прывяла яго ліквідацыя?

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Рэабілітацыя ахвяр сталінізму ў БССР у перыяд "хрушчоўскай адлігі".
2. Удзел БССР у міжнародным жыцці ў другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.
3. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя ў БССР: асаблівасці ажыццяўлення.

4. Касыгінская эканамічная рэформа і яе ўплыў на развіццё народнай гаспадаркі БССР.
5. Урбанізацыя ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.
6. Сістэма вышэйшай адукацыі ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг.
7. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе вынікі.
8. Станаўленне парламенцкай сістэмы ў БССР у 1989–1991 гг.

## Тэма 24: Рэспубліка Беларусь на сучасным этапе развіцця

**1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.**
**2. Унутрыпалітычнае жыццё ў РБ у 1990-2000-я гг.**
**3. Знешняя палітыка РБ у 1990-2000-я гг.**
**4. Сацыяльна-эканамічнае развіццё РБ у 1990-2000-я гг.**
**5. Адукацыя, навука, культура ў 1990-2000-я гг.**

### 24.1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Распад СССР абумовіў пытанне нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі. У межах палітычнай эліты БССР узнікалі рознагалоссі па пытанню аб ступені рэалізацыі суверэнітэту: урад БССР, парламенцкая большасць у Вярхоўным Савеце, кіраўніцтва КПБ выступалі за пашырэнне самастойнасці БССР у межах абноўленага Саюза; апазіцыя БНФ і блізкія да яе сілы з 1990 г. выступалі за поўную дзяржаўную незалежнасць Беларусі і выхад са складу СССР. Праблема дзяржаўнага самавызначэння абвастрылася пасля т.зв. “*параду суверэнітэтаў*” – абвяшчэння самастойнасці шэрагам саюзных рэспублік вясной – летам 1990 г.

*27 ліпеня 1990 г.* Вярхоўны Савет БССР прыняў *Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР*. Згодна з Дэкларацыяй, на тэрыторыі рэспублікі абвяшчалася вяршэнства Канстытуцыі і законаў БССР, паўната ўлады рэспубліканскіх дзяржаўных органаў, самастойнасць і незалежнасць Беларусі ў міжнародных зносінах. Разам з тым абвяшчалася імкненне да захавання Саюза на новай аснове.

У канцы 1990 – першай палове 1991 гг. кіраўніцтва СССР і шэрагу саюзных рэспублік, уключаючы БССР, праводзілі падрыхтоўку для заключэння *новага саюзнага дагавору*. Былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве Беларусі ў розных сферах з іншымі саюзнымі рэспублікамі. Па ініцыятыве М. Гарбачова ў сакавіку 1991 г. у 9 з 15 рэспублік СССР, у тым ліку БССР, быў праведзены рэферэндум, на якім большасць грамадзян выказалася за захаванне Саюза ў абноўленым выглядзе.

Жнівеньскі путч 1991 г. у Маскве і яго правал паскорылі працэс распаду СССР і адначасова садзейнічалі больш рашучым крокам у накірунку абвяшчэння незалежнасці асобных саюзных рэспублік. *25 жніўня 1991 г. пятая нечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР” і пастанову “Аб*

*забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР”*. Фактычна Беларусь была абвешчана незалежнай дзяржавай. Ва ўласнасць рэспублікі перайшла агульнасаюзная маёмасць на тэрыторыі БССР.

26 жніўня 1991 г. была *прыпынена дзейнасць КПСС-КПБ*. Усе міністры ўрада на чале з В. Кебічам заявілі аб сваім выхадзе з партыі. Быў прыняты адпаведны закон аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады, прадпрыемстваў, арганізацый, нацыяналізацыі маёмасці КПБ-КПСС.

19 верасня 1991 г. на 6-й нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета дэпутаты прынялі рашэнне перайменаваць БССР у *Рэспубліку Беларусь (РБ)*. Тады ж былі абвешчаны новыя *дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь* – бела-чырвона-белы сцяг і герб “Пагоня”.

*8 снежня 1991 г.* у Белавежскай пушчы, у рэзідэнцыі “Віскулі” кіраўнікі Беларусі (С. Шушкевіч), Расійскай Федэрацыі (Б. Ельцын), Украіны (Л. Краўчук) падпісалі *Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)*. У ім абвяшчалася, што СССР як суб’ект міжнароднага права спыніў сваё існаванне. Тры дзяржавы аб’ядналіся ў СНД і запрасілі ўступаць у Садружнасць іншыя дзяржавы былога СССР. Да канца 1991 г. да СНД далучыліся яшчэ 8 рэспублік былога СССР (Арменія, Азербайджан, Казахстан, Узбекістан, Кыргызстан, Туркменістан, Таджыкістан, Малдова). 25 снежня 1991 г. СССР афіцыйна спыніў сваё існаванне.

У канцы 1991 – пачатку 1992 гг. быў нададзены статус дзяржаўных рэспубліканскім міністэрствам і ведамствам. Была створана самастойная беларуская армія. Міністэрства замежных спраў Беларусі распачало працу па *ўстанаўленні дыпламатычных адносін з іншымі краінамі свету*. На працягу кароткага часу Рэспубліка Беларусь была прызнана большасцю дзяржаў свету, у Мінску з’явіліся пасольствы і дыпламатычныя прадстаўніцтвы шэрагу дзяржаў.

*Такім чынам, у выніку палітычнага крызісу і распаду СССР у 1990 – 1991 гг. на аснове БССР сфарміравалася незалежная дзяржава – Рэспубліка Беларусь. За кароткі час выключна мірным шляхам яна набыла ўсе асноўныя атрыбуты суверэннай дзяржаўнасці і набыла ўсеагульнае міжнароднае прызнанне.*

## 24.2. Унутрыпалітычнае жыццё ў РБ у 1990-2000-я гг.

У сацыяльна-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь можна вылучыць *два асноўныя перыяды*:

1) перыяд парламенцкай рэспублікі (1991 – 1994 гг.);

2) перыяд прэзідэнцкай рэспублікі (з 1994 г.).

У 1991-1994 гг. Рэспубліка Беларусь уяўляла з сябе *парламенцкую рэспубліку*. Функцыянаванне дзяржаўнай улады адбывалася на аснове Канстытуцыі 1978 г. з прынятымі папраўкамі і дапаўненнямі. Вышэйшым органам *заканадаўчай улады* з’яўляўся *Вярхоўны Савет*. Яму належала права прыняцця законаў, ратыфікацыі міжнародных дагавораў, кантроль над усімі дзяржаўнымі структурамі. Старшыня Вярхоўнага Савета лічыўся афіцыйным кіраўніком дзяржавы. Вярхоўны Савет фарміраваў і ажыццяўляў кантроль за

дзейнасцю *Савета Міністраў*, які быў вышэйшым органам *выканаўчай улады*. Таксама Вярхоўны Савет фарміраваў склад цэнтральных органаў *судовай улады*: Вярхоўнага Суда, Вышэйшага гаспадарчага суда. Аналагічная сістэма дзейнічала ў рэгіёнах: мясцовыя Саветы дэпутатаў фарміравалі мясцовыя выканаўчыя камітэты і суды.

У грамадска-палітычным жыцці гэтага перыяду адбываюцца наступныя працэсы:

- хуткае развіццё перыядычнага друку (найбольш масавымі выданнямі становяцца газеты “Народная газета”, “Советская Белоруссия”, “Рэспублбіка”, Звязда”);
- развіццё шматпартыйнасці: да 1994 г. было афіцыйна зарэгістравана 29 палітычных партый і 7 грамадска-палітычных рухаў (найбольш значнымі палічнымі сіламі становяцца: рух БНФ “Адраджэнне”, Партыя камуністаў Беларусі, Аграрная партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада); разам з тым большасць партый мелі невялікі колькасны склад і не аказвалі ніякага ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё;
- увядзенне спрошчаных форм выезду за мяжу;
- беларусізацыя ў розных сферах грамадскага жыцця.

На працягу 1992–1994 гг. Вярхоўны Савет стаў арэнай жорсткай палітычнай барацьбы розных груповак па пытаннях эканамічнага жыцця, вызначэння палітычнага ладу дзяржавы, знешняй палітыкі. У гэты перыяд у парламенце скläліся тры асноўныя палітычныя блокі:

- “кансерватыўная” большасць, якая падтрымлівала ўрад В. Кебіча;
- “дэмакратычная” апазіцыя БНФ і блізкія да яе дэпутацкія групы;
- “цэнтрысцкая” група на чале з Аляксандрам Лукашэнкам.

Старшынёй Вярхоўнага Савета у верасні 1991 г. быў абраны *Станіслаў Шушкевіч*. У сваёй палітыцы ён спрабаваў лавіраваць паміж рознымі палітычнымі групоўкамі; аднак у выніку страціў давер як з боку праўрадавых сіл, так і апазіцыі. З 1993 г. выявіўся канфлікт паміж С. Шушкевічам і кіраўніцтвам Савета Міністраў. У студзені 1994 г. дэпутаты адклікалі С. Шушкевіча з пасады Старшыні Вярхоўнага Савета і абралі на яе прадстаўніка парламенцкай большасці *Мечыслава Грыба*.

Асноўныя рознагалоссі паміж палітычнымі сіламі разгарнуліся паводле пытання аб прыняцці новай Канстытуцыі. Парламенцкая большасць і цэнтрысці блок адстойвалі ідэю фарміравання прэзідэнцкай рэспублікі. Апазіцыя БНФ настойвала на захаванні асноў парламенцкай рэспублікі.

*15 сакавіка 1994 г.* Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў новую *Канстытуцыю — Асноўны закон Рэспублікі Беларусь*. Паводле Канстытуцыі, Беларусь абвяшчалася ўнітарнай дэмакратычнай сацыяльнай дзяржавай. У Канстытуцыі зафіксаваны шырокія грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды грамадзян. Асноўны закон зафіксаваў прынцып падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Уводзілася пасада *прэзідэнта*, які абвяшчаўся галавой дзяржавы і кіраўніком выканаўчай улады; яму

надавалася права фарміравання ўрада і кантролю за асноўнымі дзяржаўнымі структурамі. Разам з тым захоўваліся значныя правы *Вярхоўнага Савета*, у тым ліку права зацвярджэння ўрада, фарміравання складу вышэйшых органаў судовай улады, манаполія на прыняцце дзяржаўных законаў. Уводзіўся новы вышэйшы орган судовай улады – *Канстытуцыйны Суд*, які фарміраваўся Вярхоўным Саветам. *Выбары першага прэзідэнта* былі прызначаны на 19чэрвеня 1994 г.

Кандыдатамі на пасаду прэзідэнта былі вылучаны шэсць чалавек. Асноўнымі канкурэнтамі лічыліся прэм'ер-міністр В.Кебіч і дэпутат А. Лукашэнка. Шырокую падтрымку сярод грамадзян знайшла перадвыбарная праграма А. Лукашэнкі. У ёй акцэнт рабіўся на пераадоленне эканамічнага крызісу, сацыяльную справядлівасць, барацьбу з карупцыяй, павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва і г.д. Пераможцам першага тура выбараў 19 чэрвеня стаў А. Лукашэнка, які набраў 45% галасоў. В. Кебіча, хаця ён і выйшаў у другі тур, падтрымала толькі 17,4% выбаршчыкаў. У наступным туры выбараў, які адбыўся *10 ліпеня*, амаль 80% выбаршчыкаў першым *Прэзідэнтам Беларусі* абралі *Аляксандра Лукашэнку*.

20 ліпеня 1994 г. адбылося ўступленне на пасаду прэзідэнта А. Лукашэнкі. З гэтага часу пачынаецца пераход Рэспублікі Беларусь да *прэзідэнцкай рэспублікі*. Па ініцыятыве прэзідэнта быў сфарміраваны новы Савет Міністраў, зацверджаны Вярхоўным Саветам, на чале з *Міхаілам Чыгіром*. Да пачатку 1995 г. была створана падпарадкаваная прэзідэнту строга цэнтралізаваная сістэма дзяржаўнага кіравання – так званая "вертыкаль". У 1994 г. быў таксама сфарміраваны вышэйшы орган судовай улады – *Канстытуцыйны Суд РБ*.

Палітыка прэзідэнта выклікала новае размежаванне грамадска-палітычных сіл. У апазіцыю перайшлі БНФ і блізкія да яе палітычныя групоўкі, а таксама частка былой парламенцкай большасці Вярхоўнага Савета на чале з М. Грыбам. Важным этапам барацьбы паміж урадавымі коламі і апазіцыяй сталі парламенцкія выбары, прызначаныя на *14 мая 1995 г.* Прэзідэнт ініцыіраваў правядзенне ў адзін дзень з парламенцкімі выбарамі *рэспубліканскага рэферэндуму*, які прадугледжваў 4 пытанні:

- аб наданні рускай мове статусу дзяржаўнай нароўні з беларускай;
- аб увядзенні новых дзяржаўных сімвалаў (сцяга і герба) Рэспублікі Беларусь;
- аб ухваленні курсу на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй;
- аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю, якія прадугледжвалі магчымасць датэрміновага спынення паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета прэзідэнтам у выпадках сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі.

Па ўсіх чатырох пытаннях большасць грамадзян станоўча адказалі на пытанні рэферэндума.

У студзені 1996 г. пачаў дзейнасць абраны ў маі – снежні 1995 г. *Вярхоўны Савет XIII склікання*. У парламенце разгарнулася вострая палітычная барацьба паміж прыхільнікамі ўлады (фракцыя "Згода") і

прыхільнікамі апазіцыі, якая ўключала ў сябе прадстаўнікоў Партыі камуністаў, Аграрнай партыі, Аб’яднанай грамадзянскай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада) і інш. У чэрвені 1996 г. прэзідэнт унёс у Вярхоўны Савет прапанову аб рэферэндуме, галоўным пытаннем якога павінна было стаць прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі, згодна з якой значна ўзмацнялася ўлада прэзідэнта і змяншалася ўлада парламента. Прадугледжваліся таксама дадатковыя пытанні:

- перанясенне нацыянальнага свята Дня незалежнасці з 27 ліпеня (дзень абвяшчэння суверэнітэту ў 1990 г.) на 3 ліпеня (дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 г.);
- права свабоднай куплі-продажу зямлі;
- адмена смяротнага пакарання.

Падрыхтоўка да рэферэндума абумовіла абвастрэнне палітычнай канфрантацыі. Апазіцыя ў Вярхоўным Савеце, а таксама Канстытуцыйны Суд спрабавалі абгрунтаваць незаконнасць дадзенага рэферэндума, а таксама арганізаваць імпічмент прэзідэнту ў парламенце; адбываліся дэманстрацыі і сутычкі з міліцыяй прыхільнікаў апазіцыі. Напярэдадні рэферэндума апазіцыю падтрымалі прэм’ер-міністр М. Чыгір і некаторыя іншыя міністры, якія падалі ў адстаўку. У дадзеных умовах *24 лістапада 1996 г.* адбыўся *другі рэспубліканскі рэферэндум*. За прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі са змяненнямі і дапаўненнямі прагаласавалі каля 70% грамадзян, унесеных у спісы для галасавання.

У адпаведнасці з *новай рэдакцыяй Канстытуцыі* Беларусь пераўтваралася ў прэзідэнцкую рэспубліку з шырокімі паўнамоцтвамі кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт з’яўляецца кіраўніком дзяржавы, прызначае ўсіх вышэйшых службовых асоб, фарміруе ўрад, падпісвае законы, мае права выдання асобых актаў заканадаўчага характару – *дэкрэтаў*. На чале заканадаўчай улады ствараўся двухпалатны парламент — *Нацыянальны сход*, які складаецца з *Палаты прадстаўнікоў* (110 дэпутатаў, абраных насельніцтвам) і *Савета Рэспублікі* (64 дэпутаты; з іх па 8 абіраюцца ад кожнай вобласці і г. Мінска і 8 прызначаюцца прэзідэнтам). Палата прадстаўнікоў рыхтуе праекты законаў і прымае іх; Савет Рэспублікі зацвярджае ці адмяняе гэтыя законапраекты. Захавалася права парламента зацвярджэння або вызвалення з пасадаў членаў Савета міністраў. Змяняецца парадак фарміравання *Канстытуцыйнага Суда*: з ліку 12 суддзяў 6 прызначаюцца прэзідэнтам, 6 – Саветам Рэспублікі.

У выніку змяненняў у Канстытуцыю Вярхоўны Савет XIII склікання быў распушчаны. З ліку 110 яго дэпутатаў, якія падтрымалі вынікі рэферэндуму, была сфарміравана *Палата прадстаўнікоў I склікання*. Апазіцыя адмовілася прызнаваць вынікі рэферэндуму.

Пасля падзей 1996 г. адбываецца паслядоўная *стабілізацыя і цэнтралізацыя дзяржаўнай улады*. У выніку выбараў у *Палату прадстаўнікоў II, III і IV склікання* ў 2000, 2004 і 2008 гг. у склад парламента ўваходзілі амаль выключна прыхільнікі ўлады. У *верасні 2001 г.* прэзідэнт А. Лукашэнка быў пераабраны на другі тэрмін у выніку першага туру

выбараў. *17 кастрычніка 2004 г.* адначасова з парламенцкімі выбарамі праходзіў *рэспубліканскі рэферэндум аб зменах у Канстытуцыі*, якія адмянялі абмежаванне на права займання адной асобай пасады прэзідэнта двума тэрмінамі. Большасць грамадзян падтрымалі дадзеныя змены. На выбарах прэзідэнта ў *сакавіку 2006 г.* і *снежні 2010 г.* у адпаведнасці з новымі зменамі ў Канстытуцыі А.Лукашэнка ў трэці і чацвёрты разы балатаваўся на пасаду прэзідэнта і ў абодвух выпадках атрымаў перамогу ў першым туры выбараў.

Пад кіраўніцтвам А. Лукашэнкі ў гэты перыяд змяняецца некалькі складаў Савета міністраў, які ўзначальвалі С. Лінг (1997–2000), А. Ярмошын (2000–2001), Г. Навіцкі (2001–2003), С. Сідорскі (2004–2010), М. Мясніковіч (з 2010 г.).

*Такім чынам, у грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь у 1990-2000-я гг. вылучаюцца два этапы, звязаныя з функцыянаваннем парламенцкай і прэзідэнцкай рэспублікі. З сярэдзіны 1990-х гг. назіраецца паступовая стабілізацыя і цэнтралізацыя дзяржаўна-палітычнай улады ў межах развіцця інстытутаў прэзідэнцкай рэспублікі на аснове Канстытуцыі РБ са зменамі і дапаўненнямі 1996 г.*

### 24.3. Знешняя палітыка РБ у 1990-2000-я гг.

З прыняццем Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР рэспубліка стала паступова пераходзіць да самастойнага ажыццяўлення знешнепалітычнай дзейнасці. Рэспубліка Беларусь на 2004 г. мела *дыпламатычныя адносіны* з 160 краінамі свету. У Мінску на гэты год знаходзіліся дыпламатычныя прадстаўніцтвы 35 краін, а таксама 8 консульстваў і 12 прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый. Ад пачатку свайго існавання кіраўніцтва Беларусі абвясціла *бяз'ядзерны і нейтральны* міжнародны статус дзяржавы, а знешнюю палітыку *шматвектарнай.*

Беларусь пашырыла свой удзел у арганізацыях сістэмы ААН, з'яўляецца членам *13 спецыялізаваных устаноў ААН.* У краіне дзейнічае нацыянальная *Камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА*. Беларусь актыўна ўдзельнічае ў працы такіх функцыянальных органаў ААН як *Еўрапейская эканамічная камісія, Дзіцячы фонд ААН, Канферэнцыя Аб'яднаных Нацый па гандлі і развіцці* і інш. У 1992 г. Беларусь уступіла ў *Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця, Міжнародны валютны фонд, Міжнародную фінансавую карпарацыю, Міжнароднае агенцтва па гарантыях інвестыцый*, якое ўваходзіць у групу *Сусветнага банка*; атрымала статус назіральніка ў *Сусветнай гандлёвай арганізацыі*, створанай у 1995 г. У Мінску былі адкрыты прадстаўніцтвы шэрагу ўплывовых міжнародных арганізацый.

Сучаснае міжнароднае жыццё вызначае працэс *глабалізацыі* – фарміравання адзінай глабальнай сусветнай прасторы. У гэтых умовах знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь грунтуеца на прынцыпах шматвектарнасці, развіцця усебаковых сувязяў з рознымі дзяржавамі.

Разам з тым прыярытэтным накірункам знешняй палітыкі выступае развіццё супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй і краінамі СНД. Паводле

*пагадненне аб утварэнні СНД* у снежні 1991 г. прадугледжвалася развіццё раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзяржаў-удзельніц у галіне палітыкі, эканомікі, культуры і інш. Афіцыйным месцам знаходжання каардынацыйных органаў СНД быў вызначаны Мінск. У Мінску праходзілі пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў-удзельнікаў Садружнасці. 22 студзеня 1993 г. у Мінску быў абмеркаваны і прыняты *Статут СНД*. Рэгулярна ў сталіцы СНД адбываюцца пасяджэнні кіраўнікоў урадаў, міністэрстваў і ведамстваў краін Садружнасці. З 1993 г., у адпаведнасці са Статутам, у Мінску размяшчаўся *Выканаўчы сакратарыят СНД*, з 1999 г. замест яго *Выканаўчы камітэт СНД*. Гэты міжнародны орган распрацоўвае праекты дакументаў, садзейнічае рэалізацыі сумесных праграм, арганізуе дзейнасць больш як 20 органаў галіновага супрацоўніцтва. Таксама ў Мінску знаходзіцца *Эканамічны суд СНД*, створаны ў 1994 г., які разглядае справы аб тлумачэнні актаў Садружнасці, забеспячэнні сацыяльна-эканамічных правоў грамадзян, што пражываюць на тэрыторыі дзяржаў СНД і г.д.

З сярэдзіны 1990-х гг. прыкметна актывізуецца *супрацоўніцтва з Расіяй* у выніку прынятага кіраўніцтвам дзяржаў курсу на ўзаемную *міждзяржаўную інтэграцыю*. У 1995 г. прэзідэнты дзвюх краін А. Лукашэнка і Б. Ельцын падпісалі *Дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве* тэрмінам на 10 гадоў. У маі 1995 г. ліквідавана мытная мяжа паміж дзвюма дзяржавамі. У далейшым быў падпісаны шэраг дакументаў, накіраваных на паглыбленне міждзяржаўнай інтэграцыі:

*Дагавор аб стварэнні супольнасці суверенных рэспублік Беларусі і Расіі (2 красавіка 1996 г.);*

*Дагавор аб Саюзе Беларусі з Расіяй (2 красавіка 1997 г.);*

*Дэкларацыя аб аб'яднанні Беларусі з Расіяй у Саюзную дзяржаву. (25 снежня 1998 г.)*

*Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі (8 снежня 1999 г.).*

Паводле дадзеных актаў, прадугледжвалася ўзгадненне пазіцый дзвюх дзяржаў па міжнародных пытаннях, узаемадзеянне па захаванню бяспекі, ахове межаў і барацьбе са злачыннасцю. Захоўваючы атрыбуты суверэнітэту, дзяржавы выходзілі на сумеснае будаўніцтва структур, якія мелі агульную заканадаўчую базу. Былі сфарміраваны *Вышэйшы Савет, Выканаўчы камітэт, Парламенцкі сход, Мытны камітэт, Расійска-Беларуская камісія па навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву* і некаторыя іншыя сумесныя арганізацыі. Планавалася стварэнне агульнай транспартнай сістэмы з адзінымі тарыфамі па перавозках грузаў і пасажыраў, адзінай энергасістэмы, навукова-тэхнічнай і інфармацыйнай прасторы, сінхранізацыя эканамічных рэформаў, стварэнне адзінай нарматыўна-прававой базы, уніфікацыя грашова-крэдытных і бюджетных сістэм.

На практыцы інтэграцыйныя пагадненні не заўсёды рэалізоўваліся. Галоўнай прычынай гэтага з'яўляюцца розныя падыходы да інтэграцыі кіраўніцтва дзяржаў. Беларускі бок настойвае на раўнапраўным саюзе дзвюх суверэнных дзяржаў. З боку расійскіх палітычных эліт нярэдка гучалі

прапановы ўваходжання Беларусі ў склад Расіі, альбо паніжэння статуса Беларусі ў складзе Саюза. Праблемы ўзнікаюць таксама ў эканамічнай сферы паводле такіх пытанняў як ліквідацыя мытных бар'ераў, пастаўкі расійскіх энерганосьбітаў і сыравіны ў Беларусь і іх далейшы транзіт і рээкспарт у Цэнтральную і Заходнюю Еўропу, стварэнне адзіных умоў для суб'ектаў гаспадарання абедзвюх краін і г.д.

Кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь прытрымліваецца тактыкі *рознаўзроўневай інтэграцыі на постсавецкай прасторы*. У сакавіку 1996 г. быў падпісаны дагавор аб паглыбленні эканамічнай інтэграцыі чатырох краін – Расіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, да якіх пазней далучыўся Таджыкістан (*ЕўразЭС*). У 2003 г. створана арганізацыя рэгіянальнай інтэграцыі, у якую ўвайшлі Расія, Беларусь, Украіна, Казахстан. Гэтыя краіны заявілі аб імкненні стварыць зону свабоднага гандлю і падпісалі *Пагадненне аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП)*.

Важным накірункам у знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ўстанаўленне ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі *Еўрапейскага Саюза*. Аднак у другой палове 1990-х – першай палове 2000-х гг. адносіны паміж бакамі мелі супярэчлівы характар з прычыны негатыўнай ацэнкі удзельнікамі ЕС палітычнай сітуацыі ў Беларусі. З 2007 – 2008 гг. назіраецца прыкметнае паляпшэнне адносін. З 2009 г. Беларусь разам з Украінай, Малдовай, Арменіяй і Азербайджанам была ўключана ў рэалізацыю праграмы "*Ўсходняе партнёрства*", накіраваную на паглыбленне кантактаў краін Еўрасаюза з усходнімі суседзямі.

Беларусь актыўна супрацоўнічае з многімі краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Асаблівае цеснае супрацоўніцтва ўстаноўлена з такімі дзяржавамі як Кітай, Індыя, Іран, Сірыя, Венесуэла.

Актыўна развіваюцца міжнародныя сувязі Беларусі ў эканамічнай сферы, у такіх галінах як навука, культура. Важным напрамкам міжнароднай дзейнасці Беларусі з'яўляецца супрацоўніцтва па чарнобыльскіх праблемах.

*Такім чынам, у 1990-2000-я гг. Рэспубліка Беларусь становіцца самастойным суб'ектам міжнародных адносін. У знешняй палітыцы беларускія ўлады дэкларуюць імкненне да захавання суверэнітэту пры ўсебаковым супрацоўніцтве з рознымі дзяржавамі (шматвектарны курс), забяспечваюць статус Беларусі як нейтральнай дзяржавы. Прыярытэтнымі накірункамі знешняй палітыкі выступаюць супрацоўніцтва з Расіяй і краінамі СНД, а таксама збліжэнне з краінамі Еўрапейскага Саюза.*

### 24.4. Сацыяльна-эканамічнае развіццё РБ у 1990-2000-я гг.

З лета 1990 г. , калі ў СССР быў абвешчаны пераход да рынку, пачалася таксама трансфармацыя эканамічнай сістэмы Беларусі. У кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову "Аб пераходзе БССР да рыначнай эканомікі" і зацвердзіў праграму пераходу да рынку, распрацаваную Саветам Міністраў Беларусі. Праграма прадугледжвала наступныя меры:

- *раздзяржаўленне, прыватызацыя ўласнасці на сродкі вытворчасці; развіццё прадпрымальніцтва і канкурэнцыі;*

- *стварэнне сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікай з дапамогай эканамічных метадаў* праз дзейнасць банкаўскай сістэмы, падатковую сістэму, дзяржзаказы, механізм цэнаўтварэння і г.д.

- *лібералізацыя цэн*: паэтапнае ўвядзенне свабоднага цэнаўтварэння з захаваннем дзяржаўнага кантролю за цэнамі толькі на асноўныя тавары першай неабходнасці;

- *стварэнне рыначнай інфраструктуры і механізму яе дзеяння* – біржаў, банкаў, рынкаў сродкаў вытворчасці, рабочай сілы, жылля, тавараў і г.д.

Адразу пасля зацвярджэння праграмы Вярхоўны Савет БССР прыняў шэраг законаў па яе рэалізацыі. Было ўведзена раўнапраўе прыватнай, калектыўнай і дзяржаўнай форм уласнасці. Створаўся *Нацыянальны банк*. Пасля распаду СССР у 1992 г. у Беларусі была ўведзена самастойная валюта – *беларускі рубель*.

Праграма пераходу да рыначнай эканомікі была накіравана перадусім на выхад гаспадаркі з крызісу. Аднак гэта не атрымалася. *У 1991-1995 гг. эканоміка Беларусі перажывала глыбокі сістэмны крызіс*. Яго асноўнымі праявамі былі:

- спад вытворчасці ў асноўных галінах гаспадаркі: на працягу 1991 – 1995 гг. валавы ўнутраны прадукт скараціўся на 35% (у тым ліку вытворчасць прамысловай прадукцыі на 39%, сельскагаспадарчай – на 26%);

- скарачэнне інвестыцый у асноўны капітал (за 1991-1995 гг. на 61%);

- гіперінфляцыя і абвальны рост цэн (штомесяц цэны раслі прыкладна на 30%);

- падзенне жыццёвага ўзроўню насельніцтва: у 1991–1995 гг. рэальная заработная плата знізілася амаль напалову; у 1995 г. за рысай мінімальнага спажывецкага бюджэту апынулася больш за 60% насельніцтва Беларусі;

- рост беспрацоўя;

- рост знешняй запазычанасці: у 1991 – 1995 гг. яна ўзрасла амаль у 4 разы і складала палову валавога ўнутранага прадукту.

*Асноўныя прычыны сацыяльна-эканамічнага крызісу:*

- *змена ўмоў дзяржаўнага існавання* Беларусі, якая са “зборачнага цэху” СССР пераўтварылася ў самастойную дзяржаву і распад традыцыйных эканамічных сувязяў (вынікам становіцца недапастаўка сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых і г. д.);

- праблема збыту прамысловай прадукцыі (прадукцыя беларускай індустрыі пастаўлялася перш за ўсё на расійскі рынак, дзе ў гэты час таксама назіраецца моцны крызіс і адсутнічае неабходны попыт);

- падаражанне ў сувязі пераходам да рынку матэрыяльных рэсурсаў, у першую чаргу энерганосьбітаў;

- крызіс неплацяжоў і рост бартэра;

- нізкая канкурэнтаздольнасць прадукцыі беларускай вытворчасці, у выніку чаго імпарт значна перавышаў экспарт;

- змена ўмоў гаспадарання, пераход да рыначных механізмаў.

Ва ўмовах крызісу адбывалася паступовая змена структуры ўласнасці ў эканоміцы Беларусі. Узнікае прыватны сектар эканомікі, перадусім у

сярэдняй і дробнай прамысловасці, гандлі, сферы абслугоўвання. Адбываецца раздзяржаўленне і акцыяніраванне шэрагу прадпрыемстваў; створаны шэраг дзяржаўных і камерцыйных банкаў. Была праведзена масавая прыватызацыя кватэр, дамоў, дач, гаражоў. Разам з тым у буйной прамысловасці захавалася панаванне дзяржаўнай формы ўласнасці.

*У 1996 – 1998 гг. пачынаецца ажыўленне ў эканоміцы Беларусі*. Так, у 1996 г. меў месца прырост ВУП на 3%. Такім чынам, пачалося паступовае пераадоленне наступстваў эканамічнага крызісу. У другой палове 1990-х гг. былі ўзмоцнены роля дзяржаўных органаў рэгулявання эканомікай, кантроль за працэсамі цэнаўтварэння, раздзяржаўлення і прыватызацыі. Аднак у 1998-2000 гг. адбываецца замаруджванне тэмпаў росту, якое было выклікана перадусім фінансавым крызісам у Расіі, залежнасць ад якой беларускай эканомікі заставалася высокай. У цэлым на працягу 1996 – 2000 гг. ВУП павялічыўся на 36%, прадукцыя прамысловасці – на 65%, інвестыцыі ў асноўны капітал – на 34%, рознічны тавараварот больш чым у 2 разы.

Разам з тым на мяжы 20 – 21 стст. захоўваўся шэраг значных эканамічных праблем:

- неэфектыўнасць сельскай гаспадаркі;
- стратнасць 1/3 прамысловых прадпрыемстваў;
- высокая інфляцыя;
- нізкі ўзровень аплаты працы рабочых, служачых, бюджэтнікаў.

У 2001 г. пачаўся новы этап трансфармацыі эканомікі Беларусі. Адбываецца пераход да выкарыстання пераважна эканамічных метадаў дзяржаўнага рэгулявання і рыначных механізмаў гаспадарання. Асноўнымі *прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы эканомікі* ў 2000-я гг. былі вызначаны:

- нарошчванне экспарту тавараў і паслуг;
- развіццё аграпрамысловага комплексу і звязаных з ім галін;
- актывізацыя інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці;
- развіццё жыллёвага будаўніцтва.

У 2000 – 2008 гг. адбываецца няспынны эканамічны рост у розных галінах народнай гаспадаркі. Толькі ў 2009 г. пад уплывам сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу назіраліся застойныя з'явы ў эканоміцы. Дынаміка эканамічных паказчыкаў гэтага перыяду адлюстравана ў табліцы:

| | 1995 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт, млрд. руб. | 121403 | 9134 | 17173 | 26138 | 36565 | 49992 | 65067 | 79267 | 97165 | 129791 | 136790 |
| У % да папярэдняга года | 89,6 | 105,8 | 104,7 | 105,0 | 107,0 | 111,4 | 109,4 | 110,0 | 108,6 | 110,2 | 100,2 |
| Прадукцыя прамысловасці, млрд. руб. | 131373 | 10501 | 18612 | 24912 | 33387 | 48530 | 62545 | 77267 | 95515 | 130830 | 123225 |
| У % да папярэдняга | 88,3 | 107,8 | 105,9 | 104,5 | 107,1 | 115,9 | 110,5 | 111,4 | 108,7 | 111,5 | 97,2 |

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| года | | | | | | | | | | | |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі, млрд. руб. | 46525 | 2734 | 4539 | 6521 | 7814 | 10545 | 12826 | 15544 | 18102 | 25052 | 26538 |
| У % да папярэдняга года | 95,3 | 109,3 | 101,8 | 100,7 | 106,6 | 112,6 | 101,7 | 106,0 | 104,4 | 108,6 | 101,3 |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал, млрд. руб. | 22381,6 | 1809,0 | 3049,3 | 4484,6 | 7131,2 | 10783,4 | 15095,8 | 20374,1 | 26053,3 | 37202,3 | 43377,6 |
| У % да папярэдняга года | 69,3 | 102,1 | 96,5 | 106,0 | 120,8 | 120,9 | 120,0 | 132,2 | 116,2 | 123,5 | 104,7 |
| Колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных, тыс. чал. | 131,0 | 95,8 | 102,9 | 130,5 | 136,1 | 83,0 | 67,9 | 52,0 | 44,1 | 37,3 | 40,3 |
| У % да эканамічна актыўнага насельніцтва | 2,9 | 2,1 | 2,3 | 3,0 | 3,1 | 1,9 | 1,5 | 1,2 | 1,0 | 0,8 | 0,9 |
| Намінальная сярэдняя налічаная заработная плата, тыс. руб. | 755,1 | 58,9 | 123,0 | 189,2 | 250,7 | 347,5 | 463,7 | 582,2 | 694,0 | 868,2 | 981,6 |
| Рэальная сярэдняя заработная плата, у % да папярэдняга года | 95,0 | 112,0 | 129,6 | 107,9 | 103,2 | 117,4 | 120,9 | 117,3 | 110,0 | 109,0 | 100,1 |
| Сярэдні памер пенсіі | 387,2 | 36,4 | 65,0 | 89,6 | 113,9 | 172,6 | 211,0 | 277,6 | 328,2 | 389,4 | 429,5 |
| Рэальны памер пенсіі, у % да папярэдняга года | 130,3 | 143,2 | 122,1 | 102,3 | 101,4 | 132,4 | 113,2 | 123,4 | 105,4 | 104,7 | 100,2 |
| Увод у дзеянне агульнай плошчы жылых дамоў, тыс. м² | 1948,8 | 3528,5 | 3008,9 | 2810,5 | 3019,2 | 3501,5 | 3785,5 | 4087,5 | 4665,1 | 5102,2 | 5814,2 |
| Рознічны тавараварот, млрд. руб. | 46853 | 4197 | 8171 | 11910 | 15170 | 19452 | 25230 | 31062 | 38168 | 50651 | 54736 |
| У % да папярэдняга года | 77,2 | 111,8 | 128,2 | 111,5 | 110,3 | 111,5 | 120,0 | 117,4 | 114,8 | 119,2 | 103,2 |
| Індэкс спажывецкіх цэн, у % (снежань да снежня папярэдняга года | 344,0 | 207,5 | 146,1 | 134,8 | 135,4 | 114,4 | 108,0 | 106,6 | 112,1 | 113,3 | 110,1 |
| Індэкс цэн прамысловай прадукцыі, у % | 221,8 | 268,0 | 139,1 | 142,6 | 128,1 | 118,8 | 110,0 | 109,0 | 116,8 | 116,4 | 111,1 |

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| (снежань да снежня папярэдняга года) | | | | | | | | | | | | |

*Прычынамі эканамічнага росту 2000 – 2008 гг.* з'яўляюцца:

- сусветны эканамічны ўздым;
- асаблівыя гандлёва-эканамічныя адносіны з Расіяй (ва ўмовах эканамічнага росту ў Расіі значна ўзрастаюць экспартныя пастаўкі беларускай прамысловай прадукцыі ў Расію);
- павышэнне даходнасці паліўна-энергетычнага комплексу: на працягу перыяду адбываецца рост цэн на энерганосьбіты (у першую чаргу нафту і газ); нізкія цэны на пастаўку расійскіх энерагносьбітаў і значнае павышэнне цэн на сусветным рынку садзейнічалі ўзрастанню ВУП за кошт рээкспарту нафты, нафтапрадуктаў і калійных солей.

Характэрнай рысай эканамічнай сістэмы Рэспублікі Беларусь з'яўляецца захаванне пануючай ролі дзяржавы ў сістэме ўласнасці (на долю дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый прыходзіцца каля 75% ВУП). Прыватызацыя ажыццяўлялецца шляхам продажу і акцыяніравання асобных прадпрыемстваў.

*Структура прамысловасці* ў асноўным не змянілася ў параўнанні з савецкім перыядам. Асноўнымі галінамі прамысловай вытворчасці выступаюць нафтахімічная, хімічная, электраэнергетыка, машынабудаванне, металаапрацоўчая, здабыча калійных солей, лёгкая, лясная, дрэваапрацоўчая.

У *сельскай гаспадарцы* ў асноўным захаваны буйныя гаспадаркі, якія развіваюцца на базе ранейшых калгасаў і саўгасаў. З 2005 г. сельская гаспадарка атрымала значныя бюджэтныя сродкі ў межах праграмы па будаўніцтву аграгарадкоў і г.д.

Рэспубліка Беларусь падтрымлівае шырокія *знешнеэканамічныя сувязі*. Знешнегандлёвы таваразварот Беларусі перавышае яе валавы ўнутраны прадукт. У 2008 г. экспарт тавараў і паслуг з Беларусі склаў 33 млрд. долараў, імпарт – 39,2 млрд. Асноўнымі прадметамі *экспарту* з'яўляюцца нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні, грузавыя аўтамабілі, трактары, дарожна-будаўнічая і камунальная тэхніка, хімічныя валокны, тэлевізары, халадзільнікі, малочная прадукцыя. *Імпарт* складаюць пераважна паліўна-энергетычныя рэсурсы, металы, машыны і абсталяванне. На працягу 2000-х гг. ва ўмовах хуткага росту цэн на энерганосьбіты ў структуры экспарту істотна павялічылася доля нафтапрадуктаў (на працягу 2002 – 2006 гг. яна ўзрасла ў 5 разоў і дасягнула 16,4% ВУП).

Асноўным гандлёвым партнёрам Беларусі з'яўляецца Расія. У 2008 г. у структуры экспарту на долю Расіі прыходзілася 32%, імпарту – 59,8%. Разам з тым намаганні ўладаў на правядзенне шматвектарнай знешнеэканамічнай палітыкі прывялі да некаторага змяншэння ўдзельнай вагі Расіі ў структуры знешняга гандлю. У імпарце з Расіі галоўную ролю маюць энергарэсурсы (нафта і газ). З 2006 г. назіраецца працэс паступовага павышэння цэн на расійскія энерганосьбіты і абмежаванне магчымасцяў іх рээкспарту ў іншыя

краіны. У гэтых умовах улады Беларусі накіроўваюць намаганні на пошук альтэрнатыўных шляхоў паставак энергарэсурсаў. У 2010 г. адбыліся першыя пастаўкі нафты з Венесуэлы.

Важнымі знешнеэканамічнымі партнёрамі Беларусі ў Еўропе з'яўляюцца Украіна, Германія, Літва, Латвія, Нідэрланды, Польшча, Вялікабрытанія. Развіваюцца знешнеэканамічныя сувязі з краінамі далёкага замежжа (Кітай, Індыя, Іран, Венесуэла, В'етнам, Сірыя і г.д.).

Развіццё знешнеэканамічных сувязяў прадугледжвае таксама стварэнне *сумесных і замежных прадпрыемстваў*, што спрыяе прыцягненню замежных інвестыцый, прымяненню прагрэсіўных тэхналогій. У 2002 г. у Рэспубліцы Беларусь было зарэгістравана 2415 прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі. Найбольшая колькасць сумесных і замежных прадпрыемстваў была створана з Расіяй, Польшчай, Германіяй, ЗША. Са знешнеэканамічнай дзейнасцю таксама непасрэдна звязана функцыянаванне *свабодных эканамічных зон* (СЭЗ) "Брэст", "Мінск", "Гомель-Ратон", "Віцебск", "Гроднаінвест", "Магілёў", але на іх долю ў 2001 г. прыходзілася толькі каля 2% экспарту і імпарту Рэспублікі Беларусь.

*Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь у 1990-2000-я гг. характарызуецца пераходам ад каманднa-адміністрацыйнай сістэмы да рэгулюемай рыначнай эканомікі. Рэспубліка Беларусь у асноўным захавала эканамічны патэнцыял савецкага перыяду. На сучасным этапе ажыццяўляецца палітыка, накіраваная на інтэграцыю Беларусі ў сусветную эканоміку пры захаванні эканамічнай незалежнасці.*

**24.5. Адукацыя, навука, культура ў 1990-2000-я гг.**

Пасля набыцця дзяржаўнай незалежнасці Беларусі пачынаецца працэс станаўлення самастойнай сістэмы адукацыі, навукі, культуры. На дадзены працэс аказалі істотны ўплыў:

- дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця;
- актывізацыя адукацыйных, навуковых, культурных кантактаў з замежнымі краінамі;
- камерцыялізацыя духоўнай сферы жыцця грамадства.

З мэтай стварэння спрыяльных умоў для далейшага развіцця *адукацыі* ў 1991 г. быў прыняты Закон аб адукацыі. З 1998 г. пачалася рэформа агульнаадукацыйных школ: ажыццяўляўся пераход школ на 12-гадовае навучанне, у тым ліку абавязковае 10-гадовае. Узніклі новыя формы навучальных устаноў: гімназіі, ліцэі, каледжы.

У 1990-я гг. пашырылася сетка *вышэйшых навучальных устаноў*. Сістэма дзяржаўнай вышэйшай адукацыі Беларусі аб'яднала 44 універсітэты і акадэміі. Акрамя таго ўзніклі 20 недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў, з якіх захавалася з часам 12. Значна ўзрастае колькасць асоб, якія атрымалі вышэйшую адукацыю. Так, у 2004 г. студэнтам стаў амаль кожны другі выпускнік сярэдняй школы. Па колькасці студэнтаў у разліку на 10 тыс. насельніцтва Беларусь выйшла на сярэднееўрапейскі ўзровень (300 чалавек), што з'яўляецца найвышэйшым паказчыкам у гісторыі нашай краіны.

Ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу 1991 – 1995 гг. тэмпы развіцця *навуковага патэнцыялу* знізіліся: колькасць супрацоўнікаў, занятых у навуцы, паменшылася ў 2 разы, а фінансаванне з дзяржбюджэту – у 4 разы. Разам з тым, у структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'явіліся новыя навуковыя ўстановы: інстытуты праблем выкарыстання прыродных рэсурсаў і экалогіі, радыёбіялогіі, сацыялогіі, малекулярнай і атамнай фізікі, прыкладной оптыкі і тэхналогіі металаў і інш. У 1993 г. Інстытут ядзернай энергетыкі быў пераўтвораны ў *Акадэмічны навукова-тэхнічны комплекс "Сосны"*, у склад якога ўвайшлі Інстытут праблем энергетыкі, Інстытут радыяцыйных фізіка-хімічных праблем і Інстытут радыёэкалагічных праблем. Навука вызваляецца з-пад дробязнай рэгламентацыі органаў дзяржаўнай улады.

*Для развіцця беларускай мастацкай культуры* характэрны адыход ад афіцыйнага стылю "сацыялістычнага рэалізму"; плюралізм жанраў і стыляў мастацкага адлюстравання з'яў рэчаіснасці, творчы пошук не толькі на аснове ўласных традыцый, але і сусветных тэндэнцый.

У беларускай літаратуры 1990-2000-х гг. ідзе адраджэнне стыляў мінулых літаратурных эпох, фарміруюца накірункі *мадэрнізму* і *постмадэрнізму*. Узнікае вялікая колькасць новых літаратурных аб'яднанняў. Найбольш распаўсюджанымі жанрамі мастацкай літаратуры з'яўляюцца:

- адлюстраванне сацыяльных з'яў рэчаіснасці;
- адлюстраванне гістарычнага мінулага;
- маральна-этычная праблематыка і г.д.

Найбольш значныя прадстаўнікі беларускай літаратуры на сучасным этапе: *Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Святлана Алексіевіч, Ніл Гілевіч, Леанід Дайнека, Алесь Дудараў, Вольга Іпатава, Алесь Разанаў, Іван Пташнікаў і інш.*

Аналагічныя працэсы адбываюцца ў сферы *тэатральнага і музычнага мастацтва*. Традыцыйным стала правядзенне *музычных фестываляў*. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца штогадовы міжнародны фестываль "Славянскі базар" у Віцебску.

У *выяўленчым мастацтве* выразна пашырыліся плюралістычныя тэндэнцыі. Адкрыліся недзяржаўныя галерэі, з'явіліся неафіцыйныя творчыя аб'яднанні. Традыцыйна высокім прафесіяналізмам вызначаецца *беларуская школа графікі*, у тым ліку работы В. Шаранговіча, Ю. Герасіменкі-Жызнеўскага і інш. Шырокую вядомасць атрымалі *мастакі* М. Савіцкі, М. Селяшчук, А. Ксяндзоў. Традыцыі *беларускай школы скульптуры* працягваюць В. Борзды, В. Ковач, К. Селіханаў, У. Жбанаў.

Акрамя стварэння новых культурных каштоўнасцей перад грамадствам паўстала пытанне *захавання гістарычнай спадчыны*. У маі 1993 г. быў прыняты *Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны"*. Помнікі культурней спадчыны сканцэнтраваны ў 138 музеях і іх філіялах – гістарычных, краязнаўчых, літаратурна-мемарыяльных, мастацкіх.

*Такім чынам, у перыяд пасля абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці Беларусі адбываецца працэс дэмакратызацыі ў галіне адукацыі, навукі,*

*культуры; духоўная сфера жыцця беларускага грамадства ўключаецца ў сусветныя сацыяльна-культурныя працэсы.*

**Асноўныя паняцці:**

Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, Закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”, Рэспубліка Беларусь, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, парламенцкая рэспубліка, Вярхоўны Савет, Савет Міністраў, шматпартыйнасць, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт РБ, Канстытуцыйны Суд РБ, прэзідэнцкая рэспубліка, рэферэндум 1995 г., рэферэндум 1996 г., дэкрэты, Нацыянальны сход РБ, Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, рэферэндум 2004 г., шматвектарная знешняя палітыка, глабалізацыя, Саюз Беларусі з Расіяй, Адзіная эканамічная прастора, ЕўразЭС, “Усходняе партнёрства”, радзяржаўленне, прыватызацыя, лібералізацыя цэн, Нацыянальны банк, беларускі рубель, эканамічны крызіс 1991-1995 гг., эканамічны ўздым 2000-2008 гг., сумесныя прадпрыемствы, свабодныя эканамічныя зоны.

**Кантрольныя пытанні і заданні:**

1. Калі была ўхвалена Дэкларацыя аб незалежнасці Беларусі? Дайце агульную характарыстыку дадзенага дакумента. Якія падзеі абумовілі яго з’яўленне?
2. Калі Дэкларацыя аб незалежнасці Беларусі набыла статус канстытуцыйнага закона? Якія падзеі гэта абумовілі?
3. Якія дзяржаўна-палітычныя пераўтварэнні былі праведзены ў Беларусі пасля правалу жнівеньскага путчу?
4. Якую рэакцыю атрымала абвяшчэнне незалежнасці Беларусі на міжнароднай арэне?
5. Якія асноўныя перыяды можна вылучыць у грамадска-палітычным развіцці Рэспублікі Беларусь у 1990-2000-я гг.? У чым іх спецыфіка?
6. Вызначце асаблівасці функцыянавання органаў дзяржаўнай улады РБ у перыяд парламенцкай рэспублікі.
7. Якія працэсы характарызуюць грамадска-палітычнае жыццё Беларусі ў першай палове 1990-х гг.? Якія склаліся ў гэты перыяд асноўныя грамадска-палітычныя сілы?
8. Назавіце буйнейшыя палітычныя партыі Беларусі, якія склаліся ў першай палове 1990-х гг.
9. Калі была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь? Дайце агульную характарыстыку першай рэдакцыі Асноўнага закона.
10. Калі адбыліся першыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі? Якім чынам была пераўладкавана сістэма дзяржаўнай улады пасля 1994 г.?
11. Якія пытанні выносіліся на рэферэндумы 1995 і 1996 гг.? Якімі былі палітычныя наступствы гэтых рэферэндумаў?
12. Якім чынам арганізавана сістэма дзяржаўнай улады ў РБ паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі 1996 г.?

13. Дайце агульную характарыстыку грамадска-палітычнага жыцця ў РБ у 1996 – 2010 гг. назавіце буйнейшыя палітычныя падзеі гэтага перыяду.
14. Вызначце асноўныя накірункі знешняй палітыкі РБ у 1990-2000-я гг.
15. Якое месца займае Беларусь у сусветным працэсе глабалізацыі? Падумайце, якія могуць быць перспектывы міжнароднай дзейнасці РБ?
16. Якую ролю адыграла Беларусь у фарміраванні і дзейнасці СНД? Якія органы СНД знаходзяцца на тэрыторыі РБ?
17. Дайце агульную характарыстыку адносін Беларусі з Расіяй у 1990-2000-я гг. Вызначце дасягненні і няўдачы ў працэсе дзяржаўнай інтэграцыі Беларусі і Расіі?
18. У склад якіх інтэграцыйных структур, утвораных на тэрыторыі былога СССР, уваходзіць РБ?
19. Які характар маюць адносіны Беларусі з краінамі Еўрапейскага саюза? Што такое "Усходняе партнёрства"?
20. Укажыце асноўныя праявы сацыяльна-эканамічнага крызісу 1991 – 1995 гг. Вызначце прычыны крызісу.
21. Якія змены ў структуры ўласнасці адбыліся ў эканоміцы РБ у першай палове 1990-х гг.?
22. Дайце характарыстыку сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў РБ у другой палове 1990-х гг. Якія меліся пазітыўныя і негатыўныя рысы ў эканамічным развіцці дадзенага перыяду?
23. Вызначце асноўныя прыярытэты дзяржаўнай эканамічнай палітыкі ў 2000-я гг.
24. Прааналізуйце дынаміку эканамічнага росту ў 2000 – 2008 гг. Укажыце асноўныя прычыны эканамічнага ўздыму.
25. Які характар мае структура прамысловасці Беларусі ў сучасны перыяд? Якія галіны прамысловасці найбольш эфектыўна развіваюцца ў 2000-я гг.?
26. Дайце агульную характарыстыку знешнеэканамічнай дзейнасці РБ у 2000-я гг. Якія дзяржавы з'яўляюцца асноўнымі знешнеэканамічнымі партнёрамі Беларусі на сучасным этапе?
27. Вызначце асноўныя асаблівасці развіцця духоўнай сферы грамадства ў Беларусі ў 1990-2000-я гг.
28. Якія змены адбываюцца ў сістэме вышэйшай адукацыі Беларусі ў 1990-2000-я гг.?
29. Ахарактарызуйце становішча беларускай навукі ў 1990-2000-я гг.
30. Якія асноўныя тэндэнцыі можна вылучыць у развіцці мастацкай культуры Беларусі ў 1990-2000-я гг.

**Тэмы дакладаў і рэфератаў**:

1. Фарміраванне інстытутаў і атрыбутаў незалежнай дзяржавы ў Беларусі.
2. Палітычныя партыі ў Беларусі ў 1990-2000-я гг.
3. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных інстытутаў у незалежнай РБ.
4. Роля Беларусі ў стварэнні дзейнасці Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

5. Палітычныя і эканамічныя ўзаемаадносіны Беларусі з краінамі Еўрапейскага Саюза ў 1990-2000-я гг.
6. Развіццё фінансава-крэдытнай сістэмы ў незалежнай Беларусі.
7. Дзейнасць свабодных эканамічных зон у Беларусі ў 1990-2000-я гг.
8. Беларуская навука на сучасным этапе: дасягненні, цяжкасці, перспектывы.

## НАЙБОЛЬШ ЗНАЧНЫЯ ДАТЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

100 – 40 тыс. гг. да н.э. - з’яўленне першых людзей на тэрыторыі Беларусі.

Канец 3 – пачатак 2 тыс. да н.э. – засяленне тэрыторыі Беларусі індаеўрапейцамі.

5 – 10 ст. н.э. – засяленне тэрыторыі Беларусі славянскімі плямёнамі.

862 г. – першая ўзгадка ў летапісе аб Полацку.

980 г. – першая ўзгадка ў летапісе аб Тураве.

Каля 988 г. – увядзенне хрысціянства ва Ўсходняй Еўропе.

992 г. – заснаванне Полацкай епархіі.

1003 – 1044 гг. – княжанне ў Полацку Брачыслава Ізяслававіча.

1021 г. – разрабаванне палачанамі Ноўгарада, бітва на р. Судамір, далучэнне да Полацкага княства Віцебска, Усвятаў і волакаў паміж Дняпром і Заходняй Дзвіной.

1044 – 1101 гг. – княжанне ў Полацку *Усяслава Брачыслававіча “Чарадзея”*.

Сярэдзіна 11 ст. – пабудова ў Полацку Сафійскага сабору.

1066 г. – разрабаванне палачанамі Ноўгарада.

3 сакавіка 1067 г. – бітва на р. Няміга, першая ўзгадка аб Менску.

1101 г. – падзел тэрыторыі Полацкага княства на *ўдзельныя княствы*: Віцебскае, Менскае, Ізяслаўскае, Лагойскае, Друцкае, Лукомскае. Пачатак перыяду *феадальнай раздробленасці*.

1127 г. – сумесны паход кааліцыі рускіх князёў супраць Полацкай зямлі.

1151 – 1161 гг. – полацка-менская міжусобная вайна.

1158 – 1162 гг. – пачатак самастойнасці Тураўскага княства.

1161 г. – зроблены крыж Лазарам Богшам па замове Еўфрасінні Полацкай.

1203 і 1206 гг. – паходы палачан на крыжацкія замкі Ікскуль і Гольм.

1223 г. – мір Полацка і Смаленска з крыжакамі, страта Полацкам сваіх уладанняў у Ніжнім Падзвінні, замацаванне свабоды гандлю па Зах. Дзвіне.

1239 – 1242 гг. – падчас паходаў мангола-татар на Кіеў і Польшчу спалены Гомель, Тураў, Мазыр, Пінск, Берасце.

Каля 1246 – 1263 гг. – княжанне Міндоўга у Новагародку, стварэнне ВКЛ.

1260 г. – разгром крыжакоў каля возера Дурбэ войскамі Міндоўга, палачан і жамойтаў.

1264 – 1267 гг. – княжанне *Войшалак*а у ВКЛ, далучэнне да ВКЛ дайновы, нальшанаў і гальшанаў.

1270–1282 гг. – княжанне ў ВКЛ Тройдзеня. Пазбаўленне ВКЛ ад васальнай залежнасці ад Галіцка-Валынскага княства, далучэнне Гародні і Слоніма.

Каля 1293 – 1316 гг. – княжанне ў ВКЛ *Віценя.*

1307 г. – далучэнне Полацка да ВКЛ паводле дагавора (рада).

1316 – 1341 гг. – княжанне ў ВКЛ Гедыміна. Уключэнне ў склад ВКЛ Віцебскага, Менскага, Турава-Пінскага, Берасцейскага княстваў, Падляшша. Перанос сталіцы ВКЛ у Вільню (1323 г.).

1345 – 1377 гг. – княжанне ў ВКЛ *Альгерда.*

1358 – 1359 гг. – далучэнне да ВКЛ тэрыторый сярэдняга Падняпроўя, Мсціслаўскага і Бранскага княстваў.

*1362 г. – бітва войскаў ВКЛ супраць Залатой арды пад Сінімі водамі,* далучэнне да ВКЛ Кіеўскай, Чарнігаўскай землі, Падолля, Валыні.

1368, 1370, 1372 гг. – паходы войска ВКЛ на Маскву.

1377 – 1392 гг. – княжанне ў ВКЛ Ягайлы. Барацьба за ўладу паміж Ягайлам, Андрэем Полацкім, Кейстутам, Вітаўтам.

15 жніўня 1385 г. – **Крэўская унія**.

1387 г. – наданне магдэбурскага права Вільні.

1387 г. – хрышчэнне ў каталіцкую веру балцкага насельніцтва Літвы; прывілей Ягайлы каталіцкай шляхце.

1390 г. – наданне магдэбурскага права Берасцю.

1391 г. – наданне магдэбурскага права Гародні.

1392–1430 гг. – княжанне ў ВКЛ Вітаўта.

1399 г. – разгром войска ВКЛ войскамі Залатой Арды на р. Ворскла.

1409 – 1411 гг. – “Вялікая вайна” паміж ВКЛ і Польшчай і Ордэнам.

15 ліпеня 1410 г. – Грунвальдская бітва.

1413 г. – Гарадзельская унія, устанаўленне манаполіі католікаў на займанне вышэйшых дзяржаўных пасад у ВКЛ.

1424 – 1427 гг. – далучэнне Таўрыды да ВКЛ, прызнанне васальнай залежнасці ад ВКЛ Маскоўскага, Разанскага, Пераяслаўскага княстваў.

1430 – 1432 гг. – княжанне ў ВКЛ Свідрыгайлы.

1432 – 1340 гг. – княжанне ў ВКЛ Жыгімонта Кейстутавіча.

1432 – 1439 гг. – грамадзянская вайна ў ВКЛ.

1440–1492 гг. – княжанне Казіміра Ягайлавіча.

1447 г. – выданне “прывілея Казіміра”.

1492–1506 гг. – княжанне ў ВКЛ *Аляксандра Казіміравіча.*

1492–1494 гг. і 1500–1503 гг. – паражэнні ВКЛ у войнах з Маскоўскай дзяржавай, страта Чарнігаўскай, Ноўгарад-Северскай, Бранскай і Гомельскай землі на карысць Масковіі.

1498 г. – наданне магдэбурскага права Полацку.

1499 г. – наданне магдэбурскага права Менску.

1506 г. – перамога войска ВКЛ над татарамі пад Клецкам.

1506–1548 гг. – княжанне ў ВКЛ Жыгімонта Старога.

1507–1508, 1512–1522, 1534–1537 гг. – войны ВКЛ з Масковіяй, страта Смаленска, Себежа, вяртанне Гомеля.

*8 верасня 1514 г.* – перамога ВКЛ над маскоўскім войскам пад Оршай.

1517 г. – выданне ў Празе Ф. Скарынам першай кнігі на старабеларускай мове.

1522 г. – выданне Ф. Скарынам першых кніг на тэрыторыі ВКЛ у ўласнай друкарні ў Вільні.

1523 г. – выданне М. Гусоўскім паэмы “Песня пра зубра”.

1529 г. – выдадзены І статут ВКЛ.

1548–1572 гг. – княжанне ў ВКЛ і Польшчы *Жыгімонта Аўгуста.*

1553 г. – выданне пратэстанцкай Бібліі ў Берасці на грошы М. Радзівіла Чорнага.

1557 г. – “Валочная памера” ў ВКЛ.

1558 – 1582 гг. – Інфлянцкая і Полацкая вайна ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай.

1563 г. – Віленскі прывілей: ураўнаванне ў палітычных правах шляхты ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў.

1564 г. – Бельскі прывілей: стварэнне выбарных шляхецкіх земскіх судоў, абвяшчэнне роўнасці ўсёй шляхты перад законам.

1566 г. – зацверджаны ІІ статут ВКЛ.

1 ліпеня 1569 г. – Люблінская унія. Стварэнне Рэчы Паспалітай.

1573 г. – выданне “Генрыкавых артыкулаў”, абмежаванне ўлады караля.

1576–1586 гг. – каралянванне ў Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя.

1579 г. – заснаванне Віленскай езуіцкай акадэміі.

1581 г. – заснаванне Полацкага езуіцкага калегума.

1588 г. – зацверджаны ІІІ статут ВКЛ.

1588–1532 гг. – каралянванне ў Рэчы Паспалітай Жыгімонта Вазы.

1594-1596 гг. – казацкае паўстанне С. Налівайкі 1594-1596 г.

1596 г. – Берасцейская царкоўная унія.

1600 – 1611 гг. і 1617 – 1629 гг. – войны Рэчы Паспалітай са Швецыяй, страта ВКЛ Рыгі.

1605 г. – перамога войска ВКЛ над шведскім войскам пад Кірхольмам

1606 – 1609 гг. – рокаш М. Зэбджыдоўскага – Я. Радзівіла.

1609-1618 гг. – вайна з Маскоўскай дзяржавай; вяртанне Смаленска, Чарнігава, Ноўгарад-Северскай зямлі Рэчы Паспалітай.

1621 г. – Хоцімская вайна з Турцыяй.

1623 г. – забойства праваслаўнымі ў Віцебску полацкага ўніяцкага арцыбіскупа Іасафата Кунцэвіча.

1632 – 1648 гг. – кіраванне ў ВКЛ і Польшчы Ўладыслава Вазы.

1632 г. – аднаўленне правоў праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай.

1648 – 1668 гг. – кіраванне Яна Казіміра Вазы ў ВКЛ і Польшчы.

1648 – 1651 гг. – казацка-сялянская вайна на тэрыторыі Беларусі.

1654-1667 гг. – войны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай, Швецыяй, Трансільваніяй.

1655 г. –Кейданская унія паміж ВКЛ і Швецыяй.

1660-1661 гг. – перамогі войска ВКЛ і Польшчы над маскоўскімі войскамі каля р. Палонкай, р. Басяй, пад Кушлікамі.

1669-1673 гг. – кіраванне ў РП Міхаіла Карыбута Вішнявецкага.

1674 – 1696 гг. – кіраванне ў РП Яна Сабескага.

1686 г. –“Вечны мір” паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай. Замацаванне ў складзе Масковіі Смаленскай зямлі.

1697 – 1733 гг. – кіраванне ў РП Аўгуста II Моцнага.

1697-1704 гг. – грамадзянская вайна ў ВКЛ паміж “сапежынцамі” і “рэспубліканцамі”.

1700 – 1721 гг. – Паўночная вайна.

1705-1708 гг. – вайна паміж шведскімі і расійскімі войскамі на тэрыторыі ВКЛ.

1710 г. – выхад РП з Паўночнай вайны, вывад расійскіх войскаў.

1717 г. – рашэннямі “нямога” сойму абмяжоўвалася ўлада вышэйшых дзяржаўных асоб, пацверджана права лібэрум вета; скарочана войска ВКЛ (да 6 тыс. чал.) і Польшчы (да 18 тыс. чал.).

1720- гг. – з’яўленне першых мануфактур у ВКЛ.

1733 – 1763 гг. – кіраванне ў РП Аўгуста III Саса.

1764 – 1795 гг. – кіраванне ў РП Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

1764-1766 гг. – спроба дзяржаўных рэформ у РП.

1767 – 1768 гг. – стварэнне Радамскай, Торунскай і Слуцкай канфедэрацый.

1768-1772 гг. – вайна Барскіх канфедэратаў з расійскімі войскамі ў ВКЛ.

5 жніўня 1772 г. – I падзел Рэчы Паспалітай.

1773 – 1775 і 1788-1792 гг. – працяг рэформаў на вальных соймах РП.

1773 г. – стварэнне Адукацыйнай камісіі.

1783 г. – пераўтварэнне Віленскай езуіцкай акадэміі ў Галоўную школу ВКЛ.

3 мая 1791 г. – абвяшчэнне Канстытуцыі Рэчы Паспалітай.

1793 г. – II падзел Рэчы Паспалітай і адмена канстытуцыі 3 мая 1791 г.

1794 г. – нацыянальна-вызваленчае паўстанне на чале з Т. Касцюшкам.

1794 г. – увядзенне яўрэйскай мяжы аселасці, забарона яўрэям займацца земляробствам і высяленне іх у гарады.

25 лістапада 1795 г. – III падзел і ліквідацыя Рэчы Паспалітай.

1812 г. – вайна паміж Расіяй і Францыяй на тэрыторыі Беларусі.

1812 г. – заснаванне Полацкай езуіцкай акадэміі на базе калегіума.

1817-1823 гг. – дзейнасць тайных таварыстваў філаматаў, філарэтаў, прамяністых і іх філіялаў у Вільні, Полацку, Менску, Свіслачы.

1820 г. – закрыццё Полацкай езуіцкай акадэміі. Забарона моладзі вучыцца за межамі Расійскай імперыі.

1820-я гг. – заснаванне першых фабрык у Беларусі.

Снежань 1825 г. – спроба дзекабрыстаў узняць антыцарскае паўстанне ў Бабруйскай крэпасці.

1830-1831 г. – шляхецкае паўстанне ў Беларусі.

1832 г. – закрыццё Віленскага ўніверсітэта.

1837-1841 гг. – рэформа П. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы.

1839 г. – Полацкі царкоўны сабор, скасаванне уніі і далучэнне грэка-каталіцкай царквы да Рускай праваслаўнай царквы.

1840 г. – скасаванне дзеяння Статута 1588 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі, забарона ужывання назваў "Беларусь" і "Літва".

1840 г. – стварэнне Горы-Горацкай земляробчай школы, з 1848 г. інстытута (дзейнічаў да 1864 г.).

1858 г. – стварэнне губернскіх камітэтаў і пачатак падрыхтоўкі да адмены прыгоннага права.

19 лютага 1861 г. – аграрная рэформа – адмена прыгоннага права.

1863 – 1864 гг. – нацыянальна-рэвалюцыйнае паўстанне ў Беларусі пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

1863 – 1864 гг. – адмена часоваабавязанага становішча і змяншэнне выкупных плацяжоў на тэрыторыі Беларусі на 20%.

1864 г. – адукацыйная рэформа; стварэнне агульнасаслоўнай адукайнай сістэмы.

1864 г. – (у Беларусі 1872 – 1882 гг.) – судовая рэформа; стварэнне агульнасаслоўных судоў.

1870 г. – (у Беларусі 1875 г.) – гарадская рэформа; увядзенне сістэмы гарадскога самакіравання.

1874 г. – ваенная рэформа; увядзенне ўсеагульнай вайсковай павіннасці ў залежнасці ад ступені адукацыі замест рэкрутчыны.

Другая палова 1870-х – пачатак 1880-х гг. – фарміраванне народніцкага руху. Раскол "Зямлі і волі" на "Народную волю" і "Чорны перадзел".

1881 г. – забойства Аляксандра II народавольцам І. Грынявіцкім.

1884 г. – стварэнне ў Пецярбурзе Беларускай сацыял-рэвалюцыйнай групы "Гоман".

1886 г. – заснаванне першай легальнай незалежнай газеты ў Беларусі "Минский листок".

1887 – 1892 гг. – контррэформы Аляксандра III.

1897 г. – стварэнне Бунда.

1898 г. – запуск першага трамвая ў Віцебску.

1898 г. – першы з'езд РСДРП у Мінску.

1902 г. – стварэнне Партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР, эсэры).

1903 г. – заснаванне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ).

1905 – 1907 гг. – першая рэвалюцыя ў Расіі.

17 кастрычніка 1905 г. – Маніфест цара Мікалая II аб увядзенні грамадзянскіх правоў у Расіі і заканадаўчай Думы.

1 верасня 1906 – люты 1907 гг. – дзейнасць першай легальнай беларускамоўнай газеты “Наша доля”.

Лістапад 1906 – жнівень 1915 гг. – выданне беларускамоўнай газеты “Наша ніва”.

Лістапад 1906 г. – пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы.

1911 г. – земская рэформа.

1 жніўня 1914 г. – пачатак Першай сусветнай вайны.

Верасень-кастрычнік 1915 г. – Свянцянскі прарыў германскага войска і стабілізацыя фронта па лініі Браслаў-Паставы-Карэлічы-Баранавічы-Пінск.

23 лютага – 2 сакавіка 1917 г. – Лютаўская рэвалюцыя ў Расіі, звяржэнне самаўладдзя, стварэнне Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў і Часовага ўраду.

25-26 кастрычніка 1917 г. – Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Петраградзе.

2 лістапада 1917 г. – усталяванне Савецкай улады ў Мінску.

14-18 снежня 1917 г. – правядзенне I Усебеларускага з’езду. Стварэнне Рады Ўсебеларускага з’езду.

21 лютага 1918 г. – I устаўная грамата БНР. Абвяшчэнне Рады Ўсебеларускага з’езду і Народнага сакратарыяту вышэйшай уладай у Беларусі.

3 сакавіка 1918 г. – Брэсцкі мір; падзел тэрыторыі Беларусі паміж РСФСР і Германіяй.

9 сакавіка 1918 г. – II устаўная грамата БНР. Абвяшчэнне суверэнітэта беларускай дзяржавы – Беларускай Народнай Рэспублікі.

25 сакавіка 1918 г. – III устаўная грамата БНР. Абвяшчэнне незалежнасці БНР.

Лістапад 1918 – люты 1919 гг. – дэнансацыя РСФСР Брэсцкага міру; вывад германскіх войскаў і заняцце тэрыторыі Беларусі Чырвонай арміяй.

1 студзеня 1919 г. – першае абвяшчэнне БССР.

16 студзеня 1919 г. – рашэнне ЦК РКП(б) аб перадачы РСФСР Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў. Урадавы крызіс у БССР.

1919 – 1921 гг. – правядзенне палітыкі “ваеннага камунізму”.

Люты 1919 – ліпень 1920 гг. – Літоўска-Беларуская ССР.

Люты 1919 – кастрычнік 1920 гг. – савецка-польская вайна.

31 ліпеня 1920 г. – II абвяшчэнне БССР.

Лістапад 1920 г. – рэйд атрадаў С.Булак-Балаховіча на Палессі.

27 лістапада - 28 снежня 1920 гг. – Слуцкае ўзброенае паўстанне.

1921 – 1924 гг. – устанаўленне аднапартыйнай сістэмы ў БССР.

***18 сакавіка 1921 г. –*** падпісанне Рыжскага міру паміж РСФСР і Польшчай.

1921 г. – адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Мінску.

1921 г. – прыняцце першай Канстытуцыі Польскай Рэспублікі.

1922 г. – адкрыццё Інбелкульта (1929 – Акадэмія навук БССР) ў Мінску.

1922 – 1926 гг.– дзейнасць Беларускага пасольскага клубу ў польскім парламенце.

1921 – 1927 гг. – правядзенне новай эканамічнай палітыкі ў БССР.

30 снежня 1922 г. – удзел дэлегацыі БССР у стварэнні СССР.

Сакавік 1924 г. – першае ўзбуйненне БССР; далучэнне 15 паветаў Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў.

Ліпень 1924 г. – абвяшчэнне палітыкі беларусізацыі ў БССР.

Май 1926 г. – устанаўленне "санацыйнага" рэжыму ў Польшчы.

Снежань 1926 г. – другое ўзбуйненне БССР; далучэнне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў.

Студзень 1927 г. – разгром польскімі ўладамі БСРГ.

1928 – 1932 гг. – I пяцігодка; пачатак індустрыялізацыі ў БССР. Стварэнне планавай эканомікі.

Зіма 1929-1930 гг. – пачатак масавай калектывізацыі ў БССР.

1930-я гг. – фарміраванне таталітарнага рэжыму ў СССР.

1930 г. – справа "Саюзу вызвалення Беларусі"; пачатак масавых рэпрэсій ў БССР.

1937-1938 гг. – пік масавых рэпрэсій у БССР.

23 жніўня 1939 г. – "пакт Молатава-Рыбентропа".

1 верасня 1939 г. – пачатак Другой сусветнай вайны.

17 верасня 1939 г. – уваход савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Белаарусі.

28-30 кастрычніка 1939 г. – Народны сход Заходняй Беларусі ў Беластоку. Абвяшчэнне аб далучэнні Заходняй Беларусі да БССР.

10 кастрычніка 1940 г. – перадача Вільні Літве.

1940-1941 гг. – масавыя дэпартацыі насельніцтва ("варожых элементаў") з Заходняй Беларусі.

22 чэрвеня 1941 г. – пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

28 чэрвеня 1941 г. – захоп нямецка-фашысцкімі войскамі Мінска.

3-27 ліпеня 1941 г. – абарона Чырвонай арміяй Магілёва.

Канец жніўня 1941 г. – усталяванне нямецкай акупацыі над усёй тэрыторыяй БССР.

Май 1942 г. – пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) на чале з першым сакратаром ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкам.

Верасень 1942 г. – створаны Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР), які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П. Калінін.

Жнівень-верасень 1943 г. – I этап "Рэйкавай вайны".

Другая палова верасня – кастрычнік 1943 г. – II этап "Рэйкавай вайны" ("Канцэрт").

Верасень 1943 г. – вызваленне савецкімі войскамі Камарына і Крычава.

Лістапад 1943 г. – вызваленне савецкімі войскамі Гомеля і Рэчыцы.

Снежань 1943 г. – стварэнне Беларускай цэнтральнай рады (БЦР).

Чэрвень-ліпень 1944 г. – III этап "Рэйкавай вайны"

23 чэрвеня –1944 г. – пачатак аперацыі “Баграціён” і вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

3 ліпеня 1944 г. – вызваленне Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

28 ліпеня 1944 г. – вызваленне Брэста ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; завяршэнне аперацыі “Баграціён”.

8-9 мая 1945 г. – капітуляцыя нацысцкай Германіі; канец Вялікай Айчыннай вайны.

1945 – 1950 гг. – пятая пяцігодка ўзнаўлення эканомікі БССР. Знішчэнне антысавецкага падполля ў БССР.

1949 – 1952 гг. –калектывізацыя ў Заходняй Беларусі.

Люты 1956 г. – XX з’езд КПСС; асуджэнне сталінізму, пачатак “адлігі” ў грамадскім жыцці СССР.

1956 – 1965 гг. – беларус К. Мазураў быў першым сакратаром ЦК КПБ.

1956 г. – адкрыццё тэлевізійнага цэнтру ў Мінску.

1962 г. – адміністрацыйная рэформа ў БССР, стварэнне 6 сучасных абласцей.

1963 г. – “год вялікай хіміі”; запуск вытворчасцяў хімічных прадпрыемстваў: Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод, “Беларуськалій” у Салігорску, азотна-тукавы завод “Азот” у Гродне.

1965 – 1980 гг. – кіраўніцтва ў ЦК КПБ П. Машэрава.

1965 г. – “касыгінская” эканамічная рэформа.

1969 г. – замацаванне правоў калгаснікаў на гарантаваную аплату працы і пенсіі па старасці.

1972 г. – пісьмо І.Мележа ў ЦК КПБ. Стварэнне выдавецтва “Мастацкая літаратура” для выдання кніг на беларускай мове.

1974 г. – разгром на XXVI з’ездзе КПСС “нацыяналістаў”? у т.л. у БССР.

1978 г. – чацвёртая Канстытуцыя БССР.

1985-1991 гг. – перабудова ў СССР.

26 красавіка 1986 г. – аварыя на Чарнобыльскай АЭС.

1988 г. – абвяшчэнне палітыкі галоснасці ў СССР.

Чэрвень 1989 г. – стварэнне Беларускага народнага фронту; пачатак фарміравання шматпартыйнай сістэмы ў Беларусі.

Сакавік – красавік 1990 г. – першыя альтэрнатыўныя выбары ў Вярхоўны Савет БССР.

**27 ліпеня 1990 г.** – прыняцце Вярхоўным саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

25 жніўня 1991 г. – наданне статуса закону Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР.

19 верасня 1991 г. – перайменаванне БССР у Рэспубліку Беларусь.

8 снежня 1991 г. – стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

25 снежня 1991 г. – спыненне існавання СССР.

15 сакавіка 1994 г. – прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

10 ліпеня 1994 г. – абранне першым прэзідэнтам Беларусі А. Лукашэнкі.

14 мая 1995 г. – выбары ў Вярхоўны Савет Беларусі XIII склікання і першы рэферэндум. Змена дзяржаўнай сімволікі, увядзенне рускай мовы у якасці другой дзяржаўнай, дазвол прэзідэнту на роспуск парламента.

24 лістапада 1996 г. – другі рэспубліканскі рэферэндум; пераход палітычнай сістэмы Беларусі да прэзідэнцкай рэспублікі.

2 красавіка 1997 г. – дагавор аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі.

9 верасня 2001 г. – пераабранне А. Лукашэнкі на другі прэзідэнцкі тэрмін.

17 кастрычніка 2004 г. – трэці рэспубліканскі рэферэндум; зняцце абмежаванняў па колькасці абранняў для аднаго чалавека на пасаду прэзідэнта.

19 сакавіка 2006 г. – пераабранне А. Лукашэнкі на трэці прэзідэнцкі тэрмін.

19 снежня 2010 г. – пераабранне А. Лукашэнкі на чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін.

## ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

*Аблвыканкамзах* (Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту) – вышэйшы орган Савецкай улады на тэрыторыі Заходняга фронту і Заходняй вобласці (Мінская, частка Віленскай, Магілёўкая, Віцебская, з красавіка 1918 г. Смаленская губерні); дзейнічаў з 26 лістапада 1917 г. да 2 студзеня 1919 г.

*Адраджэнне (Рэнесанс)* – агульнаеўрапейскі культурны рух 14-16 стст., фармальна накіраваны на ўзнаўленне антычнай культурнай спадчыны, у межах яго сцвярджаліся прынцыпы гуманізму, годнасці чалавечай асобы.

*Адукацыйная камісія* – дзяржаўная ўстанова па кіраванні і арганізацыі сістэмы адукацыі ў Рэчы Паспалітай у 1773 – 1795 гг.

*Акруговыя суды* – усесаслоўныя органы судовай улады ў губернях Расійскай імперыі, створаныя паводле судовай рэформы 1864 г. (у беларускіх губернях у 1882 г.).

*Акцыянерныя кампаніі* – фінансава-прамысловыя групы, у межах якіх аб’ядноўваліся капіталы некалькіх асобных уласнікаў.

*Анімізм* – вера ў існаванне душы, духаў у прыродзе і чалавеку.

*Антыклерыкалізм* – ідэйная плынь, накіраваная супраць прывілеяванага статусу царквы і традыцыйнага рэлігійнага светапогляду.

*Антытрынітарызм* – рэлігіны накірунак у хрысціянстве, прадстаўнікі якога адмаўляюць дагмат аб Тройцы (адзінстве Бога ў трох асобах) і сцвярджаюць наяўнасць адной асобы Бога і чалавечую прыроду Ісуса Хрыста; быў распаўсюджаны ў ВКЛ у другой палове 16 – першай палове 17 стст.

*Асадніцтва* – сістэма перадачы надзелаў зямлі былым польскім вайскоўцам у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне ў 1920-1930-я гг. бясплатна, альбо з

дапамогай невялікіх ільготных крэдытаў з мэтай умацавання сацыяльнай базы дзяржаўнай ўлады і правядзення паланізацыі на гэтых тэрыторыях.

*Асветніцтва* – агульнаеўрапейскі грамадскі і культурны рух 18 ст., накіраваны на перабудову ўсіх сфер сацыяльнага жыцця на аснове прынцыпаў розуму і навукі.

*Аўтарытарызм* – тып палітычнага рэжыму, заснаваны на поўным кантролі дзяржавы ў палітычнай сферы жыцця грамадства пры захаванні адноснай свабоды ў сацыяльнай, эканамічнай і духоўнай сферах.

*Базыльяне* – прадстаўнікі ўніяцкага манаскага ордэна (1617-1839 гг.).

*Барока* – стыль у еўрапейскай мастацкай культуры ў канцы 16 – першай палове 18 стст., для якога характэрныя дынамічнасць і пышнасць твораў, эмацыйнае і інтэлектуальнае напружанне кампазіцый.

*Батлейка* – лялечны тэатр у народнай беларускай культуры.

*Баяры* – ваеннаслужылыя людзі ў раннефеадальных княствах і ВКЛ ў 13 – 16 стст. (з сярэдзіны 16 ст. часткова ўліліся ў саслоўе шляхты).

*Беларусізацыя* – афіцыйная палітыка ў БССР у 1924–1929 гг., якая прадугледжвала перавод дзяржаўнага справаводства, грамадскіх і адукацыйных устаноў на беларускую мову, вылучэнне на кіруючыя пасады ў дзяржаўных і мясцовых органах улады мясцовых ураджэнцаў, падтрымку развіцця беларускай культуры і г.д.

*Брацкія школы* – навучальныя ўстановы сярэдняга тыпу, якія дзейнічалі пры праваслаўных і уніяцкіх брацтвах Рэчы Паспалітай у канцы 16 – 18 стст.

*Бронзавы век* – перыяд у гісторыі чалавецтва, які характарызуецца выкарыстаннем бронзы ў якасці асноўнага матэрыялу для вырабу прылад працы; у гісторыі Беларусі ахоплівае перыяд 2 – пачатку 1 тыс. да н.э.

*Буржуазія* – грамадскі клас уласнікаў капітала, які атрымлівае даходы ў выніку прамысловай, гандлёвай, крэдытна-фінансавай і іншай прадпрымальніцкай дзейнасці.

*Бурмістр* – вышэйшая адміністрацыйная пасада ў радзе гарадоў з магдэбургскім правам.

*“Ваенная дэмакратыя”* – форма палітычнай арганізацыі грамадства ва ўмовах разлажэння першабытнаабшчыннага ладу і фарміравання дзяржаўнасці; сутнасць яе праяўляецца ва ўзмацненні ўлады ваенных племянных правадыроў, якія выбіраюцца і кантралююцца ў сваёй дзейнасці свабоднымі воінамі – супляменнікамі.

*“Ваенны камунізм”* – назва ўнутранай палітыкі Савецкай дзяржавы ў 1918–1921 гг., накіраванай на мабілізацыю людскіх і матэрыяльных рэсурсаў з дапамогай жорсткіх адміністрацыйных метадаў дзеля патрэб забеспячэння войска ва ўмовах войнаў, якія праводзіла Савецкая дзяржава ў гэты перыяд.

*Валока* – надзел зямлі памерам 21,3 га.

*Валочная памера* – аграрная рэформа ў дзяржаўных уладаннях ВКЛ у 1557 г., сутнасць якой палягала ў падзеле ўсёй зямельнай уласнасці на фіксаваныя адзінкі плошчы (валокі) і вызначэнні дакладнай колькасці павіннасцяў з боку сялян за карыстанне зямельнымі надзеламі.

*Ваяводства* – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ у 15 – 18 стст.

*Ваявода* – кіраўнік адміністрацыйных, гаспадарчых, ваенных і часткі судовых органаў на тэрыторыі ваяводства ў ВКЛ.

*Веча* – агульны сход усіх свабодных дарослых мужчын княства ў Сярэднявеччы. Яго функцыямі з'яўляліся запрашэнне на трон і выгнанне князёў, заключэнне міжнародных дагавораў, абвяшчэнне вайны і заключэнне міру, ажыццяўленне вышэйшага суду.

*Водруб* – зямельны надзел, які выдзяляўся адным кавалкам з абшчыннай зямлі ў індывідуальную сялянскую ўласнасць, без пераносу сядзібы, паводле сталыпінскай аграрнай рэформы ў пачатку 20 ст.

*Войт* – кіраўнік гарадской адміністрацыі і суда ў гарадах з магдэбургскім правам у ВКЛ.

*Воласць* – 1) адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў раннефеадальных княствах і ВКЛ, на якой пражывала насельніцтва, што выплочвала даніну; 2) дробная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імперыі.

*Вотчына* – феадальнае ўладанне з правам поўнага распараджэння і перадачы па спадчыне.

*Выкупныя плацяжы* – дзяржаўныя плацяжы, якія выплочвала сялянства Расійскай імперыі ў 1861 – 1906 гг. у якасці пагашэння грашовай сумы, выдаткаванай царскім урадам на выкуп сялянскіх надзелаў, падчас аграрнай рэформы 1861 г.

*Вялікі князь* – кіраўнік дзяржавы ў ВКЛ, у кампетэнцыю якога ўваходзілі абарона дзяржавы, кіраванне ўнутранай і знешняй палітыкай і адміністрацыйным апаратам дзяржавы, замацаванне заканадаўчых актаў.

*Вярхоўны Савет* – вышэйшы орган заканадаўчай улады ў БССР і Рэспубліцы Беларусь у 1938 – 1996 гг.

*Галоснасць* – палітыка, абвешчаная ў СССР падчас перабудовы ў 1988 г., якая азначала працэс дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.

*Галоўны соймік ВКЛ (генеральны з'езд)*– з'езд абраных на сойм Рэчы Паспалітай паслоў ад ВКЛ напярэдадні агульнадзяржаўнага вальнага сойму.

*Гарадзішчы* – умацаваныя паселішчы ў жалезным веку; рэзідэнцыі племянных правадыроў.

*Гарадская дума* – органі гарадскога самакіравання ў Расійскай імперыі.

*Генерал-губернатарства* – ваенна-палітычная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў Расійскай імперыі, якая ўключала ў сябе тэрыторыі некалькіх губерняў.

*Генеральная акруга* – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка на тэрыторыях СССР, акупіраваных нацысцкай Германіяй у 1941-1944 гг.

"*Генрыкавы артыкулы*" 1573 г. – акт, які ўтрымліваў палажэнні, якія абмяжоўвалі каралеўскую ўладу ў Рэчы Паспалітай; пацвярджаўся каралямі напярэдадні каранацыі.

*Гетман найвышэйшы* – кіраўнік узброенымі сіламі ВКЛ.

*Гільдыі (брацтвы)* – аб’яднанні купцоў у Сярэднявеччы і раннім Новым часе.

*Гістарызм* – метадалагічны прынцып, які прадугледжвае разгляд грамадства як складанай дынамічнай сістэмы, што знаходзіцца ў працэсе пастаяннага змянення і развіцця.

*Гісторыя* – навука аб заканамернасцях функцыянавання грамадстваў на розных этапах іх развіцця.

*Глабалізацыя* – працэс фарміравання адзінай глабальнай сусветнай эканамічнай, палітычнай, інфармацыйнай, культурнай прасторы ў апошняй трэці 20 – пачатку 21 стст.

*Готыка* – мастацкі стыль у еўрапейскіх краінах у 12 – 16 стст., заснаваны на рэлігійна-філасофскіх ідэях Сярэднявечча. Характарызавалася кананічнасцю і ўзнёслымі, спічастымі формамі ў архітэктуры, дэкоры, мастацтве.

*Грамада (абшчына)* – устойлівая форма сацыяльнай арганізацыі сялянства ў традыцыйным грамадстве, якая характарызуецца пэўнай ступенню калектыўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, асаблівасцямі працэсу вытворчасці і сацыяльнага жыцця.

*Грамадска-эканамічная фармацыя* – устойлівы тып грамадства, у аснове якога знаходзіцца пэўны спосаб вытворчасці з уласцівымі яму прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі.

*Грамадскія камітэты парадку* – часовыя органы мясцовай выканаўчай улады, падначаленыя Часоваму ўраду пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

*Гродскі (замкавы) суд* – павятовы суд у ВКЛ, падначалены мясцовай адміністрацыі, у якім разглядаліся найбольш важныя крымінальныя і грамадзянскія справы.

*Губерня* – адзінка адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ў Расійскай імперыі.

*ГУЛАГ* (Галоўнае ўпраўленне папраўча-працоўных лагераў, працоўных пасяленняў і месцаў зняволення) – падраздзяленне сістэмы карных органаў СССР у 1934–1960 гг., якое ажыццяўляла кіраўніцтва ўсімі папраўча-працоўнымі лагерамі ў СССР; важнейшы інструмент сталінскіх рэпрэсій.

*Даніна* – натуральны падатак з залежнага насельніцтва ў эпоху Сярэднявечча.

*Дваранскія сходы* – органы саслоўнага самакіравання дваранства Расійскай імперыі ў 1785–1917 гг.

*Дваяверства* – культурна-рэлігійны феномен, які заключаецца ў паралельным суіснаванні элементаў хрысціянскіх і язычніцкіх вераванняў у традыцыйнай культуры еўрапейскіх народаў.

*Дзекабрысты* – рух ліберальнага дваранства ў Расійскай імперыі ў канцы 1810 – першай палове 1820-х гг., накіраваны на ліквідацыю самадзяржаўя і правядзенне ў грамадстве рэформ; разгромлены пасля няўдалага паўстання ў Пецярбургу 14 снежня 1825 г.

*Дзяржаўная дума* – вышэйшы заканадаўчы орган улады ў Расійскай імперыі ў 1906 – 1917 гг.

*Дружына* – пастаянныя прафесійныя ўзброеныя сілы пры князях у Сярэднявеччы; яе прадстаўнікі з'яўляліся дарадцамі князя ў ажыццяўленні адміністрацыйнага кіравання, суда, зборы даніны.

*Дым* – асобная сялянская гаспадарка, адзінка падаткаабкладання ў ВКЛ.

*Дысідэнты* – назва для прадстаўнікоў некаталіцкіх хрысціянскіх вызнанняў у Рэчы Паспалітай у 17 – 18 стст.

*Дыярыюш* – тып літаратурнага твору ў ВКЛ у 16 – 18 стст., які ўяўляе з сябе збор успамінаў непасрэдных відавочцаў аб пэўных падзеях.

*Дэпартацыя* – прымусовае высяленне насельніцтва з месцаў пражывання.

*Езуіты* – дзеячы каталіцкага манаскага ордэна, створанага ў 1534 г., які адыграў галоўную ролю ў барацьбе супраць Рэфармацыі ў межах контррэфармацыйнага руху, а таксама ва ўмацаванні сацыяльна-палітычных пазіцый папства ў другой палове 16 – першай палове 18 стст.

*Жалезны век* – перыяд у гісторыі чалавецтва, які характарызуецца выкарыстаннем жалеза ў якасці асноўнага матэрыялу для вырабу прылад працы; у гісторыі Беларусі ахоплівае перыяд 8 – 7 стст. да н.э. – 8 ст. н.э.

*Жамойць* – гістарычная балцкая вобласць на паўночным захадзе сучаснай Літвы; уяўляла з сябе асобную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку ў складзе ВКЛ.

*Закупы* – феадальна залежныя сяляне, якія выконвалі павіннасці на карысць землеўладальніка на пэўны час за пазыку ("купу") прадуктамі або грашыма да моманту разліку.

*Запарожская Сеч* – ваенна-палітычная арганізацыя ўкраінскага казацтва ў 16 – 18 стст.

*Заходнерусізм* – гісторыка-ідэалагічны накірунак у грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі ў другой палове 19 – пачатку 20 стст., асновай якога з'яўляецца пастулат аб тым, што Беларусь з'яўляецца часткай Расіі, а беларусы – галіной рускага народу.

*Земскі начальнік* – асобы чыноўнік у Расійскай імперыі ў 1889 – 1917 гг., які спалучаў на пэўнай тэрыторыі адміністрацыйную ўладу ў дачыненні сялян і абмежаваную судовую ўладу ў дачыненні ўсяго насельніцтва.

*Земскі павятовы суд* – выбарны шляхецкі суд у ВКЛ у 16 – 18 стст., які разглядаў большасць крымінальных і грамадзянскіх спраў шляхты.

*Земствы* – выбарныя органы мясцовага самакіравання ў Расійскай імперыі ў 1864 – 1918 гг. (у Віцебскай, мінскай і Магілёўскай губернях у 1911 – 1918 гг.).

*Інвентары* – апісанні феадальных уладанняў у ВКЛ, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў 16 – першай палове 19 стст.

*Індустрыялізацыя* – працэс сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, у выніку якога прамысловая вытворчасць пераўтвараецца ў вядучую галіну эканомікі.

*Індустрыяльнае грамадства* – тып грамадства, ва ўмовах якога важнейшай галіной эканомікі з'яўляецца прамысловасць; яго характэрныя

рысы: разгалінаваны падзел працы, развіццё сродкаў масавай камунікацыі, высокі ўзровень ўрбанізацыі.

*Інфлянты (Лівонія)* – гістарычная назва зямель сучасных Латвіі і Эстоніі.

*Казакі* – ваенізаваная сацыяльная супольнасць, якая склалася ў 15–18 стст. у стэпавай зоне паміж татарскімі ханствамі Прычарнамор'я і Прыкаспія і ўладаннямі ВКЛ, Польскага каралеўства і Маскоўскай дзяржавы.

*Калабарацыя* – супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі.

*Калегіумы* – навучальныя ўстановы сярэдняга тыпу ў ВКЛ у 16–18 стст.; найбольшая колькасць калегіумаў належала езуітам.

*Калектывізацыя* – працэс прымусовага аб'яднання дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак у дзяржаўныя калектыўныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы (*калгасы*) у СССР у 1930-1950-я гг.

*Каманднa-адміністрацыйная сістэма* – від эканамічнай сістэмы і спосаб арганізацыі грамадскіх адносін для якога характэрныя жорсткі цэнтралізм гаспадарчага жыцця на базе манапольнай дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці, наяўнасць шматлікага бюракратычнага апарату, выкарыстанне прымусовых форм працы.

*Камасацыя* – ліквідацыя цераспалосіцы сялянскіх зямель, што суправаджалася, як правіла, перасяленнем сялянскіх двароў на хутары ў Польскай рэспубліцы ў 1920 – 1930-я гг.

*Канвакацыйны сойм* – від сойма ў Рэчы Паспалітай у 16 – 18 стст., які склікаўся падчас бескаралеўя; на ім падводзіліся вынікі папярэдняга праўлення і прызначалася дата выбараў (элекцыі) новага караля.

*Кансерватызм* – сацыяльна-палітычная ідэалогія, якая сцвярджае прыярытэт у грамадстве традыцыйных каштоўнасцяў, сацыяльных, палітычных або рэлігійных устояў; адмоўна ацэньвае хуткія змены і наваўвядзенні ў грамадстве.

*Канстытуцыя (ухвала)* – рашэнне, зацверджанае вальным соймам Рэчы Паспалітай, якое мела заканадаўчую сілу.

*Канфедэрацыя* – часовы палітычны саюз шляхты ў Рэчы Паспалітай, арганізаваны для дасягнення пэўнай мэты.

*Канцлер* – кіраўнік канцылярыі ВКЛ – ведамства, якое ажыццяўляла дзяржаўнае справаводства, захавальнік дзяржаўнай пячаткі ВКЛ.

*Капіталізм* – эканамічная сістэма, якая заснавана на таварна-грашовых рыначных адносінах і кантралюецца капіталам, г.зн. сукупнасцю тавараў, маёмасці, актываў, што выкарыстоўваюцца для атрымання прыбытку.

*"Карэнізацыя"* – элемент палітыкі беларусізацыі ў БССР у 1924–1929 гг., сутнасць якога палягала ў вылучэнні на кіруючыя пасады ў дзяржаўных і мясцовых органах улады мясцовых жыхароў.

*Касінеры* – сяляне ў паўстанцкіх атрадах падчас паўстанняў 1794, 1830 – 1831 і 1863 – 1864 гг., узброеныя пераважна сякерамі і перакаванымі косамі.

*Кашталян* – камандуючы ўзброенымі сіламі ваяводскага замка і апалчэння ваеннаабавязаных пэўнага ваяводства ў ВКЛ.

*Кіеўская Русь* – прынятая ў гістарычнай навуцы назва дзяржавы, якая ўтварылася ва Ўсходняй Еўропе ў 10 – 12 стст. пад кіраўніцтвам кіеўскай княскай дынастыі.

*Класіцызм* – накірунак у еўрапейскай мастацкай культуры другой паловы 17 – пачатку 19 стст., сутнасць якога палягала ў кананізацыі антычнай культуры як дасканалага ўзору і пераносу яе элементаў у сучаснасць (ордэры ў архітэктуры, сюжэты ў літаратуры і гд.).

*Контррэфармацыя* – агульнаеўрапейскі рух другой паловы 16 – першай паловы 18 стст., накіраваны на аднаўленне пазіцый каталіцкай царквы ў рэлігійным і грамадскім жыцці пасля Рэфармацыі.

*Контррэформы* – назва мерапрыемстваў, якія праводзіў царскі ўрад Расійскай імперыі ў 1880 – 1890-я гг., былі накіраваны на ўмацаванне абсалютысцкай дзяржаўнай улады і прывілеяванага становішча дваранства.

*Крыжакі* – прадстаўнікі ваенна-манаскіх каталіцкіх ордэнаў, галоўнай мэтай дзейнасці якіх з’яўлялася распаўсюджанне хрысціянства паводле каталіцкага ўзору шляхам прымусу.

*Крытычны рэалізм* – накірунак у мастацкай культуры 19 – 20 стст., для якога характэрнае крытычнае і рэалістычнае адлюстраванне з’яў сацыяльнай рэчаіснасці.

*Лібералізм* – сацыяльна-філасофская і палітычная ідэалогія 19 – 20 стст., зыходным пастулатам якой з’ўляецца сцвярджэнне індывідуальнай свабоды чалавека ў якасці галоўнай сацыяльнай, палітычнай і культурнай каштоўнасці.

*Ліберальнае народніцтва* – накірунак у межах агульнарасійскага народніцкага руху ў канцы 19 – пачатку 20 стст., для якога былі характэрныя ідэя мірнага эвалюцыйнага пераўладкавання грамадства ў дэмакратычным накірунку, абвяшчэнне інтэлігенцыі галоўнай рухаючай сілай і каталізатарм грамадскага прагрэсу.

*Лібэрум вета* – права на выказванне пратэсту і адзінагалоссе прыняцця рашэнняў, якое мелі соймавыя паслы ў Рэчы Паспалітай у другой палове 16 – 18 стст. Выкарыстанне яго вяло да спынення пасяджэння сойма і адмены ўсіх прынятых на ім пастаноў.

*Лінейны (стадыяльна-паступовы) падыход да вывучэння гісторыі* – навуковы падыход, сутнасць якога палягае ў поглядзе на гісторыю як адзіны працэс паступовага, узыходзячага развіцця чалавецтва, у адпаведнасці з якім вылучаюцца стадыі ў гісторыі (напр., марксізм).

*Людзі лёзныя* – дэкласіраваныя элементы ў часы ВКЛ; асобы, пазбаўленыя сродкаў для існавання і пастаяннага занятку.

*Людзі непахожыя* – сяляне ў ВКЛ, якія выконвалі павіннасці і былі асабіста залежнымі ад землеўладальніка; без яго дазволу яны не мелі права змяняць месца жыхарства.

*Людзі пахожыя* – сяляне ў ВКЛ, якія з’яўляліся асабіста свабоднымі, выконвалі павіннасці на карысць уладальніка зямлі, але мелі права змены месца жыхарства.

*Магдэбургскае права* – права на самакіраванне гарадоў і мястэчак у ВКЛ.

*Магістрат* – орган гарадскога самакіравання ў гарадах з магдэбургскім правам у ВКЛ, які складаўся з *рады* (гарадская адміністрацыя) і *лавы* (гарадскі суд).

*Магія* – вера ў магчымасць уздзеяння на прыродныя аб'екты і людзей з дапамогай асаблівых дзеянняў.

*Магнацкая алігархія* – грамадска-палітычная сістэма ў Рэчы Паспалітай у 17 – 18 стст., ва ўмовах якой вырашальная роля ў ажыццяўленні палітычных працэсаў належала буйной шляхце (магнатам).

*Мадэрнізацыя* – комплексны сацыяльны працэс пераходу ад традыцыйнага да індустрыяльнага "сучаснага" грамадства.

*Манаполіі* – аб'яднанні некалькіх прадпрыемстваў пэўнай галіны вытворчасці для дасягнення кантролю над рынкамі сыравіны, збыту і цэнамі на прадукцыю.

*Мануфактура* – тып прамысловага прадпрыемства, якое заснавана на падзеле працы пры захаванні ручной тэхнікі.

*Марксізм* – накірунак еўрапейскай філасофіі другой паловы 19 – 20 стст., у межах якога галоўная ўвага надаецца крытычнаму аналізу сацыяльнай рэальнасці праз прызму эканамічных працэсаў, пошуку перспектыў яе пераўладкавання на пачатках сацыялізму.

*Марксізм-ленінізм* – афіцыйная ідэалогія ў СССР у 1920-1980-я гг., у аснове якой знаходзілася адаптаванае да патрэб савецкага рэжыму філасофскае вучэнне марксізму.

*Маршалак земскі* – старшыня на пасяджэннях Паноў Рады і сойма ВКЛ, кіраўнік вялікакняскай адміністрацыі.

*Маршалак дворны* – загадчык гаспадарчымі справамі вялікакняскага двара ў ВКЛ.

*Маршалак соймавы* – старшыня на пасяджэннях вальнага сойма Рэчы Паспалітай; выбіраўся пасламі.

*Масонства* – элітарны рэлігійна-філасофскі рух, які ўзнікае ў краінах Еўропы і Амерыкі ў 18 ст.; у 18 – пачатку 20 стст. нярэдка станавіўся формай дзейнасці ліберальных грамадскіх рухаў.

*Мезаліт* – сярэдні каменны век; ахоплівае ў гісторыі Беларусі перыяд 10 – 5 тыс. да н.э.

*Мяжа яўрэйскай аседласці* – вызначаная тэрыторыя ў межах Расійскай імперыі, на якой дазвалялася пасяленне яўрэйскага насельніцтва; ахоплівала беларускія, літоўскія, латышскія, польскія і часткова ўкраінскія губерні.

*Мяшчанства* – саслоўе гарадскіх жыхароў у ВКЛ і Расійскай імперыі.

*Навейшы час* – перыяд сусветнай гісторыі другой чвэрці 20 – пачатку 21 стст., які характарызуецца працэсамі глабалізацыі, навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, фарміраваннем постіндустрыяльнага грамадства.

*Навукова-тэхнічная рэвалюцыя* – працэс карэннай якаснай перабудовы вытворчых сіл на аснове пераўтварэння навукі ў вядучы фактар развіцця вытворчасці ў сусветнай эканоміцы ў другой палове 20 – пачатку 21 стст.

*Наменклатура* – кіруючая бюракратычная эліта ў СССР.

*Народнасць* – аб'яднанне людзей на пэўнай тэрыторыі, з агульнай гісторыяй, мовай і культурай, умовамі жыцця, але пры гэтым адсутнічала моцная агульная самасвядомасць.

*Настаўніцкія семінарыі* – навучальныя ўстановы ў Расійскай імперыі, якія давалі сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю.

*Нацызм (нацыянал-сацыялізм)* – палітычная сістэма і афіцыйная ідэалогія ў Германіі ў 1933 – 1945 гг.; уяўляла з сябе разнавіднасць таталітарнага рэжыму.

*Нацыя* – сацыяльная супольнасць, для якой характэрныя агульная тэрыторыя пражывання, агульная літаратурная мова, наяўнасць трывалых эканамічных і культурных сувязяў, развітая нацыянальная самасвядомасць.

*Нацыяналізацыя* – перадача ва ўласнасць дзяржавы маёмасці прыватных асоб або калектываў.

*Неаліт* – позні каменны век; ахоплівае ў гісторыі Беларусі перыяд 5 – 3 тыс. да н.э.

*Неалітычная рэвалюцыя* – працэс пераходу ад прысвойваючай (паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва) да вытворчай (земляробства, жывёлагадоўля) гаспадаркі.

*Нелінейны падыход да вывучэння гісторыі* – навуковы падыход, сутнасць якога палягае ў поглядзе на гісторыю як працэс фарміравання і развіцця некалькіх самастойных грамадскіх супольнасцяў (цывілізацый), кожная з якіх мела сваю самастойную гісторыю.

*Новая эканамічная палітыка (нэп)* – эканамічная палітыка ў СССР у 1920-я гг., для якой характэрныя спалучэнне панавання дзяржаўнай уласнасці і элементаў рыначнай шматукладнай эканомікі.

*Новы час* – перыяд у сусветнай гісторыі 16 – пачатку 20 стст., які характарызуецца працэсамі фарміравання цэнтралізаваных дзяржаў і каланіяльных імперый, індустрыялізацыі, развіцця капіталістычных адносін, урбанізацыі, фарміраваннем свецкіх культурных каштоўнасцяў.

*Павет* – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ у 15 – 18 стст. і Расійскай імперыі ў 18 – пачатку 20 стст.

*Падкаморскі суд* – судовы орган у ВКЛ у 16 – 18 стст. па разглядзе памежных зямельных спрэчак шляхты.

*Падскарбі земскі* – захавальнік дзяржаўнай казны (скарба) ў ВКЛ.

*Падушны падатак* – падатак у Расійскай імперыі ў 18 – 19 стст., абкладанню якім падлягалі ўсе асобы мужчынскага полу, што належалі да падатковых саслоўяў.

"*Пакта канвента*" – акт, у якім замацоўваліся гарантыі прывілеяў і вольнасцяў Рэчы Паспалітай, выдадзеных ранейшымі каралямі і вялікімі князямі; пацвярджаўся каралямі Рэчы Паспалітай перад каранацыяй.

*Палеаліт* – ранні каменны век; ахоплівае ў гісторыі Беларусі перыяд 100-40 – 10 тыс. да н.э.

*Палітычны народ, палітычная нацыя* – катэгорыя, якая пазначае пэўную супольнасць людзей, аб'яднаных прыналежнасцю да пэўнай дзяржавы, а таксама адпаведнай самасвядомасцю; у Рэчы Паспалітай 16 – 18 стст.

дадзеная катэгорыя абазначала шляхецкую супольнасць у якасці прывілеяванага дзяржаўнага саслоўя, прадстаўнікі якога мелі выключнае права на ўдзел у палітычным жыцці.

*Паншчына* – павіннасць феадальна залежнага сялянства, якая выяўлялася ў дармавой прымусовай працы з уласнымі прыладамі працы ў гаспадарцы феадала.

*Паны Рада* – вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ у другой палове 15 – першай палове 16 стст.; складаўся з саноўнікаў-магнатаў.

*Парламенцкая рэспубліка* – форма дзяржаўнага праўлення, пры якой галоўная роля ў сістэме органаў дзяржаўнага кіравання належыць заканадаўчай уладзе (парламенту).

*Парцэляцыя* – працэс продажу з дапамогай зямельнага банка невялікімі надзеламі, ад 2 да 20 га, часткі памешчыцкіх, дзяржаўных і царкоўных зямель у Польскай рэспубліцы згодна з аграрнай рэформай 1925 г.

*Пасаднік* –кіраўнік дзяржаўнай адміністрацыі ў Тураўскім княстве ў 11 – 14 стст., намеснік князя.

*Пасольская Ізба* – ніжэйшая палата сойма Рэчы Паспалітай; утваралася з выбраных на шляхецкіх павятовых сойміках паслоў.

*Пастаянная рада* – пастаянна дзеючы паміж пасяджэннямі соймаў вышэйшы орган выканаўчай улады ў Рэчы Паспалітай у 1773 – 1789 гг.

*Патрыярхат* – тып сацыяльнай арганізацыі грамадства, які прадугледжвае галоўную ролю мужчын у кіраванні грамадскімі працэсамі.

*Партызанскія зоны* – тэрыторыі СССР, на якіх ва ўмовах германскага акупацыйнага рэжыму падчас Вялікай Айчыннай вайны 1941 – 1945 гг. была ўстаноўлена ўлада партызанскіх брыгад і злучэнняў.

*Паўночна-заходні край* – афіцыйная назва Беларусі і Літвы ў Расійскай імперыі ў 1840 – 1917 гг.

*“Паўночна-усходнія крэсы”* – афіцыйная назва тэрыторыі Заходняй Беларусі ў Польскай Рэспубліцы ў 1920-1930-я гг.

*Перабудова* – перыяд у гісторыі СССР 1985 – 1991 гг., звязаны з істотнымі пераўтварэннямі ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, што ў выніку прывяло да ліквідацыі аўтарытарна-бюракратычнага рэжыму і развалу СССР.

*Першабытнае грамадства* – перыяд у гісторыі чалавецтва, які характарызуецца панаваннем абшчыннага тыпу грамадскага ўладкавання, выкарыстаннем прымітыўных тэхналогій ў гаспадарцы, панаваннем традыцый ў сацыяльным жыцці.

*Перыядызацыя гісторыі* – падзел усяго гістарычнага працэсу на пэўныя кавалкі часу згодна з вызначанымі крытэрыямі.

*Піяры* – прадстаўнікі каталіцкага манаскага ордэна, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі ў 17 – першай палове 19 стст.; вызначыліся стварэннем найбольш прагрэсіўнай сістэмы сярэдняй адукацыі ў Рэчы Паспалітай у другой палове 18 ст.

*Політэізм* – рэлігія, заснаваная на веры ў шматлікіх багоў.

*Постіндустрыяльнае грамадства* – тып грамадства, у эканоміцы якога ў выніку навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і росту масавага спажывання асноўнай

галіной становіцца сфера паслуг; вядучым вытворчым рэсурсам выступаюць інфармацыя і веды; навуковыя распрацоўкі становяцца вядучым фактарам развіцця прадукцыйных сіл грамадства.

*Пралетарыят* – сацыяльны клас, які пазбаўлены ўласнасці на сродкі вытворчасці і асноўнай крыніцай існавання якога з'яўляецца продаж уласнай працоўнай сілы.

*Прамысловая рэвалюцыя* – працэс пераходу ад працы, заснаванай на ручной тэхніцы, да машыннай індустрыі, у выніку якога прамысловасць пераўтвараецца ў галоўную галіну грамадскай вытворчасці.

*Пратэстантызм* – абагуленая назва, якая пазначае сукупнасць веравызнанняў, якія ўтварыліся ў выніку Рэфармацыі (лютэранства, кальвінізм, баптызм і г.д.).

*Прывілей* – заканадаўчы акт у ВКЛ і Рэчы Паспалітай, паводле якога вялікія князі ці каралі надавалі або пацвярджалі асаблівыя правы пэўных сацыяльных або рэлігійных груп ці асоб.

*Прыгоннае права* – сукупнасць юрыдычных норм, якія замацоўвалі асабістую феадальную залежнасць сялян, што ўключае ў сябе забарону для сялян пакідаць свае месца жыхарства, спадчыннае падпарадкаванне судова-адміністрацыйнай уладзе пэўнага феадала, пазбаўленне сялян грамадзянскіх правоў, часам права феадала прадаваць і купляць сялян без зямлі.

*"Прышчэпаўшчына"* – аграрная палітыка ў БССР у 1920-я гг., праводзімая паводле ініцыятывы наркома земляробства Д.Ф. Прышчэпава, якая заключалася ў свабодзе выбару сялянамі формаў землекарыстання, заахвочванні сялян да перасялення на хутары і невялікія пасёлкі.

*Прэзідэнцкая рэспубліка* – форма дзяржаўнага праўлення, пры якой галоўная роля ў сістэме органаў дзяржаўнага кіравання належыць выканаўчай уладзе (прэзідэнту і ўраду).

*Рабочы кантроль* – кантроль, які ажыццяўляўся працоўнымі над вытворчасцю і размеркаваннем прадукцыі і звязанымі з гэтым працэсамі праз дзейнасць фабрычна-заводскіх камітэтаў на шэрагу прамысловых прадпрыемстваў былой Расійскай імперыі ў 1917 – 1918 гг.

*"Разбор шляхты"* – палітыка ўладаў Расійскай імперыі ў канцы 18 – 19 стст. адносна шляхты былога ВКЛ, якая заключалася ў скарачэнні яе колькасці і наданні правоў расійскага дваранства толькі тым асобам, якія здолелі дакументальна засведчыць сваё шляхецкае паходжанне.

*Рада Беларускай Народнай Рэспублікі* – вышэйшы орган улады ў абвешчанай у сакавіку 1918 г. Беларускай Народнай Рэспубліцы; утвораны на аснове Рады Усебеларускага з'езда, які адбыўся ў снежні 1917 г.; у 1919 – 1925 гг. дзейнічае ў эміграцыі; самараспусцілася паводле рашэння Берлінскай канферэнцыі 1925 г.; аднавіла дзейнасць у эміграцыі ў 1947 г.

*Радовічы* – феадальна залежныя сяляне, якія заключалі дамову з землеўладальнікамі ("рад") на пэўны час з фіксацыяй павіннасцяў.

*Ракако* – мастацкі стыль у еўрапейскай культуры 18 ст., які характарызаваўся падкрэсленай пампезнасцю, вытанчанасцю форм, надзвычайнай дэкаратыўнасцю.

*Рамантызм* – ідэйны і мастацкі накірунак ў еўрапейскай і амерыканскай духоўнай культуры канца 18 – першай паловы 19 стст., які ўяўляе з сябе крытычную рэакцыю на ідэі Асветніцтва і вызначаецца сцвярджэннем самакаштоўнасці духоўна-творчай аўтаноміі асобы, увагай да асабістых пачуццяў, народнай культуры і мінулага.

*"Раскулачванне"* – прымусовая канфіскацыя маёмасці сялян, якіх улады аднасілі да ліку заможных і называлі "кулакамі", падчас калектывізацыі ў СССР у 1930 – 1950-я гг.

*Родавая абшчына* – тып сацыяльнай арганізацыі ў першабытным грамадстве, які ўяўляў з сябе калектыў, заснаваны на кроўнародных сувязях, у межах якога існуе агульная ўласнасць.

*Рокаш* – назва "законнага" ўзброенага выступлення шляхты ў Рэчы Паспалітай супраць каралеўскай улады ў абарону сваіх правоў і прывілеяў.

*Русіфікацыя* – палітыка, якая праводзілася ўладамі Расійскай імперыі і СССР, накіраваная на ўзмацненне ўплыву палітычнага, эканамічнага і культурнага ўплыву расійскай нацыянальнасці на тэрыторях з перавагай нярускага насельніцтва.

*Русь* – шматзначны тэрмін; пад ім абазначалася: 1) у 9 – 10 стст. княская дынастыя скандынаўскага паходжання, якая атрымала ўладу ў Кіеўскай дзяржаве; 2) у 11 – 14 стст. землі, на якія распаўсюджвалася ўлада князёў з Рускай дынастыі; 3) у 11 – 19 стст. праваслаўнае насельніцтва і заселеныя імі тэрыторыі ва Ўсходняй Еўропе.

*Рэвалюцыйнае народніцтва* – накірунак у межах агульнарасійскага народніцкага руху ў канцы 19 – пачатку 20 стст., для якога была характэрная ідэя станаўлення сацыялістычнага грамадства шляхам дэмакратычнай палітычнай рэвалюцыі.

*"Рэйкавая вайна"* – назва шэрагу аперацый, праводзімых партызанамі падчас Вялікай Айчыннай вайны ў 1943 – 1944 гг., сутнасць якіх заключалася ў правядзенні аднaчасовага масавага разбурэння чыгуначных камунікацый у розных рэгіёнах Беларусі.

*Рэкруцкая павіннасць* – павіннасць для прадстаўнікоў сялянскага і мяшчанскага саслоўяў у Расійскай імперыі, якая заключалася ў абавязку пастаўляць пэўную колькасць асоб для вайсковай службы, якая ў той час працягвалася 25 год (скасавана паводле ваеннай рэформы 1874 г.).

*Рэфармацыя* – агульнаеўрапейскі рэлігійны рух 16 ст., накіраваны на радыкальную трансфармацыю каталіцкай царквы і яе вучэння згодна з прынцыпамі першапачатковага хрысціянства. Вынікам Рэфармацыі стала ўзнікненне шэрагу новых канфесій: лютэранства, кальвінізму і г.д.

*Саветы дэпутатаў працоўных* – органы самакіравання працоўных (рабочых, сялян, салдат) падчас рэвалюцыі 1905-1907 гг., Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.; пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. пераўтварыліся ў вышэйшыя органы ўлады ў Расійскай рэспубліцы; паступова на працягу 1918 – 1921 гг. былі пераўтвораны ў інструмент дыктатуры бальшавіцкай партыі.

*“Санацыя”* – назва аўтарытарнага палітычнага рэжыму, які ўсталяваўся ў Польскай рэспубліцы ў 1926 – 1939 гг.

*Сарматызм* – сацыяльна-палітычная і культурная ідэалогія, што склалася ў грамадска-палітычнай думцы Рэчы Паспалітай 16 – 18 стст., згодна з якой асаблівы статус шляхты як пануючага саслоўя ў грамадскай сістэме тлумачыўся яе паходжаннем ад старажытнага племені сарматаў, якія нібыта захапілі мясцовае насельніцтва.

*Саслоўна-прадстаўнічая манархія* – форма дзяржаўнага праўлення, паводле якой дзейнічае прынцып сумеснага кіравання дзяржавай манарха і саслоўных прадстаўнікоў, найперш прадстаўнікоў шляхты.

*Сацыялізм* – тэарэтычная мадэль грамадскага ўладкавання, якая прадугледжвае калектыўныя валоданне, распараджэнне і кіраванне сродкамі вытворчасці.

*“Сацыялістычны рэалізм”* – афіцыйны мастацкі стыль у СССР у 1930 – 1980-я гг., сутнасць якога заключалася ў ідэалізацыі існуючага ў СССР грамадскага ладу, усхваленні дзейнасці бальшавіцкай партыі і яе кіраўнікоў.

*Сацыяльная рэвалюцыя* – форма змяненняў у грамадстве, якая прадугледжвае хуткія, якасныя пераўтварэнні асноўных сацыяльных падсістэм і структур у палітыцы, эканоміцы, культуры.

*Сенат* – верхняя палата Сойма Рэчы Паспалітай у 1569 – 1795 гг., якая складалася з ліку вышэйшых чыноўнікаў цэнтральнага і мясцовага дзяржаўнага апарату ВКЛ і Польскага каралеўства.

*Сістэмнасць* – прынцып, які патрабуе вывучэння гістарычных з’яў у межах пэўнай грамадскай сістэмы, з улікам усёй сукупнасці ўзаемасувязяў і механізмаў іх фунцыянавання.

*Сіянізм* – сусветны рух яўрэяў з канца 19 ст., галоўнай мэтай якога выступае вяртанне яўрэйскага насельніцтва ў Палесціну і ўтварэнне там яўрэйскай дзяржавы.

*Смерды* – свабодныя сяляне–абшчыннікі ў сярэднія вякі.

*Сойм* – вышэйшы заканадаўчы саслоўна-прадстаўнічы орган улады ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у 16 – 18 стст.; складаўся з дзвюх палат – Сената і Пасольскай ізбы.

*Соймік* – орган шляхецкага самакіравання, які ўяўляў з сябе сход шляхты пэўнага павета ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

*Сталінізм* – палітычная сістэма, якая склалася ў СССР у 1930 – першай палове 1950-х гг.; уяўляла з сябе разнавіднасць таталітарнага рэжыму.

*Староства* – дзяржаўны маёнтак у ВКЛ у 16 – 18 стст., які вялікі князь (кароль) даваў шляхце ў часовае карыстанне за службу.

*Статуты ВКЛ* – зборнікі норм розных галін права, дзейнасць якога распаўсюджвалася на ўсю тэрыторыю ВКЛ; выдадзены тры Статуты ВКЛ: 1529, 1566 і 1588 гг.

*Стража правоў* – вышэйшы орган выканаўчай улады ў Рэчы Паспалітай у 1789 – 1792 гг.

*Стачка* – калектыўнае спыненне працы на прадпрыемстве або ў арганізацыі з мэтай дамагчыся ад наймальніка больш выгадных умоў працы.

*Суверэнітэт* – права пэўнай дзяржавы ці ўладара ажыццяўляць уладу і кантраляваць насельніцтва на пэўнай тэрыторыі.

*Судзебнік 1468 г.* – зборнік норм крымінальнага права ў ВКЛ, выдадзены па ініцыятыве вялікага князя Казіміра Ягайлавіча.

*Суседская (тэрытарыяльная) абшчына* – тып сацыяльнай арганізацыі грамадства, для якога характэрныя ўладанне зямлёй калектывам, заснаваным на тэрытарыяльных сувязях, пры індывідуальным карыстанні зямлёй і прыладамі працы асобных сем'яў.

*Сярэднія вякі* – перыяд у гісторыі Еўропы 5–15 стст., які характарызуецца фарміраваннем феадальнай сістэмы, карпаратыўнасцю сацыяльнага жыцця, перавагай сельскай гаспадаркі ў эканоміцы, панаваннем рэлігіі і традыцый у духоўнай сферы жыцця грамадства.

*Таleранцыя* – сістэма міжасабістых адносін, якая прадугледжвае цярпімасць да іншых думак, перакананняў, паводзін і г.д.

*Таталітарызм* – тып палітычнага рэжыму, які характарызуецца поўным кантролем або імкненнем да поўнага кантролю з боку дзяржавы над усімі сферамі жыцця грамадства.

*Татэмізм* – вера ў звышнатуральную сувязь паміж чалавекам і прадстаўнікамі жывёльнага і расліннага свету, паходжанне роду ад гэтых прадстаўнікоў.

*Трыбунал ВКЛ* – вышэйшы орган судовай улады ў ВКЛ у 1582 – 1795 гг., які складаўся з выбраных шляхтай на павятовых сойміках суддзяў.

*Тысяцкі* – кіраўнік ваеннага апалчэння ў Тураўскім княстве ў 11–14 стст.

*Уніяцтва* – хрысціянская канфесія, у межах якой прызнаецца дагматыка каталіцкай царквы і кананічнае вяршэнства рымскага папы пры захаванні абраднасці і культу праваслаўнай царквы; на тэрыторыі Беларусі існавала ў 1596 – 1839 гг., аднавілася з 1990 г.

*Урбанізацыя* – працэс перасялення асноўнай часткі насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады.

*Усебеларускі з'езд* – сход прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 14 – 17 снежня 1917 г., на якім было выстаўлена патрабаванне стварэння аўтаномнай беларускай дзяржаўнасці; разагнаны Аблвыканкамзахам.

*Устаўныя граматы БНР* – дакументы, выдадзеныя Радай Усебеларускага з'езда (потым Рады БНР) 21 лютага, 9 сакавіка і 25 сакавіка 1918 г., у якіх дэклараваліся нацыянальны суверэнітэт, незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі, вызначаліся асновы яе грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу.

*Фальварак* – шматгаліновая таварная гаспадарка феадала ў 16 – 19 стст. арыентаваная на продаж прадукцыі, у якой вядучае месца належала вытворчасці збожжа.

*Феадалізм* – сістэма грамадскіх адносін, у аснове якой знаходзіцца прынцып перадачы зямельных уладанняў (феода) вышэйшым уласнікам зямлі ў дзяржаве (князем, каралём) сваім васалам на пэўны час або назаўсёды за

пэўныя заслугі; асноўнымі сацыяльнымі класамі феадальнага грамадства з'яўляюцца *феадалы* (буйныя уладальнікі зямлі) і залежныя ад іх *сяляне*.

*Феадальная патрыярхальна-вотчынная манархія* – форма дзяржаўнага праўлення, паводле якой дзейнічае неабмежаваная ўлада манарха згодна з замацаванымі звычаямі на тэрыторыі, якая з'яўляецца яго спадчыннай вотчынай; падданыя манарха не маюць акрэсленых палітычных правоў.

*Феадальная раздробленасць* – перыяд дэцэнтралізацыі ўлады ў сярэднявечных дзяржавах, абумоўлены палітычным і эканамічным ўмацаваннем буйных феадалаў і асобных рэгіёнаў ва ўмовах васальнай залежнасці ад цэнтральнай улады.

*Фетышызм* – вера ў звышнатуральныя якасці прыродных аб'ектаў (напр., пакланенне камяням, дрэвам), а таксама ў сувязь чалавека і прадмета.

*Філаматы, філарэты, прамяністыя* – тайныя студэнцкія таварыствы прыхільнікаў польскага нацыянальна-вызваленчага руху, якія дзейнічалі ў Віленскім універсітэце ў 1817 – 1823 гг.

*Халакост* – масавае вынішчэнне яўрэйскага насельніцтва, якое ажыццяўлялася ўладамі нацысцкай Германіі падчас Другой сусветнай вайны.

*"Хрушчоўская адліга"* – перыяд у гісторыі СССР, звязаны з праўленнем М. Хрушчова ў 1953 – 1964 гг., які характарызаваўся паступовым паслабленнем рэпрэсіўнага характару ўстаноўленага ў дзяржаве палітычнага рэжыму.

*Хутар* – адасобленная ад вёскі сялянская сядзіба з прылеглымі да яе сельскагаспадарчымі ўгоддзямі.

*Цывілізацыя* – устойлівая культурна-гістарычная супольнасць людзей, якая адрозніваецца агульнасцю эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага, духоўнага жыцця, наяўнасцю агульных геаграфічных межаў.

*Цэхі (брацтвы)* – карпаратыўныя аб'яднанні ў гарадах Сярэднявечча і ранняга Новага часу, якія аб'ядноўвалі гарадскіх рамеснікаў адной ці некалькіх сумежных спецыяльнасцяў і абаранялі іх ад канкурэнцыі.

*Часовая ўрадавая камісія ВКЛ* – грамадзянская адміністрацыя, якая была створана на тэрыторыі заходняй Беларусі і Літвы падчас французкай акупацыі 1812 г.; складалася з прадстаўнікоў мясцовай шляхты.

*Чынш* – павіннасць феадальна залежнага сялянства, якая выяўлялася ў выплаце пэўнай грашовай сумы на карысць феадала.

*Чэлядзь нявольная, халопы* – рабы або кабальныя даўжнікі ў эпоху Сярэднявечча.

*Шлях "з вараг у грэкі"* – міжнародны гандлёвы шлях, які звязваў Заходнюю і Паўночную Еўропу з Візантыяй і арабскім Усходам па рэках Зах.Дзвіна і Днепр у Сярэднія вякі.

*Шляхецкая дэмакратыя* – грамадска-палітычная сістэма ў Рэчы Паспалітай 16 – 18 стст., у межах якой шляхта валодала поўным спектрам грамадзянскіх і палітычных правоў у якасці саслоўнага прывілею (дэкларавалася прававая роўнасць у межах шляхецкага саслоўя), а таксама з'яўлялася крыніцай дзяржаўнай улады.

*Шляхецкі рэвалюцыянарызм* – грамадска-палітычны рух на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у першай палове – сярэдзіне 19 ст., галоўнай мэтай якога з'яўлялася аднаўленне Рэчы Паспалітай шляхам правядзення палітычнай і нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыі, асноўнай рухаючай сілай якой павінна выступаць шляхта.

*Шляхта* – прывілеяванае саслоўе ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у 14–18 стст., якое валодала выключным правам валодання зямлёй, займання дзяржаўных пасад і ўдзелу ў палітычным жыцці, вызвалялася ад абавязковых падаткаў; пасля падзелаў Рэчы Паспалітай асноўная яе частка ўлілася ў склад дваранства Расійскай імперыі.

*Шышы* – назва ўдзельнікаў партызанскага руху на тэрыторыі ВКЛ, занятай маскоўкімі войскамі падчас вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654 – 1667 гг.

*Эканоміі* – дзяржаўныя зямельныя уладанні ў ВКЛ у 16 – 18 стст., прызначаныя для задавальнення патрэб двара манарха і прыдворнага скарбу

*Элекцыйная манархія* – форма дзяржаўнага праўлення, пры якой кіраўнік дзяржавы (манарх) атрымлівае ўладу ў выніку выбараў.

*Элекцыйны сойм* – від сойма Рэчы Паспалітай у 16 – 18 стст., які склікаўся для правядзення выбараў новага караля падчас бескаралеўя; удзел у выбарах мог прымаць кожны шляхціц Рэчы Паспалітай.

*"Эпоха застою"* – умоўная назва перыяду ў гісторыі СССР другой паловы 1970-х – першай паловы 1980-х гг., які характарызаваўся замаруджваннем тэмпаў эканамічнага росту, нарастаннем крызісных з'яў у сацыяльна-эканамічным і сацыяльна-палітычным жыцці грамадства.

*Юрыдыкі* – асобныя кварталы ў магдэбургскіх гарадах ВКЛ, якія знаходзіліся пад уладай прыватных асоб ці царквы і не падлягалі ўладзе магістрата.

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

## Асноўная


*1. Дакументы і матэрыялы*

Беларусізацыя. 1920-я гады: дакументы і матэрыялы. – Мінск, 2001.

Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.

Белоруссия в эпоху феодализма: сб. документов и материалов: в 4 т. – Минск, 1959 – 1979.

Белоруссия в эпоху капитализма: сб. документов и материалов: в 4 т. – Минск, 1983; 1990.

Вішнеўскі, А.Ф., Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Мінск, 2003.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы: в 3 т. – Минск, 1967 – 1982.

Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах: хрэстаматыя. – Вільня, 2007.

История Беларуси в документах и материалах. – Минск, 2000.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2007.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.: Тэкст. Даведнік. Каментарыі. – Мінск, 1989.

Уния в документах: сборник. – Минск, 1997.

Хрестоматия по истории Белоруссии. С древнейшихъ времен до 1917 г. – Минск, 1977.

*2. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.*

Бригадин, П.И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. – Минск, 2007.

Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбны дапаможнік. – Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мінск, 2007.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) (і інш.). – Мінск, 2000 – 2006.

Гісторыя Беларусі. З 1795 г. да вясны 1917 г.: вучэбны дапаможнік / рэдкал.: І.П. Крэнь, І.І. Коўкель. – Мінск, 2001.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: дапаможнік / пад рэд. Л.В. Лойкі. – Мінск, 2005.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый / пад рэд. В.І. Галубовіча, Ю.М. Бохана. – Мінск, 2007.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый: вучэбны дапаможнік: у 2 ч. / пад рэд. А.А. Кавалені, В.Ф. Касовіча. – Мінск, 2005.

История Беларуси: учеб.-информ. Пособие / под ред. А.Г. Кохановского, О.А. Яновского. – Минск, 2001.

Ковкель, И.И., Ярмусик, Э.С. История Беларуси с древнейших времен до нашего времени. – Минск, 2006.

Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. – Минск, 1990.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. М.П. Касцюка. – Мінск, 1994 – 1995.

Сагановіч, Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. – Мінск, 2001.

Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. – Мінск, 2006.

Снапкоўскі, У.Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. – Мінск, 2004.

Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учебное пособие. – Минск, 2007.

Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / пад рэд. В.І. Галубовіча. – Мінск, 1999.

Юхо, Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. – Мінск, 2000 – 2003.

**Дадатковая**

Адамушка, У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20-50-х гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994.

Алексеев, Л.В. Полоцкая земля в IX – XIII вв. – М., 1966.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / пад рэд. М.А.Лазарука. – Мінск, 1985.

Асветнікі зямлі Беларускай. X – пачатак XX стст.: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2006.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945: энцыклапедыя. – Мінск, 1990.

Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 гг. / А.А. Коваленя, А.М. Литвин, В.И. Кузьменко. – Минск, 2005.

Біч, М.В. Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX стст. – Мінск, 2004.

Бохан, Ю.М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV – канцы XVI ст. – Мінск, 2008.

Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие / под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича. – Минск, 2004.

Верашчагіна, А., Гурко, А. Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць. – Мінск, 2000.

Вернигоров, В.И. Политические партии России и Беларуси: страницы истории: пособие для студентов вузов. – Минск, 2006.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны: в 3 т. – Минск, 1983 – 1985.

Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 3 т. – Мінск, 2005 – 2010.

Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. – Мінск, 2001.

Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму / пад рэд. А.П. Жытко. – Мінск, 2005. – Ч. 1.

Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. – Мінск, 1997 – 2002.

Голенченко, Г.Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII вв. – Минск, 1989.

Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскі рэгулярных вайсковых фармаваннях 1918 – 1945. – СПб, 2006.

Дзмітрачкоў, П.Ф. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII стст.). – Магілёў, 2003.

Дзмітрачкоў, П.Ф. Старажытная гісторыя Беларусі. – Магілёў, 1999.

Дзярновіч, А. Нонканфармізм у Беларусі 1953 – 1985. – Мінск, 2004.

Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии. – Минск, 2003.

Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стст.: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада – Полацк, 2007.

Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды. – Мінск, 2001.

Ермаловіч, М.І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – Мінск, 2003.

Загорульский, Э.М. Древняя история Белоруссии: очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.). – Минск, 1977.

Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь. IX – XIII стст. – Мінск, 1998.

Запруднік, Я. Беларусь на гістарычных скрыжаваннях. – Мінск, 1996.

Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. – Мінск, 1991.

Иллюстрированная хронология истории Беларуси. – Минск, 1998.

Імя тваё Белая Русь. – Мінск, 1991.
Игнатенко, И.М. Революция в историческом процессе. – Минск, 1997.
История Беларуси: словарь-справочник / под ред. С.Ф. Дубенецкого. – Минск, 2000.
Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX стст.). – Мінск, 1998.
Карскі, Я. Беларусы. – Мінск, 2001.
Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мінск, 2000.
Краўцэвіч, А.К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Мінск, 1998.
Круталевич, В.А. История Беларуси: становление национальной державности (1917 – 1922 гг.). – Минск, 2003.
Ладысеў, У.Ф., Брыгадзін, П.І. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). – Мінск, 2003.
Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. – Мінск, 1992.
Лыч, Л., Навіцкі, У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1997.
Марозава, С.В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596 – 1839 гг.). – Гродна, 2001.
Марцуль, Г.С., Сташкевіч, М.С. Гісторыя Беларусі: насельніцтва, фарміраванне і вызначэнне этнічных і дзяржаўна-адміністрацыйных межаў, беларускае замежжа. – Мінск, 1997.
Мацук, А.У. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717 – 1763 гг.). – Мінск, 2010.
Методологические проблемы истории: учеб. пособие / под общ. ред. В.Н.Сидорцова. – Минск, 2006.
Міратовіч, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
Насевіч В.Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: падзеі і асобы. – Мінск, 1993.
Очерки истории науки и культуры Беларуси. IX – XX вв. – Минск, 1996.
Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. – Мінск, 2003.
Палітычныя партыі Беларусі. – Мінск, 1994.
Пилипенко, М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. – Минск, 1991.
Пичета, В.И. История белорусского народа. – Минск, 2003.
Пічэта, У.І. Гісторыя Беларусі. – Мінск, 2005.
Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001.
Самусік, А.Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2004.
Сарокін, А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917 – 1990-я гг.). – Мінск, 1999.
Сачанка, Б. Беларуская эміграцыя. – Мінск, 1991.
Славутыя імёны Бацькаўшчыны. – Мінск, 2000; 2003. – Вып. 1-2.
Ткачоў, М.А. Замкі і людзі. – Мінск, 1991.
Туронак, Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня, 2006.
Турук, Ф.Ф. Белорусское движение: очерки истории национального и революционного движения белорусов. – Минск, 1993.

Францыск Скарына і яго час. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1988.
Ходзін, С.М. Гісторыя Беларусі Беларусі ў 1920-1930-я гг. – Мінск, 2001.
Цвікевіч А. "Западно-руссизм". Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на беларусі ў XIX і пачатку XX ст. – Мінск, 1993.
Цяплова, В.А., Каханоўскі, А.Г., Грыбко, І.Л. Гісторыя Беларусі XIX ст. – Мінск, 2004.
Чарняўскі, М.М. Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд. – Мінск, 2003.
Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. – Мінск, 2002.
Штыхов, Г.В. Города Белоруссии по летописям и рукописям (IX – XIII вв.). – Минск, 1975.
Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002). – Мінск, 2003.
Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1993 – 2003.
Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск, 1989.